ARCHE Зьмест № 5’05

1. Зьмест / Уводзіны
2. Пётра Рудкоўскі. Нацыянальны дыскурс і лібэральны мардабой.
3. Мікола Кацук. Міты беларускай сацыялёгіі.
4. Юры Чавусаў. Рэвалюцыя і антырэвалюцыя: бэкграўнд антырэвалюцыйнага дзеяньня
5. Юры Пацюпа. Богу ці жывату?
6. С’юзан Уоткінз. Еўропу хістае.
7. Лукан Элан Ўэй. Рэвалюцыя і крах Кучмавага аўтарытарызму.
8. Тарас Кузё. Памаранчавая рэвалюцыя. Шлях апазыцыі да посьпеху.
9. Міхась Тычына. Весткі з паралельнага сусьвету.
10. Віталь Сіліцкі. Складаныя рэаліі і элегантныя ідэалагізаваныя тлумачэнні.
11. Андранік Антанян. Беларуская кніга ў міжваеннай Польшчы.
12. Аляксандар Фядута. Дабраславёныя гарбачоўскія часы.
13. Валянцін Акудовіч. Сімпатычны курдупель Гарбачоў.
14. Эрык Гобсбаўм. Сход прывідаў.
15. Чэслаў Чабану. Міхаіл Гарбачоў, заняпад сацыялізму і адраджэньне Ўсходняй Эўропы.
16. Аляксандар Грыцанаў. Гарбачоў, убачаны з постмадэрну.
17. Андрэй Вашкевіч. Дзяніс Нарэль. Сымон Якавюк: адраджэнец, спекулянт, манархіст і савецкі дыверсант.
18. Аляксей Дзермант, Сяргей Санько. Этнагенез беларусаў: навука і ідэалогія.
19. Віктар Жыбуль. Футурыст Пятрусь Броўка.
20. Сяржук Няхамес. Мой шлях да Беларусі.
21. Я не магу ня быць у апазыцыі да такой улады. Гутарка з Генадзем Бураўкіным.
22. Аляксей Бацюкоў. Уся праўда пра горад Бобер.
23. Андрэй Хадановіч. Папрыка зорак.
24. Габрыель Гарсія Маркес. Каханьне падчас халеры.
25. Андрэй Ягораў. Сакральная гісторыя найноўшага часу.

26. Яўген Мірановіч. Стварэнне і разбурэнне акупацыйнай рэчаіснасці.

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (39) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

5[image]-[image]**2005**

аналітыка • эсэістыка • крытыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

[image]

З ь м е с т

C o n t e n t s

АНАЛІТЫКА

ПЁТРА РУДКОЎСКІ Нацыянальны дыскурс і лібэральны мардабой. Пасьляслоўе да дыскусіі пра мову «Нямецкай хвалі»
МІКОЛА КАЦУК Міты беларускай сацыялёгіі
ЮРЫ ЧАВУСАЎ Рэвалюцыя і антырэвалюцыя
ЮРЫ ПАЦЮПА Богу ці жывату?
С’ЮЗАН УОТКІНЗ Эўропу хістае
ЛУКАН ЭЛАН ЎЭЙ Рэвалюцыя і крах Кучмавага аўтарытарызму
ТАРАС КУЗЁ Памаранчавая рэвалюцыя. Шлях апазыцыі да посьпеху

КРЫТЫКА

МІХАСЬ ТЫЧЫНА Весткі з паралельнага сусьвету
ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ Складаныя рэаліі і элегантныя ідэалягізаваныя тлумачэньні
АНДРАНІК АНТАНЯН Беларуская кніга ў міжваеннай Польшчы

АНАЛІТЫКА: 1985-2005

АЛЯКСАНДАР ФЯДУТА Дабраславёныя гарбачоўскія часы
ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ Сымпатычны курдупель Гарбачоў
ЭРЫК ГОБСБАЎМ Сход прывідаў

ЧЭСЛАЎ ЧАБАНУ Міхаіл Гарбачоў, заняпад сацыялізму і адраджэньне Ўсходняй Эўропы з пункту гледжаньня свайго чалавека
АЛЯКСАНДАР ГРЫЦАНАЎ Гарбачоў, убачаны з постмадэрну

ГІСТОРЫЯ

АНДРЭЙ ВАШКЕВІЧ, ДЗЯНІС НАРЭЛЬ Сымон Якавюк: адраджэнец, спэкулянт, манархіст і савецкі дывэрсант
АЛЯКСЕЙ ДЗЕРМАНТ, СЯРГЕЙ САНЬКО Этнагенэза беларусаў: навука і ідэалёгія

ЭСЭІСТЫКА

ВІКТАР ЖЫБУЛЬ Футурыст Пятрусь Броўка
СЯРЖУК НЯХАМЕС Мой шлях да Беларусі

ЛІТАРАТУРА

Я не магу ня быць у апазыцыі да такой улады. Гутарка з **ГЕНАДЗЕМ БУРАЎКІНЫМ**
АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ Уся праўда пра горад Бобер
АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ Папрыка зорак. Лірыка
ГАБРЫЕЛЬ ГАРСІЯ МАРКЕС Каханьне падчас халеры

ПАЛЕМІКА

АНДРЭЙ ЯГОРАЎ Сакральная гісторыя найноўшага часу
ЯЎГЕН МІРАНОВІЧ Стварэньне і разбурэньне акупацыйнай рэчаіснасьці

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 5 (39) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/13

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (39) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image] [image] 2005

[image] [image]

Да Зместу

аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Пётра Рудкоўскі Нацыянальны дыскурс і лібэральны мардабой Пасьляслоўе да дыскусіі пра мову «Нямецкай хвалі»

ПЁТРА РУДКОЎСКІ філёзаф, тэоляг. Нарадзіўся ў 1978 годзе ў Канвэлішках (Воранаўскі раён). Магістрант Ягелёнскага ўнівэрсытэту. У сфэру ягоных зацікаўленьняў уваходзіць мэтадалегія сацыяльных навук. Апошнія ягоныя публікацыі ў «ARCHE» – агляд «Стратэгіі барацьбы за рэальнасьць» (3/2005) і артыкул «Сцэнары

«Нямецкая хваля» вельмі расхвалявала беларускія эліты. Пастанова Эўракамісіі падтрымаць вяшчаньне «Deutsche Welle» на Беларусь па-расейску выклікала ў некаторых колах вострую крытыку і ажывіла (і без таго жывую) палеміку паміж «русафіламі» і «беларусафіламі».

Нядаўна адзін з публіцыстаў, падпісаны «Янаў Палескі», паспрабаваў правесьці філязофскую крытыку гэтай палёмікі (гл.: Невозможность симбиоза // Наше мнение 16.08.2005). Палескі зрабіў таксама пэўныя высновы. Галоўнай высновай сталася наступная: *трэба дамовіцца наконт мінімальных правілаў мардабою* (маецца на ўвазе мардабой паміж «беларускамоўнымі» і «расейскамоўнымі»). Іншая выснова, якая мае ўжо больш асабісты характар, такая: «русафілы» – гэта свайго роду «лібэралы-кантыянцы», і Палескага аб’ядноўвае зь імі «*гульня супраць паталёгіі нацыянальнага пачуцьця, так*

надта чужога лібэральна-дэмакратычнаму этасу». лукашэнкаўскай улады» (4/2005).

На самым пачатку прыходзіцца паставіць пытаньне, наколькі тэкст Палескага «дыскутавальны». Бо дыскутаваць можна з поглядамі, а не з «гульнёй»; у гульню можна хіба што згуляць, калі ёсьць настрой. Тым болей дыскутаваць ня будзеш з «мардабоем». Дыскусіі не спрыяе і адпачатная ўстаноўка Палескага: «прадмет дыскусіі – бязглузды» («вздорность предмета-повода»).

Тым ня менш, выклік зроблены, дыскусія выведзена ў філязофскае поле, завязаны хаўрус з паважнымі клясыкамі (Кант, Ролз, Попэр), а таму варта сур'ёзна паставіцца да разважаньняў публіцыста «Нашего мнения». Уявім сабе, што гэта не гульня, а сур'ёзная размова, не мардабой, а інтэлектуальная дыскусія, а яе прадмет зусім не бязглузды, а наадварот, настолькі важны, што варта нават зьвярнуцца да «маткі навук»: філязофіі.

* * *

Палескі лічыць, што, нягледзячы на ўсю «вздорность предмета-повода» ўсяе дыскусіі вакол мовы вяшчаньня на Беларусь радыёстанцыяй «Deutsche Welle», яна (дыскусія) мае «пэўную сувязь з праблемамі, розным чынам наяўнымі у дыскурсах глябалізму/глякалізму, мультыкультуралізму і інш.». Калі б ня гэтая сувязь, дык – трэба меркаваць – шкада было б Палескаму марнавацца на «моўную» дыскусію.

Ход яго разважаньняў наступны:

1. Дыскусію паміж «беларускамоўнымі» і «расейскамоўнымі» можна разглядаць водле аналёгіі да дыскусіі паміж камунітарыянамі і лібэраламі. Аналягон (г. зн. падстава аналёгіі) тут такі: «кантыянцаў-лібэралаў аб'ядноўвае прэзумпцыя, згодна зь якою праблема культурных і моўных адрозьненьняў другасная ў стасунку да праблемы дэмакратыі ці шырэй – праблемы права». Тым часам, «выкарыстоўваньне тэрмінаў «ідэнтычнасьць», «культурная прыналежнасьць», «нацыянальны праект» (...) сьведчыць аб тым, што

беларускамоўная інтэлігенцыя ў сваёй лібэральна-дэмакратычнай частцы (...) так ці інакш імкнецца адрачыся ад вялікіх эмансыпацыйных праграмаў Асьветніцтва, (...) што выхалошчваюць уяўленьне пра асобу. (...) Гэта і набліжае «сьвядомых» да камунітарыянаў».

2. «Лібэралы» вызнаюць прынцып «першынства «праўнага» суб'екту ў стасунку да аб'екту, разуметага як «дабро», напрыклад, дабро мовы». «Камунітарыяне ж наадварот: вызнаюць першынство «дабра» перад правам, хоць і прызнаюць неабходнасьць «абстрактнага» права». У якасьці прыкладу «камунітарыянскай» пазыцыі Палескі прыводзіць пазыцыю рэдактара «Нашай Нівы» Андрэя Дынька: культурная ідэнтычнасьць упісана ў права і, такім чынам, папярэднічае яму.

3. Нашы кантыянцы-лібэралы (г. зн. «расейскамоўныя») не адмаўляюць цалкам важнасьці «культурнае прыналежнасьці», яны – у адрозьненьне ад камунітарыянаў – папросту разглядваюць гэтую прыналежнасьць як другасную, непрыярытэтную.

4. На чыім баку больш слушнасьці? – пытае рытарычна Палескі. «Ні на тым, ні на тым», – сам жа адказвае. Бо што стаіць за заклікамі да «дэмакратыі», «права» або «мовы»? На яго думку, адно: імкненьне да панаваньня («господства») у грамадзтве. У формуле кантыянцаў-лібэралаў (Адамянц, Мінянкоў) Палескі заўважае «известный заряд лукавства». Іхняя формула: «спачатку дэмакратыя, а потым – моўная праблема» хавае прэтэнзіі на быцьцё «спэцыялістамі па дэмакратыі» і, што за гэтым ідзе, на быцьцё кіраўнікамі дэмакратычнага працэсу. Падобнае «лукавство», на думку Палескага, гнезьдзіцца і ў душах «камунітарыянаў» (Дынько, Булгакаў): яны ў сваю чаргу прэтэндуюць на ролю «спэцыялістаў па гуманітарным праекце».

5. Нягледзячы на тое, што аргумэнты «расейскамоўных» і «беларускамоўных» для Палескага раўнавартыя (гл. пункт 4), ён ня ўтойвае, што сымпатызуе менавіта зь «лібэраламі-кантыянцамі». А з абгрунтаваньнем гэтага выбару мы ўжо знаёмыя, хоць ня лішне будзе яшчэ раз яго зацытаваць: «Мяне зь імі аб'ядноўвае гульня супраць паталёгіі нацыянальнага

пачуцьця, так надта чужога лібэральна-дэмакратычнаму этасу».

«ГУЛЬНЯ СУПРАЦЬ ПАТАЛЁГІІ»

На якой падставе Палескі прыпісаў «паталёгію нацыянальнага пачуцьця» «беларускамоўнай» эліце? Крытычных заўваг у бок апошняй, наяўных у тэксьце Палескага, малавата, каб на іх падставе дыягназаваць нейкую паталёгію. Ці «паэтызацыя пісьма за кошт «эмацыянальных» доказаў» у артыкуле А. Дынька ёсьць праявай «паталёгіі пачуцьця»? Альбо ўстаноўка на нацыянальную тоеснасьць і націск на культурную прыналежнасьць? Павышаная адчувальнасьць да нацыянальнае мовы? Усё гэта бязь цяжкасьцяў можна раслумачыць пры дапамозе катэгорыі *маральнай сьпеласьці*, а не *паталёгіі*.

Магчыма, падставы для сьцьвярджэньня паталёгіі трэба шукаць у пераліку «слабых пунктаў беларускамоўнай партыі». Вось яны:

1. «Беларускамоўная партыя» няздольная задзейнічаць у поўным вымярэньні патэнцыял камунітарыяльнага накірунку. «Калі мы сапраўды апэлюем да аргумэнту культурнае прыпіскі, то на якой падставе частка гісторыі і пэўны набор культурных матрыцаў (напрыклад, расейская культура) асуджана на забыцьцё»?

Першая заўвага – лягічная: калі спадар Палескі сам акрэсьліў камунітарыянізм як *аналёгію* «беларусафільскае» партыі, то ня можа адно і другое атаесамляць. Беларусафілы зусім не падаюць у спрэчнасьць з сабою, калі будуць рэалізоўваць патэнцыял камунітарыянізму ў *няпоўным*, а нават і ў *зусім малым* вымярэньні. Палескі забыўся, «камунітарыянізм» выконвае ў яго дыскурсе функцыю *інтэрпрэтанта*, г. зн. паняцьця, пакліканага разьвіць зьмест іншага паняцьця. А *рэальна* беларускамоўе бытуе сабе, а камунітарыянізм – сабе.

Што ж тычыцца «асуджэньня на забыцьцё», то варта ўдакладніць: *хто* асуджае на забыцьцё? Дынько? Сіліцкі? Наколькі мне вядома, «нацыянальны праект», што гадуецца ў нашаніўскім асяродзьдзі, прадугледжвае перадусім

эмансыпацыю беларускасьці як такой плюс беларусізацыю «крэолаў», г. зн. носьбітаў каляніяльнай (постсавецкай, постымпэрскай) мэнтальнасьці. Расейская культура ня скрэсьліваецца ў «праекце». Можна, вядома, назваць гэты праект «этычнай верай», але вера і паталёгія – розныя рэчы. Сам жа Палескі зацеміў, што «ўсякае суіснаваньне прадугледжвае ірацыянальны складнік, і з гэтым нічога ня зробіш». Гэта норма, хочацца дадаць. Норма, а не паталёгія.

2. «Ці не зьяўляецца вобраз ВКЛ празьмернай ідэалізацыяй?» – рытарычна пытае Палескі, намякаючы на чарговую «слабасьць» «беларускамоўнай партыі». Наш адказ: так, зазвычай зьяўляецца. Нацыянальныя *апавяданьні* амаль заўсёды адрозьніваюцца ад навуковых *дадзеных*. Але яны, гэтыя апавяданьні, не пакліканы выконваць пазнавальную функцыю. Іх заданьне – *аб'ядноўваць* досьвед паасобных беларусаў. Гэтаксама, як хрысьціяне расказваюць адзін аднаму пра стварэньне сьвету, усясьветны патоп ці Бабілёнскую вежу, хоць кожны ведае, што гэтыя апавяданьні зьяўляюцца адно толькі мітамі альбо літаратурнымі фікцыямі, так і беларусы могуць расказваць адзін аднаму свае нацыянальныя міты. Асьветніцтва прывучыла нас рагатаць над мітамі, але такія аўтарытэты, як Карл Юнг або Поль Рыкёр наадварот: вучаць падыходзіць да мітаў на поўным сур'ёзе. Міт – гэта зьбіральнік духоўнага вопыту. Празь міты мы камунікуем, перадаем іншым гэты духоўны вопыт. Варта, аднак, адзначыць, што міт павінен быць ураўнаважаны *крытычным розумам*. Сьляпая вера ў міт можа спарадзіць сапраўдную паталёгію нацыянальнага пачуцьця. Таму можам тут прызнаць рацыю Палескаму толькі ў той ступені, у якой насамрэч прапагандуецца «беларускамоўнымі» бескрытычнае ўспрыманьне нацыянальнай міталёгіі.

3. «Непрыстойны бок камунітарыяльнай устаноўкі ў яе беларускай вэрсіі стае відавочным якраз на ўзроўні мовы як «апошняга аргумэнту». І тут Палескі бярэцца дэмаскаваць прэтэнзіі «беларускамоўных» на «моўнае настаўніцтва». Гэтую «непрыстойнасьць» нярэдка «выяўляе» ў нацыянальнай эліце і афіцыйная прапаганда.

Пачнём ад галаваломкі. Дзяўчына Р. выходзіць замуж. Суседзі

цьвердзяць – дзеля грошай. Пытаньне: як дзяўчына Р. можа даказаць, што праз каханьне? Аналягічна: як я магу даказаць, што выступаю за беларускую мову, бо лічу яе каштоўнасьцю, а ня дзеля забесьпячэньня сабе дадатковых даходаў ці здабыцьця панаваньня ў грамадзтве? Закід Палескага сфармуляваны ў нефальсыфікавальнай форме. Кожнага, хто выступае за эмансыпацыю беларускай мовы, можна абвесьціць кар'ерыстам: маўляў, хоча дамагчыся палітыкі беларусізацыі, каб зарабіць на гэтым. Толькі вось цікава, якую тэорыю прымяніць да тых, хто, будучы расейскамоўным, выступае ў абарону беларускае мовы (напрыклад, Сіліцкі)? Альбо да тых, хто з-за мяжы за яе выступае (напрыклад, Браніслаў Герэмэк з Польшчы)?

4. «Калі славуты нацыянальны дыскурс – гэта цэнзураваны дыскурс абмежаванай колькасьці асобаў, ды яшчэ ў прыдачу і малацікавы для «вонкавых» карыстальнікаў (расейцаў, палякаў, часткі беларусаў), дык на якой падставе ён называе сябе «нацыянальным»?

З гэтай нагоды цікава было пазнаёміцца з крытэрамі нацыянальнага дыскурсу, ускосна высунутымі Палескім. Зь яго выказваньня вынікае, што нацыянальны дыскурс мусіць быць: а) нецэнзураваны (што-кольвечы значыла б у гэтым кантэксьце «цэнзура»); б) іх носьбітамі мусіць быць вялікая (толькі невядома, наколькі вялікая) колькасьць людзей; в) ён мусіць быць вельмі цікавы для «вонкавых» карыстальнікаў (толькі ізноў невядома, якая колькасьць «вонкавых» павінна зацікавіцца, каб прысвоіць дыскурсу званьне «цікавага»).

Падагульняючы, трэба сьцьвердзіць, што пералічаныя Палескім «слабасьці беларускамоўнай партыі» ніяк не даюць падставы падазраваць наяўнасьць якойсьці паталёгіі. Крытыка Палескага «камунітарыянаў у беларускай вэрсіі» – гэта сапраўды *гульня*, і нічога болей.

ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ ЛІБЭРАЛІЗМУ

Паспрабуйма цяпер высьветліць адносіны паміж лібэралізмам і «нацыянальным пачуцьцём».

Ня будзем адмаўляць, што стасункі паміж лібэралізмам і *нацыяналізмам* як такім былі здавён, мякка кажучы, напружаныя. Адзін з найвыбітнейшых сучасных прадстаўнікоў лібэралізму, Ісая Бэрлін, напісаў нават невялікі трактат пад назовам «Нацыяналізм – недаацэненая сіла», недаацэненая, але небясьпечная для чалавечай свабоды. Сутнасьць канфлікту паміж нацыянальнай і лібэральнай ідэалёгіямі вельмі добра выявілі яшчэ на пачатку 1990-х Алег Манаеў і Юры Дракахруст у напісаным імі супольна артыкуле «Каким быть Белорусскому народному фронту» (Согласие. 1990 г. 29 октября). «Ідэалёгія [нацыянальная], стаўшыся сымбалем барацьбы супраць камунізму, па сваёй прыродзе ідэалёгія гэтаксама калектывісцкая, паколькі апэлюе да нацыі – калектыўнага суб'екта, якая дзеля самарэалізацыі патрабуе органу, які найбольш поўна выражае яго інтарэсы, – Дзяржавы. Такім чынам, гэтак, як і ў камунізьме, у нацыянальнай ідэалёгіі Дзяржава становіцца галоўным суб'ектам грамадзкага жыцьця». «Камунізму – пішуць далей аналітыкі – найбольш адэкватна супрацьстаіць толькі ідэалёгія лібэралізму. Па сутнасьці, лібэральная ідэалёгія – гэта ідэалёгія Свабоды Асобы. (...) Асоба каштоўная сама па сабе, незалежна ад таго, у якім кантэксьце – нацыянальным, рэлігійным і інш. – яна існуе». Пазыцыя Дракахруста і Манаева – гэта ня што іншае, як разьвіцьцё думкі згаданага філёзафа Ісаі Бэрліна: у нацыяналізьме пэўная цэльнасьць – дзяржава-нацыя – паглынае чалавечую індывідуальнасьць, абвяшчаючы сябе «вышэйшым», «праўдзівым Я».

Але ўжо вучаніца Бэрліна, Яэль Тамір, піша працу пад назовам «Лібэральны нацыяналізм». У Польшчы пра магчымасьць (і патрэбу) «лібэральнага нацыяналізму» гучна гаворыць вядомы філёзаф-лібэрал Анджэй Валіцкі. Яшчэ далей пайшоў беларускі палітоляг Уладзімер Роўда, заявіўшы, што «ў процілегласьць дагматычным уяўленьням, нацыянальныя супольнасьці ў пэўным сэнсе зьяўляюцца нават больш адкрытымі і плюралістычнымі, чым супольнасьці, заснаваныя на пэўным наборы вартасных арыентацыяў, якія складаюць плятформу грамадзянскага кансэнсусу» (гл.: Вытокі нацыяналізму // ARCHE. 2001. № 2).

Справа з нацыяналізмам усё ж не такая простая. Усякі нацыяналізм зьяўляецца пэўнай *праграмай аб'яднаньня*. Нацыяналізм прадугледжвае кананізацыю пэўнае сыстэмы каштоўнасьцяў, у якой першым і апошнім словам ёсьць *нацыянальная супольнасьць*. У нацыяналістычным дыскурсе можа шмат весьціся гаворкі і пра асобу (а нават Асобу), і пра свабоду (а нават Свабоду), рынкавая эканоміка і палітычны плюралізм могуць абвяшчацца ў ім «прыярытэтамі» і г. д., але Нацыя, быццам юнгаўская Вялікая Матка, будзе ўвесь час спаглядаць на кожны твой крок і кантраляваць усякі твой выбар.

Гэта не зусім так, як даводзіць Роўда, што існуе простая сувязь паміж нацыяналізмам і плюралізмам. Гэтая сувязь вельмі няпростая. У нацыяналізьме маем справу пераважна з *кантраляваным* плюралізмам. Могуць існаваць розныя погляды, розныя рэлігіі і нават розныя мовы (хоць з гэтым апошнім нацыяналізм пагаджаецца найцяжэй), але нішто ня можа парушыць сьвятой і запаветнай Еднасьці, нацыянальнага Адзінства. Роўда піша, што ў амэрыканскім лібэральным грамадзтве ёсьць «ізгоі», у той час як у нацыянальных грамадзтвах такіх няма. Насамрэч жа ізгоі ёсьць і там, і там, толькі розьніца ў тым, што ў лібэральным грамадзтве «ізгоі» амаль не адрозьніваюцца ад «не-ізгояў» (нічога дзіўнага, што «ізгояў» там шмат, бо быць «ізгоем» там больш прэстыжна, чым дыскамфортна), у той час, як у грамадзтве, апанаваным нацыяналістычнай ідэалёгіяй, «ізгоям» зазвычай наканаваны лёс вельмі цяжкі (тут нават ня трэба спасылацца на прыклады Сэрбіі ці Харватыі, дастаткова было толькі пабыць трохі ў Літве ў пэрыяд літоўскага «нацыянальнага ўздыму» пачатку 1990-х).

І зноў жа не зусім так, як кажа Роўда, што лібэральныя мысьляры кшталту Бэрліна ці Попэра твораць «карыкатуры» нацыяналізму, хочучы яго папросту скампрамэтаваць. Нават калі і твораць карыкатуры (дарэчы, усякая канцэптуалізацыя якога-небудзь ідэйнага накірунку ёсьць у пэўным сэнсе «карыкатурай», бо хоцькі-няхоцькі спрашчае і мадэлізуе дадзеную сыстэму ідэяў), то не таму, што хоча «скампрамэтаваць», а каб выявіць пэўную небясьпеку, якая ня можа быць зыгнаравана. Попэр, магчыма, дапусьціў памылку ў

тым, што *адназначна* павязаў нацыяналізм з *трыбалізмам* (містыфікацыяй племяннога арганізму, стаўшыся часткай якога, паасобны чалавек набывае сваю «сапраўдную» сутнасьць). Хоць, безумоўна, можна ўявіць сабе і магчымасьць «нетрыбалістычнага» нацыяналізму, то ўсё ж трэба прызнаць, што нацыяналізм, як своеасаблівая праграма аб'яднаньня, знаходзіцца ў небясьпечнай блізкасьці з прынцыпам племяннога адзінства.

Увесь час гаворка вялася пра адносіны паміж лібэралізмам і *нацыяналізмам*, а пытаньне было пастаўленае пра адносіны між лібэралізмам і *нацыянальным пачуцьцём*, бо менавіта да яго Палескі прыставіў слова «паталёгія» і абвесьціў «чужым» лібэральнаму этасу. Вось жа адступленьне нашае мела мэтадалягічны характар. Калі, як аказваецца, некаторыя лібэралы дапускаюць нават магчымасьць «лібэральнага нацыяналізму», то тым больш магчымым зьяўляецца суіснаваньне лібэралізму і нацыянальнага пачуцьця, не аформленага ў нацыяналізм. Нацыяналізм – гэта ідэалёгія, якая абсалютызуе нацыянальнае пачуцьцё. А магчымымі зьяўляюцца ненацыяналістычныя грамадзкія канцэпцыі, якія прадугледжваюць нацыянальнае пачуцьцё як каштоўнасьць, але абвяшчаюць яго не абсалютнай, а толькі рэлятыўнай каштоўнасьцю.

Трэба, нарэшце, паставіць пытаньне пра магчымасьць і вартасьць такога лібэралізму, які цалкам абстрагуецца ад нацыянальнага пачуцьця, лібэралізму, які, як трэба меркаваць, вызнае спадар Палескі. Палескі тут спасылаецца перад усім на (позьняга) Ролза і – у эпізодах – на Попэра. Сапраўды, Палескага з Ролзам яднае шмат што. Рэгулятарнай ідэяй тут зьяўляецца так званы «лібэралізм нэўтральнасьці»: грамадзка-палітычная арганізацыя павінна абстрагавацца ад усякіх тоеснасьцяў. Пабудова сыстэмаў каштоўнасьцяў, якія зьяўляюцца стрыжнямі паасобных тоеснасьцяў, зьяўляецца прыватнаю справай прыватных асобаў ці пэўных групаў. Дзяржава павінна падбаць толькі пра тое, каб стварыць мэханізмы, якія будуць стрымліваць «недазволеную экспансію» паасобных ідэалёгіяў. Інакш кажучы: павінна дбаць, каб кожны застаўся ў «сваім падворку» і не патрывожыў суседа.

Канцэпцыя Ролза, на маю думку, не вытрымлівае крытыкі. Галоўны закід, які тут можна высунуць, што *такі лібэралізм настроены ня столькі на пашырэньне свабоды, колькі на яе абмяжоўваньне*. Некаторыя не заўважаюць гэтага парадоксу, бо дрэнна ўсьведамляюць узаемасувязь паміж грамадзтвам і дзяржавай. Рэч вось у чым: усё тое, што датычыць грамадзтва, ускосна датычыць і дзяржавы і наадварот. А цяпер паставім пытаньне: што значыць, што асоба А альбо група Г у Ролзавым лібэральным грамадзтве мае свабоду на захоўваньне і культываваньне ўласнай тоеснасьці? Гэта значыць, што будзе імкнуцца так ці гэтак *публічна* яе маніфэставаць. Тымчасам застаецца крайне няяснай справа, *дакуль* павінен сягаць аксіялягічны нэўтралітэт дзяржавы? Ці не акажацца так, што, скажам, публічнае прапагандаваньне беларускай культуры будзе абвешчана праявай «неталеранцыі» і парушэньнем сьвятога «нэўтралітэту»? Паўстае небясьпека, што ў такім грамадзтве будзе функцыянаваць «плюралізм падворкаў», а не плюралізм ідэяў, вынесеных на публічны форум для абмеркаваньня. Ажно цісьнецца на вусны тэрмін «склератычнае грамадзтва», які абазначае грамадзтва, унутры якога заблякаваны працэс культурнага ўзаемаабмену. «L'etica senza verità» – «этыка бяз праўды», г. зн. без устойлівых каштоўнасьцяў, – вось падложжа «лібэралізму нэўтральнасьці».

З Попэрам інакш. Па-першае, ён напэўна не пагадзіўся б з прынцыпам «l'etica senza verità». «Рэлятывізм – гэта злачынства інтэлектуалаў», – пісаў ён. Па-другое, хоць нацыяналізм ён і асацыюе з трыбалізмам (і, як было вышэй паказана, мае ў гэтым, прынамсі, частковую рацыю), то сярод сваіх «прынцыпаў лібэралізму» называе таксама «павагу да традыцыі», то бок, гісторыі. Адсюль лягічна вынікае, што нацыянальная культурная традыцыя, як пэўны тып традыцыі, ня толькі не супярэчыць Попэраваму лібэралізму, а нават падбудоўвае яго. Адзінае патрабаваньне, якое тут Попэр высунуў бы – каб традыцыя заставалася аўтарытэтам, *які можна крытыкаваць*, пазбаўленым права на дамінацыю над паасобным чалавекам. Такім чынам, Попэрава «адкрытае грамадзтва» застаецца адкрытым і на нацыянальнае пачуцьцё.

Ані паасобны чалавек, ані грамадзтва ня можа існаваць у часа-

прасторавым вакуўме. Патрэбны нарацыі і сымбалі, якія будуць утвараць (хай сабе часовую) сыстэму каардынат. Чалавек, каб быць свабодным, мусіць спачатку знайсьці самога сябе ў прасторы і часе. «Амэрыканскія і канадзкія камунітарыяне маюць рацыю, даводзячы, у спрэчцы зь лібэраламі, што пачуцьцё свабоды залежыць ад пачуцьця сэнсу, якое можа даць прыналежнасьць да супольнасьці», – піша Анджэй Валіцкі і тут жа дадае: «...пры ўмове, што гэтая супольнасьць – *плюралістычная, дастаткова ёмістая і зындывідуалізаваная* (курсіў мой. – **П. Р.**)». Такім чынам, можна сказаць, што камунітарыяне – гэта лібэралы, узброеныя больш багатай антрапалёгіяй. Як трапна заўважыў Мацей Земба ОП (прыхільнік англа-саксонскага лібэралізму), чалавек, апрача «халодных» каштоўнасьцяў, такіх, як вольны рынак, дэмакратыя, адкрытае грамадзтва, патрабуе яшчэ «цёплых» каштоўнасьцяў, якімі зьяўляюцца народ, гісторыя, рэлігія. Пра «шлюб лібэральнай дзяржавы з нацыянальнай культурай» гаворыць і вядомы сацыёляг Ежы Шацкі.

Пад паняцьцем «лібэральна-дэмакратычны этас» хаваюцца розныя вэрсіі лібэралізму, у тым ліку і такія, якім нацыянальнае пачуцьцё зусім не чужое. Палескі, абвяшчаючы нацыянальнае пачуцьцё чымсьці *так надта* чужым лібэралізму, папросту незаслужана прыватызуе лібэралізм.

НАШ ДОМ – БЕЛАРУСЬ ЦІ КОСМАС?

«*Чалавецтва* ж? – ня ведаю, што такое Чалавецтва. Яно, не існуючы рэчаісна, ёсьць сьвятою абстракцыяй, *натхняць* яно можа, і павінна, і натхняе, але *абавязваць* сілы ня мае. Народы – гэта нешта іншае: яны ёсьць, яны жывуць, церпяць, уздрыгваюць, яны, існуючы сапраўды, ужо не *натхняюць*, як Чалавецтва, але і *абавязваюць* рэчаісна», – пісаў Цыпрыян Норвід (пераклад мой – **П.Р.**).

Нельга не заўважыць арганісцка-натуралістычнага ўхілу ў Норвідавай канцэпцыі народу (народ трактуецца як жывы арганізм, якому ўласьціва натуральнае, то бок, незалежнае ад нашай волі існаваньне). Гэта, так бы мовіць, тыповая рыса

рамантызму. Аднак жа нельга не заўважыць у Норвідавым выказваньні і іншага: *філязофія народу ёсьць разьвіцьцём і дапаўненьнем асьветніцкіх ідэяў*. Менавіта дапаўненьнем, а не супрацьпастаўленьнем гэтым ідэям. Нацыянальныя рухі – гэта дзецішча ідэяў эмансыпацыі і вызваленьня. Калі заняпалі даўнейшыя, даасьветніцкія спосабы самаатаясамленьня – манархія, рэлігія, сакральная мова (лаціна), прыйшла новая, par excellence асьветніцкая форма атаясамленьня – народ.

Народ – гэта наватарская ідэя чалавека, ахрышчанага ў водах *Aufklärung*, прычым ідэя, якая, як аказваецца, вытрымала выпрабаваньні часу. Уцелаўленьне гэтай ідэі мае сваю драматычную гісторыю, а паняцьце нацыянальнага руху або нацыянальнай ідэалёгіі набыло *амбівалентную* афарбоўку. Кант трактаваў амбіваленцыю як форму эстэтычнага перажываньня, выкліканага сузіраньнем *узвышанага*, у якім зьмешваецца захапленьне з трывогай. У гэтым накірунку і варта ісьці, разглядваючы праблематыку *народу*. Народ – гэта адкрыты мастацкі твор, які паўстае ў выніку спражэньня розумаў і воляў, пачуцьцяў і жарсьцяў, каханьняў і спадзяваньняў людзей, аб'яднаных гістарычнай і прасторавай сытуацыяй.

Мастацтва, якое спарадзіла гэты новы твор, месьціцца ў старой эстэтычнай традыцыі, якая завецца *мімэсіс* (пераймальніцтва). Гэтаксама, як Леанарда да Вінчы імкнуўся як мага дакладней адлюстраваць *аблічча жанчыны*, гэтак і аўтары нацыябудаваньня пачалі імкнуцца як мага дакладней адлюстраваць *аблічча прыроды*. Імкнуліся стварыць ілюзію *натуральнай супольнасьці*, якая існавала спрадвеку, а сёньня перажывае сваю вясну, абуджэньне, адраджэньне. І, трэба прызнаць, ім няблага ўдавалася стварыць эфэкт *risorgimento*. Ілюзіі, уяўленьні, памкненьні маюць, як вядома, *рэальныя* наступствы. Слова, калі добра і правільна вымаўленае, становіцца целам.

Гэтаксама, як і Леанарда да Вінчы, будаўнікі нацыяў пераймалі прыроду згодна з пэўным канонам, *ідэяй*. Бо клясычны мімэсіс – гэта ня проста перайманьне, а перайманьне плюс ідэя. Вялікія майстры Рэнэсансу малявалі ня проста чалавека, а *ідэальнага*

чалавека. Ідэйны кампанэнт нацыябудаўніцтва па-рознаму называўся часам «дух народу», часам «Божае наканаваньне», а часам – згодна з выклікам (пост)мадэрнай эпохі – «нацыянальны праект» (падаецца, найбольш нэўтральны тэрмін).

Аўтары нацыябудаўніцтва пераймалі *фюсіс, natura* – г. зн. «тое-што-родзіцца». Іхні заклік: давайце паспрабуем жыць так, як прырода, гэтая, канкрэтная, *наша* прырода. Артадаксальныя спадкаемцы рацыяналістычных традыцыяў навучаць, пэўна, зь непрыхаванай гідотай сьцьвердзілі б: гэта прымітывізм. (Падобна, хоць і ў іншым кантэксьце, так казаў у адрас мастакоў рацыяналіст-Плятон.) Аднак на баку нацыябудаўнікоў, як аказваецца, змагаюцца – як гэта ні парадаксальна – натоўпы «неартадаксальных» спадкаемцаў навучаснага рацыяналізму, пачынаючы ад Русо цераз Ніцшэ да Гайдэгера. *Усьвядоміць супольную Волю* прапануе Русо, *актывізаваць свой дыянісійскі пачатак* правакуе Ніцшэ, *вярнуць быцьцё з за-быцьця* заклікае Гайдэгер. Быцьцё, якое трэба «ўспомніць» – гэта для Гайдэгера ня што іншае, як *фюсіс*, а спосаб яго пра-яўленьня – *мова*...

Патэнцыйнымі хаўрусьнікамі нацыябудаўнікоў зьяўляюцца і навукоўцы-біёлягі, такога кшталту, як Конрад Лёрэнц ці Эдуард Осбарн Уілсан. Чалавек павінен наноў адкрыць сваю *еднасьць з прыродай* – гэта іх галоўная этычная выснова. Урбанізацыя, ананімізацыя, атамізацыя – усё гэта нясе рэальную пагрозу, якой ёсьць страта чалавекам самога сябе. Без супольнасьці чалавек становіцца «свабодным электронам». І што з таго, што ён свабодны, калі ён электрон, а не асоба. Дакладна ў такім духу разважае і вядомы брытанскі лібэрал, Джон Грэй, чарговы хаўрусьнік нацыябудаўнікоў.

Такім чынам, Палескі дарма кажа пра «адыход ад эмансыпацыйных праграмаў Асьветніцтва», які быццам бы характарызуе камунітарыянаў у беларускай і ўнівэрсальнай вэрсіі. Як камунітарыянізм, гэтак і *нацыябудаўніцтва – гэта творчая перапрацоўка ідэалаў Асьветніцтва*. Нездарма ж за нацыянальнымі лідэрамі замацаваўся назоў *асьветнікаў*.

Калі гаворка ідзе пра лідэрства, то ня лішне будзе згадаць пра

засьцярогі Рыгора Мінянкова (Заметки о языке, знании пути и прочем // Наше Мнение. 23.08.2005) адносна Дыньковае фразы: «Мы ведаем, куды ісьці». «Я ня ведаю, куды ісьці, – рэплікуе і паясьняе: – Калі мы ведаем, куды ісьці, а іншыя не ідуць, значыць, яны блудзяць, а калі блудзяць, дык трэба іх паставіць на правільны шлях». Маўляў, пэўная форма місіянэрства, навяртаньне на «праўду» (любой цаной). Аднак, хочацца заўважыць, што насуперак сьціплым запэўненьням Мінянкова ў сваім «няведаньні», ён таксама ўсё ж такі *ведае* пэўны накірунак. «Але я ведаю, – піша, – калі мы будзем мець грамадзтва з свабодным грамадзкім дыскурсам, дзе кожная тоеснасьць, кожная група будзе мець свой голас, свабодна яго выражаць, прапаноўваць свае праекты, не прыцясьняючы іншыя галасы, (...) то тады ў такой свабоднай камунікацыі («цывілізаваным мардабоі», паводле Фядуты) і будзе выпрацоўвацца нейкі супольны кірунак». Аказваецца, што і сам Мінянкоў ведае, «куды ісьці»: трэба ісьці ў накірунку пабудовы «грамадзтва з свабодным грамадзкім дыскурсам». Дык чаму б не аб'яднаць цяпер гэтыя дзьве «веды» – Дынькову веду і Мінянкову – дзеля супольнага будаваньня? Чаму б не аб'яднаць «нацыянальны» і «лібэральны» праекты?

Па-мойму, няма нічога благога ў тым, што хтосьці «ведае, куды ісьці». Мне падабаецца тое, што і Дынько, і Мінянкоў (насуперак яго запэўненьням) ведаюць пэўны накірунак. Ува ўсякім разе, заўсёды лепш мець дачыненьне з тым, хто ведае, чаго хоча, чымся са «свабодным атамам», які заблудзіў у космасе і існуе бяз сэнсу ў дасканалай самоце.

Мінянкоў прапануе нам «грамадзянскую ідэнтычнасьць». Але гэтага замала. Бо што дае сьвядомасьць быцьця грамадзянінам? Гэта сьвядомасьць таго, што ты належыш да сукупнасьці «разумных» індывідуўмаў, якія маюць магчымасьць час ад часу прагаласаваць, выступіць публічна, уступіць у партыю ці заснаваць таварыства, пачаць ладзіць бізнэс або пісаць вершы. Гэтая сукупнасьць «разумных» індывідуўмаў нічым не адрозьніваецца ад аналягічнай сукупнасьці ў суседняй альбо далёкай краіне. Чалавек – гэта ня толькі «дзоон політікон» (грамадзянская істота), але таксама «homo culturalis». Грамадзянская тоеснасьць павінна быць дапоўнена культурнай

тоеснасьцю.

Дык жа што ёсьць нашым домам – Беларусь ці Космас? Палескі ў сваім артыкуле згадвае пра канфлікт «двух вобразаў чалавека» і «двух вобразаў сацыяльнага сьвету»: «касмапалітычнага парадку правоў чалавека» і «ўтульнае коўдры нацыянальных дзяржаваў і культураў». Нельга не заўважыць у яго мэтафорыцы («утульная коўдра») пэўны іранічны, а нават пагарджальны посмак.

Можна выдзеліць два разуменьні *касмапалітызму*: стаіцкае і глябалістычнае (намэнклятура крыху ўмоўная). У стаіцкім сьветавобразе маем некалькі «канцэнтрычных колаў», якія апісваюць чалавека: кола сям'і, родных, блізкіх; кола роднай мясьціны; кола ўсяе краіны; кола людзей, належных да элінскай культуры і – найшырэйшае – кола, якое абдымае ўнівэрсум усіх людзей. Цераз гэтыя колы «праходзіць» наша любоў і добразычлівасьць: мы абавязаны зычліва ставіцца да ўсіх людзей, але пачынаючы ад найбліжэйшых. Касмапалітызм стоікаў характарызаваўся значным этычным прагрэсам у стасунку да пазыцыі Плятона ці Арыстотэля, для якіх «мяжой» добразычлівасьці быў элінскі сьвет. Астатнія для іх – гэта барбары, пазбаўленыя розуму, здольныя быць адно толькі рабамі элінаў.

«Глябалістычны» касмапалітызм абстрагуе ад усякіх «колаў» і абвяшчае чалавека «жыхаром плянэты» альбо нават «жыхаром космасу». Тут ужо не абавязвае добразычлівасьць ці салідарнасьць з *канкрэтнымі* людзьмі, дастаткова толькі любіць абстрактнае «чалавецтва». Толькі якая вартасьць гэтае любові? Любіць «чалавецтва», «сьвятую абстракцыю», як кажа Норвід, гэта ня тое сама, што любіць пэўную супольнасьць людзей, г. зн. *чалавецтва сканкрэтызаванае*.

Апрача Норвіда, варта яшчэ згадаць пра філязофію народу Ўладзімера Салаўёва. Кожны народ, на ягоную думку, ёсьць народам «абраным», у тым сэнсе, што пакліканы надаць сваю афарбоўку таму, што супольначалавечае. *Супольначалавечае рэалізуецца ў поліфаніі нацыянальных культураў*. Такім чынам, адкрываецца магчымасьць да свайго роду сынтэзу «ўнівэрсалізму» і «нацыяналізму». «Касмапалітычны парадак

правоў чалавека» *павінен быць* выпрацоўваны пад «коўдраю нацыянальных культураў», коўдраю, дадайма, далёка не заўсёды «ўтульнаю».

«Наш дом – Беларусь» – няўжо ў гэтым лёзунгу (без сумневу, нацыянальным) не чуваць посмаку пэўнай *свабоды*: асабістай і супольнай, маёй і нашай? Магчыма, гэты посмак і суб'ектыўны, але бясспрэчна тое, што праект *уласнага дому* патрэбен. Нам патрэбна быццё-поплеч, як кажа Дынько. Не пагаджаюся з прапановай Палескага «адчуць сябе членам больш шырокай камунітарнай супольнасьці». Адчуць можна і варта чальцом супольнасьці любой «шырыні», але мы ня звольнены тым самым з стварaньня сваёй, свойскай, радзімай супольнасьці. Мы абавязаны выкарыстаць патэнцыял *тутэйшага*.

«ШМАТ ПРЫЎКРАСНЫХ ГРУДЗЕЙ НА СЬВЕЦЕ...» (МОЎНАЕ ПЫТАНЬНЕ)

«Ня час пацеры гаварыць, калі хата гарыць», – кажуць у маёй вёсцы людзі. Ня час філязафаваць на тэму беларускае мовы, мог бы хтось слушна зацеміць, калі трэба ствараць «жэнэўскую канвэнцыю» ды ўсталёўваць «правілы мардабою». І ўсё ж нават у гэты неспакойны час кінем пару занатовак на тэму мовы ўвогуле і беларускай у прыватнасьці.

Моўная дыфэрэнцыяцыя (расейска-, беларуска-, трасянка-, дзьвюхмоўныя і інш.) у Беларусі – гэта не такая ўжо і важкая праблема. Можа, і ня гэта павінна быць прадметам «перамоваў» і тым, што мае рэгуляваць «жэнэўская канвэнцыя». Праблема намнога глыбейшая. Важна ўсьвядоміць, што ў Беларусі маем справу, прынамсі, зь дзвюма *філязофіямі моваў* (лепш было б тут казаць пра «прэфілязофіі», але дзеля простасьці пакінем слова «філязофія»). Беларускамоўныя адраджэнцы зазвычай прэзэнтуюць разуменьне мовы як *sacrum*, каштоўнасьці амаль абсалютнай. У іхнім дыскурсе можам сустрэць шэраг узрушвальных заклікаў, маральных напамінаў і заахвочваньняў культываваць сваю мову. «Беларусы, ня будзьце самазабойцамі», – патэтычна асьцерагаў нас Ніл Гілевіч перад

рэфэрэндумам-95. Сёньняшнія ягоныя заклікі і ягоная канцэпцыя перадвыбарнай кампаніі па-ранейшаму кружаць вакол той самай сьвятыні: мовы.

Існуе, аднак, зусім іншая філязофія мовы, згодна зь якой мова – гэта ўсяго *інструмэнт* камунікацыі, і ў канчатковым пляне няма розьніцы, на якой мове размаўляць. Важнай ёсьць ня форма (мова), а зьмест.

Дынько і Дракахруст, Сіліцкі і Палескі дыскутуюць на тых самых мовах (першая пара – на беларускай, другая – на расейскай), але спавядаюць, на маю думку, адрозныя канцэпцыі мовы: Дынько і Сіліцкі схіляюцца да першай запрэзэнтаванай толькі што канцэпцыі, а Дракахруст, Палескі, Мінянкоў – да другой. На першы погляд, падаецца, што дзьве філязофіі мовы разьмяркоўваюцца такім чынам: «беларускамоўныя» вызнаюць канцэпцыю «мова-сакрум», а «расейскамоўныя» – «мова-інструмэнт». Але нельга паддавацца гэтай ілюзіі. Падзел на вызнаўцаў адной і другой філязофіі праходзіць *цераз* абедзьве групы і ўтварае, такім чынам, чатыры (прынамсі, чатыры) моўна-філязофскія групы.

Наяўнасьць у нашым грамадзтве розных філязофіяў – гэта ніяк не выпадковасьць сёньняшняй беларускае сытуацыі. Гэта – адлюстраваньне больш унівэрсальнага канфлікту, філязафічныя карэньні якога пастараемся ўзнавіць.

На думку польскага філёзафа-мэтадоляга Анджэя Бронка, гісторыя філязофіі ведае дзьве канкурэнцыйныя канцэпцыі мовы – «мовы як калькулятара» і «мовы як унівэрсальнага мэдыюма». Першая цягнецца ўздоўж лініі Дэкарт–Лейбніц–Гусэрль – уся аналітычная філязофія, а другая ўздоўж лініі Гердэр–Пірс – сучасная гермэнэўтыка, а найлепшым яе прадстаўніком ёсьць хіба Марцін Гайдэгер.

Згодна зь першай, мова – гэта звычайная прылада, *проста* сродак камунікацыі. Згодна з другой, гэта *мэдыюм, па-за які ня можам выйсьці*. Паколькі гэтая другая канцэпцыя ў параўнаньні зь першай больш загадкавая і «экзатычная», прысьвецім ёй болей увагі.

Мы чуем, бачым і адчуваем сьвет у значнай ступені так, як нам дазваляюць існуючыя ў нашым асяродзьдзі інтэпрэтацыйныя звароты – да такой высновы прыйшлі Эдвард Сэпір і Бэнжамін Лі-Ворф, якія дасьледавалі доўгі час індзейскія плямёны. Як прыкмеціў Умбэрта Эка, мы ня можам «бязьвінна» сказаць слова «цела», бо на «цела» накладваецца безьліч розных уяўленьняў і асацыяцыяў (якія не існуюць па-за мовай). Мова – гэта *ня проста* сродак камунікацыі, а адзіны магчымы спосаб нашага існаваньня ў сьвеце. Гайдэгер гэту канцэпцыю мовы злучае з сваёй аналітыкай быцьця: *быцьцё прамаўляе праз нашу мову*. Быцьцё цераз мову выходзіць з за-быцьця.

Гэтую другую, «рамантычную» канцэпцыю мовы можна злучыць зь іншаю тэзай: *паасобныя мовы неперакладальныя*. Аднойчы аналітычны філёзаф Ежы Шымура падчас сваёй лекцыі спытаў: «Ці ангельскае слова ’snow’ і польскае ’śnieg’ маюць ідэнтычную канатацыю?» І сам жа адказаў: «Думаю, што не».

Прапаную цяпер пару экспэрымэнтаў. Ці можам сказаць – па хвіліне рэфлексіі, – што «Беларусь» і «Белоруссия» – гэта тое сама? Альбо, скажам, «час» і «время»? Я б тут паўтарыў словы Шымуры: думаю, што не. Як аднойчы пераканаўча паказаў Юрась Пацюпа, «час» і «время» адсылаюць нас да адрозных гермэнэўтычных кантэкстаў, а нават дзьвюх адрозных гістарыязофіяў: «час» (ад «часаць») – адлюстроўвае разуменьне гісторыі космасу як пасьлядоўнага лінейнага працэсу, а «время» (ад «веретено», «вертеть») – адлюстроўвае цыклічную гістарыязофію. Ці можна перакласьці «кахаць» на «любить»? Закаханыя беларусы, мабыць, добра ўсьведамляюць неперакладальнасьць слова «кахаць». Але справа тут ня толькі ў паасобных лексэмах. Цытаваныя Сэпір і Лі-Ворф казалі пра нешта больш істотнае: неперакладальнасьць інтэрпрэтацыйных зваротаў. Мова ўплывае на наш стасунак да акаляючага сьвету, яна фармуе як унутраны, так і вонкавы сьвет (да якога мае доступ толькі праз мову, як цьвердзяць прыхільнікі другой канцэпцыі мовы).

І цяпер: калі паасобныя мовы – неперакладальныя і калі мова – гэта адзіны мэдыюм, які «ўдаступнівае» нам сьвет, то з гэтага вынікае, што сьмерць якойсьці мовы азначае страту аднаго з

сусьветаў... Ну, каб злагодзіць драматызм сьцьвярджэньня, скажам: страту аднаго з магчымых сьветаадчуваньняў.

«...Яе разам з матчынай цыцкаю / Даў табе ў вусны Бог. / Пі. (...)» – пісаў пра мову Караткевіч. Гэты верш зьяўляецца перакладам на паэтычную мову таго, што кажуць прыхільнікі канцэпцыі мовы як унівэрсальнага мэдыюму. Верш паказвае, што мова – гэта ня столькі *лёгіка*, колькі свайго роду *эротыка*. Мова-лёгас паклікана, каб падпарадкоўваць сьвет, рабіць яго прад-метам, як сказаў бы Гайдэгер, а мова-эрас паклікана, каб аб'ядноўваць, злучаць, спалучаць у адно безь зьнішчэньня адрозьненьняў. «...Шмат прыўкрасных грудзей на сьвеце / Ды ня ўспоіць цябе ні адна». Паэт тут сугестыўна сьцьвярджае *неперакладальнасьць* таго досьведу, які можа ўдаступніць беларуская мова. Далейшыя словы: «І ведай: гіне ў пракляцьцях / І зь дзярма павек не ўстае / Той, хто выплюнуў цыцку маці / Альбо злосна ўкусіў яе» – можна ўспрымаць як перабольшаную пагрозу (прароку можна), але якая мае сваё значэньне.

Гэтая другая канцэпцыя мовы, якую можна назваць «рамантычнай» або «пострамантычнай», вядома ж, небеспраблемная. Я падрабязьней над ёй спыніўся не таму, што прапаную яе як «лепшую» ў стасунку да канцэпцыі «мовы як рахунку», але каб паказаць, што тэндэнцыя беларусафілаў да абсалютызацыі беларускай мовы – гэта не праява нейкага капрызу, а нешта, што вырастае з даволі паважнай філязафічнай традыцыі, якую нельга проста так збыць. Гэта, заўважу, значна ўскладняе працу над гіпатэтычнай канвэнцыяй Дракахруста, бо цяпер яшчэ дадаткова трэба асэнсаваць сфэры ўплываў дзьвюх філязофіяў!

Фраза Дынька: «Ці можа быць расейскамоўны тэкст асновай нацыянальнага дыскурсу, яшчэ трэба даказаць» – выклікала сярод апанэнтаў крытыку, маўляў, гэта ня тая сфэра, у якой можа быць заангажавана рацыянальная аргумэнтацыя. Незалежна ад таго, якія былі Дыньковы інтэнцыі пастаноўкі пытаньня і што месьціцца ў падтэксьце, думаю, што яно павінна застацца адкрытым. Магу, аднак, запрапанаваць сваю спробу асэнсаваньня гэтага пытаньня.

Беларуская мова – гэта *адно зь* «месцаў сустрэчы» беларусаў.

Яна – *адзін з* сымбаляў, якія злучаюць беларускую супольнасьць. Функцыі такога сымбалю ня можа выконваць расейская мова, бо не выконвае асноўнае ўмовы, а менавіта, *быцьця спэцыфікацыяй супольнасьці*; расейская мова ня ёсьць «радзімай плямкай» для беларусаў, а ўсяго толькі «налепкай».

Але гэта датычыць расейскае мовы, узятай толькі ў ізаляцыі. Нацыянальны дыскурс – гэта, як вядома, ня толькі мова (незалежна ад таго, колькі «магіі» гэтай мове прыпішам). Возьмем такую структуру: нарацыя аб Вялікім Княстве (1), расказаная па-расейску (2), «мараль» якой скіравана на ўзмацненьне салідарнасьці з усімі спадкаемцамі спадчыны слаўнага княства (3). І цяпер, маем два фактары ((1) і (3)) са знакам «плюс» (г. зн. яны несумнеўна спрыяльныя для нацыябудаўніцтва) і адзін фактар ((2)) са знакам... вось яно: зь *якім* знакам? І гэта, думаю, – сутнасьць праблемы.

«Расейскі» фактар можна ацаніць патройна: а) плюс; б) мінус; в) нэўтральны. Я схільны выключыць ацэнку «плюс» з прычыны, названай вышэй: не магу прызнаць расейскай мове ролі «народазлучальнага сымбалю». Баюся, што некаторыя артадаксальныя прыхільнікі нацыянальнай ідэі схільны былі б паставіць «мінус» над гэтым фактарам, г. зн. прызнаць яму разбуральную функцыю, маўляў, расейская мова *псуе* нацыянальную нарацыю. Я асабіста перакананы, што расейская мова ў гэтым выпадку ані псуе, ані не падбудоўвае, яна зьяўляецца папросту *нэўтральным фактарам*. А калі так, то расейскамоўны нацыянальны дыскурс *магчымы*. Нішто, што нэўтральнае, ня можа сапсаваць нацыянальны дыскурс. (Такая пастаноўка справы мае свае далейшыя, хоць, думаю, і не такія пагрозьлівыя, складанасьці. Бо, як лёгка заўважыць, і тут шмат залежыць ад «філязофіі мовы». Калі хтось вызнае «рамантычную» канцэпцыю мовы, то яму будзе цяжка пагадзіцца з «нэўтралітэтам» расейскае мовы. Але тут можна адказаць, што «нацыянальная праўда», адлюстраваная ў іншай знакавай сыстэме, не абавязкова дэфармуе яе, а папросту яе *мадыфікуе*.)

* * *

Пасьля асэнсаваньня ўсяе спэцыфікі моўнай сытуацыі ў нашай краіне можна, нарэшце, падумаць над Дракахруставай прапановай. Я, што праўда, ня ў стане распрацаваць якісь больш-менш сэнсоўны праект «жэнэўскай канвэнцыі», але паспрабую зарысаваць *этычную* канцэпцыю нашага суіснаваньня ў нашым доме.

1. Беларуская мова, быўшы адным (але не адзіным) з народазлучальных сымбаляў, мае *этычную каштоўнасьць*. Калі так, то «абыякавасьць» расейскамоўных да гэтай мовы, нярэдка імі дакляраваная, ня можа быць успрынята як нэўтральная рыса. Яна, хутчэй, заганная ў этычным пляне. Павага да гэтае мовы і падтрымка беларускамоўнай культуры – гэта этычны абавязак *усіх* беларусаў.

2. Насуперак лінгвістычным нацыяналістам лічу, што згаданая ў папярэднім пункце павага да беларускай мовы ня цягне за сабой абавязку размаўляць на гэтай мове. Ад расейскамоўных беларусаў патрабаваў бы толькі – апрача рэспэкту для белмовы – пасіўнага валоданьня мовай (каб маглі разумець беларускамоўных). Актыўнага валоданьня белмовай у абавязковым парадку патрабаваў бы ад прадстаўнікоў найвышэйшых дзяржорганаў і тых, што выконваюць публічныя абавязкі (каб не было, скажам, сытуацыяў, калі трэба нямала намучыцца, каб судовы працэс адбыўся па-беларуску);

3. Патрабаваньне павагі да беларускае мовы нельга разумець як патрабаваньне нейкай *асаблівай* павагі да беларускамоўных (г. зн. беларускамоўныя ня могуць прэтэндаваць на ролю «касты абраных»). Гэта нармальна (а нават у нейкім сэнсе і пажадана), калі расейскамоўныя зоймуць у стасунку да беларускамоўных крытычную пазыцыю. Але магчымыя недахопы беларускамоўных не памяншаюць вартасьці самой мовы. (Тут, ідучы сьледам за філязофіяй Шэлера і Інгардэна, прымаю канцэпцыю аўтаноміі каштоўнасьці; згодна зь ёй, *вартасьць беларускае мовы не залежыць ад вартасьці яе носьбітаў*.)

* * *

Дзьвюхмоўе не пагражае беларускай тоеснасьці. Мова – гэта каштоўнасьць, але каштоўнасьць неабсалютная. Занядбаньне мовы альбо адмова ад яе былі б сур'ёзнымі этычнымі памылкамі. Народ не перастаў бы існаваць, але нейкая каштоўнасьць, нешта вартаснае было б страчана. Прыклады з Аўстрыяй ці Ірляндыяй тут не зусім на месцы: сытуацыя, калі нацыябудаваньне пачалося ў *момант татальнай адсутнасьці* сваёй мовы, і сытуацыя, калі ў *працэсе* нацыябудаваньня людзі адракліся ад сваёй мовы, – гэта цалкам розныя сытуацыі. (Памятаю аднаго ірляндца, які вельмі ўзрушана сьпяваў нейкую песьню на ірляндзкай мове. Думаю, што ён хацеў бы, каб сытуацыя з ірляндзкай мовай была, прынамсі, такая, як зь беларускай.) Не на месцы і ўказваньне на адсутнасьць адзінага правапісу як на праяву культурнай слабасьці «беларускамоўнай партыі». Адзіны правапіс – гэта, відавочна, справа будучыні. Цяперашні этап фармаваньня літаратурнае мовы па-свойму каштоўны, бо мова цяпер явіцца перад намі як *працэсуальны* фэномэн. Паўставаньне заўжды больш цікавае, чым стан статычны.

Я выступаю за дзьвюхмоўе, але *дэмакратычнае дзьвюхмоўе*. Віталь Сіліцкі вельмі добра паказаў адрозьненьні ў спосабах функцыянаваньня дзьвюхмоўя ўва ўмовах дыктатуры і ўмовах свабоды. Свабода, як аказваецца, спрыяе беларускай мове. Расейскамоўныя, вядома ж, могуць справядліва адзначыць, што яны не вінаватыя ў тым, што тут «мова» ад дыктатуры церпіць. І тут да месца будзе Дынькова пытаньне: але ці *мы з вамі* – *побач ці поплеч*? Ці той самы лібэральна-дэмакратычны этас не падштурхоўвае да салідарнасьці са слабейшым? Спадар Мінянкоў прадказвае, што кіраўніцтва Беларусі вось-вось рыхтуецца да беларусізацыі. Ня ведаю, ці рыхтуецца, ці не, ведаю толькі, што цяпер вядзецца барацьба са *свабодным* беларускім дыскурсам і ў яго абароне варта сёньня выступіць.

Юры Дракахруст вельмі часта выкрывае «асымэтрычнае мысьленьне» беларускамоўных, іхнія прэтэнзіі на большыя правы ў стасунку да расейскамоўных. Што ж, часам прыходзіцца прызнаць слушнасьць Дракахруставай крытыкі, але варта ўзяць пад увагу й тое, што згаданая «асымэтрыя» – гэта часьцяком звычайная псыхалягічная *кампэнсацыя*, зусім

чалавечая і нармальная зьява. Калі на гумовы шар з вадой націсьнеш з аднаго боку, то вады павінна стаць болей з другога боку. Калі пачуцьці беларускамоўных былі колькі разоў абражаныя, то гэтыя людзі спантанна будуць імкнуцца кампэнсаваць крыўды. Магчыма, некаторым «лібэралам-кантыянцам», якія апэруюць мэтафарай «мардабою», такія разважаньні пакажуцца занадта далікатнымі, але сфэра, пра якую мы разважаем, таксама далікатная. Ня ўсё ўдасца прадугледзець у актах гіпатэтычнай «канвэнцыі». Значная частка «моўнай праблемы» неэмпірычная і таму некадыфікавальная. Больш, чым канвэнцыя, нам патрэбен узаемадавер і салідарнасьць.

Кракаў

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 5 (39) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/25
[image]

Мінулыя (9’2000)

[image]

A R C H E

П а ч а т а к

№ 5 (39) - 2005

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image]

[image]2005

"да Зміцера"

паленіка • аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

МІКОЛА КАЦУК

сацыёляг, навуковы супрацоўнік Інстытуту сацыялёгіі НАН Беларусі. Сфэра інтарэсаў – крытычная сацыялёгія, сацыялёгія сацыялёгіі, культур-сацыялёгія, матэматычнае мадэляваньне. На Буйдзьё, «Фармэнты» змешчаны яго тэкст «Доклад, прыпертый к стенке (Размышления о «ленинской

Мікола Кацук

Міты беларускай сацыялёгіі

ПАДВАЛІНЫ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ

Тэза, зь якой я хацеў бы пачаць, сфармуляваная П'ерам Бурдзьё. Яна палягае ў тым, што сацыялёгія можа быць незалежнай толькі тады, калі яна – дакладней яе творцы-сацыёлягі – кіруюцца выключна сацыялягічным інтарэсам. Гаворка ідзе пра аўтаномію поля сацыялягічнай вытворчасьці. Аўтаномію як магчымасьць і здольнасьць устанаўляць уласныя правілы для ўласнай дзейнасьці.

Тэза, якая здаецца відавочнай, калі нат не трывіяльнай, прыводзіць да парадаксальных высноваў. Як піша Бурдзьё, «сацыяльныя навукі павінны былі заваяваць незалежнасьць ад палітыкі і палітыкаў, а дзеля гэтага неабходна было давесьці сваё права на ўласныя нормы валідызацыі і – асабліва – адстаяць права самім вызначыць кола праблемаў, якія павінны імі вырашацца, г. зн. праблемаў чыста сацыялягічных, адрозных ад «сацыяльных» ці «палітычных»[1].

Іначай кажучы, там, дзе вырашаюцца сацыяльныя, палітычныя, эканамічныя і любыя іншыя праблемы,

сацыялёгіі як навукі няма і быць ня можа. Аднак дамінантная ўстаноўка сацыялягічнай адукацыі палягае якраз у адваротным, а менавіта: у прадукаваньні выканаўцаў, гатовых брацца за любую вонкавую, несацыялягічную праблему. Сама структура сацыялягічнай веды будуецца пэдагогікай у строгай адпаведнасьці з структурай дзяржаўнага апарату, дзе ўсялякай галіне сацыялёгіі[2] адпавядае калі не галіна народнай гаспадаркі, то, прынамсі, сваё міністэрства альбо камітэт. Сацыялёгія працы, сацыялёгія права, сацыялёгія мэдыцыны і нават сацыялёгія культуры, якая дасьледуе наведвальнасьць бібліятэк, – усё знаходзіць сваіх двайнікоў у калідорах адміністрацыяў, упраўленьняў і ведамстваў.

Прадбачачы магчымыя рэакцыі аб аўтарытарнасьці дзяржавы і гераізьме барацьбітоў за дэмакратыю, адзначу – гэта не праблема Беларусі, гэта праблема сацыялёгіі наагул. Фізык альбо матэматык валодаюць манапольнымі правамі на выказваньні аб фізычным і матэматычным свеце. Ніхто ня будзе ў Савеце таму, што матэматык вырашае матэматычныя праблемы. Аўтаномія сацыялёгіі, апроч імпліцытнага дзяржаўнага інтарэсу да кіраваньня дзяржавай, парушаецца і адкрытасьцю сацыяльнага даксічным інтэрпрэтацыям.

Пад доксай разумеецца сама сабой зразумелая, відавочная, [illegible] веда аб сацыяльным свеце. І пытаньне нават не ў фармальна лягічным супрацьпаўстаўленьні ісьціны і доксы, і тое, і другое заяўляюць неабходнымі элемэнтамі сацыяльнага ўладкаваньня. Адрозьненьне паміж ісьцінай і доксай мае гістарычны характар і вызначаецца зьменамі ў праўсах вытворнасьці і адтварэньня грамадзкага жыцьця. Даксічная веда дазваляе захоўваць саматоеснасьць грамадзтва, яго status quo; падзея ісьціны можа парушыць структурную раўнавагу сацыяльнай сыстэмы, робячы немагчымыя практыкі магчымымі.

Адкрытасьць веды аб грамадзтве доксе праяўляецца ў тым, што для інтэрпрэтацыі сацыялягічных дадзеных не

[1] Гэта выказваньне, зразумела, ня можа быць прынятае ў якасьці аргумэнту ў дыскусіі аб дыялектыцы і метафізыцы (пазытывізма)».

[2] Вынаходзіцца новая тэрмінасістэма, якая ўключае ў сябе «спэцыяльную сацыялягічную тэорыю», якая ўладрозьнівае ад праналаваных. Мэртанам «тэорыю сярэдняга рангу» (параўнаць, тэорыі сацыяльнай групы), зьмучае ня столькі тавталогічны і эмпірычны ўзроўні дасьледаванньня, колькі ўстанаўляе гамалегічныя дасьледных і адміністрацыйных назіраньняў, які сацыялёгія можа абгрунтаваць сацыяльную праграму? Толькі заслужаны спэцыяліст у тым або іншым, на які сфармаваная цікавая замова.

патрабуецца якой-любя спэцыфічнай кампэтэнцыі. Прасьцей кажучы, дастаткова мінімальных ведаў у арытмэтыцы, каб рабіць далёкасяжныя высновы[3].

Гэтая акалічнасьць мае і адваротны эфэкт. Любая сацыялягічная інфармацыя, што падаецца спажыўцу праз непасрэднаму замоўцу, ці то, у крайнім выпадку, аўдыторыі СМІ, павінна адпавядаць ягоным чаканьням, быць арыентаванай і адпавядаць патрабаваньням, далёкім ад лёгікі навуковай вытворчасьці.

У залежнасьці ад спэцыфікі палёў, што ўзаемадзеюць з полем сацыялёгіі, гэтыя скрыўленьні могуць быць рознымі. Але так ці іначай усе яны накладаюцца на ўжо існую гістарычна абумоўленую структуру поля. Дзеля гэтага неабходна ўяніць сацыялёгію ў станаўленьні. Пры гэтым, зраблю засьцярогу, грунтоўнага аналізу поля навукі дагэтуль не праводзілася. Мабыць, таму, што бальшыня сацыёлягаў баіцца неразьбежных канфліктаў, выкліканых такім самаапісаньнем.

ГЕНЭАЛЁГІЯ ПОЛЯ

Тым ня менш, можна зрабіць папярэднія накіды. Сацыялёгія ў Беларусі, зь якога боку гэта ні ацэньваць, – спадкаемца савецкай сацыялёгіі. І рэч нават ня столькі ў ідэалягічным прэсінгу, колькі ў разрыве з традыцыяй апісаньня грамадзтва і параўнаўча больш моцнай залежнасьці ад філязофіі. Сацыялёгія наагул, пачынаючы з контаўскага «Курсу пазытыўнай філязофіі», становіцца магчымай толькі пры разрыве зь філязофскай устаноўкай. У нашым выпадку гэты разрыў прыпазьніўся, адбываўся ў больш сьціслыя тэрміны і дагэтуль ня зьдзейсьнены, доказам чаму служаць «новыя» падручнікі сацыялёгіі.

Савецкая дзяржава была ўнікальная, паколькі будавалася на аснове філязофіі. З пэрыядам адноснай стабілізацыі (гэты, які прыпаў на паваенныя гады, узьнікае «прафэсійныя дыфэрэнцыяцыя на «філёзафаў-практыкаў», то бок партыйных лідэраў, і «філёзафаў-тэарэтыкаў», то бок прадстаўнікоў

[3] Гл., у прыватнасьці, друкаваныя прафэсарам Ю. Хавінсанам «Социология в несвободном обществе», дзе апроч усяго іншага абгрунтоўваецца, што «не вызывает доверия вывод о непопулярности оппозиции. Те 30–35% поддержки, которые в сумме собирают[4] і оппозиционные партии, – их твердый электорат, если они сохранят единство». Па-першае, неправамерна, адсутныя ўяўляліся парыйных 30–35%ў

акадэмічнай філязофіі, вымушаных вынаходзіць усё новыя і новыя абгрунтаваньні дзейнасьці першых адпаведна зьменлівай лініяй партыі (балазе марксізм-ленінізм адзін для гэтага ўсе магчымасьці).

Інтарэс да сацыялёгіі і яе другое нараджэньне прыпадае на 1960-я, калі сыстэма пачынае даваць збоі. Паказальная сама тэматыка працаў – эканамічная, прамысловая сацыялёгія, што ставіць мэтай «выяўленьне ўнутраных рэзэрваў», і крыху пазьней – цэмэнтуючая ідэалёгія нашталт «сацыялістычнага ладу жыцьця і ягонай ролі ў разьвіцьці жывёлагадоўлі».

Сацыялягічнай адукацыі як такой няма. Вядзецца падрыхтоўка філёзафаў з магчымай спэцыялізацыяй у гістарычным матэрыялізьме (значыцца, і ў сацыялёгіі таксама). Дарэчы, можна пераканацца, што ў 1970-я – 1980-я сацыялягічныя дысэртацыі абараняліся пад ВАКаўскім шыфрам «гістарычны матэрыялізм». Зразумела, у той час быць філёзафам са спэцыялізацыяй у навуковым камунізьме, праблеме матэрыі і сьвядомасьці, тэорыі пазнаньня, гісторыі філязофіі было прэстыжна і выгадна, чым якім-небудзь «няўдачнікам», які ўвесь час бегае з анкетамі і падлічвае «хі-квадраты» ўручную. Хаця, дзеля справядлівасьці, варта адзначыць, што становішча сацыёляга не было зусім ужо бядотным. Камандзіраванага сустракалі на ўзроўні другога сакратара райкаму і выбачаліся, калі «Волга» белая.

Яшчэ адно пацьвярджэньне – назвы факультэтаў, што ў канцэнтраваным выглядзе адлюстроўвалі герархію дысцыплінаў. Прынамсі, у БДУ эвалюцыя назваў была наступная: гістарычны факультэт (філёзафы са спэцыялізацыяй), філязофска-эканамічны (зьяўленьне сацыёлягаў, псыхолягаў, культуролягаў), факультэт філязофіі і сацыяльных навук (адасабленьне эканамістаў, замена культуролягаў на «інфармацыю і камунікацыю»).

Прыведзеныя прыклады сьведчаць, сацыёляг быў убудаваны ў сыстэму на ўзроўні тэхнічнага памочніка філёзафа і/альбо адміністратара.

Сытуацыя кардынальна мяняецца зь перабудовай, калі

Сацыялогія
ў
Беларусі
пачынае
развівацца
ў
1960-я
гады
ХХ
ст.
Гэта
адзін
з
самых
маладых
навуковых
напрамкаў
у
сучаснай
беларускай
гуманітарыстыцы.
Сацыялогія
ў
Беларусі
ўзнікла
ў
выніку
дыферэнцыяцыі
філасофскага
ведання
і
ператварэння
сацыялогіі
ў
самастойную
навуку.
Сацыялогія
ў
Беларусі
ў
1960-я
гады
ХХ
ст.
Гэта
адзін
з
самых
маладых
навуковых
напрамкаў
у
сучаснай
беларускай
гуманітарыстыцы.
Сацыялогія
ў
Беларусі
ўзнікла
ў
выніку
дыферэнцыяцыі
філасофскага
ведання
і
ператварэння
сацыялогіі
ў
самастойную
навуку.

практычнай канцэпцыі сацыяльнага дзеяння, якая ўключае
Абстрактнай філасофіі Гегеля і Маркса неда, у
падае ўвагі. Сацыялёгія ўзнікла ў выніку

Сацыялёгія ўзнікла ў выніку спробы філасофіі і разам зь ёй ад абстрактных схемаў і тэорыяў, пераарыентоўваецца на мэтады апытаньняў, якія дазваляюць даваць хуткі эфэкт. Сацыялёгія становіцца магчымая як бізнэс.

УНУТРАНЫЯ АДРОЗЬНЕНЬНІ

На пасьляперабудовачны пэрыяд прыпадае канчатковае афармленьне поля сацыялягічнай вытворчасьці з уласным мэханізмам адтварэньня і рэкрутаваньня (сацыялягічная адукацыя), адносна высокай ступеньню камунікацыі ўнутры поля (прафэсійная супольнасьць), а таксама ўнутранымі крытэрамі дыфэрэнцыяцыі.

Поле сацыялёгіі неаднастайнае. У ім, як і ў любым іншым, можна вылучыць пазыцыі дамінуючых і недамінуючых. Крытэры, паводле якіх ажыцьцяўляецца панаваньне і падпарадкаваньне, задаюць шматвымерную структуру поля. Існуе жа, пункцірна, адзначу наступныя пазыцыі па лініі дамінаваньня.

1) Генэрацыйная. Зразумела, што старэйшае пакаленьне (у цэлым) не магло не заняць вышэйшых пазыцыяў, якія агрэгуюць ня толькі сымбалічны капітал (навуковыя годнасьці, ступені), але і адміністрацыйны (пасады), сацыяльны (сувязі), фінансавы (той жа заробак) і г. д. Але больш істотна іншае. Розным пэрыядам гісторыі і поля, і краіны адпавядалі розныя магчымасьці капіталізацыі. У прыватнасьці, нейкі час была магчымасьць абараняць доктарскія дысэртацыі па дакладзе. Такім чынам выходзіла, што некаторыя былі занадта маладыя, а некаторыя занадта старыя, каб скарыстацца гэтай магчымасьцю.

2) Гендэрная. Жанчыны-сацыёлягі па-ранейшаму пераважаюць на пазыцыях выканаўцаў. Існуюць арганізацыі, дзе падначаленымі зьяўляюцца выключна жанчыны. У гэтай сувязі станаўленьне «гендэрнай сацыялёгіі» шмат у чым інсьпіравана

жаданьнем стварыць альтэрнатыўны ліфт прафэсійнай мабільнасьці.

3) Тэарэтыкі-эмпірыкі. Тэорыя ў нас дагэтуль высокая, а эмпірызм – паўзучы. У сымбалічным вымярэньні тэорыя выйграе, асабліва падмацоўваючыся матэматычнымі мадэлямі. Быць эмпірыкам (полстэрам – вытворцам апытаньняў) не прэстыжна, і тыя, хто займаецца выключна эмпірычнай сацыялёгіяй, імкнуцца надаць свайму занятку тэарэтычную форму. У самым скрайнім выпадку тэарэтык становіцца вольным мастаком альбо паэтам ад сацыялёгіі. Як ужо адзначалася, генэалягічна гэтыя палюсы бяруць свой пачатак у апазыцыі філязофія–сацыялёгія, калі спроба згуляць на роўных зь філязофіяй афармлялася як «веданьне жыцьця».

4) ВНУ – дасьледчы цэнтар. Гэта адрозьненьне зьвязанае з праблемай рэкрутаваньня, расстаноўка сілаў вызначаецца тым, куды ідуць найлепшыя студэнты. Сёньня праца на катэдры ўяўляецца больш прэстыжнай.

5) Навука/адукацыя – бізнэс. Часткова перакрыжоўваецца з папярэдняй, аднак гаворка ідзе, канечне, аб эканамічным дамінаваньні.

6) Рэгіянальная. У супрацьстаўленьні цэнтру і пэрыфэрыі найбольш істотны інфармацыйны кампанэнт. Дзе-нідзе і Парсанс лічыцца вядучым сучасным сацыёлягам. Спэцыфіка ж сацыялёгіі ў Беларусі палягае ў тым, што апроч супрацьстаўленьня Менску і рэгіёнаў існуе і супрацьстаўленьне Менску і Масквы, дзе Менск, натуральна, адыгрывае падпарадкаваную ролю. Згодна з сфармаванай звычкай прызнаньне сацыёляга Масквой, а тым больш пераезд, азначае ня толькі лепшую легітымізацыю ў беларускім грамадзтве, але і наагул выступае сымбалем жыцьцёвага посьпеху.

7) Адукацыйная. «Жыцьцёвыя шанцы» вышэйшыя ў тых, хто атрымаў сацыялягічную (раней – філязофскую) адукацыю. Адпаведна, чым далейшая атрыманая адукацыя ад сацыялягічнай, тым меншая верагоднасьць прызнаньня ў прафэсійным асяродзьдзі. Магчымыя і выняткі, выкліканыя піетэтам перад строгімі навукамі, у першую чаргу –

матэматыкай. Аднак і ў гэтым разе рызыкі па-ранейшаму высокія.

8) СМІ. Ёсьць папулярныя ў СМІ сацыёлягі і зусім невядомыя.

9) Палітычная. Для Беларусі гэта мае асаблівае значэньне. Па сутнасьці, палітычнае адрозьненьне ўлада–апазыцыя ўнутры поля функцыянуе як адрозьненьне паміж «дзяржаўнай» і «незалежнай» сацыялёгіяй. Адназначнае вызначэньне таго, хто пануе, а хто падпарадкоўваецца, абцяжарана тым, што гэта вонкавая для сацыялёгіі рамка, і занадта шмат залежыць ад зьменаў у вонкавым атачэньні. Акрамя таго, працэс структураваньня па палітычнай лініі ў апошнія часы ідзе найбольш інтэнсіўна. З аднаго боку, ажыцьцяўляецца адміністрацыйны ціск, з другога – робяцца і крокі ў адказ[5].

Варта адзначыць, што да ўласна ўнутраных дыфэрэнцыяцыяў поля адносяцца толькі тэорыя/эмпірыя, адукацыйная дзейнасьць ВНУ/дасьледчы цэнтар. Генэрацыйная і гендэрная дыфэрэнцыяцыі зьвязаныя, хутчэй, з кантэкстам чалавечага жыцьця і ягонымі культурнымі дэтэрмінацыямі, рэгіянальная – з соцыякультурнай і гістарычнай спэцыфікай, астатнія вызначаюцца ўзаемадзеяньнем поля сацыялёгіі зь іншымі палямі. Казаць жа пра тыповы для навукі крытэр цыклічнасьці, што да сацыялёгіі ў Беларусі, на мой погляд, крыху несвоечасова, паколькі тая выступае, хутчэй, як даніна павагі навуковаму кіраўніку.

Тым ня менш, зыходзячы з пададзеных крытэраў, пры жаданьні можна намаляваць мадэль дамінуючага агента поля сацыялягічнай вытворчасьці. Рэальнасьць неабавязкова будзе адпавядаць ёй на ўсе сто адсоткаў. Аднак стратэгічна практыкі саміх сацыёлягаў накіраваны на павелічэньне альбо нават агрэгаваньне розных тыпаў капіталаў; кожнае дзеяньне агента накіравана на іх пераразьмеркаваньне, а значыць і трансфармацыю структуры поля; у канчатковым выніку барацьба вядзецца за права легітымна выступаць ад імя беларускай сацыялёгіі.

[5] Уяцыяяў прадстаўнікоў нядаўна заснаванай ініцыятывы «Независимые исследования Беларуси: в борьбе за реальность» (Новасібірск, 2004) прафэсар Алег Манаеў піша: *«центральная идея книги* состоит в том, чтобы на примере Беларуси показать и

ПАРУШЭНЬНІ АЎТАНОМІІ

Аналіз структуры поля сацыялягічнай вытворчасьці дазваляе выявіць матывы, якімі кіруюцца сацыёлягі. Зразумела, што праблема ня зводзіцца да пытаньня чысьціні намераў, і любы сацыяльны агент мае свае сацыяльныя інтарэсы. Сацыялягічны ж інтарэс палягае ў тым, каб шляхам пазнаваўчых практык і прэзэнтацыі іх вынікаў прафэсійнай супольнасьці павысіць свой статус унутры поля. У гэтым разе гаворка ідзе пра ўнутраную легітымізацыю.

Але ёсьць і іншы, ня менш эфэктыўны спосаб, які палягае ў звароце да рэсурсаў іншых палёў і вонкавай легітымізацыі ўласнай дзейнасьці. У гэтым выпадку межы поля становяцца празрыстымі, ягоная аўтаномія парушаецца, а ўласная лёгіка функцыянаваньня падмяняецца чужой.

Найбольшае ўзьдзеяньне на сацыялёгію аказвае поле палітыкі. Як ужо адзначалася, сацыялёгія ў сваёй структуры адтварае, па сутнасьці, палітычнае адрозьненьне ўлады і апазыцыі. Адпаведна, сама сацыялёгія становіцца разьменнай манэтай у гэтай барацьбе[6]. Як вынік, палітычная выніковасьць аказваецца больш значэннай, чым правілы мэтаду. Асабліва яскрава гэта выявілася падчас выбараў і рэфэрэндуму 2004 г. З пункту гледжаньня сацыялёгіі, самастойнага значэньня лічбы рэйтынгу ня маюць, але палітычнае пытаньне аб выніках галасаваньня набыло і сацыялягічнае гучаньне.

У інтэрвію радыёстанцыі «Свабода» дырэктар «The Baltic organization / Baltic surveys» Раса Алішаускене кажа:

обосновать принципиальные различия, преимущества и недостатки между традиционными (т. е. осуществляемыми государственными структурами) и независимыми (т. е. осуществляемыми негосударственными структурами) социальными исследованиями в переходном обществе» (курсіў мой. – **А. М.**). Далей раскрываецца перавага – тое, што незалежныя цэнтры сталі «фабрыкамі думкі», а вада – адсутнасьць падтрымкі з боку дзяржавы.

Атрымліваецца, што 48% ад усіх зарэгістраваных выбарнікаў Беларусі прагаласавалі «за». Калі браць тых, хто галасаваў загадзя, і тых, хто галасаваў сёньня, то датэрміновасць усіх зарэгістраваных выбарнікаў 13% выказаліся «за», сёньня – 35%. Астатнія альбо не адказалі, альбо прагаласавалі «супраць».

Варта зьвярнуць увагу на апошнюю фразу: *«астатія альбо не адказалі, альбо прагаласавалі «супраць»*. Ды вынікаў рэфэрэндуму можна ставіцца па-рознаму, але ў любым разе аказваецца, што выснова аб тым, што «Лукашэнку не хапіла 2%», зроблена без дастатковых на тое падставаў. Гіпатэза аб страху, якой часьцяком спэкулююць, абгрунтоўваючы свае неперамогі альбо спасылаючыся на трэкінг-полы, нікім не правераная і мае такое ж значэньне, як і гіпотэза «пра сорам», маўляў, людзям сорамна прызнацца, што яны галасавалі «за», гіпотэза аб «прыроджанай памкнёнасьці», маўляў, ня ваша справа... і г. д. і т. п.

Аднак самай знакавай падзеяй стала зьяўленьне «Экаома»[8]. Відаць, студэнты яшчэ доўга будуць вывучаць мэтодыку складаньня пытаньняў па ўжо сталай клясычнай фармулёўцы: «Што зроблена прэзыдэнтам Беларусі за апошнія 10 гадоў»: «вельмі шмат карыснага», «шмат карыснага», «нямала добрага», «мала карыснага», «нічога добрага». Але выснова сумная: сымуляцыя сацыялёгіі можа быць ня менш эфэктыўная, чым сама сацыялёгія. Як паліттэхналягічны праект «Экаом» у найвышэйшай ступені пасьпяховы – выдаткі, пачынаючы з часу на навучаньне і канчаючы затратамі на апытальніцкую сетку і інтэрпрэтацыю атрыманых дадзеных, мінімальныя; нават адзначаны спэцыялістамі НІСЭПД рост даверу да незалежных дасьледнікаў і той быў выкарыстаны для пазыцыянаваньня «Экаома» як незалежнага аналітычнага цэнтру.

З палітычнага гледзішча «Экаом» і незалежныя сацыёлягі – апанэнты, але для поля сацыялёгіі зьяўленьне гэтага праекту ёсьць сымптомам ягонага зьнікненьня. Для так званых «традыцыйных» сацыёлягаў гэта азначыла яшчэ большую залежнасьць ад дзяржавы, паколькі стала выразна прасьвечвацца пэрспэктыва непатрэбнасьці і празьмернасьці сацыялягічных дасьледаваньняў.

Казакевіч А. Сацыялягічныя дасьледаваньні ў палітычнай кампаніі 2004 г. // Найноўшая гісторыя беларускага парлямэнтарызму. – Менск, 2005.

[7] Першапачаткова артыкул называўся «Апытаньне дасьледчыцкага цэнтру Gallup: Лукашэнку не хапіла 2%» і быў разьмешчаны на сайце svaboda.org праз ананімайзэр anonymouse.org. Сёньня мае назву «Паводле апытаньня Інстытуту Гелапа, за Лукашэнку выказаліся 48,3% ад агульнай колькасьці выбарцаў, паводле папярэдніх афіцыйных дадзеных – болей за 82% тых, хто прагаласаваў».

[8] Гл.: Лихутина С. Приключения практической социологии в идеологическом зазеркалье.

Зрэшты, пранікненьне лёгікі палітычнай барацьбы ў поле сацыялёгіі не было імгненнае. Пачынаючы зь зьяўленьня электаральных дасьледаваньняў у беларускай палітычнай прасторы ў 1994 г. да функцыяў сацыялёгіі незалежна ад палітычных арыентацыяў дасьледнікаў дадаліся і легітымізацыя «прагнозных паказьнікаў», і агітацыя на карысьць «адзіна правільнага шляху»[9].

Выкананьне гэтых функцыяў у сваю чаргу патрабавала задзейнічаць рэсурсы СМІ, і тым самым выстаўляла іншыя патрабаваньні да сацыялягічнай публіцыстыкі. Для таго, каб быць апублікаваным, тэкст павінен адпавядаць палітыкі рэдакцыі, быць па магчымасьці сэнсацыйным ці, прынамсі, злабадзённым, а таксама ён павінен быць зразумелым пастаяннай аўдыторыі. Як правіла, гэта прыводзіла да непазьбежных стратаў у зьмесьце.

Так, да выбараў 2004 г. стала актуальнае пытаньне аб Народнай кааліцыі «5+», і была распаўсюджаная інфармацыя, падрыхтаваная НІСЭПД[10].

КЛЮЧ ДА ПОСЬПЕХУ «КААЛІЦЫІ 5+» – ІНФАРМАЦЫЯ

Табліца 1. **Узаемасувязь гатоўнасьці рэспандэнтаў галасаваць на парлямэнцкіх выбарах за кандыдатаў Народнай кааліцыі «5+» і інфармаванасьці аб ёй** (у адсотках ад колькасьці апытаных)*

Ці будзеце вы галасаваць за кандыдатаў Народнай кааліцыі «5+»?	Ці чулі вы аб Народнай кааліцыі «5+»?	
Так (28,4)	Не (71,6)	
Пэўна/хутчэй так (21,6)	64,1	35,9
Пэўна/хутчэй не (47,4)	21,2	78,8
ЦА/НА (31,0)	14,5	85,5

[9] Асабліва актуальна гэта тэма, калі

Ярмусік В. Беларусь на дароге рынка // Адкрытае грамадства. 1998. № 3 (105), дзе абгрунтоўваецца непазьбежнасьць рынкавых пераўтварэньняў, а таксама: Закат «Звязды» // Народная воля. 2001. 6 ліпеня. і: Пролог к победе. Наконец-то! // Народная воля. 2001. 24 ліпеня, прысьвечаныя безальтэрнатыўнасці кандыдата Ганчарыка.

* Чытаецца па гарызанталі. У дужках падаюцца вынікі па ўсіх апытаных.
Табліца 2*. * Чытаецца па вэртыкалі.

Выснова: гатоўнасьць выбарнікаў прагаласаваць на парлямэнцкіх выбарах 17 кастрычніка 2004 г. за кандыдатаў Народнай кааліцыі «5+» наўпрост залежыць ад узроўню інфармаванасьці аб гэтай кааліцыі.

Дадзеныя нацыянальнага апытаньня, праведзенага Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў (НІСЭПД) у чэрвені 2004-га. Мэтадам *face-to-face interview* было апытана 1508 жыхароў Беларусі векам ад 18 гадоў. Гранічная памылка рэпрэзэнтацыйнасьці не перавысіла 0,03.

Выснова, зробленая з прыведзеных дадзеных, можа быць пастаўленая пад сумнеў, прынамсі, двума спосабамі.

Зьмястоўна: было б наіўна чакаць ад людзей, непаінфармаваных аб выбарчым блёку, высокага адсотку гатоўнасьці галасаваць за яго. Практыка любых палітычных кампаніяў у якасьці свайго этапу ўлучае ў сябе інфармаваньне і агітацыю за кандыдата ці блёк. У гэтай сувязі выснова трывіяльная і даўно апісаная ў падручніках – інфармаваць трэба ў кожным разе.

І *статыстычна*. Панятак залежнасьці выкарыстаны некарэкна. Залежнасьць прадугледжвае існаваньне залежнай і незалежнай пераменных, калі вымярэньне незалежнай у адпаведнасьці з пэўнай матэматычнай функцыяй вызначае значэньне залежнай пераменнай. Гэта патрабуе ад сацыёляга выкарыстаньня спэцыяльных статыстычных каэфіцыентаў альбо пабудовы рэгрэсійнай мадэлі, мадэлі шляхавага аналізу і да т. п. У табліцах перакрыжаванага разьмеркаваньня (іначай, «дзьвюхмерках», «кросстабах»), як у дадзеным выпадку, можна толькі зафіксаваць наяўнасьць сувязі паміж пераменнымі. Пры гэтым вызначыць, што на што ўплывае, а таксама і ацаніць узьдзеяньне іншых фактараў немагчыма.

Калі ж разважаць у прычынна-выніковым рэчышчы, то паколькі

інфармаванасьць папярэднічае галасаваньню, табліцу трэба чытаць па вэртыкалі. Ведаючы аб'ём выбаркі і працэнтныя разьмеркаваньні, уявіць яе ў такім выглядзе нескладана:

Ці будзеце вы галасаваць за кандыдатаў Народнай кааліцыі «5+»?	Ці чулі вы аб Народнай кааліцыі «5+»?	
Так (28,4)	Не (71,6)	
Пэўна/хутчэй так (21,6)	48,8	10,9
Пэўна/хутчэй не (47,4)	35,3	52,1
ЦА/НА (31,0)	15,9	37,0
	100	100

Як відаць з табліцы, 48,8% паінфармаваных аб кааліцыі схільныя прагаласаваць за яе, а 35,3% ня схільныя. У параўнаньні з папярэдняй, гэтая табліца менш эфэктная. Але сацыялягічна – больш зьмястоўная, бо адкрывае магчымасць для пошуку такога паказьніка альбо іх сукупнасьці, якія сапраўды вызначаюць гатоўнасьць галасаваць за блёк. Пры гэтым інфармаванасьць трэба разумець усяго толькі як неабходную, але недастатковую ўмову галасаваньня.

Натуральна, такая інфармацыя мае вельмі далёкія адносіны да «посьпеху кааліцыі». Але паўторымся, сацыялягічны зьмест быў вылегчаны і ўплывам поля палітыкі, і ўплывам поля СМІ. Да гэтага варта дадаць яшчэ адзін немалаважны фактар, а менавіта ўзьдзеяньне эканамічнага поля.

Дзеля таго што сацыялягічныя дасьледаваньні каштуюць дорага, эканоміка так ці іначай уплывае і на пастаноўку праблемаў, і на тэхналёгію працы сацыёляга. У выпадку бюджэтнага фінансаваньня – тут адрозьненьне незалежных і дзяржаўных сацыёлягаў аказваецца дарэчным – сацыялёгія вырачаная на доўгае абгрунтаваньне тэмаў, пастаянныя перабоі зь фінансаваньнем, дасьледаваньні працягласьцю ў месяцы і нават гады і вынікі, атрыманыя толькі для таго, каб не

парушаць справаздачнасьці. Рынкавыя адносіны ўводзяць прынцып канкурэнтнай барацьбы паміж сацыялягічнымі службамі, ператвараючы іх у прадпрыемствы па вытворчасьці апытаньняў і аказаньні сацыялягічных паслуг. Ува ўмовах рынку выжываюць тыя, каму ўдалося зьвесьці выдаткі, галоўным чынам – часавыя, да мінімуму. А гэта прыводзіць да пэўнай тэхналягізацыі ў працы, арыентацыі на правядзеньне апэратыўных дасьледаваньняў і выкарыстаньне ў апрацоўцы і аналізе атрыманых зьвестак найбольш простых і павярхоўных мэтадаў.

Запыт на правядзеньне падобных дасьледаваньняў фармуецца альбо палітыкамі падчас палітычных кампаніяў, альбо бізнэсоўцамі, зацікаўленымі ў пошуку спажыўца. Супольным месцам электаральных і маркетынгавых дасьледаваньняў стала інфармацыя пра патрэбы, і прынцыповай розьніцы паміж дасьледаваньнем іміджу палітыка і папулярнасьці брэнду няма. Усё падпадарадкоўваецца адной лёгіцы, якую Бадрыяр назваў лёгікай рэфэрэндуму:

Мы жывём у рэжыме рэфэрэндуму – менавіта таму, што болей няма рэфэрэнцыі. Кожны знак, кожнае паведамленьне (…) уяўляецца нам як пытаньне/адказ. Уся сыстэма камунікацыяў перайшла ад складанай сынтаксычнай структуры мовы да бінарна-сыгналітычнай сыстэмы пытаньне/адказ – сыстэмы няспыннага тэставаньня. Між тым вядома, што тэст і рэфэрэндум уяўляюць сабой ідэальныя формы сымуляцыі: адказ падказваецца пытаньнем, загадзя мадэлюецца/азначаецца ім. Такім чынам, рэфэрэндум – гэта заўсёды ня што іншае, як ультыматум: аднабаковае пытаньне, якое анікога болей не пытае, а само адразу навязвае пэўны сэнс, чым і канчаецца цыкль[11].

І далей:

…тэст альбо рэфэрэндум ператвараюць любы канфлікт альбо праблему ў гульню пытаньняў/адказаў; рэальнасьць, якую вы тэстуеце, у адказ і сама тэстуе вас з дапамогай той самай сеткі пытаньняў, і вы дэкадуеце яе па тым жа самым кодзе, які ўпісаны ў кожнае яе паведамленьне альбо рэч, нібыта мініятурны генэтычны код[12].

[11] Бодрийяр Ж. Символический обмен и смерть. – Москва, 2000.

Адносіны эканамічнага поля – замоўца і падрадчык[12] Тамсама. знаходзяць свой эквівалент і ў адміністрацыйным полі, ператвараючыся ў адносіны начальнік–падначалены.

Узьдзеяньне замоўцы, г. зн. кіраваньне навукай, ідзе з многіх пунктаў, галоўным зь якіх ёсьць ВАК. Яе новая палітыка, пацьверджаная ўказам прэзыдэнта ад 17.11.2004, накіравана на тое, каб зрабіць навуку і навукоўцаў кіраванымі. Асаблівую значнасьць, з-за палітычнай важнасьці сацыялягічных дасьледаваньняў, яна мае для сацыялёгіі.

У 2003 г. у Менску выйшлі адразу дзьве энцыкляпэдыі сацыялёгіі, дагэнуль была надрукаваная цэлая сэрыя філязофскіх слоўнікаў у рамках праекту А. Грыцанава «Гуманітарная энцыкляпэдыя». Аб'ём тэкстаў, прыдатных для выкарыстаньня ў дысэртацыях, рэзка ўзрос. Сытуацыя магла б стаць некіраванай, калі б ня новыя правілы, паводле якіх[13]

Спаборнік навуковай ступені кандыдата навук павінен мець ня менш за тры навуковыя артыкулы, надрукаваныя ў навуковых выданьнях, улучаных у пералік выданьняў, альбо ў замежных навуковых выданьнях.

[13] Положение о присуждении ученых степеней и присвоении ученых званий в Республике Беларусь

Спаборнік навуковай ступені доктара навук павінен мець публікацыі ў навуковых выданьнях, улучаных у пералік выданьняў, і ў замежных навуковых выданьнях: па гуманітарных навуках – ня менш за 15 артыкулаў і асабіста напісаную манаграфію.

Кандыдат навук можа быць прызначаны навуковым кіраўніком, калі ён мае стаж навуковай альбо навукова-пэдагагічнай працы пасьля абароны дысэртацыі ня менш за 3 гады і надрукаваў за апошнія 3 гады ня менш за 6 працаў у навуковых выданьнях, улучаных у пералік навуковых выданьняў Рэспублікі Беларусі для апублікаваньня вынікаў дысэртацыйных дасьледаваньняў, які зацьвярджаецца ВАК (далей – пералік выданьняў), альбо ў замежных навуковых выданьнях.

У Беларусі існуе адзіны сацыялягічны часопіс, уключаны ў пералік выданьняў, галоўны рэдактар якога – намесьнік

старшыні ВАК. Фактычна, абарона па сацыялёгіі становіцца немагчымай, калі, вядома, не друкавацца ў часопісах па «сумежных» галінах, такіх як «Хлебопек» альбо «Трение и износ».

Зь іншага боку, было б памылкай уяўляць сацыялёгію ў адміністрацыйным полі як заложніцу бюракратычнай сваволі. Сацыялёгія ўбудавана ў яго як мэханізм зваротнай сувязі. Да прыкладу, і ў дзяржаўных і, да апошняга часу, у недзяржаўных ВНУ стала звыклай практыкай апытваць студэнтаў наконт іх ацэнак выкладчыкаў і праслуханых курсаў. Усё гэта робіцца зь велічнай мэтай павысіць эфэктыўнасьць адукацыйнага працэсу. Але насамрэч такія апытаньні толькі пераразьмяркоўваюць адказнасьць і сымулююць студэнцкае самакіраваньне. Задамося пытаньнем, якой павінна быць кампэтэнцыя таго, хто адказвае, для таго, каб ён мог адэкватна ацаніць курс? Відаць, ён павінен мець глыбокія веды як у зьмесьце курсу, так і мэтодыцы выкладаньня, пэдагогіцы і г. д. Але праблема ў тым, што студэнт таму і студэнт, што ў яго няма гэтых ведаў, ён *вучыцца, то бок атрымлівае* адукацыю. Таму гэтыя ацэнкі абумоўліваюцца эмацыйным успрыняцьцем выкладчыка на ўзроўні падабаецца / не падабаецца, добры / злы, справядлівы (ставіць «выдатна») / несправядлівы (ставіць «незадавальняльна»). А калі б сапраўды трэба было ацаніць сыстэму адукацыі, то падобныя апытаньні варта было б праводзіць сама меней гады праз два пасьля заканчэньня ВНУ.

У шырэйшым сэнсе, інфармацыя аб настроях грамадзтва неабходна чыноўніку толькі для карэгаваньня рэалізацыі ўжо прынятага адміністрацыйнага рашэньня. У 2000 г. расейскі фонд «Общественное мнение» праводзіў апытаньне экспэртаў, якія працуюць з грамадзкай думкай. Паводле ягоных вынікаў выявілася, што «грамадзкая думка прадстаўлена не інтэлектуальнымі канструктамі, а сыгналамі, што сьведчаць пра стан грамадзтва (групы насельніцтва), пераважна – аб неспрыяльным стане»[14]. Гэта ня больш як «трывожны сьвісток» – калі ён гучны і калі на яго зьвернуць увагу, – здольны прывесьці да таго, што ўлада зробіць нейкія крокі для ліквідацыі прычыны трывогі. Але ў чым там справа, што трэба зрабіць і г. д. – гэта, на думку рэспандэнтаў, вырашае ўлада, у

«сьвістку» гэтыя сэнсы не закладзеныя»[15].

У Беларусі такая мадэль выкарыстаньня грамадзкай думкі была ў дакладнасьці рэалізаваная ў сытуацыі з тэлеканалам «Культура». Пасьля спыненьня яго трансьляцыі і нэгатыўнай рэакцыі на тэлеканал «Лад», пра што прасыгналілі сацыёлягі, рашэньне ўладаў было адкарэктаванае, але не скасаванае.

[14] Гл.: Ломбарский г. Ю.

Общественное звание: зеленый свисток

ПАЛІТЫКА РАЗРЫВУ

[15] Тамсама.

Такім чынам, выказваньне сацыёляга абумоўлена як ягонай пазыцыяй унутры поля сацыялёгіі, так і суадносінамі сілаў паміж сацыялёгіяй і іншымі палямі – палітычным, эканамічным, адміністрацыйным і полем СМІ. Сытуацыя ўскладняецца і тым, што любыя сацыяльныя агенты, натуральна і сацыёлягі, успрымаюць дадзенасьць сацыяльнай рэальнасьці як відавочную і саму сабой зразумелую.

Тлумачачы паводзіны людзкіх масаў сацыяльнымі прычынамі, большасьць сацыёлягаў лічыць сябе незалежнымі ад сацыяльнай рэчаіснасьці. Незалежнасьць жа атаясамляецца з аб’ектыўнасцю. Але ў выпадку з сацыялёгіяй яе аб’ектыўнасьць знаходзіцца ня звонку, што прадугледжвае «адэкватнае адлюстраваньне аб’ектыўнай рэальнасьці, існуючай… дадзенай нам… якая фатаграфуецца… і г. д.», а ўнутры поля сацыялягічнай вытворчасьці.

Навука сапраўды аб’ектывуе. Сацыялёгія павінна пачынацца зь неабходнасьці «аб’ектываваць суб’екта, які аб’ектывуе»[16]. Прынцып сацыялёгіі, які ўзыходзіць да сутыкненьня сацыяльнай рэальнасьці і пазнавальнага інтарэсу сацыёляга, – гэта прынцып рэфлексіі.

Але сказаць, што рэч у рэфлексіі – толькі першы крок. Што значыць займаць рэфлексіўную пазыцыю?

Па-першае, гэта прадугледжвае разрыў з доксай. Яшчэ Дуркгайм адзначаў:

[16] Бурдье П. Объективировать объективирующего субъекта // Бурдье П. Начала.

Разглядаць факты пэўнага парадку як рэчы – ня значыць ставіцца да іх у тую ці іншую катэгорыю рэальнасьці; гэта значыць ставіцца адносна іх пэўную мысьленчую пазыцыю. Гэта значыць прыступаць да іх вывучэньня, зыходзячы з прынцыпу, што мы нічога ня ведаем пра тое, што яны сабой уяўляюць, а іх характэрныя ўласьцівасьці, як і невядомыя прычыны, ад якіх яны залежаць, ня могуць быць выяўлены нават самай уважлівай інтраспэкцыяй[17].

Па-другое, гэта азначае перабыванье ў полі сацыялягічнай вытворчасьці і разуменьне сваіх практык як накіраванасьці на зьмяненьне, г. зн. якія ўдзельнічаюць у сымбалічнай барацьбе за пераразьмеркаваньне капіталаў і права легітымна ставіць, ад імя сацыялёгіі. Тут важна ведаць, як любіў казаць мой сябар Георгі Шчадравіцкі, «супраць каго вы ваюеце».

Перш чым пачынаць дасьледаваньне, сацыёляг павінен раскрыць сацыяльную абумоўленасьць уласных практычных схемаў – свайго абагуленага досьведу як сацыяльнага агента, з пэўнай пазыцыяй, капіталам і практыкай. І далей адрэфлексаваць сваю інстытуцыю, школу, нацыянальную спэцыфіку і, нарэшце, дысцыпліну наагул.

Па-трэцяе, асэнсаваньне праблематыкі дасьледаваньняў як навязанай і пошуку ўласна сацыялягічнага інтарэсу – у разьвязаньні сацыяльных праблемаў[18].

Сацыяльнай ёсьць такая праблема, якая закране розныя сацыяльныя групы, што непасрэдна ў праблемнай сытуацыі ўдзельнічаюць. Напрыклад, праблема наркаманіі – бо, паколькі зьвязаная з рознымі сацыяльнымі выдаткамі, павышэньнем падатковага цяжару, ростам злачыннасьці, магчымасьцю эпідэміяў і г. д.

Пасьля вызначэньня ўсіх сацыяльных групаў, якіх тычыцца праблема, варта выявіць «інтарэс» кожнай. Потым вызначыць магчымасьці легітымна выказваць свой інтарэс. Потым вызначыць аб'ём рэсурсаў, якія могуць быць выдаткаваныя на рэалізацыю інтарэсу. У выніку выявіцца пэўная колькасьць групаў, якія маюць адносіны да праблемы, улучна з самімі сацыёлягамі і замоўцамі дасьледаваньня[19].

[17] Durkheim É. Les règles de la méthode sociologique. – Paris, 1894.

[18] На гэта звярнуў увагу Пьер Бурдьё ў сваіх лекцыях, прысьвечаных праблемам навучаньня сацыялёгіі. Гл. Bourdieu P. Esquisse d'une théorie de la pratique. – Paris, 1972.

[19] Гл. Бурдьё П. Практычны сэнс. – Санкт-Пецярбург, 2001.

часьцей за ўсё абумоўлена блізінёй аб’екту вывучэньня для сацыёляга-выкладчыка.

Апошнія патрабаваньні – гэта патрабаваньні да тэксту. Тэкст, тэорыя, вынікі дасьледаваньняў павінны апісваць умовы ўласнай магчымасьці. Калі пастулюецца, што людзі маюць, то хто аўтар? Калі ў выніку дасьледаваньня выяўляецца, што людзі лічаць, што ня могуць свабодна выяўляць свае думкі, якім чынам атрыманыя такія вынікі? Ці свабодна рэспандэнты адказвалі на пытаньні анкеты?

ГРАМАДЗКАЯ ДУМКА ЯК АРТЭФАКТ: ВЫПАДАК НІСЭПД

Мяркую, што гэтыя патрабаваньні назавуць максымалісцкімі, але менавіта таму, што яны аніяк ня ўпісваюцца ў цяперашнюю практыку апытаньняў грамадзкай думкі. У свой час артыкул Бурдзьё «Грамадзкай думкі не існуе»[20] нарабіў багата шуму, але для сацыялёгіі ў Беларусі ён па-ранейшаму актуальны. Больш за тое, узьнікае ўражаньне, што ён быццам пісаўся адмыслова для Беларусі. Нават «закіды тэхнічнага парадку» у нашых умовах выклікаюць, прынамсі, нездаўменьне[21].

Пазыцыя Бурдзьё палягае ў наступным:

[20] Бурдье П. Общественное мнение не существует // Бурдье П. Социология политики. – Москва, 1993.

[21] *У прыватнасьці, Мікіта Рэйтэровіч прадэманстраваў, што ў Беларусі, у адрозьненне ад Расеі, можна правесьці рэпрэзэнтатыўнае апытаньне (выпадковая выбарка, 2003 г.). Я таксама ня бачу ніякіх перашкодаў для правядзеньня апытаньняў у Беларусі, у тым ліку і па тэлефоне. Што тычыцца ўзроўню ахопу, то ён, безумоўна, ніжэйшы, чым у Расеі, але ня ніжэйшы, чым у Польшчы, Чэхіі ці Славаччыне. Гэта ня можа быць прычынай, каб не праводзіць апытаньняў.*

[22] *Гэта, напрыклад, тычыцца фактычна ўсіх апытаньняў, праведзеных Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі.*

часьцей за ўсё абумоўлена блізінёй аб’екту вывучэньня для сацыёляга-выкладчыка.

Тэкст, які ствараецца, можа ня мець ніякага грамадзкага значэньня, то хто ягоны адрасат? Ці думаюць тое, што ствараюць, пра доступ да грантаў? Якім патрабаваньням мусіць адпавядаць гэты чалавек? Якім патрабаваньням павінен адпавядаць інтэлектуальны прадукт?

Так, ня ўсе апытаньні ў Беларусі праводзяцца ў адпаведнасьці з прынятымі стандартамі. Кожны досьціпны чытач можа прывесьці шмат прыкладаў, калі апытаньні праводзіліся з парушэньнямі, якія ставяць пад сумнеў іх рэпрэзэнтатыўнасьць. Але ня ўсе апытаньні праводзяцца такім чынам. Я ведаю, прынамсі, дзьве арганізацыі, якія ў долях адсоткаў (0,03), а таксама ў дзьвюх пастулятах (0,03 %) ня ўпісваюцца ў стандарты. Гэта ня значыць, што ўсе іхныя апытаньні дрэнныя. Я лічу магчымым давесьці, што гэта зусім не так. Гэта фактычна будзе доказ ад супрацьлеглага.

[23] *Гл. напр.: Бурдье П. Вопрос о вопросе, или Непосредственный опыт социального» // Бурдье П. Начала. – Москва, 1994.*

вытворчасьці пазбаўленых сэнсу артэфактаў. Трэці пастулят праяўляецца сукрыта: той просты факт, што ўсім задаецца адно і тое самае пытаньне, абапіраецца на гіпотэзу пра існаваньне кансэнсусу, што да праблематыкі, г. зн. згоды, што пытаньні заслугоўваюць таго, каб быць зададзенымі[22].

Гэтыя словы не азначаюць таго, што ня трэба праводзіць эмпірычных дасьледаваньняў. Яны зьвернутыя да спэцыфікі інтэрпрэтацыі атрыманых дадзеных. У тым выглядзе, у якім функцыянуе грамадзкая думка, яна «...найчысьцейшы артэфакт. Яго прызначэньне – хаваць тое, што стан грамадзкай думкі ў гэты момант ёсьць сыстэмай сілаў, напружаньняў і што няма нічога больш неадэкватнага, чым выражаць стан грамадзкай думкі праз працэнтныя адносіны»[23].

Але нават у гэтым выпадку зробленыя высновы могуць абапірацца не на самі дадзеныя, а на лёгіку палітычнай барацьбы. Так, вынікі дасьледаваньня, праведзенага ў траўні 2005 г.[24], сьведчаць аб адным, але высновы зусім супрацьлеглае.

[22] Бурдье П. Общественное мнение не существует..

На мой погляд, праглядаюцца тэндэнцыі:

– цэнтраванасьці сацыяльных уяўленьняў на фігуры Лукашэнкі;

– маргінальнага палажэньня апазыцыі ў сацыяльных уяўленьнях;

– пасіўнасьці і пэсымізму дэмакратычна арыентаваных рэспандэнтаў;

– дэпалітызацыі і арыентацыі на захаваньне існага палажэньня.

Пры адказе на адкрытае пытаньне «Калі б заўтра зноў адбыліся выбары прэзыдэнта Беларусі, за каго б вы прагаласавалі?» рэйтынг прэзыдэнта складае 41,7%. Адкрытыя пытаньні спэцыфічныя тым, што, як правіла, паказваюць крыху заніжаныя вынікі. Пры гэтым рэйтынгі апазыцыйных палітыкаў трапляюць у памылку выбаркі.

Пры адказе на пытаньне, што адсылае да неверагоднай у

цяперашніх умовах сытуацыі: «Як вы думаеце, хто будзе абраны прэзыдэнтам у 2006 г., калі ўсе кандыдаты, як у 1994 г., будуць мець вольны доступ да тэлебачаньня, магчымасьць свабодна сустракацца з выбарнікамі і г. д.», 55% рэспандэнтаў усё адно лічыць, што «зноў будзе абраны А. Лукашэнка».

Адзначаны спэцыялістамі НІСЭПД рост пратэстнага патэнцыялу адначасова ня зьвязваецца з палітычнай актыўнасьцю. Рэспандэнты схільныя непадтрымліваць публічныя пратэсты супраць улады (39,2% падтрымліваюць ці хутчэй падтрымліваюць, 49,1 не падтрымліваюць ці хутчэй не падтрымліваюць). А абарону ўласных інтарэсаў рэспандэнты гатовыя адстойваць у формах, што не патрабуюць актыўнай пазыцыі – галасаваньне, зварот да ўлады, пісаньне пэтыцыяў. Сябрамі партыяў зьяўляецца 1,1%, але 19% гатовы «ўдзельнічаць у дзейнасьці партыі, якая выражае інтарэсы такіх людзей, як я». Выснова аб патэнцыяле? Але патэнцыял трэба выкарыстоўваць, а на сёньня палітычныя партыі «не выражаюць інтарэсы такіх людзей, як я».

Разьвязаньне праблемаў, што стаяць перад сям'ёй, залежыць не ад самога чалавека (29,6%), а, хутчэй, ад беларускіх уладаў (71,4%). Гэта і ёсьць пасіўнасьць.

Пры гэтым паказальна, што «за гады кіраўніцтва краінай прэзыдэнта А. Лукашэнкі палажэньне адных людзей у Беларусі палепшылася, іншых, наадварот, пагоршылася, а трэціх не зьмянілася», пагоршылася палажэньне толькі апазыцыйных палітыкаў; журналістаў і «такіх людзей, як я», не зьмянілася», астатніх жа толькі палепшылася.

Працягваць можна і далей. Калі ўзьнікне неабходнасьць, я гатовы працягнуць. Але адзначу, на мой погляд, мэта падобных інтэрпрэтацыяў палягае ў агітацыі і павышэньні маральнага духу. Калі скарыстацца вайсковай мэтафарай, то для военачальніка маральны дух войскаў, канечне, важны, але яшчэ больш важная сучасная інфармацыя аб рэальнай дыспазыцыі на полі бою.

Фабрыкі думкі ператварыліся ў фабрыкі мрояў.

МІТАЛЁГІЯ ПОЛУ

Яшчэ адным эфэктам, вырабленым сацыялягічным дасьледаваньнем, які выходзіць далёка па-за межы пазнавальнай функцыі сацыялёгіі, стала вытворчасьць мітаў. Адным зь іх ёсьць шырока распаўсюджаная думка аб тым, што «жанчыны галасуюць за Лукашэнку». Не кранаючы дэталяў ягонага функцыянаваньня, адзначу, што на сёньня гэты міт тэарэтычна легітымізаваны прадстаўнікамі/прадстаўніцамі гендэрных дасьледаваньняў:

«НН»: Статыстыка сьведчыць, што жанчыны – электарат Лукашэнкі… Яны яго падтрымліваюць.

А. У.:

Апазыцыя нават не прыклала высілкаў, каб разабрацца, чаму жанчыны і пэнсіянэры галасуюць так, а не інакш, і як можна гэтую сытуацыю пераламіць… Чаму жанчыны галасуюць за Лукашэнку? Яны галасуюць ня столькі за яго, колькі за ідэю сацыяльнай дзяржавы і за ўласную стабільнасьць і спакой. Яны галасуюць за сукупнасьць прынцыпаў, якія гэты рэжым уголас абвяшчае[25].

Паводле статыстыкі, жанчыны ставяцца да А. Лукашэнкі лепш за мужчынаў і складаюць большасьць яго выбарцаў. Паводле апытаньняў НІСЭПД канца 1990-х, сярод прыхільнікаў прэзыдэнта жанчыны складалі 58,3%, а мужчыны – 41,7%, паводле зьвестак агенцыі БелаПАН, падчас выбарчай кампаніі 2001 г. 63% жанчын былі гатовыя прагаласаваць за А. Лукашэнку. Некалькі адсоткаў агульнай тэндэнцыі не мяняюць: яна відавочная і ў шырокіх публічных колах прынятая за адзін з фактаў беларускага жыцьця[26].

Зразумела, што «за» галасуюць ня толькі жанчыны. Зразумела, што існуе статыстычна значэнная сувязь паміж галасаваньнем і полам.

Але гэтай сувязі ня варта надаваць значэньня – на вялікіх выбарках, якія выкарыстоўвае сацыялёгія, практычна любыя //

[25] Усі лепш А. Мужчыны // Наша Ніва. 2005. № 25.

[26] Гаўмен А. Шчаўленне «бацька» і яго бацькоўскі клопат //

паказнікі, асабліва зь невялікай колькасьцю градацыяў, зьяўляюцца ўзаемазьвязанымі. Істотна іншае – сацыяльныя рэальнасьць не вычэрпваецца толькі прыхільнікамі праціўнікамі, мужчынамі і жанчынамі. Узаемадзеяньне гэтых паказнікаў апасродкуецца мноствам іншых. У статыстыцы ўжо сталі хрэстаматыйнымі выпадкі, калі, прыкладам, робіцца адкрыцьцё, што чым больш пажарных тушыць пажар, тым большыя ад яго страты. А насамрэч гэтая строгая матэматычная залежнасьць апасродкавана маштабам пажару, чым большы пажар, тым болей пажарных павінна яго тушыць і тым большая шкода.

Праблема ў тым, што ў такой лёгіцы становіцца заканамерным рашэньне ў мэтах скарачэньня шкоды накіроўваць на тушэньня пажару нязначную колькасьць людзей.

У гэтым сэнсе выпадак полу – ня вынятак. Ягоны ўплыў на галасаваньне ажыцьцяўляецца апасродкавана. Давесьці гэта можна, выкарыстоўваючы больш складаныя мадэлі, якія ўлічваюць шматвымернасьць сацыяльнай рэальнасьці. Напрыклад, пры дапамозе мэтаду дыскрымінантнага аналізу.

Ён прызначаны для вырашэньня дзьвюх клясаў задачаў. Па-першае, ён дазваляе на падставе наяўных дадзеных клясыфікаваць рэспандэнтаў, для якіх зь нейкіх прычынаў невядомая прыналежнасьць для групы. Напрыклад, як у выпадку з галасаваньнем аднесьці да прыхільнікаў ці праціўнікаў тых, хто адмовіўся галасаваць ці ня вызначыўся? Па-другое, вызначыць пераменныя, кожная зь якіх аказвае максымальны і самастойны ўплыў на адрозьненьне, якім мы зацікавіліся.

Мэтад выстаўляе вельмі высокія патрабаваньні да дадзеных, тэарэтычнага абгрунтаваньня мадэлі і кваліфікацыі сацыёляга. Таму, відаць, ён вельмі рэдка выкарыстоўваецца.

У нашым выпадку задача крыху спрашчаецца і зводзіцца да таго, ці трапіць пераменная пола ў лік незалежных пераменных, што маюць найбольшую адрозьнівальную ўласьцівасьць. На падставе дасьледаваньня, праведзенага Інстытутам сацыялёгіі НАН Беларусі ў траўні–чэрвені 2005 г.[27],

можна пабудаваць простую дыскрымінантную мадэль. У якасьці залежнай пераменнай выступіць «давер прэзыдэнту» з градацыямі «давяраю», «ня вызначыўся», «не давяраю»; у якасьці незалежных (дыскрымінантных) – пол, узрост (колькасьць поўных гадоў), для чысьціні экспэрымэнту – рэгіён (абласныя цэнтры, іншыя гарады, сельскія мясьціны), і асноўная крыніца інфармацыі пра жыцьцё ў нашай краіне (тэлебачаньне, радыё, газэты і часопісы, Інтэрнэт, сябры і сваякі, афіцыйнае інфармаваньне на працы)[28].

У выніку былі адабраныя пераменныя: рэгіён, узрост, адукацыя і дзьве альтэрнатыўныя крыніцы інфармацыі – Інтэрнэт і тэлебачаньне. Гэтыя пераменныя сапраўды ўплываюць на давер і зьмяншаюць уплыў астатніх пераменных, што не ўваходзяць у мадэль. А гэта пол, месца жыхарства, радыё, газэты і часопісы, сябры і сваякі і афіцыйнае інфармаваньне на працы.

Тэарэтычная інтэрпрэтацыя атрыманай мадэлі можа быць наступная. Найбольш важным фактарам зьяўляецца наяўнасьць адукацыйнага капіталу, які дазваляе, па-першае, крытычна

[28] Уплыў пераменнай інфармацыя пра дзяржаўныя дакументы ацэньваўся ў 1998 г. Тады ў Беларусі гэтыя крыніцы разьмеркаваныя нераўнамерна, і чым большы населены пункт, тым болей гэтых крыніцаў. У сельскай мясцовасьці дамінуе тэлебачаньне з абмежаванай колькасьцю праўрадавых каналаў. Адсутнасьць у мадэлі пераменнай месца жыхарства можна лёгка вытлумачыць, бо пераменная рэгіён улучае яе ў сябе і мае болей градацыяў, а значыць і большую адрозьнівальную здольнасьць. Зь іншага боку, адукацыя зьвязаная з узростам, паколькі людзі старэйшага пакаленьня мелі меней магчымасьцяў для яе атрыманьня.

Пераменная пол аказваецца незначэннай, паколькі дзеля натуральных дэмаграфічных працэсаў працягласьць жыцьця сярод жанчын большая, чым у мужчын; і сярод людзей сталага веку жанчыны пераважаюць.

Варта адзначыць, што пабудаваная мадэль не прызначалася для вычарпальнага апісаньня рэчаіснасьці, але толькі для праверкі гіпотэзы. Каэфіцыенты кананічных дыскрымінантных функцыяў, якія дазваляюць ацаніць якасьць мадэлі, то бок

[27] Адукацыя ... 1958 ... ўваходзіць ... рэпрэзэнтацыйнасць ... склала менш за 0,05.

ступень яе адпаведнасьці рэчаіснасьці, аказваюцца нізкія – 0,35 і 0,13. Такім жа невысокім зьяўляецца адсотак правільнасьці паўторнай клясыфікацыі, які складае 58%. Гэта значыць, што для разьвязаньня задачы апісаньня ў мадэль павінны быць улучаныя і іншыя, няўлічаныя фактары, абгрунтаваньне якіх зьяўляецца тэарэтычнай праблемай.

У той жа час, прадбачачы магчымыя пярэчаньні, я сьцьвярджаю: у выпадку з полам мае месца ня разавы ўсплеск, а працяглая тэндэнцыя, зафіксаваная ў матэрыялах розных дасьледаваньняў.

Гэтую тэндэнцыю можна праверыць.

Калі ўмець.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 5 (39) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/01/25**
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (39) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image]

[image]2005

[image] [image] [image]

аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Юры Чавусаў Рэвалюцыя і антырэвалюцыя: бэкграўнд антырэвалюцыйнага дзеяньня

ЮРЫ ЧАВУСАЎ

палітоляг, юрыст. Нарадзіўся ў 1978 годзе ў Менску. Сябра рэдакцыйнай рады часопісу «Палітычная сфера». Ягоная апошняя публікацыя ў «ARCHE» – артыкул «Вайна для народу» (2/2005).

---

30 чэрвеня – 1 ліпеня ў Маскве адбылося мерапрыемства, выключна важнае для разуменьня палітычных працэсаў, якія адбываюцца цяпер і будуць адбывацца ў бліжэйшыя гады ў нашай частцы сьвету. Першы Міжнародны форум «Эўропа: вынікі году переменаў» (або, як яго называлі самі арганізатары, Эўрапейскі форум) дэкляраваў сваёй задачай «падтрымку і разьвіцьцё дэмакратычных асноваў расейскай палітыкі, спрыяньне разьвіцьцю дэмакратыі ў краінах постсавецкай прасторы». Але пераважная частка дыскусіяў на форуме была прысьвечаная падсумаваньню палітычных вынікаў украінскай Памаранчавай рэвалюцыі і іншых каляровых рэвалюцыяў, асэнсаваньню наступстваў гэтых працэсаў для самой Расеі і прарасейскіх сілаў на постсавецкай прасторы. Маскоўскі форум прадэманстраваў інтэлектуальны ўзровень палітычных сілаў, што аб’ядналіся супраць дэмакратычнага разьвіцьця на постсавецкай прасторы. Таксама ён засьведчыў той факт, што пасьля балючай паразы старых прарасейскіх праектаў у шэрагу краінаў-суседак для расейскай улады постсавецкае навакольле зноў прызнанае аб’ектам, вартым пільнага дасьледаваньня.

Натуральна, гэткі калектыўны аналіз ня мог мець выключна рэтраспэктыўную скіраванасьць, ён непазьбежна ўключаў у сябе ацэнку пэрспэктываў разьвіцьця рэвалюцыйнай хвалі і быў скіраваны на сынтэз новых палітычных стратэгіяў. У праекцыі на будучыню пераважная большасьць удзельнікаў форуму задавалася пытаньнем «Як не дапусьціць працягу рэвалюцыйнай хвалі?». Яны спрабавалі даць на яго практычны адказ зыходзячы з уласнага бачаньня становішча, з уласных палітычных зацікаўленасьцяў і наяўных рэсурсаў. Кожны казаў пра сваё, пра набалелае. У гэтыя адказы (што гучалі з украінскім, беларускім, цэнтральнаазіяцкім і нават прыбалтыйскім акцэнтам) прагна ўслухоўваліся арганізатары форуму, якія не хавалі сваёй набліжанасьці да кіроўнай у Расеі адміністрацыі, – чыноўнікі, палітыкі, паліттэхнолягі і аналітыкі. Няма сумневаў, што выкладзеныя на канфэрэнцыі меркаваньні стануць матэрыялам для аналізу, які будзе ляжаць у аснове будучых палітычных рашэньняў па палітыцы Расеі ў дачыненьні да сваіх бліжэйшых суседзяў.

Адметнасьцю Эўрапейскага форуму стала ягоная геаграфічная прадстаўнічасьць. Прысутнічалі ўдзельнікі з Расеі, СНД, Балтыі, Сэрбіі. Арганізатары не баяліся пачуць рэзкія выказваньні: на форуме гучалі і прыватныя, і прадузятыя меркаваньні і нават асабістыя крыўды на расейскую палітыку. У суме яны давалі каштоўны матэрыял для аб'ектыўнага аналізу сытуацыі ў поставецкай прасторы.

Натхняльнікам мерапрыемства быў кіраўнік Фонду эфэктыўнай палітыкі Глеб Паўлоўскі. Расею на форуме прадстаўлялі прэзыдэнт Фонду «Палітыка» Вячаслаў Ніканаў, дырэктар Інстытуту палітычных дасьледаваньняў Сяргей Маркаў, старшыня грамадзкае Рады замежнай і абароннай палітыкі Сяргей Караганаў, рэдактар часопісу «Политический класс» Віталь Трацьцякоў, палітаглядальнік Канстанцін Крылоў, доктар палітычных навук Ігар Панарын, дырэктар Інстытуту краінаў СНД Канстанцін Затулін, начальнік упраўленьня Адміністрацыі прэзыдэнта Расеі, адказны за сувязі з СНД, Мадэст Колераў, намесьнік старшыні Рады Фэдэрацыі Аляксандар Трошын і інш.

Сярод запрошаных ста пяцідзесяці палітыкаў і экспэртаў былі менавіта тыя людзі, якія маглі прапанаваць альтэрнатыву палітыцы, што ў апошнія гады ажыццяўлялася расейскім кіраўніцтвам на постсавецкай прасторы і якая, па меркаваньні замоўцаў Эўрапейскага форуму, і прывяла да нездавальняючага выніку ў выглядзе падзеньня шэрагу рэжымаў у былых савецкіх рэспубліках. Але адначасова форум стаў своеасаблівым кастынгам патэнцыйных антырэвалюцыйных сілаў з усёй постсавецкай прасторы. Функцыя ўдасканаленьня і узгадненьня антырэвалюцыйнай ідэалёгіі, відавочна, закладалася ў місію гэтага сымпозіюму разам з пошукам тых, хто будзе рэалізоўваць гэтую ідэалёгію на практыцы.

Пасьлярэвалюцыйная Ўкраіна была прадстаўленая асобамі, пераважна скептычна настроенымі ў дачыненьні да пасьлярэвалюцыйнага рэжыму, – лідэрам партыі «Братэрства» Зьмітром Карчынскім, лідэрамі партыі «Працоўная Ўкраіна» Валер'ем Канавалюком і Ўладзімерам Сіўковічам, старшынём руху «Спадкаемцы Багдана Хмяльніцкага» Леанідам Грачом.

З Казахстану прыбыў лідэр Дэмакратычнай партыі «Ак Жол» Аліхан Баймэнаў. З Латвіі – старшыня Партыі народнай згоды Яніс Урбановіч і старшыня Эўрапейскага камітэту сойму, адзін з самых уплывовых палітыкаў Оскарс Кастэнс. З Эстоніі – намесьнік старшыні Народнай партыі Анатоль Ягораў. З Азэрбайджану – загадчыца аддзелу гуманітарнай палітыкі Адміністрацыі прэзыдэнта Фаціма Абдула-задэ. З Арменіі – віцэ-прэзыдэнт Асацыяцыі па сувязях з грамадзкасьцю Армэн Сагаталян. Кыргызстан, апошняя на сёньня пасьпяховая кропка ў рэвалюцыйным ланцугу, быў прадстаўлены стракатай дэлегацыяй. Тут быў зрынуты ў выніку рэвалюцыйнага паўстаньня экс-прэзыдэнт Аскар Акаеў, прадстаўнік Эўрапейскага клюбу Аляксандар Каратэнка, віцэ-сьпікер парлямэнту Эркінбэк Алымбэкаў і шэраг іншых палітыкаў. З Малдовы, дзе рэвалюцыйную хвалю спрабавалі асядлаць і прарасейскія, і антырасейскія сілы, прыехаў лідэр апазыцыйнай парлямэнцкай фракцыі альянсу «Наша Малдова» Сэрафім Урэкян, прадстаўнік прарасейскіх сілаў на мінулых парлямэнцкіх выбарах. Кампанія Ўрэкяна была першай спробай скарыстацца тэхналёгіяй Памаранчавай рэвалюцыі, каб

паставіць на чале краіны прарасейскага лідэра.

Такім чынам, удзельнікаў форуму можна падзяліць на дзьве катэгорыі: з тых краінаў, якія ўжо перажылі рэвалюцыйны крызіс з рознымі наступствамі, і зь мясьцінаў, дзе гэткі крызіс толькі сасьпявае. Да апошняй групы, відавочна, адносяцца Расея, Казахстан і, перадусім, Беларусь. Менавіта ў гэтых краінах будуць «абкатвацца» новыя антырэвалюцыйныя мэтодыкі.

Нашу краіну на форуме рэпрэзэнтавалі прэтэндэнты на ролю дэмакратычнага апанэнта дзейнае ўлады на выбарах 2006 г.: экс-рэктар БДУ, новы лідэр сацыял-дэмакратычнай партыі, прафэсар Аляксандар Казулін, акадэмік Аляксандар Вайтовіч і лідэр Рады інтэлігенцыі Ўладзімер Колас. Таксама ў форуме бралі ўдзел рэктар Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту ў выгнаньні прафэсар Анатоль Міхайлаў і лідэр Лібэрал-дэмакратычнай партыі дэпутат Сяргей Гайдукевіч. Беларускі аналітычны корпус прэзэнтавалі публіцыст Андрэй Суздальцаў і дырэктар Цэнтру праблемаў эўрапейскай інтэграцыі ЭГУ Юры Шаўцоў. Згодна з чуткамі, у пачатковым сьпісе запрошаных быццам бы быў і Вікітар Шэйман – ягонае запрашэньне разам з апазыцыйнымі дзеячамі, аддаленымі ад фармалізаванай нацыянальнай апазыцыі, упісвалася ў канцэпцыю Эўрапейскага форуму, – аднак ён цалкам прадказальна не прысутнічаў на маскоўскім мерапрыемстве.

Пазьней Андрэй Суздальцаў у «Свободных новостях» у дачыненьні да гэтага сходу ўжыў выраз «расейскі гуманітарны Давос» – і з гэтым азначэньнем часткова варта пагадзіцца. Сапраўды, па ўзроўні інтэлектуальнага прадстаўніцтва сустрэча ня мела сабе роўных. Нават акадэмічныя званьні беларускіх удзельнікаў сьведчаць пра слушнасьць гэтай ацэнкі. Удзел шматлікіх экспэртаў і аналітыкаў з постсавецкай прасторы мусіў надаць мерапрыемству характар набліжанай да практыкі дыскусіі зацікаўленых экспэртаў, пазбавіць яго адценьня простай палітычнай сваркі і пазьбегнуць высьвятленьня, «хто вінаваты» ў правале расейскай палітыкі на постсавецкай прасторы. Але гэты «Давос» менавіта «расейскі». Ён адлюстроўваў, перш за ўсё, наяўныя рэальна і патэнцыйна

прарасейскія сілы ў краінах былога СССР з прыцягненьнем пэрсонаў, чыя дзейнасьць аб'ектыўна выгадная гэтым сілам або можа быць скарыстаная імі. Напрыклад, у Беларусі ўвагу Паўлоўскага прыцягнулі тыя, хто не супрацоўнічае з аб'яднанай дэмакратычнай апазыцыяй і прэзэнтуе ўласныя палітычныя праекты.

Паказальныя назвы насілі круглыя сталы й пленарныя пасяджэньні падчас Эўрапейскага форуму. Яны адлюстроўваюць сфэры ўвагі расейскіх антырэвалюцыянэраў унутры Расеі і на постсавецкай прасторы. Пленарнае пасяджэньне «Легітымнасьць, дэмакратыя і сувэрэнітэт на постсавецкай прасторы» мусіла задаць агульны настрой дыскусіяў, пазначыць праблемнае поле форуму, асэнсаваць ролю негвалтоўных рэвалюцыйных пераўтварэньняў, «імпартаванай» і эндагеннай дэмакратызацыі. Круглы стол «Эўразьвяз на Ўсходзе Эўропы» быў прысьвечаны абмеркаваньню ролі вонкавых, нерасейскіх гульцоў у рэгіянальнай палітыцы, у рэвалюцыйных працэсах, што адбыліся ці яшчэ адбудуцца. Удзельнікі панэляў «Дыялёг і палітычныя рэформы ў Цэнтральнай Азіі» і «Малдаўска-Прыднястроўскі вузел у кантэксьце праблемаў Чарнаморскага рэгіёну» аналізавалі спэцыфіку лякальных рэвалюцыйных выклікаў і задачы расейскай палітыкі ў гэтых рэгіёнах. Асобны круглы стол быў прысьвечаны каштоўнасьцям моладзі і моладзевай палітыцы – той праблеме, якая лічыцца ключавой у тэхналёгіі негвалтоўных зьменаў палітычных рэжымаў. Тэксты дакладаў, што гучалі на форуме, і іх абмеркаваньне – каштоўны матэрыял для дасьледнікаў сёньняшніх палітычных працэсаў і тых, хто займаецца прагнозамі грамадзкага разьвіцьця. Выкладзеныя падчас форуму меркаваньні безумоўна знойдуць сваё адлюстраваньне ў рэальных палітычных стратэгіях.

Выступоўцы (у тым ліку і тыя нешматлікія зь іх, хто з доляй сымпатыі ставіўся да каляровых рэвалюцыяў і з разуменьнем – да іх перадумоваў) альбо ведалі прычыны тых рэвалюцыяў, альбо ведалі, якія чыньнікі могуць перашкодзіць паўтарэньню падобнага разьвіцьця падзеяў. А вось саміх памаранчавых рэвалюцыянэраў не было на форуме – не запрасілі.

Нягледзячы на тое, што Беларусь не была зафіксаваная як асобны аб'ект аналізу, беларуская спэцыфіка і пэрспэктывы разьвіцьця нашай краіны займалі важнае месца падчас усіх дыскусіяў.

Выніковае пасяджэньне і брыфінг для прэсы павінны былі падвесьці «рэалістычныя вынікі «году рэвалюцыяў» і пэрспэктывы разьвіцьця Эўраўсходу ў наступным палітычным сэзоне». У гэтым парадку дня катэгорыя «Эўраўсход» павінна тлумачыцца не як геаграфічны тэрмін, а як эўфэмізм для вызначэньня таго, што ў больш празрыстых канцэпцыях расейскіх геапалітыкаў называецца сфэрай уплыву Расеі як рэгіянальнага лідэра, прасторай для пабудовы нэакаляніяльнай «лібэральнай імпэрыі» альбо нават *Lebensraum* расейскай дзяржавы.

1. АНТЫРЭВАЛЮЦЫЙНАЯ АНТАНТА

Ідэалягічна амаль усіх небеларускіх удзельнікаў форуму і, дакладна, усіх яго арганізатараў яднала тое, што ўсе яны – *антырэвалюцыянэры* (альбо контрарэвалюцыянэры – там, дзе адбылася рэвалюцыя). Нягледзячы на часам супрацьлеглыя сьветапогляды, іх яднае нэгатыўнае стаўленьне да актуальных негвалтоўных рэвалюцыяў як да сацыяльнай зьявы. Яны салідарныя ў імкненьні не дапусьціць працягу той нізкі народных паўстаньняў, якая пачалася ў Югаславіі ў 2000-м, была падхопленая грузінамі ў 2003-м, дасягнула фэнамэнальнага посьпеху ва Ўкраіне ды вылілася ў двухсэнсоўныя забурэньні ў цэнтральнаазіяцкім Кыргызстане. Гэтая палітычная плынь апраўдвае рэпрэсіі супраць праваабаронцаў ва Ўзбэкістане, прызнае неабходнасьцю існаваньне антынародных дыктатураў, дэманструе прыхільнасьць да маніпуляцыйных тэхналёгіяў ва ўнутранай палітыцы. Аднак пад гэтую змрочную і ня новую палітычную канцэпцыю падводзіцца новы ідэалягічны падмурак: інтэлектуальны антырэвалюцыянізм.

Беларускі бок можна аб'яднаць іншым выслоўем: усе беларускія ўдзельнікі – *нерэвалюцыянэры*. Мы далёкія ад думкі,

што Казулін, Вайтовіч альбо Колас бачаць магчымасьць эвалюцыйнай зьмены рэжыму, аднак яны не інтэграваныя пакуль у нацыянальны рэвалюцыйны праект. Яны бачаць іншы, «уласны» варыянт разьвіцьця падзеяў у краіне і ў гэтым сэнсе былі цікавыя арганізатарам форуму. Зь Беларусі ў Маскву быў завезены кірмаш палітычных праектаў, якія могуць быць альтэрнатывай надыходзячай беларускай рэвалюцыі.

Беларускія ж антырэвалюцыянэры на чале зь дзейным прэзыдэнтам маюць іншыя каналы для шчыльных кантактаў з сваімі расейскімі калегамі і ня маюць патрэбы ў дадатковых сустрэчах. Іншая справа, што інтарэсы беларускага і расейскага антырэвалюцыянізмаў не заўжды супадаюць і патрабуюць дадатковага – негалоснага – узгадненьня. Калі водгалас гэтых узгадненьняў трапляе ў грамадзтва, узьнікаюць скандалы, накшталт таго, што адбыўся вакол патэнцыйнага пасла Аяцкава. Аднак пры ўсім пры тым расейскія антырэвалюцыянэры выдатна ладзяць зь беларускімі калегамі. Яны змагаюцца на два франты: супраць пагрозы рэвалюцыі ўнутры Расеі і супраць распаўсюджаньня «памаранчавай заразы» ў краінах СНД. Параза на ўкраінскім участку фронту балюча адбілася на пазыцыях рэакцыйных сілаў унутры Расеі. Трапна ўлавіў гэтую залежнасьць беларускі прэзыдэнт на нарадзе па пытаньнях унутранай і замежнай палітыкі: «Рэвалюцыя ў Беларусі – гэта рэвалюцыя ў Маскве». Сказана зь яўным разьлікам на замежную аўдыторыю: слухай, Крэмль! Гэта трохі разыходзіцца з гістэрычнымі выказваньнямі, адрасаванымі ўнутранай аўдыторыі: «Тут няма базы для рэвалюцыі», «Мы ведаем, што рабіць у выпадку інтэрвэнцыі» і г. д. Пераконваючы электарат і намэнклятуру ў немагчымасьці рэвалюцыйнага разьвіцьця падзеяў, Лукашэнка спрабуе шантажаваць Маскву пагрозай рэвалюцыі і… зацікаўлены прадаць свае антырэвалюцыйныя ноў-гаў на Ўсход. Правіцель выдатна разумее, што цяпер ягоны галоўны рэсурс – гэта ня проста жорсткая і бязьлітасная расправа з крыніцамі грамадзкай незадаволенасьці, а менавіта імідж уладара, які здольны на гэткую расправу, які ня спыніцца ні перад чым дзеля захаваньня неабмежаванай улады. Менавіта гэткі імідж дапамог бы прыцягнуць для сваёй падтрымкі і іншыя рэсурсы і пасьпяхова захаваць уладу. Па магчымасьці, бяскроўна.

Выкарыстоўваючы тэрмін «антырэвалюцыянэры», я кіруюся простай лёгікай. Там, дзе адбылася рэвалюцыя, мае месца контрарэвалюцыя як нэгатыўная рэакцыя на тое, што адбываецца альбо ўжо адбылося. Калі ж мы гаворым пра імкненьне не дапусьціць рэвалюцыі альбо паставіць яе пад кантроль, пра імкненьне ўрэгуляваць насьпелую рэвалюцыйную сытуацыю нерэвалюцыйным шляхам, арганізаваць «прыручаную» рэвалюцыю, бясьпечны квазірэвалюцыйны праект – такую ідэалягічную плынь я называю антырэвалюцыянізмам[1]. Ён уяўляе сабой сур'ёзную зьяву, за якой стаіць грунтоўны інтэлектуальны рэсурс, пэўная традыцыя і салідны корпус тэкстаў. Як ідэалягічная плынь антырэвалюцыянізм заслугоўвае пільнай увагі дасьледніка рэвалюцыйных працэсаў. У зьвязку з гэтым скажам колькі словаў пра агульныя прынцыпы ідэалягічнага разьвіцьця, зьвязанага з рэвалюцыйнымі пераўтварэньнямі.

2. РЭВАЛЮЦЫЯ І ДЫНАМІКА ІДЭЯЎ

Часам вялікія сацыяльныя ўзрушэньні, якія прыводзяць да палярызацыі грамадзтва, вядуць да парадаксальнага выніку ў ідэалягічнай сфэры. Той бок, які перамог у ходзе рэвалюцыйнай барацьбы, ня ў стане выкласьці аніякага цікавага мысьленьня, ня ў стане вырабіць новыя ідэалягічныя канцэпцыі – яго ідэалягічная і, шырэй, інтэлектуальная творчасьць як быццам бы прыпыняецца. Пераможную ідэалёгію не мяняюць, нават калі наступныя дзеяньні пераможцаў не адпавядаюць іх ранейшым ідэалягічным устаноўкам – зручней прыстасаваць пераможнае вучэньне пад будзённыя патрэбы, чым прыдумляць нешта новае. У стане пераможцаў дамінуе меркаваньне, што ўсё было сказана клясыкамі, гэтымі геніяльнымі тэарэтыкамі і непераўзыдзенымі практыкамі. Да таго ж, самі рэвалюцыянэры занадта занятыя практычным пераразьмеркаваньнем здабытага ў ходзе рэвалюцыі, будуюць новую дзяржаву і сварацца паміж сабой, займаюцца рэалізацыяй папярэдне распрацаваных канцэпцыяў, напрацаваных яшчэ да «часу Х». На выпрацоўку новых ідэяў папросту шкада марнаваць час, і ў асяродзьдзі новай кіраўнічай эліты не адбываецца канкурэнцыі стратэгіяў, а мае

[1] Сучаснаму расейскаму *антырэвалюцыянізм* прысьвечаны, напрыклад, адмысловы сайт «Антиреволюционер», які нарадзіўся з аднайменнага артыкулу расейскага публіцыста Віталя Іванова.

месца толькі барацьба тактык. Натуральна, дарэвалюцыйныя канцэпцыі часьцяком малапрыдатныя для пабудовы дзяржавы ў пасьлярэвалюцыйны пэрыяд, аднак да іх карэннай зьмены рукі не даходзяць, справа абмяжоўваецца іх нязначнай карэкціроўкай і прыстасаваньнем пад патрэбы практыкі. Новае тэарэтызаваньне і выпрацоўка іншых тэорыяў нават у межах пераможнай парадыгмы адбываецца зрэдку. Часам гэткая кансэрвацыя перадрэвалюцыйнай ідэалягічнай парадыгмы ў новапабудаванага рэжыму прыводзіць да сьмешных практык: у 1970-х забранзавелыя партыйныя бонзы на трыбуне Маўзалею ідэнтыфікавалі сябе правадырамі працоўных масаў рабочых і сялянаў ва ўсім сьвеце; дый цяпер гімн рафінаванай Пятай Рэспублікі ў Францыі ў вуснах ейнага прэзыдэнта гучыць іранічна. Які сэнс спадар Шырак можа ўкладаць у радкі «Да зброі, грамадзяне! Стварайце батальёны!»?

Наадварот, бок, які пацярпеў паразу і быў зрынуты ў выніку рэвалюцыйных пераўтварэньняў, робіцца актыўным вытворцам сацыяльнай думкі і новых ідэалягічных тэорыяў. Адбываецца выбух крэатыўнага мысьленьня. Так бы мовіць, важнасьць абгрунтаваньня перамогі меншая за важнасьць асэнсаваньня вынікаў паразы. Натуральна, што сярод накірункаў гэткага асэнсаваньня дамінуе палітычны: высьвятленьне прычынаў перажытага крызісу, выяўленьне вытокаў рэвалюцыйнай сытуацыі і абмеркаваньне зробленых уладамі памылак, вызначэньне сутнасьці сацыяльных пераўтварэньняў і наступстваў зьмены элітных груповак, а таксама разнастайныя ваенна-палітычныя, геастратэгічныя і псыхалягічныя інтэрпрэтацыі. Відавочна, што перад пераможаным лягерам стаяць складанейшыя і інтэлектуальна значна больш прыцягальныя задачы, чым перад новай уладай. Праблемнае поле, якое ляжыць перад уладамі, прыцягвае схільных да канфармізму і нясхільных да творчага падыходу тэарэтыкаў – там няма складаных сьветапоглядных альбо тэарэтычных праблемаў, а ёсьць толькі руцінная і арыентаваная на практыку будзённасьць. Лягер пераможцаў прыцягвае людзей больш практычнага і прадпрымальнага складу характару, ня схільных да абстрактнай рэфлексіі. А ў інтэлектуальным асяродзьдзі пераможаных утвараецца гэткі крытычны інтэлектуальны булён, які, урэшце, пераўтвараецца з контрарэвалюцыйных

енкаў у праграму альтэрнатыўнага разьвіцьця. Калі новыя ідэалягічныя канцэпцыі сапраўды дзейсныя, неўзабаве можа адбыцца «помста пераможаных», і ўжо новае пакаленьне інтэлектуалаў робіцца ідэалягічнымі правадырамі новай рэвалюцыі. Такі колазварот ідэалягічных праграмаў ёсьць чыньнікам сацыяльнага прагрэсу альбо стварае яго бачнасьць. Ён штурхае грамадзтва да разьвіцьця, ці, прынамсі, забясьпечвае ў ім разьвіцьцё сацыяльных тэорыяў.

Калі зрынуты падчас рэвалюцыі рэжым меў жорсткі аўтарытарны характар і ўціскаў акадэмічную і інтэлектуальную супольнасьць (гаворка ня толькі пра рэпрэсіі й забароны, а аб простым інстынкце самазахаваньня ідэалёгіі), вызваленьне ад прыгнёту ўплывае на інтэлектуалаў былога прыўладнага боку, схільных да рэакцыі, удвая пазытыўна. Хібы старой ідэалягічнай праграмы для іх ужо відавочныя, бо яны былі выяўленыя падчас рэвалюцыйнага сутыкненьня ў рэальным жыцьці. І таму відавочная неабходнасьць працы над памылкамі. Вызваленыя ад адміністрацыйнага ціску і абавязку забясьпечваць бясспрэчную ідэалягічную падтрымку ўладаў, носьбіты старой ідэалягічнай праграмы вымушана актывізуюць сваю творчую дзейнасьць. У якасьці прыкладу можна назваць выбух манархічнага і кансэрватыўнага мысьленьня адразу пасьля 1905 г. і яшчэ большы пасьля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. у Расеі і надалей у эміграцыі.

Іншы суб'ектыўны чыньнік – крытычныя інтэлектуалы, больш схільныя ісьці насуперак пазыцыям істэблішмэнту, нават новапаўсталага істэблішмэнту, што яшчэ толькі фармуецца і заваёўвае свае пазыцыі. Яны схільныя выступаць супраць дамінуючай масы – на тое ж яны і крытычныя інтэлектуалы. Падчас паўстаньня масаў ня трэба доўга шукаць Артэга-і-Гасэта, які б усе свае інтэлектуальныя намаганьні прысьвяціў разьвянчаньню гэтых масаў і давядзеньню няслушнасьці іхных сьветапоглядных прынцыпаў.

Прыкладамі гэткага кшталту дынамікі ідэяў поўніцца гісторыя. Мы ўжо адзначалі варты жалю лёс тэарэтычнага марксізму пасьля перамогі сацыялістычнай рэвалюцыі – савецкі марксізм і навуковы камунізм назаўжды застанецца помнікам

бязглуздасьці, на якую здольнае чалавечае мысьленьне, які тым больш кантрастуе з росквітам інтэлектуальнай творчасьці і разнастайнасьці ў заходняй цывілізацыі. Значная частка інтэлектуальных высілкаў заходніх мысьляроў была скіраваная на палеміку з марксізмам, яны імкнуліся сфармуляваць прывабную альтэрнатыву камуністычнаму «раю» – і, у нейкім сэнсе, дасягнулі посьпеху.

Нацыянал-сацыялісты пасьля прыходу да ўлады ў Нямеччыне фактычна адракліся інтэлектуальнага асяродку, у якім нараджалася іх ідэалёгія і міталёгія: адбылася вульгарызацыя ідэяў Таварыства Туле і Карла Гаўсгофэра. Была абмежаваная, а пазьней і забароненая дзейнасьць *Germanenorden*, барон Зэботэндорф быў вымушаны пакінуць краіну, дый увогуле, уся ідэалёгія расізму і нацыянал-сацыялізму ў сутыкненьні з рэальным жыцьцём прадэманстравала сваю нікчэмнасьць. Нацысты ўвесь час адзначалі практычную скіраванасьць сваёй ірацыянальнай палітыкі («мысьліць канкрэтна, не займацца голым тэарэтызаваньнем, працаваць»), шукалі рацыянальнае вырашэньне ірацыянальных праблемаў і тым самым падсеклі ўласныя інтэлектуальныя карані.

У той самы час у лібэральным лягеры адбывалася актыўнае пераасэнсаваньне базавых канцэпцыяў лібэралізму і ствараліся канцэптуальныя творы, як «Шлях да рабства» Фрыдрыха фон Гаека альбо «Адкрытае грамадзтва» Карла Попэра – палымяная палеміка з усімі разнавіднасьцямі таталітарнай тэорыі – фашызмам, нацыянал-сацыялізмам і камунізмам. У сваю чаргу, падчас трыюмфу лібэралізму (дакладней, яго трыюмфу ў межах заходняй цывілізацыі), у часы, калі глябалізацыя і вэстэрнізацыя ў сваіх самых радыкальных формах ахапілі сьвет – у самым яго ўлоньні аформілася інтэлектуальнае ядро новых правых. Яно аформілася сьпярша менавіта як інтэлектуальная групоўка, але зь ясным усьведамленьнем сваіх палітычных задачаў і гістарычнай місіі творцаў новай ідэалягічнай альтэрнатывы. Новыя правыя як палітычная сіла – гэта вынік уплыву і сьвядомых дзеяньняў менавіта новых правых мысьляроў, нонканфармістаў і дысыдэнтаў у межах заходняга лібэральнага ладу, якія марылі менавіта пра рэвалюцыю. «Наша тэарэтычная канструкцыя – адкрытая сыстэма, ідэі –

сродкі для дасягненьня мэты», – казалі гэтыя ідэолягі. Іхнае вучэньне набыло інтэрнацыянальны характар, дзіўным чынам спалучыўшыся з сваімі адпаведнікамі нават па-за межамі заходняй цывілізацыі.

Інтэлектуальны і ідэалягічны капітал Вялікай Французскай рэвалюцыі быў збольшага назапашаны да самой рэвалюцыі. А яе перамога выклікала фармаваньне і самаідэнтыфікацыю кансэрватыўнай плыні як у Францыі, так і за мяжой. Калі б не рэвалюцыя, ці атрымалі б кансэрватары палымяны маніфэст Жазэфа дэ Мэстра «Разважаньні пра Французскую рэвалюцыю» (1796), які пераконваў (і пераконвае) чытачоў у «сатанінскай» прыродзе рэвалюцыі ўвогуле і Французскай рэвалюцыі у прыватнасьці? Пытаньне рытарычнае – відавочна, што жахі рэвалюцыйнага рэжыму перадвызначылі самаідэнтыфікацыю кансэрватыўнай плыні французскай думкі, якая пасьля стварыла інтэлектуальную глебу для ўсталяваньня рэжыму Напалеона і пазьней Рэстаўрацыі. Паказальна, што гэткі ўплыў Французскай рэвалюцыі, мацеркі ўсіх лібэральных рэвалюцыяў, выйшаў за межы Францыі. Эдмунд Бёрк, пішучы свае «Развагі пра рэвалюцыю ў Францыі», адзін з асноўных тэкстаў клясычнага кансэрватыўнага мысьленьня, быў даволі мала дасьведчаны адносна рэальных падзеяў у тагачаснай Францыі, ягоная праца насіла выключна тэарэтычны, ідэалягічны характар. Такім чынам, рэвалюцыйныя зьмены ў адной з краінаў, дзе спачатку былі зьнішчаныя ідэалягічныя бастыёны пэўнага вучэньня, а пасьля ў ходзе рэвалюцыі адбылося і іх палітычнае зьнішчэньне, – гэтыя зьмены здольныя аказаць станоўчы ўплыў на разьвіцьцё адпаведнага накірунку мысьленьня ва ўсім рэгіёне. І гаворка, натуральна, ідзе не пра ўздым папулярнасьці пераможанай ідэалёгіі ў яе ранейшым выглядзе, а менавіта пра яе радыкальную рэвізію, разьвіцьцё і ўдасканаленьне.

Гэтая нізка «ідэйных фіяска» пераможцаў і прадуктыўнай працы пераможаных працягваецца і цяпер у нашым рэгіёне, у тым ліку і ў Беларусі. Напрыклад, творцы ідэалёгіі беларускай дзяржавы кожным сваім тэкстам пацьвярджаюць сваю няздольнасьць да вытворчасьці новых канцэпцыяў. Крэатыўная імпатэнцыя і тэарэтычнае жабрацтва пад навуковай маскай апанавалі афіцыёзнае беларускае грамадазнаўства. Ідэалягічнае крэда,

сфармуляванае ў сярэдзіне 1990-х А. Лукашэнкам, сёньня фактычна збанкрутавала. Гэта ўжо болей не жывое рэвалюцыйнае вучэньне, а мёртвае паўтарэньне штампаў, асьвечанае акадэмічнай навукай. Можна прагназаваць, што толькі пасьля посьпеху беларускай рэвалюцыі ў тэарэтычнай сфэры лукашызм нарэшце зрушыцца зь мёртвай ідэалягічнай кропкі – на карысьць гэтага прамаўляе намаляваная вышэй ідэалягічная дынаміка.

Напэўна, будзе слушнай выснова, што намаляваны працэс ёсьць абавязковай прыкметай сапраўднай рэвалюцыі, якая азначае ня проста біцьцё вітрынаў на вуліцы ці замену пэрсоны ў галоўным кабінэце краіны, а біцьцё і руйнаваньне ідэалёгіяў, замену канцэпцыяў разьвіцьця нацыянальнай супольнасьці, радыкальную перабудову грамадзка-палітычнага ладу альбо нават зьмену вэктару разьвіцьця ў межах цэлага рэгіёну ці цывілізацыі. У барацьбе супраць пануючай ідэалёгіі перамагае новая ідэалягічная парадыгма, пасьля гэткай зьмены ў тэарэтычнай сфэры адбываецца рэвалюцыя ў палітычным вымярэньні, адбываецца захоп улады носьбітамі новай філязофіі. Калі мы назіраем такое разьвіцьцё ў ідэалягічнай сфэры – гэта азначае, што мы маем справу з сапраўднай рэвалюцыяй, а не з заменай адной элітнай групоўкі на іншую ў межах аднаго грамадзка-палітычнага ладу. Рэвалюцыя толькі тады можа называцца рэвалюцыяй, калі яна прыводзіць да ўлады носьбітаў новай ідэалёгіі і адхіляе ад улады прадстаўнікоў старой ідэалягічнай дактрыны.

Існуе небясьпека, што ідэалёгія лукашызму атрымала нарэшце рэальную глебу для разьвіцьця. Як Вялікая Французская рэвалюцыя ўскосным чынам спрыяла разьвіцьцю кансэрватызму за межамі Францыі, так і трыюмф памаранчавай ідэі можа пацягнуць узмацненьне антырэвалюцыйнай дактрыны ў ідэалёгіях нашых суседзяў.

3. ЗРАЗУМЕЦЬ, КАБ ПЕРАМАГЧЫ

У выкладзеным разуменьні Памаранчавая рэвалюцыя ва Ўкраіне была сапраўднай рэвалюцыяй, бо суправаджалася

ідэалягічным пераваротам. А вось пазнейшыя падзеі ў Кыргызстане рэвалюцыяй не былі, хоць мелі вонкавае падабенства і адбываліся ў межах аднаго ланцуга так званых каляровых рэвалюцыяў на постсацыялістычнай прасторы. Каляровая рэвалюцыя як форма сацыяльнай дынамікі можа мець як сапраўды рэвалюцыйны зьмест, так і іншае напаўненьне – сама па сабе гэта ўсяго толькі форма. Як бы там ні было, каляровыя рэвалюцыі ў масавай сьвядомасьці і ў маўленьні палітычных аналітыкаў зьліліся ў адную плынь. Нягледзячы на відавочнае адрозьненьне свайго ідэалягічнага зьместу, яны ўспрымаюцца як частка адной дэмакратычнае хвалі, накшталт той, якую калісьці прадказваў Гантынгтан. Пераасэнсаваньне паразы аўтарытарных рэжымаў адбываецца як у лібэральна-дэмакратычным лягеры, так і ў кансэрватыўным ідэйным блёку.

Напярэдадні электаральнай рэвалюцыі рэвалюцыйны блёк патрабуе арганізацыйнага і ідэалягічнага адзінства. Існуе неабходнасьць узгадненьня інтарэсаў незадаволеных існым становішчам суб'ектаў – трэба аб'яднаць неаб'яднанае. Ужо лічыцца канонам каляровай рэвалюцыйнасьці, што на выбары апазыцыя мусіць ісьці адзінай калёнай. Функцыю яднальнага фактару выконвае ідэя, якая знаходзіць шлях да сваёй рэалізацыі ў рэвалюцыі. У выпадку каляровых рэвалюцыяў гэткай ідэяй зьяўляецца ідэя свабодных і справядлівых выбараў. Менавіта ідэалягічны фактар аб'ядноўвае каляровыя рэвалюцыі ў адну плынь – у той час як па клясава-сацыяльным характары чыньнікі рэвалюцыяў адрозьніваюцца. Тыя палітычныя сілы, якія не падзяляюць артыкуляванай рэвалюцыйным блёкам ідэі альбо зь нейкіх іншых прычынаў, напрыклад праз амбіцыі лідэраў, ня здольныя далучыцца да гэтага блёку, аб'ектыўна ператвараюцца ў саюзьнікаў антырэвалюцыйнага блёку. Але працэс увасабленьня гэтай простай ідэі ў канкрэтнай палітычнай стратэгіі патрабуе вялікіх творчых высілкаў – гэтая ідэя і прапанаваная стратэгія яе рэалізацыі мусяць ня толькі задаволіць усе складнікі рэвалюцыйнага палітычнага блёку, яны таксама мусяць запаліць народныя масы. Таму працэс фармуляваньня рэвалюцыйнай ідэі і стратэгіі яе рэалізацыі зьвязаны з вынаходзтвам прымальнага для грамадзтва палітыка-

ідэалягічнага праекту з боку рэвалюцыянэраў.

Пасьля ж рэвалюцыі, як мы ўжо адзначалі, ранейшае разуменьне сутнасьці рэвалюцыі робіцца афіцыйным, яно не падлягае карэктыроўцы. Аднак заплюшчваць вочы на раней прыхаваныя супярэчнасьці далей ужо немагчыма. Сумленныя выбары адбыліся дзякуючы рэвалюцыйнаму паўстаньню народных масаў, але палітычныя інтарэсы складнікаў рэвалюцыйнага блёку не абмяжоўваліся толькі ідэяй справядлівасьці. Па-над ідэалягічным праектам паўстаюць розныя палітычныя інтарэсы. Калі справядлівыя выбары адбыліся і іх больш ніхто не спрабуе «скрасьці», то зьнікае аб'яднальны фактар для каляровых рэвалюцыянэраў. Цяжка знайсьці яму замену – калі толькі рэвалюцыйны правадыр не цэмэнтуе новага рэжыму і сілай уласнай харызмы не забясьпечвае ягонай трываласьці. Рэвалюцыянэры ўсё яшчэ робяць выгляд, што рэвалюцыя працягваецца, але дзейнічаюць яны ўжо па-за рамкамі перадрэвалюцыйнае ўгоды. Старыя законы ў новай сытуацыі больш ня дзейнічаюць, дакладней, дзейнічаюць супраць саміх рэвалюцыянэраў. Ад здольнасьці перастроіцца пад новую сытуацыю залежыць трываласьць новаўсталяванага рэжыму – у адваротным выпадку ён асуджаны на ідэалягічную паразу.

Антырэвалюцыйны лягер напярэдадні рэвалюцыі таксама выступае, прынамсі вонкава, аб'яднаным. Але ён аб'яднаны, хутчэй, арганізацыйна, чым ідэалягічна – і ў гэтым яго слабасьць. Прадстаўнікоў гэтай эліты яднае стратэгічная задача захаваньня ранейшых правілаў гульні, аднак жыцьцёвыя іх інтарэсы ёсьць няўзгодненымі, супярэчнасьці застаюцца, адзіная ідэалёгія не цэмэнтуе груповак унутры эліты. Кіроўную эліту аб'ядноўвае не ідэалёгія, а сама ўлада – магчымасьць карыстацца ёй, магчымасьць гуляць па тых правілах, якія гэтая сама эліта і ўсталявала, прыстасавала пад узгадненьне рознаскіраваных інтарэсаў у межах сваёй групоўкі (у грамадзтве цяпер не існуе кіроўных элітаў бяз рознаскіраваных інтарэсаў). У існым палітычным раскладзе кожны з складнікаў уладнай элітнай групоўкі бачыць магчымым дасягненьне сваёй мэты ў рамках дзейных законаў – аднак гэтыя мэты па сутнасьці розныя, часам несумяшчальныя, ня ўзгодненыя

фармальна. Існуе толькі «дамоўленасьць» у дачыненьні да правілаў іх дасягненьня. Розныя складнікі эліты разьлічваюць на працяг існуючых тэндэнцыяў, разьлічваюць дасягаць сваіх мэтаў у межах адной карціны будучыні – аднак для кожнага з кланаў, груповак, хаўрусаў і лабісцкіх цэнтраў мэта, якую яны ў гэтай будучыні хочуць дасягнуць, застаецца сваёй. Яны ня бачаць патрэбы ў выпрацоўцы аб'яднаўчай ідэі. Маючы на сваім баку ўладу, сілу легітымнага дзяржаўнага гвалту, нашто яшчэ ідэі? З адсутнасьці ідэалягічнай творчасьці вынікае слабасьць ідэалягічных пазыцыяў эліты, няздольнасьць процістаўіць агрэсіўнай рэвалюцыйнай ідэалёгіі прывабную альтэрнатыву. І ў той момант, калі ў грамадзтва з боку рэвалюцыянэраў будзе ўкінутая аб'яднаўчая ідэя, эліта ў разгубленасьці разумее, што ў ідэалягічным сэнсе яна нястанная. Перамога рэвалюцыянэраў на вуліцы магчымая толькі тады, калі грамадзтва прымае прапанаваную рэвалюцыянэрамі ідэю. Энэргетыка Майдану тлумачыцца тым, што гэтых людзей аб'ядноўвала адна ідэя. У выніку грамадзтва пачынае падпарадкоўвацца зусім іншым правілам гульні, ранейшыя правілы губляюць сваю легітымнасьць, і ранейшай эліце не застаецца нічога, як саступіць уладу. Элемэнт нечаканасьці ў такую схему можа ўнесьці толькі фактар харызматычнага лідэра. Толькі ягоны ўплыў можа прадухіліць асуджаную на фіяска ідэалягічна нястанную эліту. Ці можа гэты фактар быць апісаны ў тэхналягічным ключы? Ці можа палітычная тэхналёгія ў спалучэньні з сучаснымі сродкамі масавай камунікацыі штучна стварыць гэты фактар? На гэтае пытаньне складана адказаць адназначна, але свой адказ на яго дае кожнае рэвалюцыйнае сутыкненьне.

Пасьля ж рэвалюцыі сытуацыя мяняецца. Зрынутыя рэвалюцыяй сілы дробяцца. Распачынаецца апісаная вышэй контрарэвалюцыйная ідэалягічная творчасьць па выпрацоўцы альтэрнатывы рэвалюцыйнай мадэлі. У той час як пераможцы займаюцца ўнутранымі разборкамі, фармуюць стратэгію практычнага падзелу рэвалюцыйных здабыткаў, у стане пераможаных фармуецца група, якая ў межах новай сыстэмы выступае ў якасьці новай апазыцыі. У выніку выходзіць сытуацыя, калі асэнсаваньне прычынаў рэвалюцыі сярод прыхільнікаў старога парадку выводзіць іх на новы ідэалягічны

ўзровень. Пагатоў што зь цягам часу ранейшая рэвалюцыйная ідэя пачынае працаваць супраць саміх рэвалюцыянэраў. Паколькі ўвасабленьне ідэі ў рэчаіснасьць ня можа адпавядаць палітычным інтарэсам усіх складнікаў рэвалюцыйнага блёку, гэты блёк развальваецца. Народ часткова расчароўваецца ў палітыцы рэвалюцыянэраў, бо любое ўвасабленьне ідэі ў рэчаіснасьці горшае за самую ідэю – і новая апазыцыя набірае на гэтым палітычныя балы. Рэвалюцыянэры падманулі, кажа апазыцыя, і ў пэўным сэнсе мае рацыю. Устанаўліваюцца пасьлярэвалюцыйныя правілы гульні, якія моцна розьняцца ад чаканьняў большасьці ўдзельнікаў рэвалюцыі. Справядлівыя выбары адбыліся, але яны не азначаюць абсалютнай справядлівасьці, якой прагне грамадзтва падчас рэвалюцыі. А няздольнасьць адкрыта прызнаць часовы і дэклярацыйны характар рэвалюцыйных лёзунгаў толькі грае на руку новай апазыцыі.

У адпаведнасьці з гэткай ідэалягічнай дынамікай адрозьніваецца і разуменьне самой рэвалюцыі антырэвалюцыянэрамі і рэвалюцыянэрамі да падзеі і пасьля яе. Тут варта прыгадаць словы Бярдзяева: «Рэвалюцыя ірацыянальная, яна сьведчыць пра панаваньне ірацыянальных сілаў у гісторыі… заўжды зьяўляецца сымптомам нарастаньня ірацыянальных сілаў. Менш за ўсё разумеюць сэнс рэвалюцыі рэвалюцыянэры і контрарэвалюцыянэры. Рэвалюцыянэры звычайна не разумеюць сэнсу рэвалюцыі».

Існуе і іншы накірунак аналізу драматычных рэвалюцыйных пераўтварэньняў. Гэты аналіз робіцца людзьмі, якія прынялі рэвалюцыю як зьяву і перажываюць яе, узвышаючыся над яе будзённасьцю. Для рэлігійнага філёзафа Бярдзяева ў дачыненьні да расейскай рэвалюцыі 1917 г. гэта быў пераважна аналіз апакаліптычны, з пазыцыяў хрысьціянскага пэсымізму. Аднак гэткі гістарыязофскі пагляд не адзіны магчымы і каляровыя рэвалюцыі ў нашых суседзяў – таму прыклад. І ўкраінскія падзеі, і візыты Пуціна да Януковіча, і зьнявага апошнім Лукашэнкі падчас сьвяткаваньня гадавіны вызваленьня Ўкраіны могуць быць разгледжаныя з пазыцыяў мэтафізычных, могуць быць тэмай для рэфлексіі пра сутнасьць рэвалюцыі.

4. ВЯЛІКАЯ ІДЭАЛЬНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ

Украінскі выпадак дае значна больш падставаў для гэткага аналізу ў параўнаньні з папярэднімі каляровымі рэвалюцыямі. Тут і цывілізацыйны канфлікт Усходу і Захаду, і барацьба дзьвюх імпэрыяў за кантроль над спрэчнай тэрыторыяй, і гістарычнае народнае паўстаньне, і выбар дэмакратыі супраць тыраніі, і спэктакль «фармаваньня нацыі» тут і цяпер, у гэтую хвіліну. Некаму ў падзеях на Майдане бачылася жахлівае паўстаньне масаў, а другія з задавальненьнем назіралі «рэвалюцыю няўрадавых арганізацыяў», некаму мроіліся змовы таемных лялькаводаў гісторыі, хтосьці абаслютызаваў сацыяльны чыньнік, іншыя апэлявалі да геапалітычных тлумачэньняў альбо зьвярталі ўвагу на мову, на якой размаўлялі бакі. Розныя вэрсіі, разныя бачаньні, розныя гледзішчы. У аналізе ўкраінскіх падзеяў, як у люстэрку, адбіліся ўсе балючыя праблемы сучаснасьці. Памаранчавая рэвалюцыя зрабілася фокусам ня толькі рэвалюцыйных тэхналёгіяў, але й стала палігонам да разуменьня грамадзтва ў сусьветным маштабе. Памаранчавая рэвалюцыя – гэта ўзорны прыклад сучасных рэвалюцыяў, найбольш блізкі да іх ідэальнага тыпу. А ўзорныя тыпы заўжды прывабліваюць увагу дасьледнікаў, зьяўляюцца зручнымі для тэарэтызаваньня нават пры наяўнасьці вялікага кола спрэчных пытаньняў.

У перамогі шмат бацькоў, а параза – заўжды сірата. Калісьці сем гарадоў Грэцыі спрачаліся за права называцца радзімай Гамэра. Цяпер адразу некалькі амэрыканскіх, славацкіх і сэрбскіх экспэртных цэнтраў цьвердзяць, што менавіта яны стаялі ля вытокаў украінскай рэвалюцыі, забываючы, што роля інтэлектуальнага руху ўнутры Ўкраіны была вызначальная – без ідэалягічнага падмурку ў грамадзтве немагчыма было б спадзявацца на падтрымку народу падчас барацьбы за сумленныя выбары. Ідэалягічнае асяродзьдзе, у якім магла здарыцца Памаранчавая рэвалюцыя, было створанае нацыянальнымі інтэлектуаламі[2]. Але створаны інтэлектуаламі ідэйны бэкграўнд ня быў тэхналягічным! Паводле ўсіх законаў, для высьпяваньня нацыі спатрэбіліся б яшчэ гады. Кажуць, што ўкраінскія гістарычныя раманы 1970-х, калі іх чытаць уважліва,

былі сьведчаньнем таго, што нешта падобнае да Майдану рана ці позна абавязкова адбудзецца. Але навошта чакаць яшчэ 10–20 гадоў? Трэба хутчэй! І тут якраз прысьпелі заходнія тэхнолягі, інжынэры грамадзянскай супольнасьці і рэвалюцыйныя мэнэджары, а палітыкі распачалі чарговую бойку за перадзел уплыву сярод кланаў. Інтэлектуалы падкінулі грамадзтву ідэю, якая была падхопленая палітыкамі, увасобленая ў выглядзе палітычнай праграмы і рэалізаваная ў форме палітычнай рэвалюцыі дзякуючы намаганьням грамадзянскай супольнасьці.

Глебу для рэвалюцыі стварыла шматгадовая руплівая праца ўкраінскага няўрадавага сэктару. Тысячы асьветніцкіх мерапрыемстваў і заходнія тэхналёгіі актывізацыі грамадзтва стварылі тую форму, напаўненьне якой ідэалёгіяй нацыяналізму і перадусім ідэяй вызваленьня ад карупцыянэрскай улады прывяло да фармаваньня рэвалюцыйнай сытуацыі.

Увогуле, для Памаранчавай рэвалюцыі было характэрнае спалучэньне інтэлектуальных, палітычных і грамадзянскіх высілкаў. Акурат пасьпяховае запазычаньне гатовых тэхналёгіяў дзеля вырашэньня ўжо сасьпелай рэвалюцыйнай сытуацыі робіць украінскую рэвалюцыю ўзорным прыкладам каляровых рэвалюцыяў. Інтэлектуалы стварылі ідэалёгію вызваленьня, грамадзянская супольнасьць дала тэхналёгію вызваленьня, а палітыкі скарысталіся гэтай тэхналёгіяй. Калі «імпарт рэвалюцыі» і меў месца, ён адбыўся ў сваім найбольш прыстойным выглядзе. Менавіта таму памаранчавы ўзор стаў прыцягваць увагу замежных пасьлядоўнікаў, менавіта таму аранжавы колер зрабіўся колерам грамадзянскага супраціву несправядлівасьці на ўсім сьвеце і быў узьняты на штандары ў Румыніі, Расеі, Ізраілі і нават Гане і Зымбабвэ.

Памаранчавая рэвалюцыя канчаткова сфармавала канон сучаснай рэвалюцыі. Гэты канон быў прыняты і прыхільнікамі рэвалюцыі, і яе антырэвалюцыйнымі крытыкамі – розьніца палягала толькі ў ацэнцы тых фактаў, якія назіраліся падчас гэтага працэсу. А вось падзеі ў Кыргызстане не адпавядалі канону і зь цяжкасьцю ўпісваліся ва ўжо напрацаваную парадыгму. Рабаваньні на вуліцах, гвалтоўныя сутыкненьні

2 Нечакады ніхто былі рэвалюцыяй сваіх поспехаў і расійская сыстэма стварае ілюзію поўнага кантролю над грамадзтвам, якая, аднак, на справе вынулецца ілюзіяй. Многія украінскія інтэлектуалы з пэсымізмам глядзелі на магчымасьць зьмены рэжыму ў выніку выбараў 2004 г. у

нязначная роля моладзевага пратэставага руху, адсутнасць бясспрэчнага лідэра – усё гэта выбівалася з намаляванай схемы і патрабавала дадатковых тлумачэньняў. Таму кыргызскі выпадак у межах сучаснай рэвалюцыйнай тэорыі трэба ўспрымаць як эмпірычны факт, які не адпавядае агульнапрынятай парадыгме. Назапашваньне гэткіх фактаў падчас наступных крызісаў у іншых краінах павінна прывесьці да пераасэнсаваньня рэвалюцыйнай тэорыі, што падпарадкоўваецца законам разьвіцьця тэорыяў, пабудаваным у межах філязофіі навукі.

Аднак акрамя практычнага і рэфлексіўна-філязофскага тэарэтызаваньня на тэму рэвалюцыйных працэсаў магчымыя і ацэнкі рэвалюцыі зь іншых гледзішчаў. Да прыкладу, анэнка аб'ектыўна-навуковая, якая імкнецца разгледзець у падзеях рацыянальны сэнс або нават пабачыць у іх фактар узьдзеяньня «аб'ектыўных законаў гістарычнага разьвіцьця». Гэты пункт гледжаньня займаюць людзі, якія імкнуцца пазнаць рэвалюцыю розумам, але пры гэтым самі ў ёй не бяруць удзелу. Гэта не значыць, што іхнае разуменьне рэвалюцыі ня будзе ўзята на ўзброеньне ўдзельнікамі палітычнага працэсу – у наш час распаўсюджанае меркаваньне пра магчымасьць сьвядомага кіраваньня і маніпуляцыі палітычнымі працэсамі і грамадзкімі настроямі, і няма лепшага сродку для сацыяльнай інжынэрыі, чым навуковая тэхналёгія. Менавіта таму такім попытам карыстаюцца разнастайныя палітычныя аналізы, прагнозы, магчымыя сцэнары разьвіцьця падзеяў і паліталягічныя дасьледаваньні. Удзельнікі гульні падазраюць, што іхныя ірацыянальныя дзеяньні на самай справе падпарадкоўваюцца нейкім аб'ектыўным законам, якія можна зразумець, вытлумачыць і скарыстаць на сваю карысьць. Сацыялёгія рэвалюцыі ёсьць толькі самым відавочным прыкладам выкарыстаньня навуковых мэтадаў быццам бы рацыянальнага разуменьня дзеля ажыцьцяўленьня палітычных стратэгіяў узьдзеяньня на грамадзтва.

Народныя масы таксама ніколі не прызнаюць той ірацыянальнай глыбіні, якую яны падсьвядома адчуваюць падчас рэвалюцыйнага паўстаньня. Іх цешыць думка, што ўсё гэта тлумачыцца разумнымі чыньнікамі. Невытлумачальная

ўстасць, вырай ідэі прывядзём часопіс «Ї», ці, што «Мова будаваным у краіны». З друкарні ён выйшаў ужо пасьля рэвалюцыі, і выдаўцам не заставалася нічога, як скрэсьліць на вокладцы слова «нямое» і ператварыць слова рэдактара ў тлумачэньне сваёй сэнсісу: Гатуючи нумер журналу про мову ще на початку осени 2004, ми з гіркою внутрішньою переконаністю обрали назву «Мова німої країни». Тоді видавалося,

радасьць «тварэньня гісторыі» падчас народнага ўзрушэння проста мусіць быць сфармуляваная ў быццам бы лягчэйшым лёзунгу альбо патрабаваньні. Мала хто скажа: «Мы робім рэвалюцыю дзеля таго, каб зрабіць рэвалюцыю». Гэта выклікае псыхалягічны дыскамфорт. Значна больш лёгка сябе адчуваеш, кіруючыся тэзай «Мы робім рэвалюцыю дзеля Свабоды, Дэмакратыі, супраць падману і самадурства». Задача харызматычнага рэвалюцыянэра альбо ягонага памагатага, шамана-паліттэхноляга, у тым, каб сфармуляваць ірацыянальныя памкненьні масаў у разумнай форме і ўпісаць гэтую рацыянальную фармулёўку ў вусны правадыра.

рушэнням сярэдняй краіны робіли, що українська молодь на вулицях Києва. Задача харизматичного лідера, безнадійно віддаленого від більшости публічних сфер суспільства – від спорту розважально-видовищної індустрії до науки і бізнесу? Не берусь стверджувати, але так, чи майже так, думали і відчували більшість авторів цього числа».

Намаляваная намі карціна дазваляе па-іншаму паставіцца да некаторых праяваў антырэвалюцыйнай дзейнасьці ў Расеі і Беларусі. Адной з антырэвалюцыйных стратэгіяў можа быць фармуляваньне псэўдарэвалюцыйных лёзунгаў, як гэта робяць цяпер у Расеі архітэктары моладзевага руху «Наши». Гэта можа быць ня толькі спроба ўзяць пад кантроль моладзевы рух, як такі, як гэта робіць БРСМ у Беларусі – для ўсіх, хто бываў у прымусовых моладзевых арганізацыях зразумелая іх мізэрная і нават адваротная эфэктыўнасьць. Гэта значна больш, гэта спроба перахапіць права на фармуляваньне рацыянальнай абалонкі для ірацыянальных пратэстных настрояў у грамадзтве. І сапраўды, занадта ўжо часта й перакананча разважаюць лідэры «Наших» пра сваю апазыцыю да сёньняшняга палітычнага рэжыму ў Расеі. Іхная канцэпцыя, скіраваная ў сэрца народу, які падманваюць: «Мы супраць сёньняшняй эліты. Мы хочам вярнуць харызматычнага лідэра, панаваньня ў краіну! Мы хочам вярнуць Расеі справядлівую ўладу!» – так трэба разумець іхны мэсыдж.

У межах намаляванай намі схемы эфэктыўна процідзейнічаць рэвалюцыі павінны таксама і тыя дзеяньні, якія дэманструюць бессэнсоўнасьць і неразумнасьць рэвалюцыйных дзеяньняў. Напрыклад, падчас выбуху пратэставых моладзевых рухаў у Расеі пры канцы 2004-га – на пачатку 2005-га гг. спосабы дэманстрацыі бессэнсоўнасьці рэвалюцыйнага праекту. «Наши» выходзілі на плошчы з «пратэставымі» лёзунгамі «Как-нибудь Так!», «Увы!», «Тяни одеяло, дели пироги!», «Мир! Труд! Майя!». Хто ж пасьля гэтага мог сур'ёзна паставіцца да

дэманстрацыі пад дэвізам «Пора!», што адбывалася поруч? Гэтыя падобныя да памаранчавых лёзунгі, дарэчы, папраўдзе трапна выкрываюць пустэчу, якая нярэдка хаваецца за пратэставымі лёзунгамі. Тэхналёгіі кшталту «Поры» працуюць толькі ва ўмовах нарастаньня грамадзка-палітычнай напружанасьці. Тады скарыстацца імі можа кожны – на тое гэта і тэхналёгіі. Калі адзін бок скарыстаўся імі, то і іншы можа імі авалодаць.

5. МОЛАДЗЬ ЗМАГАЕЦЦА – САМА З САБОЙ

Распаўсюджана такое меркаваньне, што менавіта дзейнасьць моладзевых рухаў супраціву і ёсьць тым штуршком, які выклікае рэвалюцыйныя пераўтварэньні. Многія назіральнікі выказвалі думку, што якраз украінская «Пора», грузінская «Кхмара» і югаслаўскі «отпор» «зрабілі» рэвалюцыі ў сваіх краінах, выкарыстоўваючы тэхналёгію негвалтоўнага супраціву. Сама да гэтай праблематыкі скіраваная ўвага антырэвалюцыянэраў у Расеі. Кнігі Джына Шарпа «Негвалтоўная барацьба: найлепшы сродак вырашэньня вострых палітычных і этнічных канфліктаў?», «Палітыка негвалтоўных акцыяў» і «Ад дыктатуры да дэмакратыі: канцэптуальныя асновы вызваленьня» ўважліва штудыююцца як рэвалюцыянэрамі, так і іхнымі апанэнтамі. Зробленыя з гэтых тэкстаў высновы ўплываюць на палітычную сытуацыю. Як прызнавалі і ўдзельнікі Эўрапейскага форуму, менавіта моладзь можа быць асноўным носьбітам рэвалюцыйнай пагрозы, але таксама моладзь можа быць найлепшым сродкам прадухіленьня такой пагрозы.

Недзе да пачатку 2005 г. моладзевыя палітычныя рухі ў Расеі ўяўлялі вартае жалю відовішча. Кожная вялікая партыя мела сваё моладзевае крыло – гэта лічылася неабходным мінімумам, безь якога партыя ня можа разьлічваць на палітычны посьпех на фэдэральным узроўні. Аднак ані Саюз моладзі «За Родину», ані «Молодежное Яблоко», ані якія іншыя суполкі не маглі пахваліцца істотным посьпехам. Сяброў было вобмаль, дзейнасьць збольшага была фармальная, СМІ яе не заўважалі, а палітычныя праграмы пераважна ішлі ў фарватэры «даростлай»

часткі партыі. Расейскія каляпартыйныя арганізацыі моладзі прываблівалі найбольш тых, хто разьлічваў зрабіць палітычную кар'еру – у моладзевым «СПС» ці камсамоле, а найлепш, вядома, у «Молодежном Единстве» і «Идущих вместе» з праўрадавай «Единой Россией». Такія моладзевыя аб'яднаньні не разглядаліся ў якасьці палітычнай сілы і не маглі быць падмуркам масавага пратэставага руху. Натуральна, пры гэтым кожная з гэтых партыяў мела свае асаблівасьці. «Соколы Жириновского» адрозьніваліся ад яблычнікаў, аднак прыкметы крызіснага стану былі супольныя. Аніякай уласнай палітычнай ролі ў нацыянальным маштабе моладзевыя палітычныя арганізацыі ня гралі. Нельга не пагадзіцца з ацэнкай, якую самакрытычна даў ЦК КПРФ Саюзу камуністычнай моладзі пры канцы 2003 г. у дачыненьні да выбарчых кампаніяў: «Мы назіраем слабы ўплыў моладзевых арганізацыяў… аб павелічэньні іх ролі падчас выбарчых працэсаў гаварыць не выпадае».

Крызіс назіраўся і ў асяродзьдзі непартыйных палітызаваных згуртаваньняў моладзі, хоць там ён праяўляўся па-іншаму. Нягледзячы на большую актыўнасьць і публічнасьць у параўнаньні з партыйнымі моладзевымі структурамі, тут таксама мела месца стагнацыя, зьвязаная з адсутнасьцю рэальнага ўплыву на палітычнае жыцьцё. На гэтым флянгу найбольш заўважнай была дзейнасьць Нацыянал-бальшавісцкай партыі Эдуарда Лімонава. Гэтая арганізацыя *de jure* не пазыцыянавала сабе як чыста моладзевую, аднак рэальна выконвала функцыю радыкальнай моладзевай апазыцыі. НБП канцэнтравалася на пазасыстэмнай дзейнасьці. Пікеты, захопы ўрадавых будынкаў, антыпутынскія пэрформансы, гучныя заявы і палітычныя зьняволеныя з шэрагу нацыянал-бальшавікоў замацавалі за імі імідж найбольш пасьлядоўнай альтэрнатывы пануючаму рэжыму Пуціна. Пачынаючы з 2000 г. на глебе антыпуцінскай праграмы НБП істотна пашырыла геаграфію сваіх аддзяленьняў, вырасла колькасна, атрымала досьвед удзелу ў выбарчых кампаніях. Аднак яна была юрыдычна адрэзаная ад сапраўднай барацьбы за палітычную ўладу праз адсутнасьць адпаведнага статусу і ўплывовых саюзьнікаў (нават спробы пагадненьня з анпілаўцамі засталіся на паперы). Пакрысе НБП стала

выконваць выключна функцыю каналізацыі моладзевага пратэсту без рэальнай барацьбы за ўладу. Яе актыўнасьць больш турбавала не палітыкаў, а дысыдэнтаў і праваабаронцаў. Такая экстрэмісцкая апазыцыя найбольш задавальняла пуцінскі рэжым. Акцыі лімонаўцаў былі гучнымі, але не ўяўлялі пагрозы для ладу, толькі палохалі сярэдняга грамадзяніна. Нацысцкі ж імідж такой апазыцыі рабіў магчымымі рэпрэсіі супраць актывістаў безь пярэчаньня з боку міжнароднай супольнасьці. Паступова НБП была адсунутая з поля публічнай палітыкі і маргіналізавалася.

Прыкладна такую ж ролю адыгрываў «Авангард красной молодежи», блізкі да партыі «Рабочая Россия». Стварэньне гэтай арганізацыі ў 2000 г. мела за мэту скарыстацца пратэставым настроем моладзі па прыкладзе НБП, аднак з большай ідэалягічнай нагрузкай. Калі ў нацболаў адсутнічае якая-кольвек ідэалягічная дактрына (сярод сяброў і кіраўнікоў партыі ёсьць і нацысты, і новыя левыя, і трацкісты), то «АКМ» пасьлядоўна трымаецца камуністычнай ідэалёгіі ў яе радыкальным варыянце. Зрэшты, ідэалягічны фактар ў моладзевых рухах ня грае вызначальнай ролі – у рэгіёнах вельмі часта структуры НБП, «АКМ» і іншых радыкальных груповак перакрыжоўваюцца, таксама як і іх мэтавыя групы. Урэшце, абодва згуртаваньні ў пэўны момант адчулі сабе годнымі заняць нішу масавага пратэставага руху моладзі напярэдадні блізкага рэвалюцыйнага крызісу – і падштурхнуў іх да гэтага ўсьведамленьня ўкраінскі прыклад.

Як ні дзіўна, да рэвалюцыйных падзеяў ва Ўкраіне і Кыргызстане расейцы не задумляліся пра моладзевую палітыку, а палітычныя дзеячы і іхныя дарадцы ня бачылі патрэбы ў інтэнсыфікацыі працы з моладзьдзю. Азначаны крызісны стан моладзевай палітыкі прызнаваўся ўсімі, аднак ён не лічыўся чымсьці небясьпечным у параўнаньні з агульным станам расейскага палітычнага ладу. Зразумела, рухі накшталт «Отпору» атрымалі пэўную вядомасьць, аднак пра магчымасьць стварэньня падобных структураў у Расеі ніхто ўсур'ёз не задумляўся. Гаворка пра расейскую «Кхмару» была, хутчэй, вытанчаным інтэлігенцкім сьцёбам. Палітычныя аналітыкі мала цікавіліся гэтым праблемным полем, пакуль моладзевыя

«кулакі» пратэсту лічыліся праблемай выключна замежнай палітыкі. Але калі ўзімку 2004 г. памаранчавы карнавал пабачылі ў кожным расейскім доме, моладзь сама, незалежна ад дарослых палітыкаў, зразумела, што яна можа вырашаць лёс краіны. Калі гэта можа адбыцца ўва Ўкраіне, то чаму гэта немагчыма ў Расеі? Адначасова тая ж думка, вядома, пранізала й галовы крамлёўскіх паліттэхнолягаў, чыноўнікаў і журналістаў. Практыка паказала, што непартыйныя моладзевыя рухі, фінансаваныя за кошт грантаў і кіраваныя прынцыпамі негвалтоўнага супраціву ў духу Шарпа, здольныя прывабіць значную колькасьць маладых людзей.

Як гэта ня раз бывала ў мінулыя стагодзьдзі, новыя ідэі Расея зноў стала запазычваць з Украіны й Беларусі.

І пачалася рознаскіраваная актыўнасьць. Аналітычныя цэнтры пуцінскага рэжыму сталі ўважліва назіраць за разьвіцьцём падзеяў у асяродзьдзі моладзевых арганізацыяў і рабіць пэўныя крокі па кіраваньні гэтымі працэсамі. Самі ж моладзевыя структуры распачалі сапраўднае спаборніцтва: хто стане найлепшым расейскім адпаведнікам «Поры»? Ахвотных было столькі, што іх, здаецца, хапіла б, каб рэвалюцыянізаваць усе дыктатарскія рэжымы сьвету. Найлепшыя шанцы зрабіцца адзіным антыпуцінскім брэндам мела навастваряная арганізацыя «Оборона», блізкая да правацэнтрысцкага крыла традыцыйнай апазыцыі. Ядро «Абароны» склала моладзь СПС і «Яблока». Адзін з каардынатараў «Поры» Андрэй Юсаў адзначыў, што менавіта «Оборона» зьяўляецца найбольш жыцьцяздольнай моладзевай структурай у сучаснай Расеі, але пры гэтым з жалем дадаў: «Але ж іх да сьмешнага мала».

Аднак у час, калі кыргіскія маладзёны зь «Бірге!» і «Кель-Кель» зьдзівавана назіралі за нечаканым посьпехам уласнай рэвалюцыйнай праграмы, у Расеі поўным ходам ішоў і пошук субстытутаў гэтых рухаў негвалтоўнага супраціву.

6. ЦУКЕРКІ «КРАМЛЁЎСКІЯ»

Стратэгію расейскіх уладаў выпрацавалі паліттэхнолягі на чале

з Паўлоўскім. Апошні, фрустраваны ганебным прафэсійным правалам ва Ўкраіне, задумаў два важныя крокі дзеля прадухіленьня расейскай моладзевай рэвалюцыі. Першы зь іх зыходзіў з наступнай лёгікі: калі няможна прадухіліць фармаваньне моладзевага пратэставага руху, трэба зрабіць так, каб гэты рух згубіўся сярод дзясяткаў кантраляваных Крамлём цэнтраў «пратэставай» актыўнасьці, каб не сфармаваўся адзіны рух пратэсту. Па камандзе з Крамля было створана некалькі «радыкальных моладзевых рухаў», якія мусілі адцягнуць на сябе частку радыкальнай моладзі. Зразумела, далёка ня ўсе зь іх былі простымі агентамі Крамля, аднак сама сытуацыя відавочна была вынікам маніпуляцыі пуцінскай адміністрацыі. У Расеі зьявілася адразу некалькі арганізацыяў з назвай «Пора» – проста «Пора», «Российская «Пора», «Оранжевая Москва-«Пора», «Красная «Пора». Фігураваў нават правакацыйны рух, у сымболіцы якога слова «пара» было арганічна сумешчанае з чорнай свастыкай. Яшчэ былі «ДА!», «Мы!», «Хватит!» і інш. Гэтыя арганізацыі распаўсюдзілі свае антыпуцінскія маніфэсты, стварылі сайты, аднак аніякай дзейнасьці практычна не ажыцьцяўлялі. На гэта наклалася барацьба паміж рэальнымі моладзевымі структурамі – напрыклад, моладзевая фракцыя партыі «Родина» перахапіла сабе назву «Ура!», пры партыйцы Ірыны Хакамады «Наш Выбор» быў створаны моладзевы рух «Стоп-кран». У выніку склалася становішча, калі ў адной прасторы функцыянавалі дзясяткі апазыцыйных брэндаў, іх дублі і фантомы, і склалася ўражаньне, што ніводны з гэтых рухаў нельга ўспрымаць усур'ёз.

Раскалоўшы такім чынам моладзевы рух, цэнтар Паўлоўскага стварыў умовы для наступнага кроку. Ён прадугледжваў стварэньне на моладзевым полі моцнага гульца, які быў бы цалкам падпарадкаваны пуцінскай адміністрацыі. Так нарадзіліся «Наши», ультрапатрыятычная прапуцінская арганізацыя. Кіраўніком новага руху стаў Васіль Якіменка, раней – стваральнік руху «Идущие вместе», заснаванага ў 2000 г. дзеля падтрымкі Пуціна.

Расейскі ўрад прыняў фэдэральную праграму «Патрыятычнае выхаваньне грамадзянаў Расейскай Фэдэрацыі ў 2006–2010 гг.».

Згодна з гэтай праграмай, на прапаганду патрыятызму сярод моладзі выдзяляецца больш за 17 мільёнаў даляраў. Натуральна, большая чатка гэтых сродкаў будзе наўпрост альбо ўскосна накіраваная «Нашим». Паводле зьвестак сацыёлягаў з ВЦІОМ з сакавіка да ліпеня вядомасьць «Наших» сярод насельніцтва павялічылася з 4 % да 17 % ад усіх апытаных.

Сіла «Наших» і іхнае адрозьненьне ад савецкага тыпу арганізацый кшталту БРСМ у выкарыстаньні тэхналёгіяў, выпрацаваных «Отпорам» і падобнымі структурамі. Гэта сеткавы прынцып пабудовы арганізацыі, радыкальная рыторыка, паўваенная арганізацыйная фразэалёгія («камандзіры», «камісары»), настрой на перамены і прыцягненьне моладзі да беспасярэдняга ўплыву на палітычнае жыцьцё. «Наши» даюць расейскай моладзі тое, чаго ёй даўно бракавала і што ёй маглі б у будучыні прапанаваць рэвалюцыйныя моладзевыя рухі – адчуваньне ўдзелу ў палітычным жыцьці краіны. Гэтая арганізацыя атрымала імідж «баявых атрадаў», якія павінны абараніць інтарэсы Расеі – аніякай ідэалягічнай пазыцыі, акрамя падтрымкі Пуціна, яны ня маюць. За антыфашысцкай рыторыкай «Наших» напраўдзе хаваюцца пляны расправы з прадстаўнікамі апазыцыі. «Наши» таксама гатовыя падтрымаць Крэмль на будучых прэзыдэнцкіх выбарах, а таксама замяніць сваімі камісарамі цяперашнюю намэнклятуру як «прагнілую і інфікаваную паражэнствам». (Прыдумка піяршчыкаў: у рыторыцы «нашых» галоўнай мішэньню зьяўляюцца менавіта абстрактныя «паражэнцы».)

Расейскага дэмакратычнага кандыдата яшчэ ніхто ня бачыў, аднак моладзевы фронт супраць яго, антымайдан ужо створаны. Ёсьць падставы думаць, што гэтыя напрацоўкі Паўлоўскага скарыстае і беларускі рэжым, які сутыкнуўся з паважнымі выклікамі.

7. ДЗЯРЖАВА І АНТЫРЭВАЛЮЦЫЯ

Рэвалюцыйны палітычны праект у Беларусі імкнецца авалодаць прыхільнасьцямі грамадзтва. Натуральна, што ўлада валодае

нашмат большымі палітычнымі і эканамічнымі рэсурсамі. На яе баку ўся моц дзяржаўнага апарату. Аднак у рэвалюцыйнага праекту ў Беларусі ёсьць бясспрэчны «джокер» – адчуваньне непазьбежнасьці рэвалюцыі, непазьбежнасьці пераменаў. Згодна з дадзенымі славацка-беларускага дасьледаваньня, распаўсюджанага браціслаўскім фондам «Понціс» увесну 2005 г., каля траціны насельніцтва незадаволеныя становішчам у Беларусі і выступаюць за перамены. 39 % беларусаў у той альбо іншай ступені падтрымліваюць асобаў, якія публічна пратэстуюць супраць дзеяньняў існага ў Беларусі рэжыму. Гэта высокі паказнік, які адпавядае аналягічнаму індэксу ва Ўкраіне напярэдадні мінулых прэзыдэнцкіх выбараў. Пры гэтым 49 % апытаных беларусаў ня вераць у справядлівасьць і сумленнасьць будучых выбараў. Такім чынам, апазыцыя разьлічвае, што ў краіне да будучых выбараў высьпее рэвалюцыйная сытуацыя.

Але сацыялёгія – гэта ўсяго толькі сацыялёгія. На вуліцы выходзяць стаяць не адсоткі – жывыя людзі. Апазыцыя апрыёры ідзе на рэвалюцыйны блеф – і яе праціўнік прымае гэтыя правілы гульні. Усе астатнія палітычныя праекты, якія не прымаюць гэткага раскладу, аб'ектыўна знаходзяцца па-за гульнёй. Яны функцыянуюць па-за межамі палітычнай пэрспэктывы і могуць фігураваць у намаляванай палітычнай прасторы толькі як элемэнт фундамэнтальнай рэвалюцыйнай або антырэвалюцыйнай стратэгіі.

Беларусь – асноўная мішэнь для антырэвалюцыянэраў менавіта праз тое, што рэвалюцыянэры дэкляруюць нашу краіну наступным пунктам прыкладаньня высілкаў міжнароднага рэвалюцыйна-дэмакратычнага інтэрнацыяналу. Толькі ў Беларусі палітычная апазыцыя адкрыта заяўляе пра немагчымасьць зьмяніць палітычны рэжым нерэвалюцыйным чынам. І, што яшчэ важней, гэты прынцып закладаецца ў падмурак стратэгіі прыходу апазыцыі да ўлады. Прэзыдэнцкія выбары 2006 г. разглядаюцца аб'яднанай дэмакратычнай апазыцыяй не як электаральнае спаборніцтва, а як нагода для негвалтоўнай рэвалюцыі. Дарэчы, гэта не пастулявалася адкрыта ні камандай Каштуніцы, ні камандай Юшчанкі. Беларуская ж апазыцыя загадзя рыхтуецца да рэвалюцыі,

паколькі ня верыць у самую магчымасьць свабоднага выяўленьня волі народу падчас прэзыдэнцкіх выбараў 2006 г. Словы Лукашэнкі пра немагчымасьць рэвалюцыі ў Беларусі толькі лішні раз акцэнтуюць імавернасьць такога разьвіцьця падзеяў. Беларускае рэвалюцыйнае лобі мае рэвалюцыйныя тэхналёгіі, распрацаваную палітычную стратэгію і ня цешыцца ілюзіямі што да характару сёньняшняга рэжыму. Мізэрнасьць фінансавага рэсурсу адрозьнівае беларускі рэвалюцыйны праект, аднак у каляровых рэвалюцыях ня ўсё вырашаюць грошы.

Антырэвалюцыйныя плыні ў Беларусі і Расеі маюць сваю спэцыфіку. Аднак нягледзячы на адрознасьці ў фразэалёгіі і мэтадах, на адчувальную розьніцу між палітычнымі рэжымамі і эканамічным ладам антырэвалюцыйныя плыні ў Расеі і Беларусі маюць адзіны ідэалягічны падмурак. Гэта прадэманстравалі і выступы расейскіх антырэвалюцыянэраў падчас Эўрапейскага форуму. Як і іх беларускія калегі, пад «разьвіцьцём дэмакратычных асноваў стабільнасьці» яны разумеюць перадусім удасканаленьне мэханізмаў маніпуляцыі грамадзкай думкай. Беларускі бок, праўда, дадае да гэтага забарону газэтаў і НДА, непразрыстыя мэханізмы падліку галасоў, зьняволеньне палітычных апанэнтаў і нават горшыя мэтады расправы зь імі. А мірны пратэст і негвалтоўны супраціў фальсыфікацыям называюцца «маніпуляцыйнымі тэхналёгіямі». Сам тэрмін «разьвіцьцё дэмакратыі» разумеецца антырэвалюцыянэрамі ў чыста інструмэнталісцкім ключы, як працэс, які без кіраваньня і абмежаваньня можа прывесьці да непажаданых наступстваў. І таму «спрыяньне разьвіцьцю дэмакратыі» – складаная задача, якая патрабуе глыбокага аналізу на глебе веданьня геапалітычных і геастратэгічных тэорыяў, нацыянальных інтарэсаў дзяржавы-лідэра, выкарыстаньня сучасных маніпуляцыйных тэхналёгіяў кіраваньня грамадзкай думкай і электаральнымі працэсамі. Карацей, надышоў час пераходзіць ад грубых тэхналёгіяў да вытанчаных мэтадаў пашырэньня кіраванай дэмакратыі. Калі беларуская антырэвалюцыя скіраваная на ўмацаваньне дыктатуры з пашырэньнем рэпрэсіяў, то расейскі шлях разам з абмежаваньнем свабодаў прадугледжвае выкарыстаньне больш гнуткіх спосабаў прадухіленьня рэвалюцыйнага крызісу. Перад

беларускімі дэмакратамі ўзьнікае спакуса прыняцьця расейскага «мяккага праекту для Беларусі»: ён падаецца больш лібэральным за лукашэнкаўскі. Аднак у канчатковым пляне ён мае за мэту тую ж кансэрвацыю ранейшай сытуацыі.

Беларускія антырэвалюцыйныя сілы вынесьлі зь мінулых рэвалюцыяў гэткую навуку: рэвалюцыі адбываюцца там, дзе ўлада дэманструе слабасьць. Але беларуская антырэвалюцыя выкарыстоўвае ня толькі рэпрэсіі, яна яшчэ і абапіраецца на «дзяржаўную ідэалёгію». Стабільнасьць стала сьвятарнай каровай рэжыму ў Беларусі, разам зь лёзунгамі «апоры на ўласныя сілы» і рацыянальнымі доказамі абгрунтаванасьці пэрсанальнай дыктатуры Лукашэнкі. Пасьля рэвалюцыі ва Ўкраіне беларускі рэжым зрабіўся больш жорсткім да апазыцыі. Да таго ж, украінскія падзеі спрыялі рэанімацыі беларуска-расейскага інтэграцыйнага праекту. Цяпер гэта ўжо ня «газ у абмен на пацалункі», а хаўрус рэжымаў, якія адчуваюць супольную небясьпеку. У выніку Памаранчавай рэвалюцыі Расея зноў зацікавілася сваімі суседзямі, што стварыла, нягледзячы на двухсэнсоўнасьць Лукашэнкавай інтэграцыйнай рыторыкі, рэальную небясьпеку незалежнасьці Беларусі.

Памаранчавая рэвалюцыя ва Ўкраіне стала і для Пуціна, і для Лукашэнкі добрым урокам, які яны выдатна засвоілі. Таму посьпех беларускай апазыцыі ў 2006 г. будзе залежаць толькі ад здольнасьці дзейнічаць уласнымі, новымі мэтадамі, абапірацца на нацыянальныя рэсурсы. Мэханічнае капіяваньне чужога досьведу, мэханічны перанос імпартных тэхналёгіяў прывядзе да жорсткае паразы. Толькі арыгінальнасьць дзеяньня здольная забясьпечыць посьпех. І тым самым унесьці новае ў тэорыю каляровых рэвалюцыяў.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 5 (39) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/25

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (39) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image]2005

[image]

[image] [image] [image]

Юры Пацюпа Богу ці жывату?

– Усё т’кі – не сакрэт – як бы Богу клянесься!
– Ня Богу, Міканор, а жывату свайму! Ці мо’ і жывот – Бог таксамо?..

Іван Мележ «Людзі на балоце»

Відаць, нездарма спрэчка, справакаваная на старонках «ARCHE» (2004. № 3) сацыёлягам, кандыдатам фізыка-матэматычных навук Юр’ем Дракахрустам, трывае ўжо з год. Надта ж балючыя праблемы яна закранае. Што да мяне, дык перш чым улучыцца ў палеміку, хацеў бы крыху салідарызавацца з сп. Дракахрустам, пацьвердзіць у нейкай ступені ягоныя выракі і фобіі. Многія апанэнты сацыёляга, а мае аднадумцы палемізавалі, даводзячы шчырую лібэральнасьць беларускага нацыяналізму. Як беларускі нацыяналіст, я з гэтым не могу пагадзіцца напоўніцу. Хоць спэктар палітычных упадабаньняў беларускамоўных беларусаў досыць шырокі, усё ж праўдападобна, што лібэральныя ідэі сярод нас менш папулярныя, чым у асяродку расейскамоўных. Ня раз назіраў абурэньне, маўляў, чаму мы гаворым пра *беларусізацыю* замест

ЮРЫ ПАЦЮПА паэт, дасьледнік літаратуры. Выкладае ў Гарадзенскім унівэрсытэце імя Янкі Купалы. У 1999 годзе гарадзенскае выдавецтва «Віт» выдала пад яго рэдакцыяй «Надручныя нарысы для журналістаў «Гармонія беларускага слова». Апошняя публікацыя ў «ARCHE» – рытмалягічны трактат «Страла Зяпона» (5/2004).

таго, каб гаварыць пра *вэстэрнізацыю*.

Але быць *нелібэралам* – гэта ня значыць быць людаедам, галасаваць за цяперашні рэжым і ў брацкім экстазе хацець паяднацца з Расеяю або, наадварот, прагнуць дыскрымінацыі ўсіх расейскамоўных. У даным кантэксьце – гэта значыць быць проста *кансэрватарам*. Ня трэба забывацца, што дрэва дэмакратыі ня голы, гладкі дубец, як хацелася б думаць зачараваным сучаснасьцю адэптам эгалітарызму, яно мае шмат, і можа мець яшчэ больш, галінаў ды парасткаў. Усё залежыць ад нашых з вамі розуму, волі. Галоўнае, кажучы словамі Карла Попэра, адрозьніваць сацыяльную інжынэрыю ад утапічнае сацыяльнае інжынэрыі. Лібэральная ж мадэль дэмакратыі (толькі адна з многіх!) мне падаецца занадта прымітыўнаю, наіўнаю і небясьпечнаю для будучыні чалавечае культуры, што на беларускім прыкладзе бліскуча пацьвярджае сп. Дракахруст.

САБАКА ЧЭСТЭРТАНА

Крытыку свайго апанэнта я хацеў бы пачаць зь ягонага мэтаду. А дзеля гэтага ўспомню апавяданьне Гілбэрта Чэстэртана «Прарочы сабака». Там адзін з герояў шчыра верыць, што жывёлы здольныя бачыць тое, што простаму чалавечаму ўспрыняцьцю недаступна. Каталіцкі сьвятар, а воляю лёсу – дэтэктыў, а. Браўн зьняпраўджвае гэтую наіўноту:

– Вас чапіла пляга, якая ў наш час усё шырыцца і шырыцца. Яна імкліква авалодала галовамі. Я знаходжу яе і ў газэтавых сэнсацыях, і ў модных слоўцах. (...) Людзі страцілі цьвярозы глузд і ня бачаць сьвет такім, які ён ёсьць. Цяпер варта сказаць: «О, гэта ня так проста!» – і фантазія разыходзіцца ўшчэрць, як у страшным сьне. Тут і сабака нешта варожыць, і сьвіньня прыносіць шчасьце, а кот – бяду, і жук – ня проста жук, а скарабей. Адным словам, адрадзіўся ўвесь зьвярынец даўнейшага політэізму, – і сабака Анубіс, і зеленавокая Баст, і быкі басанскія. Так вы коціцеся назад, да багомленьня жывёлаў, вяртаючыся да сьвятых сланоў, кракадзілаў і гадаў...

Здаецца, пры чым тут Дракахруст? А пры тым, што ён багоміць мёртвую лічбу статыстыкі з тым жа запалам балванахвальца, што й герой апавяданьня прарочых жывёлаў. Ці не становіць сёньня сьляпая вера ў матэматычныя падлікі на кампутары сур'ёзную пагрозу для навукі і здаровага розуму? (Хто ня ведае славутага перапісваньня гісторыі матэматыка Фаменкі!) Статыстыка – усяго толькі спосаб, а кампутар – прылада. Яны здольныя даць нам тое, што мы ад іх хочам, і ня больш. Сустрэўшы тыя лічбы, якія паказвае ў сваім артыкуле сацыёляг, я б парадаваўся за беларускую мову. Мне і ў галаву не прыйшло б рабіць такія высновы, якія робіць мой апанэнт. Лічбы паказваюць, што працэс беларусізацыі даўно зрушыўся зь мёртвага пункту і працягваецца – насуперак, а часамі нават дзякуючы, усім «ворагам Беларушчыны». Нацыяналізм расейскамоўных беларусаў – гэта толькі пачатковы этап нашага *адраджэньня* (не пабаюся гэтага высокага і крыху заеждженага слова). Далей павінны рабіць сваю работу тыя *моўныя прыхільнасьці*, «вынайдзеныя» Жукоўскім, калі іх не глушыць «у час».

Аднак, відаць, некаму ўсё ж выгадна браць факты *статычна* і сьведама ня бачыць іх *дынамікі*. Калі мы ўжываем такія паняткі як *небеларусы, беларусы, беларускамоўныя беларусы, расейскамоўныя беларусы*, дык забываемся, што да гэтых бінарных апазыцыяў ня зводзіцца ўся складанасьць тутэйшых нацыятворчых працэсаў. Мы забываемся на куды істотнейшыя ў данай сытуацыі рэчы. Падабаецца нам гэта ці не, але ж шчырая праўда (і – таксама факт!), што тыя самыя беларускамоўныя беларусы маюць нутраны падзел на тых, хто «ўжо беларусы», і тых, хто «яшчэ беларусы». Для першых іх беларускасьць як «горб», а для другіх – як *свабодны выбар*. Расейскамоўныя якраз стаяць пасярэдзіне, што моцна ўскладняе саму праблему. Ігнараваць гэта – значыць спрашчаць сытуацыю, сьведама ці нясьведама падманваць і сябе і іншых.

Калі мне сп. Дракахруст пачне даводзіць, дзей зробленыя ім высновы дыктуюцца сацыялягічнаю мэтадалёгіяй, што ж... тым горш для сацыялёгіі... Я пэўна ведаю, што навука ня зводзіцца да маніпуляваньня тымі ці іншымі данымі. Дзе няма розуму –

там няма навукі, якімі б аўтарытэтамі накшталт Дзюркгайма гэта ні прыкрывалася. Дарэчы, наконт апошняга: на клясыкаў навукі спасылацца варта, але заразом не забывацца, што ўсе клясыкі – дзеці свайго часу. Дзюркгайм жыў у залатую пару пазытывізму, і ягоны мэтад, ягоныя пасылы застарэлі ў той меры, у якой застарэў пазытывізм. Я б гэтага, можа, і не казаў, каб на кожным кроку ня бачыў у Дракахруста дагматычнае веры ў факт і яго *адназначнае* прачытаньне.

Дзеля аспрэчаньня апошняга возьмем просты факт: *беларускія тэлевізійныя каналы я амаль што не гляджу*. Найперш з прычыны іх татальнае прарасейскасьці ды расейскамоўнасьці. І ўжо ў апошнюю чаргу – з прычыны іх неінфармацыйнасьці. Выходзячы з данага факту, без уліку матывацыі, мяне можна зьвінаваціць у антыбеларускасьці, а з улікам матывацыі – у расеяфобіі. Выснова яшчэ раз пераменіцца, калі я дадам, што з ахвотаю гляджу расейскія каналы. Цяпер мне няцяжка прыпісаць антыпатрыятызм. Але й гэта лухта. Проста расейскасьць на расейскіх каналах – рэч натуральная, а расейскасьць на беларускіх – скрайне агідная. (І, як бы ні сарамаціў мяне сп. Дракахруст – нічога не магу парабіць з такім пачуцьцём. «Розум кажа: суха, а сэрца – вільготна, / А што кажа розум, дык сэрцу маркотна», – пісаў Гальляш Леўчык.) Як бачым, факт можна варочаць па-ўсялякаму, тлумачыць, сутыкаць зь іншым фактам. І, калі статыстыка ня здольная ўлічваць падобных «дробязяў» – гэта яе праблемы.

САБАКА БУЛГАКАВА

Але крытыка мэтадалёгіі – рэч другасная. Куды важней высьветліць *анталягічны* статус тутэйшых лібэралаў і лібэралізму наагул, бо гэта якраз той бастыён, адкуль белым сьцягам махае сп. Дракахруст. Пачнём дазнаньне з рэчаў прыватных, «тутэйшых». Мяне ніколі не пакідала пытаньне: чаму мае суайчыньнікі, проста знаёмыя, у штодзённым жыцьці карыстаюцца расейскаю моваю? Што ім замінае перайсьці на беларускую? Да гэтае пары я мучаюся пытаньнем і не знаходжу канчатковага адказу. Лёс, нібы выпрабоўваючы, даваў мне

таксама розныя падставы для выбару. І да беларускасьці ніхто мяне не прынявольваў, нават школу я канчаў расейскую, а не беларускую. Адзінае, у чым не магу паскардзіцца на лёс – гэта хутаранскае маленства. Дзедаў хутар падараваў мне такое глыбокае веданьне мовы, якога ня здольныя даць усе ўнівэрсытэты разам узятыя. Ды каб нават ня гэта, хіба ж я не гаварыў бы на мове свае бацькаўшчыны? Чаму ж я ды частка маіх сяброў гаворым па-беларуску, а іншая частка – не? Чаму знаходзяцца беларусаеды сама шырокага спэктру?

Жаданьне асымільваць беларусаў мае ўсяго дзьве падставы: нізкую культуру і незычлівасьць. Нізкая культура бывае рознай прыроды. Асыміляцыі іншых народаў прагнуць зазвычай людзі грубыя, прымітыўныя, гэткія душэўныя матэрыялісты, якія наагул не разумеюць каштоўнасьці слова *культура*. Але тая прымітыўнасьць можа быць і адноснаю, не кранаць душы асобы. Інакш кажучы, гэта звычайная неінфармаванасьць, недасьведчанасьць. Апошняя, сваім парадкам, можа таксама быць вынікам старэньня і закасьцяненьня асобы, што выліваецца ў дагматычнае нежаданьне ведаць і ўспрымаць нешта новае. Возьмем, прыкладам, Салжаніцына як «цывілізаваны» ўзор расейскага шавініста. Чалавекам нізкай культуры яго ніяк не назавеш, але як асоба ён сфармаваўся вельмі даўно і не заўсёды на найлепшых жаролах. Як па-дзеля мяне, дык менавіта недасьведчанасьцю тлумачыцца яго шавінізм поглядаў што да беларусаў ды ўкраінцаў.

Але пакінем без разгляду абыякавасьць тых ці іншых замежнікаў да лёсу нашай культуры. Таксама ня будзем чапаць недасьведчаных, з абодвух бакоў, бо апошняе папраўляецца проста: асьветаю. А прыгледзімся да тых, хто сам ёсьць беларусам ды мае заразом усе падставы спрыяць беларускай культуры, у прыватнасьці беларускай мове, але ня робіць гэтага, або стоячы ўбаку, або сьведама шкодзячы. Што імі рухае? Тое, што я далей напішу – гэта толькі гіпотэза, мая асабістая і нават асабовая, здагадка, для якой, на жаль, не знаходжу альтэрнатывы. Я прыйшоў да высновы, і прыйшоў ня ў ходзе дыскусіі, а вельмі даўно (дыскусія толькі нагода выказацца), што ўсім гэтым людзям бракуе свайго роду *спачуваньня. Ім абсалютна дастаткова іх расейскамоўнай*

Беларусі, сьвету пераважнай большасьці, вельмі трапна і дарэчы падказвае мне сп. Дракахруст. Нашто ім адрывацца ад цёплых, наседжаных крэслаў, ісьці да паліцы ды браць у рукі слоўнік, напружвацца?

«Для беларуса, які сур'ёзна чытаў Францішка Багушэвіча, пісаць не на роднай мове – азначае мучыць сябе згрызотамі сумленьня», – пярэчыць Валер Булгакаў. Аднак, каб не даймала сумленьне, знаходзяцца лібэральныя сацыёлягі, якія пад звычайную чалавечую ляноту падводзяць ідэалягічную базу. Ляноту я яшчэ гатоў зразумець і мушу зь ёй лічыцца, а вось тэарэтыкаў ляноты разам зь іх сафістыкай... прабачце... Асабліва цікавай адменаю духовай ляноты ёсьць жаданьне далучыцца да культуры мацнейшай. Спрыяць беларускай мове цяжка, клопатна, а часамі проста непрэстыжна. Затое кожная няздарыца, якая далучаецца да культурных прадуктаў Вялікай імпэрыі, адразу ўзрастае ў сваіх вачох. Такая ня стане Натальляй Арсеньневай і не паедзе, як лорд Байран, змагацца за свабоду паняволеных народаў. Такая будзе сядзець у крэсьле і разважаць...

І тут мне ўспамінаецца яшчэ адзін сабака, на гэты раз з аповесьці Міхаіла Булгакава:

...а сабака Шарык, прывалiўшыся, ляжаў на каберцы каля скураной канапы...

«Так пашэнціла мне, так пашэнціла, – думаў ён, задрэмваючы, – не расказаць як пашэнціла. Укараніўся я ў гэтай кватэры. Урэшце я ўпэўніўся, што ў маім паходжаньні нячыста. Тут не без вадалаза. Цягачка была мая бабка, зямля ёй пухам, старой. Праўда, галаву ўсю пашахалі чамусьці, але гэта пакуль жаніцца загаіцца. Нам на гэта ня варта зважаць.

Магія мацнейшай культуры – гэта той грунт, на якім паядноўваюцца лібэралы і крайнія шавіністы. Лібэралы ў палеміцы з шавіністамі любяць успамінаць выказваньне Лява Талстоя пра патрыятызм як апошні прытулак нягодніка. Чаму нягодніку так утульна ў патрыятызьме (я б удакладніў: у

патрыятызьме *вялікай* культуры)? Бо гэта вялікая выгода, як той казаў, эканомія душэўных сілаў. Беларускі ж патрыятызм дае вельмі мала дывідэнтаў. Гэтая, кажучы словамі Хлестакова, «лёгкасьць надзвычайная» і паядноўвае скрайнасьці. Я ўжо даўно заўважыў няўлоўнасьць, эфэмэрнасьць пераходу паміж тутэйшым лібэралізмам і расейскім шавінізмам беларускага гатунку. Але вернемся да галоўнай лініі разваг, да лібэралізму наагул.

Правы грамадзяніна вышэйшыя за інтарэсы дзяржавы або нацыі (Злотнікаў). Вось слова-ключ! Больш нічога казаць ня трэба. У гэтай фразе, соткі разоў прамоўленай, соткі разоў чутай, замыкаюцца і вытокі лібэралізму, і наступнасьці, якія зь яго вынікаюць. А таксама яго плюсы і мінусы. *Бздура!* – крычыць Злотнікаву Ігар Хаменка. Ведама... Каб жа гэтая «бздура» не была яшчэ сымбалем веры для плоймы ідэолягаў, дык і была б яна ўсяго толькі бздураю. А так... Гэта ня бздура. Гэта прынцып, максыма, можна сказаць, сьвятая карова... Хто не паважае такіх рэчаў – рызыкуе абярнуцца цямрэжнікам, добра, калі невукам, горай – фашыстам. Бо, на жаль, людзі, якія вызнаюць той ці іншы прынцып, маюць схільнасьць, ці мімаходзь, ці пасьлядоўна, ператвараць яго ў закон.

Я разумею эўрыстычную каштоўнасьць прынцыпу перавагі асобы над калектывам. Гэта адзіны спосаб абараніць ад першабытнага камунізму наш нутраны сьвет, нашую асабовасьць, тую заваёву, якую дало нам эўрапейскае Асьветніцтва. Каб абярнуць унявеч гэтую заваёву і выдумваюцца ўсялякія «праваслаўныя саборнасьці» (праваслаўе тут ні пры чым), усялякія «савецкія калектывізмы» і да т. п. Але ўявім хоць на хвілінку, што мы гэты прынцып абвясьцілі ўсеагульным законам! Або – зрабілі яго альгарытмам штодзённае практыкі. Ніводная пастанова парлямэнту ня зможа быць прынятая. На кожным кроку мы спаткаем абсурд, корань квадратны з адмоўных лічбаў. Так! І не пагодзіцца з гэтым хіба толькі дарэшты зашораны, замбаваны ды абмежаваны дагматык ад лібэралізму.

Такім парадкам, прынцыпы трэба адрозьніваць ад законаў. Але бяда ў тым, як я ўжо зазначаў, што ўсе прынцыпы маюць

схільнасьць да абсалютызацыі і дагматызацыі. А таму ўсе канцэпцыі грамадзтва, усе ідэалёгіі маюць сваю *ахілесаву пяту* – той падступны мэханізм, які й вядзе іх да выраджэньня ды няўхільнае ратацыі. Калі запыніць ратацыю ідэалёгіяў, дык найгуманьнейшая зь іх стане пачвараю, «драконам» з казкі Шварца. У грунце лібэралізму, менавіта ў узвышэньні адзінкі, тоіцца адумысны «дракон» – *анталягічны эгаізм*. Калісьці Канстанцін Лявонцьеў назваў хрысьціянства зь яго асабістым збавеньнем «трансцэндэнтным эгаізмам». Вось жа, тэрмін *анталягічны эгаізм* я прапаноўваю паводле аналёгіі. Сэнс яго палягае ў завужанай рэдакцыі славутага выразу Пратагора: *Чалавек – мера ўсіх рэчаў*. Для лібэрала гэты выраз мусіў бы гучаць так: *Індывід – мера ўсіх рэчаў*.

Для лібэрала найважнейшае ягонае «я». Ужо з самой абсалютызацыі індывіда лягічна вынікае некрытычнае стаўленьне да зьместу гэтага «я». Інакш кажучы, каштоўнасьць індывідуальнага *эга* пастулюецца апрыёры. А раз так, дык няма такой культурнай каштоўнасьці, якая не магла быць ускладзеная на ахвярнік ненажэрнага, самаўлюбёнага *эга*. Ці яно ўбогае насамрэч, ці не, але плён цэлых пакаленьняў геніяў і «нягеніяў» становіцца вартым у той меры, у якой яго прымае «сьвятое» *эга*. Цікава, што плён гэтага эга, сваім парадкам, можа (і мусіць) быць пажэрты чарадою наступных *эга*. Ясна, на такой глебе культуры не пабудуеш ніколі. Каб будаваць культуру, патрэбныя інстытуты для рэгуляваньня індывідуальных памкненьняў. А на грунце голага індывідуалізму можна будаваць цывілізацыю, што заўгодна, толькі не культуру. Самаўлюбёны індывід перш-наперш цэніць уласны камфорт, а ўжо тады – духовыя каштоўнасьці. Высокая культура для яго – толькі частка камфорту.

Аднак абмыла ўсіх крытыкаў анталягічнага эгаізму ў тым, што яны не выходзяць за абсягі апазыцыі *адзінка – калектыў*. Нападам падпадае не эгаізм, а *індывідуалізм*, які насамрэч ёсьць каштоўнасьцю і вялікім здабыткам людзтва. Адпаведна, ухваляецца калектывізм, найагіднейшы апэндыкс дзікасьці, за якім не праглядваецца сур'ёзных каштоўнасьцяў. Таму далей я мяркую крытыку індывідуалізму толькі ў адным, спэцыфічным, ракурсе – анталягічнага эгаізму. Замест простае апазыцыі

індывідуалізм – калектывізм я прапаную апазыцыю парадаксальную: *індывідуалізм – культуралізм*.

З прыроды чалавек вылучаецца тым, што стварае культуру. Але культура – толькі прадукт, вонкавая праява багацьця душы. Калі мы кажам, што кожны чалавек – гэта цэлы сьвет, дык перш-наперш цэнім у біялягічным індывідзе *асобу*, індывіда культурнага. Ведама, біялягічны індывід не вымыкаецца з асобы, бо ёсьць матэрыяльнаю базаю для яе. Ці не падмяняе лібэралізм чалавека як культурную асобу чалавекам як індывідам? Такая падмена вядзе да свавольства чалавека біялягічнага.

Што да калектывізму, дык гэта – наш учорашні дзень. Тэрміты, мурашы, пчолы, аб'яднаўшыся ў калектывы, дасягнулі вялікіх посьпехаў, але менавіта індывідуалізм зрабіў людзей людзьмі. Можна сказаць так: індывідуалізм – гэта найвышэйшая, *асабовая* форма калектывізму. Індывідуалізм не разбурае калектывізму, а ўзбуйняе яго, памнажае ў бясконцай прагрэсіі. Калі мы ня хочам вярнуцца ў стадыю тэрмітаў, дык павінны ахоўваць свой індывідуалізм. І ўсё ж... без культуралізму ён нішто. Індывідуалізм і культуралізм – гэта судапаўняльныя супраціўнасьці. Калі індывідуалізм ахоўвае генія ад замахаў натоўпу (не замінаючы кожнаму з натоўпу ўзвысіцца і таксама стаць геніем), дык культуралізм, наадварот, ахоўвае супольны плён ад замахаў індывідаў, ня здольных ацаніць яго вартасьцяў.

Чалавек індывідуальны без культуры падобны да рысі, чалавек калектыўны і таксама без культуры – да ваўка. Я ня бачу паміж імі вялікай розьніцы. Назіраючы за манерамі цывілізаваных, цалком рэспэктабэльных людзей, мяне час ад часу не пакідае дзіўнае адчуваньне, што перада мною «крыху жывёлы». Тое, што для цябе *гарачае* – для іх *халоднае*. Пакуль ты сэнс свайго жыцьця зводзіш да пытаньня, выжыве ці ня выжыве беларуская мова, яны тым часам спакойна разважаюць: «выжыве ці ня выжыве». Не – значыць «не», так – значыць «так». Для адных лепей «так», для іншых лепей «не». Гэтае адрозьненьне не прынцыповае. А ты для іх з сваёй палкасьцю, мала сказаць – «дзівак», «вар'ят», ты для іх – іншаплянэтнік. Яны паглядзяць на

цябе ды плячыма паціснуць...

Існуе думка, што перад абліччам глябальных катастрофаў мы на гвалт мусім захаваць чалавека як від. У мяне на гэты конт адразу ўзнікае заўвага, а ці варты чалавек адумыснае апекі, раз ён ня ўмее захоўваць сваёй жа культуры? У чым яго перавага супраць павукоў і гадаў? Душа? Дык культура і ёсьць выразьнікам душы! Чаму наяўнасьць душы бярэцца апрыёры, а не даводзіцца самым жыцьцём людзтва? Я тут не кажу, што існуюць вечныя прадукты культуры, але чаго вартыя нашыя стварэньні, якія не імкнуцца стаць вечнымі? Чым геніяльная паэма лепшая за скрутак ружовай, пахнай туалетнай паперы? Думаю, інгрыдыентам вечнасьці, які ў ёй закладзены! Чым жа яшчэ! Вось жа, паміж правам выбіраць ежу і правам выбіраць мову існуе прынцыповая розьніца. *Гэта прадмет экалёгіі культуры, а не ўцісканьня правоў чалавека, як гэта імкнуцца падаваць* (Мацкевіч).

Аднак тая лібэральная тэорыя, што багоміць індывіда, ужо самой сваёй лёгікай разбурае гэтую розьніцу і становіць пагрозу для культуры. Я б сказаў так: гэта звычайная жывёльнасьць, якая апранаецца ў тогу гуманізму. Можа, я завастраю вуглы, але падобная інтуіцыя і адпаведная лёгіка – не маё вынаходніцтва. Яшчэ Максім Багдановіч стараўся падаць страту беларускае мовы як страту ўсяго людзтва. *Аднак за апошнія дзесяцігодзьдзі ў адзінцы беларускага нацыянальнага руху стварыўся пэўны супраціў гэтым антыкультурным уплывам,* піша ён ў адной з сваіх працаў. *Разьвіцьцё памянёнага руху дае спадзеў, што яшчэ адзін народ не зьвядзецца зь сьвету, не расточыцца бязь сьледу, аграмадная духовая праца шматлікіх пакаленьняў, і беларуская культура – твор гэтае працы, – выстаіць супраць напору іншых сілаў і плыняў.*

Свабода выбару – гэта толькі прынцып. Няма свабоды хадзіць голымі па вуліцах. Няма свабоды выпаражняцца пад плотам. Няма нават свабоды ня мець сярэдняй адукацыі. Некалі ў савецкіх школах паасобных вучняў вызвалялі ад вывучэньня беларускае мовы, а я дзівіўся: чаму ніхто не вызваляе ад матэматыкі, ад геаграфіі, ад фізыкі і біялёгіі, нават ад замежнае мовы? Чым беларуская мова так не дагадзіла, што ад

яе можна вызваліцца на беларускай зямлі? Нехта запытаецца: а чаму ёсьць свабода вывучэньня шумэрскае мовы? Бо няма шумэрскае дзяржаўнасьці, шумэрскага патрыятызму, шумэрскае моўнае палітыкі. Яны ўжо нікога ня рупяць. І калі хто прагне свабоды вывучэньня беларускае мовы, сам таго ня думаючы, ураўноўвае яе ў правох з шумэрскаю. Сам факт існаваньня такіх людзей мяне не зьдзіўляе. Аднак я зусім ня бачу розьніцы паміж тымі, хто дабіваецца свабоды вывучэньня беларускае мовы дзеля яе паступовага зьнікненьня, і тым, хто проста дабіваецца свабоды яе вывучэньня дзеля «гуманнага» сьвербу. Я ня бачу *практычнае* розьніцы паміж Дракахрустам і Лукашэнкам.

ДЗЕ САБАКА ЗАКАПАНЫ?

Анкетаваньне, праведзенае «ARCHE», дало зусім не найгоршыя вынікі. Як выяўляецца, далёка ня ўсе з апытаных – заўзятыя прыхільнікі дзьвюхмоўя. Нехта досыць упэўнена заяўляе: *Дзяржаўная мова Беларусі мусіць быць адна – беларуская* (Букчын); *Я пакінуў бы дзяржаўнай толькі адну беларускую мову* (Мацкевіч). Нехта яшчэ вагаецца: *Мне б хацелася, каб былі дзьве раўнапраўныя мовы* (Алексіевіч), *на пераходны пэрыяд, магчыма, і назаўсёды…* (Алексіевіч), *з паступовым ростам прэваляваньня беларускай* (Панькоўскі). Бачым, што ваганьні ўжо даюць трэшчыну: *галоўнай мовай павінна быць беларуская* (Панькоўскі). Здаюцца нават сама цьвёрдыя русафілы: *Цалкам расейскамоўнай Беларусі ня прагне, бадай, ніхто* (Дракахруст). От дзякуй! Хоць гэтым пацешыў! Вельмі слушныя і дарэчныя заўвагі, што з увядзеньнем беларускай мовы *ня трэба сьпяшацца* (Мацкевіч) і ўводзіць яе *паступова, акуратна* (Марцаў).

Але калі даходзіць да беларусізацыі, дык гучаць нейкія вялыя прапановы наконт *прэстыжных навучальных установаў зь беларускй мовай навучаньня і разнастайных формаў матэрыяльнага стымуляваньня* (Багданкевіч); *здаваньня экзамэну на веданьне дзьвюх дзяржаўных моваў* (Фядута) і да т. п. Мова адразу ж аддаецца стыхіі індывідуалізму: *паводле прынцыпу добраахвотнасьці* (Фядута); *каб… выбіралі бацькі*

(Сасноў); *добраахвотны выбар бацькоў* (Багданкевіч); *прынцып добраахвотнасьці* (Злотнікаў); *вольнае навучаньне* (Заіка); *паводле волевыяўленьня грамадзянаў* (Марцаў). У апытанцаў не разьвітае стратэгічнае бачаньне, адсюль скразны матыў: *у цяперашняй моўнай сытуацыі* (Дракахруст); *у цяперашніх умовах* (Багданкевіч); *у гэтай сытуацыі, у гэты канкрэтны гістарычны пэрыяд* (Марцаў). Для сучаснасьці ў іх не існуе альтэрнатывы: *Я думаю, гэты шанец – быць асобна ад Расеі ў Эўропе – мы прапусьцілі* (Алексіевіч); *Эўропа ўжо даўно саступіла Беларусь Расеі як зону ўплыву*. (Алексіевіч); *Я б таксама вітаў, каб беларуская мова была пануючай у нашым грамадзтве. Але гэта сёньня немагчыма* (Сасноў). Зьдзіўляе нявольніцкая абачлівасьць: *гэта адразу прывядзе да ўскладненьняў адносінаў з Расеяй; гэта нявыгадна Эўрапейскаму Зьвязу* (Фядута).

Я асабіста супраць выцясьненьня адной лінгвістычнай сыстэмы празь іншую, заяўляе Заіка. Між іншым, пры чым тут сыстэма? Мова – сыстэма, але выштурхоўваецца яна не як сыстэма, а як рэч, як дадзенасьць, а сыстэма нават у мёртвых моваў жыве. Часамі гэтая ж ідэя гучыць пад выглядам сьвятой наіўноты: *Чаму сьвядомыя беларусы так змагаюцца за адну дзяржаўную мову?* – пытаецца Сасноў. Чытаеш такое – і злосьць бярэ: няўжо людзі ня ведаюць, што дзьвюхмоўе – гэта скрайне няўстойлівая моўная сытуацыя, якая рана ці позна абяртаецца аднамоўем! Толькі вось пытаньне: якім? Дзьвюхмоўе – тэорыя для «чайнікаў» і «лохаў», якою прыкрываецца пераход да аднамоўя. Калі яе прапагандуюць, думаеш: ці людзям патрэбен лікбез, ці ім проста выгадна ўдаваць зь сябе прасьцячкоў?

Ну што рабіць зь «беларускім комплексам», які вагаецца паміж «пануючай мовай» і «экзотыкай»? – іранізуе Букчын: *...ня будзе гэтых штучных падыходаў, «прымерак» да флямандзкай ці ірляндзкай*. І акурат пападае ў свайго, бо менавіта Дракахруст першы загаварыў пра Бэльгію. Насамрэч памянёныя ваганьні задаюцца не «прымітыўнымі» нацыяналістамі, а самім жыцьцём. Нехта, каб знайсьці апраўданьне, прымерваецца да Швайцарыі, нехта да Аўстрыі, нехта да Бэльгіі, нехта да Ірляндыі, нехта да Канады... Аднак існуюць простыя лінгвістычныя законы: дыглясія – адносна ўстойлівая сытуацыя, а дзьвюхмоўе – наадварот. Калі пры дзьвюхмоўі

мінарытарную мову адумысна не бараніць – яе заступае мажарытарная. Мультылінгвізм у абсягах аднаго гаспадарства захоўваецца пры тэрытарыяльным распадзеле ці калі сілкуецца моцнаю культурнаю мэтраполіяй. Вось збольшага і ўсё.

Асыміляцыя – гэта роўнасьць? …ці прызнае ён, у парадку роўнасьці, права «стыхіі» асыміляваць яго самога? – гуманна абураецца Дракахруст. Пазьней выявілася: гэтае палкае пытаньне, адрасаванае Жукоўскаму, узьнікла зь непаразуменьня. Але такой бяды… Я прымаю яго на сябе. І пасылаю ў пекла такую роўнасьць. Прабачце за прастату: я ня веру, што асобы, у якіх не баліць сэрца за культуру, здольныя «хварэць» за людзей. Якую трэба мець мэфістофэльскую падступнасьць, халодную абыякавасьць да беларускае мовы, каб гаварыць пра роўнасьць! У расейскае мовы за плячыма ёсьць Расея, а ў беларускае няма нічога апрача Беларусі. (Затое ў беларускамоўных беларусаў ёсьць якая-ніякая свая культура, а ў расейскамоўных – транты «с барского плеча».) Што да асыміляцыі і «стыхіі», дык пытаньне рытарычнае. «Стыхія» цэлы век мяне асымілюе, не пытаючыся ў запісных гуманістаў дазволу, праўда, пакуль што бяз посьпеху…

Беларусізацыя запраўды пагражае пэўным дыскамфортам расейскамоўным. І гэты дыскамфорт трэба на гвалт мінімалізаваць, каб ня шкодзіць справе. (Сабатажнае беларусізацыі мы ўжо наеліся!) Але гуманізм камфорту – гэта якраз тое, супраць чаго я выказваўся вышэй. Вага такога гуманізму ня большая, чым эстэтычная вартасьць рэклямнае паэзіі. Калі спадары гуманісты супраць асыміляцыі ці беларусізацыі расейскамоўных беларусаў, дык дзе выйсьце? Адкуль узяць беларускамоўных? Зь месяца? Выгадаваць у прабірках? Падвысіць нараджальнасьць сабе падобных? А тым часам «стыхія» ня дрэмле і не пытаецца… Тым часам акупацыйны (ці «крэольскі»?) рэжым і падступныя суседзі ня сьпяць у шапку. Ці, можа, сп. Дракахруста задавальняе сучаснае становішча беларускае мовы, і ён хоча яго «замарозіць»?

Найлепшым дасягальным варыянтам у моўнай, культурнай сфэры ёсьць той, які склаўся ў сфэры канфэсійнай, голасам

сырэны заваблівае Дракахруст. Першае: у рэлігійнай сфэры сытуацыя вельмі далёкая ад згоды і паразуменьня, куды больш ваяўнічая, чым у моўнай. Другое: шматканфэсійнасьць – гэта таксама ідэфікс. Якую яна шкоду прынесла беларусам за ўсю гісторыю – ня трэба казаць. Мала таго, свабода веравызнаньня можа быць розная. І ў сваім скрайнім, закончаным выглядзе выгадная хіба толькі атэістам: калі ўсе рэлігіі роўныя, дык няма ніякае! (Але гэта ўжо асобная тэма.) Трэцяе: трэба быць надта непрафэсійным сацыёлягам, каб ня ведаць, што моўныя, рэлігійныя, эстэтычныя і інш. сыстэмы маюць розную ступень татальнасьці і, адпаведна, функцыянуюць паводле розных законаў. Усякае перайманьне – гэта дактрынэрства чыстай вады, утапічная сацыяльная інжынэрыя! Пад выглядам слыннае роўнасьці прапануюцца скрайне сумнеўныя ўтопіі: *Клясычны падыход* (NB!!!), хітруе Марціновіч, *тэхнічныя навукі… па-расейску… гуманітарныя – па-беларуску*. Я думаю, што ўсё гэта тая прастата, пра якую расейцы кажуць «хуже воровства».

А вось яшчэ адна яго хітрасьць: *Можна, дарэчы, сфармуляваць зусім амбіцыйны праект для будучай дэмакратычнай Беларусі: прывесьці з сабой у Эўропу свайго няўрымсьлівага і непрадказальнага «старэйшага брата»*. Гэта называецца: як ня ў дзьверы, дык праз акно! Мне глыбока ўсё роўна, дзе Расея, у Эўропе ці Азіі, гэта яе нутраная справа, абы ў Беларусь не мяшалася. Для нас жа, не зважаючы на ўсе заганы сучаснае Эўропы, іншыя альтэрнатывы куды горшыя. Колькі б ні баялі расейскія нацыяналісты пра «эўразійскі рай», яны ня здатныя ні на што лепшае, як толькі змалпаваць тую самую Эўропу ці Амэрыку. А ня выйдзе – узяць ды з роспачы пазакручваць гайкі на азіяцкі капыл. (Працэс, дарэчы, пайшоў!) Вось і ўся загадка расейскае душы. Так, *шлях у Эўропу пралягае менавіта праз Маскву*. Але… з часоў падзелу Рэчы Паспалітае. Хіба радавацца гэтаму? Ці мо’ пагадзіцца з гэтым? Калі гэта не каляніялізм, дык што тады каляніялізм? Гісторыя паказвае: на Ўсходзе нас чакае толькі адно – братняе паляпваньне па плячы і поўная асыміляцыя. Іншых ластавак адтуль не прылятала.

Мае зьвінавачваньні Дракахруста ў сафістыцы не галаслоўныя. Улюбёнае прыймо лібэралаў: тонкая эўрыстыка з прысмакам маралізму. Пачну здалёку, у сярэдзіне 1990-х адна выкладніца

расейскае літаратуры, якая да ўсяго беларускага ставілася неяк паблажліва, з гэткім зычлівым снабізмам, уласьцівым каляніяльнай інтэлігенцыі, але ніяк не варожа, нечакана прызналася: «Я наконец поняла: это стыдно, что мы до сих пор не умеем говорить по-белорусски». А вось Дракахрусту за ЭГУ ня сорамна. І няхай сабе! Аднак замест таго, каб гаварыць аб справе, ён выкручваецца з дапамогаю ўсякага кшталту сафізмаў, вось, маўляў, вам парытэт: «ARCHE» друкуецца па-беларуску, а ў ЭГУ выкладаюць па-расейску. Некарэктнае параўнаньне. А галоўнае – не пра тое ў Жукоўскага! Ідзецца аб тым, што вартасьць той беларускай навучальнай установы, выпускнікі якой *не валодаюць* (валодаць і карыстацца – розныя рэчы) моваю тытульнай нацыі, апрыёры паніжаецца. Тут ніхто ні на чые правы не пасягае, а ўсяго толькі зьняпраўджваецца вера ў Дракахруставу ўтопію (ці ідылію) дзьвюхмоўнай Беларусі.

Што ж, дапусьцім, быццам можна ствараць культуру на чужой мове, быць г. зв. «расейскамоўным беларусам». Хай сабе, калі гэта так... Але гэта ня так! Гаварыць пра расейскамоўных беларусаў менавіта як пра беларусаў – неяк няшчыра, ці, прынамсі, нелягічна. Беларуская расейскамоўная культура – у лепшым разе – яшчэ толькі ствараецца. У горшым – яе няма і, баюся, ніколі ня будзе. А раз так – мне цікава даведацца, як павінны жыць і пачувацца людзі, якія ўважаюць сябе за беларусаў, але ня маюць уласнай культуры, традыцыі, якія вымушаныя жывіцца крохамі з суседзкага стала? Яны ня хочуць спажываць беларускамоўнай прадукцыі і ня маюць паўнавартай сваёй, расейскамоўнай. Што ім, бедным, рабіць? Можа, адзін асобна ўзяты індывід неяк і перабудзе гэткую нязручнасьць, а што рабіць нацыі? Ці можа гэта мінуцца без наступнасьцяў для яе духовага здароўя? Баюся, што без усялякіх комплексаў – правінцыйных, імпэрскіх, манкуртаўскіх і да т. п. – тут не абыдзесься.

Такое становішча, пры вонкавай адукаванасьці, начытанасьці, а хоць бы нават максымальнай, ня можа не ствараць інтэлектуальнага аўтсайдэрства, зоны духовай галечы, паняверкі. Найгорай жа тое, што гэтая культурная пустэльня можа расьцягнуцца на гады, на стагодзьдзі, паволі

пераможўваючы лёсы цэлых пакаленьняў, перарабляючы іх на мякіну правінцыйнасьці і мяшчанскасьці. Культуры расейскамоўных беларусаў у нас папросту няма, ёсьць толькі апалягеты жывата. Людзі ж, каб як найхутчэй ухіліцца ад абдымкаў пустэльні, маюць усяго два выйсьці: далучыцца да мэтраполіі ці адрадзіць уласную традыцыю. Вось дзеля чаго беларусізацыя! Яна мусова патрэбная ня толькі дзеля экалёгіі культуры, але й з погляду на здароўе культурнае супольнасьці, нацыі. Грамадзяне, узрослыя на імпартаванай культуры, якія ведаюць, што *сьмятанка, вяршкі* – ТАМ, а ТУТ – *сыроватка*, ня могуць быць гаспадарамі свайго становішча. Яны могуць быць выканаўцамі, спажыўцамі, кім заўгодна, толькі ня творцамі.

Калі нехта любіць капацца ў «мэнтальнасьці», дык ці ня тут «сабака закапаны»? Адныя нас вучаць, быццам «славяне» (слова па-оруэлаўску хітрае, непадатлівае варожаму выкарыстаньню) ня маюць досьведу дэмакратыі, другія, наадварот, складаюць сагі пра вялікія традыцыі дэмакратыі ў Вялікім Княстве Літоўскім, а тая мэнтальнасьць – уся на паверхні, у нашым няпэўным становішчы, якое хаця-нехаця прыніжае чалавечую годнасьць. Носьбіту расейскамоўнай культуры можна жыць бяз комплексу правінцыйнасьці і ў Волагдзе, і ў Петрапаўлаўску-Камчацкім, а вось у Менску – ня могуць не пачацца праблемы. Як павінен пачувацца тут чалавек, які імпартуе Пушкіна зусім не ад шырыні сваіх інтарэсаў, а таму, што не разумее мовы, на якой пісаў Купала? Гэта ж трагедыя асабовасьці! Якая тут можа быць незалежніцкая палітыка? Аўтсайдэру наагул не да палітыкі. Тым часам рэжыму непатрэбная ні беларуская, ні расейская культура. Росквіт папсы, славянскія базары, дажынкі, хакеі, лыжы – апасродкаваны, але натуральны вынік існага становішча.

Такім парадкам, патрэбная не канвэнцыя для захаваньня status quo, а спакойнае, негвалтоўнае і, у той жа час, настойлівае, неадкладнае разьвязваньне моўнага пытаньня, прытым – на карысьць беларускай мовы, бо ў іншы бок яно й без намаганьняў разьвяжацца. Некалі Сьпіноза вучыў, што гаспадарства мусіць так кіраваць сваімі грамадзянамі, каб яны самі таго не заўважалі. За гэтую ідэю я страшэнна не залюбіў Сьпінозы. Гэта вяршыня цынізму, антыўтопія ў адной фразе!

Але калі дадаць, што вольныя грамадзяне свабодна кантралююць такое кіраваньне, дык нічога цынічнага тут няма. Гэта якраз той ідэал, да якога павінна імкнуцца беларусізацыя.

І ЯШЧЭ ХВОСТ...

Пісаў я свае заўвагі і думаў: ці не занадта я бескампрамісны? Ці заўжды беларускамоўныя слушна кажуць? А прачытаўшы «Ліст да спадара Данілы Жукоўскага» Гэніка Лойкі, пераканаўся: не заўжды. Сп. Лойка ўпікае Жукоўскага за расейскую мову на працы і, як адмоўны прыклад, успамінае свайго знаёмага, які знаёміўся зь дзяўчынаю па-расейску. Сам ён даводзіць такое *credo*: беларусу на расейскую мову варта пераходзіць адно тады, калі існуе пагроза сьмерці. Але, маўляў, у жыцьці такіх сытуацыяў не бывае... Вось нацыяналізм, які мяне раздражняе ня менш за лібэралізм! Такім зацятым беларусам я звычайна кажу: раман Лява Талстоя «Вайна і мір» пачынаецца з доўгага французскага пасажу і далей такіх пасажаў утрымвае нямала, але ад гэтага не перастае быць расейскім раманам.

«Бальшавіцкая» бескампраміснасьць нікому не прынесла карысьці. Трэба запраўды быць вельмі «далёкім ад народу», каб не разумець, што праца ў негуманітарных асяродках зусім не такая простая для нацыянальнага пазыцыяваньня, як падаецца сп. Лойку. Адна мая знаёмая, якая ўсё жыцьцё прапрацавала ў беларускай атмасфэры, выгадавала беларускамоўнага сына, патрапіла, урэшце, на «звычайную вытворчасьць» і... мусіла загаварыць па-расейску. Аднак усё роўна, за адну толькі прыхільнасьць да беларускасьці яна ўспрымаецца там як «нацыяналістка». Думаю, куды плёньней нязмушана «гуляць» сваёй беларускамоўнасьцю, дзе трэба яе ўзмацняючы, а дзе трэба аслабляючы, чым упарта «ўпірацца рогам». А ці падумаў сп. Лойка, колькі людзей ён адштурхнуў ад беларускасьці сваёй бескампраміснасьцю?

Між іншым, той хлопец, які зьвярнуўся да дзяўчыны па-расейску, зрабіў у пэўным сэнсе слушна. Іншае пытаньне, як ён далей сябе павядзе, ці не пераможа яго дзяўчына? І, наадварот,

пераходзіць на расейшчыну толькі дзеля самавыратаваньня ня надта прыгожа, хоць тут цяжка што раіць... У жыцьці, дарэчы, бываюць усялякія дзівосы... Некалі, яшчэ ў 1980-я, у парку сярод белага дня за беларускую мову мне пабілі фізіяномію. Каб ухіліцца ад непрыемнасьці, варта было перайсьці на расейскую мову, але я не зрабіў гэтага.

Затое зь незнаёмымі жанчынамі я заўжды пачынаю гутарку па-расейску. Жанчыны – рэч тонкая... А мова, як паветра, павінна не заўважацца, быць празрыстаю. Эфэкт ад гаварэньня на нязвыклай мове такі самы, які мог бы быць ад каляровага паветра. Увага канцэнтруецца на мове, а не на табе, успрыняцьце цябе самога робіцца аднабаковым. Аднак я ніколі не хаваю сваіх беларускіх прыхільнасьцяў. А пераходжу на беларускую мову тады, калі жанчына прывыкае да мяне. Неяк з адной жанчынай я доўга не пераходзіў на беларускую мову. А калі загаварыў пра беларускасьць – яна прызналася, дзей ня любіць беларускае мовы, на што я адрэагаваў:

– Ведаеш, я гаварыў з табою па-расейску дзеля павагі да цябе і, пры патрэбе, гатоў з кожным так гаварыць, але май на ўвазе, той, хто ня любіць беларускае мовы – *мой асабісты вораг*...
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 5 (39) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/25
[image]

палітыка • эканоміка • палітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

С’ЮЗАН УОТКІНЗ

С’юзан Уоткінз Еўропу хістае

С’юзан Катс Уоткінз (Susan Cotts Watkins, нар. 26 кастрычніка 1938-га) – сацыёлаг. Выкладае ва ўніверсытэце Пэнсыльваніі. У сферы яе навуковых зацікаўленняў ляжыць дэмаграфія, гістарычная і кампаратыўная сацыялогія, сацыяльная трансфармацыя і ўнутранымі малодзь. Аўтарка кніжак «Feminism

---

І раней бывалі правалы ратыфікацыі еўрапейскіх дамоў, аднак сёлета непрадбачаны выбух масавай незадаволенасці ўнутранымі працэсамі ў Еўрапейскім Саюзе быў беспрэцэдэнтны. Адхіленне канстытуцыйнай дамовы ЕС на французскім і нідэрландскім рэферэндумах 2005 г. не суправажалася тым спалучэннем апатыі і знеахвочанасці, ірландцы ў 2001 г. прагаласавалі супраць дамовы ў Ніцы, а датчане ў 2000 г. – супраць еўра. І ў Нідэрландах, і ў Францыі назіралася высокая яўка выбарнікаў: 63 і амаль 70 % адпаведна. У абедзвюх краінах адносна маргінальныя сілы нефармальнага левага руху адыгралі цэнтральную ролю ў агітацыі супраць дамовы. І тут, і там галасаванне мела выразны класавы характар: большасць нізкааплатных работнікаў, прыхільнікаў лейбарыстаў і сацыялістаў прагаласавалі «супраць» насуперак пазіцыі партыйнага кіраўніцтва. Моладзь таксама стала ў выразную апазіцыю да дамовы.

У развіцці падзей у ЕС рэдка прасочваецца адзіная логіка: шматлікія сутыкненні паміж канкурэнтнымі дзяржаўнымі інтарэсамі, палітычнымі капіталамі, размаітымі эканомікамі і вонкавымі сіламі робяць Еўрасаюз зонай дзеяння закона непрадбачаных наступстваў. Вынікі сёлетняга правалу для будучага функцыянавання і пашырэння ЕС, што ўключае 25

дзяржаў, наўрад ці будуць выключэннем з яго. Тым не менш, першая рэакцыя на вынікі галасавання з боку лідэраў ЕС была дастаткова прадказальная: чым менш галасоў «за», тым больш гандлю. Але праблема, як «прадаць» іх мадэль Еўропы, застаецца. Заснаваны ў паваенную эру сацыяльнай і хрысціянскай дэмакратыі, ЕС значна змяніўся і развіўся: ён інстытут эпохі ліберальнай гегемоніі. Рэферэндумы 2005 г. выявілі новы палітычны ландшафт кантынента лепш, чым любое апытанне «Еўрабарометра». Яны агалілі не толькі прорву паміж электаратам і элітамі, што далёка не навіна, але і праблему выпрацоўкі палітыкі, альтэрнатыўнай «неаліберальнаму парадку».

ЛАГЕР «ЗА»

На першы погляд, афіцыйная кампанія за канстытуцыйную дамову здавалася прывабнай і даволі пераканаўчай і мела падтрымку пераважнай большасці палітычнага і медыйнага істэблішменту. Як сцвярджалася[1], дамова, хаця і «не абсалютна дасканалая», яна зробіць ЕС больш дэмакратычным, эфектыўным, мадэрнізаваным, празрыстым. Еўрапейскі парламент набудзе больш паўнамоцтваў, права вета асобна ўзятай дзяржавы па ключавых пытаннях будзе абмежавана, і будзе закладзены падмурак супольнай замежнай і абарончай палітыкі. Вынікам будзе мацнейшая Еўропа, здольная стрымліваць імперскія амбіцыі Злучаных Штатаў. Без гэтага, папярэджваў чытачоў «Le Monde» Тымаці Гартан Эш напярэдадні галасавання, амерыканская супердзяржава ізноў будзе «стаяць перад спакусай заставацца такой у поўнай адзіноце».

У Францыі кампанія «за» была распачата пампезнай дэманстрацыяй аднагалосся ў Версалі 28 лютага 2005 г., калі сенатары і дэпутаты сабраліся на спецыяльную сесію Нацыянальнага сходу, каб ратыфікаваць дамову. Сілы поўнай боегатоўнасці, уключыліся ў кампанію. Серж Алімі на канале «Францыя Інтэр» «Стэфан Паолі падтрымае Бернарда Гета, які падтрымае П'ера Ле Марка, а той падтрымае Жака

[1] У «Le Monde», «Libération», «Le Nouvel Observateur», «Le Canard», «Marianne», «Le Point» і «Le Figaro» [Le Monde, 2005].

Ву Ёнгінь (Cambridge: Icon Books, 1993) і Уоллерстайн, Імануіл. Іншы 1968: Year in the Streets» (New York: W.H. Freeman and Company, 1998).

Марка Сільвестра»[2] без аніводнага голасу «супраць». Падчас узорнай мабілізацыйнай кампаніі, якую Перы Андэрсан назваў «саладжавым хаўрусам»[3] , у тэлестудыях збіраліся разам прэзідэнт Францыі, лідэры «Саюза за народны рух» і Сацыялістычнай партыі, журналісты «Figaro», «L'Express», «Le Monde», «Libération», «Le Nouvel Observateur», вядучыя прагрэсіўнай навін і ток-шоў, якія ў кампаніі з плеядамі знаканамітасцяў, ад кіназорак і да футбалістаў, дэманстравалі сваю гатоўнасць галасаваць «за». Прэм'ер-міністр Іспаніі, прэзідэнт Польшчы, канцлер Германіі адмыслова прыляталі ў Францыю, каб выказаць Шыраку сваю падтрымку. Інфармацыйны тыкет, не выдадзены і разасланы выбарнікам за дзяржаўныя гаворачы, быў не нейтральны, а змяшчаў просталінейную прапаганду «New дамову, як і спецыяльныя брашуры для школьнікаў, разасланыя міністэрствам адукацыі. Інвестыцыйны фонд «Caisse d'épargne» заявіў, што «дзякуючы Еўропе» ён павышае працэнтную стаўку для ўкладнікаў.

Калі, нягледзячы на ўсё гэта, апытанні пачалі выяўляць рост выбарнікаў, схільных галасаваць «супраць», тон стаў больш пагрозлівым. Праціўнікаў дамовы называлі ксенафобамі, расістамі, прыхільнікамі антытурэцкіх, антыпольскіх, антыеўрапейскіх поглядаў. Старонкі ліберальнай прэсы поўніліся заклікамі з абодвух берагоў Атлантыкі, у якіх падкрэслівалася важнасць галасавання «за» для пабудовы «еўрапейскай альтэрнатывы» амерыканскай звышмагутнасці. У «Le Monde» з'явіўся зварот да «нашых сяброў-французаў», яго падпісалі Вольф Бірман, Юрген Габермас, Аляксандр Клюге, Гюнтэр Грас і іншыя. Яны сцвярджалі, што галасаванне

[2] Halimi Serge. Médias en tenue de campagne européenne // Le Monde diplomatique. 2005. May.

[3] Anderson P. Union Sucrée // London Review of Books. 2004. 23

Гаспадар
ўсёй Паўдзённай Еўропы
«Cosmiere della Sera», «Frankfurter Allgemeine Zeitung», «Guardian», «Independent», «Financial Times», «New York Times», «Washington Post». Да гонару «Economist'а», ён не адмовіўся ад свайго ультраліберальнага скептыцызму, што да канстытуцыйнай дамовы, на працягу ўсёй кампаніі.

краін і для адносін са Злучанымі Штатамі. Галасаванне «за» было маральным абавязкам: «Мы маем яго перад мільёнамі і мільёнамі ахвяр нашых бессэнсоўных войнаў і злачынных дыктатур»[4]. У піку ўсёй гэтай істэрыі 2 траўня дамова была адхіленая 55 % галасоў «супраць» на 45 % «за».

У Нідэрландах механізмы гегемоніі набылі менш вытанчаную форму. Прэса, лідэры палітычных партый, цэрквы, кіраўнікі прафсаюзаў, асацыяцый наймальнікаў, нават клуб турыстаў заклікалі галасаваць «за». Нідэрландскі парламент, які першапачаткова заклікаў правесці рэферэндум, зацвердзіў канстытуцыйную дамову 85 % галасамі «за». Ізноў жа афіцыйная рыторыка станавілася ўсё больш апакаліптычнай, як толькі замаячыла параза. Прэм'ер-міністра Балкенэндэ трывожыў прывід Асвенціма, міністр эканомікі гаварыў аб «згаслым святле ў канцы тунеля», міністр юстыцыі – аб «балканізацыі» і вайне. Галасаванне 1 чэрвеня дало наступныя вынікі: 62 % супраць дамовы, 38% – «за».

ЧЫТАЮЧЫ ДАМОВУ

У абедзвюх краінах ключавым фактарам першапачатковай мабілізацыі для галасавання «супраць» стала сама дамова. Нідэрландская мабілізацыйная кампанія вялася 40 тысячамі валанцёраў Сацыялістычнай партыі[5], на постэрах якой красаваўся памідор, які атакаваў адначасова бюракратызм і палітыку свабоднага рынку. У Нідэрландах Сацыялістычная партыя пакрэслівала, што 85 % тых, хто «добра азнаёміўся» з дамовай, мерыліся галасаваць супраць яе. Французскія дэбаты суправаджаліся інтэнсіўнай адукацыйнай кампаніяй, якая перамяніла першапачатковы спагадны настрой большасці на процілеглы. Пасланне істэблішменту – больш дэмакратычная, эфектыўная, празрыстая Еўропа, здольная лепей сфармаваць альтэрнатыву ЗША – знаходзілася ў рэзкай супярэчнасці з самім тэкстам.

Дамова захоўвала ў нязменным выглядзе неверагодна вычварную і недэмакратычную будову ЕС, якая ствараўся пачынаючы з 1957 г. Наднацыянальная камісія, маючае манаполію на заканадаўчую ініцыятыву, мелася па-ранейшаму прызначацца шляхам дыпламатычнага гандлю паміж урадамі дзяржаў-членаў; як і даўней, еўрапейскія выбарнікі былі пазбаўленыя права вызначаць склад выканаўчага органа ЕС, Павелічэнне ролі самітаў кіраўнікоў урадаў для Еўрапейскай рады, Еўрапейскі суд, які разглядае пераважна гаспадарчыя справы, Цэнтральны банк і міжурадавая Рада міністраў[5] і іншымі складнікамі гэтага неафеадальнага інстытуцыйнага ландшафту[6]. Еўрапейскі парламент мусіў застацца толькі кансультацыйным органам, які не меў бы дастатковых паўнамоцтваў, каб заблакаваць або ініцыяваць заканадаўчыя акты, хаця і надзяляўся правам уносіць папраўкі, якія Камісія магла прыняць або адкінуць, калі палічыць гэта патрэбным (гэтая была «найбольш дэмакратычная» норма дакумента). Нанова таксама закранулі парадак размеркавання колькасці галасоў розных краін у Радзе міністраў: за кошт Францыі мусіла павялічыцца ўплыў Германіі, колькасць галасоў Іспаніі і Польшчы мусіла знізіцца ў прапорцыі, зацверджанай у 2000 г. Акрамя перайменавання пасады Хаўера Саланы («міністра замежных справаў» замест «вярхоўны прадстаўнік») падтрыманай дыпламатычным корпусам, і ператварэння пасады ранейшага прэм'ер-міністра з тэрмінам паўнамоцтваў у шэсць месяцаў у пасаду старшыні Рады міністраў з тэрмінам паўнамоцтваў у трыццаць месяцаў канстытуцыйная дамова змяшчала мала новага.

Яна не была «фундаментальным палітычным актам», як некалі спадзяваўся Юрген Габермас[7]. Не была яна і канстытуцыяй, у сэнсе прававой базы, у рамках якой могуць абмяркоўвацца і прымацца розныя палітычныя акты; замест гэтага дамова ў падрабязнасцях распісвала, якімі яны павінны быць, аж да мікрааперацый, звязаных са свабодным гандлем таварамі і паслугамі. Камісія, Еўрапейскі суд і Цэнтральны банк былі пакліканыя праводзіць у жыццё неаліберальную праграму. І

5 З 1972 г. на
ранейшаму
ураднікі
дыпламатычнага
рангу
Пасаду
Старшыні
Рады
міністраў
ліквідавалі
ў 1993 г.
6 Гл. таксама
Ulrich Beck,
Cosmopolitan
Vision,
Cambridge
2006, p. 14.
7 Jürgen
Habermas,
'Why Europe
Needs a
Constitution',
New Left
Review 11,
September–
October 2001.
Гл. таксама
Jürgen
Habermas,
'Constitutional
Democracy: A
Paradoxical
Union of
Contradictory
Principles?',
Political
Theory, June
2001.
8 Гл. Ulrich
Beck, Power in
the Global Age,
Cambridge
2005, p. 109.
9 Гл. Ulrich
Beck, Power in
the Global Age,
Cambridge
2005, p. 109.
10 Гл. Ulrich
Beck, Power in
the Global Age,
Cambridge
2005, p. 109.

Старкі з'ехаўшыся (прыехаўшы) у сваю чарговую сталіцу, пакладуць (ці пакладуць) ці не ўскладуць (ці не ўскладуць) ці не ўскладуць (ці не ўскладуць) ці не ўскладуць (ці не ўск

працэсу паўстане дэмакратычны эканамічны і палітычны саюз, а Еўрапейскі парламент будзе надзелены рэальнымі заканадаўчымі паўнамоцтвамі. На працягу 1980-х гг. гэтая ідэалагічная формула аказалася вельмі прыдатнай для трансфармацыі Еўрасаюзам статычных дыктатур у Грэцыі, Іспаніі і Партугаліі – краінах з моцнымі камуністычнымі партыямі і рэвалюцыйнымі традыцыямі – у ліберальныя капіталістычныя дэмакратыі, надзейна зацягнутыя ў заходнія абарончыя альянсы.

З 1989 г. геапалітычная сітуацыя ў Еўропе несупынна мянялася. Па-першае, на парадку дня з'явілася пякучае пытанне аб'яднанай Германіі: як трэцяя велічынёй эканоміка свету, яна магла дамінаваць у «Mitteleuropa» і, тэарэтычна, на сваіх умовах дамаўляцца з Масквой. Па-другое, паколькі савецкія танкі паехалі назад на Урал, больш не было пераканаўчых аргументаў на карысць прысутнасці НАТО ў Еўропе. Нарэшце, пасля калапсу Рады эканамічнай узаемадапамогі і Варшаўскага пакта цэлы пояс дзяржаў звярнуўся да Захаду па эканамічную дапамогу і гарантыі бяспекі. Для Злучаных Штатаў, перад якімі стаяла задача ў новых формах навязаць свой парадак на тэрыторыях, праз якія праходзілі раздзяляльныя лініі халоднай вайны – у Цэнтральнай Еўропе, на Блізкім Усходзе, у Сярэдняй Азіі, на Карэйскім паўвостраве – непасрэдным прыярытэтам у Еўропе было (1) не дапусціць любога далейшага збліжэння паміж Бонам і Масквой шляхам шчыльнейшага прывязвання Германіі да яе заходніх саюзнікаў, (2) заблакаваць любыя сур'ёзныя крокі ў кірунку выпрацоўкі незалежнай еўрапейскай абарончай палітыкі, (3) прымусіць ЕС выканаць (і прафінансаваць) працу для трансфармацыі цэнтральнаеўрапейскіх эканомік у адкрытыя, капіталістычныя эканомікі рынкавага тыпу, як гэта ўжо было паспяхова зроблена пад патранажам ЕС у міжземнаморскіх краінах. «Прасоўванне палітычных і эканамічных рэформаў на Усходзе з'яўляецца «натуральным пакліканнем» ЕС», – заяўляў Джэймс Бэкер еўрапейскім лідэрам . ЗША маглі падаваць сябе ў якасці найлепшага саюзніка цэнтральнаеўрапейскіх краін, падтрымліваючы іх намер уступіць у ЕС, бо ім гэта нічога не каштавала. Больш за тое, пашырэнне на ўсход перашкаджала палітычнай інтэграцыі,

а значыць, і ператварэнню ЕС у незалежную геапалітычную сілу, падточваючы яго слабыя федэратыўныя структуры і закідаючы за яго муры цэлы табун «траянскіх коней».

Канцлер ФРГ Гельмут Коль быў гатовы дорага заплаціць за згоду дыпламатый іншых цэнтраў сілы на неадкладнае аб'яднанне Германіі, і адмова ад дойчмаркі была не найдаражэйшай платай. Аб'яднаная Германія выражала гатоўнасць звязаць сябе сталёвымі тросамі валютнага і палітычнага саюза ў імя ўсеагульнай карысці, каб яе магутнасць была «выгаднай для ўсіх». У снежні 1989 г. дэлораўская камісія кіраўнікоў цэнтральных банкаў прапанавала план і графік Еўрапейскага валютнага саюза, у які цягам наступных двух гадоў былі ўнесеныя папраўкі, каб закласці аснову для Маастрыхцкай дамовы. Логіка здавалася бездакорнай: валютны саюз перарасце ў палітычны саюз, якому будзе ўласцівая большая ступень адказнасці. Камісія падрыхтавала праекты дамоў аб замежнай палітыцы і ўнутраных справах – «стаўпах» будучага Еўрапейскага Саюза.

МААСТРЫХТ І САРАЕВА

Аднак палітычны саюз пасля 1989 г. мусіў улічваць небяспеку, што аб'яднаная Германія будзе дамінаваць у любой дэмакратычнай федэрацыі еўрапейскіх дзяржаў у сілу свайго памеру і эканамічнай вагі. Французская эліта ўхілілася ад задачы «абмежавання» Германіі. Улічваючы брытанскую апазіцыю да федэралізацыі еўрапейскай супольнасці, стала ясна, што сапраўдны працэс у кірунку палітычнага аб'яднання Еўропы не стаіць на парадку дня, а гэтаксама няма шанцаў і на канстытуцыйную дэмакратыю.

Першыя крокі Еўропы да «супольнай замежнай палітыкі» выглядалі надзвычай правінцыйна на фоне насаджэння Вашынгтонам «новага сусветнага парадку» на ўсім свеце. У студзені 1991 г. Брытанія і Францыя паслухмяна далучыліся да аперацыі «Бура ў пустыні», як толькі амерыканцы

прадэманстравалі сваю агнявую магутнасць у Персідскай затоцы. У Югаславіі шокавая тэрапія, праведзеная федэральным урадам па ўказцы Сусветнага банку, выклікала у 1989 г. скарачэнне з працы паўмільёна чалавек, што забяспечыла на чарговых выбарах перамогу нацыяналістаў ва ўсіх рэспубліках федэрацыі. Германія і Аўстрыя, імкнучыся заваяваць прыхільнасць каталіцкіх дзяржаў-кліентаў на Балканах, падахвоцілі Харватыю і Славенію выйсці з федэрацыі, хаця было зразумела, што меншасці ў поліэтнічных рэспубліках процістаяцьмуць яе развалу. Калі ў жніўні 1991 г. пачаліся цяжкія баі паміж харватамі і Югаслаўскай народнай арміяй, а таксама паміж харвацкімі сіламі і сербамі з Краіны, Коль і Геншэр настойвалі на неадкладным прызнанні Харватыі краінамі Еўрапейскай супольнасці, замест таго, каб заклікаць да ўсёахопнага палітычнага ўрэгулявання ў Югаславіі, якое гарантавала б правы меншасцей. Падчас начнога саміту перад Маастрыхтам у снежні 1991 г. Колю ўдалося дабіцца брытанскай падтрымкі незалежнасці Харватыі, наўзамен за дадзены ўраду Мэйджара дазвол не далучацца да Еўрапейскага валютнага саюза і Сацыяльнай хартыі. Аналагічным чынам даўняя ідэя Францыі стварыць незалежны ад НАТО Еўракорпус з кантынгентам 30–35 тысяч чалавек на гэтым этапе атрымала германскую падтрымку[8].

ЗША хуценька зрабілі ўсё для таго, каб ідэя пра незалежны Еўракорпус была забытая. У снежні 1992 г. яны вырвалі з Францыі і Германіі пагадненне, што любой такой сілай на практыцы будзе камандаваць НАТО. Да таго ж заахвочванне Еўрапейскай супольнасцю першых крокаў да распаду Югаславіі развязала рукі адміністрацыі Клінтана, якая распачала маштабную дыпламатычную кампанію за прызнанне незалежнасці Босніі, наконт якой вагаліся нават Коль і Геншэр[9]. Харвацкая вайна за незалежнасць мела вынікам 200 тысяч уцекачоў, 350 тысяч дэпартаваных і 20 тысяч забітых. Падчас вайны ў Босніі 1992–1994 гг. амаль 2 мільёны чалавек сталі ўцекачамі або былі дэпартаваныя, а загінула, паводле найсціплейшых падлікаў, 70 тысяч чалавек[10]. Ідэалагічна падзеі ў былой Югаславіі азначалі крах самазванай місіі Еўрапейскай супольнасці: пакласці канец войнам на старым кантыненце. Стратэгічна жахлівае маштабам праліццё

[8] Woodward S. Balkan Tragedy. Chaos and Dissolution after the Cold War. – Washington, 1995. p. 184, 464.

[9] Паводле дзяржасакратара Лоўрэнса Іглбергера, Вашынгтон дбаў пра тое, каб Германія не «перабегла дарогу ЗША». Гл.: Woodward, *Balkan Tragedy*, p. 196.

[10] Woodward, *Balkan Tragedy*, p. 464, 283.

крыві прадэманстравала бяссільнасць еўрапейскіх лідэраў. У часе аблогі Сараева французскія, брытанскія, германскія і італьянскія лібералы заклікалі да амерыканскай інтэрвенцыі. Толькі натаўская ваенная магутнасць, сцвярджалі яны, можа неяк працверазіць канфліктуючыя бакі. Олбрайт з'яднала харвацкія і баснійскія ўзброеныя сілы, умацаваўшы іх авіяцыяй НАТО, у барацьбе супраць баснійскіх сербаў. У Канстытуцыю Германіі была ўнесеная папраўка, каб дазволіць пілотам Люфтвафэ пад камандаваннем ЗША патруляваць забароненую для палётаў сербскай авіяцыі зону. У красавіку 1993 г. Парыж і Бон заявілі, што нягледзячы на знікненне савецкай пагрозы еўрапейская замежная і абарончая палітыка застанецца пад кантролем НАТО.

ЕЎРАВАЛЮТА

Такім чынам, Еўрапейскі валютны саюз паўстаў на фоне прабуксоўкі палітычнага саюза і замежнай палітыкі, падпарадкаванай вашынгтонскаму вета. У гэтай сферы, нягледзячы на дробныя сваркі, еўрапейскія лідэры даволі лёгка здолелі дамовіцца наконт праграмы, што адпавядала іх супольным інтарэсам. Уін Годлі красамоўна апісаў тыпы эканамічных захадаў, ад якіх нацыянальным урадам належала адмовіцца згодна з Маастрыхцкім планам – вызначэнне аптымальнага ўзроўню сацыяльнага забеспячэння, падатковага цяжару, асігнаванняў на бюджэтныя выдаткі, памеру і фінансавання бюджэтнага дэфіцыту, вызначэнне працэнтных ставак, абменных курсаў, узроўню інфляцыі, росту эканомікі, занятасці, размеркаванне даходаў і дабрабыту.

«Неймавернай лакунай у Маастрыхцкай праграме было тое, што яна прадугледжвала заснаванне і функцыяванне незалежнага Цэнтральнага банка, аднак не прадугледжвала з'яўлення цэнтральнага ўрада (у тэрмінах еўрапейскай супольнасці). Вось жа, без гэтай інстытуцыі Еўрапейскі валютны саюз будзе перашкаджаць эфектыўнаму функцыяванню асобных краін і нічога не дасць ім узамен», – пісаў Годлі[11].

Сапраўды, замест палітычнай федэрацыі еўрапейскія зрабілі W. Godley выбралі малаўцямны палітычны саюз. Жорсткія фіскальныя патрабаванні і курсы абмену валют, маастрыхцкія «крытэрыі канвергенцыі» і Пакт аб стабільнасці выключалі такія эканамічныя інструменты, як дэвальвацыя валюты або фінансаванне бюджэтнага дэфіцыту, пакідаючы дваццаць маласумяшчальным эканомікам еўразоны ў якасці адзінага механізму прыстасавання да цыклічных і іншых зменаў большую эксплуатацыю працоўнай сілы. Урэшце нацыянальныя эканомікі еўразоны, нямецкая, французская і італьянская, былі вымушаны раўняцца на англасаксонскую мадэль з яе нізкімі заробкамі, слаба абаронемымі наёмнымі работнікамі і неўстойлівай камерцыялізаванымі паслугамі. Нават у часы рэцэсіі 2001 г. Еўрапейскага цэнтральнага банка ўтрымліваліся на «антыінфляцыйным» узроўні, і адзіным тлумачэннем гэтаму захадаў было, здаецца, жаданне дабіць да ручкі ўсёсільную жыццяздольную рэйнскую мадэль*. У Германіі ўнутраны попыт заставаўся нізкім, беспрацоўе – высокім, а рост эканомікі – павольным. Увядзенне новай валюты ў студзені 2002 г. суправаджалася далейшым пагаршэннем сітуацыі ўстойліцы.

У такой сітуацыі французскія і нідэрландскія рэферэндумы выявілі вострыя класавыя падзелы вакол «неалібэральнай дамовы». У Нідэрландах 58 % з тых, хто галасаваў за лейбарыстаў, не прыслухалася да кіраўніцтва сваёй партыі. Калі браць пад улік крытэр адукаванасці, 71 % выбаршчыкаў з «нізкай» і 64 % з «сярэдняй» кваліфікацыяй прагаласавалі «супраць», сярод жа «высокакваліфікаваных» выбаршчыкаў – 52 %. У лейбарысцкіх урадах Вім Кока ў 1990-я гг. і пры ўрадзе Балкенэндэ з 2002 г. Нідэрланды сталі больш «англасаксонскай» краінай, чым Вялікабрытанія, дзякуючы махінацыям з нерухомасцю, пераводу ў акцыі ашчаджэнняў, хатніх гаспадарак і выцясненням працоўных вакансій у прамысловасці і ў дзяржаўным сектары вакансіямі ў нізкааплатнай сферы паслуг. Вынікам стала павелічэнне разрыву паміж багатымі і беднымі і рост сацыяльнай напружанасці. У багатых анклавах Хемстэдэ і Блумендал суадносіны галасоў дыяметральна адрозніваліся ад агульнанацыянальных: 57 і 61 % прагаласавалі за дамову.

11 Godley W. The Euro in Trouble: Is Stage Three Perry Anderson and Patrick Camiller, eds. The Question of Europe. London, 1997. P. 174–175.

* Гэтыя і падобчыя сімптаматычная праблемы – не толькі прадбачыць суверэнітэту, хоча ўвогуле выйсці з такаматыва Еўрапейскага валютнага саюза. Мне таксама сімпатычныя тыя, хто імкнецца да інтэграцыі пад юрысдыкцыяй нейкай федэральнай канстытуцыі і з федэральным бюджэтам,

У Францыі «супраць» прагаласавалі 56 % прыхільнікаў Сацыялістычнай партыі, а гэтаксама 79 % рабочых і 71 % беспрацоўных. У найбяднейшых кварталах Марселя і шахцёрскіх раёнах Поўначы Па-дэ-Кале доля тых, хто прагаласаваў супраць, сягнула 78 і 84 %. У сем'ях збяднелі, ніжэйшым за 1500 еўра ў месяц, супраць дамовы прагаласавалі 66 %. Большасць праціўнікаў дамовы – 52 % – у якасці галоўнай прычыны свайго выбару назвалі «нязгоду з цяперашняй эканамічнай і сацыяльнай сітуацыяй у Францыі» (35 % у якасці такой прычыны назвалі нежаданне бачыць Турцыю ў складзе ЕС)[12]. Паняцце «французскай сацыяльнай мадэлі» можа ўвесці ў зман. Жаспен і яго міністры фінансаў Строс-Кан і Фаб'юс прыватызавалі папулярныя дзяржаўныя актывы, зменшылі верхнюю стаўку падаходнага падатку і іншых збораў з бізнесу і трымалі на нізкім узроўні дзяржаўныя выдаткі. Рафарэн працягваў у тым жа духу. Хаця ў Францыі вышэйшы ўзровень прававой абароны працоўных, чым у Вялікабрытаніі, прычым што простыя замежныя інвестыцыі і прадукцыйнасць працы ў Францыі значна вышэйшыя. Акрамя таго, высокі ўзровень беспрацоўя цесна звязаны са скіраваным супраць рабочых праектам эканамічнай палітыкі ЕС, які найбольш бацькоўскага ўдарыў па нізкааплатных наёмных работніках і па малазе. У адрозненне ад іх, вышэйшы слой сярэдняга класа ў Францыі вельмі добра прыстасаваўся да неалібералізму: у цэнтральных парыжскіх кварталах, дзе цэны на нерухомасць узляцелі да нябесаў, «за» прагаласавалі 66 %. Сярод тых, хто зарабляе больш за 1500 еўра ў месяц, за дамову выказаліся 71 %, а ў фешэнебельным Нёйі іх колькасць дасягнула 82,5 %.

* «Рэйнская», альбо нямецкая мадэль гаспадарання паўстала ў канцы XIX ст. Яе вызначальнай рысай з'яўляецца дасягненне пагаднення паміж прадстаўнікамі наймальнікаў і наёмных работнікаў пры пасярэдніцтве дзяржавы. – **Заўв. перакл.**

ЕЎРОПЫ 2003 г.

[12] Le Sondage sorti des urnes // www.ipsos.fr.

Галоўнай прычынай канстытуцыйнай дамовы было пашырэнне ЕС. Пашырэнне ад пачатку ўваходзіла ў амерыканскія планы, а на раннім этапе яму спрыялі таксама Германія і Вялікабрытанія. У 1993 г. Еўрапейская камісія выпрацавала мінімальныя крытэры для далучэння да ЕС: працоўная рынкавая эканоміка, стабільныя інстытуты ўлады, здольнасць

прытрымлівацца правілаў ЕС. У 1990-я гг., паколькі паміж урадамі разгарэліся спрэчкі, якія краіны мусяць быць прыняты ў першую чаргу, да гэтага спісу крытэраў была таксама дадзеная імплементацыя 97-тысячастаронкавага «*acquis communautaire*», то бок заканадаўства ЕС. Не дасягнуўшы згоды наконт таго, якім чынам уносіць папраўкі ў дамовы аб пашыраным ЕС, краіны-заснавальніцы Саюза на сустрэчы ў Амстэрдаме 1997 г. вырашылі «развіваць кааперацыю», дазволіўшы разнахуткасную інтэграцыю. Рашэнне аб працэдуры галасавання ў ЕС пасля пашырэння было адкладзенае да міжурадавай канферэнцыі ў Ніцы 2000 г.

Напярэдадні Ніцы тры галоўныя дзяржавы Саюза акрэслілі свае пазіцыі. Падчас выступу ўва універсітэце Гумбальдта ў траўні 2000 г. Фішэр заклікаў да дэмакратычнай федэрацыі еўрапейскіх нацыянальных дзяржаў, агульнаеўрапейскага парламента з «рэальнымі заканадаўчымі паўнамоцтвамі» і з другой палатай, складзенай з выбраных членаў нацыянальных парламентаў, да федэральнага ўрада і прэзідэнта, надзеленага выканаўчымі паўнамоцтвамі, а таксама да прыняцця канстытуцыі. Шырак адрэагаваў у чэрвені, выступіўшы перад Бундэстагам. Ён выказаўся супраць федэральнага ўрада, за мацнейшы саюз нацыянальных дзяржаў, дзе прыняцце рашэнняў ажыццяўлялася б простай большасцю галасоў. Заклік да канстытуцыі ён, аднак, падтрымаў. Яе мог выпрацаваць Канвент, – орган, падобны да таго, які ў той час распрацоўваў Хартыю фундаментальных правоў ЕС (гэта было спробай палепшыць імідж Бруселя пасля таго, як камісія ў поўным складзе з Жакам Сантэрам на чале мусіла сысці ў адстаўку ў 1999 г. пасля абвінавачванняў у карупцыі). Блэр, жадаючы выступіць з гэткага ж сімвалічнага «подыюма», як Фішэр і Шырак, разразіўся прамовай у Варшаўскай фондавай біржы. На думку Вялікабрытаніі, дэбаты аб канстытуцыі не абавязкова павінны завяршыцца яе прыняццем: кодэкс дамоў (a treaty of treaties) можа быць не менш эфектыўны. Больш важна, што надзеленая правам вета Еўрапейская рада мусіць вызначаць палітычны курс ЕС. У снежні 2000 г. канферэнцыя ў Ніцы ўстанавіла квоты галасоў 25 членаў Саюза і вызначыла 2004 г. як крайні тэрмін для прыняцця канчатковай дамовы, якая «абдорыць Еўропу канстытуцыяй». Да таго часу далучыцца да

ЕС мусілі тры балтыйскія рэспублікі, Польшча, Венгрыя, Чэшская рэспубліка, Славакія, Славенія, Мальта і Кіпр.

Падагрэты амбіцыямі прэм'ер-міністраў дробных дзяржавак, Канвент аб будучыні Еўропы сабраўся ў будынку Еўрапарламента ў Бруселі ў лютым 2002 г. Калі маастрыхцкія перамовы адбываліся пад акампанемент войнаў у Персідскай затоцы і на Балканах, то дыскусіі Жыскар д'Эстэна і яго калегаў ішлі на фоне бамбардаванняў і акупацыі Афганістана і Ірака. Пакуль прадстаўнікі моладзі і грамадзянскай супольнасці выступалі на нарадзе, «Герніка» была ўжо зачахлёная, легенда пра зброю масавага знішчэння створаная, а ваенны флот перасякаў Міжземнае мора. Больш за мільён чалавек у Лондане, два мільёны ў Мадрыдзе, тры мільёны ў Рыме выйшлі на вуліцы, каб выказаць пратэст супраць уварвання ў Ірак, але кіраўнікі еўрапейскіх краін – Азнар у Іспаніі, Берлусконі ў Італіі, Бароса ў Партугаліі, Блэр у Вялікабрытаніі, Расмусен у Данііі, Мед'ешы ў Венгрыі, Мілер у Польшчы і Гавал у Чэхіі – выказалі сваю падтрымку ваеннай інтэрвенцыі, падпісаўшы супольную заяву, апублікаваную ў «Wall Street Journal».

Для Юргена Габермаса і Жака Дэрыды гэта стала нагодай звярнуцца да «сутнасці Еўропы»[13]. Згадаўшы «маральна агідныя» прыгатаванні ваеннай машыны і «цывілізаванае варварства» халаднакроўна запланаваных забойстваў і знішчэнняў «мноства жылых раёнаў і бальніц, дамоў і музеяў, рынкаў…», два філосафы патлумачылі, што «вайна прынесла еўрапейцаў усвядоміць правал іхняй супольнай замежнай палітыкі». Міжнародныя дэбаты аб законнасці амерыканскага ўварвання паглыбілі, паводле Габермаса і Дэрыды, разрыў паміж «англа-амерыканскімі краінамі» – краінамі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы – і «Старой Еўропай». Каб пераадолець развалу ЕС, краінам яго гуманітарнага «ядра» трэба выкарыстоўваць механізмы «паглыбленай кааперацыі», зацверджаныя ў Амстэрдаме, і яшчэ раз стаць лакамацівай, праводзячы такую еўрапейскую замежную палітыку, якая б грунтавалася на нормах міжнароднага права.

Вядома, краіны ядра ЕС сапраўды ўжо раскрылі свае карты. Пашырэнне, якое прайшло пад іх апекай (на далучэнне новых

[13] Habermas Jürgen and Derrida Jacques. February 15, or What Binds Europeans Together: Plea for a Common Foreign Policy, Beginning in Europe // Levy et al, eds. Old Europe, New Europe, Core

краін была дадзена фармальная згода ў кастрычніку 2002 г., за месяц да з'яўлення рэзалюцыі Рады бяспекі ААН № 1441), надоўга змяніла баланс сілаў унутры ЕС. Гучныя пратэсты Дэ Вільпэна ў Радзе бяспекі суправаджаліся заявамі французскага пасла ў Вашынгтоне, што другая рэзалюцыя ААН была зусім непатрэбная, і дазволам Шырака на свабоднае перасячэнне амерыканскімі бамбардыроўшчыкамі паветранай прасторы Францыі[14]. Наступнай вясной, у 200-годдзе дэкларацыі Тусен-Луверцюра аб гаіцянскай незалежнасці, Шырак і Дэ Вільпэн замацавалі сваё прымірэнне з Бушам і Паўэлам, здзейсніўшы сумесную інтэрвенцыю ў Порт-о-Прэнс. Пакуль Канвент у Бруселі заяўляў, што забеспячэнне міру ў Еўропе з'яўляецца мэтай нумар адзін, Шродэр мерыўся зрабіць нямецкі вайсковы кантынгент другой велічынёй сілай у акупаваным НАТО Афганістане, напічканым амерыканскімі турмамі.

БЛЭР І ШЫРАК

На Канвенце аб будучыні Еўропы Лондан яшчэ раз узваліў на сябе ношу распрацоўкі праекта канстытуцыі. Джон Кер, былы брытанскі міністр замежных справаў, узначаліў сакратарыят Канвента і падрыхтаваў некалькі варыянтаў дакумента[15]. Не дзіўна, што ў снежні 2003 г. брытанская прэса адзначала, што яго канчатковы варыянт амаль не змяніўся: першынство Еўрапейскай рады было захавана, заставалася права вета ў фіскальнай і супольнай замежнай палітыцы, а таксама ў сфэры сацыяльнай бяспекі; «паглыбленая кааперацыя» не закранала абсягаў, звязаных з абаронай; нават права працоўных на страйк, урачыста абвешчанае Хартыяй, было гарантавана толькі «ў адпаведнасці з нацыянальнымі заканадаўствамі».

Тым часам дэталі здзелкі па далучэнні да ЕС былі ўзгодненыя з усімі бакамі. Новыя дзяржавы-члены атрымлівалі другарадны статус: простыя датацыі згодна з умовамі Супольнай сельскагаспадарчай палітыкі складалі для іх 25 % ад заходніх паказчыкаў, мабільнасць рабочай сілы была абмежаваная, а памер датацый са Структурнага фонду не сягаў і паловы таго, што належала Грэцыі, Іспаніі, Партугаліі і Ірландыі. Перамовы

[14] Адмова турэцкага парламента аддаць Пентагону тэрыторыю краіны для наземнай атакі на Паўночны Ірак мела куды большае значэнне для ходу баявых дзеянняў.

[15] Norman P. The Accidental Constitution. 2nd ed. Brussels, 2005. P. 32–33. Пратэжэ М. Тэтчэр Артур Кокфілд распрацаваў Адзіны Еўрапейскі акт, а Леон Брытан – Капенгагенскія крытэры 1993 г. для прыёму дзяржаў у члены ЕС.

аб долях галасоў у органах ЕС доўга буксавалі, паколькі двое з *васьмі прадажнікаў* (huits mercenaries), Іспанія і Польшча, адмаўляліся пераглядаць дасягнутыя ў Ніцы дамоўленасці. Аднак тэракт на вакзале Аточа і эксплуатацыя яго Азнарам прывялі да ўлады ў сакавіку 2004 г. сацыялістычны ўрад Сапатэры. Адным з першых дзеянняў Сапатэры была згода на зніжэнне долі галасоў Іспаніі.

У гэтую пару Блэр, напалоханы брытанскай жоўтай прэсай, абвясціў, што вынясе канстытуцыйную дамову на рэферэндум (пасля брытанскіх выбараў 2005 г.), а Шырак вырашыў, што настаў момант выканаць абяцанне, дадзенае ў 2002 г. Маастрыхцкую дамову ледзьве ўдалося прапіхнуць на апошнім французскім рэферэндуме, праведзеным па «еўрапейскім пытанні». Аднак тады, у пачатку 1990-х гг., французскі істэблішмент быў расколаты, існавала моцная апазіцыя да дамовы з боку правых галістаў на чале з Сягенам. Цяпер жа здавалася, што галісты гатовыя былі праглынуць англа-французскую страву, прывезеную Жыскар Д'эстэнам з Бруселя. На пачатку апытанні давалі дадатны вынік для прыхільнікаў дамовы. Разлік Шырака выглядаў досыць пэўна.

Але пасля Маастрыхта прамінула дзесяцігоддзе. За гэты час гнеў народны супраць усяго, што ён прынёс, і ўсяго, што навязвалася краіне рознымі ўрадамі «ў імя Маастрыхта», паступова нарастаў – аж да таго, што нават канфармісты з кіраўніцтва Сацыялістычнай партыі выйшлі з-пад кантролю. Калі Фаб'юс, учуўшы настрой «знізу» і спадзеючыся заваліць свайго суперніка па партыі, вырашыў раскрытыкаваць дамову, «кансенсус» у асяроддзі палітычных эліт быў падарваны. Мабілізацыя ATTAC* і яе саюзнікаў, незвычайная маштабам і вынаходлівасцю, давяршыла справу.

* «Асацыяцыя за падаткаабкладанне фінансавых аперацый дзеля дапамогі грамадзянам».

ВАРВАРЫ Ў БРАМЕ

Рэакцыя СМІ на французскі і нідэрландскі рэферэндумы яшчэ раз прадэманстравала поўнае аднагалоссе. Тыя, хто галасаваў «супраць», былі людзьмі ірацыянальнымі, калі не носьбітамі

паталогіі – паводле «Libération», імі рухаў «боль, страх, грабуна, шал». «Le Monde» меркавала, што галасаванне выявіла «глыбокі адкат назад»; паводле «New York Times», яно адлюстравала «крызіс ідэнтычнасці». На думку «Guardian», Францыя была «глыбока падзеленая, хваравіта безадказная, запалоханая і недаверлівая… аганізуючая і няшчасная». З пункту гледжання Тымаці Гартана Эша, галасаванне «супраць» было «у розных бояззю. Бояззю іміграцыі, бояззю перамен». Хаця было – відавочна, што большасць тых, хто выказаўся супраць дамовы, падтрымлівалі сацыялістаў і, шырэй, левацэнтрыстаў, сцвярджалася, што яны кіраваліся «нацыяналізмам, ксенафобіяй, дагматызмам» («Le Monde»), «неверагоднай ксенафобіяй» («Libération»), выступалі за «Францыю для французаў» («Guardian»). У той жа час яны былі «інфантыльныя», «адсталыя». Адзін з аглядальнікаў «Guardian» назваў выбар французаў «палітыкай Пітэра Пэна». «Фуко ацаніў бы гэтую карэляцыю паміж ведамі і ўладай, – зазначыў Ален Бад'ю, – выбар «за» быў прэрагатывай асвечанай думкі (экспертаў усіх масцей, уключаючы журналістаў), галасаванне «супраць» падавалася як невуцтва. Тыя, хто крытыкаваў шыракаўскае рашэнне вынесці дамову на рэферэндум, выкарыстоўвалі той самы аргумент: такія важныя рэчы, як Еўропа, нельга давяраць цёмнай масе. У гэтым кантэксце тых, хто галасаваў супраць, незалежна ад таго, левымі ці правымі яны былі, абавязкова таўравалі як «варвараў».

Паводле англамоўных каментатараў, віна ляжала перадусім на Шыраку і французскім палітычным кіраўніцтве. Справа была не толькі ў тым, што яго эканамічныя рэформы выбіліся з графіка – урэшце, рэформы Берлусконі зацягнуліся яшчэ даўжэй. Ключавы закід палягаў у тым, што французскае кіраўніцтва не здолела прышчапіць свайму электарату перакананне, што альтэрнатывы няма. Але для цвердалобых неалібералаў настаў зорны час. Французскія левацэнтрысты апынуліся ў крызісе: пазіцыю большасці кіраўніцтва Сацыялістычнай партыі не толькі не падтрымала большасць яе выбарнікаў, але 4 чэрвеня Франсуа Оланд і Дамінік Строс-Кан паглыбілі раскол у ёй, выключыўшы Фаб'юса і яго прыхільнікаў з выканаўчага камітэта партыі. Правацэнтрысцкі «Саюз за народны рух» перажывае не менш востры крызіс, чым Сацпартыя. Калі

ўлічыць, што падтрымліваны Вашынгтонам на выбарах кандыдат Нікаля Сарказі здольны паслаць у адстаўку «ўрад кульгавых качак» Шырака і Дэ Вільпэна, а на змену Шродэру, нягледзячы на ўсе яго заслугі ў галіне рэформаў, у Германіі прыйдзе Хрысціянска-дэмакратычны саюз, то ў 2007 г. лідэрства ў Еўропе можа пераняць больш надзейнае праамерыканскае трыо ў Парыжы, Лондане і Берліне. Спакайнейшы перыяд у трансатлантычных адносінах будзе забяспечаны.

Наколькі паслухмяным акажацца ўрад Меркель або Сарказі? Параза сацыял-дэмакратаў у Паўночным Рэйне-Вестфаліі ў траўні 2005 г. была абумоўлена як няяўкай на выбары сацыял-дэмакратычных выбарнікаў, расчараваных шродэраўскім зніжэннем падаткаў для бізнесу і скарачэннем дапамогі беспрацоўным, так і пераходам галасоў да ХДС. Меркель – большая атлантыстка, чым Шродэр, але ейны блок цесна звязаны з сярэднім нямецкім бізнесам, зацікаўленым у далейшым існаванні «рэйнскай мадэлі». Калі Сарказі выйграе ў 2007 г., яму давядзецца вырашаць праблему з французскім электаратам, які апошнія два дзесяцігоддзі караў кожны ўрад, які праводзіў прыватызацыю і абмяжоўваў дзяржаўнае рэгуляванне, выражэннем недаверу яму пасля першай жа яго кадэнцыі. Травень 2005 г. паказаў новае пакаленне французскай моладзі, што набыла сваю палітычную адукацыю ў кавярнях, на вуліцах і мітынгах. Выгнаць варвараў з горада можа аказацца не так проста. Сапраўдны страх, з якім мы сутыкнуліся, як пракаментаваў Славой Жыжак:

гэта страх, што да выбару «супраць» падштурхнула сама новая еўрапейская палітычная эліта. Гэта страх, што народ больш нельга будзе так лёгка дурыць яе «постпалітыкай». А для ўсіх іншых выбар «супраць» – гэта пасланне і выражэнне спадзеву. Гэта надзея, што палітыка яшчэ жывая і магчымая… У галасаванні «супраць» быў пазітыўны выбар: выбар самога выбару, адмова шантажу з боку новай эліты, якая навязвае нам адзіны выбар: зацвярджаць вывады ейных экспертаў або выяўляць «ірацыянальную» няспеласць[16].

16 Žižek

ПАХІСНУТАЯ ГЕГЕМОНІЯ

Якія вывады можна зрабіць з правалу «Еўрапейскага асноўнага закону»? Па-першае, трэба пахаваць ілюзію, што ЕС – або нават яго ядро – можа развіцца ў незалежную сілу, стаўшы больш гуманнай, дэмакратычнай альтэрнатывай Злучаным Штатам. Для гэтага цяпер патрэбны тэктанічны зрух, сувымерны з заканчэннем халоднай вайны. Пачынаючы з квазітэтчэраўскага адзінага Еўрапейскага акту еўрапейскія эліты выкарыстоўвалі заканадаўчыя і выканаўчыя органы ЕС для выдалення сацыял-дэмакратычнай спадчыны пасляваеннага перыяду: для камерцыялізацыі дзяржаўнага сектара, лібералізацыі рынку працоўнай сілы, адкрыцця нацыянальных эканомік для сусветнага фінансавага капіталу. Падчас гэтага працэсу іх «Еўропа» станавілася сацыяльна безабароннай.

У яго выніку яна прыняла амерыканскае сусветнае лідэрства на ўмовах, прадыктаваных Вашынгтонам. Развой ЕС, пачынаючы з 1989 г., адбываўся пераважна паводле англа-амерыканскіх прадпісанняў. Лібералізацыя і пашырэнне ператварылі ЕС у рыхлую, бесхрыбетную супольнасць, якая ўважліва прыслухоўваецца да амерыканскага карпаратыўнага лобі ў Бруселі, але бязлітасна ігнаруе пажаданні грамадзян. «Шматхуткасны» ЕС, які паўстаў у апошнія 15 гадоў – з еўразонай «дванаццаткі», групай НАТО з дзевятнаццаці краін, з адмысловым статусам дзяржаў, якія далучыліся да Саюза ў 2004 г. – сведчыць аб правале еўрапейскай інтэграцыі. Да таго ж гэта дае Вашынгтону шырокае поле манеўру ў выбары партнёраў па кааліцыях. Цяпер «вялікая тройка» ЕС, Вялікабрытанія, Францыя і Германія, спрабуюць прымусіць Іран адмовіцца ад атамнай праграмы, хоць яна – дзяціная забаўка ў параўнанні з ядзерным арсеналам Ізраіля, які яны так старанна аберагаюць.

У гандлёвых войнах ЕС можа адказаць ударам на ўдар, адбіваючыся ад амерыканскіх аэробусаў або кітайскіх маек. Але ў плане геапалітычнай магутнасці па заканчэнні халоднай вайны Еўрасаюзу была адведзеная падпарадкаваная роля ў сістэме амерыканскай гегемоніі. Адной з яго функцый стала аказанне паслуг па зачыстцы і «пераўладкаванні» рэжымаў на

Slavoj. The constitution is dead. Long live proper politics // Guardian. 2005. 4 June.

Балканах, на Каўказе, ва Усходняй Еўропе і ў Малой Азіі, часта пасля амерыканскіх уварванняў або ўнутраных канфліктаў. Як правіла, пры такіх аперацыях у абыход прадстаўнічых структур у найважнейшыя міністэрствы прызначаюцца ключавыя дарадцы, а фінансаваныя з-за мяжы НДА падмяняюць выбарныя органы мясцовай або цэнтральнай улады. За апошняе дзесяцігоддзе вымалявалася «натуральнае пакліканне» ЕС да сацыяльнай інжынерыі: дысцыплінавання працоўнай сілы, апрацоўкі эліт, адкрыцця рынкаў для амерыканскага і еўрапейскага капіталаў, асабліва сярод шырокай паласы краін яго перыферыі: «суседскі імперыялізм», у фармулёўцы Роберта Купера[17]. Так, спадзеў на ўступленне ў ЕС адыграў цэнтральную ролю ў пераконванні турэцкіх рабочых згадзіцца павысіць свой пенсійны ўзрост, а палякаў – урэзаць свае пенсіі.

Ці можна лічыць няздольнасць ЕС навязаць сваю гегемонію асяродку Саюза знакам аслаблення ягонай ролі як кнута, які прывучае жыць і кіраваць па правілах рынкавай эканомікі? Адзін з высокіх функцыянераў ЕС з трывогай адзначыў энтузіязм, з якім вынікі еўрарэферэндуму былі сустрэты ў Бялградзе, і ўзніклае там пачуццё, што сербы больш не маюць прычыны «бяздумна выконваць кожнае патрабаванне Еўропы»[18]. Дарэчы будзе сказаць, што ў той самы тыдзень, калі французы і нідэрландцы адхілілі канстытуцыйную дамову, у Багдад прыбыла група спецыялістаў ЕС, каб узяць удзел у напісанні аналагічнага дакумента для акупаванага Ірака. Трэба спадзявацца, што іракцы пашлюць гэтую хартыю і тых, на чыіх штыхах яна трымаецца, туды, куды была адпраўлена яе брусельская папярэдніца.

Народнае адхіленне Канстытуцыі ЕС дае падставы меркаваць, што дзеянне палітычнага наркозу, уведзенага Брусельскім кангрэсам, заканчваецца. ЕС як сіла, што навучае сацыяльнай дысцыпліне, больш не можа жывіцца ідэалагічным капіталам эры Рэйгана, даўно растрачаным на насаджэнне рынку, рэструктурызацыі і войны. Тэлеалогія сацыяльнага прагрэсу не працуе: Еўропа ўявіць сабе лепшую будучыню, калі няма альтэрнатывы. Лічылася, што ўзніклую нішу запоўняць мас-медыі, спажывецкая ідэалогія і абыякавасць. «Гэта ж ЕС даў вам мабільныя тэлефоны і танныя авіябілеты», – заявіў Сарказі маладым французам на сустрэчы ў траўні. Іх галасы «супраць»

17. Cooper R. The New European Imperium // Prospect. 2001. October.

18. Bilefsky D. Europe must keep its soft power, Turkey tells critics // International Herald Tribune. 2005. 1 June.

нагадалі манеткі, кінутыя ў адхіленых ад улады італьянскіх палітыкаў з нагоды скандалу «Тангентопалі». Не трэба перабольшваць размаху бунту: у Брытаніі, Польшчы, Ірландыі, Даніі выбарнікі пакорліва пагадзіліся скасаваць рэферэндумы. Аднак прорва паміж еўрапейскім электаратам і неаліберальнымі элітамі яшчэ ніколі не была такой вялікай; у траўні 2005 г. Блэр заваяваў толькі 21 % галасоў брытанскіх выбарнікаў. Скіраванае перадусім супраць «эканамічных і сацыяльных» аспектаў ілжывай еўрасаюзаўскай рыторыкі, галасаванне «супраць» у каторы раз выявіла крызіс рэпрэзентацыі левых сілаў. Лідэры лейбарыстаў і Сацпартыі апынуліся ў стане процістаяння з большасцю сваіх выбарнікаў, пакінуўшы левае поле маргінальным сілам. Дзякуючы гэтаму выявілася, як далёка мы знаходзімся ад стварэння ўсёахопнай праграмы, альтэрнатыўнай неаліберальнаму праекту. Аднак, хаця сёлетнія бліскавіцы выявілі адсутнасць такой праграмы, яны на момант асвятлілі і будучы гарызонт, пры якім яна магла б існаваць.

Пераклаў з амерыканскай В. Р. паводле: Watkins Susan. Continental Tremors // New Left Review. No 33. May–June 2005. P. 5–21.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 5 (39) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/25
[image]

[image] [image] [image]

ЛУКАН ЭЛАН ЎЭЙ
прафэсар палітalёгіі Храмавага ўнівэрсытэту (Temple University), што ў Філадэльфіі, у 2004–2005 гг. – стажэр Гарвардзкае акадэміі міжнародных рэгіянальных дасьледаваньняў. З кастрычніка па сьнежань 2004 г.у быў незалежным назіральнікам на прэзыдэнцкіх выбарах ува Украіне. У сфэру яго навуковых

Лукан Элан Ўэй
Рэвалюцыя і крах Кучмавага аўтарытарызму

Большасьць аналізаў памаранчавае рэвалюцыі ўва Украіне была прысьвечана са- праўды незабыўным масавым акцыям пратэсту, якія адбыліся пасьля сфальсыфікаванага другога туру прэзыдэнцкіх выбараў 21 лістапада 2004 г. Аднак існуе іншы аспэкт памаранчавае рэвалюцыі, якому было нададзена нашмат менш увагі. Канчатковая перамога апазыцыйнага кандыдата Віктара Юшчанкі сталася вынікам жудаснай слабасьці старога рэжыму і няздольнасьці яго кіраўніцтва кантраляваць сваіх хаўрусьнікаў. Разброд на самым версе сьпярша прывеў да аслабленьня аўтарытарных дзяржаўных інстытутаў, а пасьля і да краху рэжыму Леаніда Кучмы. Украіна пры прэзыдэнту Кучму была ўзорам «канкурэнтнага аўтарытарызму», цывільнага недэмакратычнага рэжыму, пры якім рэгулярна праводзяцца канкурэнтныя, але надзвычай несправядлівыя выбары. Пры такіх рэжымах існуюць дэмакратычныя інстытуты, якія лічацца асноўным сродкам атрыманьня і ажыцьцяўленьня палітычнае ўлады, аднак палітычная адміністрацыя так часта парушае гэтыя правілы, што рэжым перастае адпавядаць мінімальным дэмакратычным стандартам. Улады рэгулярна перасьледуюць апазыцыйных лідэраў, цэнзуруюць СМІ и фальсыфікуюць вынікі выбараў. Тым ня менш выбары

праводзяцца рэгулярна і маюць канкурэнтны характар, а апазыцыйныя кандыдаты могуць і часам выйграюць.

Рэдка дзе сустрэнеш нагэтулькі адкрыты да канкурэнцыі рэжым з такім недэмакратычным урадам, як ува Украіне часоў Кучмы. Спалучэньне абсалютна недэмакратычных захадаў з сапраўднай палітычнай канкурэнцыяй было асабліва прыкметнае ў стаўленьні ўладаў да апазыцыі падчас выбараў. У адрозьненьне ад такіх цалкам аўтарытарных рэжымаў, як беларускі, апазыцыйных кандыдатаў не саджалі ў турму і не здымалі з выбарчае дыстанцыі, а паддавалі надзвычай брутальнаму перасьледу. Напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў 2004 г. адбыліся ня менш за два замахі на Юшчанку, асабліва сур'ёзныя наступствы мела яго атручваньне дыяксінам, якое так зьнявечыла ягоны твар незадоўга да выбараў.

Падобнае спалучэньне злоўжываньняў і канкурэнтнасьці працягвалася і ў сам дзень галасаваньня. Пры чыста аўтарытарных рэжымах маштабная падтасоўка галасоў забясьпечвае перамогу кандыдата ад улады незалежна ад стану яго рэальнае падтрымкі. У адрозьненьне ад гэтага, пры канкурэнтных аўтарытарных рэжымах існуе пэўнае абмежаваньне колькасьці і адсотка галасоў выбарнікаў, якія беспакарана могуць украсьці ўлады. Напрыклад, падчас парлямэнцкіх выбараў 2002 г. Кучма забясьпечыў абсалютную падтрымку «сваіх» кандыдатаў на закрытых выбарчых участках – у турмах, бальніцах і на вайсковых базах, аднак ня здолеў перашкодзіць апазыцыйнай кааліцыі «Наша Ўкраіна» здабыць больш месцаў у Вярхоўнай радзе, чым любая іншая партыя. На прэзыдэнцкіх выбарах 2004 г. нягледзячы на зьнішчальныя падтасоўкі ўладаў па падмене бюлетэняў, колькасьць падтасаваных галасоў перавысіла 10 адсоткаў.

Пачынаючы з 1989 г. канкурэнтныя аўтарытарныя рэжымы існавалі як мінімум у 37 краінах Усходняй Азіі (Камбоджа, Малайзія, Тайвань), Амэрыкі (Дамініканская Рэспубліка, Гаяна, Гаіці, Нікарагуа, Мэксыка, Пэру), Цэнтральнай Эўропы (Альбанія, Харватыя, Македонія, Румынія, Сэрбія, Славаччына), былога Савецкага Саюзу (Армэнія, Беларусь, Грузія, Расея, Украіна) і Афрыкі (Камэрун, Кот-д'Івуар, Гана, Кенія, Мадагаскар, Мазамбік, Сэнэгал, Танзанія, Замбія, Зымбабвэ).

Канкурэнтныя аўтарытарныя рэжымы таксама адрозьніваюцца ступеньню свабоды СМІ. Чыста аўтарытарныя рэжымы практычна цалкам выключаюць апазыцыю з тых СМІ, якія маюць выхад на шырокую аўдыторыю, і дазваляюць крытыкаваць улады толькі на старонках малатыражных выданьняў ды ў інтэрнэце. У адрозьненьне ад гэтага, пры канкурэнтных аўтарытарных рэжымах апазыцыйных журналістаў сувора

[1] Гэтая частка артыкула грунтуецца на маёй працы: Levitsky S., Way L. Elections without democracy: The rise and decline of competitive authoritarianism // Journal of Democracy. – 2002. – Vol. 13, No. 2. – P. 51–65. Гл. таксама: Levitsky S., Way L. Competitive Authoritarianism: Hybrid Regimes after the Cold War. – Cambridge: Cambridge University Press, 2010. – P. 5–7. Гл. таксама: Levitsky S., Way L. The Rise of Competitive Authoritarianism // Journal of Democracy. – 2002. – Vol. 13, No. 2. – P. 51–65.

[2] Гэтая частка артыкула грунтуецца на маёй працы: Way L. Pluralism by Default: Weak Autocrats and the Rise of Competitive Politics. – Baltimore: Johns Hopkins University Press, 2015. – P. 1–4, 7–8, 11–12, 15–16, 19–20, 23–24, 27–28, 31–32, 35–36, 39–40, 43–44, 47–48, 51–52, 55–56, 59–60, 63–64, 67–68, 71–72, 75–76, 79–80, 83–84, 87–88, 91–92, 95–96, 99–100, 103–104, 107–108, 111–112, 115–116, 119–120, 123–124, 127–128, 131–132, 135–136, 139–140, 143–144, 147–148, 151–152, 155–156, 159–160, 163–164, 167–168, 171–172, 175–176, 179–180, 183–184, 187–188, 191–192, 195–196, 199–200, 203–204, 207–208, 211–212, 215–216, 219–220, 223–224, 227–228, 231–232, 235–236, 239–240, 243–244, 247–248, 251–252, 255–256, 259–260, 263–264, 267–268, 271–272, 275–276, 279–280, 283–284, 287–288, 291–292, 295–296, 299–300, 303–304, 307–308, 311–312, 315–316, 319–320, 323–324, 327–328, 331–332, 335–336, 339–340, 343–344, 347–348, 351–352, 355–356, 359–360, 363–364, 367–368, 371–372, 375–376, 379–380, 383–384, 387–388, 391–392, 395–396, 399–400, 403–404, 407–408, 411–412, 415–416, 419–420, 423–424, 427–428, 431–432, 435–436, 439–440, 443–444, 447–448, 451–452, 455–456, 459–460, 463–464, 467–468, 471–472, 475–476, 479–480, 483–484, 487–488, 491–492, 495–496, 499–500, 503–504, 507–508, 511–512, 515–516, 519–520, 523–524, 527–528, 531–532, 535–536, 539–540, 543–544, 547–548, 551–552, 555–556, 559–560, 563–564, 567–568, 571–572, 575–576, 579–580, 583–584, 587–588, 591–592, 595–596, 599–600, 603–604, 607–608, 611–612, 615–616, 619–620, 623–624, 627–628, 631–632, 635–636, 639–640, 643–644, 647–648, 651–652, 655–656, 659–660, 663–664, 667–668, 671–672, 675–676, 679–680, 683–684, 687–688, 691–692, 695–696, 699–700, 703–704, 707–708, 711–712, 715–716, 719–720, 723–724, 727–728, 731–732, 735–736, 739–740, 743–744, 747–748, 751–752, 755–756, 759–760, 763–764, 767–768, 771–772, 775–776, 779–780, 783–784, 787–788, 791–792, 795–796, 799–800, 803–804, 807–808, 811–812, 815–816, 819–820, 823–824, 827–828, 831–832, 835–836, 839–840, 843–844, 847–848, 851–852, 855–856, 859–860, 863–864, 867–868, 871–872, 875–876, 879–880, 883–884, 887–888, 891–892, 895–896, 899–900, 903–904, 907–908, 911–912, 915–916, 919–920, 923–924, 927–928, 931–932, 935–936, 939–940, 943–944, 947–948, 951–952, 955–956, 959–960, 963–964, 967–968, 971–972, 975–976, 979–980, 983–984, 987–988, 991–992, 995–996, 999–1000.

[3] Гэтая частка артыкула грунтуецца на маёй працы: Way L. Pluralism by Default: Weak Autocrats and the Rise of Competitive Politics. – Baltimore: Johns Hopkins University Press, 2015. – P. 1–4, 7–8, 11–12, 15–16, 19–20, 23–24, 27–28, 31–32, 35–36, 39–40, 43–44, 47–48, 51–52, 55–56, 59–60, 63–64, 67–68, 71–72, 75–76, 79–80, 83–84, 87–88, 91–92, 95–96, 99–100, 103–104, 107–108, 111–112, 115–116, 119–120, 123–124, 127–128, 131–132, 135–136, 139–140, 143–144, 147–148, 151–152, 155–156, 159–160, 163–164, 167–168, 171–172, 175–176, 179–180, 183–184, 187–188, 191–192, 195–196, 199–200, 203–204, 207–208, 211–212, 215–216, 219–220, 223–224, 227–228, 231–232, 235–236, 239–240, 243–244, 247–248, 251–252, 255–256, 259–260, 263–264, 267–268, 271–272, 275–276, 279–280, 283–284, 287–288, 291–292, 295–296, 299–300, 303–304, 307–308, 311–312, 315–316, 319–320, 323–324, 327–328, 331–332, 335–336, 339–340, 343–344, 347–348, 351–352, 355–356, 359–360, 363–364, 367–368, 371–372, 375–376, 379–380, 383–384, 387–388, 391–392, 395–396, 399–400, 403–404, 407–408, 411–412, 415–416, 419–420, 423–424, 427–428, 431–432, 435–436, 439–440, 443–444, 447–448, 451–452, 455–456, 459–460, 463–464, 467–468, 471–472, 475–476, 479–480, 483–484, 487–488, 491–492, 495–496, 499–500, 503–504, 507–508, 511–512, 515–516, 519–520, 523–524, 527–528, 531–532, 535–536, 539–540, 543–544, 547–548, 551–552, 555–556, 559–560, 563–564, 567–568, 571–572, 575–576, 579–580, 583–584, 587–588, 591–592, 595–596, 599–600, 603–604, 607–608, 611–612, 615–616, 619–620, 623–624, 627–628, 631–632, 635–636, 639–640, 643–644, 647–648, 651–652, 655–656, 659–660, 663–664, 667–668, 671–672, 675–676, 679–680, 683–684, 687–688, 691–692, 695–696, 699–700, 703–704, 707–708, 711–712, 715–716, 719–720, 723–724, 727–728, 731–732, 735–736, 739–740, 743–744, 747–748, 751–752, 755–756, 759–760, 763–764, 767–768, 771–772, 775–776, 779–780, 783–784, 787–788, 791–792, 795–796, 799–800, 803–804, 807–808, 811–812, 815–816, 819–820, 823–824, 827–828, 831–832, 835–836, 839–840, 843–844, 847–848, 851–852, 855–856, 859–860, 863–864, 867–868, 871–872, 875–876, 879–880, 883–884, 887–888, 891–892, 895–896, 899–900, 903–904, 907–908, 911–912, 915–916, 919–920, 923–924, 927–928, 931–932, 935–936, 939–940, 943–944, 947–948, 951–952, 955–956, 959–960, 963–964, 967–968, 971–972, 975–976, 979–980, 983–984, 987–988, 991–992, 995–996, 999–1000.

перасьледуюць, але часам ім удаецца ўнікаць рэпрэсіяў і выходзіць на шырокую аўдыторыю. У 1990-х гг. Кучма пачаў узмацняць кантроль над мэдыямі, але яму так і не ўдалося прымусіць замаўчаць крытыкаў яго рэжыму.

Нягледзячы на фармальную прыватызацыю большасьці электронных СМІ ў 1995–1996 гг., урад працягваў утрымліваць нефармальны кантроль практычна над усімі найбуйнейшымі тэлевізійнымі каналамі. Напрыканцы 1990-х два найвялікшыя тэлеканалы – «Інтер» і «1 + 1», якія займаюць каля 50 % тэлевізійнага рынку краіны, перайшлі пад кантроль Аляксандра Зінчанкі й Віктара Медведчука з праўрадавае Сацыял-дэмакратычнае партыі Ўкраіны (Аб'яднанае) (СДПУ(а). Акрамя таго, зяць Кучмы Віктар Пінчук пераняў кантроль за «Новым каналам», ICTB і СТВ, якія разам займаюць яшчэ ад 15 да 25 % тэлерынку навінаў.

У выніку, у апошнія гады існаваньня рэжыму Кучмы пачала ажыцьцяўляцца мэтавая, шырокамаштабная і прыдзірлівая цэнзура зьместу праграмаў навінаў. Напачатку 2002 г. прэзыдэнцкая адміністрацыя распачала рассылаць *«тэмнікі»* (ад слова «тэма») – падрабязныя інструкцыі, як трэба асьвятляць пэўныя навіны, і якія падзеі трэба ігнараваць. Напрыклад, *тэмнікі* раілі падкрэсьліваць унутраную грызьню паміж лідэрамі апазыцыі і падаваць іх як прыхільнікаў этнічнага экстрэмізму. Некаторых асобаў, такіх як апазыцыйная лідэрка Юлія Цімашэнка, рэкамэндавалася ўвогуле ня згадваць. Улады выразалі цэлыя фрагмэнты ток-шоў у жывым этэры, а таксама абмяжоўвалі шэраг іх удзельнікаў да вузкае групы людзей, якім давярала прэзыдэнцкая адміністрацыя.

У той жа час апазыцыя надалей мела доступ да высокатыражных газэтаў накшталт «Сільські Вісті» Сацыялістычнай партыі. І што важней, напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў апазыцыя кантралявала «5 канал», які пры канцы 2004 г. займаў 5 % ад нацыянальнага інфармацыйнага рынку і добра прымаўся ў шматлікіх гарадох ува ўсёй Украіне. Акрамя гэтага, апазыцыя выкарыстоўвала інтэрнэт як форум для палітычных дыскусіяў. Карацей кажучы, дарма што апазыцыя знаходзілася ў нашмат горшых умовах у

параўнаньні з уладамі, яны былі ня ў стане прымусіць яе маўчаць.

Спалучэньне аўтарытарных практык і рэальнай канкурэнцыі таксама пераважала ўва ўзаемаадносінах паміж прэзыдэнтам і парлямэнтам. У шмат якіх ключавых сфэрах прэзыдэнт меў нашмат больш улады (як дэ-юрэ, так і дэ-факта), чым Вярхоўная Рада. Кучма меў права самастойна прызначаць прэм'ер-міністра і ўсіх чальцоў кабінэту міністраў, а таксама сваіх прадстаўнікоў у абласьцях ды раёнах. Аднак, у параўнаньні з чыста аўтарытарнымі рэжымамі, украінскі парлямэнт ніколі не рабіўся марыянэткай у руках прэзыдэнта. Ён адмаўляўся зацьвердзіць шматлікія прапановы Кучмы па эканамічных рэформах у 1990-х і 2000–2001 гг., а таксама пасьпяхова заблякаваў спробу Кучмы ўзмацніць прэзыдэнцкую ўладу ў краіне.

На працягу ўсяго постсавецкага часу ўкраінскі парлямэнт быў асноўным пляцдармам для дзейнасьці апазыцыі, даючы дэпутатам адносна лёгкі доступ у СМІ, а таксама імунітэт ад перасьледу. Паводле закону, дэпутат можа быць аддадзены пад суд толькі ў выпадку, калі парлямэнт пастановіць зьняць зь яго недатыкальнасьць, што здаралася надзвычай рэдка. Хоць такі імунітэт прываблівaў шматлікіх карумпаваных бізнэсоўцаў, ён быў сапраўдным паратункам для апазыцыйных лідэраў. Таму, хоць парлямэнт часьцяком меў меншую ўладу, чым іншыя органы ўлады, ён забясьпечваў абаронены праўны статус дэпутатаў і даваў трыбуну для выражэньня апазыцыйных і пратэстных настрояў. У лістападзе 2000 г. лідэр Сацыялістычнае партыі Аляксандар Мароз выкарыстаў парлямэнцкую залю, каб публічна абвінаваціць Кучму ў тым, што той загадаў забіць апазыцыйнага журналіста Георгія Гангадзэ. Гэтая падзея спарадзіла першы буйны крызіс рэжыму Кучмы.

ПАДВАЛІНЫ РЭЖЫМУ

Каб зразумець, наколькі была абмежавана дэмакратыя ўва Ўкраіне, а таксама прычыны нескансалідаванасьці Кучмавага аўтарытарызму, неабходна разгледзець інстытуцыйныя ды палітычныя падваліны яго рэжыму. Канкурэнтны аўтарытарызм Кучмы грунтаваўся на двух стаўпах: па-першае, шырокім наборы надзвычай нефармальных аўтарытарных інстытутаў ды працэдураў для перасьледу апазыцыянэраў ды фальсыфікацыі вынікаў выбараў; і па-другое, кааліцыі алігархічных сілаў у парлямэнце і прэзыдэнцкай адміністрацыі, якая забясьпечвала падтрымку Кучмы, змагаючыся за ягоны патранаж.

Большасьць акадэмічных дасьледзінаў, прысьвечаных пераходу да дэмакратыі, засяроджваюцца выключна на фармальных законах ды канстытуцыях. На жаль, гэткі фокус часта не дазваляе ўбачыць аўтарытарныя рысы рэжымаў, якія пасьля заканчэньня «халоднае вайны» фактычна не атрымалі падрабязнага апісаньня і разгляду. Эканамічнае панаваньне Захаду і міжнароднае прызнаньне дэмакратыі схілілі шматлікія рэжымы да прыняцьця «дэмакратычных» канстытуцыяў, хаця ў той жа самы час яны шырока ўжывалі нефармальныя правілы для захаваньня аўтарытарызму.

Кучмаў аўтарытарызм трымаўся на шырокім шэразе нефармальных інстытутаў, заахвочваньняў і пакараньняў, ужываных для нэўтралізацыі апазыцыі і стымуляцыі выбарчых фальсыфікацыяў падчас галасаваньняў. Дзяржаўныя ўстановы, такія як падатковыя інспэкцыі, міліцыя, школы і бальніцы, акрамя сваіх *фармальных* функцыяў (зьбіраньне падаткаў, барацьба з злачыннасьцю, забесьпячэньне адукацыі й мэдычных паслуг) выконвалі шэраг *нефармальных* абавязкаў, зьвязаных з утрыманьнем існуючага рэжыму пры ўладзе. Напрыклад, падатковыя інспэкцыі ды іншыя кантрольныя органы часам выкарыстоўваліся для барацьбы зь бізнэс-структурамі і асобамі, якія падтрымлівалі апазыцыю. Паводле словаў былога кіраўніка Службы бясьпекі Ўкраіны (СБУ) Яўгена Марчука, «калі [ваша фірма] ляяльная ўладам, яны праігнаруюць або не заўважаць любыя правапарушэньні. Калі ж вы неляяльныя, ці вы, ці ваш бізнэс адразу зазнае ўціск»[2]. Бізнэс-структуры, якія дапамагалі апазыцыі, часьцяком рабіліся ахвярамі перасьледу з боку падатковых інспэкцыяў, пракуратуры ды іншых

дзяржаўных органаў.

ТВОРЧАЯ ПАДТАСОЎКА ГАЛАСОЎ

Падчас выбараў такія дзяржаўныя ўстановы, як бальніцы, школы і вайсковыя базы, станавіліся ключавымі інструментамі ў фальсыфікацыі рэжымам вынікаў галасаваньня. Кіраўніцтва гэтых устаноў ставілася задача забясьпечыць высокую явку выбарнікаў на ўчасткі для галасаваньня і высокі адсотак падтрымкі кандыдатаў ад улады. На выбарах у 2004 г. удзельнічала чвэрць кіраўнікоў мясцовых выбарчых штабоў Януковіча складалася з рэктараў універсытэтаў, дырэктараў школ, галоўных лекараў бальніцаў, якія забясьпечвалі «патрэбны» кандыдата ад улады вельмі творчымі мэтадамі. Напрыклад, назіральнік у адной з бальніцаў Днепрапятроўску паведаміў, што галоўны лекар бальніцы падаў ува ўчастковую камісію сьпіс з удвая завышанай колькасьцю пацыентаў, а пасьля прывёў прыхільнікаў Януковіча, каб яны прагаласавалі за гэтых віртуальных пацыентаў.

Выбарчыя фальсыфікацыі й запалохваньні пры Кучму мелі паўсюдны, мэтаскіраваны ды добра арганізаваны характар. Нядаўна апублікаваныя прызнаньні актывістаў выбарчае кампаніі Януковіча паказваюць, што ўлады распрацавалі вельмі дэталёвыя пляны перамогі з адрывам каля 3 адсоткаў. Гэты адрыў быў дастаткова буйны, каб выглядаць салідным і пераканаўчым, і дастаткова мінімальны, каб паказаць, што выбары сапраўды былі канкурэнтнымі. Дзеля ажыцьцяўленьня гэтага пляну ўлады стварылі разгалінаваную сакрэтную каардынацыйную структуру. Раённыя і гарадзкія адміністрацыі атрымалі распараджэньні, колькі адсоткаў мае быць «за» Януковіча з надзвычай падрабязнымі інструкцыямі, як і дзе скрасьці галасы.

У горадзе Умань украінская моладзевая НДА «Знаю!» выявіла афіцыйную дырэктыву, у якой былі пералічаныя розныя тэхналёгіі маніпуляцыяў з галасамі выбарнікаў (закіданьне

2. Цыкуецца трэхдзённага кіраўніцтва скарыстаўшы Цэнтру Разумкова «Сістэма дапамагатычнага трымаўшы кантролю навадаміў, кампаўнымі парлямі: яе афіцыйнымі і недахопы» (Нацыянальная бібліятэка і абарона. Кіеў, 04.2004).

«левых» бюлетэняў у скрыні для галасаваньня, подкуп выбарнікаў і да т. п.), прызначананыя для ўжываньня падчас другога туру прэзыдэнцкіх выбараў 21 лістапада 2004 г. У гэтым дакумэнце канкрэтызавалася колькасьць «левых» галасоў, якія трэба было забясьпечыць пры дапамозе гэтых тэхналёгіяў на кожным выбарчым участку. У іншых выпадках дырэктывы заклікалі запалохваць выбарнікаў. Напрыклад, у Запароскай вобласьці шматлікія выбарчыя ўчасткі атрымалі іншую інструкцыю – яна была надрукаваная на паперы з троху іншым адценьнем зялёнага колеру, чымся аналягічны дакумэнт, зацьверджаны пры ўдзеле міжнароднай супольнасьці, – у якой пазначалася, што выбарнікі павінны падпісаць свой бюлетэнь, што выключала таямніцу галасаваньня. Іншыя чальцы выбарчых камісіяў паведамлялі, што ім загадалі дапусьціць да галасаваньня іншагародніх з адмацавальнымі талёнамі, якіх прывозілі цэлымі аўтобусамі. Урэшце, калі б гэтыя захады не далі патрэбных вынікаў, улады мелі запасны варыянт: загадзя, яшчэ да выбараў, падпісаныя ды паштампаваныя пратаколы галасаваньня з выбарчых участкаў.

Кучма стварыў усёабдымную сыстэму заахвочваньняў і пакараньняў, каб забясьпечыць выкананьне ўрадавых дырэктываў старшынямі выбарчых камісіяў. Ён выкарыстоўваў падатковыя інспэкцыі, міліцыю ды іншыя дзяржаўныя органы, каб прымусіць бізнэсоўцаў, палітыкаў і ўрадоўцаў падтрымаць рэжым падчас выбараў. Кейт Дардэн сьцьвярджала, што Кучма часта заахвочваў карупцыю, бо адпаведны кампрамат можна было выкарыстаць для шантажаваньня тых, на каго абапіраўся рэжым. Сакрэтныя запісы размоваў Кучмы, зробленыя ў 2000–2001 гг., паказваюць, як ён выкарыстоўваў шантаж для забесьпячэньня падтрымкі свае кандыдатуры ў сельскай мясцовасьці падчас пасьпяховай кампаніі свайго пераабраньня ў 1999 г. На адной з стужак ён гаворыць кіраўніку Дзяржаўнай падатковай адміністрацыі:

Трэба, каб кожны падатковы інспэктар пайшоў да кіраўнікоў калгасаў у кожнай вёсцы і сказаў: «Любачка! Ты цудоўна разумееш, колькі мы маем на цябе матэрыялаў, каб хоць заўтра засадзіць цябе за краты... На кожнага старшыню калгасу больш

чым дастаткова матэрыялаў. Так ці не? Пэўна, так. Вось чаму міліцыя... то бок падаткавікі... усе павінны ўзяцца [за справу] і правесьці сур'ёзныя размовы з усімі кіраўнікамі калгасаў[3].

Сёй-той выконваў урадавыя дырэктывы дзеля боязі згубіць сваю працу. Пасьля першага туру галасаваньня ў 2004 гг. 14 дзяржаўных кіраўнікоў раённых адміністрацыяў былі звольненыя з сваіх пасадаў у тых рэгіёнах, дзе Януковіч прайграў.

[3] Keith Dinden, «Blackmail as a Tool of State Domination».

Шматлікія прадстаўнікі выбарчых камісіяў атрымалі салідныя грашовыя прэміі за выкананьне ўрадавых дырэктываў. На выбарах у 2004 г. старшыня адной выбарчай камісіі ў Запароскай вобласьці, дзе, паводле большасьці ацэнак, узровень фальсыфікацыяў быў *найменшы*, паведаміла, што сябры ўчастковых камісіяў атрымоўвалі прэміі ў залежнасьці ад таго, колькі галасоў было аддадзена за Януковіча і колькі было ўжыта спосабаў фальсыфікацыі вынікаў галасаваньня. Паводле яе словаў, пасьля першага туру галасаваньня кожная ўчастковая камісія атрымала каля 5000 даляраў ЗША. Іншыя крыніцы гавораць, што фігуравалі большыя сумы[4]. Ніхто дакладна ня ведае, наколькі пашыраным быў такі подкуп, але, калі б толькі палова з 33 000 участковых выбарчых камісіяў ува ўсёй Украіне атрымала такую суму, гэта азначае, што ўладам давялося выдзеліць на гэта больш за 80 мільёнаў даляраў.

На выпадак краху ўсіх гэтых мясцовых мэтадаў фальсыфікацыі існаваў мэханізм «карэктаваньня» вынікаў падліку галасоў на самым версе. Канчатковы падлік галасоў кантраляваўся прэзыдэнцкай адміністрацыяй праз кампутарную сыстэму, якая «адфільтроўвала» вынікі галасаваньня ў рэгіёнах пры дапамозе сакрэтнага кампутарнага сэрвэру да таго, як яны паступалі ў Цэнтральную выбарчую камісію, орган, які афіцыйна займаецца канчатковым падвядзеньнем вынікаў галасаваньня на выбарах.

[4] Пофіцыі Запорожжа. 2004. 14 студзеня; Украінская правда. 2004. 16 лістапада.

УСЯЎЛАДЗЬДЗЕ АЛІГАРХАЎ

Вышэйпамянёныя нефармальныя аўтарытарныя інстытуты ды працэдуры дапаўняліся рыхлай кааліцыяй алігархаў – багатых і палітычна ўплывовых людзей, – якія арганізоўвалі палітычную падтрымку прэзыдэнту. Панаваньне алігархаў у Кучмавай Украіне адлюстроўвала адмысловую ўзаемасувязь паміж эканамічнай і палітычнай уладай, вельмі падобную той, што склалася падчас прэзыдэнцтва Ельцына ў Расеі ды Пятра Лучынскага ў Малдове. У большасьці краінаў палітычныя лідэры разьлічваюць на падтрымку бізнэсу, але толькі ў алігархічных сыстэмах бізнэсоўцы самі займаюць месцы ў парлямэнце ці іншыя афіцыйныя пасады. Гэтыя алігархі часта зарабляюць свае капіталы дзякуючы доступу да таннай прыватызацыі, дзяржаўных манаполіяў ці бюджэтных рэсурсаў, і шмат хто зь іх ідзе ў парлямэнт, каб атрымаць дэпутацкую недатыкальнасьць ці пралабіраваць уласныя эканамічныя інтарэсы.

Як і ў Расеі, колькасьць і багацьце алігархаў ува Ўкраіне рэзка павялічылася ў 1990-я гг. У 2000 г., паводле інфармацыі дзяржаўнае падатковае адміністрацыі, 386 з 450 дэпутатаў Вярхоўнае рады былі заснавальнікамі 3954 бізнэс-структураў, якія кантралявалі 25 % нацыянальнага імпарту і 10 % экспарту. Некаторыя зь іх, такія як лідэр СДПУ(а) Віктар Медвядчук і лідэр партыі «Батьківщина» Юлія Цімашэнка (цяперашні прэм'ер-міністар Украіны), выкарыстоўвалі кантакты ўва ўрадзе, каб атрымаць доступ да высокадаходных энэргетычных рэсурсаў. Шмат іх абвінавачвалі ў выкарыстаньні сувязяў ува ўрадзе на карысьць розных бізнэс-структураў і прамысловых прадпрыемстваў.

Часткова ў абмен на доступ да дзяржаўных рэсурсаў алігархі дапамаглі Кучму мабілізаваць палітычную падтрымку напрыканцы 1990-х і напачатку 2000-х, часьцяком наўпрост выкарыстоўваючы свае фірмы. Як і Ельцын, Кучма сур'ёзна залежаў ад кантраляваных алігархамі тэлевізійных каналаў і газэтаў. Тэлевізійны магнат Віктар Медвядчук з СДПУ(а) быў ініцыятарам распаўсюду *тэмнікаў*, якія вызначалі зьмест тэлевізійных навінаў. Алігархі зь іншых галінаў эканомікі таксама прыцягвалі свае рабочыя калектывы на падтрымку

Кучмы. Паводле шматлікіх зьвестак, падчас выбараў 2004 г. рабочых аўтамабілебудаўнічых, сталеліцейных, вуглездабывальных, энэргетычных ды іншых прадпрыемстваў, якія належалі пракучмаўскім алігархам, змушалі ўдзельнічаць у дэманстрацыях, галасаваць за Януковіча і нават у адным дужа дзіўным выпадку абвясьціць «страйк», каб зьвярнуць увагу грамадзкасьці на «небясьпеку», якая зыходзіць ад дзейнасьці апазыцыі. Падобныя мэханізмы палітычнае мабілізацыі былі асабліва важныя з прычыны адсутнасьці ў краіне моцных палітычных партыяў.

Замест таго каб стварыць адзіную прапрэзыдэнцкую партыю, Кучма, падобна Барысу Ельцыну, разьлічваў на падтрымку шэрагу дробных партыяў, якімі кіравалі варагуючыя міжсобку алігархі. Замест таго каб зьліцца з адной палітычнай групай, ён разьмяркоўваў палітычныя й эканамічныя рэсурсы паміж шматлікімі й канкурэнтнымі фракцыямі, спадзеючыся тым самым перашкодзіць таму, каб нейкая зь іх стала занадта моцнай і пачала ўяўляць небясьпеку ягонаму рэжыму. У выніку ягоная падтрымка ў парлямэнце і ўва ўласнай адміністрацыі залежала выключна ад каротката эрміновага эканамічнага эгаізму вялікага і блытанага мноства дробных фракцыяў і нефармальных груповак. Напачатку 2000 г. забесьпячэньне падтрымкі Кучмы ў парлямэнце было ўскладзенае на лідэра СДПУ(а) Віктара Медведчука, лідэрку партыі «Батьківщина» Юлію Цімашэнку і навасьпечаную Партыю Рэгіёнаў, створаную кіраўніком Дзяржаўнае падатковае адміністрацыі Міколам Азаравым і пазьней узначаленую Віктарам Януковічам. Напярэдадні парлямэнцкіх выбараў 2002 г. адбылася каротката эрміновая спроба стварэньня прапрэзыдэнцкае партыі пад назвай «За адзіную Ўкраіну» на ўзор пуцінскае «Адзінае Расеі». Кіраваць новым палітычным аб'яднаньнем паставілі былога кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Кучмы Ўладзімера Літвіна. Аднак неўзабаве пасьля парлямэнцкіх выбараў гэтая палітычная група распалася на колькі паасобных фракцыяў.

СЫСТЭМА ДАЕ ЗБОЙ

Пэўны час спалучэньне дзяржаўных аўтарытарных структураў з панаваньнем алігархаў дапамагала ўзурпаваць выканаўчую ўладу. Аднак у гэтую сыстэму быў закладзены самаразбуральны пачатак. У адрозьненьне ад апаратчыкаў Камуністычнае партыі ці кіраўніцтва СБУ, алігархі забясьпечвалі слабую базу падтрымкі: яны не выконвалі безь пярэчаньняў загадаў, паводле свае натуры былі неверагодна апартуністычныя й мелі слабое пачуцьцё ляяльнасьці. Калі пад Кучмам пахіснулася глеба, яны ўраз адвярнуліся ад яго. Гэта прывяло да распаду дзяржаўных аўтарытарных структураў, выклікала ўрэшце крызіс рэжыму падчас выбараў у 2004 г. і сыход Кучмы.

Алігархічная сыстэма стварыла ключавыя перадумовы для ўзьнікненьня апазыцыйных сілаў. Перш за ўсё, уцёкі капіталу, хоць яны і блага ўплывалі на разьвіцьцё ўкраінскай эканомікі, сталіся важнай крыніцай сілы для апазыцыйнага руху. Дарма што дзяржаўная падатковая служба магла перасьледаваць апазыцыйны бізнэс аж да яго поўнае ліквідацыі, яна была ня ў стане канфіскаваць грошы, вывезеныя за мяжу. Сакрэтныя запісы, зробленыя ў 2000 г., сьведчаць, што тагачасны міністар унутраных справаў Краўчанка скардзіўся Кучму, што ўладам надзвычай цяжка забраць вывезеныя за мяжу грошы. Вывезшы агромністыя сумы грошай за мяжу, алігархі стваралі сур'ёзныя пагрозы Кучму нават тады, калі ён зачыняў іх бізнэс ува Ўкраіне.

Іншай крыніцай палітычнай незалежнасьці быў статус дэпутацкай недатыкальнасьці, які забараняў крымінальны перасьлед дэпутатаў Вярхоўнае рады падчас дзеяньня іх паўнамоцтваў. Гэтая недатыкальнасьць абараняла як дэпутатаў-крымінальнікаў, так і лідэраў апазыцыі. Адпаведна, падчас выбарчае кампаніі 2004 г. практычна ўсе яны, уключна зь Юшчанкам, былі дэпутатамі парлямэнту – апазыцыянэры маглі не баяцца, што ўлады зьняволяць іх ці будуць цягаць на допыты.

Апазыцыя таксама карысталася з імкненьня алігархаў шырока разьмеркаваць свае рэсурсы паміж усімі патэнцыйнымі групамі

ўплыву. У выніку, у 2002–2003 гг., пасьля таго, як Юшчанка стаў паўсюдна разглядацца ў якасьці фаварыта прэзыдэнцкіх выбараў 2004 году, ён атрымаў тайныя ахвяраваньні ад шматлікіх бізнэсоўцаў. Асноўны спонсар Юшчанкі Давід Жванія хваліўся ў сакавіку 2004 г.: «Я ня ведаю фінансавае групы ўва Ўкраіне ці нават у Расеі, якая б не хацела, каб Юшчанка стаў прэзыдэнтам. У Юшчанкі няма праблемаў з грашыма»[5]. Паведамлялася, што нават алігарх з усходняе Ўкраіны Рынат Ахметаў, які ўрэшце перайшоў на бок Януковіча, пры канцы 2003 г. зрабіў ахвяраваньні на карысьць выбарчае кампаніі Юшчанкі.

Напасьледак, разьмеркаваньне рэсурсаў Кучмам сярод канкурэнтных груповак павялічвала верагоднасьць таго, што гэтыя рэсурсы патрапяць у «дрэнныя» рукі. Сакрэтныя запісы, зробленыя ў 2000 г., выкрываюць Віктара Януковіча, тагачаснага губэрнатара Данецкае вобласьці, які скардзіўся Кучму, што, даючы бюджэтныя сродкі тагачаснаму прэм'ер-міністру Віктару Юшчанку, Кучма «даваў грошы ворагу... Зразумела? Вы ўзмацняеце іх!»[6]. Неўзабаве стала ясна, што Януковіч меў рацыю.

[5] Українська правда, 2004, 7 красавіка.

Гэтыя магчымасьці для незалежнай дзейнасьці, уласьцівыя алігархічнай сыстэме, пры канцы 2000 г. дазволілі нанесьці ёй вырашальны ўдар, калі былы целаахоўнік Кучмы Мікола Мельнічэнка абнародаваў аўдыёзапісы, якія намякалі, што прэзыдэнт загадаў забіць апазыцыйнага журналіста Георгія Гангадзэ, а таксама выяўлялі велічэзны ўзровень карупцыі й злоўжываньня ўладай. Абнародаваньне гуказапісаў падарвала рэпутацыю Кучмы як ўва Ўкраіне, так і за мяжой. Упершыню з моманту свайго абраньня на пасаду прэзыдэнта ў 1994 г. ён апынуўся на мяжы адстаўкі. Адначасова Юшчанка, якога Кучма пры канцы 1999 г. прызначыў прэм'ер-міністрам, стаў найпапулярнейшым палітыкам Украіны. На Кучмаву бяду, жыцьцяздатная альтэрнатыва ягонаму рэжыму зьявілася акурат у той самы момант, калі ўзровень ягонай папулярнасьці проста абрынуўся.

КРЫШТАЛІЗАЦЫЯ АПАЗЫЦЫІ

Хаця Кучма вытрымаў першыя заклікі сысьці ў адстаўку, агучаныя пасьля абнародваньня аўдыёзапісаў, крызіс ужо паступовы развал ягонае кіруючае кааліцыі. За колькі істотнымі выняткамі, кіраўніцтва праюшчанкаўскага руху вельмі цесна зьвязана з Кучмам – большасьць працаваньня рэжым за некалькі гадоў і нават за пару месяцаў да президента лістападаўскіх падзеяў[7]. Сам Юшчанка аднойчы назваў, што Кучма быў яму як «бацька». Лідэр радыкальнага крыла праюшчанкаўскага руху Юлія Цімашэнка ўзначальвала пракучмаўскую парлямэнцкую фракцыю з 1998-га па 2000-га г. Дарадца і фінансавы дырэктар Юшчанкі, а таксама кіраўнік адзінага праюшчанкаўскага тэлеканалу Пятро Парашэнка пачынаў сваю палітычную кар'еру ў СДПУ(а) і быў адным з заснавальнікаў «Партыі рэгіёнаў» Януковіча. Кіраўнік выбарчае кампаніі Юшчанкі Аляксандар Зінчанка да пачатку 2003 г. быў лідэрам СДПУ(а) і ўзначальваў р'яна прапрэзыдэнцкі тэлеканал «Інтер».

Выкыванье рэжыму Кучмы апынулася яшчэ пад большай пагрозай, калі за некалькі месяцаў да выбараў шматлікім чальцы ягонага ўраду і праўрадавае большасьці ў Вярхоўнай радзе пачалі перабягаць на бок апазыцыі. У сярэдзіне сьнежня 2004 г. сьпікер Вярхоўнае рады Ўладзімер Літвін, які ў кіраваў прапрэзыдэнцкай фракцыяй у парлямэнце й лічылі адным з найбліжэйшых паплечнікаў Кучмы, парваў з Кучмам, пацягнуўшы за сабой прыкладна 40 дэпутатаў. Менавіта пад кіраўніцтвам сьпікера Літвіна парлямэнт стаўся першым дзяржаўным органам ува што падтрымаў дэманстрантаў, калі празь пяць дзён пасьля пачатку акцыяў пратэсту Вярхоўная рада абвясьціла вынікі другога туру галасаваньня несапраўднымі й запатрабавала правесьці паўторна другі тур выбараў 26 сьнежня 2004 г. Такім чынам, акурат старыя паплечнікі Кучмы стварылі прамую базу для апазыцыі ў цэнтральных органах улады.

Цімашэнка, Парашэнка і Зінчанка, якіх часам называлі тэмпэрамэнтам, гаманцом і розумам юшчанкаўскага руху, забясьпечылі ключавую фінансавую і арганізацыйную падтрымку, якая дапамагла скіраваць у патрэбнае рэчышча

7 Менавіта ў Кучмы Юшчанка ўпершыню сустрэў Кіры Жанну Кіпіані. Кто есть кто в политике Беларуси. Минск, 2002. с. 116.

неверагодны людзкі пратэст з-за фальсыфікаваных вынікаў выбараў, зрабіўшы рэвалюцыю магчымай. Паколькі апазыцыя зазнала сур'ёзны прэсінг з боку ўладаў і фактычна была пазбаўлена доступу да большасьці СМІ, асабліва значную ролю падчас дэманстрацыяў адыграў рэзка праюшчанкаўскі «5 канал» Парашэнкі. З раньняга рана 22 лістапада, як толькі стала вядома, што ўлады сфальсыфікавалі вынікі другога туру выбараў, «5 канал» стаў для апазыцыі асноўным мабілізацыйным інструмэнтам, паказваючы кадры з моладзьдзю, якая размахвала юшчанкаўскімі памаранчавымі сьцягамі й заклікала людзей прыйсьці на Майдан Незалежнасьці, каб «абараніць свае канстытуцыйныя правы». Цягам усёй рэвалюцыі «5 канал» трансьляваўся на агромністым тэлевізійным экране на Майдане ў Кіеве, а таксама ўва ўсёй Украіне.

У дадатак да арганізацыйнае дапамогі, перакінчыкі з табару Кучмы забясьпечвалі неацэнныя фінансавыя рэсурсы. Апазыцыйны рух вельмі залежаў ад ахвяраваньняў мясцовых бізнэсоўцаў. Каля траціны чальцоў Камітэту нацыянальнага паратунку, якім кіраваў юшчанкаўскі рух, складалі бізнэсоўцы. Паводле інфармацыйных крыніцаў у апазыцыі, да сярэдзіны сьнежня 2004 г. рух здолеў прыцягнуць як найменш 100 мільёнаў даляраў ЗША. Аўтар нядаўняе публікацыі ў «Nation» выказаў меркаваньне, што ЗША дырыжавалі падзеямі ўва Ўкраіне, фінансуючы грамадзянскую супольнасьць ды іншыя групы[8], хоць ясна, што апазыцыя мела мноства ўнутраных фінансавых рэсурсаў і была практычна незалежнай ад замежных грошай.

Украінскія грошы дапамаглі прафінансаваць і выбарчую кампанію Юшчанкі, і саму рэвалюцыю. Акурат зь іхняга аплачана арэнда памяшканьняў мясцовых выбарчых штабоў ва ўсёй краіне, рэклямная кампанія, абсталяваньне для мітынгаў-рок-канцэртаў, а таксама ўсюдыісныя памаранчавыя шаліны й сьцягі. Дзякуючы ахвяраваньням украінцаў у дзень выбараў былі пакрытыя транспартныя выдаткі назіральнікаў, а таксама былі набытыя тысячы відэакамэраў, коштам па 300 даляраў ЗША за штуку, для фіксацыі парушэньняў выбарчага заканадаўства. Падчас рэвалюцыі гэтыя сродкі былі

[8] Steele J. Ukraine's Untold Story // Nation. 2004. 20 December.

выкарыстаныя на намёты, мабільныя кухні, пенастырольныя дыванкі, абагравальнікі, харчаваньне, а таксама на кампэнсацыю выдаткаў за праезд чыгункай ці аўтобусам для тысячаў дэманстрантаў.

ШТО НЕ АТРЫМАЛАСЯ Ў ДЗЕНЬ ГАЛАСАВАНЬНЯ?

Разлад на самым версе ў спалучэньні з сур'ёзнымі рэгіянальнымі адрозьненьнямі паміж усходняй і заходняй часткай Украіны спрычыніў частковы паралюш дзяржаўных аўтарытарных структураў падчас і адразу па заканчэньні другога туру галасаваньня 21 лістапада. Першы правал адбыўся ў дзень галасаваньня. Улады, відавочна, прадбачылі, што выбары могуць быць прызнаныя несапраўднымі, але яны таксама спадзяваліся, што паміж часткамі апазыцыі й заходнімі ўрадамі ўзьнікнуць супярэчнасьці нашталт той, ці сапраўды выбары былі сфальсыфікаваныя. Такі сцэнар значна зьмякчыў бы рэакцыю Захаду і зьнізіў бы матывацыю дэманстрантаў выходзіць на вуліцы.

Найбуйнейшы правал з забесьпячэньнем галасоў на карысьць Януковіча здарыўся ў заходніх рэгіёнах Украіны, якія прынцыпова падтрымлівалі Юшчанку і разглядалі выбарчую кампанію Януковіча як частку намаганьняў Расеі «калянізаваць» Украіну. Напрыклад, у Львоўскай вобласьці міліцыя і падатковыя інспэкцыі адмовіліся распаўсюджваць адмацавальныя талёны, якія, відавочна, былі прызначаныя для фальсыфікацыі галасаваньня. У некаторых выпадках мясцовыя ўлады нават дапускалі невялікія фальсыфікацыі на карысьць Юшчанкі[9].

Паралюш аўтарытарных структураў не абмяжоўваўся рэгіёнамі, якія былі апірышчам Юшчанкі. Аўдыёзапісы, зробленыя ў дзень выбараў, сьведчаць, што кіраўнікі выбарчае кампаніі Януковіча былі зьдзіўленыя і заклапочаныя вынікамі галасаваньня ў Харкаўскай ды іншых паўночна-ўсходніх абласьцях Украіны, якія лічыліся «вотчынай» Януковіча. У некаторых выпадках

[9] Паведамленьні аб фальсыфікацыях ў дзень галасаваньня ў Украіне

высьвятлялася, што падтасоўка галасоў не ўдалася дзякуючы прынцыповай пазыцыі мясцовага кіраўніцтва. Напрыклад, былы кіраўнік Запарожскай аблдзяржадміністрацыі паведаміў былым назіральнікам у Запарожжы я бачыў, што шмат выбаршчыкаў галасаваць супрацоўнікаў выбарчых камісіяў не зьвярталі ўвагі на сваіх спраўлялі памылкі ў сьпісах выбарнікаў, прызначаных кіраўніцтвам дапусьціць выдачы бюлетэняў магчымым прыхільнікам кандыдата Юшчанкі. Як сказаў мне адзін чалец выбарчае камісіі, «нам сэнсу выключаць зь сьпісу гэтых людзей. Я іх ведаю, яны маё суседзі».

У іншых выпадках адмова некаторых адказных асобаў спрыяць падтасоўцы галасоў тлумачылася іх боязьзю юрыдычных наступстваў за гэты ўчынак. Заканадаўства Ўкраіны вызначае вялікія тэрміны турэмнага зьняволеньня за некаторыя віды выбарчых маніпуляцыяў. Адна сяброўка ўчастковае выбарчае камісіі прызналася, што шмат яе калегаў баяліся ўдзельнічаць у працэсе фальсыфікацыяў, бо «нават калі добра заплацілі... хто хоча сесьці ў турму, калі пераможа іншы кандыдат?»[10].

Як вынік, выпадкі выбарчых фальсыфікацыяў, якія можна пра вызначыць, параўнаўшы вынікі вельмі бруднага галасавання 21 лістапада з адносна чыстым галасаваньнем 26 снежня, былі даволі спарадычнымі. У Закарпацкай, Сумской і Кіраваградзкай абласьцях значная доля падстасоўкі галасоў пацьвярджаецца больш як дзесяціадсоткавай розьніцай на карысьць Юшчанкі, а ў Данецкай вобласьці – істотным зьмяншэньнем яўкі. Аднак у большасьці іншых абласьцей адзначаецца надзіва малая колькасьць фальсыфікацыяў вынікаў выбараў 21 лістапада[11]. Правал або слабасьць спробаў фальсыфікацыі ў шэрагу абласьцей тлумачыліся ашаламляльнай падтрымкай Юшчанкі ў заходніх рэгіёнах Украіны, а таксама даволі вялікім адсоткам аддадзеных галасоў за ягоную кандыдатуру ў шматлікіх шчыльна населеных усходніх і паўднёвых абласьцях краіны (напрыклад, 24 % галасоў у Харкаўскай і Запароскай абласьцях). Немагчымасьць скрасьці заплянаваную колькасьць галасоў у большасьці абласьцей краіны прымусіла ўлады павялічыць свае намаганьні ў падкантрольных рэгіёнах, асабліва на карысьць Януковіча Данеччыне, што тым самым рабіла фальсыфікацыю яўнымі ўкраінскай грамадзкасьці й міжнароднай супольнасьці.

[10] Пошта Запарожжя. 2004, 1 грудня.

[11] У большасьці выпадкаў фальсыфікацыі ў Юшчанкі.

На наступную раніцу пасьля дня галасаваньня ўлады павялічылі афіцыйны лічбу яўкі выбарнікаў з 78,7 % да 80,1 %. Каб Юшчанка быў пераможаны на заплянаваныя 3 % улады былі вымушаны павялічыць яўку ў адным толькі Данецку неверагодных 96 %, што на 18 % перавышала колькасць выбарнікаў, якія прыйшлі на ўчасткі ў гэтым горадзе падчас першага туру.

Паводле розных ацэнак, у самім Данецку і вобласьці на карысьць Януковіча было сфальсыфікавана ад адной траціны да адной траціны ўсіх галасоў. Назіральнікі паведамлялі, што ў гэтым рэгіёне шматлікія чальцы выбарчых камісіяў адкрыта ўкідвалі бюлетэні ў скрыні для галасаваньня, нават не намагаючыся схаваць падтасоўкі. Падобныя дзеяньні зрабілі крадзеж галасоў відавочным для ўсіх, акрамя найбольш гарачых прыхільнікаў Януковіча. Неаспрэчныя доказы яўных фальсыфікацыяў у Данецкай, Кіраваградзкай ды іншых абласьцях Украіны мелі важнае значэньне для практычна адзінадушнага і рэзкага асуджэньня выбараў міжнароднай супольнасьцю.

РЭВАЛЮЦЫЯ

Збой каардынаванага кантролю ў дні, насталыя пасьля падтасаваных выбараў 21 лістапада, зьвёў на нішто высілкі па прэсінгу дэманстрантаў. Наступным ранкам, калі дэманстранты пачалі зьбірацца на Майдане Незалежнасьці, шмат хто меркаваў, што ўлады перакрыюць уезд у Кіеў. Улады былі, пэўна, гатовы да *нейкага роду* акцыяў пратэсту (хоць ніхто ня мог уявіць, наколькі вялікія маштабы яны набудуць). Нават пры адсутнасьці стымулу, якім былі падтасаваныя вынікі выбараў, апазыцыя здолела вывесьці больш за 50 000 людзей на несанкцыянаваную дэманстрацыю ў Кіеве на пачатку лістапада 2004 г. Перад другім турам галасаваньня Кучма выступіў у тэлевізіі з папярэджаньнем: «Мы не дапусьцім рэвалюцыі!», а міністар унутраных справаў Мікола Білаконь запэўніў тэлегледачоў, што, у адрозьненьне ад Грузіі,

была ўсяго на 2-3 %. Ён заявіў, што ў выпадку перамогі Януковіча ў другім туры 26 сьнежня, чым падчас другога туру выбараў 21 лістапада.

украінская міліцыя будзе абараняць «канстытуцыйны лад». У Кіраваградзкай вобласьці, дзе мне давялося назіраць за ходам другога туру галасаваньня, на дзьвярах шматлікіх выбарчых камісіяў быў зьмешчаны зварот Білаконя да выбарнікаў, у якім ён заклікаў грамадзянаў устрымацца ад «неканстытуцыйных дзеяньняў» пасьля выбараў.

Аднак на працягу крытычных 48 гадзінаў пасьля другога туру намаганьні ўладаў заблякаваць прыезд пераважна заходніх украінцаў у Кіеў аказаліся зусім марнымі. Міліцэйскае камандаваньне ў гэтыя гадзіны было вельмі слабое. Едучы з Кіраваграда ў Кіеў уначы 22 лістапада, я бачыў, як міліцыя ў некаторых абласьцях (Кіраваградзкай, Жытомірскай, Мікалаеўскай) актыўна супрацьдзейнічала руху ў кірунку да Кіева. У той жа час міліцыя ў іншых рэгіёнах (у Львоўскай, Тэрнопальскай, Чаркаскай абласьцях і горадзе Кіеве) рабіла гэта даволі спарадычна, а ў Львоўскай вобласьці нават *дапамагала* дабрацца да Кіева ахвочым узяць удзел у акцыях пратэсту. Паводле словаў апазыцыйных актывістаў, дэпутаты парлямэнту, ужываючы свой статус, прымушалі міліцыю здымаць блёк-пасты з дарог. Да 23 лістапада аўтобусы і машыны з дэманстрантамі маглі бесьперашкодна прыбыць у сталіцу.

Таксама было важна, што дзяржаўная чыгунка падыгрывала прыхільнікам і Януковіча, і Юшчанкі, забясьпечваючы дастаўку прыхільнікаў рэжыму з усходняе Ўкраіны для ўдзелу ў падтасоўцы галасоў, а таксама дазваляючы набываць калектыўныя квіткі для транспартаваньня пратэстоўцаў у Кіеў. Міністар транспарту Георгі Кірпа дорага паплаціўся за сваю няздатнасьць перашкодзіць апазыцыі. Кажуць, што Януковіч выбіў яму два зубы. Таксама выявілася, што ў шэрагу выпадкаў мясцовыя ўлады дапамагалі тым, хто хацеў патрапіць у сталіцу. Мітынгоўцы з Тэрнопальскае вобласьці паведамілі мне, што дэканы некаторых дзяржаўных унівэрсытэтаў і кіраўніцтва гарадзкой адміністрацыі дапамагалі арганізаваць прыезд у сталіцу.

Больш узгодненыя і скаардынаваныя намаганьні ўладаў заблякаваць уезд дэманстрантаў у сталіцу маглі б істотна

зашкодзіць акцыям пратэсту. Дарма што ўкраінскія дэманстранты былі вельмі разгневаныя і рашучыя, яны не былі так добра зарганізаваныя, як, напрыклад, іхныя сэрбскія калегі ў кастрычніку 2000 г. Тамтэйшыя ўдзельнікі акцыі грамадзкага пратэсту прыехалі ў Бялград з зброяй і на бульдозэрах, каб прадухіліць любы супраціў з боку паліцыі. У адрозьненьне ад іх, украінскія пратэстоўцы ня мелі выбару, як стаць на ўзбочыне, калі дарожная міліцыя загадвала ім спыніць аўтамабіль для праверкі.

Найбольш важны збой цэнтральная ўлада дала ў самой сталіцы. Мэр Кіева, гарадзкая міліцыя, адміністрацыя і вялікая колькасьць жыхароў адкрыта падтрымалі ўдзельнікаў акцыяў пратэсту. Гарадзкое кіраўніцтва дазволіла дэманстрантам начаваць на першым паверсе будынку Кіеўскае адміністрацыі і ўзяла на сябе іхнае матэрыяльна-тэхнічнае забесьпячэньне. Як патлумачыў адзін з арганізатараў акцыі пратэсту, «усе пытаньні забесьпячэньня харчаваньнем, вадой, біятуалетамі, а таксама прыбіраньня тэрыторыі былі вырашаныя дзякуючы цеснаму супрацоўніцтву арганізатараў дэманстрацыі з Кіеўскай гарадзкой адміністрацыяй... Кожную раніцу ад дзесяці да дванаццаці спэцыяльных машынаў вывозілі сьмецьце з Кіева!»[12].

Урэшце, Тарас Кузё заўважыў, што з прычыны яўна перайшлі на бок апазыцыі. Многія кіраўнікі дзяржаўных ведамстваў публічна выражалі сваю апазыцыйнасьць да рэжыму на «5 канале» і з трыбуны, установленай на Майдане Незалежнасьці. У першыя дні дэманстрацыяў спэцслужбы забясьпечылі апазыцыю запісамі тэлефонных размоваў памочнікаў Януковіча, якія пацьвярджалі простую датычнасьць гэтага кандыдата да спробаў фальсыфікацыі выбараў.

[12] Пошта Запоріжжя. 2004. 11–17 сьнежня.

Адначасова многія супрацоўнікі спэцслужбаў пачалі адкрыта запярэчваць легітымнасьць улады Кучмы. Кузё цытуе аднога супрацоўніка службы бясьпекі з будынку Адміністрацыі прэзыдэнта: «Я ня ведаю, хто цяпер прэзыдэнт – Кучма ці Юшчанка»[13]. Паведамлялася, што 28 лістапада Кучма

адмовіўся ўжыць сілу супраць дэманстрантаў. На той момант такі крок быў бы вельмі рызыкоўным. Вельмі верагодна, што шматлікія супрацоўнікі сілаў бясьпекі адмовіліся б выконваць загады па разгоне дэманстрацыяў і да таго ж, падобныя загады маглі б справакаваць сілавы канфлікт паміж рознымі галінамі ўлады[14].

Неспадзявана масавыя дэманстрацыі налякалі многіх блізкіх паплечнікаў Януковіча, і яны пачалі пакідаць тонучы карабель. Празь некалькі дзён з пачатку дэманстрацыяў два асноўныя публічныя рэпрэзэнтанты Януковіча – кіраўнік ягонае выбарчае кампаніі ды ягоны прадстаўнік у Вярхоўнай радзе – адышлі ад свайго кандыдата. Адначасова вялікая колькасьць рэгіянальных прыхільнікаў Януковіча ў парлямэнце з розных праўжымных фракцыяў перабегла да апазыцыі. Мікола Таменка, лідэр лягеру Юшчанкі, заўважыў, што большасьць з гэтых перакінчыкаў складалі бізнэсоўцы, якія не хацелі заставацца на баку пераможаных. Да сярэдзіны сьнежня большасьці назіральнікаў стала зразумела, што падтрымліваць Януковіча беспэрспэктыўна. Згубіўшы падтрымку бізнэсу (і ўлады), шматлікія рэгіянальныя штабы Януковіча былі вымушаныя пераехаць зь вялікіх офісаў у цэнтры гарадоў у больш сьціплыя памяшканьні. Засталася толькі шчырая і перакананая актывісты. Гэты прыхільнік Януковіча Вікстар Шуфрыч так ахарактарызаваў гэтую сытуацыю: «Пацукі пераскокваюць з адной [боку] да другога».

Падчас паўторнага другога туру галасаваньня 26 сьнежня сваю падтрымку Юшчанку актыўна прапаноўваў бізнэс. На адным выбарчым участку ў Мікалаеўскай вобласьці, які я наведаў, супрацоўнік аўтатранспартнага прадпрыемства з Кіева паведаміў мне, што ягоны начальнік накіраваў яго і сорак ягоных работнікаў, каб памагчы прадстаўляць Юшчанку на выбарчых участках ва ўсёй краіне. На іншым участку для галасаваньня ў тэй самай вобласьці кіраўнік сельскагаспадарчае фірмы з Тэрнопіля паведаміў, што даслаў два аўтобусы ягоных работнікаў, каб тыя забясьпечылі назіраньне на выбарах ад імя штабу Юшчанкі. Усяго разнастайныя бізнэс-структуры даслалі 6000 назіральнікаў ува ўсходнюю Украіну на паўторны другі тур выбараў.

[13] Kuzio T. Ukraine: Begin the Debate // Jamestown Foundation Eurasia Daily Monitor. 2004. 1 December.

[14] Іван Лазавы паведамляе, што Кучма, магчыма, сапраўды 27 лістапада аддаў загад «выкарыстаць сілу супраць апазыцыйных дэманстрантаў, але міліцыя адмовілася яго выконваць і потым усім перастала падпарадкоўвацца».

[15] Украінскі 2004 г. прыкладаў

[image] Падсумоўваючы, многія аналізы Памаранчавае рэвалюцыі былі засяроджаныя на сапраўды велічных і незабыўных масавых пратэстах ідэалістычнае моладзі, якая сьмела выйшла на халодныя вуліцы Кіева пасьля сфальсыфікаванага другога туру выбараў 21 лістапада. Аднак каб цалкам зразумець украінскую рэвалюцыю, неабходна пільна прыгледзецца да падвалінаў рэжыму Кучмы. Крах канкурэнтнага аўтарытарнага рэжыму Кучмы быў спрычынены ягонай унутранай слабасьцю і ўзьніклым у верхніх эшалёнах улады расколам. Алігархічны рэжым Кучмы зруйнавала вельмі шырокае разьмеркаваньне яго рэсурсаў сярод занадта вялікай колькасьці людзей, якіх прэзыдэнт быў ня ў стане кантраляваць. У выніку рэжым Кучмы быў разбураны рукамі яго былых паплечнікаў. Толькі час пакажа, ці прывялі шанцы, узьніклыя дзякуючы сыходу Кучмы, да станаўленьня новага дэмакратычнага ладу на руінах старога рэжыму.

З амэрыканскай мовы пераклаў Андрусь Клікуноў
паводле: Journal of Democracy., Vol. 16. No 2. April 2005
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/25
[image]

[image]

A R C H E

П а ч а т а к

№ 5 (39) - 2005

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image] [image] 2005

да Зміст

аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Тарас Кузё

Памаранчавая рэвалюцыя

Шлях апазыцыі да посьпеху

ТАРАС КУЗЁ

прафэсар Школы міжнародных стасункаў унівэрсытэту імя Джорджа Вашынгтона. Выкладаў ува унівэрсытэтах Таронта і Бірмінгэму. Аўтар вялікай колькасьці публікацыяў аб постсавецкай і украінскай палітыцы, посткамуністычнай дэмакратызацыі і выбарах (гл. іх поўны сьпіс на www.taraskusio.net)

Украінская Памаранчавая рэвалюцыя выявіла дынамічную грамадзянскую супольнасьць, у існаваньне якой верыла мала навукоўцаў і аналітыкаў. Масавыя народныя дэманстрацыі ў Кіеве забурлілі, калі ўлады абвясьцілі прэм’ер-міністра Віктара Януковіча пераможцам апошняга туру прэзыдэнцкіх выбараў 21 лістапада 2004 г., хоць вынікі экзыт-полаў паказалі яўную перавагу апазыцыйнага кандыдата Віктара Юшчанкі. Падчас першага туру галасаваньня 31 кастрычніка, які таксама суправаджаўся парушэньнямі выбарчага заканадаўства, Юшчанка афіцыйна перамог Януковіча на 0,6 % (гл. табліцу ніжэй). У самы пік акцыяў пратэсту колькасьць іх удзельнікаў дасягала паўмільёна чалавек: апазыцыйных актывістаў, студэнтаў і расчараваных выбарнікаў. Гэтыя масавыя дэманстрацыі ў спалучэньні з доказамі буйнамаштабных фальсыфікацыяў змусілі Вярхоўны суд 3 сьнежня ануляваць вынікі другога туру выбараў і прызначыць перагаласаваньне на 26 сьнежня 2004 г. Падчас перагаласаваньня Юшчанка перамог Януковіча (52 % супраць 44 %). Яго інаўгурацыя як трэцяга прэзыдэнта незалежнае Ўкраіны адбылася 23 студзеня 2005 г.

Добра арганізаваныя пратэстныя акцыі і ў мінулыя гады зьбіралі шмат людзей, але колькасьць іх удзельнікаў ніколі не складала небясьпекі напаўаўтарытарнаму рэжыму прэзыдэнта Леаніда Кучмы. Чым жа тлумачыцца масавае абурэньне, якое прывяло да дэмакратычнага прарыву, падобнага да тых, што адбыліся ў 2000 г. у Сэрбіі ды ў 2003 г. у Грузіі? Каб адказаць на гэтае пытаньне, неабходна пільней прыгледзецца да вытокаў ды эвалюцыі ўкраінскае апазыцыі.

Паміж 1992 г., калі краіна стала незалежнай, і 2001 г., калі Вярхоўная рада, якая складаецца з 450 дэпутатаў, прагаласавала за адстаўку ўраду тагачаснага прэм'ер-міністра Віктара Юшчанкі, асноўная апазыцыя гуртавалася вакол Камуністычнай і Сацыялістычнай партыяў (КПУ і СПУ). КПУ была забароненая ў 1991 г. У 1993 г. ёй дазволілі перарэгістравацца пры ўмове, што яна ня будзе пераемніцай савецкай камуністычнай партыі і адмовіцца ад прэтэнзіяў на былую маёмасьць кампартыі, набытую за савецкім часам. Тым ня менш, КПУ пераняла вузкалобую ідэалёгію сваёй «імпэрскай» папярэдніцы: яна выступала ня толькі за аднаўленьне камуністычнае сыстэмы, але і супраць самое ідэі ўкраінскай дзяржаўнасьці. Іншымі словамі, найбуйнейшая палітычная апазыцыйная сіла ва Ўкраіне з 1993-га па 2001-шы г. варожа ставілася да незалежнасьці краіны.

Як і КПУ, СПУ ўтварылася на базе савецкае Камуністычнае партыі. Дарма што яе стварыў былы лідэр камуністычнай парлямэнцкай большасьці, пасьля забароны КПУ ў 1991 г. СПУ стала «ня столькі пераемніцай кампартыі, колькі партыяй эканамічнага папулізму»[1]. Яна заставалася меншай зь дзьвюх левых партыяў, маючы каля траціны чальцоў ад агульнае колькасьці сяброў КПУ. Гэтыя дзьве партыі дамінавалі ў Радзе з 1994-га па 1999-ты г. і былі галоўнай парлямэнцкай апазыцыяй рэжыму Кучмы цягам шасьці зь дзесяці гадоў ягонага прэзыдэнцтва.

Прэзыдэнцкія выбары 1999 г. ува Ўкраіне былі ў пэўным сэнсе паўтарэньнем прэзыдэнцкіх выбараў 1996 г. у Расеі. Ва абодвух,

[1] Ambrosio, Thomas. Ukraine and Russia: Paths of Separation. Westport, CT: Praeger, 2001, с. 8.

выпадках дзейныя прэзыдэнты Кучма і Ельцын перамаглі лідэраў камуністычных партыяў. Аднак ува Ўкраіне і ў Расіі сталі ня столькі праявай падтрымкі непасьлядоўнай супярэчлівай Кучмавай праграмы «рэформаў», колькі другім рэфэрэндумам за незалежнасьць краіны. У сьвятле антыдзяржаўнай рыторыкі лідэра КПУ Пятра Сіманенкі, большасьць украінцаў прагаласавала, хутчэй, *супраць* яго, чым *за* Кучму. Такога не было на расейскіх выбарах 1996 г., бо лідэр расейскіх камуністаў Генадзь Зюганаў неаднаразова выказваў сваю прыхільнасьць да расейскае «нацыянальнае ідэі».

ed. Political Handbook of the World: 2000-2002. – Binghamton, N.Y.: CSA, 2003.

Пасьля падзеньня камунізму былы вышэйшы эшалён украінскае намэнклятуры канвэртаваў здабытую за савецкім часам палітычную магутнасьць у эканамічны ўплыў і фінансавы капітал. Імкнучыся лабіраваць свае бізнэсовыя інтарэсы, гэтыя «новыя ўкраінцы», ці т. зв. алігархі, падчас парлямэнцкіх выбараў 1998 г. вярнуліся на палітычную сцэну пад шырмай цэнтрысцкіх партыяў, якія неўзабаве сталі адной з асноўных групаў падтрымкі Кучмы. Алігархі альбо ўзначалілі ўжо існуючыя партыі, такія як Сацыял-дэмакратычная партыя Ўкраіны (аб'яднаная) (СДПУ(а), Партыя зялёных і Народна-дэмакратычная партыя Ўкраіны (НДПУ), альбо ўтварылі новыя, такія як Працоўная партыя Ўкраіны (ППУ) і Партыя рэгіёнаў (ПР). Гэтыя ідэалягічна аморфныя партыі папросту выкарыстоўваліся ў якасьці *«даху»* («крыши» на расейскім крымінальным слэнгу) для рэгіянальных ці бізнэс-інтарэсаў. Большасьць зь іх ня мела рэальнай палітычнай плятформы і была ня ў стане прапанаваць канкрэтнага палітычнага курсу; замест гэтага яны імкнуліся малпаваць сваіх апанэнтаў, выкарыстоўваць брудныя мэтады й выступаць за папулісцкія захады накшталт павышэньня памеру пэнсіяў.

Уздым алігархаў ды іхных цэнтрысцкіх партыяў адлюстраваў заняпад КПУ, апошні посьпех якой прыпаў на прэзыдэнцкія выбары 1999 г. Пасьля пераабраньня Кучмы пасаду прэм'ер-міністра атрымаў былы кіраўнік Нацбанку Ўкраіны, рэфарміст Віктар Юшчанка. Была сфармаваная праўрадавая парлямэнцкая большасьць з 11 цэнтрысцкіх і правацэнтрысцкіх фракцыяў, якія даўно намагаліся пазбавіць левых у Вярхоўнай радзе вядучых пазыцыяў. Новая парлямэнцкая большасьць

складалася з цэнтрыстаў і нацыянал-дэмакратаў (правых), якія мелі мала супольных інтарэсаў, акрамя варожасьці да левых.

На пасадзе прэм'ер-міністра Юшчанка распачаў шырокамаштабную праграму рэформаў, якая ўключала захады для ажыцьцяўленьня прыватызацыі, памяншэньня інфляцыі, збалянсаваньня бюджэту і скарачэньня дзяржаўнае бюракратыі. Дзякуючы барацьбе з карупцыяй, асабліва ў энэргетычнай сфэры, у дзяржаўны бюджэт былі вернутыя больш за 2 мільярды даляраў ЗША, што былі накіраваныя на выплату даўгоў па заробках, стыпэндыях і пэнсіях. У выніку рэйтынг папулярнасьці Юшчанкі перавысіў 35 %, лічбу, беспрэцэдэнтную для незалежнай Украіны. Дарма што запачаткаваныя рэформы пайшлі краіне ў цэлым на карысьць, неўзабаве яны сталі шкодзіць інтарэсам алігархаў, і ўрад Віктара Юшчанкі (у першую чаргу – віцэ-прэм'ер Юлія Цімашэнка) уцягнуўся ў канфлікт з уплывовымі прамыслоўцамі.

Афіцыйныя вынікі прэзыдэнцкіх выбараў ува Ўкраіне ў 2004 годзе (галасы выбарнікаў у адсотках)

Імя і прозьвішча	Першы тур* 31 кастрычніка	Другі тур 21 лістапада	Паўторны другі тур 26 сьнежня
Віктар Юшчанка («Наша Ўкраіна»)	39,90	46,61	51,99
Віктар Януковіч («Рэгіёны Ўкраіны»)	39,26	49,46	44,20
Аляксандар Мароз (Сацыялістычная партыя Ўкраіны)	5,82	—	—
Пятро Сіманенка (Камуністычная партыя	4,97	—	—

Ўкраіны)
Крыніца: Цэнтральная выбарчая камісія Ўкраіны.
*Ніводзін іншы кандыдат не набраў больш за 2 % галасоў выбарнікаў. 1,98 % выбарнікаў прагаласавалі супраць усіх кандыдатаў.

«КУЧМАГЕЙТ»

Калі народная падтрымка Юшчанкі імкліва расла, то Кучмава папулярнасьць рэзка падала. 28 лістапада 2000 г. лідэр Сацыялістычнае партыі Ўкраіны Аляксандар Мароз перадаў у СМІ аўдыёзапіс размовы Кучмы з тагачасным міністрам унутраных справаў Юр'ем Краўчанкам, падчас якога прэзыдэнт прасіў міністра «разабрацца» з апазыцыйным журналістам Георгіем Гангадзэ, які даўно крытыкаваў рэжым і выкрываў выпадкі карупцыі. Гангадзэ зьнік 16 верасьня. Ягонае абезгалоўленае цела знайшлі на поўдні ад Кіева 5 лістапада. Прыпісваная Кучму датычнасьць да зьнікненьня журналіста спарадзіла хвалю грамадзкага пратэсту. Дэманстрацыі, выкліканыя гэтым скандалам, які стаў вядомы як «Кучмагейт», мелі маштаб, нябачаны ўва Ўкраіне з часоў распаду Савецкага Саюзу.

У самы разгар «Кучмагейту» пры канцы 2000 г. і на пачатку 2001 г. дэманстрацыі пратэсту, арганізаваныя актывістамі руху «Ўкраіна бяз Кучмы», зьбіралі дзясяткі тысячаў удзельнікаў, але нават гэтага было замала, каб пахіснуць пазыцыю прэзыдэнта Кучмы. Толькі дзьве апазыцыйныя парлямэнцкія фракцыі – «Бацькаўшчына» Юліі Цімашэнкі ды СПУ Аляксандра Мароза – падтрымалі дэманстрантаў. Яны сфармавалі Фронт нацыянальнага паратунку, які імкнуўся каардынаваць дзейнасьць руху «Ўкраіна бяз Кучмы» і адначасова мацаваў правацэнтрысцкі хаўрус у парлямэнце. КПУ, дарма што таксама знаходзілася ў апазыцыі, адмовілася далучыцца да антыкучмаўскіх пратэстаў, бо верыла ў маскоўскую «тэорыю змовы», паводле якой «Кучмагейт» быў распрацаванай пры падтрымцы ЗША правакацыяй, скіраванай на адхіленьне Кучмы з пасады прэзыдэнта і ўсталяваньне ўва Ўкраіне праамэрыканскага рэжыму.

Падчас акцыяў пратэсту рэжым ужываў усё больш агрэсіўную,

савецкую тактыку і рыторыку што да апазыцыі, абвяшчаючы яе «падрыўнымі элемэнтамі», «экстрэмістамі» і «радыкаламі». Кучма называў тых, хто намагаўся прыйсьці да ўлады пад лёзунгам «Украіна бяз Кучмы», «палітычнымі карлікамі». Акцыі пратэсту, урэшце, спыніліся ў сакавіку 2001 г., калі ўлады, імкнучыся дыскрэдытаваць апазыцыю, пачалі вэрбаваць парамілітарных правакатараў, каб ператварыць мірныя акцыі пратэсту ў масавыя беспарадкі, а пасьля сілком разагнаць іх пры дапамозе міліцыі.

У той час Віктар Юшчанка займаў пасаду прэм'ер-міністра краіны і выступаў супраць антыпрэзыдэнцкіх дэманстрацыяў. Імкнучыся сваім аўтарытэтам абараніць Кучму, ён заявіў: «Асабіста я перакананы, што прэзыдэнт ня мог замовіць забойства чалавека. Я маральна не дапускаю, што прэзыдэнт мог мець датычнасьць такім чынам да зьнікненьня гэтага чалавека»[2].

У лютым 2001 г. Юшчанка разам з Кучмам і сьпікерам парлямэнту Іванам Плюшчом падпісалі сумесную заяву, якая затаўравала ўдзельнікаў акцыяў пратэсту як «фашыстаў».

«Кучмагейт» у спалучэньні зь непапулярнасьцю Юшчанкі сярод алігархаў у Вярхоўнай радзе зрабіў ягоны ўрад безабаронным. 26-га красавіка 2001 г. яго адправілі ў адстаўку вынесеным неверагоднай парлямэнцкай кааліцыяй алігархаў і камуністаў вотумам недаверу. Сваё рашэньне алігархі матывавалі прыватнымі інтарэсамі; КПУ ж адчайна імкнулася пазбавіць пасады Юшчанку, якога ахрысьціла «амэрыканскім сатрапам». Адстаўка ўраду Юшчанкі паклала канец дзесяцігодзьдзю супрацоўніцтва правых і цэнтрыстаў, накіраванага на нэўтралізацыю дзьвюх пагрозаў, якія ўспрымаліся абедзьвюма сіламі як супольныя – КПУ і Расеі. І, што важней, яна прывяла да ўзьнікненьня нялевае апазыцыі ў парлямэнце ўпершыню з часу абвяшчэньня незалежнасьці Ўкраіны.

Хаця кар'ера ў бізнэсе, у банкаўскай сфэры і ўрадзе не рабіла Юшчанку схільным да радыкалізму або апазыцыйнасьці, пасьля адстаўкі з пасады прэм'ер-міністра ён зрабіўся рашучым праціўнікам рэжыму Кучмы і яго цэнтрысцка-алігархічных хаўрусьнікаў. Некалькі былых паплечнікаў Юшчанкі ўва ўрадзе

[2] Kuchma Rescues Top Level Support // www.cnn.com. 16.03.2001. (У арыгінале рэпліка была даўжэйшай: «Декілька тижнів тому президент сказав, що готовий присягти на Біблії, що не має відношення до зникнення чи іншої

паддаліся яго прыкладу і перайшлі ў апазыцыю (хаця
большасць ключавых супрацоўнікаў па 2004 г. у 2003 г. яны
не далучыліся да ягонага перадвыбарнага штабу). У
2001 г. Юшчанка стварыў блёк «Наша Ўкраіна», які
аб'яднаць раздробленыя і разнашэрсныя нацыянал-
дэмакратычныя й лібэральныя партыі вакол супольнай
антырэжымнай плятформы. На парлямэнцкіх выбарах у
сакавіку 2002 г. гэты блёк дабіўся найлепшага выніку,
атрымаўшы ў парлямэнце 112 месцаў з 450 магчымых і
выперадзіўшы прапрэзыдэнцкую цэнтрысцкую «За адзіную
Ўкраіну» зь яе 104 месцамі. У той жа час КПУ заняла ўсяго
толькі трэцяе месца з 66 дэпутацкімі мандатамі, упершыню
часу абвяшчэньня незалежнасьці Ўкраіны згубіўшы
найбольшае парлямэнцкае фракцыі ў Вярхоўнай радзе.

Хаця апазыцыя дабілася сур'ёзнага посьпеху на выбарах у
2002 г., яна была занадта разьяднаная, каб утварыць рэальную
пагрозу завязанаму на алігархах рэжыму Кучмы. Апазыцыйны
электарат разрываўся паміж «Нашай Украінай», блёкам Юліі
Цімашэнкі, КПУ і СПУ. Толькі ў 2004 г. апазыцыя здолела
аб'яднацца і дамовіцца пра супольную антыкучмаўскую
плятформу. У гэтым сэнсе кансалідацыя ўкраінскае апазыцыі
паўтарала досьвед сэрбскай: у абодвух выпадках супольная
плятформа была прынятая толькі пасьля аб'яднаньня вакол
бясспрэчнага апазыцыйнага лідэра – Віктар Юшчанка ў
Ўкраіне выканаў ролю Ваіслава Каштуніцы ў Сэрбіі.

ПАРАЗЫ АПАЗЫЦЫІ

Хаця пасьля парлямэнцкіх выбараў сакавіка 2002 г. большасць
месцаў у Вярхоўнай радзе атрымалі чатыры найбуйнейшыя
апазыцыйныя партыі, прапрэзыдэнцкая фракцыя,
дакамплектаваная «незалежнымі» дэпутатамі, адсунула іх на
другі плян. Гэта прывяло да павелічэньня палітычнага
напружаньня, якое вылілася ў масавыя дэманстрацыі ў Кіеве з
нагоды другой гадавіны зьнікненьня Георгія Гангадзэ. У
верасьні 2002 г. дзясяткі тысячаў чалавек выйшлі на вуліцы
ўкраінскае сталіцы ды іншых гарадоў краіны, заклікаючы
Кучму сысьці ў адстаўку і правесьці датэрміновыя прэзыдэнцкія

> Тогда для меня Христианин имеет право на жизнь независимо от своих убеждений, пола и национальности. Лично я не могу себе представить президента страны, который был бы причастен к убийству человека. Я говорю это не как премьер, а как простой человек. Для меня это трагедия. Я морально не допускаю, что президент мог быть причетным таким чином до зникнення цієї людини».
>
> Гл. таксама **Рэд.**)

выбары. ЗША падтрымалі ініцыятыву апазыцыі, у якую ўваходзілі «Наша Ўкраіна», блёк Юліі Цімашэнкі, СПУ і КПУ, абвінаваціўшы Кучму ў тым, што той санкцыянаваў продаж супрацьпаветранае радыёлякацыйнае сыстэмы Садаму Хусэйну. Камэнтуючы гэтыя абвінавачаньні, Юшчанка заявіў, што будзе байкатаваць усе галасаваньні ў Вярхоўнай радзе датуль, пакуль Кучма не пагодзіцца абмеркаваць шляхі пераадоленьня існага ў краіне палітычнага напружаньня. Аднак зь цягам часу акцыі пратэсту сышлі на нішто.

Наступная вялікая дэманстрацыя адбылася ў сакавіку 2003 г., калі каля 50 000 чалавек выйшлі на вуліцы Кіева. Гэтая хваля пратэстаў была зьбітая пасьля арышту некалькіх чальцоў аргкамітэту грамадзкага руху «Паўстань, Украіна!», хаця іх палітычныя хаўрусьнікі абяцалі працягваць заклікаць Кучму да адстаўкі. Зацкаваны і палітычна аслаблены пастаяннымі заклікамі да адстаўкі, Кучма прапанаваў пакет канстытуцыйных рэформаў, каб зьлёгку паменшыць прэзыдэнцкія паўнамоцтвы і надаць большую ўладу парлямэнту. Вярхоўная рада прагаласавала за прапанаваны пакет рэформаў у красавіку 2004 г., але не зацьвердзіла яго (згодна з Канстытуцыяй, гэта патрабавала падтрымкі 300 з 450 дэпутатаў). Урэшце рэформы былі ўхваленыя ў сьнежні 2004 г. як частка «кампраміснага пакету», прынятага з мэтай прадухіленьня фальсыфікацыяў на выбарах. Яны ўступаюць у сілу зь верасьня 2005 г.

Дарма што ў гэты час і КПУ, і «Наша Ўкраіна» падтрымлівалі антыкучмаўскі рух, паміж імі заставалася вялікая прорва, і яны так і не змаглі дамовіцца пра супольную палітычную плятформу. Расколы ўнутры апазыцыі не дазволілі ёй высунуць супольныя палітычныя ініцыятывы, што, у сваю чаргу, абмежавала яе здольнасьць да мабілізацыі народнае падтрымкі. Згодна з апытаньнем, зладжаным чатырма найбольш аўтарытэтнымі сацыялягічнымі службамі, 64 % рэспандэнтаў заявілі, што нічога ня ведалі пра погляды апазыцыі. Калі ў іх запыталіся, ці хочуць яны ведаць, толькі палова зь іх адказала сьцьвярджальна[3].

Няздатнасьць чатырох апазыцыйных партыяў аб’яднацца

[3] Українська

супраць рэжыму Кучмы і яго хаўрусьнікаў-алігархаў. Гэта прычынай таго, што гэтыя пратэсты ня здолелі зарушыць такой жа масавай падтрымкай, якую выклікала Памаранчавая рэвалюцыя. Дзеля свайго пярэстага складу апазыцыя не магла выпрацаваць пазытыўнага мэсыджу і зацыклілася на нэгатыўных лёзунгах і закліках. Падчас прэзыдэнцкіх выбараў 2004 г. і пасьлей, цягам Памаранчавае рэвалюцыі, апазыцыя згуртавалася вакол пазытыўных ідэяў дэмакратыі, палітычнае адказнасьці і барацьбы з карупцыяй.

Дарма што апазыцыя ня здолела адхіліць ад улады Кучму і яго кампаньёнаў-алігархаў пасьля «Кучмагейту» і яго працяглых наступстваў, масавыя пратэсты выпрацавалі ў многіх украінцаў пэўны ўзровень палітычнай сьвядомасьці. Асабліва моцнага ўзьдзеяньня зазнала палітычна пасіўная моладзь – пакаленьне, якому ў 2004 г. было наканавана стаць рухальнай сілай Памаранчавай рэвалюцыі.

Аднак у цэлым украінскае грамадзтва па-ранейшаму было незадаволенае палітыкай. Апытаньне, апублікаванае ў сакавіку 2003 г. «Української правдої», паказала, што дзевяць зь дзесяцёх рэспандэнтаў меркавалі, што ўва Ўкраіне трэба ажыцьцявіць значныя зьмены, але што яны самі ня ў стане іх зьдзейсьніць. Столькі ж апытаных меркавала, што яны ніяк не ўплываюць на мясцовыя і цэнтральныя ўлады і што ў іх краіне рэгулярна парушаюцца правы чалавека. Падобным парадкам напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў у 2004 г. апытаньні паказвалі, што большасьць украінцаў мяркуе, што выйграе Юшчанка, але толькі меншасьць дапускала, што ўлады дазволяць яму стаць прэзыдэнтам.

Аднак ажно да 2004 г. шырока распаўсюджанае расчараваньне рэжымам Кучмы не ператваралася ў падтрымку апазыцыі. Напрыклад, у 2003 г. два апытаньні выявілі, што ад паловы да двух трацінаў насельніцтва Ўкраіны альбо не падтрымліваюць пратэстаў апазыцыі, альбо не жадаюць браць у іх удзел[4]. У красавіку таго ж году апытаньне Цэнтру сацыялягічных і палітычных дасьледзінаў, апублікаванае «Української правдої», паказала, што ўзровень падтрымкі апазыцыі ўдвая перавышае ўзровень падтрымкі рэжыму (33 % супраць 16 %). У той жа час

больш як траціна насельніцтва была нагэтулькі расчараваныя палітыкай, што не падтрымлівала ніводзін з бакоў[5].

Трымаючы ў галаве масавыя акцыі пратэсту ў сакавіку–лістападзе 2003 г., абодва бакі распачалі падрыхтоўку да прэзыдэнцкіх выбараў 2004 г. Апазыцыя нарэшце аб'ядналася вакол Юшчанкі, які ў той момант быў бесьпярэчна найбольш папулярным палітыкам ува Ўкраіне. Па сутнасьці, ён быў *адзіным* кандыдатам, чый дадатны рэйтынг, паводле сацыялягічных апытаньняў, пастаянна перавышаў адмоўны. Вынікі апытаньня 2003 г. праца працытаванага «Української правдої», выявілі, што 48 % рэспандэнтаў падтрымлівалі Юшчанку, і толькі 32 % сьцьвярджалі, што ніколі не прагаласуюць за яго[6]. (Гэтая галоўным чынам, складалася з камуністаў і прыхільнікаў Януковіча з Усходняй Украіны.)

Тым часам Кучма, уся яго палітычная машына і прэзыдэнт Расеі Ўладзімер Пуцін ужо заўзята агітавалі за прэм'ер-міністра Віктара Януковіча як кандыдата на пасаду прэзыдэнта. «Нумар адзін» ці «нумар два», падрыхтаваны ў інтэрнэт-часопісе «Украінскі тыдзень» 28.08.2003, складняла вызначэньне кандыдата, які б мог пераняць прэзыдэнцкую «паходню» пасьля заканчэньня другога тэрміну Кучмы. Сьпікер парлямэнту Ўладзімер Літвін або старшыня Нацбанку Сяргей Тыгіпка былі б нашмат больш прымальнымі кандыдатамі ў параўнаньні зь Януковічам, але рэйтынгі іхнае папулярнасьці былі занадта малыя для таго, каб стаць пэрспэктыўнымі кандыдатамі.

Кучма меркаваў, што прадстаўнік данецкае алігархічнае эліты Януковіч будзе мець гарантаваную падтрымку дзьвюх найбольш населеных усходнеўкраінскіх абласьцей, Данецкай і Луганскай, найбуйнейшых цэнтраў вугальнае прамысловасьці ў краіне. Януковіч насамрэч меў шмат сымпатыкаў сярод *люмпэн-пралетарыяту* ў гэтым рэгіёне, які паверыў у міт пра тое, што іхныя нерэнтабэльныя прадпрыемствы будуць зачыненыя ў выніку эканамічных рэформаў Юшчанкі. Да іх далучыліся алігархі, якія аказалі сур'ёзную падтрымку Януковічу: яны баяліся, што ў выпадку перамогі Юшчанкі згубяць свой прывілеяваны статус ці нават сядуць на лаву падсудных.

[4] В 2003 году Ющенко выступал с антиправительственными речами, часто появлялся на публике в *Interfax* (Москва), 25.04.2003 г., «Зеркало недели» (Київ), 27.09.2003.

[5] Украінскі кіраўнік адмовіўся ад другога тэрміну.

[6] Вынікі апытаньня, падрыхтаванага Ўкраінскім цэнтрам эканамічных і палітычных даследаваньняў імя Разумкова.

Здавалася, рэжым мае ўсё для сваёй перамогі: агромністыя фінансы, адміністрацыйны рэсурс, спэцслужбы і нефармальны атрад галаварэзаў з арганізаваных крымінальных груповак. Аднак Кучма зрабіў стаўку на кандыдата, супраць якога апазыцыі было лёгка згуртавацца. У маладосьці Януковіч сядзеў у турме, і ягоныя апанэнты сьцьвярджалі, што з канца 1980-х ён падтрымліваў цесныя сувязі з групоўкамі арганізаванай злачыннасьці (т. зв. браткамі), лабіруючы іх інтарэсы ў мясцовых і нацыянальных органах улады. Ён быў цесна зьвязаны з данецкім «кланам» і ягоным лідэрам, алігархам Рынатам Ахметавым. Да таго ж, Януковіч блага валодаў украінскай мовай (у адрозьненьне ад расейскай), пра што сьведчылі запоўненыя ім ад рукі і пададзеныя ў Цэнтральную выбарчую камісію дакумэнты для рэгістрацыі ў якасьці кандыдата, якія былі абнародаваныя прэсай.

Ня толькі біяграфія Януковіча, але і яго перабываньне на пасадзе прэм'ер-міністра зрабілі досыць лёгкай справай мабілізацыю апазыцыі супраць яго. Акурат кабінэт Януковіча прымушаў незалежных дэпутатаў у парлямэнце ўвайсьці ў прапрэзыдэнцкую «большасьць» пасьля выбараў 2002 г., маргіналізуючы і разьюшваючы апазыцыю. Падчас выбарчае кампаніі ў 2004 г. апанэнты Януковіча малявалі змрочную карціну Ўкраіны ў выпадку ягонае перамогі. Яго рэжым, гаварыла апазыцыя, будзе мала чым адрозьнівацца ад рэжыму Кучмы: аўтарытарнага, рэпрэсіўнага і карумпаванага. Юшчанка гаварыў народу: «Бандыты ня будуць вызначаць будучыні гэтай краіны. Яны хочуць прывучыць нас, дзясяткі мільёнаў людзей, кожную ўкраінскую сям'ю, маю сям'ю жыць паводле крымінальных законаў, гаварыць на турэмным слэнгу і насіць турэмныя робы»[7].

РЭВАЛЮЦЫЯ

Магчыма, адчуваючы ўзрост падтрымкі апазыцыі, рэжым пачаў рабіць захады для забесьпячэньня перамогі Януковіча. Нізійная публіцы Кучма адкідаў і высьмейваў ідэю, што на Ўкраіне магчымы дэмакратычны прарыў накшталт грузінскай рэвалюцыі ружаў лістапада 2003-га. У прыватных размовах аднак, Кучма баяўся, што прэзыдэнцкія выбары 2004-га

[7] Украінская праўда, 8.12.2004.

сапраўды могуць пакласьці канец напаўаўтарытарнаму рэжыму, які ён усталяваў. У сапраўднасьці ўлады заўсёды варожа ставіліся да ідэі сапраўды свабодных і справядлівых выбараў, вынікі якіх не былі сплянаваныя імі загадзя.

За два месяцы да першага туру выбараў, які адбыўся 31 кастрычніка, МУС, Служба бясьпекі Ўкраіны (СБУ) і пракуратура апублікавалі сумесную адозву, якая засьцерагала, што імі будуць зробленыя «прэвэнтыўныя захады» для прадухіленьня рэвалюцыі па грузінскім сцэнары. Гэтыя ведамствы сьцьвярджалі, што яны маюць «доказы таго, што апазыцыйныя палітычныя сілы ў дадзены момант рыхтуюць розныя небясьпечныя акцыі, скіраваныя на дэстабілізацыю сытуацыі ў краіне». Яны заяўлялі, што апазыцыя заклікае ўкраінцаў «выказаць пратэст у самай крайняй форме – паўстаньня» і што такія дзеяньні «небясьпечныя для грамадзтва і дзяржаўнай стабільнасьці і будуць прадухіляцца згодна з украінскім заканадаўствам»[8].

Асьцярогі ўладаў, канечне, мелі пад сабой падставы. Апазыцыйная лідэрка Юлія Цімашэнка сапраўды паабяцала, што будзе «арганізоўваць і праводзіць акцыі грамадзянскага непадпарадкаваньня» ў выпадку фальшаваньня вынікаў выбараў. Яе пагроза была заснавана на падазрэньні, што рэжым плянуе сфальсыфікаваць прэзыдэнцкія выбары такім жа чынам, як ён раней, у 2004 г. сфальсыфікаваў выбары мэра г. Мукачава. Існавала ўстойлівае перакананьне, што на гэтай выбарчай баталіі, падчас якой рэжым працягнуў на пасаду мэра свайго кандыдата нягледзячы на яўную перамогу апазыцыі, адпрацоўваліся тэхналёгіі будучых прэзыдэнцкіх выбараў.

27 жніўня «Наша газета», орган праўрадавай Сацыял-дэмакратычнай партыі (аб'яднанай), прагназавала, што рэвалюцыя накшталт грузінскай ня знойдзе шырокай падтрымкі. Сам Кучма падзяляў такі пункт гледжаньня. Напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў ён цынічна прыгадаў, як у мінулыя гады апазыцыя пагражала вывесьці супраць яго 200 000 дэманстрантаў, але ніколі не зьбірала больш за 50 000. Юшчанка ніколі не любіў вулічных дэманстрацыяў, але ён практычна ня меў выбару: у выпадку масавых фальсыфікацыяў

[8] Українська правда, 2004, 22 кастрычніка.

з боку ўладаў яму давядзецца рыхтаваць народныя пратэсты. Апазыцыянэры спадзявалася, што сфальсыфікаваныя выбары вывядуць на вуліцу больш як сто тысяч чалавек. Нават яны былі ашаломленыя, калі на вуліцы Кіева выйшлі сотні тысяч чалавек, як толькі стала зразумела, што рэжым сфальсыфікаваў вынікі галасаваньня 21 лістапада.

Ні ўлады, ні апазыцыя не маглі ведаць, колькі ўкраінцаў выйдуць на вуліцы, каб абараніць сваё права на дэмакратычна абранага прэзыдэнта. Нацыянальнае апытаньне, праведзенае незадоўга перад выбарамі Цэнтрам Разумкова, паказала, што 84 % рэспандэнтаў пагадзіліся, што яны маюць права пратэставаць у выпадку фальсыфікацыі выбараў, толькі 6 % не былі згодныя з гэтым. Цэнтар Разумкова папярэджваў, што ня ўсе з тых, хто настойваў на сваім праве пратэставаць, зь неабходнасьцю зробяць гэта ў выпадку сфальшаваных выбараў, але ён засьцерагаў: «Было б наіўна спадзявацца, што ўлады могуць бязьмежна дыскрэдытаваць сябе ў вачах свайго ўласнага народу без наступстваў, якія могуць аказацца фатальнымі для іх»[9].

Гэтае прадказаньне збылося: улады на самай справе сур'ёзна недаацанілі абурэньне, якое выклікалі сфальсыфікаваныя выбары. Ужо тады, калі Юшчанка афіцыйна выйграў першы тур выбараў, многія ўкраінцы пачалі задумвацца пра магчымасьць прыходу дэмакратаў да ўлады. Трыма тыднямі пазьней, калі экзыт-полы паказалі, што Юшчанка перамог таксама ў другім туры, праведзеным 21 лістапада, яны пачалі адчуваць перамогу. Перад выбарамі апытаньні паказвалі, што большасьць украінцаў, хутчэй, паверыць вынікам экзыт-полаў, чым афіцыйным вынікам, калі яны будуць адрозьніваць.

Іншае перадвыбарнае апытаньне, праведзенае Фондам дэмакратычных ініцыятываў, выявіла, што 18 % рэспандэнтаў былі гатовыя ўзяць удзел у акцыях пратэсту ў выпадку фальсыфікацыі выбараў, і амаль 11 % заявілі, што яны будуць пратэставаць, калі іх кандыдат не пераможа. Таму нядзіўна, што, калі былі абвешчаныя сфальсыфікаваныя на карысьць Януковіча вынікі выбараў, якія супярэчылі вынікам экзыт-полаў, натоўпы расчараваных людзей выправіліся ў Кіеў, каб

[9] Українська правда, 2004.5

далучыцца да рэвалюцыі. Некаторыя зь іх былі «вэтэранамі» пратэстаў падчас «Кучмагейту», іншыя пераканаліся ў неабходнасьці зьменаў дзякуючы кампаніям, праведзеным апазыцыяй, і, больш за тое, дагэтуль ніколі не праяўлялі інтарэсу да палітыкі. Яны палічылі, што выбарчыя махінацыі былі занадта яўнымі, каб іх праігнараваць.

Многія ўкраінцы доўгі час трымаліся палітычнага падыходу, выказанага ў вядомай прымаўцы «Мая хата з краю». Пасьля сфальсыфікаваных выбараў замест яе зьявіўся іншы прыпеў: «Калі Януковіч выйграе, іншых выбараў ня будзе; калі Юшчанка выйграе, прынамсі, я ведаю, што яны будуць». Акурат такога кшталту расчараваньне, паняверка і абурэньне спарадзілі Памаранчавую рэвалюцыю. За тры дні па фальсыфікаваным туры галасаваньня 21 лістапада натоўп на Майдане Незалежнасьці і прылеглых вуліцах разросься да больш за паўмільёна чалавек. Без такой масавай падтрымкі народу гэтыя дэманстрацыі – падобна пратэстам у ранейшыя гады – скончыліся б гвалтоўным разгонам і паразай.

Ранейшыя пратэсты прыцягвалі найбольшую колькасьць прыхільнікаў з традыцыйнай астоі апазыцыі – праэўрапейскіх заходніх рэгіёнаў краіны. У 2004 г. Юшчанка таксама перамог ува ўсіх цэнтральных украінскіх абласьцях і дабіўся велізарнай падтрымкі жыхароў Кіева, якія першымі выйшлі на вуліцы пасьля выбараў. Нават значная частка кіеўскай эліты, якая збольшага была ляяльная да рэжыму, падчас рэвалюцыі перайшла ў Юшчанкаў лягер.

Як і ранейшыя гады, рэжым зьвярнуўся да агрэсіўнай савецкай рыторыкі, таўруючы дэманстрантаў як «экстрэмістаў» і «тэрарыстаў». Падчас выбарчай кампаніі апазыцыю абвінавацілі ў выбуху бомбы ў Кіеве (на рынку ў Траешчыне. – **Рэд.**), і паплечнікі Кучмы спрабавалі давесьці датычнасьць моладзевага апазыцыйнага руху да гэтай акцыі. Узровень і бессаромнасьць гэтых тактыкаў у канцавым выніку сталі такімі яўнымі, што яны толькі паспрыялі мабілізацыі далейшай падтрымкі для Юшчанкі. У адказ на брудную кампанію, разьвязаную рэжымам, апазыцыйныя лідэры і іх прыхільнікі зрабілі стаўку на негвалтоўныя сродкі пратэсту і прадухіленьне

любых правакацыяў. Колькасьць злачынстваў у Кіеве падчас рэвалюцыі зьнізілася на траціну, і, як паведамлялі СМІ, выпадкі гвалту мелі месца па-за Кіевам і з удзелам прыхільнікаў Януковіча.

ЗАХАД І НОВАЕ ПАКАЛЕНЬНЕ

Хаця Памаранчавая рэвалюцыя прыцягнула большую частку сваіх фінансавых рэсурсаў з унутраных крыніцаў (асабліва малога і сярэдняга бізнэсу), міжнародная падтрымка была ключавым фактарам яе посьпеху[10]. Моладзевы рух «Пора», які адыграў вырашальную ролю ў пратэстах, прайшоў падрыхтоўку ў сэрбскага «Отпору», а шматлікія заходнія НДА і групы грамадзянскай супольнасьці аказалі ключавую дапамогу сваім украінскім партнэрам. Міжнародныя назіральнікі за выбарамі, гэтаксама як іх украінскія калегі, якія прайшлі падрыхтоўку ў замежных НДА, адыгралі калясальную ролю, выкрываючы і паведамляючы пра выбарчыя фальсыфікацыі і парушэньні пры галасаваньні. Падтрымка, забясьпечаная незалежнымі мэдыямі, такім як інтэрнэт-газэта «Українська правда», дапамагла пашырыць праграму апазыцыі па ўсёй краіне.

Юшчанкаў лягер ды яго пераважна маладыя прыхільнікі эфэктам стаў важным інструмэнтам выбараў 2002 г., і яго роля яшчэ павысілася ў 2004 г. Моладзевыя групы і іншыя моладзевыя групы арганізавалі он-лайн-форумы (выкарыстоўваючы замежныя сэрвэры, каб пазьбегнуць ляяльных да рэжыму хакераў), каб прыхільнікі Юшчанкі маглі абмеркаваць тактыку і стратэгію дэманстрацыяў. Адным эфэктыўна выкарыстоўвала сотавую тэлефанію як падчас выбарчай кампаніі, так і падчас самой рэвалюцыі. У вядомым цяпер відэакліпе, які быў запісаны на відэакамэру сотавага тэлефона аднаго апазыцыянэра, бачна, як выкладчык універсытэту процізаконна заклікае сваіх студэнтаў галасаваць за Януковіча.

Посьпех Памаранчавае рэвалюцыі трэба часткова зарахаваць на рахунак украінскай моладзі – пакаленьня, якое ня памятае

[10] Інтэрвію з Аляксандрам Гудачковым, кіраўніка ўпраўленьня выбарчага штабу Віктара Ющанкі: Українська правда. 2004. 22 сьнежня. Braychenko, Viktoria. Who Financed the

савецкага рэжыму даперабудовачных часоў і таму нашмат менш баіцца ўладаў, чымся іх бацькі і дзяды. Хоць і выраслі пры Кучмавым карумпаваным напаўаўтарытарызьме, пэтаж пакаленьне дзякуючы Інтэрнэту, спадарожнікавамуDecember. тэлебачаньню і поп-культуры засвоіла, па сутнасьці, заходні сьветагляд. Шмат моладзі падарожнічала, вучылася ці працавала ў Эўропе ці Паўночнай Амэрыцы, і большасьць яе ня бачыць альтэрнатывы дэмакратыі.

Натхнёнае ператварэньнем заходніх суседзяў сваёй краіны з савецкіх сатэлітаў у чальцоў Эўрапейскага Зьвязу, маладое пакаленьне падтрымала Юшчанкаву візію дэмакратычнай і «эўрапейскай» Украіны. Шмат хто зь іх далучыўся да Памаранчавае рэвалюцыі дзеля жорсткага непрыняцьця карумпаванай напаўаўтарытарнай сыстэмы, што склалася пры Кучму, і расейскага засільля. Украінская моладзь успрыняла выбары 2004 г. як раздарожжа: іх вынік вырашаў, пойдзе Ўкраіна па шляху да заходняй лібэральнай дэмакратыі ці да кансалідаванай аўтакратыі а ля пуцінская Расея.

Яшчэ адной сацыяльнай групай, якая падтрымала Памаранчавую рэвалюцыю, былі дробныя і сярэднія бізнэсоўцы (якіх часта называюць «новымі ўкраінцамі»), якія ўжо даўно і палітычна, і эканамічна пераарыентаваліся на Захад. Яны прагаласавалі за Юшчанку, бо хацелі пакласьці канец усёахопнай карупцыі, палітычна матываваным праверкам з боку ўладаў і высокім падаткам, якія прымушалі іх працаваць у ценявым сэктары эканомікі. Больш за тое, яны бачылі патрэбу разьмежаваць палітыку і бізнэс, пазбавіўшы тым самым алігархаў часткі іх магутнасьці і стварыўшы лепшыя ўмовы для малога і сярэдняга бізнэсу, гатовага гуляць па правілах дэмакратычнай сыстэмы.

РЭЖЫМ ГУБЛЯЕ КАНТРОЛЬ

Як у Сэрбіі і ў Грузіі, у посьпеху Памаранчавай рэвалюцыі вырашальную ролю адыграў нэўтралітэт праваахоўных органаў, а таксама пераход іх супрацоўнікаў на бок пратэстоўцаў. Ува Ўкраіне былы міністар абароны і старшыня

СБУ Яўген Марчук першым уцёк з тонучага карабля. Падчас выбарчай кампаніі ён захоўваў маўчаньне, а праз чатыры дні пасьля другога туру галасаваньня, 21 лістапада, зьявіўся на экранах тэлевізараў і абвінавацiў рэжым у выбарчых фальсыфікацыях. Прыклад Марчука перанялі іншыя супрацоўнікі спэцслужбаў, а яго сувязі з правахоўнымі органамі рознага ўзроўню добра паслужылі апазыцыі.

Прыхільнікі Юшчанкі з СБУ забясьпечылі апазыцыю такімі доказамі фальсыфікацыі выбараў, як матэрыялы незаконнага праслухоўваньня тэлефонных размоваў зь «ценявога выбарчага штабу» Януковіча. Гэтая структура была створаная паралельна з афіцыйным выбарчым штабам Януковіча для збору сродкаў звыш заканадаўча вызначанага максымуму, каардынацыі адміністрацыйных і мэдыярэсурсаў, а таксама для ажыцьцяўленьня іншых брудных тэхналёгіяў з мэтай дыскрэдытацыі Юшчанкавай кампаніі. СБУ загадзя паінфармавала Юшчанкаў лягер, а таксама яго групы падтрымкі, што выступае супраць палітычна матываваных спробаў рэжыму сфабрыкаваць іх абвінавачаньні ў тэрарызьме[11].

Украінская армія захоўвала нэўтралітэт ці, як у выпадку з войскамі Заходняга апэратыўнага камандаваньня, штабныя разьмешчаны ў Львове, адкрыта падтрымала Юшчанку. Міністэрства ўнутраных справаў падзялілася: некаторыя і спэцпадразьдзяленьні перайшлі на бок Юшчанкі, а тыдзень пасьля другога туру. Курсанты акадэміі міліцыі адкрыта агітавалі за Юшчанку і зьвярнуліся да войскаў спэцыяльнага прызначэньня з заклікам перайсьці на «ягоны бок». Калі 28 лістапада па трывозе былі выкліканыя 10 000 вайскоўцаў МУС з мэтай разгону акцыі пратэсту на Майдане, Незалежнасьці, СБУ адразу папярэдзіла лідэраў апазыцыі аб гэтай правакацыі. Кровапраліцьце і, магчыма, грамадзянская вайна была прадухілена дзякуючы таму, што кіраўніцтва СБУ заклікала камандзіраў аддзелаў войскаў МУС адступіць, а тыя выканалі загад. Аднак сапраўднымі героямі Памаранчавае рэвалюцыі былі Юшчанка і ягоныя прыхільнікі, якія праявілі непахісную адданасьць негвалтоўным мэтадам пратэсту.

[11] Інтэрвію Дзьмітром Прыхічанкі, кіраўніком «Зубра» 24.12.2004.

Падобна былому прэзыдэнту Грузіі Эдуарду Шэварнадзэ, Кучма цяпер ганарыцца тым, што яго праўленьне скончылася мірным шляхам. Насамрэч і ў тым, і ў другім выпадку неўжываньне гвалту не было абумоўлена велікадушнасьцю адыходзячага лідэра. У сапраўднасьці і ў Шэварнадзэ, і ў Кучмы не было такой падтрымкі, каб спыніць народны пратэст. Напаўаўтарытарныя рэжымы, накшталт таго, які пабудаваў Кучма ўва Ўкраіне, унутрана ўразьлівыя падчас выбараў, бо яны не валодаюць легітымнасьцю, якую дае народная падтрымка. У 2004 г. украінскія ўлады ведалі, што пры свабодных і справядлівых выбарах кандыдат ад апазыцыі здабудзе абсалютную большасьць галасоў ужо ў першым туры галасаваньня. Акурат усьведамленьне гэтага ў спалучэньні са страхам пазбавіцца ўлады паштурхнула рэжым да правядзеньня найбруднейшае выбарчае кампаніі з часу набыцьця Ўкраінай незалежнасьці. Кульмінацыя гэтае кампаніі ў дзень другога туру галасаваньня, 21 лістапада, калі адбыліся масавыя і непрыхаваныя фальсыфікацыі, толькі паказала, наколькі слабым, авантурным і бездапаможным стаў рэжым.

Януковіч са сваёй кампаніяй вельмі недаацанілі ўнутраную і вонкавую рэакцыю на такія нахабныя фальсыфікацыі. Хаця Памаранчавая рэвалюцыя, бесьпярэчна, пачалася ўва Ўкраіне, яе заахвочвала і спрыяла асуджэньне міжнароднай супольнасьцю фальсыфікацыяў вынікаў прэзыдэнцкіх выбараў. Украінская апазыцыя таксама натхнялася дадатным досьведам адхіленьня ад улады Эдуарда Шэварнадзэ ў Грузіі й Слабадана Мілошавіча ў Сэрбіі: іх абодвух зрынулі пасьля масавых акцыяў пратэсту, выкліканых іхнымі спробамі ўтрымаць уладу шляхам фальсыфікацыі выбараў. Быўшы яўна спантаннымі, усе тры рэвалюцыі сталі вынікам інтэнсіўных масавых кампаніяў і кааліцыйнага будаўніцтва сярод палітычнае апазыцыі й групаў грамадзянскае супольнасьці. Украінская Памаранчавая рэвалюцыя рыхтавалася колькі гадоў.

Такім чынам, любы аналіз дэмакратычнага прарыву ўва Ўкраіне трэба пачынаць ня з конадня рэвалюцыі ў лістападзе 2004 г., а чатырма гадамі раней, калі ўпершыню былі абнародаваныя ўлікі, якія прывялі да выбуху «Кучмагейту». Акурат чатырохгадовы пэрыяд правядзеньня акцыяў

грамадзкага пратэсту падрыхтаваў і даў неабходны досьвед сябром украінскае апазыцыі, каб ачоліць Памаранчавую рэвалюцыю і скіраваць сваю краіну на шлях дэмакратыі і вяртаньня ў Эўропу.

Пераклаў з амэрыканскай Андрусь Клікуноў паводле: Journal of Democracy. Vol. 16. No 2. April 2005

[image]
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/05
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (39) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image]

[image]2005

Да Зміцера

паэмыка • аналітыка • **крытыка** • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Міхась Тычына Весткі з паралельнага сусьвету

МІХАСЬ ТЫЧЫНА нарадзіўся 10 лютага 1943 г. у пасёлку Ленінскі Алданскага раёну (Якуцкай АССР) у сям’і ссыльнага. Скончыў філялягічны факультэт Берасьцейскага пэдагагічнага інстытуту (1964), асьпірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР (1970), дзе й працуе навуковым супрацоўнікам.

Адамовіч Антон. *Да гісторыі беларускае літаратуры.* – Менск: Выдавец ІП Зьміцер Колас, 2005. – 1464 с.

Якою была б наша літаратурная навука сёньня, калі б мы своечасова пазнаёміліся з творчасьцю Антона Адамовіча! Удзельнік і відавочца падзеяў, якія сёньня ўспрымаюцца як легендарныя, ён, маючы ад прыроды ўнікальную памятлівасьць, цікаўнасьць і неабыякавасьць, сваімі згадкамі пра яшчэ тады жывых і дзейных Купалу і Коласа, Дубоўку і Пушчу, Бабарэку і Калюгу, Арсеньневу і Салаўя ўводзіць нас у рэальную атмасфэру 1920-х – 1940-х гг. У выніку ягоных навукова-крытычных экзэрсісаў ствараецца аб’ектыўнае ўяўленьне аб паралелаграме тэндэнцыяў, зь якіх вырастала раўнадзейная беларускай гісторыі.

Вялізазная таміна пясочна-сонечнага колеру, нягледзячы на свой аб’ём, тым ня менш ня здолела ўвабраць усяго апублікаванага Антонам Адамовічам за жыцьцё. Дый тое, што ўвайшло ў зьмест, нераўназначнае. Сам Адамовіч (спадзяюся, у гэтай рэцэнзіі яго ня зблытаюць ні з Адамовічам Алесем, дзяржаўным дзеячам, ні з Адамовічам Алесем, празаікам і публіцыстам, хаця ў іменным паказьніку ёсьць невялічкая

накладка) ужываў архітэктурныя аналёгіі, а таму выбра франтону Парфэнону, зьмешчаная на вокладцы дызайнаўскага сымбалічная.

Сябра Беларускага ПЭН-цэнтру з 1989 г. Селета у «ARCHE» друкаваўся яго аналіз «Эра камэнтароў».

Як вядома, калянада храму багіні Афіны, у адрозьненьне ад калянады менскага Палацу прафсаюзаў, хавае ў сабе дасьціпную хітрасьць архітэктараў: ад бюракратычнай паныласьці відарыс ратуе тое, што калёны знаходзяцца на рознай – хоць гэта і цяжка заўважыць – адлегласьці адна ад аднае. Тое самае льга сказаць і пра рознага памеру і зьместу крытычныя рэфлексіі аўтара кнігі: пэўная несымэтрычнасьць пакідае адчуваньне натуральнасьці і жывой прасторы.

Бадай, галоўнае ўражаньне ад прачытанага – гэта аптымістычная выснова, што наша творчая эліта ня толькі адэкватна, але і своечасова рэагавала на зьменлівыя варункі гістарычнага лёсу і ў адраджэнскія часы, і ў часы ўзвышэнства. Іншая рэч, што вынікі тае этычна-эстэтычнае рэакцыі даходзяць да нас з жахлівым у эпоху масавых камунікацыяў спазьненьнем, якое занадта дорага каштуе нацыі. Кожны раз, калі ўзьнікае найменшая магчымасьць самавыявіцца, мы вымушаны зноў і зноў пачынаць з таго, на чым спыніўся наш рух да свабоды. Антон Адамовіч лічыў, што з «узвышэнства», і меў рацыю.

Як меў, дарэчы, рацыю і Міхаіл Бахцін (постаць невыпадковая, бо таксама пачынаў у памятныя 1920-я гг.), цьвердзячы: «...усякі сапраўды істотны крок наперад суправаджаецца зваротам да пачатку («адпачатковасьць»), дакладней, да абнаўленьня пачатку. Ісьці наперад можа толькі памяць, а не забыцьцё».

Антон Адамовіч адпачатку актыўна шукаў мову апісаньня, тоесную мове аб’екту дасьледаваньня, безь якое немагчымае і нават заганнае любое дасьледаваньне ў гуманітарыстыцы. Адшукаў надзвычай хутка, і гэта ня дзіва было ў тыя часы: літаратура і навука аб літаратуры шпарка маладзела, літаратурныя дэбютанты назаўтра прачыналіся геніямі, працэс паскарэньня набіраў, як у сынхрафазатроне, небывалую, хоць і зьменлівую, хуткасьць.

На фоне першых вучнёўскіх спробаў (водгукаў на творы В. Маракова, А. Барычэўскага, Я. Коласа, М. Багдановіча, П. Труса), дзе крытычнае чытаньне тэкстаў, відавочна, не адпавядала мэтаду інтэрпрэтацыі, а глыбінныя сэнсы і прырода вобразнай мовы гэтых тэкстаў нагадвалі аб сабе, хутчэй, у агаворках, гэта асабліва заўважаецца. Уражліва аб'ёмны, як для 18-гадовага юнака, студэнта Белпэдтэхнікуму, і надзвычай зьмястоўны артыкул пра М. Гарэцкага альбо «спроба манаграфіі аб творчасьці» дэманструе ўрачыстасьць навуковай мэтадалёгіі і вырашальную ролю надзеленага Божым дарам крытыка.

Чаму М. Гарэцкі? З успамінаў вядома, што будучы «аб'ект дасьледаваньня» адгаворваў маладога крытыка ад задумы, маючы на ўвазе менавіта адсутнасьць падставовае мэтадалёгіі. Магчыма, што ў аснове дзёрзкага замаху таго была спаборніцкая жарсьць, якая прыцягвае аднаго ездака на ровары да другога, хаця абодва знаходзяцца на прыстойнай адлегласьці і яшчэ могуць пазьбегнуць сутыкненьня (калі выкарыстоўваць аналёгію Л. Талстоя).

У артыкуле «Да пабудовы навуковае гісторыі беларускае літаратуры» Адамовіч згадваў словы Гарэцкага пра тое, што «выхад ягонае кнігі Р. Зямкевіч спаткаў як свайго роду асабістую абразу, уважаючы, што першую гісторыю беларускае літаратуры мог напісаць толькі ён...». Прагаворка? Так.

Але Адамовіч, па натуры амбіцыйны гулец, які прэтэндаваў – і небеспадстаўна («хадзячая энцыкляпэдыя») – на першынство, старанна аберагаў рэпутацыю ўсяведа і ні ў што ня ставіў савецкае літаратуразнаўства, мог не на жарты ўстурбавацца. Да яго, пэўна, дайшло, што навукоўцы Інстытуту літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР завяршаюць працу над 4-томнай «Гісторыяй беларускай літаратуры» (дакастрычніцкай і савецкай), якая неўзабаве пасьля ягонага артыкулу пачала выходзіць з друку і была калектыўным плёнам кароткага пэрыяду ажыўленьня беларускага культурнага жыцьця ў 1950-я – 1960-я гг., нягледзячы на ўсе свае сёньня бачныя недахопы, пралікі і хібы.

Антон Адамовіч, як ніхто іншы на эміграцыі, быў блізкі да

стварэньня менавіта навуковай гісторыі нацыянальнай літаратуры. Яго нібыта суб'ектыўная і падкрэсьлена асабістая зацікаўленасьць тым ці іншым літаратарам тлумачылася ягоным выразным бачаньнем архітэктуры будучага Парфэнону гісторыі беларускае літаратуры. Клясычную зграбнасьць санэту ён менавіта так і апісваў: два прастакутнікі катрэнаў і два трыкутнікі тэрцынаў.

У аўтабіяграфіі Адамовіч скардзіўся:

Цяпер працую над гісторыяй Беларусі да XIX ст., але абставіны жыцьця ДП не дазваляюць аддацца ёй як належыць, таксама як і абставіны беларускага эміграцыйнага друку не даюць ніякіх надзеяў на апублікаваньне бліжэйшым часам таго, што ўжо ёсьць у рукапісах, асабліва большых агульных працаў («Гісторыя беларускае літаратуры», «Спроба нарматыўнае граматыкі беларускае літаратурнае мовы», «Гісторыя беларускага нацыянальнага руху», «Гісторыя Беларусі XVI–XVIII стст.»).

У іншым месцы Адамовіч разважаў пра адсутнасьць інстытуцыйных структураў, якія маглі б пазьбегнуць непазьбежных хібаў вядомых спробаў напісаньня абагульняючых працаў з гісторыі літаратуры ў сталінскія часы, сярод якіх фальсыфікацыі, сацыялягізацыя, палітызацыя, замоўчваньне імёнаў, твораў, цэлых пэрыядаў гісторыі, нэгатыўных момантаў, правінцыйнасьць, непрафэсіяналізм і інш. Менавіта ўсё тое, што зноўку паўтараецца сёньня, калі са школьных і ўнівэрсытэцкіх праграмаў зьнікаюць імёны і творы, мастацкія зьявы, якімі іншая літаратура і культура ганарыліся б як сваім дасягненьнем. А ў выніку гэтае пакрокавае рэакцыі, як піша В. Булгакаў, укладальнік, аўтар прадмовы і камэнтароў, мы прачынаемся з адчуваньнем, што жывём у іншай краіне. У краіне, дзе няма Антона Адамовіча, Натальлі Арсеньневай, Алеся Салаўя, Масея Сяднёва... Як нядаўна не было Алеся Гаруна, Максіма Гарэцкага, Уладзімера Жылкі, Лукаша Калюгі, Тодара Кляшторнага, Андрэя Мрыя... Сьпіс бясконцы.

Атрымалася выданьне, якое адпавядае сваёй назьве «Да

гісторыі беларускае літаратуры». Маецца на ўвазе не дадатак да будучай акадэмічнай 4-томнай (у 5 кнігах) «Гісторыі беларускай літаратуры XX стагодзьдзя», а матэрыялы, навуковая канцэпцыя, вэрыфікаваная мэтадалёгія, гістарычна-літаратурныя і тэарэтычна-тэксталягічныя камэнтары да ўласнай ненапісанай гісторыі. А згаданая акадэмічная гісторыя толькі б выйграла, калі б мела перад сабой літаратуразнаўчыя распрацоўкі і крытычныя рэфлексіі Адамовіча.

Лёс літаратурнай навукі зьвязаны найперш з паняцьцямі «чытаньне» (у мадыфікаваным варыянце Р. Барта – «запаволенае чытаньне», «эротыка тэксту») і «інтэрпрэтацыя». Мала хто ўмеў чытаць тэксты так, як Адамовіч, бачыць у іх нешта самадастатковае і ў той жа час знаходзіць выяўленьне духу гісторыі, эпохі, вышукваць канстытутыўныя супярэчнасьці і перадаваць на мове паняцьцяў сваё разуменьне прачытанага і зразуметага. Сапраўды, талент крытыка больш рэдкі, чым талент паэта ці празаіка. Меў рацыю клясык дэканструкцыі Поль дэ Ман, калі сьцьвярджаў: «Крытыка ёсьць мэтафарай акту чытаньня, і гэты акт невычарпальны». Праблемы пачынаюцца не тады, калі зьдзяйсьняецца працэс «чытаньня», а тады, калі ўзьнікае патрэба растлумачыць чытачу тое, што сам крытык зразумеў, як ён інтэрпрэтаваў прачытанае.

Праблемы заключаюцца ў мэтадалёгіі дасьледаваньня. Афіцыёз, прадстаўлены ў кнізе асобамі с. Куніцкага і А. Канакоціна, калі згадваць адно гэтыя прозьвішчы, лёгка і хутка вызначыў, што мэтад, ужываны Адамовічам, «суб'ектыўна-ідэалістычны», а яго артыкулы ёсьць «адлюстраваньнем буржуазнай нацыянал-дэмакратычнай ідэалёгіі». Насамрэч улюбёным мэтадам узвышэнскага крытыка Адамовіча быў мэтад культурна-гістарычнай школы, які, на яго погляд, «адпавядаў задачам нацыяналістычнага літаратуразнаўства». Менавіта таму ён так ахвотна, пачынаючы з манаграфіі аб творчасьці М. Гарэцкага, спасылаўся на аўтарытэт лідэра згаданай школы г. Тэна, які настойліва суадносіў літаратурныя творы з «агульным станам розуму і нораваў навакольнага асяродзьдзя», «з пэўнымі плынямі ў сфэры думкі і маралі», з «народным духам».

Свае імпульсы атрымаў Адамовіч ад «біяграфічнага мэтаду» Ш. А. Сэнт-Бёва, псыхалягічнага падыходу Дз. Аўсяніка-Кулікоўскага, гермэнэўтыкі, абгрунтаванай філёзафам В. Дылтэем, параўнальнага літаратуразнаўства, закладзенага ў працах П. ван Тыгема… Мэтадалягічны ўзровень, дасягнуты папярэднікамі ў беларускай крытыцы – с. Палуянам, М. Багдановічам, А. Луцкевічам, М. Гарэцкім, А. Бабарэкам – дазваляў Антону Адамовічу сынтэзаваць у адно цэлае ўсе магчымыя ўплывы і крытычна ацэньваць магчымасьці «дыялектычна-матэрыялістычнага мэтаду» зь ягоным сацыялягізмам.

Антон Адамовіч – сапраўдны майстар крытычнай інтэрпрэтацыі творчасьці беларускіх клясыкаў. Сьвядома абраны ім мэтад, лепш сказаць, пункт гледжаньня на літаратуру, дазваляў вычытваць глыбінныя сэнсы мастацкага тэксту, адэкватна разумець прыроду мастацкай мовы, «прагаворвацца» аб тых унутраных супярэчнасьцях пісьменьніцкага сьветаадчуваньня, аб якіх часта не здагадваецца і сам пісьменьнік. Чытаючы найбольш праніклівыя старонкі артыкулаў, прысьвечаных творчасьці беларускіх клясыкаў, міжволі заўважаеш, як у працэсе інтэрпрэтацыі зьнікае сам аўтар дасьледаваньня і вырастае на ўвесь рост аб'ект яго крытычнай увагі. Знаходзячыся ў звычайнай для эмігранта экзыстэнцыі, якая дыктуе свае правілы паводзінаў у сьвеце і ў выніку суб'ектывізуе, адчужае, дэфармуе рэальны малюнак быцьця, крытык урэшце выбірае як адэкватны досьвед жыцьця ў Вялікім Часе (у разуменьні гэтага паняцьця М. Бахціным), набыты і выяўлены ў мастацкіх творах Я. Купалам, Я. Коласам, М. Гарэцкім, А. Гаруном, У. Дубоўкам, Я. Пушчам, У. Жылкам, Л. Калюгам, Н. Арсеньневай, А. Салаўём.

Палемічнае поле беларускай літаратуры, на якое ўзышоў у канцы 1920-х гг. А. Адамовіч, структуравалася на аснове яго асабістага жыцьцёвага досьведу, досьведу маладога беларуса, які надзвычай рана, яшчэ падлеткам, адчуў і асэнсаваў сваю нацыянальную прыналежнасьць, прыняў як наканаваньне свой ахвярны лёс, уласьцівы лёсу прадстаўніка любой «малой», занядбанай, загнанай нацыі. Сюжэт ягонага жыцьця стаў сюжэтам ягонае літаратурна-крытычнае творчасьці.

Можна ў гэтым выпадку пагадзіцца з фармулёўкай В. Булгакава: «Для Адамовіча працэс ператварэньня нацыянальнай літаратуры з каталізатара нацыянальнай сьвядомасьці ў адзін з сымбалічных падмуркаў каляніяльнага панаваньня, які прытупляе нацыянальныя пачуцьці і зьнеахвочвае да свайго, быў асноўнай падзеяй у гісторыі беларускага пісьменства XX ст.». Сам Адамовіч гэты ланцуговы працэс назваў словам «саветызацыя», якое асэнсоўваецца як паняцьце, адпачатку супастаўнае паводле сэнсавага напаўненьня з паняцьцем «нацыяналізацыя», а ў афіцыйным варыянце «беларусізацыя» і «карэнізацыя». Менавіта гэты стрыжнявы сюжэт беларускай гісторыі XX ст. найбольш уражліва апісаны, узноўлены, асэнсаваны ў кнізе А. Адамовіча. Асабісты экзыстэнцыйны досьвед аўтара ўрэшце заключыў своеасаблівую канвэнцыю з адцягненым досьведам літаратурнай навукі, з мэтадалягічнымі канцэпцыямі.

Антон Адамовіч знаходзіцца сярод найлепшых нашых літаратурных крытыкаў і навуковых дасьледнікаў XX ст. Міжволі напрошваюцца літаратурныя паралелі паміж двума выбітнымі Адамовічамі, Антонам і Алесем. Але ня правам аднаго і таго ж прозьвішча альбо асабістых кантактаў: падчас сэсіі ААН у 1982 г. яны мелі кароткую сустрэчу, прынамсі, высьветлілі, што ня родзічы. Абодва Адамовічы прычыніліся да вывучэньня творчасьці М. Гарэцкага. Менавіта Гарэцкі дае магчымасьць зрабіць адно супастаўленьне.

Вялікі, расьцягнуты на шэсьць нумароў часопісу «Ўзвышша», артыкул Антона Адамовіча «Максім Гарэцкі (Спроба манаграфіі аб творчасьці)» апублікаваны ў 1928 г. Гарэцкі яшчэ толькі зьбіраўся пісаць раман-эпапэю «Крыж»: пасьпеў аб'яднаць з дапамогай галоўнага героя Лявона Задумы некалькі аповесьцяў. У тым ліку і аповесьць «Ціхія песьні», дапрацаваную і выдадзеную ў 1930 г. пад новай назвай «Ціхая плынь». Не былі напісаны пакуль што раманы «Віленскія камунары» і «Камароўская хроніка». Не існавала дзёньнікавых запісаў пад умоўнай назвай «Скарбы жыцьця». Невядомая была будучыня пісьменьніка і яго твораў.

Раман-дасьледаваньне «Браму скарбаў сваіх адчыняю» Алесь

Адамовіч апублікаваў у 1975 г., уважліва пазнаёміўшыся зь сямейным архівам Гарэцкіх, запісаўшы ўспаміны Гаўрылы Гарэцкага, брата празаіка, і Галіны Гарэцкай, дачкі, дакладней, маючы перад сабою ўвесь абсяг творчай спадчыны М. Гарэцкага. Зразумела, што самі час і літаратура дазвалялі дасьледніку і нават змушалі яго сілаю свайго абноўленага гістарычнага і эстэтычнага патэнцыялу выказваць тое, чаго са зразумелых прычынаў ня мог сказаць Антон Адамовіч. Напрыклад, Антон Адамовіч ня змог належным чынам ацаніць мастацкае адкрыцьцё Гарэцкага, зьдзейсьненае ў сфэры дакумэнталістыкі, і аднёс аповесьць «На імпэрыялістычнай вайне» да «пераходнага пэрыяду» ў творчасьці празаіка. Што змог Алесь Адамовіч, якому сам Бог загадаў гэта зрабіць як аднаму з аўтараў дакумэнтальнай кнігі народных лёсаў «Я з вогненнай вёскі...».

Аднак жа і Алесь Адамовіч ня мог адкрыта разважаць пра выяўленьне нацыянальнай ідэі ў творчасьці М. Гарэцкага, што мог яшчэ ў канцы 1920-х Антон Адамовіч. У пачатку 1970-х гг. маскоўская супрацоўніца часопісу «Вопросы литературы» на маю прапанову напісаць артыкул па праблеме нацыянальнага характару, азірнуўшы пранізьліва прысутных супрацоўнікаў тагачаснага сэктару тэорыі літаратуры акадэмічнага Інстытуту літаратуры, сярод якіх знаходзіўся і Алесь Адамовіч, стрымана адказала, што гэтая праблема ўжо вырашана (мела на ўвазе ўсесаюзную дыскусію па пытаньнях нацыянальнага і інтэрнацыянальнага на старонках маскоўскіх часопісаў «Вопросы истории» і «Дружба народов»). Дарэчы, і праз 10 гадоў гэтая «вырашанасьць» вострай і балючай праблемы адгукнулася купюрамі ў 4-томным Зборы твораў М. Гарэцкага (часткова запоўненых эксклюзіўнай публікацыяй М. Мушынскага, зь якой бачна, што не памыліся, калі замест купюраў напішаш словы «маскаль», «маскалі» і інш.).

Нягледзячы на «маўчаньне, глухое маўчаньне» літаратурнай крытыкі, «мнагазначнасьць» якога зразумелая, Антон Адамовіч сьпяшаўся «прычыніцца да тэй канечнасьці літаратурна-археалягічных раскопак у будучыні», «вынаходу і пераацэнкі гэтага пісьменьніка ў наступным», што выпала на долю ўжо Алеся Адамовіча.

Менавіта ў першай сваёй буйной публікацыі Антон Адамовіч вызначыў на ўсё астатняе жыццё цэнтральны сюжэт сваёй літаратурна-крытычнай дзейнасьці. Ён і ў гэтым выпадку выкарыстаў свой улюбёны прыём: параўнаў архітэктоніку першага зборніка М. Гарэцкага «Рунь» з трохпавярховай будоўляй. На першым, тэматычным, паверсе знаходзяцца «пытаньні чыста сацыяльна-бытавыя», на другім – «праблемы, так сказаць, касмаганічна-гнасэалягічныя, вядомыя звычайна пад назовам «праклятых» пытаньняў», нарэшце, на трэцім – пісьменьнік «высоўвае на першы плян пытаньні нацыянальна-беларускія, характэрныя для эпохі нашага адраджэньня».

Адамовіч пагаджаецца з высновай В. Ластоўскага, што зборнік

«Рунь» – «ня зборнік апавяданьняў мляўка-стагнальных і не скалазубства зь вяскоўца, зь яго мазалёў і цемнаты, – гэта першы ў нашай літаратуры паэмат-трагедыя Маладой Беларусі. Першы голас беларускай, маладой, набалелай душы «на ўвесь сьвет, на Белу Русь».

З гэтае пары яго цікавіць у беларускай літаратуры яе трэці «тэматычны паверх», а менавіта нацыянальна-беларуская праблематыка, якую ён адсочвае зь віртуознай дапытлівасьцю ў творах Я. Купалы і Я. Коласа, У. Дубоўкі і Я. Пушчы, У. Жылкі і Л. Калюгі, Н. Арсеньневай і А. Салаўя.

На памяці драматычны эпізод з жыцьця тэкстолягаў акадэмічнага Інстытуту літаратуры пачатку 1970-х гг., калі вырашалася пытаньне, што рабіць з публікацыяй паэмы Я. Коласа «Сымон-музыка» ў 14-томным Зборы твораў. Зразумела было, што рэдакцыі паэмы – гэта канцэптуальна адрозныя творы і што радыкальныя зьмены маюць палітычны характар. У першай рэдакцыі гэта была паэма-трагедыя, эпіграфам да якой льга было паставіць радкі зь яе: «Колькі талентаў зьвялося, / Колькі іх і дзе ляжыць / Невядомых, непрызнаных, / Не аплаканых нікім, / Толькі ветрам адсьпяваных / Ў полі посьвістам пустым...». У трэцяй рэдакцыі (другая была нібыта ўкрадзена падчас вяртаньня паэта з Кіславодску, у чым А. Адамовіч сумняваўся) зьнікла ўсё, што супярэчыла ідэям

«марксісцкага дэтэрмінізму», прыкметна адрэдагаваны трагедыйны напал, зьмяніліся на проста супрацьлеглыя нэгатыўныя ацэнкі акупантаў з Усходу, а фінал быў шчасьлівым, хаця і сымбалічна-туманным, з намёкам, што талент Сымона-музыкі ўрэшце будзе ацэнены. Супраць таго, каб зьмяшчаць нават у разьдзеле камэнтароў першапачатковы тэкст паэмы, рашуча, калі не сказаць агрэсіўна, як бы па праве духоўнага спадкаемцы Коласавай літаратурнай спадчыны, выступіў М. Лужанін, былы літаратурны сакратар, прыстаўлены ў такой якасьці да клясыка.

Невядома, ці дапамог бы навукоўцам А. Адамовіч, бліскучы крытычны аналіз якога рэдакцый паэмы быў проста недаступны, а, бадай, і не вядомы савецкім літаратуразнаўцам, ці, наадварот, нашкодзіў бы. Але зразумела, што адсутнасьць зьвестак пра публікацыі Адамовіча змусіла навукоўцаў ісьці па шляхах, ужо пройдзеных таленавітым папярэднікам. Нічога, акрамя марнаваньня сілаў, энэргіі і часу, гэтае мусовае «няведаньне» не прынесла.

Як і «няведаньне» ўсяго, што пісаў Антон Адамовіч пра 1920-я – 1940-я гг. у гісторыі беларусаў і беларускай літаратуры. Пра пэрыядызацыю нацыянальнай гісторыі. Пра адрозьненьне тэрмінаў «гісторыя літаратуры» і «літаратурны працэс». Пра «літаратурацэнтрызм» беларускай культуры. Пра лёс рукапісаў А. Рыпінскага. Пра «ажыўленства» і «ўзвышэнства». Пра «беларускую літаратурную рэвалюцыю» і «нацыянальны эрас». Пра «мангольскі праект» і «закулісную гісторыю». Пра «сацыялістычны рэалізм» і пра «эзопаву мову». Пра «кнігі з ключом» (livre б clef). Пра трагедыю Купалы, генія з геніяў. Пра шматлікія драмы талентаў, «невядомых, непрызнаных, неаплаканых нікім». Пра балючыя драмы талентаў «вядомых», але змушаных, замест таго, каб пісаць мастацкія шэдэўры, якія «ўбачаць вякі і народы», самае лепшае пісаць «дрындушкі», як гэта называў Купала, а самае горшае… А самае горшае – капаць катлаваны (у значэньні, якое ўкладваў у гэтае паняцьце А. Платонаў, аўтар аповесьці «Катлаван»), тралявaць лес, класьціся замест шпалаў пад рэйкі (пра гэта пісаў паэт-вязень ГУЛАГу П. Прунікаў у аповесьці-ўспамінах «Пекла»)…

А можа, меў рацыю У. Дубоўка, калі выказваў правакацыйную ідэю: «зробіць благое справу добрую на сьвеце» (словы гэтыя цытуе Антон Адамовіч)? Тым самым далучаючыся да «паралельнага» руху ў Вялікім Часе, скажам, М. Булгакава, які невыпадкова ўзяў за эпіграф да свайго «Майстра і Маргарыты» словы Ё. В. Гётэ: «Дык хто ж ты? – Частка сілы той ліхой, / Дабро ўтвараецца зь якой». У паралельным Сусьвеце, як вядома, дзеюць іншыя законы, свая лёгіка, парадаксальнае мысьленьне. Антон Адамовіч зь ліку тых вядомых зь міталягічных часоў Гэрмэсаў, якія «перадаюць весткі багоў сьмяротным». Што з таго, калі гэтыя весткі ня дужа суцяшальныя для нас, хто жыве ў зямным сьвеце!
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 5 (39) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/05
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (39) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

крытыка [image]2005
ґаз Зміласту
паэмыка • аналітыка • **крытыка** • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Віталь Сіліцкі Складаныя рэаліі і элегантныя ідэалагізаваныя тлумачэнні

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ палітэканом, сталы аўтар «ARCHE». Яго апошняя сёлетняя публікацыя ў заходнім друку выйшла ў вашынгтонскім «Journal of Democracy» пад назвай «How my Country was Screwed».

Natan Sharansky with Dermer Rom. *The Case for Democracy: The Power of Freedom to Overcome Tyranny and Terror.* – New York: Public Affairs, 2004. – 303 p.

Калі Натан Шаранскі апавядае пра свабоду і дэмакратыю, яго нельга ігнараваць. Былы савецкі дысідэнт і вязень брэжнеўскіх лагераў, які стаў уплывовым ізраільскім палітыкам і сусветна вядомы публіцыстам, ён, безумоўна, са свайго жыццёвага досведу ведае, пра што гаворыць. Дадайце да гэтага выключныя інтэлектуальныя здольнасці (Шаранскі неяк згуляў унічыю ў шахматы з Гары Каспаравым) – і вы атрымаеце адну з самых уплывовых кніг апошніх часоў, якая адначасова сумяшчае глыбокі паліталагічны аналіз і пасіянарны палітычны маніфест у падтрымку пашырэння дэмакратыі на ўсім свеце.

Для лявацкага бамонду на Захадзе Шаранскі – гэта найперш кат нявінных палестынскіх тэрарыстаў, што мірна ўзрываюць ізраільскія аўтобусы, найлепшы сябра Джорджа Буша-малодшага, а значыць, пачварны неакансерватар, чые думкі нясуць небяспеку міру ва ўсім свеце. Аднак Шаранскага такім

стаўленнем да сваёй персоны не засмуціш – ён не сядзеў восем год у савецкім ГУЛАГу дзеля таго, каб чырванець перад сваімі крытыкамі. Акрамя таго, Шаранскі лепш за каго іншага ведае розніцу паміж тым, хто кажа тое, што трэба, каб спадабацца іншым (г. зн. палітыкам), і тым, хто кажа тое, што лічыць праўдай (г. зн. дысідэнтам). Кніга «У падтрымку дэмакратыі» – гэта твор сапраўднага дысідэнта.

Пры ўсёй сённяшняй афіцыйнай модзе на падтрымку дэмакратыі ў калідорах улады на Захадзе, палітыка «пашырэння свабоды», бадай, не сустракала такога інтэлектуальнага супраціву апошнія гадоў трыццаць-сорак. Амерыканскія кнігарні, напрыклад, перапоўненыя трактатамі на тэму, ці гатовыя тыя ці іншыя народы да дэмакрытыі, ці яны сапраўды жадаюць больш свабоды ў абмен на бяспеку і матэрыяльны дабрабыт, ці не прывядуць вольныя выбары да ўлады мусульманскіх фундаменталістаў і ці не ёсць «неліберальная дэмакратыя» большай пагрозай для заходняга свету, чым дыктатура ў той ці іншай краіне. Шаранскі, аднак, бліскуча атакуе гэтыя інтэлектуальныя вышукі, цалкам мяняючы ўсю сістэму каардынат, у якой мы прызвычаліся разважаць аб праблемах дэмакратыі, і ставячы пытанні з зусім іншага кута. Для яго пытанне выбару ляжыць не паміж «свабодай» і «бяспекай», а паміж свабодным грамадствам і грамадствам страху. Больш за тое, ступень адданасці любой краіны вартасцям свабоды і дэмакратыі вызначае яе паводзіны ў свеце. Вольныя грамадствы жадаюць міру, грамадствы страху распаўсюджваюць тэрор і вайну. Дыктатары кроўна зацікаўленыя ў падтрымцы тэрору і нянавісці для ўласнага выжывання. Праблема тэрарызму – гэта, перш за ўсё, праблема адсутнасці дэмакрытыі. Гэта прыводзіць да простай высновы: толькі пашырэнне свабоды і дэмакратыі пазбавіць свет ад тэрору. Арабскі свет – зусім не выключэнне.

Аднак, зноў жа: ці ўсе народы на свеце здольныя прыняць дэмакратыю? Тут Шаранскі абсалютна катэгарычны. Хіба ж не праўда: калі людзям прадставіць выбар паміж жыццём у свабодным грамадстве і грамадстве страху, яны аддадуць перавагу свабодзе? Ці варта верыць прапагандзе, што распаўсюджваюць тэрарысты і дыктатары, быццам той ці іншы

народ сапраўды любіць страх і тыранію? Шаранскі занадта доўга жыў у таталітарнай дзяржаве, каб ведаць адказ на гэтыя пытанні. Ён ведае ўсе «механізмы дыктатуры», як ён сам іх вызначае, з уласнага досведу. Больш за тое, у адрозненне ад сваіх крытыкаў, ён таксама ведае, як за фасадам арганізаваных праяў нянавісці да свабодных грамадстваў ціха і патаемна жыве прага да свабоды. З гэтым пагодзяцца далёка не ўсе. Прывабныя вобразы таталітарнага раю і гармоніі дагэтуль не з'яўляюцца такой ужо рэдкасцю на Захадзе. Аднак Шаранскі папярэджвае іх: не апыніцеся ў становішчы Леона Фейхтвангера, які аб'ездзіў сталінскі СССР у 1930-я гг., прыняў пацёмкінскія вёскі за рэчаіснасць і застаўся ў гісторыі як узор абялення тэрору і генацыду.

Страх і нянавіць ужываюцца з прагай да свабоды ў формуле, якую калісьці вывеў Джордж Оруэл – *doublespeak* (навамоўе). Шаранскі прыгадвае сваё першае сутыкненне з *doublespeak* у 1953 г., калі, даведаўшыся пра смерць Сталіна, яго бацька растлумачыў тады пяцігадоваму дзіцяці, хто такі быў «бацька народаў», але строга загадаў быць лаяльным савецкім хлапчанём, як кажуць, не балакаць лішняга. Потым Шаранскі сутыкнуўся з *doublespeak* і па-за межамі савецкай краіны. Неяк ананімны палестынскі бізнэсмэн пазваніў яму ў офіс і сказаў, што цалкам падтрымлівае яго выснову, што корань блізкаўсходняга канфлікту – у дыктатарскім рэжыме, што існуе на палестынскіх тэрыторыях і які зацікаўлены ў распаўсюджванні тэрору і страху. Баючыся пакарання, гэты ананімны палестынец, аднак, папрасіў не называць свайго імя: звонку ён цалкавіты прыхільнік Арафата і інтыфады. Прыводзячы гэты прыклад, Шаранскі паказвае, наколькі падобны сённяшні арабскі свет да Савецкага Саюза трыццацігадовай даўніны. І калі Савецкі Саюз змяніўся, то чаму арабскі свет не можа?

Шаранскі далей сцвярджае, што сувязь паміж дэмакратыяй і мірам павінна быць прызнана ў міжнароднай палітыцы не на словах, а на справе. Ён верыць у тое, што моц заходніх ідэй здольная трансфармаваць грамадствы страху. Прасоўваць свабоды адначасова прагматычна і маральна. У гэтым Шаранскі спрачаецца з так званымі рэалістамі, якія лічаць, што

палітыка нацыянальных інтарэсаў і маральныя сентыменты несумяшчальныя. Тут у ім гаворыць савецкі дысідэнт: сапраўды, рэалістычная ніксанаўская палітыка разрадкі з Савецкім Саюзам прывяла да таго, што дысідэнты і вязні сумлення аказаліся закладнікамі прагматызму і абыякавасці. Больш за тое, менавіта з меркавання інтарэсаў Захад, і найперш Злучаныя Штаты, традыцыйна падтрымліваюць шэраг дыктатур: Саудаўскую Аравію дзеля нафты, а Пакістан і Расію ў інтарэсах барацьбы з тэрарызмам. Аднак менавіта цынічная абыякавасць да праблем правоў чалавека ў Саудаўскай Аравіі прывяла да таго, што большасць з арганізатараў атак 11 верасня былі яе грамадзянамі. Дарэчы, палітыку Рэйгана ў дачыненні да СССР многія лічылі залішне ідэалістычнай і небяспечнай для міру. Але ці не гэтая палітыка прывяла да краху «імперыі зла» і разам з тым да зніжэння рызыкі ядзернага канфлікту?

Шаранскі таксама крытыкуе падыход да асобных дыктатараў трэцяга свету, быццам іх варта падтрымліваць толькі таму, што альтэрнатыва можа быць нават горшай. Такое перакананне, на ягоную думку, распаўсюджваюць самі дыктатары. Больш за тое, каб надаць яму трываласць і доказнасць, яны наўмысна падтрымліваюць тэрарыстычныя і экстрэмісцкія рухі, на фоне якіх блізкаўсходнія шэйхі, прэзідэнт Мушараф, таксама як і нябожчык Ясір Арафат, выглядаюць нявіннымі ягняткамі. Такім чынам, «братнія» дыктатуры атрымліваюць міжнароднае прызнанне і мільярды долараў вонкавай дапамогі – быццам бы на барацьбу з экстрэмізмам. Шаранскі дае простую параду заходнім лідэрам: не купляйцеся на прымітыўны шантаж, звяжыце палітычную падтрымку і фінансавую дапамогу з унутранай палітыкай дзяржаў, з тым, ці падтрымліваюць яны дэмакратычныя свабоды альбо тэрарызм і тыранію.

Агульная схема прыкладаецца Шаранскім і да аналізу араба-ізраільскага канфлікту. Вядома, што аўтар, дэпутат кнэсету і былы міністр, належыць да г. зв. партыі вайны, якая нібыта знаходзіцца ў апазіцыі да мірнага ўрэгулявання канфлікту. Шаранскі, аднак, паслядоўна абараняе свой пункт гледжання, які прыводзіў яго да крытыкі бадай што кожнага мірнага плана на працягу апошняга дзесяцігоддзя. Аніводны з гэтых планаў

ніяк не кранаў кораня ўсяго супрацьстаяння паміж вольным грамадствам (Ізраіль) і грамадствам страху (Палестына і, паводле азначэння, увесь арабскі свет). Пакуль Палестына знаходзіцца пад уладай мілітарысцкай дыктатуры, для якой вайна і тэрор – толькі сродак падтрымання ўлады, мір немагчымы. Сапраўды, колькі Захад ні падтрымліваў Ясіра Арафата ў надзеі, што ён, як кажуць, «моцнай рукой» прыструніць сваіх экстрэмістаў, ён гэтага не зрабіў – не таму, што, як многія меркавалі, не меў рэальнай улады, а таму, што проста быў незацікаўлены ў спыненні тэрору, якое б прывяло да падзення ягонага рэжыму. Тут, аднак, Шаранскі сутыкаецца з парадоксам, які ён не можа вырашыць, а таму проста ігнаруе. Нават калі корань праблемы рэгіёна – у адсутнасці дэмакратыі ў Палестыне, то як яна можа там з'явіцца, калі дэмакратыя паводле азначэння немагчымая па-за рамкамі суверэннай нацыянальнай дзяржавы? Ці не падрывае тады адмова палестынцам у незалежнасці як мір, так і дэмакратыю? Акрамя таго, Шаранскі яўна перабольшвае, калі ўпарта праводзіць лінію дабра і зла па мяжы Ізраіля і палестынскіх тэрыторый (гэтаксама як заходняга і арабскага светаў). Так ён імкнецца адказаць тым крытыкам сваёй краіны, якія лічаць Ізраіль вінаватым у генацыдзе палестынцаў. Ён прыводзіць шматлікія факты таго, як ізраільскія карныя акцыі былі справакаваныя палестынскімі тэрарыстамі, але адначасова сцвярджае, што аперацыі ізраільскай арміі ў Джэніне ў 2002 г. – амаль што ўзор таго, як свабодная краіна клапоціцца аб тым, каб зменшыць ахвяры сярод мірнага насельніцтва. Альбо, звяртаючыся да тэмы скандалу ў іракскай вязніцы Абу-Грэйб, Шаранскі ледзь не заходзіцца, апавядаючы пра тое, як свабоднае грамадства, у адрозненне ад дыктатур, знаходзіць мужнасць прызнаць свае памылкі і нават злачынствы. Магчыма, ён у чымсьці мае рацыю, але прыклад Абу-Грэйба і аперацыі ў Джэніне – не найлепшы спосаб маркетынгу дэмакратыі.

Можна аспрэчыць і некаторыя іншыя сцвярджэнні Шаранскага аб сусветнай палітыцы. Так, жаданне жыць у вольным грамадстве можна знайсці паўсюль у свеце, аднак некаторыя грамадствы ўсё ж такі робяць вольны выбар на карысць недэмакратычнага рэжыму. Узгадайце пра Расію, Венесуэлу альбо Беларусь: Пуцін, Уга Чавес і Лукашэнка атрымалі свае

першыя перамогі ў збольшага вольных выбарах. Па-другое, магчымасці для ціску на дыктатуры з боку Захаду абмежаваныя не толькі памылковымі меркаваннямі. Час ад часу дыктатуры маюць большы ўплыў на дэмакратыі, чым наадварот. Злучаныя Штаты, напрыклад, залежаць ад кітайскага фінансавання свайго бюджэтнага дэфіцыту і арабскай нафты. Прыгарады еўрапейскіх сталіц моляцца Алаху. Сярод пастаўшчыкоў нафты на сусветны рынак увогуле амаль няма дэмакрытый. Да таго ж, каб перамагчы СССР, той жа Рэйган, якім захапляецца Шаранскі, сумяшчаў рамантычны ідэалізм з *realpolitik*, калі выкарыстоўваў дыктатарскую Саудаўскую Аравію, каб збіць сусветныя цэны на нафту і знясіліць савецкую імперыю эканамічна. Па-трэцяе, ціску паддаюцца найперш тыя, хто самі гатовыя да пэўных рэформаў. Халодная вайна скончылася не толькі з-за Рэйгана, але і з-за Гарбачова. Відавочна, што ў трэцім свеце амаль няма Гарбачовых. Больш за тое, ягоны прыклад стаўся навукай для многіх дыктатараў, якія разумеюць, што нават маленькія рэформы, невялікія саступкі Захаду могуць ім каштаваць дорага.

[image]Трэба адзначыць, што Шаранскі не абыходзіць магчымую крытыку. Так, ён кажа: дэмакратычныя працэдуры часам прыводзяць да ўлады недэмакратычных лідэраў. Аднак нават у цяперашнім стане Расея значна менш небяспечная, чым быў СССР. Да таго ж, падобныя выпадкі толькі пацвярджаюць, што свабоду і дэмакратыю трэба прасоўваць адначасова. У кожным разе, ён кажа: лепш мець справу з дэмакратыяй, якая цябе ненавідзіць, чым з дыктатурай, якая нібыта цябе любіць і падтрымлівае. Акрамя таго, тыя, хто бачаць у Шаранскім неакансерватыўнага ястраба, здзівяцца, калі даведаюцца пра ягоныя даволі сціплыя прапановы для пашырэння дэмакрытыі. Не, ён не заклікае да татальнай вайны ці вонкавага ўварвання на ўсім свеце. Абыходзьцеся з дыктатарскімі краінамі так, як яны абыходзяцца з уласнымі грамадзянамі – а ўсё астатняе будзе зроблена імі самімі – такі яго заклік да ўрадаў дэмакратычных краін. Акрамя гэтага ідэалістычнага закліку Шаранскі урэшце выказваецца за стандартную практыку *democracy-promotion*: прапануе пераадрасаваць як мінімум частку тых рэсурсаў, што выдаткоўваюцца на вонкавую дапамогу для дыктатарскіх рэжымаў, для падтрымкі

дысідэнтаў і дэмакратычных рухаў. Але, як сведчыць досвед, такая стратэгія можа даць вынік толькі ў доўгатэрміновай перспектыве і пасля руплівай і прадуманай працы, а не нейкага новага крыжовага паходу. Калі Шаранскі з гэтым згодны, то ягоны ідэалізм можна лічыць адпаведным складаным рэаліям, якія не заўжды пасуюць да элегантных і ідэалагізаваных тлумачэнняў.

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

№ 5 (39) - 2005

[image]да Зьместу

[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2006/02/05

[image]

АНДРАНІК АНТАНЯН
журналіст, эсэіст, дасьледнік літаратуры. Магістар філялёгіі Віленскага ўнівэрсытэту. Дэбютаваў у «ARCHE» пазалетась эсэ «Зьніклая Вільня».

Андранік Антанян Беларуская кніга ў міжваеннай Польшчы

Turonek Jerzy. *Książka Białoruska w II Rzeczy Pospolitej. 1921–1939.* – Warszawa: Slawistyczny Ośrodek Wydawniczy (Prace Slawistyczne; 109), 2000. – 79 s.

Гісторыя беларускага друку ў міжваеннай Рэчы Паспалітай да сёньня зьяўляецца ці ня самай белай плямай на старонках беларускай рэтраспэктыўнай бібліяграфіі. Да сярэдзіны 1980-х гг. не магло быць і гаворкі пра вядзеньне падобнай працы ў СССР (выхад у 1949 г. у Вільні бібліяграфічнага даведніка В. Абрамавічуса «Библиография белорусских периодических изданий: 1861–1944», відавочна, трэба трактаваць як цуд зь мінімальнай верагоднасьцю паўтарэньня). Напэўна, менавіта з гэтай прычыны праца віленскага бібліёграфа так і не ўвайшла ў сталы навуковы абарот дасьледнікаў гісторыі беларускага друку. Як ні парадаксальна, але разам зь неаднаразовай зьменай цэнзурных, ідэалягічных і іншых умоваў існаваньня беларускай навукі, гэтае становішча не было выпраўленае.

Біябібліяграфічы слоўнік «Беларускія пісьменьнікі» (1992–1995) уражвае сваёй манумэнтальнасьцю, але ўсё ж ня мае права прэтэндаваць на статус грунтоўнага выданьня.

Дастаткова заўважыць, што ў ім былі амаль абыдзеныя ўвагай публікацыі, якія пабачылі сьвет на тэрыторыях, акупаваных Нямеччынай падчас Другой сусьветнай вайны. Гэта тычыцца ня толькі прыжыцьцёвых публікацыяў аўтараў, чыя рэпутацыя магла быць падмочаная ўяўным «калябарацыянізмам», але і тых пісьменьнікаў, якія ў часе вайны ўжо былі ў лепшым сьвеце і ніякім чынам не маглі паўплываць на лёс сваіх твораў. Аднак асноўныя хібы гэтага выданьня выкліканыя ня толькі і ня столькі ідэалягічнымі бар'ерамі, пра якія падрабязна апавядае ў сваіх успамінах Адам Мальдзіс[1] , але тым, што ў працы над слоўнікам бралі ўдзел аўтары зь вельмі розным узроўнем кваліфікацыі, эрудыцыі, урэшце, культуры. З пазыцыяў сёньняшняга дня гэтае выданьне можа трактавацца хіба як помнік. Але помнік не беларускай літаратуры ці беларускай кнізе, а помнік беларускаму савецкаму літаратуразнаўству. Толькі гэтым можна і растлумачыць той факт, што па выхадзе гэтага выданьня ані Інстытут беларускай літаратуры, ані выдавецтва «Беларуская Энцыкляпэдыя» не былі заўважаныя ў выпуску бібліяграфічных даведнікаў ці дасьледаваньняў у галіне гісторыі беларускай кнігі. Самыя грунтоўныя кнігі ў галіне рэтраспэктыўнай бібліяграфіі, якія былі выдадзеныя на працягу апошніх гадоў (за выключэньнем, хіба, бібліяграфічнага паказальніка «Газеты Беларусі, 1776–1975»[2], падрыхтаванага нацыянальнай Кніжнай Палатай), былі створаныя па-за межамі інстытутаў Нацыянальнай акадэміі навук РБ і кабінэтаў выдавецтва «Беларуская Энцыкляпэдыя»[3].

Таму выхад дасьледаваньня Юр'я Туронка ў выдавецтве Інстытуту славістыкі польскай Акадэміі навук, а таксама той факт, што яно так і не дачакалася грунтоўнай рэцэнзіі, сьведчыць выбіваюцца ані з кантэксту, ані з традыцыі вывучэньня гісторыі беларускай кнігі.

Аб'ектам дасьледаваньня Юры Туронак абраў беларускія

1 Мальдзіс А. Ад кнігі да кнігі // Наша Ніва. 2003. № 9 (14).

2 Газеты Беларусі, 1776–1975 : Указальнік / Нац. кн. палата Беларусі ; [склад. А. М. Мальдзіс, Э. У. Скакаў (нас.) ; навук. рэд. В. І. Сянкевіч]. – Мінск : НКП Беларусі, 2003. – 316 с.

3 Гутарыць пра выданьні Інстытуту беларускай кнігі падрабязна ня можам, бо ў нашых кантрольных экземплярах іх няма.

Бібліяграфічны паказальнік. – Мінск: БНІМ, 2003. – 584 с.

Гісторыя беларускай кнігі ў 3 т. Т. 2. Кнігавыданне ў перыяд капіталізму. – Мінск: БНІМ, 2001. – 570 с.

Гісторыя беларускай кнігі ў 3 т. Т. 3. Кнігавыданне ў перыяд сацыялізму. – Мінск: БНІМ, 2001. – 570 с.

Бібліяграфічны паказальнік беларускіх кніг, выдадзеных за мяжой, 1917–1939. – Мінск: БНІМ, 2003. – 584 с.

Гісторыя беларускай кнігі ў 3 т. Т. 1. Кнігавыданне ў перыяд феадалізму і капіталізму. – Мінск: БНІМ, 2001. – 570 с.

Бібліяграфічны паказальнік беларускіх кніг, выдадзеных за мяжой, 1917–1939. – Мінск: БНІМ, 2003. – 584 с.

Гісторыя беларускай кнігі ў 3 т. Т. 2. Кнігавыданне ў перыяд капіталізму. – Мінск: БНІМ, 2001. – 570 с.

Гісторыя беларускай кнігі ў 3 т. Т. 3. Кнігавыданне ў перыяд сацыялізму. – Мінск: БНІМ, 2001. – 570 с.

Бібліяграфічны паказальнік беларускіх кніг, выдадзеных за мяжой, 1917–1939. – Мінск: БНІМ, 2003. – 584 с.

Гісторыя беларускай кнігі ў 3 т. Т. 2. Кнігавыданне ў перыяд капіталізму. – Мінск: БНІМ, 2001. – 570 с.

Гісторыя беларускай кнігі ў 3 т. Т. 3. Кнігавыданне ў перыяд сацыялізму. – Мінск: БНІМ, 2001. – 570 с.

Бібліяграфічны паказальнік беларускіх кніг, выдадзеных за мяжой, 1917–1939. – Мінск: БНІМ, 2003. – 584 с.

Гісторыя беларускай кнігі ў 3 т. Т. 2. Кнігавыданне ў перыяд капіталізму. – Мінск: БНІМ, 2001. – 570 с.

Гісторыя беларускай кнігі ў 3 т. Т. 3. Кнігавыданне ў перыяд сацыялізму. – Мінск: БНІМ, 2001. – 570 с.

кніг, канфіскаты, чытацкая аўдыторыя, прыводзіцца сьпіс псэўданімаў і крыптанімаў, а таксама кароткая гісторыя агоніі беларускай выдавецкай дзейнасьці ў Вільні. У дадатку прыведзены сабраны аўтарам кнігасьпіс, у якім, на вялікі жаль, выходныя зьвесткі пададзеныя ў польскай транскрыпцыі, з асобным пазначэньнем альфабэту, якім была надрукаваная тая ці іншая кніга. У выпадку з кірыліцай – *cyr*, для «лацінкі» – *lat*. Гэта стварае пэўныя нязручнасьці пры карыстаньні.

У кнізе відавочны несыстэмны падыход да фіксаваньня псэўданімаў. У зборным каталёгу кнігі Канстанціна Міцкевіча, выдадзеныя за подпісам «Тарас Гушча», фігуруюць пад яго найбольш вядомым псэўданімам «Якуб Колас» (с. 60, 66), «Areљиycha» трапіла стаць «Ożeszko» (с. 68), што не зусім карэктна. Кнігі, выдадзеныя без пазначэньня аўтарства, хоць стваральнік іх вядомы, у кнігасьпісе, тым ня менш, ніяк не пазначаюцца. Так адбылося з кнігай Сяргея Паўловіча[4] «Пазашкольная асьветная і культурная праца Таварыства Беларускай Школы» (с. 67), а аўтарам рамансу «Лугам, лугам зеляненькім» (с. 66) зьяўляецца віленскі кампазытар Канстанцін Галкоўскі.

Найбольшую цікавасьць выклікае зроблены аўтарам[4] Гадавік статыстычны аналіз беларускай выдавецкай справы Беларускага міжваеннай Польшчы і ступень распаўсюджанасьці Навуковага кнігі сярод чытачоў у Заходняй Беларусі (с. 43–46, 49–51). Таварыства. Сухая мова лічбаў ня можа не шакаваць чытача, слаба Кн. 1 знаёмага з заходнебеларускай спэцыфікай. Паводле аўтарскіх падлікаў, Вільня, на працягу 1921–1939 гг. было выпушчана каля 500 назваў 1938. с. 209. асобнікаў кніг на беларускай мове, і, адпаведна, на кожнага беларуса прыпадала ад 1/4 да 1/2 экзэмпляра за ўвесь без малога дваццацігадовы пэрыяд.

[image] Разумеючы прыблізнасьць такіх падлікаў, тым ня менш, мушу адзначыць, што яна магла быць крыху больш адпаведнай рэчаіснасьці, калі б у распараджэньні аўтара былі ня толькі беларускія кнігазборы ў Польскай Рэспубліцы і прыватных

калекцыянэраў (відаць, таксама з Польшчы) (с. 10). Зводны кнігасьпіс, сабраны Юр'ем Туронкам, далёкі да паўнаты, але назваць гэта «заганай» у мяне не падымецца рука, бо добра разумею, што размовы пра «поўную бібліяграфію» маюць тое самае паходжаньне, што і разважаньні пра Рай на Зямлі.

Міма дасьледніка таксама прайшоў той факт, што, прынамсі, у сярэдзіне 1920-х гг. на беларускім кніжным рынку Заходняй Беларусі была даволі шырока прадстаўленая прадукцыя замежных выдавецтваў. Напрыклад, у рэклямным каталёгу Беларускага выдавецкага таварыства, выдадзеным, верагодна, напрыканцы 1924 г., з 183 прадстаўленых кніг – 83 (амаль 45 %!) былі прадукцыяй выдавецтваў БССР і Літоўскай Рэспублікі[5]. Яшчэ цікавейшая сытуацыя была з часопісамі: з 14 анансаваных тытулаў толькі 5 мелі заходнебеларускае «паходжаньне»[6].

Беларуская кніга з другой Рэчы Паспалітай таксама мела даволі шырокі распаўсюд на тэрыторыі Латвійскай Рэспублікі. А таксама тое, што прадукцыя беларускіх выдавецтваў Латвіі адносна бесьперашкодна трапляла ў Заходнюю Беларусь. Наагул, аспэкт цыркуляваньня на тэрыторыі Польшчы беларускіх кніг замежных выдавецтваў разгледжаны слаба.

Яшчэ больш няясная сытуацыя з выданьнямі, якія выходзілі ў міжваеннай Літве з пазначэньнем фальшывых выходных зьвестак. У сваім дасьледаваньні Юры Туронак падае, што такіх кніг на пачатку 1921–1922 гг. выйшла 20 (с. 11). Цяжка сказаць, адкуль узялася гэтая лічба, але выглядае, што беларускія кнігі зь фіктыўнымі выходнымі зьвесткамі выдаваліся ў Літоўскай Рэспубліцы і ў 1923 г., а затым яны выходзілі ў другой палове 1930-х гг.

Канечне, у міжваеннай Польшчы рэгістрацыйная бібліяграфія была пастаўленая не на самым высокім узроўні, а адзіная грамадзкая арганізацыя ў Заходняй Беларусі, якая магла б узяць гэтую ношу, – Беларускае навуковае таварыства ў Вільні – ня мела ні магчымасьцяў, ні кваліфікаваных кадраў, ані хоць бы энтузіястаў для сталага выкананьня падобнай працы. Гэтыя акалічнасьці, вядома, не спрыялі працы дасьледніка, аднак

[5] Каталёг Беларускага Выдавецкага Таварыства). Выданьні 1922–1924. Вільня, [1924]. – 15 с.

[6] Ibid. – с. 14–15.

толькі гэтым не патлумачыш тое, што ў зборны сьпіс (с. 58–79) ня трапіла кніга Ўладзімера Дубоўкі «І пурпуровых ветразей узьвівы», выдадзеная рэдакцыяй часопісу «Калосьсе», якая ня толькі добра вядомая беларускім дасьледнікам гісторыі кнігі[7], але і анансавалася ў тагачасным пэрыядычным друку.

Арытмэтычнае параўнаньне колькасьці выдадзеных кніг, напр.: беларускай мове на працягу 1921–1939 гг. у Заходняй Беларусі і ў БССР наўрад ці можна назваць удалым. У Заходняй Беларусі гэтая сфэра дзейнасьці была ачолена грамадзкімі арганізацыямі, якія звычайна мелі абмежаваныя фінансавыя магчымасьці, вельмі сьціплы (у параўнаньні зь дзяржаўным) уплыў на насельніцтва рэгіёну, да таго ж у сваёй дзейнасьці яны цярпелі ўціск як з боку дзяржаўных, так і недзяржаўных установаў. Нягледзячы на кароткачасовасьць гэтак званай «беларусізацыі» ў БССР, пэўны час беларуская мова абслугоўвала ці ня ўсе сфэры грамадзкага жыцьця – з аднаго боку, з другога боку – дзяржава мела даволі шырокія каналы дзеля распаўсюду кнігі і актыўна зь іх карысталася, асабліва не зважаючы на рэнтабэльнасьць выдавецтваў. У міжваеннай Польшчы беларуская мова, нягледзячы на ўсе прыгожыя праекты часоў станаўленьня Польскай дзяржавы, была брутальна выштурхнута на ўзбочыну грамадзкага жыцьця і, адпаведна, абслугоўвала вельмі вузкія яго сфэры, што адмоўна паўплывала і на колькасьць чытачоў, і на актыўнасьць беларускай інтэлігенцыі ў кнігавыдавецкай сфэры.

[image] Таксама ня трэба абыходзіць увагай тое, што кніга сама сабой (у тым ліку і беларуская) у Беларусі першай паловы XX ст. не трактавалася ані чытачамі, ані выдаўцамі як нейкая самадастатковая каштоўнасьць, рэч, уладаньне якой можа падкрэсьліць твой сацыяльнай статус (як было ў часы гэтак званага савецкага «кніжнага буму» 1960-х – 1980-х гг. XX ст., які захапіў і Беларусь). Рэч нават не ў татальным браку грошай у беларускай вёсцы і ў беднасьці гарадзкога насельніцтва нашага рэгіёну. Кніга разглядалася перадусім як мэтадычны сродак у школьнай і грамадзкай працы. І пашырэньне трактавалася як непазьбежны спадарожнік актыўнасьці грамадзка-палітычных і культурніцкіх арганізацыяў . Кажучы простымі словамі, калі ў вёсцы не было свайго харавога гуртка,

[7] Гл., напр.: Беларускія пісьменнікі 1917–1990. Міжвы: Маўчыцкая ейнасьціра, 1994. с. 185–186.

то й пільнай патрэбы ў рэпэртуарнай літаратуры таксама не магло ўзнікнуць. Калі беларускае школьніцтва Заходняй Беларусі ў 1930-я гг. было зьведзена да стану экзатычнага дзівацтва, то на мэтадычную літаратуру таксама не магло ўзнікнуць сталага попыту. Сьведчаньні гэтага мы можам знайсьці ў табліцы на с. 25–26, у якой пададзеныя зьвесткі паводле колькасьці тытулаў на год. Найбольшая кнігавыдавецкая актыўнасьць назіраецца ў 1921 г. (34 тытулы), зьвязана гэта найперш з актыўнасьцю на школьным фронце, другі ўсплёск прыпадае на 1926–1929 гг., на ўздым Грамады і культурніцкіх арганізацыяў. Беларуская кніга, у адрозьненьне ад пэрыядычнага друку, ня мела ў паўсядзённым жыцьці (ня важна, гарадзкім ці вясковым) вялікага ўтылітарнага значэньня, і яе распаўсюджанасьць можа сьведчыць адно пра становішча беларускіх культурніцкіх ці палітычных арганізацыяў. Таму гэтыя лічбы хіба толькі ўскосна адлюстроўваюць пашыранасьць беларускага друкаванага слова ў міжваеннай Польшчы. Ускоснае пацьверджаньне гэтага тэзісу мы знойдзем і ў мэмуарах Янкі Багдановіча, які на працягу доўгага часу працаваў у беларускай друкарні імя Францішка Скарыны, дзе даволі падрабязна расьпісаная праца над пэрыёдыкамі і асабліва адрыўнымі календарамі (якія, дарэчы, выходзілі статысячнымі накладамі), а кнігі ўзгаданыя адным абзацам[8].

Ня варта забывацца й на тое, што беларускія кніжкі вельмі рэдка зьмяшчалі абсалютна невядомы альбо новы для чытача зьмест. Тэксты, якія выходзілі асобнымі выданьнямі, звычайна ўжо былі добра вядомыя праз публікацыі ў пэрыядычным друку, якія, як правіла, адбываліся літаральна напярэдадні зьяўленьня асобнага выданьня. Усё ж варта прызнаць, што ў 1920-я – 1930-я гг. у Заходняй Беларусі асноўным і адзіным рэгулярным каналам пашырэньня беларускага слова служыў пэрыядычны друк, а роля кнігі была інтэрпрэтавалася сучаснікамі як дапаможная.

[8] Багдановіч Я. Ня быта... – Мінск, 1992. – С. 93.

[9] Kairiūkštytė N. Vilniaus Vadavimo Sąjunga, 1925.04.26–1938.11.25: Istorinė apybraiža. – Vilnius, 2001. P. 198.

Прыблізна такія самыя тэндэнцыі можна прасачыць, аналізуючы статыстыку літоўскага друку ў міжваеннай Польшчы, чые ўмовы існаваньня ў пэўнай ступені супадалі зь беларускімі. Калі штомесячна на Віленшчыне выкуплялася

блізу 23 тысячаў асобнікаў пэрыёдыкаў на літоўскай мове[9] (шляхам нескладаных арытмэтычных апэрацыяў можна параўнаць гэтыя лічбы зь сёньняшнімі накладамі незалежных выданьняў на беларускай мове ў Рэспубліцы Беларусі, і параўнаньне ня будзе на нашу карысьць). Але, у той жа час, колькасьць кніжных тытулаў, выдадзеных на літоўскай мове ў міжваеннай Польшчы (малаверагодна, што іх наклады значна пераўзыходзілі беларускія), не перавышала і двух дзясяткаў на год[10].

Аналізуючы зьвесткі, прыведзеныя ў дадатку да гэтай працы, адразу кідаецца ў вочы, што найбольшыя прагалы ў прыведзенай у працы Ю. Туронка бібліяграфіі прыпадаюць на пачатак 1920-х гг., а найбольш «пацярпелымі» тэматычнымі групамі сталі грамадзка-палітычныя выданьні і школьныя мэтадычная літаратура. Зьвязана гэта, у першую чаргу, з тым, што школьная дапаможная літаратура даволі часта перавыдавалася з той прычыны, што «тэрмін жыцьця» кніг дадзенай катэгорыі ў разы меншы, чым у астатніх выданьняў, якія пабачылі сьвет у абраным дасьледнікам гістарычным пэрыядзе, таму прасачыць кожнае перавыданьне таго ці іншага падручніка на сёньня задача складаная. Тым больш, што сучасьнікамі факт перавыданьня таго ці іншага падручніка не трактаваўся як падзея, вартая ўзгадкі на старонках пэрыядычнага друку. Таксама ня трэба забывацца на тое, што ў 1930-х гг. частка друкаў, прызначаных для Віленскай беларускай гімназіі, множылася літаграфічным спосабам невялікімі накладамі і выпускалася з грыфам «на правох рукапісу», таму і не трапляла ў афіцыйны бібліяграфічны ўлік.

Другая «пацярпелая» катэгорыя – актуальная і прапагандысцкая палітычная літаратура. Кнігі гэтай тэматычнай групы выходзілі часта, у абсалютнай большасьці выпадкаў яны былі забясьпечаныя фінансаваньнем (ня важна, ці гэта прыватныя ашчаджэньні паслоў сойму, дзяржаўны бюджэт ці грошы замежных структураў). Асобныя выданьні прамоваў соймавых беларускіх паслоў зьяўляліся часта, распаўсюджваліся безь якіх-кольвек абмежаваньняў, бо былі абаронены статусам афіцыйнай стэнаграмы паседжаньня сойму, аднак адначасова яны мала цікавілі як рэцэнзэнтаў, так

[10] Makauskas V. Vilniojos lietuvių 1920–1939 metais. – Vilnius, 1991. P. 10

і складальнікаў бягучай бібліяграфіі. Зрэшты, і кніжных калекцыянэраў таксама.

Усе пералічаныя заўвагі ня могуць перакрэсьліць таго факту, што праца Ю. Туронка ёсьць першым грунтоўным дасьледаваньнем гісторыі беларускай кнігі ў міжваеннай Польшчы, і яна можа і павінна стаць каштоўным дапаможнікам для дасьледніка гісторыі гэтага пэрыяду. А таксама тое, што кніга гэтая заслугоўвае беларускага выданьня, папраўленага і дапоўненага.

ДАДАТАК
1921

Лёсік Я. Нашая крыніца. – Вільня: І, Беларуская школьная рада, Друкарня «Віленскага выдавецтва», 1921. – 107 с.

Краўцоў М. Рада Беларускай народнай Рэспублікі. – Вільня: V, «Беларускі Звон», Друкарня Б. Клецкіна, 1921. – 32 с.

Краўцоў М. Усебеларускі Зьезд 1917 г. – Вільня: «Беларускі звон». Друкарня Б. Клецкіна, 1921. – 32 с.

1922

Смоліч Аркадзь. Географія. ч. II. Выд. 2-е. – Вільня: Віленскае беларускае выдавецтва Б. Клецкіна, 1922. – 367 с.

1923

Манцэвіч М. Як залажыць спажывецкі коопэратыў. – Вільня: Друк Я. Левіна, [пасьля 1923]. – 14 с.

1926

Stankievič A. Pramova Pasła ks. Ad. Stankieviča u Sojmie 24.IX.26. – [Вільня]: V, Biełaruskaja drukarnia imia Skaryny, 1936. – 16 s.

Гарэцкая Л. Родны Край. Першая пасьля лемантара кніжка да чытаньня. Выд. 4-е. – Вільня: Беларускае Выдавецкае таварыства, Беларуская друкарня імя Францішка Скарыны, 1926. – 95 с.

Прамовы дэпутатаў соймавага клюбу Беларускае сялянска-работніцкае грамады. – Вільня: Друкарня Левін і сын, 1926. – 83 с.

Прамовы дэпутатаў соймавага клюбу Беларускае сялянска-работніцкае грамады. Друкарня «Левін і сын», 1926. – 50 с.

1927

Гарэцкая Л. Родны Край. Трэцяя і чацьвертая пасьля лемантара кніжка да чытаньня. – Вільня: Таварыства Беларускае Школы, Друкарня Клецкіна, 1927. – 208 с.

Закон аб выбарах да гмінных самаўрадаў. – Вільня: Цэнтральны Беларускі Нацыянальны Выбарны камітэт на Віленшчыну і Наваградчыну, Друкарня Яна Баеўскага, 1927. – 16 с.

1928

Катэхізм для сяброў Царквы Мэтадыстаў, зьмяшчаючы збор хрысьціянскіх дактрынаў. – Вільня: Місія мэтадыстаў, Друк Я. Левіна, 1928. – 120 с.

1929

Беларускія (крывіцкія) казкі / Я. Станкевіч. – Вільня: Друкарня «Lux», 1929. – 48 с.

Biełaruskija relihijnyja pieśni. Выданы на правох рукапісу. – Вільня: Беларуская друкарня імя Ф. Скарыны, 1929. – 23 с.

Мэморыял Беларускага Пасольскага клюбу ў Лігу Народаў. – Вільня: Беларускі пасольскі клюб, Беларуская друкарня імя Ф. Скарыны, 1929. – 8 с.

1930

Навагрaдшчына у 1926–1930 гг. – Навагрaдак: Безпарцейны Блёк спаўпрацы з Урадам, Друкарня Wydziału Powiatowego w Nowogródku, 1930. – 14 с.

Рай на зямлі. – Навагрaдак: Безпарцейны Блёк спаўпрацы з Урадам, Друкарня Wydziału Powiatowego w Nowogródku, 1930. – 24 с.

1933

Машара М. Вось тут і зразумей. Драматычны абразок у 2-х адслонах. – Вільня: Таварыства Беларускай Асьветы, Друк Я. Левіна, 1933. – 29 с.

1934

Маршалак Язэп Пілсудскі ў Вільні й на Віленшчыне. – Вільня: Выдавец «Dzieńnik Urządowy», Друк Я. Левіна, 1934. – 96 с.

1935

Хвялоўскі З., Шайер В., Тарскі А. Геомэтрыя. Падручнік для III клясы гімназіяў / Пер. Р. Астроўскага, (на правох рукапісу). – Вільня: Выданьне беларускай філіі дзяржаўнае гімназіі імя Ю. Славацкага, 1935. – 164 с.

Зыдлер. І. Геомэтрыя. Падручнік II клясы гімназіяў. – Вільня: Выданьне беларускай філіі дзяржаўнае гімназіі імя Ю. Славацкага, 1935. – 62 с.

1936

Аўэрбах М. і Дамброўскі К. Слоўнік да Disce Latine. Падручнік для II кл. гімназіяў /Пер. Анцукевіча М., (на правох рукапісу). Вільня: Выданьне беларускай філіі дзяржаўнае гімназіі імя Ю. Славацкага, 1936. – 44 с.

Кіта Б. Трыгонамэтрыя. Падручнік для VII і VIII клясаў гімназіі. Компіляцыя па Златчынскаму і Войнову. – Вільня: Выданьне беларускай філіі дзяржаўнае гімназіі імя Ю. Славацкага, 1936. – 119 с.

1937

Našaja praca. Padručnaja knižka dla trejciaje klasy pačatkovych školaŭ. – [Львоў]: Państwowe wydawnictwo książek, Druk Towarzystwa Naukowego im. Szewczenki, 1937. – 160 s.

Śpieŭnik biełaruskich narodnych pieśniaŭ. – Wilnia: Narodnaja Knižnica, I, 1937. – 32 s.

1939

Дубоўка У. І пурпуровых ветразей узьвівы. – Вільня: Калосьсе, Беларуская друкарня ім. Ф. Скарыны, 1939. – 31 с.

Інж. В. Б. Сакрэт Ураджаю, або якім насеньнем засяваць і як яго на сяўбу загатаўляць / Пер. А. К. – Вільня: Выданьне «Самапомачы», 1939. – 46 с.

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/05
[image]

Аляксандар Фядута Дабраславёныя гарбачоўскія часы

АЛЯКСАНДАР ФЯДУТА палітычны камэнтатар, аўтар кнігі «Лукашенко. Политическая биография», якая выйшла сёлета ў маскоўскім выдавецтве «Референдум».

Я плакаў у дзень сьмерці Юр’я Андропава.

Былы старшыня КДБ СССР, генэральны сакратар ЦК КПСС, старшыня Прэзыдыюму Вярхоўнага савету СССР Юры Андропаў памёр халодным лютаўскім днём 1984 году. Я, студэнт Гарадзенскага ўнівэрсытэту, даведаўся пра гэта ў Ленінградзе, куды прыехаў на тыдзень папрацаваць у Публічнай бібліятэцы.

Было так. Я спусьціўся з гатэльнага нумару ў сталоўку – пасьнедаць. Радыёкропка ў нумары не працавала, тэлевізара не было зусім, і насельнікі гатэлю, адрэзаныя ад сусьветных навінаў, задавальняліся кнігамі і газэтамі, што прывезьлі з сабой. Я чытаў Зошчанку (каго яшчэ чытаць у Ленінградзе?). Чакаючы замоўленыя паранцы, у восьмы ці дзявяты раз учытваўся я ў апавяданьне пра пакуты рымскага дыктатара Сулы, вымушанага расплачвацца за настрыжаныя спрытнымі патрыётамі галовы ворагаў народу («Гэтак аніякіх грошай ня хопіць!» – прычытаў, памятаецца, Сула, знайшоўшы сярод пададзеных да аплаты галоў адну, не прадугледжаную прэскрыпцыйнымі сьпісамі). І тут забегла буфэтчыца:

– Андропаў памёр!

Было ўжо не да пакутаў згалелага дыктатара. Сьмерць Андропава ў вачох дваццацігадовага гарадзенскага студэнта – падзея сур'ёзная. Менавіта пры ім на вуліцах гораду, дзе адбыўся апошні сойм Рэчы Паспалітай, перасталі трапляцца п'яныя, а на прылаўках зьявілася кілбаса. Пры думцы аб тым, што п'яныя ізноў зьявяцца, а кілбаса зьнікне, сьлёзы жалобы самі наварочваліся на вочы.

Я падняўся ў нумар, выплакаўся (бывае) і пайшоў у бібліятэку. Ледзяны вецер дзьмуў проста ў сьпіну, і па нячышчаным ходніку мяне падкаціла сьпярша да станцыі мэтро, а потым, калі выйшаў на Неўскім праспэкце і, робячы ўсё, каб не заваліцца на сьпіну (вецер дзьмуў ужо ў твар), я дабраўся да былой Імпэратарскай публічнай бібліятэкі. І толькі там, у галоўным корпусе Публічкі, я ўпершыню ў жыцьці пачуў прозьвішча Гарбачова.

Барадаты чалавек у акулярах, не стары яшчэ, нэрвова палячы, ціха размаўляў зь нейкай жанчынай блякаднага ўзросту. Яны абмяркоўвалі, хто можа зьмяніць «Юр'я Даўгарукага» на ягоных пасадах (аб тым, што хворы на астму Чарненка ўжо ўзначаліў пахавальную камісію, яшчэ не паведамілі). Называліся імёны Раманава, Грышына, Аліева.

– А Чарненка?

– Вы зьдзяцінелі! Новыя хаўтуры праз паўгоду!

У галаве мільганула: «А праўда ж! Хаўтуры праз паўгоду! І жалобныя стужкі не навязалі на сьцяжкі, а акуратна абшылі імі палотнішчы, нібыта разьлічваючы загадзя: вось міне час, памрэ наступны правадыр – дык каб ужо час не марнаваць і вочы не сьляпіць, гэтыя сьцяжкі, абшытыя крэпам, і вывесім!»

– А Гарбачоў?

– Хто ж яго пусьціць?! Занадта малады!

Так я даведаўся, што маладосьць – вялікі недахоп у палітыцы.

Андропава пахавалі.

Задыханы Чарненка праляцеў у нашым жыцьці непрыкметна, пакінуўшы толькі ўспаміны пра кашаль, што захрасае ў вушах. Сьцяжкі з жалобным крэпам весела, па-сакавіцку, праводзілі старога ў апошні шлях.

А потым усё-ткі прыйшоў Гарбачоў.

Прыйшоў непрыкметна. Проста перад іспытам з гісторыі філязофіі наш любы прафэсар Ігар Давыдавіч Разэнфельд сказаў:

– Другія пытаньні ў білетах № 12 і 27 адказваць неабавязкова.

Адказваючы на гэтыя пытаньні, давялося б разважаць аб унёску Андропава Ю. У. і Чарненкі К. У. у разьвіцьцё марксісцка-ленінскай філязофіі.

Мне пашанцавала. У мяне пытаньні былі пра вечнае: «Ідэалістычная філязофія Плятона» і «Гістарыязофія Лява Талстоя».

Гарбачоў выявіўся ідэалістам, які верыць у сваю гістарычную місію.

Ён дазволіў – усё!

То бок, з гледзішча выпускніка філялягічнага факультэту – літаральна ўсё!

Выйшаў аграмадны том Веліміра Хлебнікава. Потым – Мікалая Гумілёва. Затым – біяграфія Бухарына. Затым яе перавыдалі ў Менску наагул нейкім непрыстойна аграмадным накладам – нібыта ў Беларусі столькі людзей ведаюць пра існаваньне Бухарына.

На адкрытым уроку па «Злачынстве і пакараньні» мая вучаніца Лілька Сафіна – у прысутнасьці сакратара ЦК ЛКСМБ і намесьніка міністра адукацыі рэспублікі! – сказала:

– Ад тэорыі Раскольнікава адзін крок да фашызму, расізму... І

сталінізму…

Сакратар ЦК зычліва хітнула галавой: маўляў, ужо можна… Ужо можна ставіць Сталіна ў адзін шэраг з Гітлерам.

Стала цяжка выпісаць «тоўсты» часопіс. У «Новом мире» друкавалі «Архіпэляг ГУЛАГ». Мы з калегамі па школе стварылі «часопісны каапэратыў»: дамовіліся, хто які часопіс выпісвае і ў якім парадку мы яго чытаем. У гаручцы выпісалі нат «Наш современник», але потым спахапіліся і вырашылі болей грошы не марнаваць.

У кінаклюбе «Ракурс» паказалі фільм Анджэя Вайды. Той самы «Краявід пасьля бітвы», які да таго мы ўпотайкі ўпяцёх разам з дырэктарам кінатэатру глядзелі а шостай раніцы – ды так, што ня толькі ніхто з нас, але нават кінамэханікі анікому ня «стукнулі».

На мэтадычным аб’яднаньні выкладчыкаў расейскай літаратуры мне прапанавалі падзяліцца досьведам выкладаньня навучэнцам «Майстра і Маргарыты». Калегі канспэктавалі. Потым адна сталага веку паня нясьмела спытала, дзе я ўзяў дастатковую колькасьць кніг, каб забясьпечыць кожнага навучэнца.

У камсамол сталі ўступаць радзей.

У партыю – яшчэ радзей.

Я сказаў маці, што падаю заяву аб уступленьні ў шэрагі чальцоў КПСС. Маці, старая камуністка, паглядзела на мяне з гонарам і спытала:

– А ты – гатовы?

Настаўніцкая камсамольская арганізацыя рэкамэндацыю мне даць адмовілася. Падстава: не гатовы.

Давялося адкласьці падачу заявы на год.

Пачаліся рэформы, палітычныя і эканамічныя.

Грошай у сям'і стала менеў: маці сышла на пэнсію. Куплялі менеў кніг і болей лекаў.

У Вярхоўным савеце БССР дэпутат Алег Трусаў паставіў пытаньне аб ільготах для былых малалетніх вязьняў фашыстоўскіх канцлягераў. Мама, што начамі слухала бясконцыя сэсійныя дэбаты, заплакала. Так я даведаўся, што дзяўчынкай яе зганялі ў Нямеччыну.

Для атрыманьня льготаў спатрэбілася даведка з КДБ. Маці ў КДБ ісьці не жадала. Але здароўе пагаршалася, і я яе ўмовіў.

Зьбіралася яна ў КДБ, як у турму. Я вырашыў ісьці разам зь ёй. Яна забараніла:

– Цябе арыштуюць!

– Ты зьдзяцінела!

Я быў пасьпяховым школьным настаўнікам, які выкладаў літаратуру сыном старшыні гарвыканкаму Сямёна Домаша. На камсамольскіх канфэрэнцыях са мной ветліва здароўкаўся першы сакратар абкаму партыі Ўладзімер Сямёнаў. Мяне абралі чальцом ЦК ЛКСМБ – і арыштуюць?!

Але мама была непахісная. І пайшла ў КДБ адна.

Яе доўга не было. Горадня – маленькі горад, і я пачаў ужо хвалявацца. Ці мала што можа здарыцца з жанчынай сталага веку, якая пакутуе на гіпэртанію?

Але ля пад'езду спынілася «волга», і малады чалавек у акуратным касьцюме дапамог маці выйсьці.

Моўчкі яна паднялася да нас на трэці паверх, увайшла ў пакой, не распранаючыся, легла на канапу. І моўчкі праляжала добрую гадзіну, не адказваючы на мае пытаньні.

Потым сказала адно слова:

– Дзякуй Гарбачову.

Яна прыехала ў КДБ, на вуліцу Тэльмана ў старой частцы Горадні. Спытала, куды ісьці. Ёй назвалі нумар кабінэту. Яна ўвайшла ў кабінэт – і толькі ў гэты момант зразумела, што трапіла ў *той самы кабінэт*, у якім раз на месяц, з 1949 да 1956 год, ёй даводзілася адказваць на адно і тое ж пытаньне:

– Чаму вы засталіся жывыя ў Нямеччыне, у той час, калі ўсе сумленныя людзі там загінулі? Прызнайцеся, што вы супрацоўнічалі зь немцамі!

Калі скончылася вайна, ёй было ўсяго няпоўных 19 гадоў.

У 1949 годзе ёй далі рэкамэндацыю на ўступленьне ў партыю. Рэкамэндацыю падпісаў сакратар абкаму ЛКСМБ Аляксандар Аксёнаў.

Але ў гаркаме партыі на паседжаньні бюро ўстаў начальнік УКДБ і ўпершыню задаў гэтае самае сакрамэнтальнае пытаньне:

– Чаму вы засталіся жывыя ў Нямеччыне, у той час, як усе сумленныя людзі там загінулі? Прызнайцеся, што вы супрацоўнічалі зь немцамі!

І на працягу пяці гадоў паўтаралася тое ж самае.

Мама хадзіла ў КДБ як на суботнік – сумленна. Яна ня ведала, што адказваць, таму што ня ведала за сабой аніякіх грахоў. Але адказвала, што зь немцамі не супрацоўнічала.

Мяркуючы па ўсім, у КДБ таксама ня ведалі за ёй аніякіх грахоў. Таму яна заставалася на волі, і ёй давалі кожны год рэкамэндацыю ў партыю, а КДБ яе заварочваў – проста таму, што так было трэба, да 1956 году ўключна. Да Хрушчова.

…І цяпер, у 1990 годзе, мама прымлела. І яна пачала падаць – у гэтым кабінэце, дзе нават сталы былі расстаўленыя, як у часы Сталіна.

Яе падхапілі. Паклалі на нейкую кушэтку, знайшлі лекара. Высьветлілі, што ёй трэба. Назвалі дакладны дзень, калі прыйсьці па даведку. Дачакаліся, калі стане лепш, далі машыну

і суправаджальніка, каб яе завезьлі дадому. І завезьлі дадому.

Аказваецца, можна ўвайсьці ў будынак КДБ – і выйсьці адтуль вольным…

– Дзякуй Гарбачову!

Да гэтага часу памятаю, як яна сказала гэта – з заплюшчанымі вачыма.

19 жніўня 1991 году я, ужо сакратар ЦК ЛКСМБ, прыйшоў на працу.

Радыёкропка не працавала – як і ў гатэльным нумары ў дзень сьмерці Андропава, – а тэлевізара ў новай аднапакаёўцы яшчэ не было. Таму мяне зьдзівіла пытаньне Славы Сьцяпуры – загадчыка аргаддзелу ЦК:

– А цябе хіба не арыштавалі?

– За што?!

– Ды… Там Гарбачова арыштавалі. Мы падумалі: раптам і цябе…

Я лічыўся «гарбачоўцам».

– Ня бойся. Гэта я пажартаваў.

– Добрыя жарцікі!

Далей усё адбылося імгненна. У тры дні.

Я правёў іх у Баранавічах, у летніку школьнага актыву. Першы сакратар гаркаму ЛКСМБ, Саша Бужак, адвёз мяне ў камітэт камсамолу аднаго з баранавіцкіх заводаў, дзе была спадарожнікавая апаратура. Хлопцы паказвалі мне запісы таго, што трансьлявалі ў тыя дні ўсе сусьветныя інфармацыйныя каналы. Танкі на маскоўскіх вуліцах.

Дрыготкія рукі Генадзя Янаева зусім не надавалі аптымізму.

Танкі здаваліся больш пераканальнымі.

Я параіў схаваць стужкі ў надзейнае месца. На ўсялякі выпадак. Раптам спатрэбяцца…

Эра Гарбачова скончылася раптоўна – калі ён спускаўся трапам самалёта, разам з жонкай і ўнучкай. Ён раптам пастарэў, страціўшы намэнклятурны лоск. Стала зразумела, што ўлады – і магчымасьці ўплываць на палітыку – у яго амаль не засталося. Тры дні апэрэткавага путчу, што забралі жыцьці трох маладых людзей, ператварыліся ў шматкроп'е на апошняй старонцы гісторыі савецка-камуністычнай імпэрыі.

Далей на яго было горка глядзець. Нельга бачыць куміраў разьвянчанымі. А Гарбачоў быў і застаецца маім кумірам. Прыкладам таго, што можна быць маральным і ідэйным палітыкам, што можна годна і прыгожа сысьці з улады. І што можна жыць нават пасьля таго, як ты ўладу згубіў.

Я бачыў яго некалькі разоў.

Ён выступаў перад дэлегатамі зьезду УЛКСМ. Я сядзеў на другім шэрагу, проста перад трыбунай. Ён, кіраўнік дзяржавы, здаваўся мне гістарычнай асобай, чалавекам, пакліканым пераўладкаваць сьвет. Гэта было ў 1989 годзе – яшчэ да другіх беларускіх «Дзядоў».

У 1995 годзе я браў інтэрвію ў прэзыдэнта «Гарбачоў-фонду». Я хваляваўся перад гэтай сустрэчай, як перад іспытам. Але задаць пытаньне мне атрымалася толькі праз дваццаць хвілін пасьля таго, як Гарбачоў пачаў адказваць на яго.

І я ўзгадаў радкі Шпалікава:

> *По несчастью или к счастью, истина проста:*
> *Никогда не возвращайся в прежние места.*

А ў 1995 годзе Гарбачоў быў «уже прошлым, к которому не

было возврата».

[image]І я ўбачыў яго ў Карлавых Варах, дзе ён адпачываў на запрашэньне Вацлава Гаўла. Гэта было ўжо пасьля сьмерці Раісы Максімаўны. Гарбачоў не пастарэў ужо – ён проста стаў спакайнейшы, мудрэйшы, сур'ёзьнейшы. Ён выходзіў з гатэлю, і людзі, якія зьвярталі на яго ўвагу, ставіліся да яго з разуменьнем і павагай. Ніхто ня кідаўся па аўтограф. Але яго пазнавалі і глядзелі яму ўсьлед, як мне падалося, зь любоўю. І калі ён памрэ – а гэта непазьбежна, – я буду плакаць. І мне ня будзе сорамна. Таму што я буду аплакваць ідэалы і спадзяваньні ўласнай маладосьці, буду прыгадваць час, калі была жывая мая маці, калі хацелася працаваць і верыць.

Буду прыгадваць дабраславёныя гарбачоўскія часы.

І буду паўтараць:

– Дзякуй Гарбачову.

За што? Ні за што. Проста за тое, што ўсе мы атрымалі магчымасьць стаць тым, кім сталі.

Дзякуй яму.

З расейскай.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 5 (39) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/05
[image]

[image] [image] [image]

Валянцін Акудовіч Сімпатычны курдупель Гарбачоў

ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ публіцыст, літаратурны крытык, мысьліцель-мэтафізык. Сурэдактар часопісу «Перекрестки». Аўтар кніг «Мяне няма. Роздумы на руінах чалавека» (1998), «Разбурыць Парыж» (2004).

Дваццатае стагоддзе аказалася большае за ўсю папярэднюю гісторыю чалавецтва. За гэты век людзі нарабілі столькі ўсяго ўсялякага, што сярод гэтага наробку для саміх сябе месца амаль не засталося. Ужо нават неба хутка не будзе хапаць, каб змясціць усё, што пазакідалі над галовы.

Затое ніколі раней не было і гэткіх стратаў. Памёр Бог, ляснуліся гісторыя з геаграфіяй, ушчэнт выпетрыліся адлегласць і час, знік недзе чалавек (засталіся адно людзі), а ўсіх ацалелых звяроў і птушак можна па заапарках расясяліць, ды яшчэ пустыя клеткі застануцца…

А колькі за гэты век было падзеяў, ад якіх ходырам хадзіла зямная куля! Сусветныя войны і сусветныя рэвалюцыі, развалы імперый і атамныя землятрусы, генацыды народаў і тэхнагенныя катастрофы (усяго да ночы не пералічыць). І сярод усёй гэтай апакаліптыкі адной з самых значных падзей, безумоўна, быў крах Вялікай камуністычнай імперыі. Пасля яго ўвесь свет адразу радыкальна перамяніўся… Як вядома, зачынальніка той глабальнай перамены звалі Міхаіл Гарбачоў.

Гэта быў добры жарт гісторыі. У эпіцэнтр падзеі сусветнага маштабу падставіць чалавека, крэатыўнага патэнцыялу якога (у іншых варунках) было б хіба даволі адно для шараговага губернатара.

Тут адразу згадваецца ці не самы праблемны з дыскурсаў дыялектычнага матэрыялізму. А менавіта, роля асобы ў гісторыі.

З *тэорыі* класікаў марксізму-ленінізму як быццам адназначна вынікала, што роля асобы ў гісторыі, лічы, аніякая. Бо змены сацыяльна-грамадскіх фармацый (і камунізм у перспектыве) адбываюцца не з ініцыятывы тых альбо іншых герояў, а толькі праз назапашванне сродкаў вытворчасці (і ўсялякага да таго падобнага). Хаду гісторыі не толькі не спыніць, але нават і не скрывіць нікому ўпаасобку.

Разам з тым, на практыцы *ідэалогія* марксізму-ленінізму не магла абысціся без перманентнага прадукавання «культу асобы» ў самых розных маштабных вымярэннях, ад усепланетнага (Маркс, Энгельс, Ленін, Сталін, Мао) да местачковага (герой-партызан, падпольшчык, камбайнёр…).

Калі ў маёй, спрэс заштампаванай савецкай адукацыяй галаве, пачало сёе-тое прасвятляцца, я нейкі час цікаваў, як праз штукаванне розных амбівалентных канструкцый тадышнія філосафы ад марксізму-ленінізму спрабавалі палагодзіць міжсобку ідэалогію з тэорыяй стасоўна ролі асобы ў гісторыі. Не цяжка здагадацца, што з тых інтэлектуальных мітрэнгаў партыйнага мыслярства нічога пэўнага і пераканаўчага не атрымлівалася…

…Але нічога пэўнага не атрымліваецца і ў мяне, калі я сёння, праз дваццаць гадоў пасля прыходу Міхаіла Гарбачова ў «генсекі», спрабую зразумець, ці была хоць якой роля ягонай асобы ў той гісторыі з крахам камунізму?

[image] Міхаіл Гарбачоў быў звычайным «генсекам» (іншага ніхто б тады і не пусціў на верхатуру камуністычнай імперыі).

Незвычайным у ім было бадай адно – маладосць (і гэтага не пралічылі патрыярхі палітбюро, калі ім ўстыла штогод хаваць лідэраў усяго прагрэсіўнага чалавецтва і яны навярнуліся на перспектыўнага, у сэнсе пажыць, Гарбачова). Канцэптуальная памылка. Бо Міхаіл Гарбачоў усё ж такі трохі недабраў партыйнага часу, каб з яго паспела дарэшты выпетрыцца ўсё жывое, прыстойнае, чалавечае і з гэтага атрымаўся цалкам унармаваны «вождь». Хаця б яшчэ гадоў дзесяць пагаблявалі ў запасе – тады, можа б, мы і сёння за камуністамі жылі…

Малады ён і ў палітбюро малады. Яму яшчэ на людзі хочацца, перад дзеўкамі павыстаўляцца, славай ужывую падыхаць, а не праз папяровыя хваласпевы ў глухіх прыцемках крамлёўскіх пакояў.

Сёння ўжо нават цяжка сабе ўявіць той радасны шок, які скалануў усю краіну, калі людзі пабачылі на вуліцы, ну зусім побач з сабой, генеральнага сакратара ЦК КПСС. Чытачам іншага веку патлумачу, з чаго атрымаўся шок. Акрамя як на трыбунах з'ездаў ці на маўзалеі амаль ніхто з паспалітых не бачыў *жывым* Сталіна, Брэжнева, Андропава, Чарненку. (Праўда, быў выламаўся з партыйнай традыцыі Хрушчоў, але ягоны паход у народ успрынялі ўсяго толькі як кур'ёз.) Гэта значыць, што больш за паўстагоддзе, недзе з 1930-х гг., кіраўнікі СССР (і лідэры ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва) для «шырокіх народных масаў» існавалі адно ў сімвалічнай ролі. Бо трыбуна партыйнага з'езда ці маўзалей ні каліва не дадавалі ім рэальнасці, паколькі на трыбуне і звычайны шараговец ужо трохі помнік…

Болей за тое, неўзабаве Міхаіл Гарбачоў пачаў з'яўляцца на людзях не проста чалавекам, а мужам з жонкай. Раней ніхто нават і падумаць не мог, што ў генеральных сакратароў бываюць жонкі. І так думаць было цалкам слушна, паколькі жанаты сімвал – гэта нейкі вычварэнскі аксюмаран.

Зразумела, гэта толькі паэтычная гіпотэза, але як мне ўяўляецца, сусветны крах камунізму пачаўся менавіта з усенароднага захаплення новым кіраўніком СССР. Натуральна,

не наўпрост з эйфарыі пачаўся, а, так бы мовіць, апасродкавана. Спачатку гэтае захапленне захапіла самога Міхаіла Сяргеевіча. Было цудоўна пачувацца не толькі выбраным (палітбюро), але і абраным (народам). Сёння мы назвалі б гэта «электаральнай падтрымкай». Аднак тады яшчэ ні пра што такое не ведалі, бо ніколі раней лідэраў партыі не цікавіла, падтрымлівае іх народ ці не. Яны рабілі тое, што лічылі мэтазгодным, а затым адпаведныя ідэалагічныя структуры арганізоўвалі ўсенародную ўхвалу чаго заўгодна: ад саюза з фашыстоўскай Германіяй да ганьбавання камуністычнага Кітая.

«Любоў народная» зрабіла Міхаіла Гарбачова кіраўніком краіны як бы ў квадраце. Яна сталася для яго нечым накшталт «другога палітбюро», і з гэтага ён мог пры нагодзе ўпэўнена канфрантаваць з тым першым, якое яго толькі выбрала.

Аднак любоў народу недвухсэнсоўна патрабавала адпаведных захадаў з боку абранніка і нават падказвала, якімі яны мусяць быць. Паколькі генсека ўпадабалі за прастату і людскасць, дык думка пра «сацыялізм з чалавечым аблічам» з'явілася бадай сама сабой і прыйшлася цалкам да месца.

Упершыню «сацыялізм з чалавечым аблічам» паспрабавалі пабудаваць у Чэхаславаччыне ў другой палове 1960-х. Толькі там гэтае аблічча досыць хутка ўпляжылі ў пражскі брук тракамі савецкіх танкаў.

Але нават каб танкаў не было, дык нічога з той чэхаславацкай задумы не атрымалася б, бо сацыялізм (прынамсі, камуністычнага фармату) таму і сацыялізм, што ён не мае і не можа мець аблічча. Ні чалавечага, ні якога там яшчэ.

Калі вада залішне падпірае запруду, крый Божа рабіць у ёй адтуліну, каб паслабіць напругу…

Нават у тым маразматычным палітбюро ўжо даўно разумелі, што за семдзесят гадоў улады саветаў сацыяльнай напрузе назбіралася аж занадта, але раней палітбюро заўсёды хапала

старэчай абачлівасці не кранаць запруды. А Міхаіл Гарбачоў быў малады, і яму яшчэ хацелася авантураў.

Ён іх і атрымаў – з гакам.

Паўторым да месца: Міхаіл Гарбачоў быў *звычайным* «генсекам». І яму, як кажуць, нават у жахлівым сне не магло прысніцца, што якраз з ягоных ініцыятыў ляснецца не толькі сусветная сістэма камунізму, але разам з ёй гэпнецца і ейнае трывалішча – Савецкі Саюз. Верагодна, каб ён ведаў наперад, як яно далей будзе, дык уласнымі рукамі сам сябе засіліў (хаця на гэткае і не выглядаў здатным). Аднак пра апакаліптычнае ён ужо ж напэўна тады і не думаў, бо шчыра хацеў усяго толькі дабра ды росквіту і савецкім людзям, і вялікай краіне, і светлай будучыні. А калі стала ясна, што адбываецца нешта зусім іншае, раўнуючы з тым, аб чым яму мроілася, ён ужо не мог даць рады сваволі падзей.

У адрозненне ад камуністычных лідэраў першай рэвалюцыйнай пары, якія ўмелі ўтаймоўваць народную стыхію і менавіта праз гэтае ўмельства станавіліся лідэрамі, пазнейшыя (пасля Сталіна) у ім не мелі патрэбы. Усё і ўсюды даўно было ўпарадкавана ды злагоджана, на месцы дробнабуржуазных стыхій віраваў энтузіязм працоўных масаў і ніякіх праблем тут нават у перспектыве не прадбачылася. На верхатуру Крамля цяпер узбіваліся не тыя, што маглі «з усім народам гутарку весці» (ці заліваць яго па горла крывёю), а здольныя гаспадарнікі, пры гэтым не пазбаўленыя таленту кулуарнай барацьбы за ўладу.

Таму калі не толькі «народныя масы», але і сама гісторыя з геаграфіяй раптам усчынілі бунт, Міхаіл Гарбачоў разгубіўся, ды так моцна, што надалей ад яго адно разгубленасць і засталася. Ён ужо нічога не разумеў, што адбываецца ў свеце. Але і што побач з ім адбываецца, ён таксама не разумеў. Апошняе было яшчэ і балюча, бо яго як бы без дай прычыны разам узнелюбілі і палітбюро, і той самы народ; а жонку Раісу народ дык аж узненавідзеў. І нават электарат, які ён сам упершыню і сфармаваў як уласны электарат (былыя дысідэнты, дзеячы культуры і навукі, проста інтэлігенты, слухачы замежных радыёстанцый, чытачы тоўстых часопісаў,

«нефармалы» і да т. п.) пачаў спехам пакідаць яго на карысць ужо зусім рэвалюцыйнага Барыса Ельцына.

Як добра падумаць, дык ГКЧП і Барыс Ельцын супольна выратавалі Міхаіла Гарбачова ад яшчэ больш ганебнага фіналу (і бадай што ўратавалі чалавеку жыццё). Бо без старонняй волі ён самахоць не збочыў бы з «генсекаў». Разгублена і бязвольна ішоў бы паўз бурапенны век і далей – невядома куды, але да першай бездані.

За той час, што прамінуў пасля «перабудовы», якіх толькі (і колькі!) аналітыкаў не панапісана, дзе «поздним умом» пераканаўча тлумачыцца, чаму камуністычная імперыя мусіла разваліцца. Але найлепшая з аналітык – гэта сам час, які прамінуў з той пары. Калі б яны (і камунізм, і СССР) разваліцца не мусілі, дык за столькі гадоў ужо павінны былі б не тым, дык іншым спосабам засведчыць свой жыццядайны патэнцыял. Толькі нічога падобнага да рэваншу і заваду няма.

Зрэшты, сёння ўжо добра бачныя і падставовыя прычыны гэтай «мусовасці».

Тэорыя камунізму ў сваіх канцэптах сусветнай рэвалюцыі ды інтэрнацыяналізму першай сфармулявала ідэю глабальнага свету, збудаванага на агульным для ўсіх зямлянаў ідэалагічным алгарытме. У XX ст. практыкі камунізму паспрабавалі рэалізаваць гэтую тэарэтычную задачу – і не без пэўнага поспеху. Няблага атрымалася на пачатку стагоддзя, але асабліва ўдала пасля Другой сусветнай вайны, калі колькасць дзяржаў, якія на ўсіх кантынентах задэкляравалі сваю прыхільнасць да камуністычнай ідэі, вырасла неймаверна, і перспектыва сусветнага панавання камунізму ўжо зусім не выглядала на ўтопію.

Дэмакратычны Захад пералякаўся. Ён тэрмінова заклікаў сваіх хаўруснікаў да кансалідацыі і дзеля большай пэўнасці аб'явіў таталітарнаму Усходу халодную вайну.

Лічыцца амаль аксіяматычным, што ўрэшце Захад гэтую вайну

і выйграў. Але насамрэч нашэсце камунізму на сусвет перапыніў не ўласна Захад, а выбух камунікацыяў, які спарадзіў іншы тып глабалізму – інфармацыйна-камунікатыўны. Апошні па ўсіх цывілізацыйных параметрах відавочна пераўзыходзіў (і, бадай, не на адзін парадак) ідэалагічны глабалізм. Тым і перамог – лёгка. Хаця калі быць больш дакладным, дык інфармацыйна-камунікацыйны глабалізм непасрэдна з ідэалагічным і не змагаўся, ён проста адмовіў у легітымацыі ўсім ідэалогіям разам, і сярод іх – камуністычнай.

Прыйсце постмадэрна якраз-такі і засведчыла гэты факт.

У эпоху краху ўсіх ідэалогій у камунізму не было аніякіх шанцаў на перамогу.

Паколькі інфармацыйна-камунікатыўны глабалізм (паводле логікі развою тэхнакратычнай цывілізацыі) рана ці позна абавязаны быў згамаваць глабалізм ідэалагічны, дык атрымліваецца, што Міхаіл Гарбачоў мог сабе лішне і не дакараць за крах камунізму.

У канцэптуальным плане – мабыць, так, а вось у тэмпаральна-сітуацыйным?..

Літаральна «за хвіліну» да Гарбачова генеральным сакратаром ЦК КПСС быў абраны інтэлектуал і паэт Андропаў. Між іншым, адукаванае грамадства ўжо ад яго чакала вызвольных перамен, але ён адразу гэтак улёгся ў парадак і дысцыпліну, што каб яго ўлада задоўжылася, дык нам, магчыма, яшчэ б і пры ваенным камунізме пашэнціла пажыць.

Інакш кажучы, Андропаў і Гарбачоў атрымалі тую самую ўладу лічы ў той самы час, а якія розныя вынікі?! Адзін нацягнуў лейцы так, што ўсялякі рух увогуле запыніўся, а другі цалкам наадварот – узяў ды закінуў цуглі ў бадыллё… І табуны падзей шалёным галёпам панесліся ў розныя бакі свету.

Вось тут і думай што хочаш пра ролю асобы ў гісторыі. Ці то яна ёсць, тая роля, ці яе няма?

Дарэчы, у выпадку з Міхаілам Гарбачовым сітуацыю заблытвае яшчэ той факт, што тут і асобы не было. Быў здольны савецкі функцыянер, які з-за сваёй партыйнай няспеласці «наламаў дроваў» не раўнуючы сто бураломаў, а пасля сеў і заплакаў як бабёр.

Усё ніяк не знікае з памяці адзін увогуле звычайны газетны фатаздымак. Шырокафарматны. Па самым яго нізе ідуць насустрач адзін аднаму, з працягнутымі для вітання рукамі, два маленькія чалавечкі. Аднаго, вышэйшага, завуць Рональд Рэйган, другога – Міхаіл Гарбачоў.

Наўрад ці фатограф, здымаючы здаля лідэраў дзвюх супердзяржаў на вялізнай пустой сцэне (відаць, з галёркі нейкага «форуму»), меў на мэце зганіць іх адмысловым ракурсам. Але атрымалася так, што фотаапарат зафіксаваў прэзідэнтаў дробненькімі, калі яны абодва паднялі па адной назе – і з гэтага як бы трохі страцілі раўнавагу, – неяк смешнавата матлянулі вольнымі ад вітання рукамі і па-дурнаватаму ашчэрыліся, хаця фармальна іх усмешкі былі надзвычай прыязныя.

Дык вось, калі гэты фатаздымак патрапіў на вочы, мяне чамусьці аж скаланула (іншыя на яго, магчыма, і ўвогуле не звярнулі ўвагі).

– Курдупелі! – выбухнула ўва мне. І ад гэтых двух курдупеляў залежыць лёс ці не ўсяго чалавецтва?!

– Які здзек! – ліхаманіла далей. Пасрэдны кінаакцёр і не менш пасрэдны савецкі функцыянер цяпер будуць апавядаць усяму свету, што яны на гэты раз збіраюцца з ім рабіць. І ўсе мы, сотні мільёнаў, мільярды працавітых, разумных, таленавітых будзем слухаць гэтыя дзве пасрэднасці і хоцькі-няхоцькі патураць іхным словам.

Божа, цяпер я ведаю, якой была Твая апошняя кара нябесная. Сыходзячы, Ты аддаў нас у рукі палітыкаў.

Наўрад ці калі раней існавалі сферы жыцця, дзе хай сабе і здольны ў сваёй прафесіі, але пасрэдны, як асоба, чалавек, мог заняць у ёй вяршыннае месца. І толькі калі з'явіліся і запанавалі палітычныя дыскурсы (у сучасным разуменні палітыкі), такое сталася магчымае і магчымае спрэс. Сёння чалавецтва (у яго шматлікіх фрагментах) ачольваюць калі не нікчэмныя, дык досыць ардынарныя персоны. Так, зазвычай яны цалкам функцыянальныя як палітыкі, але ці шмат пра каго з іх можна сказаць – Асоба. Вось чаму на абсалютную балышыню палітычных курдупеляў адразу і забываюцца, як толькі яны сыходзяць з публічнай сцэны.

Феномен сучаснай палітыкі, як месца дзейнасці чалавека (і дамінуючае над усім месца) якраз тым і адметны, што ўласна *чалавека* ён і не патрабуе. Неабходны толькі набор пэўных якасцяў, а ў што гэтыя якасці ўгрунтаваныя (ці ўвогуле ні ў што не ўгрунтаваныя) – зусім неістотна. Больш за тое, і палітычная структура, і сістэма даўно вызначыліся ў тым сэнсе, што яны могуць трывала і эфектыўна функцыянаваць адно тады, калі ў гэтым топасе для *асобы* па азначэнню месца не будзе (хіба адно дзе на маргінэсе трохі вытыркнецца).

Дзіўная і трывожная сітуацыя! Чым больш магутны патэнцыял (ва ўсіх сферах сваёй дзейнасці) назапашвае людства, тым больш ардынарных персон яно патрабуе для сістэматызацыі і легітымацыі сваіх дзеянняў. А паколькі гэтыя a priori банальныя персанажы «па законах жанру» мусяць быць у цэнтры грамадскай увагі, дык яны яшчэ выступаюць і як бы мерай чалавека ўвогуле. З чаго (перадусім) мы маем татальную ды імклівую баналізацыю не толькі чалавецтва, але і ўсяго дыскурса жыцця.

Сумна, да нуды сумна. Курдупелі авалодалі светам. Але тут, здаецца, ужо нічога не паробіш, бо сучасны свет сам абраў сабе за форму існавання палітыку. І ўсё сталася палітыкай, а што не палітыка, таго як бы і няма.

Вось і Беларусь аб'явілася сярод суб'ектаў еўрапейскай прасторы адно дзякуючы палітыцы ды палітыкам. І Міхаілу Гарбачову найперш, хаця і паўз ягоную волю…

[image] Дарэчы, перачытваючы сваю пісаніну, я быў непрыемна здзіўлены, што мой герой атрымаўся ну нейкім ужо зусім адмоўным. Але ж гэта няпраўда! Прынамсі, я сам пра яго асабліва дрэнна ніколі не думаў. Міхаіл Гарбачоў быў далёка не горшы сярод курдупеляў. А, можа, – і адзіны мне напраўду сімпатычны. Бо і на вяршынях улады, і сапхнуты адтуль, ён быў (і застаецца) досыць прыстойным суб'ектам.

Прыстойны палітык – які смешны збег словаў. Толькі я пэўны, што якраз гэтая прыстойнасць не дазволіла Міхаілу Гарбачову нават у пару самых драматычных забурэнняў пагнаць танкавыя калоны па ўсіх мацерыках і пазаліваць чалавечай крывёю пажары рэвалюцый.

Будзе няпраўдай сказаць, што на ім ані плямкі… На бруднай рабоце адно лайдакі застаюцца чыстымі. Але ў якую б краіну ён сёння не прыехаў, з ім шчыра вітаюцца і тыя, хто, хутчэй, адсячэ сваю руку, чым пацісне заплямленую чалавечай крывёю.

На гэтым і спынімся…
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 5 (39) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/05
[image]

[image]

A R C H E П а ч а т а к № 5 (39) - 2005

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

5 [image] [image]2005

[image] [image] [image]

[image] [image] [image]

Эрык Гобсбаўм Сход прывідаў

ЭРЫК ГОБСБАЎМ выдатны брытанскі гісторык (нарадзіўся ў 1917 годзе). У свой час вядучы тэарэтык брытанскай кампартыі. Аўтар кніг «The Invention of Tradition», «Age of Extremes» і аўтабіяграфіі «Interesting Times».

Мне не ўдалося сустрэцца зь Міхаілам Гарбачовым чатыры гады таму, у Осла, на сотай канфэрэнцыі Нобэлеўскай фундацыі за мір, якая сабрала разам ляўрэатаў Нобэлеўскай прэміі міру і навукоўцаў. Я прыняў запрашэньне, бо там чакаўся Гарбачоў. Аднак ён не прыехаў, і маім візаві стаўся Кім Тэ Джун[1] з Паўднёвай Карэі – без сумневу, выбітная постаць, але зусім ня той чалавек, які ў адзіночку зрабіў больш, чым усе астатнія разам узятыя, каб выратаваць сьвет ад пагрозы ядзернай вайны, ня той, хто ў адзіночку зрабіў так, каб зьмены ў Савецкім Саюзе й савецкай імпэрыі не перайшлі ў крывавую бойню, як гэта адбылося ў Югаславіі.

Сёлета мне пашэнціла больш. Мне прыйшло запрашэньне з Турына ад Сусьветнага палітычнага форуму (у якім старшынюе М. Гарбачоў) з прапановай узяць удзел у агульным сходзе пад назвай «1985–2005: дваццаць год, што зьмянілі сьвет», які мае адзначыць той момант, калі Гарбачоў, стаўшы лідэрам СССР, распачаў перабудову і актыўныя дзеяньні дзеля прасоўваньня міру ў сваёй краіне. Я адразу ўхапіўся за гэтую мажлівасьць, бо для мяне як для фаната Гарбачова гэта быў цудоўны шанец аддаць даніну пашаны гэтаму герою – хоць і трагічнаму, але герою.

[1] Экс-прэзыдэнт Паўднёвай Карэі, ляўрэат Нобэлеўскай прэміі міру за дзейнасьць, накіраваную на прымірэньне Карэяў.

Але чаму менавіта Турын? А чаму б і не? Гістарычна Турын мае больш супольнага з праектам Гарбачова, чым Давос – з трыюмфатарамі-капіталістамі, што зьбіраюцца там на Давоскі Сусьветны эканамічны форум. Турын – гэта ж горад Грамшы і Тальяці, месца нараджэньня адначасова і Італьянскай камуністычнай партыі, палітыка якой натхняла даперабудовачнага Гарбачова і такіх баявітых лібэралаў, як, напрыклад, знакаміты і слаўны Франка Вэнтуры, партызанскі камандзір і гісторык, што вывучаў эўрапейскае асьветніцтва і расейскі папулізм. Суворы, інтэлектуальна сур'ёзны Турын у свой час зарэкамэндаваў сябе цьвёрда антыфашысцкім горадам, як ніякі іншы ў Італіі, прычым антыфашысцкія пазыцыі ў ім займаў нават буйны бізнэс. Гэта таксама места, дзе пражывае ніштаватая габрэйская грамада. Турын заўсёды мне падабаўся, хоць ягоная архітэктура ўяўляе сабой дзіўнаваты кактэйль пышна-нацыянальных і раньнеіндустрыяльных модаў пампэзнага XIX стагодзьдзя. У адрозьненьне ад Мілану, ён не згубіў ані сваёй цэласнасьці, ані арганічнай повязі з гарамі, што яго атульваюць. Горад гэты знакаміты сапраўднай навуковай атмасфэрай і Акадэміяй навук, ганаровым прэзыдэнтам якой некалі быў сам праконсул Напалеон Банапарт. Першы раз я наведаў Турын у часы ягонай славы, калі ён быў адначасова і італьянскім Дэтройтам, дзякуючы цараваньню Джаньні Аньельлі[2] («Сэньёра Адваката», так яго звалі), і Днепрагэсам італьянскай інтэлектуальнай і літаратурнай магутнасьці, на якім запраўляў Джуліё Эйнаўдзі, таксама цар у сваёй сфэры, праўда, з нашмат меншымі фінансавымі магчымасьцямі, – сын першага прэзыдэнта Італіі. Эйнаўдзі валодаў самым прэстыжным выдавецкім домам краіны (ён друкаваў Павэзэ, Кальвіна, Вітарыні, Прыма Леві, Натальлю Гінзбург, ня кажучы пра самога Грамшы), два першыя паваенныя дзесяцігодзьдзі гэта, можа быць, было топ-выдавецтва сьвету. Ён часам запрашаў падобных да мяне аўтараў на вячэру (што адбівалася на ганарарах у бок іх паніжэньня) у найшыкоўнейшую рэстарацыю «Камбіё», што не зьмянілася з часоў Кавура[3], які за гэтымі сталамі снаваў праекты ператварэньня Сардзінскага каралеўства ў Італію. Падчас вайны, калі верыць Эйнаўдзі, усе да аднаго супрацоўнікі ягонай канторы сышлі ў партызаны. Мяне проста кранула, калі я пабачыў, што ў 2005 г. нехта яшчэ ставіць

ручкай жывы подпіс на афіцыйным блянку з запрашэньнем да ўдзелу ў гарбачоўскай канфэрэнцыі.

Няма таго, што раньш было. Памёр Джуліё, памёр і «Сяброўскі Адвакат» (і «Рэпубліка»[4] прысьвяціла яму ні многа ні мала восем старонак). Маральнае старэньне канвэераў фабрыкі «Фіяц», тыпу прывяло да страты горадам чвэрці свайго насельніцтва, маральнае старэньне камунізму – да зьяўленьня альтэрнатыўнай румынаў. Колькасьць работнікаў на «Фіяце» скарацілася з 60 да 15 тысячаў, але ён пакуль што змагаецца; я чуў, што італьцы падумваюць аб ягонай куплі. Былы зборачны цэх Лінгота цяпер пераробле[3] Прэм'ер-міністар Сардзінскага каралеўства, сталіцай у Турыне, пасьля – першы прэм'ер аб'яднанай Італіі.ны ў выстаўначную пляцоўку для кніжных кірмашоў. Кіпр і апошні раз летаў у Турын, «Брытанскія авіялініі», зарыентаваныя збольшага на пасажыраў бізнэс-клясы, адкрыліся наўпроставых пералётаў зь Лёндану сюды, саступаючы пляцоўку авіякампаніі «Раянэйр»[5], але сёлета яны зноўку ўступілі ў канкурэнцыю з таннымі перавозчыкамі; у цудоўным турынскім аэрапорце шуміць вір турыстаў-лыжнікаў. «Ювэнтус»[6] трымае марку, і Альпы ўсё гэтак жа атачаюць горад сваім дзівосным колцам, але Турын ужо ня той, што быў колісь. А ці зможа й «Ювэнтус» захаваць свой узровень без падтрымкі нябожчыка Аньельлі? Мясцовыя прадпрыемствы ўліваюць свае грошы ў зімовыя Алімпійскія гульні наступнага году, што павінна, паводле іх разьлікаў, добра акупіцца. А што далей, чаму б Турыну ня стаць месцам правядзеньня міжнародных форумаў? Турынскія і п'емонцкія вяльможы, запрасіўшы нас і аплаціўшы нам прыезд, без сумневу, разглядаюць падзею, якая сабрала трынаццаць былых прэзыдэнтаў і прэм'ер-міністраў, дзевяць былых міністраў замежных справаў і пару лайнэраў з рознага кшталту дыпляматамі й сябрамі ўрадаў, як нешта вельмі прэстыжнае.

Проста не магу прыгадаць нічога падобнага. Гісторыкі[4] Перадача могуць пабачыць аб'екты сваіх досьледаў у твар, нават[5] Ці ўяўнае стагодзьдзе тэлебачаньня, дзякуючы якому мы можам[6] Італійскі пазнаваць усіх тых, хто прымае рашэньні на нацыянальным ці нават сусьветным узроўні. Проста незвычайнае адчуваньне, быццам бы ты наведваеш музэй мадам Цюсо і бачыш, што ўсе воскавыя фігуры замененыя арыгіналамі. Мы паціскаем руку ямо зь імі разам за аднымі сталамі адну й тую ж ежу (ну, можа, і не зусім тую ж, бо ўсё ж такі існуе панятак спэцыяльнага

мэню, напрыклад, для Міхаіла Гарбачова і сапраўднага «Кямсамолкі». вяльможаў). Мы можам задаваць ім пытаньні, на якія яны даюць сяброўскія, але, звычайна, банальныя адказы. А супрацоўніка Службы бясьпекі крыху меней, чым у музэі.

5 Авіякампанія, што спэцыялізуецца на танных рэйсах.
6 Знакамітая футбольная каманда.

Больш чым сотня мужчынаў сярэдніх і сталых гадоў (жанчын, як заўжды, жменька) сядзяць за сталамі, выстаўленымі доўгім прастакутнікам у залі Вайсковай акадэміі, збудаванай у барочным стылі эпохі Віктара Эмануіла. Яны пазіраюць – сталы стаяць так шыракавата – адно на аднаго ды слухаюць сынхронны пераклад на ўсе абавязковыя на такіх мерапрыемствах мовы плюс польскую (палякі прыслалі двух былых прэзыдэнтаў зусім розных поглядаў, а таксама экс-прэм'ер-міністра). У правых ад мяне кутах прастакутніка, за галоўным сталом, я заўважаю праніклівы позірк Джуліё Андрэоцьці, зморшчанага чалавечка, які сем разоў узначальваў італьянскі ўрад у пэрыяд паміж 1972 і 1992 гг., вайсковую выпраўку генэрала (пазьней прэзыдэнта) Ярузэльскага, які душыў «Салідарнасьць» і вытаргоўваў канец польскага камунізму, і самога Міхаіла Гарбачова, прыгожага і ветлага. Ён надзіва добра захаваўся, але выглядае меншым за самога сябе ў цені свайго велізарнага суседа Гэльмута Коля, канцлера Нямеччыны, якую ён аб'яднаў у 1990-м, праседзеўшы на сваёй пасадзе рэкордны тэрмін. За сталом таксама было пакінута месца для былога прэзыдэнта Бразыліі Фэрнанда Энрыка Кардоза, які забавіўся ў дарозе.

Нават стары цынік-гісторык быў бы ўражаны такім наборам. Мне выпала месца паміж былым дарадцам Рэйгана па нацыянальнай бясьпецы і былым французскім выведнікам. Насупраць мяне сядзеў па-антышаронаўску настроены ізраільцянін, зь якім я паразмаўляў падчас абеду і які выявіўся былым намесьнікам дырэктара «Масаду» ў далікудаўскія часы. Я таксама заўважыў пэрсанажа з чэскае мінуўшчыны – тае мінуўшчыны, якую я жадаў бы забыць, – Рудальфа Сланскага-малодшага, выключанага з партыі за свой удзел у «Праскай Вясьне», а пазьней аднаго з падпісантаў «Хартыі-77». Ён нават чымсьці нагадвае мне свайго бацьку, расстралянага ў 1952-м – найбольш вядомую ахвяру камунізму падчас апошніх публічных антысэміцкіх сталінскіх «паказальных працэсаў» ва

Ўсходняй Эўропе. Дзесьці за сталом Лех Валэнса тлумачыць, што ў вяртаньні яго краінай незалежнасьці няма заслугі ані расейскіх палітыкаў, ані польскіх камуністаў: усё адбылося дзякуючы выключна «Салідарнасьці» й папу. (Мой сусед, які падпісваў рахункі для апэрацыяў ЦРУ ў Польшчы ў тыя часы, ніяк не рэагуе.) Валэнса нагадвае мне Джона Прэската[7], толькі здаравейшы. Апошнія дваццаць пяць гадоў даліся яму яўна цяжэй, чым ягоным братам-палякам.

Але яшчэ больш дзіўнае для мяне адчуваньне, што я бачу ўсе сход прывідаў. Няма кітайцаў, якія заўсёды пазьбягаюць публічных абмеркаваньняў, але прысутнічае значная колькасьць тых асобаў, хто ў 1980-я прымаў рашэньні, зьмянялі сьвет. А вось тыя, хто кіруюць сваімі краінамі сёньня, адсутнічаюць. Няма нікога з пуцінскай Расеі, вулфавіцкага Вашынгтону, шродэрскай Нямеччыны ці блэрскай Брытаніі. Толькі нязьменнасьць французскіх замежнапалітычных інтарэсаў забясьпечвае пераемнасьць замежнай палітыкі Парыжу. У астатніх краінах паміж 1985 і 2005 гг. пралегла глыбокая прорва. Акрамя палітыкаў мясцовага ўзроўню з Турыну й П'емонту, а таксама італьянскага міністра эўрапейскіх справаў, які моўчкі рэпрэзэнтуе ўрад Бэрлюсконі, адзіны дзейны міністар на гэтай сходцы – гэта былы савецкі дысыдэнт Натан Шаранскі, які цяпер, на жаль, падвязаўся ў кабінэце Шарона. Нават заходнія закулісныя гульцы таго пэрыяду ўжо пасьпелі адысьці ад палітыкі, а то і ўвогуле ад усялякіх справаў. Перамены апошніх дваццаці гадоў абмяркоўваюць тыя, каго гэтыя перамены выкінулі на звалку гісторыі. Вядома, падзея такога кшталту задумвалася, каб павіншаваць Гарбачова, яна не прадугледжвала выступаў, у якіх прамоўцы аналізавалі б дзейнасьць чалавека, якім амаль усе тутака шчыра захапляюцца. Але й настрой віншаваньня – гэта далёка ня той настрой, што панаваў на гэтай сустрэчы. І проста цяжка пазьбегнуць адчуваньня, што шмат хто з прысутных у залі, як з Усходу, так і з Захаду, насамрэч цешыцца тым, што адбылося ў былых камуністычных краінах, тым, як разьвівалася міжнародная абстаноўка пасьля падзеньня Гарбачова.

[7] Брат Джона Кеннэдзі і амаль прэм'ер.

Удзельнікі форуму ўсе як адзін занепакоеныя Амэрыкай Буша,

але існуе таксама нешта, што адрозьнівае тых, хто з Захаду, ад тых, хто з Усходу. Заходнія сыстэмы працягваюць сваё існаваньне. А для людзей з Усходу гэты форум стаў форумам тых, каго нашчадкі Францускай рэвалюцыі называлі *ci-devant*, а нашчадкі расейскай рэвалюцыі 1917 г. называлі *бывшие люди*. Мала хто з прадстаўнікоў Усходу належаў да ліку даўнішніх дысыдэнтаў. Не здаецца пакуль удава Сахарава Алена Бонэр, трымаецца і Аляксандар Якаўлеў, былы найбліжэйшы хаўрусьнік Гарбачова, які цяпер ганьбіць усё, што належала савецкім часам. Але большасьць з прысутных – гэта людзі, якія ўсё сваё жыцьцё былі ляяльнымі й карысным дзеячамі рэжымаў сваіх краінаў, што сышлі ў нябыт назаўсёды. Ніхто ня кажа пра настальгію, хоць яна адчуваецца ў размовах былых югаславаў, але шмат для каго ў гэтым будынку, што нагадвае некаторым зь іх пэўныя залі так знаёмых ім палацаў, гэтая сустрэча – нібыта памінкі па сыстэме, у якую яны верылі і якая памерла, і памінкі па надзеі – па маленечкай-маленечкай надзеі на яе рэфармаваньне, – якой яны зь цяжкасьцю зракліся, а мо і ўвогуле не зракаліся.

Ну а што ж звонкая рэшта – занудныя экспэрты й навукоўцы, пераважна амэрыканцы? Савецкія крыніцы інфармацыі пэнсійнага ўзросту пачуваюцца сярод іх як рыбы ў вадзе: яны вітаюць старых сяброў і партнэраў, запаўняюць лякуны, бароняць свае інтэрпрэтацыі, абменьваюцца ўспамінамі пра Маскву й Варшаву. Тым ня менш, хоць падзеньне камунізму – гэта ёсьць часткаю і майго жыцьця, гэта не мая стыхія; іх сцэна – не мая сцэна. Я тут найперш як гісторык, які пісаў пра стагодзьдзе, большую частку якога пражыў сам, як той, хто жадае зразумець яго лепей і спадзяецца, што ягоныя працы пра гэтае стагодзьдзе вытрымаюць прысутнасьць тых людзей, пра якіх я пішу.

Ці дапамагаюць прыватныя кантакты з рэліктамі мінулага праліць сьвятло на гэтае мінулае, і калі так, дык якім чынам? Гэтае пытаньне ў той ці іншай форме задаюць сабе ўсе гісторыкі. Так, дапамагаюць. Але якім чынам, да канца невядома. Амаль заўсёды мы думаем пра месцы, а не пра людзей. Тапаграфія прамаўляе нават у адсутнасьць чалавека: выпалены сонцам бразыльскі пэйзаж дапамагае зразумець

далёкіх харызматаў, а гарадзішча на пясчаным грудку ў сярэдзінным Ўэлзе – уявіць нічыйнасьць балотных абшараў у часы Сярэднявечча. Часам гарады здольныя былі сказаць значна больш, чым людзі, а некаторыя зь іх і цяпер гавораць самі за сябе. Напрыклад, Санкт-Пецярбург альбо Прага да свайго бяздумнага посткамуністычнага заняпаду. Ці можна параўнаць перажытае мною на турынскім сходзе з тым, што я перажыў, стоячы халодным зімовым ранкам перад старым, неперабудаваным Фінляндзкім вакзалам у Ленінградзе? Ці дала мне гэтая сустрэча больш, чым я ўзяў з кніг ці ўдзелу ў не такіх грандыёзных калёквіюмах у апошнія гады савецкага пэрыяду? Адказ на абодва пытаньні – не. Ці гэта таму, што людзі проста хутчэй старэюць і стамляюцца? Ці гэта таму, што людзі ў грамадзкім краявідзе разбураюцца больш імкліва, чым будынкі й рэкі? Ці таму, што, як ведае кожны гісторык і журналіст, з інтэрвію з прэзыдэнтам ці прэм'ерам шмат ня выцягнеш? Значна больш эфэкту ад размовы зь людзьмі, якім плацілі за ўважлівасьць і ў каго язык лёгка разьвязваецца: пагаварыць з журналістамі і дыпляматамі-разьведчыкамі. (На шчасьце, апошнімі заля поўнілася.)

Зрэшты, я ехаў у Турын, не спадзеючыся даведацца шмат новага пра перабудову, але дзеля таго ж, што і многія іншыя – каб аддаць даніну павагі выбітнаму, захапляльнаму, добраму і сумленнаму чалавеку. І калі гісторык унутры мяне быў крыху расчараваны, то фанат Міхаіла Гарбачова радаваўся. Ці вялікі чалавек Гарбачоў? Я ня ведаю. Я сумняюся. Ён быў – і, падобна, застаецца – чалавекам чэсным, чалавекам добрай волі, дзеі якога мелі калясальныя наступствы, як добрыя, так і дрэнныя. Я кажу гэта, бо для мяне вялікі гонар быць ягоным сучасьнікам. Чалавецтва бясконца абавязанае гэтай постаці. І ўсё ж, калі б я быў расейцам, я б думаў пра яго, як пра чалавека, што зруйнаваў маю краіну.

Пераклаў з ангельскай Віктар Прастакоў
паводле London Review of Books з ласкавай згоды аўтара і выданьня.
Copyright by Eric Hobsbawm.
[image]

[image]

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/05
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (39) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

5 (39) - 2005

[image]

[image]2005

[image] [image] [image]

ЧЭСЛАЎ ЧАБАНУ

Чэслаў Чабану Міхаіл Гарбачоў, заняпад сацыялізму і адраджэньне Ўсходняй Эўропы з пункту гледжаньня свайго чалавека

быў дарадцам прэзыдэнта Савецкага Саюзу Міхаіла Гарбачова ў пытаньнях Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы. Ён абараніў дысэртацыю па палітэканоміі ў Маскоўскім дзяржаўным ўнівэрсытэце ў 1979 годзе. Пасьля распаду СССР Чабану займаў пасады намесьніка

Зь Міхаілам Гарбачовым, асобай, якая да пэўнай ступені абумовіла мой жыцьцёвы шлях, я апошні раз сустрэўся ў Міжнародным цэнтры імя Вудра Ўілсана 11 лістапада 2002 году. У той час я быў стажэрам Форуму палітычных, дыпляматычных і навуковых дасьледаваньняў у Вашынгтоне. На маё зьдзіўленьне, ён памятаў мяне й нават падпісаў фатаздымак, зроблены амаль пятнаццаць гадоў таму падчас сустрэчы зь Нікалае Чаўшэску. На ім я перакладаю словы двух лідэраў, што ціснуць рукі адзін аднаму, усьміхаючыся. Гарбачоў – уласьцівай яму шырокай усьмешкай, Чаўшэску – з дапытлівасьцю на твары. У тыя часы, у часы «перабудовы» і «галоснасьці», я быў дарадцам і перакладчыкам спадара Гарбачова. Гэтая кароткая сустрэча падвяла мяне да неабходнасьці вярнуцца да пэўных думак, якія я глушыў у сабе

досыць доўгі час, і паспрабаваць аднавіць у памяці ўсе тое, што адбывалася ў чатыры гады, сем месяцаў і дваццаць адзін дзень (студзень 1987-га – жнівень 1991-га), якія я адпрацаваў на Старой плошчы ў Маскве ў аддзеле міжнародных сувязяў ЦК КПСС, камітэту Камуністычнай партыі Савецкага Саюзу. Ямпрацаваў там у якасьці дарадцы, а пазьней галоўнага дарадцы па сацыялістычных краінах Усходняй Эўропы, найперш ці Румыніі. Другім штуршком для гэтай задумы сталіся зносіны з Ўладзімера Цісманяну, рэдактара часопісу «Ўсходнеэўрапейская палітыка і грамадзтва»[1].

«Савецкі Саюз і Камуністычная партыя толькі выйгралі б, калі б яе генэральны сакратар болей працаваў з праблемамі жыцьця краіны, ня ўлазячы ў праблемы замежнай палітыкі і гістарычныя пытаньні…»

Першы афіцыйны візыт Чаўшэску ў Маскву адбыўся 23 кастрычніка 1988 году, на дваццаць чацьвертым годзе «братэрскіх адносінаў» паміж Чаўшэскавай Румыніяй і Савецкім Саюзам. Для мяне гэтая падзея была нібыта хрышчэньнем у новай якасьці, хаць ні мяне, ні маіх калегаў гэткі «гонар» не натхняў. Больш за тое, наш аддзел у адзіночку выступаў супраць гэтага візыту. Таму мы спрабавалі максымальна зьменшыць усе праявы «гонару», каб з аднаго боку не дыскрэдытаваць Гарбачова, а з другога – каб Чаўшэску не наўяўляў сабе лішняга адносна ўласнай важнасьці.

Тут трэба зрабіць невялікае адступленьне. У студзені 1988 году Чаўшэску акурат адсьвяткаваў сваё 70-годзьдзе. Гэта адбылося за два тыдні да таго, як мяне разам з маімі калегамі з іншых савецкіх рэспублік перавялі з самай пэрыфэрыі СССР – з ягонага квітнеючага саду, Малдовы, – у Маскву, у каманду Гарбачова, як «маладыя нацыянальныя кадры»[2]. Пад такога кшталту юбілеі лідэраў сацыялістычных краінаў і братэрскіх партыяў звычайна ганаравалі найвышэйшай савецкай узнагародай – ордэнам Леніна – «за выдатныя заслугі ва ўзмацненьні дружбы і пабудове сацыялізму».

Уладзімер Цісманяну, 1990-я гады

Уладзімер Цісманяну (нар. 1948) – палітолаг, дасьледчык, выкладчык, аўтар шматлікіх кнігаў і артыкулаў, прысьвечаных праблемам трансфармацыі і кіраваньня ў постсацыялістычных краінах. Ён – прафэсар Дзяржаўнай маёмасьцю, намесьніка кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Малдовы, дарадцы прэзыдэнта. Апошняя дзяржаўная пасада ў Малдове – пасол Малдовы ў ЗША. Пасьля сыходу зь дзяржаўнай службы доктар Чабану стаў навуковым супрацоўнікам універсытэту імя Джэймза Мэдысана ў ЗША.

[1] Хацелася б адзначыць некаторыя зь іх: Stalinism for All seasons: a Political History of Romanian Communism. – University of California Press, 2003; Between Past and Future. The revolution of 1989 and its Aftermath / Edited by Sorin Antohi and Vladimir Tismaneanu. – Central European University Press, 2000 («Сталінізм на ўсе часы: Палітычная гісторыя румынскага камунізму» і «Паміж мінулым і будучым. Рэвалюцыя 1989 году і яе наступствы»).

Нашая прапанова зламаць гэтую традыцыю і не ўпрыгожваць румынскага лідэра новым ордэнам была нечаканай для Палітбюро. Гэта была першая прапанова такога кшталту. За такую ініцыятыву ў ранейшыя часы можна было б ня толькі з крэсла паляцець. На жаль, нам не ўдалося давесьці яе да самога Гарбачова, таму традыцыя на гэты раз не была парушаная. Для Чаўшэску гэта быў другі ордэн Леніна, а таксама дадатковая нагода сьцьвердзіць сябе ў якасьці «Ўлюбёнага Правадыра Сацыялістычнай Румыніі, якога падтрымлівае СССР». Генэральны сакратар меў і іншых дарадцаў, так званых «людзей з квадратнымі тварамі і зоркамі на пагонах». У той час іх меркаваньне важыла нямала. Ня першы раз наверсе не прыслухоўваліся да прапановаў, ні пакаленьня дарадцаў, хоць яны абсалютна адпавядалі ўсяму палітычнаму мысьленьню й падыходам Гарбачова.

Гарбачоў ня быў да канца свабодным у прыняцьці рашэньняў. Ён ня быў і да канца пасьлядоўным у ажыцьцяўленьні сваіх намераў, якія, ня быўшы падмацаваныя канкрэтнымі дзеяньнямі і мэханізмам рэалізацыі, заставаліся толькі на паперы. Захад з энтузіязмам вітаў гэтыя новыя ідэі, затое яны далёка не заўсёды знаходзілі падтрымку ўнутры Савецкага Саюзу. Асабліва ўпарціўся ўсёмагутны партапарат. Ён устаў у маўклівую, але непрабівальную апазыцыю, асабліва на

[2] Новая палітыка адкрыта Гарбачова ня толькі з яе дадугледжвала ім, а таксама сьціраў на ўсіх узроўнях. У іншым назвы Ён кажаў, як казаў патрыярх нашага аддзелу Мікалай Рамбіеўскі – найразумнейшы чалавек. Ён суправаджаў Гарбачова падчас

пэрыфэрыі, дзе перабудова ды галоснасьць успрымаліся, хутчэй, як прыгожыя словы, чым праявы рэальнай палітыкі. Такая ж сытуацыя была і ў сацыялістычных краінах Цэнтральнай ды Ўсходняй Эўропы, дзе па-ранейшаму панавалі артадаксальны сацыялізм лідэраў старога пакаленьня.

Як мяркуе Здэнэк Млынарж, сукурсьнік Гарбачова па ўнівэрсытэце, адзін зь лідэраў «аксамітнай рэвалюцыі» ў Чэхаславаччыне і суаўтар «Хартыі-77», які ў тыя гады быў частым госьцем у Крамлі, «Брэжнеў моцна трымаў Гарбачова ў сваіх абдымках». Гарбачоў вельмі паблажліва ставіўся да сытуацыі ў сацыялістычных краінах і да памылак і спэцыфікі іхных камуністычных лідэраў. Насамрэч шмат хто зь іх, а магчыма і большасьць, ініцыявалі рэформы і падтрымліваліГарбачова выключна фармальна, баючыся, што інакш іх уласныя грамадзтвы знойдуць сваіх «гарбачовых». Прэзыдэнт Савецкага Саюзу ўнікаў крытыкаваць сваіх партнэраў (за некаторымі выключэньнямі, такімі, як Чаўшэску) і проста чакаў, пакуль яны не адыдуць ад улады празь біялягічныя прычыны. Такая пазыцыя Гарбачова была зразумелая, бо ён падкрэсьлена дыстанцыянаваўся ад любога кшталту ўмяшаньня ва ўнутраныя справы іншых краінаў і імкнуўся пазбавіцца ад звычкі сваіх папярэднікаў указваць людзям, што і як трэба рабіць, і ўжываць грубую сілу, калі «меншыя браты» не падпарадкоўваюцца. Аднак час працаваў ня толькі супраць артадаксальных лідэраў, але й супраць самога Гарбачова.

Вяртаючыся да афіцыйнага візыту, мне хацелася б зазначыць некалькі момантаў сустрэчы за зачыненымі дзьвярыма ў Нова-Агарове, бо, як кажуць амэрыканцы, «д'ябал крыецца ў дэталях». Асабліва хацелася б зьвярнуць увагу на тон неафіцыйных размоваў, што пасьля доўгага і стамляльнага дня перамоваў і прагляду знакамітага «Брыльянтавага запасу» ў Крамлі (ён моцна ўразіў Алену Чаўшэску) зацягнуліся далёка за поўнач. Толькі падчас шыкоўнай вячэры дыскусіі ацяхлі – дзякуй вытанчаным вінам, традыцыйнай «Сталічнай гарэлцы», ікры, шампанскаму, дэсэртнаму каньяку і каве (усё гэта адбывалася ў самы разгар знакамітай антыалькагольнай кампаніі).

аповяду, візыту Румынію ў 1987 годзе. Ён першы ж дзень маёй працы ў ЦК, у студзеня 1988 году, павітаўшыся з мной з расчыненых дзьвярэй свайго кабінэту, ён адразу ж паразіў, каб я як найхутчэй пазбавіўся сваіх кшталтоўскіх «малдавізмаў» і пачаў размаўляць на «сапраўднай бухарэсцкай мове». У мае абавязкі ўваходзіў аналіз разьвіцьця усходнеэўрапейскіх краінаў, падрыхтоўка прапановаў для кіраўніцтва і забесьпячэньне

«Я не такі ўжо гарачы прыхільнік Сталіна, – пачаў Чаўшэску, – але менавіта ён дабіўся перамогі над фашысцкай Нямеччынай, зрабіў Савецкі Саюз сусьветнай супэрдзяржавай і тым самым стварыў супрацьвагу магутнасьці Злучаных Штатаў сустрэчаў. Я трэба, што Савецкі Саюз і Камуністычная партыя толькі выйгралі б, калі б яе генэральны сакратар болей працаваў з праблемамі жыцьця краіны, ня ўлазячы ў праблемы замежнай палітыкі і гістарычныя пытаньні, напрыклад, разьвянчаньне культу асобы Сталіна». Намёк быў больш чым празрысты. У паветры павісла доўгая няёмкая цішыня. Я думаў, што Гарбачоў узарвецца – на надта ж балючы мазоль наступілі. Аднак тут першай знайшлася ягоная жонка Раіса. Гарбачоў адказаў другім, адказаў спакойна, але цьвёрда і непрыемна для Чаўшэску, які нават і не спрабаваў хаваць сваю сымпатыю да тырана Сталіна.

«Ці ведае генэральны сакратар Камуністычнай партыі Румыніі, што 95 працэнтаў свайго часу я прысьвячаю менавіта праблемам жыцьця краіны, якія назапасіліся за апошнія дзесяцігодзьдзі і не знаходзяць свайго вырашэньня? Стан эканомікі нашай дзяржавы катастрафічны, сельская гаспадарка перажывае працяглы заняпад, а прыродныя рэсурсы эксплюатуюцца неэфэктыўна. Толькі дзякуючы экспарту і выгаднай каньюнктуры сусьветнага рынку мы можам супрацьстаяць гэтаму крызісу... Але самая балючая праблема – гэта мінулае, што расстаўляе нам пасткі на кожным нашым кроку. Яно даўлее над сьвядомасьцю нашага народу. І пры дапамозе адміністрацыйных альбо дыктатарскіх, як некаторыя прапануюць, мэтадаў мысьленьня ня зьменіш».

Далей Гарбачоў перайшоў да тэмы раскрыцьця архіваў, што тычыліся культу асобы Сталіна, на прыкладзе ўласнага дзеда Панцялея Гопкалы. «Ён быў нарыхтоўшчыкам сельгаспрадукцыі ў сваім раёне. Яго арыштавалі, зьвінавацілі ў «контрарэвалюцыйным праватрацкісцкім апартунізьме» і катавалі. Нават пасьля гэтага ён быў сьвята перакананы, што Сталін нічога ня ведаў пра ўсе гэтыя злачынствы і што таварыш Сталін разабраўся б з тымі, хто іх дапускаў. Мільёны і мільёны такіх вось нявінных людзей верылі ў гэта». СССР быў тады на самай першай, «рамантычнай і наіўнай» стадыі сваёй эвалюцыі, і, дадаў Гарбачоў, пакуль «раскрыта толькі маленькая частка

жудасных матэрыялаў з архіваў сталінскіх часоў. Рэакцыю грамадзтва цяжка прадказаць». Ключавая фраза, якою Гарбачоў скончыў сваю прамову і на якой зрабіў асаблівы акцэнт, сталася прарочай: «Усе дыктатары, незалежна ад абставінаў і дзеяў, сканчаюць аднолькава – каля сьцяны гісторыі»[3]. Пасьля гэтай заўвагі Чаўшэску больш гэтай тэмы не кранаў.

«Калі я ня буду крытыкаваць цябе, дык хто…»

Ліпеньская 1989 году сэсія Кансультацыйнага палітычнага камітэту Варшаўскай дамовы ў Бухарэсьце, апошняя з падзеяў такога кшталту, уразіла мяне ня столькі сваёй напружанай і атмасфэрай, у якой усе лідэры сацыялістычных краінаў чакалі зьяўленьня нейкай магічнай формулы, што маўла б захаваць іх «рэч паспалітую», колькі выступам Чаўшэску, які заявіў, што гэтую формулу ведае. Гэта быў апошні крытыкаваць, што сабраў старых кіраўнікоў сацыялістычных краінаў Варшаўскага блёку.

Зараз я ўзгадаю тыя моманты, калі я прысутнічаў пры дыялёгу на прыватнай вячэры, якую сям'я Чаўшэску зладзіла для Раісы і Міхаіла Гарбачовых у сваёй рэзыдэнцыі «Прымавара» над цудоўным возерам у Бухарэсьце. Вокны былі зацягненыя цяжкімі расшытымі золатам парт'ерамі, а ў каміне зырка, нібы для сярэдзіны зімы, а не сьпякотнай летняй ноччу, палаў агонь. Генэральны сакратар Камуністычнай партыі Румыніі і ягоная жонка раскашавалі па-заходняму ў багатых вілах з паляўнічымі хаткамі, камінамі, запрудамі й басэйнамі ды іншымі радасьцямі жыцьця, у час, калі краіна, якой яны кіравалі, проста бедавала. Людзі вар'яцелі ад дэфіцыту элемэнтарных тавараў, таўкліся ў бясконцых чэргах па прадукты, трэсьліся ў страху перад спэцслужбамі. Міхаіл Гарбачоў цудоўна ведаў сытуацыю ў Румыніі, ведаў, што «залатыя часы» сканчаюцца. Гэта якраз і была адна з задачаў, што выконваў я й мае калегі – каб генэральны сакратар быў добра інфармаваны. Ён чытаў нашыя справаздачы перад кожнай сустрэчай. І вячэра ў «Прымавары» не была выключэньнем.

Чаўшэску спрабаваў пераканаць Гарбачова ў посьпехах

[3] 25 сьнежня 1989 году Ніжняй Алеўні Чаўшэску паставіць да сьцяны стол, адным з маленькіх гарадкоў пад Бухарэстам і расстраляюць па абвінавачваньні ў «злачынствах супраць румынскага народу».

румынскага сацыялізму, тлумачачы, што ён «сплаціў усе замежныя пазыкі датэрмінова», «вырашыў праблему жытла для кожнай румынскай сям'і», зьдзейсьніў «самую дэмакратычную мадэль самакіраваньня працоўных», ажыцьцявіў «адміністрацыйна-тэрытарыяльную рэформу», «упарадкаваў расьсяленьне насельніцтва» і што «зьменіць аблічча краіны безь ніякай там непатрэбнай шокавай тэрапіі, небясьпечных пераменаў і пераўтварэньняў». Дыктатару з Дамбовіты карцела даць крамлёўскаму госьцю навуку, як і што трэба зрабіць, калі той жадае «вярнуць Савецкаму Саюзу былы бляск і славу», выкарыстоўваючы як прыклад Румынію зь яе «пасьпяховым вырашэньнем сацыяльна-эканамічных праблемаў». Нікалае Чаўшэску браў на сябе ролю ня толькі гаспадара, але й мэнтара, настаўніка, «збаўцы» ідэяў і практык сацыялізму. І ўсе гэтыя тэндэнцыі яскрава выяўляліся на паседжаньнях Кансультацыйнага палітычнага камітэту Варшаўскай дамовы.

Гарбачоў ня мог не заўважыць усе гэтыя спробы. Як я і чакаў, ягоная рэакцыя была жорсткай і эмацыйнай. Часам мне падавалася, што я назіраю палітычнае шоў у тэатры абсурду: абодва лідэры размаўлялі адначасова, ня слухаючы адзін аднаго і не спрабуючы прыйсьці да нейкага кампрамісу. Я спрабаваў перакладаць зьмест заўваг Гарбачова як мага больш дакладна. Чаўшэску ж перакладаў ягоны пэрсанальны перакладчык Георге Стоіца.

«Я добра знаёмы з сытуацыяй ня толькі ў сябе ў краіне, але і ў Румыніі, – адказваў Гарбачоў. – Ці вы сапраўды думаеце, дарагі таварыш генэральны сакратар, што я ня ў стане зразумець, што я бачыў, напрыклад, 23 жніўня на фабрыцы, дзе рабочыя проста рабілі выгляд, што абсалютна задаволеныя сваім жыцьцём? Гэта ж была звычайная паказуха безь ніякага дачыненьня да рэчаіснасьці». Але чым больш сур'ёзнымі рабіліся заўвагі Гарбачова, тым больш нецярпеньня й дакору гучала ў адказах Чаўшэску, што, безумоўна, вельмі раздражняла савецкага лідэра.

«Нікалае... таварыш генэральны сакратар... – госьць безвынікова спрабаваў умяшацца ў бесьперапынны маналёг гаспадара. – Ты запрасіў мяне дзеля размовы ці каб я моўчкі

выслухоўваў твае разважаньні? Вось дык тэатар адзінага актора. Калі я ня буду крытыкаваць цябе, казаць табе праўду пра тое, што робіцца ў цябе ў краіне, дык хто? Хіба што Алена, жонка твая, можа дазволіць сабе крытыкаваць цябе... Больш у Румыніі такога сабе ніхто дазволіць ня можа», – казаў Гарбачоў. Алена Чаўшэску не змагла стрымаць тутака ўсьмешкі. Мне запомнілася мудрая заўвага Раісы Гарбачовай: «Міхаіл Сяргеевіч, супакойся, ты ж ведаеш, што гэта за чалавек...» Напрыканцы гэтай «сяброўскай» вячэры абодва бакі засталіся ў варожым настроі, а я выйшаў... галодны. Мне проста не было калі паспытаць ані тыя смачныя стравы, прыгатаваныя ў найлепшых традыцыях румынскай кухні, ані адборныя катнарскія віны.

З сваімі артадаксальнымі поглядамі на камунізм, з сваёй непрыхаванай варожасьцю да новай палітыкі адкрытасьці й галоснасьці, якую праводзіў Савецкі Саюз, Чаўшэску быў тыповым прадстаўніком таго блёку ястрабаў, што супрацьстаяў Гарбачову. Ён быў адным з тых камуністычных лідэраў, якія душылі ў сваіх краінах любыя праявы сымпатыі й цікавасьці да падзеяў у СССР. У тыя часы «сьвятло» для румынскага народу прыходзіла з усходу, а найбольш папулярнымі крыніцамі інфармацыі былі тэле- і радыёперадачы Малдовы. «Перабудова» інтэрпрэтавалася як акно ў новае жыцьцё, што Гарбачоў меўся прынесьці ў Румынію. У шматлікіх лістах, якія ішлі савецкаму лідэру з Румыніі, «румынскім Гарбачовым» называлі Іліеску. Чаўшэску адчуваў тое ж самае, менавіта таму ён і адсунуў Іліеску ад улады, загнаўшы яго у глухую правінцыю – у румынскую Малдову, што з самых розных пазыцыяў ацэньвалася як «выгнаньне без аніякага шанцу вярнуцца назад».

«Калі ня мы, дык хто? Калі не цяпер, дык калі?»

Гэтая фраза належыць генэралу Войцеху Ярузэльскаму, лідэру Польшчы, – аднаму зь лідэраў усходняй Эўропы, якія без ваганьняў падтрымалі «адкрытасьць і новае палітычнае мысьленьне» Гарбачова. Я меў прывілею сустрэцца зь ім падчас

дзьвюх важных падзеяў у сацыялістычнай гісторыі: падчас сьвяткаваньня 70-годзьдзя Расейскай рэвалюцыі (лістапад 1987-га) і падчас бухарэсцкага саміту ў ліпені 1989-га, пра які я ўжо пісаў вышэй. У яго было шмат супольнага з Гарбачовым: здольнасьць зразумець самую існасьць сытуацыі ў ягонай краіне і ва ўсім сацыялістычным блёку агулам, здольнасьць знаходзіць палітычныя рашэньні й прыходзіць да кампрамісаў, заснаваных на дыялёгу з апазыцыяй (круглыя сталы з прадстаўнікамі «Салідарнасьці» ў лютым–красавіку 1989-га); нежаданьне выкарыстоўваць грубую сілу ў крызісных сытуацыях, як рабілі ягоныя папярэднікі, кіруючыся «рэкамэндацыямі» Крамля, а таксама жаданьне абгрунтаваных рэформаў і дэмакратызацыі грамадзтва. Якраз Польшча і сталася палігонам для такога кшталту рэформаў.

Тут я хацеў бы зазначыць, што гаворка вядзецца пра рэформы ў межах адміністрацыйна-плянавай эканомікі, якія Гжэгаж Калодка, адзін з удзельнікаў круглых сталоў ураду і апазыцыі, былы першы віцэ-прэм'ер і міністар фінансаў у польскім урадзе, назваў «няўдалым пачаткам».

Ярузэльскі меў шэраг якасьцяў, што адрозьнівалі яго ад ягоных калегаў і асабліва ад Чаўшэску: інтэлект, эрудыцыя і ўменьне мужна глядзець у твар паразе, замест таго каб спрабаваць павярнуць кола гісторыі назад. Мяне ўражвала, што калі Ярузэльскі паціскаў табе руку, ён заўсёды глядзеў табе ў вочы, адзначаючы цябе сваёй асабістай увагай незалежна ад таго, хто ты і якую пасаду займаеш. Гэта яднала яго з Гарбачовым. Перакладчыкі ім былі ня трэба, Ярузэльскі свабодна размаўляў па-расейску. Усе гэтыя абставіны згладзілі працэс палітычных зьменаў у Польшчы на пачатку 1990-х, даючы прыклад для ўсіх астатніх краінаў, уключаючы сам СССР.

Стаўленьне сацыялістычных лідэраў да зьменаў у Савецкім Саюзе і спробаў надаць сацыялізму «чалавечае аблічча» праз адкрытасьць і галоснасьць стала лякмусавай паперкай для гэтых лідэраў, для іхнага адчуваньня сацыяльнай эвалюцыі й духовага абуджэньня сваіх нацыяў. Чым гучней выступаў Чаўшэску на пераможным зьезьдзе партыі, чым актыўней Хонэкер спрабаваў ізаляваць насельніцтва Нямецкай

Дэмакратычнай Рэспублікі ад уплыву савецкай перабудовы (якую ён лічыў выключна «зьменай шпалераў»), чым болей Жыўкаў спрабаваў падмяняць новую палітыку выключна касмэтычнымі зьменамі й пустымі заявамі, тым больш напружанай рабілася сытуацыя ў гэтых краінах і тым больш зразумелым рабілася грамадзтву, што падзеньне сацыялізму, выкліканае ягонымі ўнутранымі праблемамі і асабліва ягонай эканамічнай нястаннасьцю, зьяўляецца толькі справай часу. Падзеньне Бэрлінскай сьцяны ў лістападзе 1989 году, як і падзеі ў Румыніі і Баўгарыі, пацьвердзілі ўсе гэтыя тэндэнцыі.

Разбурэньне сьцяны мела, аднак, і іншыя значэньні. Паводле меркаваньня прыхільнікаў палітыкі сілы, якія складалі ў КПСС большасьць, гэтая падзея значыла ня што іншае, як паразу краіны празь пяцьдзясят гадоў пасьля перамогі ў Другой сусьветнай вайне. На часткі развальваўся ня толькі міт пра «гістарычную перавагу сацыялізму над капіталізмам», але і ўвесь савецкі блёк, што да гэтага лічыўся маналітным. Чакаўся канец Савецкага Саюзу – «імпэрыі, што зьбіралася, кропля па кроплі, больш за тысячу гадоў», як шчыра выказаўся падчас вячэры Віталі Варатнікоў, лідэр савецкай дэлегацыі на 14-м і апошнім зьезьдзе Камуністычнай партыі Румыніі ў 1989 годзе. Я суправаджаў яго на ўсіх сустрэчах, уключаючы сустрэчу з Чаўшэску. Падчас той паездкі было некалькі значных момантаў, якія асабліва запомніліся.

Перш за ўсё, дзівіў сваёй дурасьцю дэвіз падзеі: «Зьезд вялікіх перамог і трыюмфу сацыялізму, незалежнасьці й поўнага сувэрэнітэту Румыніі». Да развалу партыі й расстрэлу яе лідэра застаюцца лічаныя дні, але дэлегаты ўсё славяць Чаўшэску, перарываюць аплядысмэнтамі ягоную справаздачу 43 разы. На знакі ягонае жонкі й другога сакратара партыі Эміля Бобу ўся заля ператваралася ў шматгалосы хор, што славіў «улюбёнага кандукатара», «генія Карпатаў», «волата волатаў». Усяго праз тры тыдні, на масавым мітынгу, скліканым Чаўшэску ў мэтах «умацаваньня адзінства партыі з народам», дзясяткі тысячаў румынскіх грамадзянаў з той самай еднасьцю будуць пратэставаць супраць дыктатуры Чаўшэску. Прорва паміж камуністычным кіраўніцтвам і грамадзтвам дасягнула сваёй мяжы, выбух быў непазьбежны. Я добра зразумеў гэта падчас

зьезду.

Пры сустрэчы з Варатніковым, акрамя традыцыйнай гаворкі пра істотнасьць «замацаваньня перамог сацыялізму», «супрацоўніцтва і абмену вопытам», упершыню сам Чаўшэску прапанаваў лідэрам «брацкіх» партыяў склікаць сустрэчу ў вярхах для пошуку «вырашэньня супольных праблемаў камунізму», «абмеркаваньня і каардынацыі дзейнасьці ў імя рэвалюцыі й сацыялізму». «Мы павінны ісьці тым самым шляхам, што і Ленін у 1903 годзе. Мы павінны пачаць перш за ўсё з тых, хто жадае захаваць справу сацыялізму. Калі ня мы зробім гэта, дык хто?» – так ставіў пытаньне Чаўшэску. Гэта было тое самае пытаньне, што задаваў Ярузэльскі, але прагучала яно ў абсалютна іншым кантэксьце і зь іншымі мэтамі.

Было дзіўна пачуць гэтыя словы з вуснаў таго, хто больш як чвэрць стагодзьдзя заставаўся непаслухмяным дзіцем, «безнадзейным дысыдэнтам» камунізму, зьяўляючыся дэ-факта значна больш артадаксальным і адданым справе камунізму, чым большасьць зь ягоных калегаў, агрэсіўна душачы любога кшталту праявы незалежнасьці, апазыцыі. Пры Чаўшэску ўсе друкарскія машынкі да адной былі зарэгістраваныя ў «Сэкурытатэ», а пра любы кантакт з замежнікамі (нават грамадзянамі СССР) мусова было дакладваць у адпаведныя інстанцыі. І вось гэткую прапанову робіць той, хто не падтрымаў ваеннай інтэрвэнцыі краінаў Варшаўскай дамовы ў Чэхаславаччыну і хто заўжды меў асаблівае меркаваньне, адрознае ад пазыцыяў лідэраў іншых камуністычных краінаў. Упершыню я бачыў яго настолькі ўсхваляваным і стомленым. Рукі ў яго дрыжалі, а вочы блукалі з аднаго месца на другое.

Магчыма, ён адчуваў набліжэньне канца; гэта было заўважна падчас ягонага апошняга візыту ў Маскву 4 сьнежня 1989 году, падчас чарговай сэсіі лідэраў сацыялістычных краінаў – удзельніцаў Варшаўскага пакту, арганізаванай Гарбачовым пасьля ягонай сустрэчы з амэрыканскім прэзыдэнтам Джорджам Бушам-старэйшым на востраве Мальта.

«Здрада Гарбачова», «Рэвалюцыя, натхнёная КДБ», «Іліеску – агент Масквы»...

Я добра памятаю драматычныя падзеі ў Румыніі 22–25 сьнежня 1989 году. Па гарачай лініі мы трымалі сувязь з савецкім пасольствам і карпунктам агенцтва ТАСС у Бухарэсьце, зь міністэрствам замежных справаў, якім кіраваў Эдуард Шэварднадзэ, з Пэтру Лучынскім, які пазьней стаў першым сакратаром Камуністычнай партыі Малдовы, а тады апэратыўна дакладваў Гарбачову інфармацыю праз старшага дарадцу Георгія Шахназарава. У той час прэзыдэнт Гарбачоў удзельнічаў у сэсіі зьезду дэпутатаў Савецкага Саюзу і экспромтам адказваў на ўсе пытаньні, што тычыліся сытуацыі ў Румыніі і ягонага асабістага да яе стаўленьня.

З Бухарэсту паступала супярэчлівая інфармацыя, сытуацыя не была нам зразумелая. Пасольствам у адсутнасьць пасла Яўгена Цяжэльнікава (падзеі засьпелі яго на дарозе ў Маскву) кіраваў дарадца-пасланьнік Пазьнякоў, і яно не рашалася даваць нейкую канкрэтную інфармацыю і настойвала, каб Масква «не сьпяшалася з высновамі» і «не займала пакуль аніякай пазыцыі, бо элітныя часткі засталіся вернымі Чаўшэску і, ня выключана, неўзабаве могуць узяць сытуацыю пад свой кантроль». У сакрэтных тэлеграмах зьявілася яшчэ адна цікавая дэталька: Маскве рэкамэндавалася «не давяраць інфармацыі агенцтва ТАСС з Бухарэсту». Між тым якраз тады ўпершыню паведамленьні ТАСС у поўным аб'ёме цытавалі самыя значныя агенцыі сьвету (Reuters, Associated Press, France-Press ды іншыя). З інфармацыі ТАСС вынікала, што ў Румыніі адбываецца масавае паўстаньне, што дыктатар, ягоная партыя і спэцслужбы пераходзяць у разрад мінуўшчыны. Бюро ТАСС месьцілася ў самым цэнтры Бухарэсту і асьвятляла ўсе падзеі непасрэдна з плошчы, на якой яны адбываліся. Кіраўнік бюро, Думітру Дзьякаў (будучы старшыня Вярхоўнага савету Малдовы. – **Рэд.**), як і ўсе карэспандэнты, рызыкаваў ня менш, чым звычайныя дэманстранты. Адусюль стралялі. Патрэбная была мужнасьць, каб выйсьці з офісу і адсочваць рэальны ход падзеяў у сытуацыі, калі пасольства было катэгарычна супраць «пасьпешлівых высноваў». Мо Пазьнякоў быў і неблагім дыпляматам, але за час свайго знаходжаньня ў Румыніі (23

гады), што амаль супала з «залатымі часамі», ён зрабіўся занадта асьцярожным і ня мог даць веры таму факту, што «часы» гэтыя скончыліся, а зь імі й «пераможны марш сацыялізму». Але я магу абсалютна пэўна сказаць, што ён ня быў адзіны такі тады.

У гэтым кантэксьце мне хацелася б зьвярнуцца да некаторых мітаў, што тычацца падзеяў сьнежня 1989 году ў Румыніі і ва ўсім сацыялістычным лягеры ўвогуле, і якія дажылі нават да сёньня. Першы міт тычыцца «здрады Гарбачова» і таго, што «рэвалюцыю ажыцьцявіў КГБ СССР». Той доступ практычна да ўсёй інфармацыі ўнутры краіны, які я ў сваім статусе меў, дазваляе мне абвергнуць гэтую вэрсію. М. Гарбачоў быў лідэрам зусім іншага кшталту, ён радыкальна адрозьніваўся ад сваіх папярэднікаў.

Існавала безьліч сцэнароў, рэкамэндацыяў і прапановаў, якімі павінен быў скарыстацца Гарбачоў у выпадку крызіснай сытуацыі ў сацыялістычным лягеры. Прэцэдэнты былі ва Ўсходняй Нямеччыне ў 1953-м, Вугоршчыне ў 1956-м, пасьля ў Чэхаславаччыне й Польшчы. Гарбачоў адкінуў гэтую мадэль, заявіўшы, што «кожны сам зьяўляецца гаспадаром у сваім доме і павінен несьці абсалютную адказнасьць за ўсё, што ў ім адбываецца». Старая партыйная намэнклятура ўбачыла ў гэтым «мяккацеласьць» або «ваганьні», а прадстаўнікі сілавога лягеру адкрыта называлі гэта «здрадай». Пазьней, пасьля путчу 1991 году, яны зьвінавацяць яго таксама ў здрадзе Камуністычнай партыі й сацыялізму ўвогуле. Але маё асабістае меркаваньне палягае ў тым, што, калі й быў чалавек, які жадаў захаваць сацыялізм, даць яму другі шанец, дык гэтым чалавекам быў Міхаіл Гарбачоў. Аднак ён быў прадуктам сваёй сыстэмы, магчыма, самым лепшым, і таму імкнуўся абараніць яе. Жадаючы таго ці не, ён пацьвердзіў гэта ў той вечар, калі яго вызвалілі з Фаросу пасьля жнівеньскага путчу ў 1991-м. Ні разу нідзе Гарбачоў ня ставіў пад сумнеў ідэі сацыялізму, ён крытыкаваў толькі скрыўленьні сыстэмы ў самім СССР і ў яго сатэлітах.

Іншы даўгавечны міт тычыцца «экспарту рэвалюцыі агентамі КГБ». Гэта стала адной з тэмаў першай размовы паміж

Гарбачовым ды Іліеску, калі румынскі лідэр наведаў Маскву ў 1990 годзе. Я цудоўна памятаю атмасфэру той сустрэчы. Як яна кантраставала з сустрэчамі з папярэднікам Іліеску! Паміж двума лідэрамі не існавала псыхалягічнага бар'еру, яны не прытойвалі думак. Прэзыдэнт Іліеску прааналізаваў сытуацыю крызісу ў сьнежні 1989 году, калі быў створаны Фронт нацыянальнага выратаваньня. На ягоную думку, усё скончылася нечакана хутка; падзеі справакаваў сам Чаўшэску сваім скліканьнем «сустрэчы з народам». Панаваў неймаверны хаос. «Калі б існаваў нейкі замежны сцэнар, – працягваў Іліеску, – падзеі разгортваліся б больш арганізавана». Камэнтуючы гэтую тэму, Гарбачоў зазначыў, што было б проста абразай для румынскага народу і грамадзтва лічыць, што «рэвалюцыя была экспартаваная агентамі КГБ».

Тут мне б хацелася зрабіць невялічкае адступленьне: зерне гэтага міту ў сапраўднасьці пасеяў сам Чаўшэску, які быў пэўны, што за ўсімі дэманстрацыямі пратэсту стаіць Масква; ён нават заявіў гэта прадстаўніку савецкага пасольства, калі ў Тымішаары распачаліся акцыі пратэсту… Калі я наведваў Румынію пазьней, мне прыходзілася даказваць, што народ Румыніі і толькі ён павінен ганарыцца тым, што скінуў дыктатара. Мне ніхто ня верыў, так глыбока ўкаранілася ў сьвядомасьць вэрсія пра КГБ.

«Хто ня супраць нас – той з намі». Вугорскі «гуляш-сацыялізм»

Часам я задумваюся, што супольнага было ва ўсіх сацыялістычных лідэраў пэрыяду заняпаду камунізму і чаму ўсе яны так дамагаліся ўвагі Гарбачова, хоць шмат хто яго ненавідзеў лютай нянавісьцю, бо ён стаўся прычынай падзеньня як савецкае, так і іхных сыстэмаў. Існавала, як мінімум, тры тлумачэньні.

Сустрэцца з Гарбачовым, новым савецкім лідэрам, які захапіў усіх сваімі новымі ідэямі, які выпраменьваў культуру і інтэлект, што так моцна адрозьніваліся ад культуры і інтэлекту традыцыйных савецкіх лідэраў, які валодаў харызмай і

прывабнасьцю й мог выклікаць давер з самай першай сустрэчы, было ня проста «данінай модзе». Шмат якія заходнія лідэры разглядалі мажлівасьць наведаць Гарбачова ці прыняць яго ня проста вельмі істотнай падзеяй, але й пэрсанальным гонарам. Для лідэраў заходняй Эўропы такога кшталту сустрэча была добрай мажлівасьцю павысіць сваю самаацэнку. А вось для ўсходнеэўрапейскіх лідэраў такая сустрэча патрэбна была, каб суцішыць настроі, што пачыналі панаваць у іхных краінах: «Гарбачоў лічыцца з намі, ён ідзе тым самым шляхам, які мы прайшлі 15–20 гадоў таму».

Найбольш пасьпяховым у выбары моманту для фатаграфаваньня быў, мне падаецца, Чаўшэску. Нават падчас шматбаковых сустрэчаў ён мог «выпадкова» апынуцца побач з Гарбачовым і гэтаксама «выпадкова» румынскія фатографы рабілі здымкі двух лідэраў разам, з усьмешкамі на тварах. Часам адбываліся проста дзіўныя рэчы. Я суправаджаў Гарбачова падчас візыту ў Бухарэст і падчас візыту Чаўшэску ў Маскву, але ня мог адшукаць сябе ні на адным здымку ў афіцыйнай румынскай прэсе. Мае дасьведчаныя калегі раскрылі мне гэты «сакрэт»: усе фатаздымкі акуратна апрацоўваліся аэрографам такім чынам, каб ніхто іншы не зьяўляўся побач зь «вялікім правадыром». Мяне й маіх калегаў проста заціралі, замяшчалі мэбляй і шпалерамі. Усё гэта яскрава дэманструе сапраўдную існасьць партыйнай прэсы.

Але ўвагі патрабавалі і іншыя лідэры. Напрыклад, г. Гусак, чыя каманда, паводле словаў З. Млынаржа, пасьпяхова скончыла тое, што распачалі савецкія танкі, спыняючы ў 1968 годзе Праскую Вясну . Гусак забясьпечыў адносна высокі ўзровень жыцьця, вядома, высокі ў параўнаньні з Савецкім Саюзам. Ягонай галоўнай мэтай было захаваньне існага стану рэчаў. Дзіва што Гусак, як і астатнія, «горача» вітаў перабудову Гарбачова, але не рабіў абсалютна нічога, каб рэалізаваць гэтую палітыку на практыцы. Пазьней Гарбачоў заўважыў тую самую тэндэнцыю і ў самім Савецкім Саюзе. У чэхаў быў добры жарт у духу ўдалага ваякі Швэйка наконт дабрабыту і посьпехаў сацыялізму: «Чаму гэта сацыялістычны лягер можа здагнаць Злучаныя Штаты, але ня можа перагнаць? Бо мы не жадаем, каб амэрыканцы бачылі нашыя голыя задніцы».

Акрамя простай зацікаўленасьці ў сустрэчы з Гарбачовым была і іншая, значна больш празаічная, прычына – эканамічная зацікаўленасьць. Эканоміка ўсіх гэтых краінаў трымалася на нагах дзякуючы танным энэрганосьбітам і сыравіне з СССР. Узровень жыцьця, непараўнальна вышэйшы за савецкі, абсалютна не забясьпечваўся самімі краінамі. У дадатак да гэтага, на большасьці з сацыялістычных краінаў (за выключэньнем Румыніі) віселі велізарныя замежныя пазыкі, якія трэ было абслугоўваць. Паводле некаторых ацэнак, Масква штогод асыгнавала 10–15 мільярдаў даляраў датацыяў на падтрыманьне эканомікі Ўсходняй Эўропы ў дадатак да выдаткаў на ўтрыманьне сваіх вайсковых базаў на тэрыторыі гэтых краінаў[4]. Савецкае кіраўніцтва, уключаючы і самога генэральнага сакратара, меркавала, што сацыялістычны сьвет трэба захаваць любым коштам, нават коштам дабрабыту свайго ўласнага народу.

Спробы рэфармаваць сацыялізм, надаць яму «чалавечае аблічча», магчыма было бачыць, напрыклад, у Вугоршчыне. Традыцыйны дэвіз «хто ня з намі – той супраць нас» тут новае гучаньне: «хто ня супраць нас – той з намі». Вугоршчына пад кіраўніцтвам Янаша Кадара знайшла, магчыма, самую пасьпяховую формулю падтрымкі прыватнага сэктару, лібэралізуючы эканоміку і дэмакратызуючы грамадзтва. Міхаіл Гарбачоў выказваў асаблівую зацікаўленасьць гэтым экспэрымэнтам, поўнае разуменьне і падтрымку Я. Кадара.

У блізкіх адносінах паміж Гарбачовым, Кадарам і Ярузельскім не было нічога дзіўнага. Гарбачоў актыўна шукаў эфэктыўную эканамічную мадэль. Ён цудоўна разумеў, наколькі небясьпечна думаць, быццам паскораныя рэформы могуць зрабіць усіх заможнымі «за адну ноч». Ён разумеў цяжкасьці стварэньня новай эканамічнай сыстэмы. Папулярным афарызмам тых часоў была фраза «мы жадаем жыць, як пры капіталізьме, але працаваць, як пры сацыялізьме».

Сацыялістычнае грамадзтва чакала вынікаў (чытай – узбагачэньня), але не было падрыхтаванае несьці цяжар выдаткаў гэтых рэформаў; камуністычнае кіраўніцтва было

[4] Gedmin J. The Hidden Hand: Gorbachev and the Collapse of East Germany. – Washington: The AEI Press, D.C., 1992. P. 15.

гатовае прапагандаваць рэформы, але не за кошт адмовы ад «сацыялістычных ідэяў» (і свайго існаваньня). Урэшце, матэрыяльныя і фінансавыя рэсурсы для рэформы насамрэч былі вельмі абмежаваныя. Усё гэта прывяло да глыбокага расчараваньня грамадзтва вынікамі новай палітыкі й масавай падтрымкі электаратам тых, хто абяцаў хуткае аднаўленьне «сацыялістычных каштоўнасьцяў». Гэта таксама тлумачыць той факт, што на прэзыдэнцкіх выбарах у Расеі ў 1996 годзе за Гарбачова галасаваў менш за 1 працэнт (!) выбарцаў.

Вяртаючыся да жаданьня лідэраў краінаў-сясьцёр сустрэцца з Гарбачовым, я павінен занатаваць адну рэч, якую я змог зразумець дзякуючы яму толькі нядаўна. Падчас сустрэчы з былым сэнатарам Лі Гамільтанам, дырэктарам Цэнтру імя Вудра Ўілсана, ягоным штатам і навукоўцамі, уключаючы мяне самога, Міхаіл Гарбачоў падпісаў мне фатаздымак 15-цігадовай даўніны і прызнаўся: «Падчас нашай апошняй сустрэчы ў сьнежні 1989 году Чаўшэску шукаў суразмоўцу, у якога ён змог бы атрымаць чаканую падтрымку і разуменьне. Ён усьведамляў увесь той развал, да якога ён прывёў Румынію, але ня меў дастаткова мужнасьці, каб пачаць усё з самага пачатку, перагледзець і раскрытакаваць усё тое, што ён рабіў усе гэтыя гады. Ён жадаў прытулку, выратаваньня».

Чаўшэску, як і ягоныя сябры Хонэкер, Жыўкаў і Гусак, спадзяваліся знайсьці гэты прытулак у Гарбачову, падсьвядома трымаючыся прынцыпу «хто ня супраць нас – той з намі». Гарбачоў нічога ня меў пэрсанальна супраць іх, у яго хапала цярплівасьці выслухоўваць іх, але ён ніколі ня быў «зь імі».

А цяпер мне б хацелася зьвярнуцца да крыху менш вядомых аспэктаў палітыкі Гарбачова. Урокі падзеньня «разьвітага сацыялізму» ва Ўсходняй Эўропе (што была значна больш разьвітая за Савецкі Саюз) былі вельмі добра засвоены жыхарамі гэтых краінаў. Адразу ж пасьля падзеньня Бэрлінскай сьцяны падзеі пачалі разьвівацца драматычна і відовішчна. Краіны, яшчэ нядаўна «завязаныя» на Варшаўскай дамове, пераўтварыліся ў сапраўдныя дэмакратыі й пасьпяхова праводзілі непадробныя рынкавыя рэформы. Сёньня гэтыя краіны цешацца падтрымкай і дапамогай Захаду, большасьць зь

іх уступіла ў NATO – што 15 гадоў таму здавалася зусім неімаверным! У той жа час былыя савецкія рэспублікі знаходзяцца на цяжкім шляху ў пошуку сваёй нацыянальнай ідэнтычнасьці, спрабуючы дэмакратызаваць свае грамадзтвы і рэфармаваць эканоміку. Яны рухаюцца мэтадам «спробаў і памылак» і ў пэўнай ступені паўтараюць досьвед усходняй Эўропы. Вось чаму так істотна ведаць гэты досьвед, каб не паўтараць памылак.

«Не падабаецца мне твой Гросу»

Фраза гэтая належыць Гарбачову; ён сказаў мне гэта ў 1989 годзе падчас абеду ў Бухарэсьце. Я сядзеў побач зь ім, перакладаючы ўсё, што казаў Чаўшэску і ўстаўляючы час ад часу пэўныя камэнтары. Гарбачоў быў чалавекам адкрытым, дэмакратычным і даступным у рамках тагачаснага істэблішмэнту. Ён запытаўся, ці падобныя нацыянальныя кухні Румыніі й Малдовы, якія існуюць культурныя, лінгвістычныя і сацыяльныя падабенствы паміж краінамі, якое маё меркаваньне наконт агульнага разьвіцьця Малдовы. У пэўны момант ён зазначыў: «Насамрэч у вас шмат супольнага, але, тым ня менш, вы розныя». У мяне хапіла сьмеласьці адказаць яму ў тым жа ключы: «Разнастайнасьць ёсьць прычынай таго, што мы жадаем ведаць адзін аднаго лепей, каб урэшце адчыніць усе дзьверы і зламаць усе бар'еры, што былі ўсталяваныя гады таму паміж берагамі ракі Прут». Я сказаў яму, што візыт генэральнага сакратара ў Кішынёў змог бы шмат у чым дапамагчы, зазначаючы, што ў Малдове яго паважаюць настолькі ж моцна, як і ў Румыніі. Ён адказаў, што аднойчы ўжо зьбіраўся прыехаць у Малдову. Ён прасіў сабраць інфармацыю наконт атмасфэры і сытуацыі ў Малдове, каб «зрабіць пэўныя высновы наконт мясцовага партыйнага кіраўніцтва».

Ён зрабіў свае высновы празь некалькі месяцаў, замяніўшы Сымона Гросу Пэтру Лучынскім, які пазьней вярнуўся ў Маскву ў якасьці сакратара ЦК. Пасьля путчу ў жніўні 1991-га Лучынскі, якому даручылі ліквідацыю партыі, стаўся сапраўдным «магільшчыкам Камуністычнай партыі Савецкага Саюзу». На жаль, Гарбачоў так і не наведаў Кішынёва. У выніку

ён ня здолеў прадухіліць некаторыя гістарычныя падзеі – падзел рэспублікі сэпаратысцкімі сіламі з усімі жудаснымі наступствамі для сувэрэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасьці Малдовы, а таксама для бясьпекі й стабільнасьці ўсяго рэгіёну.

Паводле Сораса, самая вялікая памылка Гарбачова палягала ў тым, што ён ня змог зразумець: «Палітычныя зьмены былі неабходныя, але недастатковыя для таго, каб адбыліся зьмены эканамічныя»

Джордж Сорас, якога я меў прывілею ведаць пэрсанальна і карыснымі парадамі якога я скарыстаўся ў сярэдзіне 1990-х, лічыў, што «новае палітычнае мысьленьне» й ягонае ўжываньне ў міжнародных адносінах былі найбольш моцнымі бакамі гарабачоўскай палітыкі адкрытасьці. Паводле Сораса, самая вялікая памылка Гарбачова палягала ў тым, што ён ня змог зразумець: «Палітычныя зьмены былі неабходныя, але недастатковыя для таго, каб адбыліся зьмены эканамічныя. Разуменьне дэмакратыі Гарбачовым было наіўнае: проста дай людзям мажлівасьць вырашаць, і яны будуць прымаць правільныя рашэньні. Але справы ня робяцца кансэнсусам»[5]. Амэрыканскі філянтроп меў абсалютную рацыю. Перабудова была галоўнай справай Гарбачова, але яму было вельмі цяжка дамагчыся посьпеху, калі, з словаў самога генэральнага сакратара, «85 працэнтаў партыйнага апарату былі супраць ягонага курсу». Я вельмі добра зразумеў гэта падчас сваіх паездак у Малдову і Армэнію.

У кастрычніку 1989 году я зноў апынуўся ў Малдове, дзе нацыянальнае адраджэньне, асабліва ў галіне культуры і мовы, ужо пачалося. Тым ня менш, мясцовае партыйнае кіраўніцтва працягвала адказваць на патрабаваньні мірных дэманстрацыяў традыцыйным «не», «не» і яшчэ раз «не». Яны бачылі сваю ўлоўленымі гэтымі праявамі незадаволенасьці падкопы «нацыянальных экстрэмістаў» і вінавацілі Гарбачова за тое, што ён перапусьціўся «такога разгулу свабоды слова й дэмакратыі».

[5] Soros G. Opening the Soviet System. London: Weidenfeld and Nicolson, 1990. P. 105.

Падчас маіх сустрэчаў я зразумеў, што «новае палітычнае

мысьленьне» віталі простыя людзі і інтэлігенцыя, але зусім не прымалі намэнклятура й чынавенства. Але апазыцыя Гарбачову была ня толькі пасіўнай. Калі інтэлектуалы і студэнты ўтварылі Народны Фронт, што аб'яднаў вакол сябе ўсе прадэмакратычныя сілы ў падтрымку перабудовы, зь іншага боку быў створаны Інтэрфронт, што зьяднаў рэакцыйныя, антыгарбачоўскія сілы пад лёзунгамі «салідарнасьці й пралетарскага інтэрнацыяналізму». У піку дэманстрацыям прыхільнікаў дэмакратыі прадстаўнікі «працоўных калектываў» арганізоўвалі свае ўласныя дэманстрацыі, і аніводны бок не жадаў кампрамісу.

Пад канец сваёй паездкі я меў сустрэчу зь першым сакратаром малдаўскай кампартыі с. Гросу. Я паінфармаваў яго пра ўсё, што пабачыў, пра свае ўражаньні й высновы; а пасьля гэтага я амаль паўтары гадзіны слухаў пра «цудоўныя дасягненьні» сацыялістычнай Малдовы ў «мэханізацыі сельскай гаспадаркі – гэтай шашы прагрэсу», а таксама пра пляны пабудовы двух заводаў дзеля вырабу віна і шампанскага, якія «вы зможаце пабачыць наступным разам проста з акна кішынёўскага ЦК». Я пачуў пра пляны пабудовы атамнай электрастанцыі на Днястры пад Грыгарыёпалем, калі толькі «Дзяржплян у Маскве выдзеліць грошы на гэты праект». Аніводнага слова аб рэальнай сытуацыі, аб пратэстах, аб сапраўдных праблемах, зь якімі сутыкнулася грамадзтва, ані пра палітыку галоснасьці і якім чынам «камуністы і народ Малдовы» зьбіраюцца ажыцьцявіць яе на практыцы. Тады я ўзгадаў словы Гарбачова, што ён сказаў паўгоду раней: «Не падабаецца мне твой Гросу. Калі я зь ім размаўляю, ён з усім пагаджаецца і, падаецца, падтрымлівае палітычную лінію Гарбачова. Але насамрэч ён альбо нічога ня робіць, альбо робіць усё наадварот». Ён меў рацыю.

Шанец знайсьці супольную глебу, прадухіліць разьяднаньне Малдовы, а праз гэта ўтварэньне сэпаратысцкай пачварыны – Прыднястроўя – усё яшчэ быў. У маіх справаздачах па выніках гэтых паездак, што, як я ведаю, дасягнулі-такі кабінэту генэральнага сакратара без аніякіх правак (выпадак, насамрэч, вельмі рэдкі)[6], я называў асобу, якая магла б супакоіць сытуацыю й прадухіліць рост канфрантацыі, – Міхаіла

Сяргеевіча Гарбачова. Ён яшчэ мог прывесьці супрацьлеглыя бакі да цывілізаванага дыялёгу. Празь некалькі дзён я даведаўся, што Гарбачоў вырашыў наведаць Малдову. Былі падрыхтаваныя ўсе неабходныя матэрыялы і падрабязная праграма. У аэрапорт Кішынёва прыляцелі тры грузавыя самалёты з аўтамабілямі і абсталяваньнем для забесьпячэньня бясьпекі. Малдаўскія дзяўчынкі ў нацыянальных строях ужо чакалі генэральнага сакратара ў аэрапорце з традыцыйным хлебам і сольлю, а сам Кішынёў стаяў на галаве. На жаль, нешта здарылася, як гэта заўсёды бывае. У самы апошні момант Гарбачоў адмяніў паездку з парады маршала Сяргея Ахрамеева, дэпутата, які прадстаўляў Малдову ў Вярхоўным савеце СССР. «Там няма чаго рабіць, Міхаіл Сяргеевіч; яны [малдаване] усе нацыяналісты, якія толькі й чакаюць, калі будуць адкрытыя межы, каб аб'яднацца з Румыніяй». Я сутыкнуўся з гэтым аргумэнтам і крыху пазьней, пачуўшы яго ад яшчэ аднаго з дарадцаў Гарбачова.

Пасьляслоўе: «Не вяртайцеся ў мінулае. Не губляйце шанец, падораны вам гісторыяй»

19 жніўня 1991 году, у дзень путчу ў Маскве, я знаходзіўся ў Кішынёве, у будынку Цэнтральнага камітэту партыі Малдавіі. З супрацоўнікі й кіраўніцтва, зь якімі я сустракаўся ўпершыню, былі ў найлепшай гуморы; яны не маглі схаваць сваіх пачуцьцяў. Але радасьць ад таго, што «нашы людзі» зноў вяртаюцца да ўлады, доўжылася толькі тры дні. Тыя, хто навука была завучаная добра: дэмакратыя й рэформы вымагаюць доўгага й цяжкога шляху, які абсалютна не гарантуе посьпеху і плёну за адну ноч.

Шмат чаго зьмянілася за апошнія пятнаццаць гадоў.

Грамадны будынак, у якім разьмяшчаўся ЦК Кампартыі Малдовы, пабудаваны паводле пляну Івана Бодзюла, вернага пасьлядоўніка Леаніда Брэжнева, які васямнаццаць гадоў кіраваў краінай у якасьці першага сакратара, быў рэстаўраваны. Сёньня ў ім месьціцца парлямэнт краіны. Ня так даўно, у дзень свайго 85-годзьдзя Бодзюла ўганаравалі

6 Адзін з Малдаўскіх прыяцеляў, якіх ён часта: «Перш чым Бога менш, дабярэсься, цябе сьвятыя зьядуць».

Тое самае я магу сказаць і пра сябе, звычайнага супрацоўніка Аддзелу замежных сувязяў, якому

найвышэйшай узнагародай краіны – мэдалём Рэспублікі Ягоная атрымаў з рук прэзыдэнта Ўладзімера Вароніна, які ўзяў яшчэ адначасова і першым сакратаром кіроўнай Камуністычнай партыі Малдовы. Цікава, што Бодзюл атрымаў свайго вяршыня, «леніна» 25 гадоў таму, прыкладна ў той самы час, перш Чаўшэску…

У лістападзе 1995-га я ўдзельнічаў у міжнароднай канфэрэнцыі ў Маскве, арганізаванай Фондам Гарбачова і прысьвечанай тэме «Расея і Ўсходняя Эўропа: у пошуках новай ідэнтычнасьці». На канфэрэнцыю я быў запрошаны разам з прадстаўнікамі зь іншых краінаў. Падчас перапынку я папрасіў Міхаіла Гарбачова падпісаць мне экзэмпляр ягоных мэмуараў «Жыцьцё й рэформы». Я запытаўся ў яго, што б ён зрабіў, калі б была мажлівасьць пачаць усё з самага пачатку, і ці спраўдзіліся ягоныя прадказаньні наконт тых падзеяў, што адбыліся ў Расеі і іншых савецкіх рэспубліках пасьля ягонай адстаўкі. Ягоны адказ быў адначасова і чаканы, і нянаджаны: «Я ўпэўнены, што сацыялізм можна было перабудаваць, не ўхіляючыся ад рэформаў і радыкальных зьменаў інстытуцыйнага характару, скіраваных на стварэньне якасна новай сыстэмы. Тое, што мы сёньня назіраем у Расеі, дый ня толькі ў Расеі, – гэта спроба вярнуцца ў мінулае. І таму мая парада наступная: не спрабуйце вярнуць мінулае; шукайце свой уласны шлях, што адпавядае вашаму ўласнаму досьведу, культуры і мэнтальнасьці вашага народу. Не губляйце шанец, падораны вам гісторыяй...»

Вашынгтон, травень 2003 году

Пераклаў са скарачэньнямі з ангельскай мовы Віктар Прастакоў.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 5 (39) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/05
[image]

[image] [image] [image]

Аляксандар Грыцанаў Гарбачоў, убачаны з постмадэрну

АЛЯКСАНДАР ГРЫЦАНАЎ
філёзаф, публіцыст «Белорусской газеты». У сфэру ягоных зацікаўленьняў уваходзяць філязофіі постмадэрну, псыхааналізу, марксізму; псыхалягічная школа ў сацыялёгіі, параўнальнай літаратуры, міжнацыянальных адносінах, філязофская кампаратывістыка. Рыхтуе кандыдацкую дысэртацыю «Слова ў сістэме современной философии. Постмодернизм», якія выйшлі в кавецкага

Почему все так вышло? И будет ложью
на характер свалить или Волю Божью.
Разве должно было быть иначе?
Мы платили за всех, и не нужно сдачи.

Іосіф Бродзкі

У самым канцы 1980-х гг. многім у СССР і за яго межамі здавалася, што яшчэ зусім крыху, і краіна стане ліберальнай эўрапейскай дэмакратыяй. Але Гарбачоў ня даў радасьць, якія паўсталі ў часе рэформаў. Савецкі Саюз ня стаў дэмакратычнай дзяржавай, ня стаў і фрагмэнтам атлянтычнай лібэральнай супольнасьці. Больш за тое, дзяржава з такой назвай бясслаўна зьнікла з мапы сьвету. Свабода слова, некаторы час прысутная на прасторы канаючай камуністычнай імпэрыі, была імкліва згорнутая: ва ўсіх краінах, што ахапілі піетэт да яе «слаўных традыцыяў», адноўлена жорсткая цэнзура. Эканоміка (як і сама дзяржава) працягвае заставацца ва ўласнасьці бюракратыі, карупцыя не перастае разьвівацца, самыя падмуркі дзяржаўнасьці былой імпэрыі. Захаваць грамадзкай цікавасьці да лёсу і дзеяньняў апошняга кайзеліка

рэфарматара не ў апошнюю чаргу абумоўлена вось другім нявырашанасьцю агучаных пры ім задачаў.

[image] Сам па сабе кар’ерны ўзьлёт М. Гарбачова, шмат у чым выпадковы (адыграў прынцып рыбы-прыліпалы пры Ю. Андропаву), яшчэ раз пацьвердзіў сумную практыку камуністычнага рэжыму: тут хто заўгодна можа стаць кім заўгодна. Калі падфарціць. Калі ня высунецца раней часу. Калі ад пачатку прыме ўсе правілы гульні навакольнага сьвету – нават самыя цынічныя.

Былы памочнік камбайнэра стаў кіраўніком партыі і дзяржавы. І прывёў іх да гібелі. «Заўсёды і амаль ва ўсіх удаецца тое, чаго ніхто не жадаў», – пісаў Энгельс. Тут гэта ажыцьцявілася ў найвышэйшай ступені.

Такой духоўнай вольніцы, як пры Гарбачову, Расея ня ведала ніколі: камуністычнай цэнзуры ўжо не было, бюракратычных абмежаваньняў яшчэ не было. Усім можна было ўсё: шараговы інжынэр аднекуль з Поўначы – дэпутат Абаленскі – удзельнічае ў гістарычных гонках за права быць афіцыйным лідэрам грамадзтва. Духоўныя айцы Прыбалтыкі прапануюць людзям падпісацца пад патрабаваньнем надаць тром дзяржавам Балтыі нацыянальны сувэрэнітэт. «Каапэратывы» пераплюнулі вайскова-прамысловы комплекс сваімі амбіцыямі і самаўпэўненасьцю. «Свабода прыходзіць аголеная», такой яна і явілася агаломшаным грамадзянам камуністычнай імпэрыі: яшчэ не было ні засільля спэцслужбаў, ні самадурства алігархаў, ні ангажаванасьці прадстаўнікоў правапарадку, ні крымінальнага бязьмежжа.

Час Гарбачова ўскрыў амаль усе праблемы айчыннага «заўтра». Прыгадаем заклікі Шэварнадзэ быць пільнымі й гатовымі супрацьстаяць дыктатуры, прыгадаем незаслужана забытыя сюжэты «Взгляда», прыгадаем усё тое самае – толькі крыху больш стрыманае – у духоўнай атмасфэры нашай айчыны, Беларусі.

На якую ж «гаспадарку» прыйшоў Гарбачоў і якую краіну ён спрабаваў сьпярша захаваць, а пазьней з палёгкай яе адрокся?

[image] Ягоная апошняя публікацыя ў «ARCHE» – «Разброд і хістальні афіцыйнай навукі» ў № 4/2005.

«Эпоха» апошняга генэральнага сакратара ЦК КПСС – Гарбачова – па часе прасьціраецца болей за пэрыяд ягонага непасрэднага валоданьня вярхоўнай уладай у СССР (1985–1991 гг.). Яшчэ на працягу двух гадоў (1991–1993) Б. Ельцын працягваў (у «расстрэльным» фармаце) палітычную лінію Гарбачова на ліквідацыю ўсёпранікальнага ўплыву ў РФ артадаксальна-камуністычных і сілавых структураў, непадкантрольных цэнтру. Толькі па меры старту Вялікага Перадзелу Ўласнасьці (пасьля падзеяў кастрычніка 1993 г.) ельцынская сыстэма пачала бурліва разьвівацца, адштурхоўваючыся ўжо ад уласных палітычных установак і эканамічных прыярытэтаў. Задача ж цяперашняга пуцінскага кіраваньня – як гэта ўжо неаднойчы адзначалася, – *«забясьпечыць непарушнасьць вынікаў вялікай прыватызацыі 1993–2000 гг. на кароткім гістарычным адрэзку часу, дастатковым для таго, каб выгоданабывальнікі прыватызацыі змаглі прадаць свае асноўныя актывы за рэальны рынкавы кошт і легалізаваць атрыманыя сродкі на бясьпечным і ўтульным Захадзе»* (Станіслаў Бялкоўскі). Драматургія разьвіцьця сучаснай Расеі і шмат у чым – на жаль! – навакольнай прасторы СНД ёсьць наступствам двух этапаў уладных гульняў у Маскве: 1) «паўзучай» палітычнай рэвалюцыі Гарбачова і 2) «абвальнай» эканамічнай рэвалюцыі Ельцына.

Найноўшая гісторыя цывілізаваных грамадзтваў эўрапейскага кшталту пішацца на базе жорстка выбудаванай, дастаткова аўтаномнай і прынятай усімі грамадзянамі сыстэмы захаваньня адпаведных сьведчаньняў. Яна ўлучае, да прыкладу, абавязковае стэнаграфаваньне ходу нарады ў прэзыдэнта ЗША, улік матэрыялаў незалежнай гаспадарчай статыстыкі і да т. п. У культуры Захаду, разам з гэтым, прысутнічае глябальная згода адносна герархіі сыстэмы каштоўнасьцяў, што зьмяшчаюцца ў падмурку гістарычных рэканструкцыяў. Уцямнае ж аднаўленьне сцэнароў эвалюцыі Савецкага Саюзу не ажыцьцявіць без папярэдняй выпрацоўкі тых ці іншых «кансэнсусных» дамоўленасьцяў: што лічыць «дабром» і «ліхам», «прагрэсам» і «рэгрэсам», а таксама «посьпехамі» для «краіны» і «дзяржавы».

Немагчыма пераканаўча і вычарпальна адлюстраваць фэномэн

Гарбачова – гэта будуць, у лепшым выпадку, творчыя ўдачы/няўдачы. Важна імкнуцца не паўтараць памылак тых, хто паверыў у яго, у яго высакамоўнасьць, у ягоную перакананасьць у ажыцьцяўленьні руху «камуністы за дэмакратыю» (альбо, дакладней, «ваўкі за вэгетарыянства»). Існуюць гістарычныя задачы, непад'ёмныя нават для геніяў ля трону.

Першым сыстэмным напружаньнем у арганізацыі Саюзу ССР, якое спрабаваў, але ня змог пераадолець Гарбачоў, былі эканамічная і культурная неаднароднасьць розных тэрыторыяў дзяржавы. Як да ўмоваў Расейскай Імпэрыі, то тэарэтык анархізму М. Бакунін яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. празорліва адзначыў: «Для свайго захаваньня ў цяперашніх межах нашая дзяржава вымушана будзе заставацца самадзяржаўнай манархіяй». Непазьбежна ўласьцівая любой імпэрыі спакуса да бязьмежнага пашырэньня жыцьцёвай прасторы, калі рух вонкі замяняе ўнутранае разьвіцьцё, год ад году адсоўвала насьпелыя і перасьпелыя рэформы ўнутранага жыцьця і замінала грунтоўнаму ўладкаваньню цэнтральных губэрняў «мацерыка-мэтраполіі». Гэта асабліва адлюстравалася ў выраджэньні насельніцтва і прасторы «нечарназёмных вобласьцяў» Расеі.

Бальшавікі – пасьля прыходу да ўлады – пагоршылі гэтую сытуацыю. Пацярпеўшы фіяска ва ўкараненьні ў Сярэдняй Азіі і Закаўказьзі масавага сьветагляду, фундаванага пралетарскай, клясавай асновай, ідэолягі бальшавізму зьдзейсьнілі кардынальны ідэалягічны паварот. Яны жорстка зьвязалі (упершыню ў сусьветнай гісторыі) нацыянальную ідэнтычнасьць з тэрытарыяльным топасам: нацыі ў СССР пачалі канструявацца ў якасьці тэрытарыяльных утварэньняў. У аспэкце ідэі аб непазбыўным канфлікце «культураў» і «цывілізацыяў» сэнс крывавай бальшавіцкай рэвалюцыі ў Расеі можа быць інтэрпрэтаваны як сілавая замена руска-расейскай «культуры» касмапалітычнай камуністычнай «цывілізацыяй». Экстэнсіўнае тэрытарыяльнае разьвіцьцё, існаваньне ў складзе СССР рэгіёнаў, якія знаходзяцца на розных узроўнях і рэальна адносяцца да розных цывілізацыяў, пакінула ў спадчыну рэжыму Гарбачова выключную неаднароднасьць «савецкага народу» ў эканоміцы, якасьці сацыяльных адносінаў,

культурных традыцыяў. Гетэрагеннасьць соцыякультурнай сфэры Савецкага Саюзу была, найперш, абумоўлена разьмяшчэньнем на яе тэрыторыі розных цывілізацыйных, этнакультурных, рэлігійных формаў. У канцы XX ст. (як і ў ягоным пачатку) у імпэрскіх уладаў Расеі – СССР «не было ні найменшага шанцу вырашыць нацыянальнае пытаньне. Яно перакрывала ўсе шляхі эвалюцыі рэжыму, бо лібэральная, дэмакратычная, прагрэсіўная альтэрнатыва, што ўяўляе сабой магчымае разьвязаньне іншых праблемаў, не дае рашэньня нацыянальнага пытаньня і ў выніку прыводзіць да распаду імпэрыі» (А. Бэзансон).

Менавіта гэтая цывілізацыйная неаднароднасьць краіны саветаў садзейнічала правалу сацыялістычнага варыянту палітыкі перабудовы, якая праводзілася партыйным кіраўніцтвам на чале з Гарбачовым і выклікала моцнае ўнутранае напружаньне і ў постсавецкай Расеі. Гэтае напружаньне магло быць большае ці меншае, праяўляцца як у палітычных – легальных і негвалтоўных, – так і ў гвалтоўных – нелегітымных – формах. Але зь цягам часу неабходнасьць падтрыманьня фізычнага цела імпэрыі ва ўсё большай ступені абмяжоўвала эфэктыўнасьць, глыбіню і радыкальнасьць мадэрнізацыйных трансфармацыяў у рамках як імпэрскай, так і лібэральнай мадэлі. Імкнучыся мадэрнізаваць дзяржаўную машыну (з мэтамі захаваньня за СССР статусу вялікай дзяржавы), Гарбачоў быў вымушаны адмаўляцца ад лібэральна-рэфарматарскіх праграмаў. Апошнія ж, сапраўды, былі здольныя вырашыць усе сацыяльным праблемы – але коштам распаду імпэрыі.

Усякае грамадзтва знаходзіцца ў адным з трох станаў: «разьвіцьцё», «стагнацыя», «крызіс». Пачатак стагнацыі ў СССР правамоцна датаваць мяжой 1960-х – 1970-х гг. Асваеньне новых нафтавых радовішчаў дазволіла ў пэўнай ступені кампэнсаваць неэфэктыўнасьць савецкай сыстэмы яшчэ на працягу прыблізна двух дзесяцігодзьдзяў. Акрамя палітыкі «лякальных рэпрэсіяў» і вялых касмэтычных паляпшэньняў асобных элемэнтаў дзяржаўнага мэханізму была заўважная патэнцыйная схільнасьць кіроўных колаў КПСС да ўзнаўленьня імпэрскай мадэрнізацыі. Усім стала відавочна, што ў фармаце

стагнацыі адставаньне СССР ад разьвітых дзяржаваў Захаду толькі ўзрастала. Ю. Андропаў, пераемнікам якога хутка стаўся Гарбачоў, быў схільны да правядзеньня чарговага этапу мадэрнізацыі ў імя кансэрвацыі імпэрыі, але ў яго не засталося для гэтага часу: на пасадзе генэральнага сакратара ЦК КПСС ён быў каля году.

У цэлым можна ахарактарызаваць палітыку кіраўніцтва СССР да 1985 г. як дастаткова кансэрватыўную, накіраваную на захаваньне існуючага стану рэчаў. Радыкальна адрозьніваецца ад гэтага пэрыяду бясчасься пэрыяд кіраваньня М. Гарбачова, які зрабіў апошнюю спробу ажывіць сыстэму, надаць ёй пэўную гнуткасьць і канкурэнтаздольнасьць у адносінах да тадышняга гістарычнага суперніка камунізму – заходняй цывілізацыі. Гэта была запозьненая і шмат у чым імправізацыйная спроба выкарыстаць лібэральную мадэль для працягу гістарычнага існаваньня савецкай сыстэмы. Аднак калі лібэральныя элемэнты, прыўнесеныя ў соцыякультурную сфэру жыцьця краіны, сталі фармавацца ў альтэрнатыўную сыстэму, сытуацыя выйшла з-пад кантролю ініцыятараў перабудовы. У сілу як аб'ектыўных, так і суб'ектыўных прычынаў прагнілы савецкі рэжым рассыпаўся разам зь ягонымі рэфарматарамі, далейшыя радыкальныя зьмены былі непазьбежныя. Як прароча казаў М. Бярдзяеў: «Гіне Расейская імпэрыя. І гэтак жа загінуць усе імпэрыі, якія будуць калі-кольвек створаныя». Распад Савецкага Саюзу быў выкліканы ў большай меры прычынамі аб'ектыўнымі, суб'ектыўныя прычыны адыгрывалі, хутчэй, дапаможную ролю. Імпэрыі ня вечныя, распад СССР быў шмат у чым прадвызначаны яшчэ да падзеяў жніўня–сьнежня 1991 г., калі адбывалася ўсё большая радыкальная дэвальвацыя цэмэнтуючай дзяржаву камуністычнай ідэалёгіі.

На жаль, трагізм крушэньня сфэры пражываньня «адзінай інтэрнацыянальнай еднасьці – савецкага народу» не рабіў разумнейшай расейскую інтэлігенцыю. Парадаксальна, але факт: духоўныя лідэры нацыянальных ускраін (ад Эстоніі да Грузіі з Казахстанам) дакладна адрэфлексавалі гістарычны вырак, вынесены гісторыяй апошняй імпэрыі XX ст. Фармат «малых» альбо «сярэдніх» дзяржаваў, якія не прэтэндуюць на ролю самадастатковых геапалітычных гульцоў, у XXI ст. зручны

і выгадны. Не азадачылася дадзенай праблемай толькі фармальна самая прасунутая інтэлектуальная эліта – маскоўская чыноўніцкая бюракратыя і акадэмічна-вэнэушная прафэсура. Для публікі такога кшталту задача «адраджэньня велічы Расеі» непарыўна злучаная з аднаўленьнем чыста імпэрскіх стасункаў з бліжэйшымі і – у пэрспэктыве – аддаленымі суседзямі. «Черного кобеля не отмоешь до бела» – любы маскоўскі «аналітык» лічыць магчымым пры любым зручным выпадку заклікаць да аднаўленьня Расеяй уласнага статусу імпэрскай «мэтраполіі». На гэтым і зламаўся, і ня мог не зламацца Гарбачоў-рэфарматар. Іншы ж Гарбачоў – Гарбачоў-гаспадар – ужо відавочна адчуваў непрыдатнасьць чалавечага і тэхналягічнага патэнцыялу для працягу фармату канкурэнцыі з Захадам.

Ініцыятары «перабудовы» хацелі застацца «вернымі» «сацыялістычнаму выбару» (М. Гарбачоў), але яшчэ больш яны жадалі застацца пры ўладзе. Таму нават абвясьціўшы аб пераходзе на пераважна эканамічныя мэтады кіраваньня прадпрыемствамі, а таксама прыняўшы закон, які гарантуе іх самастойнасьць, дзяржава захоўвалася як адміністрацыйна-камандная сыстэма на працягу ўсёй перабудовы. У гэтай сытуацыі рынкавыя мэханізмы, з агаворкамі дапушчаныя ў эканоміку, не маглі быць настолькі моцнымі, каб падняць эфэктыўнасьць эканомікі наагул, але яны, тым ня менш, працавалі супраць камандна-разьмеркавальнай сыстэмы, супраць сацыялістычнай дзяржавы, супраць яе фінансаў.

Савецкая імпэрыя клясычнага (сталінскага) пэрыяду была краінай, дзе квазіфэадалізм разьвіваўся, паступова набываючы ўсё больш разьвітыя формы. У гэтым сэнсе КПСС была сапраўдным авангардам савецкага грамадзтва, паколькі ўвасабляла сабой найвышэйшую форму яго квазіфэадальнай самаарганізацыі. Імкнучыся ўстанавіць і захаваць кантроль над усімі сфэрамі жыцьця, КПСС «перакоўвала», перавыхоўвала дакапіталістычнага расейскага чалавека, якога яна атрымала ў спадчыну, упісвала яго ў герархічныя парадкі квазіфэадальнага паводле сваіх падмуркаў грамадзтва. КПСС апрабоўвала на сваіх членах і структурах і потым распаўсюджвала на ўсё грамадзтва адносіны і інстытуты, якія існавалі ўжо ў Эўропе ў

час Сярэднявечча. Усё больш разьвітай, шматпрыступкавай станавілася сыстэма васалітэту, фармаваліся ўнутраныя кодэксы паводзінаў і карпаратыўная мараль, саслоўнае права, разьвіваліся формы фэадальнай рэнты, выпрацоўваліся формы гарманізацыі кланавых і агульнадзяржаўных каштоўнасьцяў і г. д. Галоўным у гэтым працэсе стала прагрэсіўнае зьмяншэньне з 1953 г. долі дзяржаўнага рабства, на якое стагодзьдзямі абапіралася імпэрская дзяржава.

Фэадальна-прыгонныя інстытуцыі ў значнай частцы перажылі пераходны пэрыяд 1990-х гг. У прыватнасьці, лібэрал-рэфарматары, якія пэўны час былі ва ўладзе ў Расеі, фактычна не адважыліся адмяніць інстытут прапіскі, перайменаваўшы яго ў інстытут рэгістрацыі і захаваўшы практычна той самы аб'ём абмежаваньняў. Калі разглядаць інстытут прапіскі як нефункцыянальны атавізм савецкай эпохі, яго ня толькі фармальная, але і зьмястоўная адмена была б, хутчэй, справай часу. Але гэты інстытут зьяўляецца адной з асноўных формаў кантролю насельніцтва з боку Ўлады, ён садзейнічае падтрыманьню фэадальнага ладу. Дакладна такая сытуацыя паўтарылася ў Беларусі.

Яшчэ вельмі важнай фэадальнай інстытуцыяй, што захоўваецца да цяперашняга часу ў РФ і РБ, зьяўляецца ўсеагульная вайсковая павіннасьць. З гледзішча вайсковай мэтазгоднасьці, захаваньне гэтай інстытуцыі ня толькі не патрэбнае, але і шкоднае, бо канкураваць з высокапрафэсійнымі ўзброенымі сіламі разьвітых дзяржаваў эпохі мадэрнасьці такому войску скрайне цяжка. Справа ў тым, што валоданьне мэтадамі вядзеньня вайны і прафэсійнае выкарыстаньне складаных сыстэмаў узбраеньня патрабуюць зусім ня меншага прафэсіяналізму, чым праца ў высокатэхналягічных галінах эканомікі. Працэс якаснай падрыхтоўкі вайсковага спэцыяліста павінен проста перакрываць усталяваны законам часавы інтэрвал вайковай службы па прызыве. У дадзеным выпадку рашэньне ўласна вайсковых задачаў зусім пэрыфэрыйнае, галоўны сэнс захаваньня ўсеагульнай вайсковай павіннасьці заключаецца ў масавай сацыялізацыі мужчынскага насельніцтва краіны, «перакоўцы» стыхійнага дадзяржаўнага чалавека.

У палітычным пляне «перабудова» (выбарнасьць на ўсіх узроўнях і ва ўсіх сфэрах, акрамя войска і спэцслужбаў, рост самастойнасьці нацыянальных утварэньняў) прывяла да росту апазыцыі дзяржаўнай машыне. Неабходнасьць стабілізуючых рашэньняў патрабавала ад ураду СССР усё большых сродкаў. Інакш перабудова магла скончыцца сацыяльным выбухам, расейскім бунтам, бессэнсоўным і бязьлітасным.

Да 1990-га, калі большасьць саюзных рэспублік, уключаючы РСФСР, заявілі пра свой дзяржаўны сувэрэнітэт, стала зразумела, што палітычны правал «перабудовы» азначае распад СССР, што непазьбежна вядзе і да распаду адзінага народна-гаспадарчага комплексу краіны. Сацыялістычныя прадпрыемствы перайшлі ва ўласнасьць новых незалежных дзяржаваў, кожная зь якіх абрала свой шлях пераадоленьня крызісу.

Сумны лёс Гарбачова ў масавай сьвядомасьці цяперашняга расейскага грамадзтва тлумачыцца нязьменна сумным лёсам усіх расейска-савецкіх лідэраў. Аддаўшы лідэрам права на любы гвалт краіны падчас кіраваньня ёю, насельніцтва зарэзэрвавала за сабой прэрагатыву зьнішчаць любую цёплую памяць аб лідэрах, якія ўжо сышлі. Можна сказаць, што ў посткамуністычнай Расеі досьведу гісторыі не існавала. Яе замяняў «гумар на лесьвіцы» – французскі аналяг расейскай прымаўкі аб чалавеку, «который задним умом крепок».

Вынікам ірацыяналістычнага антыгістарызму зьяўляецца пастаянна ўзнаўляны інфантылізм расейскай гістарычнай сьвядомасьці. У яе сыстэме каардынат гісторыя ня мае пераемнасьці, паколькі прыход да ўлады новага кіраўніка патэнцыйна нясе з сабой магчымасьць абнаўленьня космасу і быцьця. Нядаўняе мінулае перакрэсьліваецца, зь яго рэдка робяцца практычныя высновы, выкарыстаньне якіх на новым этапе магло б пазбавіць грамадзтва ад новых памылак і выпрабаваньняў. У той жа час былы лідэр, якога падвяргаюць афіцыйным ганеньням, выклікае ў носьбіта традыцыйнай сьвядомасьці жывое спачуваньне і падтрымку.

Драматычны прыклад Гарбачова, хуткае зьнікненьне любові да яго ў народу і нават у маскоўскай інтэлігенцыі, пацьвердзілі

агульнае руціннае правіла. Прыход новага кіраўніка, а ў апошняе дзесяцігодзьдзе гісторыі Расеі і абраньне новага складу органаў заканадаўчай улады, часта суправаджаецца масавымі ірацыянальнымі спадзяваньнямі на цудоўнае зьмяненьне (абнаўленьне) сьвету ці хаця б на неадкладнае паляпшэньне матэрыяльнага становішча людзей. Суаднясеньне гэтых гіпэртрафаваных спадзяваньняў з аб'ектыўнымі соцыякультурнымі рэаліямі шмат у чым недасяжнае для традыцыйнай сьвядомасьці. На пачатку свайго кіраваньня суб'ект Улады можа эсплюатаваць наяўнасьць у падданых ад пачатку завышаных, амаль сакральных чаканьняў, але з часам, згубіўшы веру ў яго здольнасьць пераўтварыць сьвет, сьвядомасьць традыцыяналіста можа зьдзейсьніць інвэрсію ў адносінах суб'екта Ўлады, перасоўваючы яго ў сваіх уяўленьнях з полюсу Дабрыні на супрацьлеглы полюс Зла.

Для носьбіта традыцыйнай сьвядомасьці (што цалкам дастасоўна і да стаднага прыхільніка асобы А. Лукашэнкі) важна не зьмястоўная, праграмная частка уладнай прамовы, а пэрсаналія таго, хто яе прамаўляе. Менавіта таму чарговаму суб'екту Ўлады так важна сказаць шмат агульнага і мала прыватнага, каб не бянтэжыць, ня ўводзіць у спакусу малых сіх, даўшы ім тым самым магчымасьць аб'яднацца ў падтрымцы пэрсоны ўладара. Калі зь цягам часу суб'ект Улады губляе сваю сувязь з эманацыямі Ідэалу і Чаканьняў, ён аказваецца ў сфэры зямнога, Існага, пагружаецца ў сьвет адзінкавых, несапраўдных фактаў, а таксама сам набывае адценьне несапраўднасьці (У. Падгол).

Арыентаваныя на абяцаньні руху да Ідэалу носьбіты традыцыйнай сьвядомасьці абвінавачваюць былых лідэраў ва ўсіх мажлівых грахах, але за гэтымі абвінавачваньнямі стаіць, як правіла, галоўнае – яны зьніжаюць узвышанае аблічча Ўлады, пераводзячы яе з сфэры сакральнага ў сфэру прафаннага. Няма ў народзе і асаблівай удзячнасьці царам і генсекам-вызваліцелям, бо яны, адпаўшы ад Ідэалу, упалі ў ерась Існага. Абліччы блізкіх па часе сучаснаму чалавеку М. Хрушчова і М. Гарбачова ў масавай сьвядомасьці афарбаваныя выразнымі адмоўнымі канатацыямі, зусім іначай успрымаецца вобраз кіраўніка, які вытрымлівае іспыт на адпаведнасьць

Ідэалу – няхай нават зусім няўцямнаму простым людзям. У ім усе чалавечыя якасьці паступова элімінуюцца, суб'ект Улады ў пошуках Ідэалу – гэта ўжо, хутчэй, не чалавек і нават ня звышчалавек, але нейкая вышэйшая істота.

Так, у 1977 г. у часопісе Саюзу пісьменьнікаў Беларускай ССР быў надрукаваны верш паэта з словамі аб тым, што сапраўдны савецкі чалавек заўсёды можа зьвярнуцца па параду і падтрымку да камуніста № 1 У. Леніна: «Имеем право мы: Буди! Имеем право мы: Звони!.. Не стерпишь ты, я не смолчу. Мы все позвоним Ильичу!». У гэтай сыстэме каардынатаў Лідэры ад Ідэалу выступаюць у якасьці «сьвятых» ад камуністычнай квазірэлігіі ў яе марксісцка-ленінскім варыянце, «сьвятых», да якіх можна зьвярнуцца з асабістай і калектыўнай скаргай, просьбай выправіць грамадзкае бязладзьдзе, адыход ад лініі, якая здаецца Ідэалам, «мошчаў», якім заўсёды можна пакланіцца і атрымаць падтрымку і суцяшэньне.

Наколькі моцнай аказалася гэтая спайка, відаць на прыкладзе постсавецкага пэрыяду гісторыі, калі менавіта расейская інтэлігенцыя ў найбольшай ступені аплаквала Савецкі Саюз, пачынаючы зь сярэдзіны 1990-х гг. усё больш дрэйфуючы ў напрамку левага флянгу палітычнага спэктру. Аказалася, што савецкая інтэлігенцыя ўсё жыцьцё працавала на імпэрскую дзяржаву. І калі гэтай дзяржавы ня стала, з сумам выявілася, што ў новых для краіны ўмовах «кожная асоба абавязана павышаць сваю здольнасьць быць нанятым і пашыраць партфэль сваіх праектаў. Калі хтосьці зь нейкіх прычынаў няздольны да гэтага, ён хутка маргіналізуецца і выключаецца з сацыяльных сувязяў, перасоўваючыся ў пэўную страту, што зьніжае здольнасьць успрыняцьця новага і прапановаў праектаў» (Я. Келер). Калі ня стала савецкай імпэрскай дзяржавы, то ў постсавецкага інтэлігента ня стала ня толькі гарантаванай крыніцы матэрыяльнага існаваньня, але і зьнікла адчуваньне ўласнай значнасьці, далучанасьці да вялікіх будоўляў і іншых зьдзяйсьненьняў часу. Аказалася, што трэба зарабляць грошы, трэба сыходзіць з курылак НДІ, ад кульманаў канструктарскіх бюро, трэба прапаноўваць грамадзтву такі інтэлектуальны і матэрыяльны прадукт, які яно згоднае набыць. Ці ж гэта ня драма для расейскага інтэлігента? Бо ж

так ня хочацца ўсяго гэтага бруду і мільгатні, лепш згаласіць да Ўлады: дайце замову на новую ідэалёгію, нацыянальную ідэю, хаця б якую-небудзь замову, толькі пазбаўце нас ад неабходнасьці самім зарабляць грошы, мы добрыя, мы болей ня будзем кепска казаць пра Вас на кухнях і тым больш у сродках масавай інфармацыі. А таму – няхай жыве КПРФ/Лукашэнка і/альбо нэаімпэрская ўлада, якая адна можа прыгалубіць і пашкадаваць, даць кавалак хлеба будзённага і паўзабытае ўжо адчуваньне ўласнай значнасьці. Частка постсавецкай інтэлігенцыі прагла новага/старога парадку, прычым гэты «парадак» часьцей спалучаецца са словамі «любой цаной». Адпаведна, такі парадак можна навесьці толькі «цьвёрдая рука, жорсткі, нязломны лідэр». Але калі так шчыра штосьці прасіць – можна і атрымаць тое, што шукаеш, і ўжо, здаецца, атрымалі. І ў Расеі, і ў Беларусі. Ня толькі ў частцы інтэлігенцыі, але і ў больш шырокай частцы постсавецкага грамадзтва ўзьнікла ўстойлівая дыхатамія, што прапануе выбар паміж свабодай, рэдукаванай да анархіі, і бясьпекай, якая ўспрымаецца як аўтарытарны парадак.

Але расейска-савецкае грамадзтва ня вытрымала ня толькі выпрабаваньня свабодай. Яно – што нават больш прыкра – ня вытрымала і іншага выпрабаваньня гарбачоўскага пэрыяду, выпрабаваньня мірам. Згубіла статус імпэратыву ідэалёгія мабілізацыі жыцьцёвых сілаў дзяржавы і грамадзтва на абарону ад замежнай пагрозы, якая займала ў папярэдні пэрыяд дамінантнае становішча ў каштоўнаснай герархіі.

Між тым, да выпрабаваньня свабодай і мірам дадалося выпрабаваньне дэідэалягізацыяй, адмовай ад глябальных праектаў, зьменай напрамку вэктару масавай сьвядомасьці ад мэсіянства «сусьветнай рэвалюцыі» ў бок прыватнай сфэры чалавечага быцьця. Пасьля заідэалягізаванага жыцьця пры Леніну–Сталіну–Хрушчову–Брэжневу такі стан быў нязвыклы. Улада паўстала перад пытаньнем, на якіх падставах можна захаваць хаця б мінімальны ўзровень інтэграванасьці соцыюму ва ўмовах адноснай свабоды, аўтаномнасьці асобы, дасягнутага ўзроўню гетэрагеннасьці каштоўнасьцяў, нормаў, жыцьцёвых стратэгіяў. І ўлада вярнулася да звыклага сродку – амаль непрыхаванага гвалту і беззаконьня.

І сёньня на гістарычнай сцэне ў Беларусі і Расеі засталіся, у адпаведнасьці з уласнымі ідэаламі, дзьве супрацьлеглыя сілы: пакаленьне свабоды, якое сацыялізавалася ў канцы 1980-х і ў пачатку 1990-х, і прывід мёртвай імпэрыі, прасьцёрты над сваім душапрыказчыкам – прэзыдэнцкай Уладай. Рэфэрэнтныя прадстаўнікі сыстэмы на фізіялягічным узроўні адчуваюць, хто свой, а хто чужы, і тут не схаваесься. Можна колькі заўгодна каверкаць расейскую мову, як гэта было прынята ў савецкі пэрыяд у вышэйшых эшалёнах улады, рабіць па тры-чатыры-пяць памылак у выразе «интенсификация сельского хозяйства», – не дапамагала і не дапаможа. Ля трону выжываюць толькі тыя, для каго правіла «угадать–угодить–уцелеть» стала сэнсам і камэртонам асабістага быцьця.

Эпоха Гарбачова–Ельцына выразна паказала, што ёсьць унутраная лёгіка разьвіцьця сыстэмы, пераламіць якую вельмі складана. Калі кажуць «А», далей ідзе «Б» – і так да канца альфабэту. Як нельга быць «крыху цяжарнай», так нельга захаваць элемэнты самой дэмакратыі ў яе «кіраваным» канструкце. Лёгіка фэдэральна-імпэрскай сыстэмы патрабуе ўваскрашэньня Ідэалу – Належнага і паэтапнага пераводу ўсіх дыскусіяў дзяржавы з грамадзтвам на мову сілы, мову спэцслужбаў і армейскага спэцназу. І «дыялёг» грамадзтва з уладай на такой мове ад пачатку пройгрышны, бо цывільныя людзі ўмеюць вучыць і лячыць дзяцей і дарослых, будаваць дамы, кіраваць бізнэс-структурамі, пісаць артыкулы, але ня ўмеюць супрацьстаяць «спэцназу ГРУ». Для грамадзтва «дыялёг» на такім полі згубны. І зьяўляецца толькі крайнім, адчайным сродкам: прыгадаем віленскі тэлецэнтар і многія іншыя кропкі «дыялёгу» ўлады і грамадзтва пры Гарбачову. Для ўлады такога кшталту дыялёг можа паказацца цалкам прымальным, сіла на яе баку. Але наколькі трывалай аказваецца створаная ў выніку правядзеньня шэрагу пасьпяховых дыскусіяў такога кшталту палітычная канструкцыя, – пытаньне, прынамсі, адкрытае. Спроба імпэрскай рэстаўрацыі, заснаваная на буйнамаштабным выкарыстаньні сілавых структураў ва ўмовах масавай карупцыі, ня можа быць дастаткова эфэктыўнай і даўгавечнай. Дзіва што на працягу ўсіх 1990-х гг. нябачным, але вызначальным для дзеяньняў улады заставаўся стары лёзунг: нам бы ноч

прастаяць ды дзень пратрымацца. Гістарычны час спрасаваўся ў бясконцае цяперашняе, у несупынныя сэлектарныя закліканьні А. Лукашэнкі аб зусім звыклай «бітве за ўраджай».

Можна сказаць, што эпоха Гарбачова канчаткова скончыцца толькі з распадам Расеі. І да таго ўсё ідзе. Для безумоўнай карысьці грамадзянаў яе асобных тэрыторыяў. Ельцын ня мог перайграць Гарбачова, не разваліўшы Саюз ССР. Расея здолее ўтаймаваць крамлёўскую бюракратыю, толькі калі яна фрагмэнтуецца. Да палёгкі таксама і ўсіх суседзяў.

З расейскай.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 5 (39) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/05
[image]

Мінулыя (9’2000)

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (39) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image]2005

[image] [image] [image]

[image] [image] [image]

АНДРЭЙ ВАШКЕВІЧ. у 2004 г. скончыў гістфак Гарадзенскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Я. Купалы. Асьпірант Інстытуту гісторыі Акадэміі навук Беларусі. Малодшы навуковы супрацоўнік Гарадзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалягічнага музэю. Дасьледуе пытаньні заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў

Андрэй Вашкевіч. Дзяніс Нарэль. Сымон Якавюк: адраджэнец, спекулянт, манархіст і савецкі дыверсант

УСТУП

Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух раней быў справай адносна невялікай колькасці людзей. Мы вельмі слаба знаёмыя і з іх жыццяпісамі. Асобу Сымона Якавюка нельга аднесці да ліку шырокавядомых нават сярод беларускіх гісторыкаў. Найчасцей яго згадваюць у спісе беларусаў, выбраных восенню 1922 г. у сойм Другой Рэчы Паспалітай. Між тым гэтая падзея была далёка не самай важнай у яго грамадска-палітычным жыцці.

Сымон Якавюк меў самае шчыльнае дачыненне да беларускага руху на працягу больш чым дваццаці гадоў, браў удзел у яго лёсатворных падзеях. Як і многія іншыя беларускія дзеячы, с. Якавюк у пачатку 1990-х паспеў трапіць у лік рупліўцаў беларускага адраджэння. Адбылося гэта, хутчэй за усе, з прычыны звычайнай і вельмі небяспечнай – меркаваць аб

прадстаўніках той ці іншай палітычнай плыні агульнавядомы савецкія гісторыкі кляймілі ўсіх запар беларускіх нацыяналістаў-здраднікаў, дык гадоў 15 таму сталася наадварот. Прыкладам, расказваючы пра падзеі на Гарадзеншчыне ў канцы 1918 г. гісторык Анатоль Сідарэвіч піша пра «…Сымона Якавюка, беларускага сацыялістарэвалюцыянера, будучага пасла на сойм Польскай Рэспублікі, які трапіць у 1923 г. на лаву падсудных у справе 45-ці супраць польскай акупацыі»[1]. Сяброўства с. Якавюка ў партыі беларускіх эсэраў – міф, які склаўся, мабыць, на падставе ягонага ўдзелу ў антыпольскім падполлі пачатку 1920-х гг.

Дзякуючы гэтаму міфу с. Якавюк фактычна ўвайшоў у беларускую гісторыю. Ён прысутнічае ў кнігах Аляксея Гарэцкага, Уладзіміра Ігнатоўскага, Яўгена Кіпеля, Яўгена Мамонькі, Вячаслава Насевіча, Ігара Марзалюка, Генадзя Сагановіча, Яўгена Сабалеўскага, Ніны Стужынскай, Алега Трусава, Вячаслава Шарамета і многіх іншых аўтараў, якія пісалі пра беларускі рух 1917–1920 гг

пасля смерці яго самога і ягонага сына апынуўся ў Расійскі людзей. Архіў гэты налічвае каля 60 розных дакумен тычацца асабістага і грамадскага жыцця с. Якавюка, і падзеі ад 1924 да 1956 г. Найбольшую цікавасць уяўляе копія паслужнога ліста с. Якавюка з часоў яго служ расійскім войску і ліставання пачатку 1950-х гг.

Асноўная частка дакументаў – пратаколы пасяджэнняў і рэзалюцыі Беларускага культурна-прасветнага таварыства ў Літве, якім с. Якавюк кіраваў у 1932–1940 гг., а таксама матэрыялы, што тычацца яго супрацьстаяння з К. Душэўскім (напрыклад, складзеная у 1933 г. «Справка», дзе прыхільнікі с. Якавюка пералічвалі ягоныя заслугі ў беларускай культурнай і палітычнай рабоце).

У наступныя гады нашы веды пра жыццё с. Якавюка істотна папоўніліся матэрыяламі архіваў Беларусі, Польшчы і Расіі. Так, у фондзе № 3 Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва ў Менску захоўваецца даволі значная колькасць дакументаў, што выйшлі з-пад пяра беларускіх дзеячаў Ковенскай Літвы 1930-х гг. Хутчэй за ўсё, гэтыя дакументы нейкім вакольным шляхам (можа, праз латвійскіх беларусаў) дасылаліся ў рэдакцыю віленскай газеты «Беларуская Крыніца».

[image] З Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі паходзяць матэрыялы аб дзейнасці беларускіх арганізацый Гарадзеншчыны ў канцы 1918-га – пачатку 1920-х гг. Дакументы польскай паліцыі з Цэнтральнага вайсковага архіва ў Варшаве ўтрымліваюць шмат цікавай, але ў той жа час супярэчлівай інфармацыі аб палітычнай арыентацыі с. Якавюка ў пачатку 1920-х гг.

[image] С. М. Якавюк падчас Першай сусветнай вайны. 1916—1917 гг." title="С. М. Якавюк падчас Першай сусветнай вайны. 1916—1917 гг. Бадай што адзінай крыніцай аб дзейнасці с. Якавюка ў перыяд яго актыўнага супрацоўніцтва з урадам Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1924–1925 гг. ёсць двухтомнік «Архівы БНР», выдадзены ў 1998 г. стараннем Сяргея Шупы.

Багата новага даў і перыядычны друк 1920-х – 1940-х гг. Гэта і выданні Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі «Зарава», «Нашае Жыцьцё» і інш., дзе друкаваліся пратаколы працэсу 45-ці ў Беластоку, і віленская «Крыніца» (з 1926 г. «Беларуская Крыніца», а ў 1939–1940 гг., калі Вільня стала часткай тады яшчэ незалежнай Літвы, ізноў «Крыніца»), і газеты расійскіх эмігрантаў у Літве «Новые Дни», «Литовский Вестник».

Менавіта наяўнасць значнай колькасці аўтэнтычных і разнастайных паходжаннем крыніц і дазволіла нам даволі падрабязна пранікнуць у перыпетыі жыццёвых сцежак Сымона Якавюка.

Аўтары гэтай працы сталі першаадкрывальнікамі далёка не ўсіх выкладзеных на наступных старонках фактаў. Гарадзенскі гісторык Андрэй Чарнякевіч ужо выклаў інфармацыю аб дзейнасці с. Якавюка ў 1918-м – 1920-х гг. на старонках сваёй кнігі «Гарадзенскія апосталы: Беларускі нацыянальны рух у Гародні (1918–1920 гг.)». Ён жа прадставіў у наша распараджэнне дакументы з расійскага архіва і перыёдыкі з пратаколамі працэсу 45-ці.

[image]
Зусім нядаўна ўбачыла свет кніга гэтага ж аўтара «Постаці беларускага нацыянальнага руху ў Гродне 1909–1939 гг.: Біяграфічны даведнік». Сымону Якавюку ў ёй прысвечаны асобны і грунтоўны артыкул. Дакументы з архіва Польшчы – знаходкі менскага гісторыка Алеся Пашкевіча, які вывучае дзейнасць беларускіх дэпутатаў у польскім сойме ў 1920-х – 1930-х гг.

Абодвум ім нашая шчырая падзяка.

ПАЧАТКІ (1881–1918 гг.)

Нарадзіўся Сымон Якавюк у маі 1881 г. у вёсцы Дубіны Новабярозаўскай воласці Бельскага павету Гарадзенскай губерні[3]. У вядомых нам крыніцах сустракаецца ажно тры даты нараджэння Сымона Якавюка: 23 мая[4] , 24 мая[5] і 4 мая. Апошняя адлюстравана на яго надмагільнай пліце. Усе гэтыя

даты паходзяць з раўназначных сваёй вартасцю крыніц, таму ўстанавіць сапраўдны дзень нараджэння с. Якавюка будучым даследчыкам будзе няпроста.

Паходзіў Сымон Якавюк з праваслаўнай сялянскай сям'і, якая, з ягоных уласных словаў, мела шэсць гектараў зямлі[2]. Незаможны стан гаспадаркі бацькоў, а таксама тое, што яго знаходзіліся на чыгунцы, магчыма, і вырашылі ягонаў жыццёвы шлях.

Скончыўшы ў 1897 г. Бельскую 8-класную павятовую вучэльню, Сымон прайшоў гадавы курс у чыгуначнай школе тэлеграфістаў у Беластоку[8] . У 1898 г. паступіў у Віленскую тэхнічную вучэльню[9], якую кінуў на апошнім курсе і ў 1900 г. пачаў працаваць тэлеграфістам станцыі Беласток Паўночна-заходняй чыгункі[10]. Звесткі з наступных 14 гадоў жыцця с. Якавюка сведчаць пра ягоны значны кар'ерны рост. Праз тры гады ён ужо працуе начальнікам «станцыі паста «Трэцяй вярсты». З 1905 г. і да пачатку Першай сусветнай вайны выконвае абавязкі памочніка начальніка станцыі Беласток[11] (паводле некаторых звестак працаваў чыноўнікам багажнага аддзялення[12]).

Прыкладна ў гэты час ён узяў шлюб з Марыяй, дачкой Васіля Кахана, якая ў 1911 г. нарадзіла сына Канстанціна. Перад самым пачаткам імперыялістычнай вайны (18 ліпеня 1914 г.) Сымон Якавюк быў мабілізаваны ў запас і прызначаны ніжэйшым павятовым вайсковым начальнікам і прызнаны прыдатным для службы ў Гарадзенскую крэпасць[13], на бруствер якой працаваў яшчэ ў якасці чыгуначнага спецыяліста пачынаючы з 1913 г.[14]. Магчыма, з гэтага ж часу ён і жыў у Гарадні.

Летам 1914 г. пачынаецца новы этап у жыцці с. Якавюка, поўны бадзянняў па-за межамі Беларусі. Дакладна невядома, колькі часу прабыў с. Якавюк у Гарадзенскай крэпасці, але, найхутчэй, менавіта на першы год службы прыпадае і ягонае знаходжанне ў 1-м запасным чыгуначным батальёне ў Кіеве і Смаленску[15].

23 верасня 1915 г., калі Горадня ўжо была акупаваная немцамі, с. Якавюка накіравалі у штаб Дзвінскай ваеннай акругі, а адтуль – у школу прапаршчыкаў[16]. Вучыўся ён ува Усць-Іжорскай інжынернай вучэльні на спецыяльнасці

[2] Ліст Кадровай Управы Дубіны *02.07.1954 г.** (Тут і далей знакам * пазначаныя дакументы з архіва аўтара, курсівам надрукавана ідэта складання дакумента і каротае тлумачэнне да яго.)

[7] Личный Листок по Учёту Кадров. *02.07.1954 г.**

[8] Posłowie i senatorowie… S. 278.

[9] Личный Листок по Учёту Кадров. *02.07.1954 г.**

[10] Тамсама.

[11] Тамсама.

[12] Posłowie i senatorowie… S. 278.

[13] Ištrauka iš tarnybinio lapo… *

[14] Posłowie i senatorowie… S. 278.

[15] Тамсама.

[16] Ištrauka iš tarnybinio lapo… *

[17] Ištrauka iš tarnybinio lapo *jakovitsko praporščicko 14 gelskelio batalione, sustatto 1917 metais gruodžio 31 d. [выпіска з наступнога пяці с. Якавюка 31.07.1927 г.]*. [1 Posłowie i senatorowie Rzeczypospolitej Polskiej 1919–1939. Słownik biograficzny. T. II. L–S. – Warszawa: Wydawnictwo Sejmowe, 2000. S. 278.

чыгункі на Каўказе[19]. Сам Сымон Якавюк пісаў пра
гэта, што ў 1916–1918 гг. быў начальником телеграфа
Макінскай дарогі[20]. Горад Маку быў цэнтрам Макінскага
раёна, што і спрыяла да 1922 г. на поўдні іранскага
Азербайджана. Падчас Першай сусветнай вайны на тэрыторыі
Персіі знаходзіўся расійскі экспедыцыйны корпус генерала
Баратава, колькасцю прыблізна 15 батальёнаў. У Маку да канца
1917 г. знаходзіліся 1-шы Тамазскі, 1-шы Каўказскі казацкія
палкі і 4-я Кубанская казацкая батарэя, аб’яднаныя ў брыгаду.
Не выключана, што тут жа маглі размяшчацца і ваенныя
інжынеры, сярод якіх праходзіў службу Якавюк.

У канцы 1917-га – пачатку 1918-га г. Каўказскі фронт фактычна
перастаў існаваць. Салдаты і афіцэры разыходзіліся па дамах
або запісваліся ў шматлікія нацыянальныя фармаванні
(грузінскія, армянскія, расійскія і інш.).

Як ужо гаварылася вышэй, удзел Сымона Якавюка ў Турэцкай
кампаніі афіцыйна завяршыўся 28 студзеня 1918 г.[21]. Пасаду ж
начальніка тэлеграфа ён займаў да 1 траўня 1918 г. Пасля
развалу фронту с. Якавюк удзельнічаў у эвакуацыі з Баязета ў
Тыфліс маёмасці Макінскай чыгункі. «Будучи в Тифлисе вместе
с Управлением дороги, после эвакуации, состоял
Председателем Финансовой Комиссии, регулировавшей
производство расчётов со служащими всех полевых железных
дорог Кавказского фронта и оказывал энергичное содействие к
получению служащими Макинской дороги причитающихся им
видов денежного довольствия», – было напісана ў
характарыстыцы Сымона Якавюка[22]. Вядома, што падчас
свайго знаходжання на Каўказе Якавюк браў удзел у
кааператыўнай і дабрачыннай працы[23], але ўдакладніць
храналогію гэтай работы нельга. Застаецца адкрытым пытанне,
дзе знаходзіўся Сымон Якавюк пасля распаду Каўказскага

17 Личный листок по учету кадров. 02.07.1954 г.
18 Istrabka is tarnybinio lapo…*
19 Posłowie i senatorowie… S. 278.
20 Личный листок по учету кадров. 02.07.1954 г.
21 Istrabka is tarnybinio lapo…
22 Аддзел рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ф. 23. Воп. 1. Спр. 55. Арк. 1.
23 Posłowie i senatorowie… S. 278.
24 Istrabka is tarnybinio lapo…
25 Залесский К. Первая Мировая война. Биографический энциклопедический словарь. Москва: Вече, 2000. с. 179–180.
26 Аддзел рукапісаў ЦНБ імя Я. Коласа НАНБ. Ф. 23. Воп. 1. Спр. 55. Арк. 17.
27 Posłowie i senatorowie… S. 278.

фронту (фактычна з траўня да кастрычніка 1918 г.).

Але 14 жніўня 1918 г. прапаршчык былога 14-га чыгуначнага батальёна Сымон Якавюк загадам галоўнаначальніка войскаў былога Каўказскага фронту атрымаў званне падпаручніка[24]. Каўказскага фронту не існавала ўжо з траўня месяца, пра далейшы лёс яго апошняга галоўнаначальніка генерал-маёра Я. Лебядзінскага мы не маем ніякіх звестак. Тым не менш, менавіта Я. Лебядзінскі ці ягоны папярэднік генерал М. Пржэвальскі (галоўнаначальнік фронту да снежня 1917 г.) падпісаў гэты загад. Факт надання Якавюку афіцэрскага звання ў разгар грамадзянскай вайны, праз тры месяцы пасля ліквідацыі фронту, дае права меркаваць аб знаходжанні ў гэты час яго ў адным з белых фармаванняў на поўдні Расіі. Тым больш, што генерал Пржэвальскі ў гэты час служыць у арміі генерала Дзянікіна, а ў канцы 1918 г. прызначаецца начальнікам над добраахвотніцкімі войскамі на Каўказе[25]. У сваёй аўтабіяграфіі, складзенай у 1970 г., Сымон Якавюк напіша, што, выехаўшы аднекуль з Каўказа 21 жніўня 1918 г., ён ужо 28-га дня таго ж месяца быў у Горадні[26]. Даты, канечне, абсалютна нерэальныя, праўда, у нас ёсць усе падставы меркаваць, што праз паўстагоддзя Якавюк свядома крыху сказіў храналогію свайго вяртання на Гарадзеншчыну. Бясспрэчна, 1918 г. – адна з самых вялікіх таямніц у жыцці Сымона Якавюка, тым больш што гэта не былі месяцы спакойнай мірнай працы, а адзін з лёсавызначальных этапаў у яго біяграфіі.

Далей – пакручастая дарога на радзіму. Вядома толькі яе апошняя частка: Будапешт, Варшава, Беласток, Горадня[27]. Трапіць з Каўказа або з расійскага поўдня ў Будапешт, верагодней за ўсё, можна было толькі морам (магчыма, праз захоплены ў жніўні дзянікінцамі Новарасійск).

У ГОРАДНІ (1918–1920 гг.)

Перш чым перайсці да абставін з’яўлення і першых звестак аб знаходжанні Сымона Якавюка ў Горадні, неабходна ў агульных рысах ахарактарызаваць расстаноўку палітычных сілаў Гарадзеншчыны ў канцы 1918 г.

Больш чым тры гады губерня знаходзілася пад нямецкай акупацыяй. Пасля лістападаўскай рэвалюцыі і паразы Нямеччыны ў Першай сусветнай вайне нямецкія войскі паступова пакідалі тэрыторыю ўсходняй Беларусі і Украіны. Аднак з заходняй часткі Гарадзеншчыны немцы адыходзіць пакуль не збіраліся. Найперш дзеля таго, што існавала адпаведная дамоўленасць з краінамі Антанты, якія не хацелі дапусціць усталявання тут савецкай улады. Па-другое, немцы спадзяваліся захаваць важны транспартны калідор для эвакуацыі на захад сваіх войскаў і маёмасці. Тым не менш, адступленне акупантаў з Гарадзеншчыны было справай найбліжэйшага часу. Таму ў горадзе і яго ваколіцах пачыналі дзейнічаць розныя палітычныя сілы, якія мелі намер пераняць уладу мірным ці збройным шляхам.

Наймацнейшымі былі пазіцыі палякаў, якія ўдала скарысталіся прымусовай эвакуацыяй значнай часткі праваслаўнага насельніцтва на ўсход летам 1915 г., падтрымкай буйных земляўласнікаў і актыўнай прапагандай на карысць польскасці з боку каталіцкага касцёла. Інтарэсы беларусаў у краі спрабаваў абараняць Беларускі нацыянальны камітэт, які складаўся з невялічкай групы патрыётаў (А. Грыкоўскі, Я. Натусевіч і інш.). Камітэт не карыстаўся падтрымкай немцаў, меў фінансавыя праблемы і таму не мог разгарнуць шырокай работы сярод палітычна і нацыянальна несвядомай масы беларускага насельніцтва.

У канцы 1918 г. свае прэтэнзіі на Гарадзеншчыну выказала і літоўская Тарыба, якая спрытна скарысталася цяжкім становішчам урада БНР, што вымушаны быў уцякаць з Менска ад наступу Чырвонай Арміі. У канцы лістапада 1918 г. Тарыба і ўрад БНР заключылі пагадненне аб утварэнні пры ўрадзе Літвы Міністэрства беларускіх справаў, якое павінна было кіраваць аўтаномнай Гарадзеншчынай у складзе Літоўскай дзяржавы. Міністрам беларускіх справаў стаў Язэп Варонка (былы міністр унутраных справаў БНР), але прэм’ер-міністрам БНР заставаўся Антон Луцкевіч. Тым самым ствараласяся своеасаблівае двухуладдзе, і ў наступныя некалькі месяцаў Горадня сталася арэнай супрацьстаяння гэтых беларускіх палітыкаў, кожны з якіх прэтэндаваў на тое, каб прадстаўляць волю беларускага

народу.

Якавюк не далучыўся да гэтых груповак. Упершыню дакументы ўзгадваюць с. Якавюка як удзельніка 1-га Гарадзенскага губернскага беларускага з'езду, які адбыўся 1–2 снежня 1918 г. з ініцыятывы Гарадзенскай расійскай управы. Матэрыялы з'езду сведчаць, што Гарадзенская расійская ўправа была створана прадстаўнікамі прывілеяваных колаў (праваслаўнае духавенства, расійскія чыноўнікі, земляўласнікі і г. д.) былой Гарадзенскай губерні прыкладна за паўтара месяца да з'езду[28]. Першапачаткова ва Управу ўвайшло 9 чалавек, частка з іх жыла на Гарадзеншчыне ў перыяд акупацыі, а частка, у тым ліку і яе кіраўнік Яўген Яўграфавіч Курлоў, вярнулася з цэнтральнай Расіі, куды ўцякла ад немцаў увосень 1915 г. Я. Курлоў быў даволі вядомым у перадваеннай Горадні чалавекам – мясцовы памешчык, ён лічыў сябе літаратарам і, насуперак некаторым меркаванням, не быў родным братам знакамітага менскага губернатара Паўла Рыгоравіча Курлова.

На момант з'езду Управа таксама складалася з 9 чалавек, сярод якіх быў і с. Якавюк. Ён, як сябра Управы, запісаўся селянінам[29]. Хутчэй за ўсё, гэта быў першапачатковы крок гэтай арганізацыі (тады с. Якавюк прыбыў у Горадню толькі за сярэдзіну кастрычніка 1918 г.).

Дзейнасць Управы мела расійска-праваслаўны кірунак, аднак рэальная сітуацыя змушала яе сяброў карыстацца дэмакратычнай тэрміналогіяй, а таксама нярэдка ўжываць паняцце «Беларусь», хаця іх разуменне гэтага тэрміну не выходзіла за рамкі канцэпцыі трыадзінага расійскага народу.

Знаходжанне Якавюка ў падобным асяроддзі, верагодна, сведчыць аб ягонай тагачаснай палітычнай пазіцыі. З'езд ладзіўся Управай з дазволу нямецкіх уладаў дзеля легітымізацыі свайго статусу. У ім бралі ўдзел сяляне з некалькіх паветаў Гарадзеншчыны, а таксама прадстаўнікі Беларускага нацыянальнага камітэту. Сымон Якавюк не быў абраны ў кіраўнічыя органы з'езду, аднак колькасць пададзеных за яго галасоў (74 з 186, трэцяе месца падчас выбараў таварышаў кіраўніка з'езду) гаворыць, што ён быў ужо досыць вядомы. Акрамя таго, ён вылучаўся на пасаду сакратара

[28] Дзяржаўны Архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ). Ф. 399. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 11.

[29] Там жа. Арк. 16 адв.

з’езду[30].

[image]

С. Якавюк выступіў з пленарным дакладам аб будучых выбарах валасных старастаў, дзе адлюстраваў агульную пазіцыю Управы аб падтрымцы нямецкіх захадаў па арганізацыі выбараў мясцовых органаў самакіравання. Якавюк, звяртаючы ўвагу на спробу палякаў заняць большасць месцаў у адміністрацыі, заклікаў да неабходнасці выбіраць усіх беларусаў без розніцы ў веравызнанні[31].

Пазіцыя Управы датычна выбараў, адсутнасць канкрэтных прапаноў па зямельным пытанні, абыякавае стаўленне да развіцця беларускай нацыянальнай адукацыі выклікалі атакі на Управу з боку ўдзельнікаў з’езду.

Сымон Якавюк выступаў яшчэ двойчы. Увесь час абараняў Расійскую ўправу, сцвярджаючы, што апошняя «взяла на себя почин организации белорусского народа»[32]. На прапанову дзеячаў БНК аформіць рэзалюцыю з’езду па-беларуску Сымон Якавюк адказаў сакраментальна:

Не надо спорить нам о языке. Надо дело делать. Почему Белорусский комитет не собрал вас, а сделает лишь это, что введет язык. Не будем расточаться, а дело творить. Наш Управа называется русской, а не белорусской – это игра слов[33].

[image]

З’езду таксама было паведамлена, што Управа вядзе перагаворы з літоўскім урадам аб тым, каб афіцыйна прадстаўляць Гарадзеншчыну перад Літвой. Канкрэтнай інфармацыі аб пагадненні Тарыбы і БНР Управа яшчэ не мела.

У выніку з’езду губернская Управа ўмацавала свае пазіцыі. Быў захаваны яе ранейшы склад, але ў якасці кампрамісу з беларускімі дзеячамі яна была перайменаваная ў Гарадзенскую беларускую губернскую ўправу і дапоўнена прадстаўнікамі сялянства і сябрамі БНК[34].

У снежні 1918 г. немцы стварылі орган мясцовага самакіравання – «часовы камітэт па прыняцці гарадской гаспадаркі», куды Сымон Якавюк увайшоў як дэлегат ад

[30] Тамсама. Арк. 26 адв.

[31] Тамсама. Арк. 4 адв.

[32] ДАРФ. Ф. 5999. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 11.

[33] Тамсама. Арк. 20 адв.

[34] Тамсама. Арк. 21 адв.

[35] Гарадзенскія Абласныя Ведамасці. 1918. № 1. С. 2.

[36] Там самым. С. 9.

[37] Там самым. С. 5.

[38] ЛАРФ. Ф. 5999. Воп. 1. Спр. 5. Арк. 7 адв.

гарадзенскіх працаўнікоў. Усіх іх аб'ядноўвала імкненне бачыць
у нацыянальным Вялікім Княстве (1918–1920 гг.) [БНК. Тэкст 15–16
снежня 1918 г. Гарадзенскі
Гарадзенскі БНК і прадстаўнікі ўрада БНР правялі свой з'езд, дзе была створана павятовая Сялянская рада, а таксама абраны Арганізацыйны камітэт па скліканні 9 студзеня 1919 г. краёвага беларускага з'езду Гарадзеншчыны. У склад Арганізацыйнага камітэта ўвайшоў і Сымон Якавюк, што на фоне канфлікту, які разгараўся паміж Управай і БНК, выглядае даволі дзіўна[36].

З другой паловы снежня пазіцыі гарадзенскіх беларусаў пачынаюць узмацняцца. У Горадню з'язджаюцца прадстаўнікі Міністэрства беларускіх спраўаў і Рады БНР. Усведамляючы небяспеку з боку палякаў, Беларуская губернская ўправа ў гэты час працягвае перамовы з літоўскім урадам, якія вядзе пераважна Усевалад Боеў – адна з найбольш значных і таямнічых асобаў у атачэнні Якавюка[37]. Літоўцы патрабуюць ад Управы пагаднення з беларускімі арганізацыямі, перадусім з Міністэрствам беларускіх спраўаў. Паводле інфармацыі Боева, Сымон Якавюк быў адным з тых, хто дакладваў кіраўніку справамі Рады Міністраў Літвы аб дасягненні згоды паміж Управай і Радай БНР[38].

Больш канкрэтнае ўражанне аб далейшых захадах Якавюка можна атрымаць з дзённікаў Антона Луцкевіча, які прыехаў у Горадню 28 снежня 1918 г. Ранкам гэтага дня адбылася нарада паміж прадстаўнікамі беларускіх арганізацый і Гарадзенскай управай, якую прадстаўлялі Боеў, Якавюк і Зянковіч. Каб дасягнуць кампрамісу з беларусамі, сябры Управы аб'явілі аб выхадзе з яе пяці «масквафілаў і чарнасоценцаў», у тым ліку Я. Курлова. Аднак канчатковае рашэнне мусіў прыняць з'езд, прызначаны на 9 студзеня 1919 г. Як бачым, Якавюк і Боеў у справах Гарадзенскай управы займалі далёка не апошняе месца.

Цікава выглядае характарыстыка, дадзеная ім абодвум Антонам Луцкевічам у гэты ж дзень: «Боеў – «адвакацішка» з малога места, хоча паказаць сваё красамоўства, Якавюк туды ж, чалавек малаінтэлігентны»[39]. А. Луцкевіч не ведаў с. Якавюка раней, і таму, нягледзячы на амбіцыі самога прэм'ер-міністра, гэтыя словы з'яўляюцца важным, хаця і суб'ектыўным, сведчаннем.

С. Якавюк, аднак, перарываць кантактаў з А. Луцкевічам не збіраўся і 29 снежня наведаў яго двойчы: спачатку з дэлегацыяй Саюза чыгуначных, паштова-тэлеграфных і шашэйных служачых, якія заявілі, што палітыкай займацца не будуць, і ўвечары – для «інтымнай» гутаркі, каб сказаць, што палякі ў Саюзе зацягваюць яго ў сваю арганізацыю[40]. 30 снежня Якавюк завітаў да Луцкевіча, каб паведаміць пра магчымае пасяджэнне Управы. На наступны дзень ён даў неафіцыйную інфармацыю пра новую перастаноўку сяброў Управы, якая, як пазней высветлілася, выявілася непраўдзівай[41].

Баючыся скампраметаваць сябе напярэдадні Парыжскай мірнай канферэнцыі супрацоўніцтвам з немцамі, актыўнай удзелу А. Луцкевіч займацца не збіраўся. Але ў пачатку студзеня 1919 г. у горадзе з'яўляюцца Язэп Варонка і Павал Аляксюк, кожны з якіх меў прэтэнзіі на кіраўніцтва беларускім рухам. І калі П. Аляксюк даволі хутка падпарадкаваў сваім уплывам БНК, то адносна Язэпа Варонкі можна адзначыць відавочнае зблiжэнне яго пазіцый з Гарадзенскай губернскай управай.

С. Якавюк, хутчэй за ўсё, спадзяваўся падтрымліваць сувязь з А. Луцкевічам як найбольш аўтарытэтным беларускім дзеячам, бо 15 студзеня 1919 г. зноў наведаў яго і апавёў пра справы ва Управе. Паводле Якавюка, з Управы ўжо выйшлі найбольш рэакцыйныя элементы, і таму можна было яе рэфармаваць, увёўшы ў склад прадстаўнікоў ад валасных і павятовых сялянскіх радаў. Тады Управу магчыма было б абвесціць Губернскай радай сялянскіх дэпутатаў. Ужо праз два дні, 17 студзеня, А. Луцкевіч напіша, што вышэйзгаданае мерапрыемства плануецца Управаю ў самым цесным кантакце з Я. Варонкам, стасункі якога з А. Луцкевічам былі вельмі нацягнутыя[42].

Новы ўдар па легітымнасці БНК і павятовай рады нанесуць непасрэдна Управа. 18 студзеня 1919 г. было арганізавана «белорусское собрание», якое прыняло заяву аб падтрымцы сяброў часовага гарадскога камітэта ад Управы Зорына, Марозава, Якавюка ды Дзмітрыева[43]. Гэтая заява, абмяркаваная на пасяджэнні часовага камітэта, была накіраваная супраць П. Алексюка і яскрава прадэманстравала раскол у беларускім асяроддзі. Так Управа спрабавала стварыць ілюзію шырокай

39 Луцкевіч А. Дзённік // Полымя. 1991. № 4. с. 215.

40 Тамсама. с. 216.

41 Тамсама. с. 218.

42 Луцкевіч А. Дзённік // Полымя. 1991. № 5. с. 171.

падтрымкі беларусамі дзейнасці сваіх дэлегатаў і адсутнасць такой падтрымкі ў П. Алексюка і ўсяго БНК.

Сярод удзельнікаў «собрания» разам з У. Боевым і Я. Курловым узгадваецца таксама і с. Якавюк. Ёсць інфармацыя і пра яго першы вядомы нам гарадзенскі адрас – Станіславоўская, 4[44].

21 студзеня 1919 г., падчас банкету ва Управе, Антон Дубейко згадвае прысутных Я. Варонку, У. Боева і с. Якавюка як тых, ўжо як адну кампанію, якая аб'яднана выступае супраць БНР[45].

На наступны дзень адбылося пасяджэнне Арганізацыйнага камітэта ў справе склікання краёвага беларускага з'езду Гарадзеншчыны, у якім узялі ўдзел прадстаўнікі БНК і Управы (у тым ліку і с. Якавюк)[46]. Гэтая слабая спроба аб'яднацца, відаць, скончылася нічым, бо з'езд не адбыўся. Апагеем канфлікт «Управа–БНК» дасягнуў у канцы лютага падчас выбараў у гарадскую раду, якая мусіла замяніць часовы камітэт. Беларусы вылучылі адразу два выбарчыя спісы: сумесны ад Міністэрства беларускіх справаў і Управы – «блок беларускіх грамадзянаў», і ад БНК – «блок беларускіх сацыялістаў». Зразумела, што Якавюк знаходзіўся ў «блоку беларускіх грамадзянаў». Беларусы на выбарах пацярпелі паразу, правёўшы ад кожнага блока толькі па адным кандыдаце, агулам на 36 месцаў. Управу прадстаўляў У. Боеў, БНК – П. Аляксюк[47].

З пачатку 1919 г. Сымон Якавюк уваходзіць у больш шчыльныя кантакты з прадстаўнікамі літоўскага ўрада. Як піша (гэтая сувязь узнікла ў канцы 1918 г. і ўзмацнілася супрацоўніцтвам з Я. Варонкам, які, уласна, і прадставіў Горадні літоўцаў. с. Якавюк паступіў у Гарадзенскі літоўскі полк, дзе служыў у званні лейтэнанта ў гарадской камендатуры[48]. Полк фармальна быў часткай літоўскага войска, але складаўся пераважна з салдатаў і афіцэраў (былой царскай арміі. Прыкладна з гэтага ж часу с. Якавюк займаў пасаду чыноўніка ў асабліва важных справах пры Міністэрстве па справах беларусаў[49]. У гэтым жа годзе ён уступіў у Віленскую літоўскіх стральцоў (напаўвайсковая добраахвотніцкая арганізацыя)[50].

43 Чарнякевіч А. Гарадзенскія апосталы… с. 13.

44 ДАРФ. Ф. 5999. Воп. 1. Спр. 2. Арк. 26.

45 Пупкевіч А. Дзённік // Гістарычны 1991. № 5. с. 177.

46 Архівныя крыніцы БНР (фонд № 582 Дайнавскага Архіву Літвы «Рада Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі» у Вільні – Нью-Ёрк–Менск–

У сакавіку 1919 г. Якавюк купіў дом за 15 тысяч расійскіх рублёў[51]. Магчыма, гэта была камяніца на вуліцы Садовай, цяпер Леніна, 17[52]. Вацлаў Пануцэвіч узгадвае таксама канюшні Якавюка, дзе размяшчалася частка эскадрона беларускага палка М.Улінскага[53].

За наступныя некалькі месяцаў у палітычнай сітуацыі ў Гарадзеншчыне адбыліся значныя змены. У красавіку горад пакінулі немцы, і амаль адразу кантроль над горадам захапілі польскія ўзброеныя аддзелы. Беларускі полк фактычна падпарадкаваўся палякам. Я. Варонка і А. Луцкевіч пакінулі Гарадню.

Адзінай значнай беларускай арганізацыяй засталася Цэнтральная беларуская рада Гарадзеншчыны, створаная 16 сакавіка 1919 г. з ініцыятывы А. Луцкевіча. с. Якавюк на арганізацыйным пасяджэнні Рады прадстаўляў Гарадзенскую управу [*не зразумела*]. Старшынём Рады з самага пачатку быў абраны П. Алаксюк, які не хаваў сваіх праўдзівых поглядаў. У сваёй ён пачаў прапагандаваць ідэю незалежнасці Беларусі, выступаў супраць падпарадкавання палякам аб супрацоўніцтве.

Для стварэння дэлегацыі Алаксюк склікаў прэзідыум Цэнтральнай беларускай рады Гарадзеншчыны (Алаксюк, Фохт, Зянковіч, Якавюк). с. Якавюк, прадчуваючы перспектыву беларускага ўгодніцтва перад палякамі, выказаўся супраць стварэння дэлегацыі. Ён прапанаваў вырашыць пытанне аб дэлегацыі на пленуме Рады, пэўна ведаючы антыпольскую арыентаванасць большасці беларускіх дзеячаў і быўшы ўпэўненым, што там дэлегацыю стварыць не дадуць. Іншыя сябры прэзідыума гэтую прапанову адкінулі і, стварыўшы дэлегацыю, выехалі ў Варшаву. с. Якавюк вырашыў скарыстацца нагодай:

Аб выездзе дэлегацыі, – пісаў ён Варонку, – я паведаміў: Беларускую Управу, «Бацькаўшчыну» (назва мясцовай газеты. – **Аўт.**), *«Духоўны Звяз», аддзел уцекачоў, настаўніцкае сабранне і камітэты: чыгуначнікаў, паштовых і шасовых дарогаў. На агульным сабранні арганізацыі вынеслі станоўчы пратэст*

47 Чарнякевіч А. Гарадзенскія абсталы… с. 16–17.

48 Lietuvos Respublikos Užsienio reikalų ministerija. № 125 Pažymėjimas [*пасведчанне с. Якавюку ад 05.01.1932 г.*].*

49 Спіс [*не зразумела*] 1933 г.*

50 Там жа.

51 З гэтага 1923 г. 25 тысяч.

52 Чарнякевіч А. Гарадзенскія абсталы… с. 41.

53 Пануцэвіч В. Горадзеншчына ў нацыянальным руху ў 1918–1919 гадох // Пагоня. 1994. № 6.

54 Спіс [*не зразумела*] 1933 г.*

такога самазванага ўчынку прэзідыі Цэнтральнай рады Гродзеншчыны і даручылі мне зрабіць Вам (міністру беларускіх справаў) даклад аб тым, што ўсе гарадзенскія беларускія арганізацыі ўважаюць гэтую «дэлегацыю» няпраўнай, а ўсе заявы, ёй зробленыя, незаконнымі, ды прасіць Вас пераслаць гэты наш пратэст каму патрэбна[55].

Падобныя дзеянні, мабыць, прычыніліся да таго, што на арганізаваным Алексюком у ліпені 1919 г. «кангрэсе» Гарадзеншчыны і Віленшчыны ён нават не быў выбраны ў склад новай Управы Цэнтральнай рады[56] . Ягоныя планы аб супрацоўніцтве з палякамі цалкам праваліліся. Аднак і палякі, якія ўжо ў чэрвені пачалі арышты беларускіх дзеячаў, не даравалі гэтага і с. Якавюку. Паводле словаў настаўніка Я. Антонава, с. Якавюк быў арыштаваны 18 ліпеня 1919 г. У той жа дзень былі схоплены віцэ-старшыня Гарадзенскай управы У. Боеў, протаярэй І. Карчынскі і шэраг іншых асоб, сярод якіх рэстаратар Бахановіч, генеральша Пурыхава, домаўласнік Якімовіч і г. д. Апошнія ж з беларускай дзейнасцю, па ўсёй бачнасці, не былі звязаныя. Агулам у гэты час у польскіх вязніцах і канцэнтрацыйных лагерах апынулася больш за 2 тысячы жыхароў Гарадзеншчыны і Віленшчыны[57].

Якавюк, разам з многімі афіцэрамі Беларускага палка (у тым ліку М. Дзямідавым і палкоўнікам Антонавым) быў адпраўлены ў канцэнтрацыйны лагер «Станцыя раздзельная» ў Беластоку. Умовы ўтрымання ў лагеры былі жудасныя. Ад няспынных эпідэмій тыфу і дызентэрыі за дзень часам памірала па 50–70 чалавек. Са словаў таго ж настаўніка Антонава, з 3 тысяч вязняў у кастрычніку 1919 г. да пачатку лютага 1920-га памерла 2 тысячы чалавек…

Сітуацыя пачала крыху паляпшацца толькі прыблізна з пачатку 1920 г., калі лагер наведала спачатку амерыканская місія, а пазней камісія па звальненні вайскоўцаў і цывільных грамадзянаў. Верагодней за ўсё, Сымон Якавюк, як лейтэнант камендатуры Беларускага палка, апынуўся ў так званым «афіцэрскім» бараку, дзе ўмовы былі лепшымі – барак знаходзіўся не за калючым дротам, а арыштаваныя былі звязаныя кругавой парукай. Яны самі атрымлівалі прадукты і

[54] Чарнякевіч А. Гарадзенскія ўспаміны. Ў 1919 г. // Пагоня. 1994. № 10.

[55] Пануцэвіч В. Горадзеншчына. // Пагоня. 1994. № 10.

[56] Тамсама.

[57] Пануцэвіч В. Горадзеншчына. // Пагоня. 1994. № 11.

мелі магчымасць варыць сабе ежу. Тым не менш, з 12 жыхароў барака дзевяць захварэлі на тыф, з іх 3 – памерлі[58].

Мы не маем звестак з жыцця Якавюка на працягу наступнага паўгода. Вядома толькі, што бюлетэнь Цэнтральнай Беларускай рады Віленшчыны і Гарадзеншчыны ад 22 верасня 1919 г. надрукаваў тэлеграму Якавюка, у якой той паведамляў пра намер Гарадзенскага аддзялення дэфензівы выслаць яго ў берасцейскі лагер і прасіў аб дапамозе[59].

[58] Панцэвіч В. Гарадзеншчына… // Пагоня. 1994. № 12.

[59] Чарнякевіч А. Постаці беларускага нацыянальнага руху ў Гародні 1909–1939 г.: Біяграфічны даведнік / Гарадзенскі Клуб ежа ў Гродна. Гарадзенскае аб'яднанне «ВІТ», 2003. с. 278.

[60] Чарнякевіч А. Гарадзенскія пісьмы… с. 33.

Гарадзенскія беларусы, застаўшыся ўбаку ад буйных палітычных баталій, спрабавалі аб'яднацца. Цэнтрам гэтага аб'яднання стаў вернуты да жыцця БНК. 28 сакавіка 1920 г. адбыліся перавыбары Нацыянальная камітэта, вынікі якіх сведчаць, што кіраўніцтва беларускім рухам у Горадні ўзялі ў свае рукі людзі, якія раней знаходзіліся на другіх ролях. У склад БНК аднагалосна быў абраны Сяргей Баран (Баранаў), Сымон Якавюк, атрымаўшы 94 галасы (другі вынік пасля Барана), Лукаш Дзекуць-Малей і іншыя[60].

У пачатку чэрвеня 1920 г. Сымон Якавюк, як прадстаўнік бацькоўскага камітэта, увайшоў у склад Гарадзенскай беларускай настаўніцкай рады[61]. Гэта дае падставы меркаваць, што сын Сымона Якавюка Канстанцін, якому было ў той час дзевяць гадоў, навучаўся ў беларускай школе. Невядома, у якіх стасунках быў Гарадзенскі БНК з польскай адміністрацыяй горада, аднак тады ён быў легальнай арганізацыяй.

Нечакана хуткі наступ Чырвонай Арміі ў пачатку ліпеня 1920 г. на нядоўгі час усталяваў у горадзе савецкую ўладу. У жыцці Сымона Якавюка гэтыя два месяцы былі напоўненыя неадназначнымі і шмат у чым супярэчлівымі падзеямі. Гэты перыяд найбольш яскрава асвечаны ў матэрыялах «працэсу 45-ці», калі польскія абвінаваўцы з асаблівай цікавасцю прыглядаліся да дзейнасці падсуднага Якавюка ў час савецкага панавання.

[61] Тамсама. с. 32.

Бальшавікі знаходзіліся ў Горадні з 24 ліпеня па 26 верасня 1920 г. і імкнуліся ажыццявіць у горадзе рэвалюцыйныя перамены (стварэнне гарадзенскага рэўкама са шматлікімі аддзеламі і пададдзеламі, нацыяналізацыя прадпрыемстваў і інш.). Натуральна, яны варожа паставіліся да такой «буржуазна-нацыяналістычнай» і легальнай пры паляках арганізацыі як Гарадзенскі БНК. Больш за тое, са словаў сведкі на «працэсе 45-ці» Р. Зямкевіча, сябры БНК, летам 1920 г. адной з прычынаў такой варожасці было тое, што «камітэт меў урадавае падтрыманне ў першыя часы польскай улады. З гэтай прычыны камітэт пры бальшавікох не існаваў, а вісеў на валаску»[62].

З паказанняў сведкі с. Рак-Міхайлоўскага таксама вынікае, што «ў часе бальшавікоў Камітэт не функцыянаваў»[63]. Як сведчаць далей Р. Зямкевіч, с. Баран і с. Якавюк ажыццяўлялі кіраўніцтва БНК (С. Баран у якасці старшыні, с. Якавюк як сакратар), за што, пэўна, і былі арыштаваныя «асобым аддзелам» Вялікага рэвалюцыйнага камітэта. Ёсць і іншая версія, што да жыцця (а магчыма, і прычыны арышту) Сымона Якавюка летам 1920 г. у Горадні. Яе прапаноўвае нам згаданы ўжо Зямкевіч, збіральнік беларускай этнаграфічнай спадчыны, добры знаёмы В. Ластоўскага, а па сумяшчальніцтве агент дэфензівы: *Запытаны пра Якавюка, я пацвердзіў, што ведаю яго з Горадні з 1920 г., дзе ён быў сакратаром Беларускага нацыянальнага камітэту ў Горадні. Я сказаў, што ён быў маім падначаленым чыгунцы ў 1920 г. пры бальшавіках і працаваў на тэлеграфе. Я катэгарычна засведчыў, што прысутны пасол сойму Сымон Якавюк у 1920 г. не ставіўся варожа да Польскай Дзяржавы ні як член Беларускага камітэта, ні як начальнік чыгуначнага тэлеграфа ў Горадні, а пацвердзіць гэта магу тым, што ён ведаў, што ў мяне працуюць два афіцэры і некалькі жаўнераў-акружэнцаў з польскага войска, і нікога не толькі не выдаў бальшавікам, але змест усіх тэлеграм, якія праходзілі па адзіным чыгуначным тэлеграфе, паведамляў мне, што я потым паведамляў афіцэрам, а праз іх і Польскай арганізацыі вайсковай. Я дадаў, што Якавюк быў і ёсць беспартыйным, пры паляках на чыгунцы як праваслаўны служыць не мог і сродкі да жыцця здабываў пры дапамозе гандлю і дробнай спекуляцыі*[64].

[62] Нашанаш. 1923. № 5.

[63] Гарадзенскі жыццё. 1923. № 6.

Цікава таксама адзначыць, што с. Якавюку «надта пашкодзіла знойдзеная бальшавікамі ў яго ў часе ператрусу пропіска імя Начальніка Дзяржавы Пілсудскага па прыватнай справе». Варта звярнуць увагу і на тое, што Сяргей Баран быў старшынём юрыдычнага аддзела ВРК (структуры цывільнай рэвалюцыйнай улады). І тым не менш, ён таксама трапіў арышт[66].

Звяртаючыся да лёсу с. Якавюка, скажам, што, паводле яго асабістых сведчанняў, у савецкім астрозе яму давялося прабыць каля аднаго месяца[67]. Бальшавікі, пакідаючы Горадню, вывезлі Сымона Якавюка і Сяргея Барана, са словаў с. Рак-Міхайлоўскага, у кірунку Ліды[68]. Р. Зямкевіч кажа, што іх абодвух накіравалі ў Смаленск, ён жа дадае, што с. Якавюк па дарозе ўцёк і хаваўся ў Горадні[69]. Сам уцякач удакладняў гэтую інфармацыю, указваючы, што тры дні пасля вяртання ў горад хаваўся ў Барысаглебскім манастыры[70]. Хутчэй за ўсё, гэта было да 26 верасня, калі горад занялі палякі. Такую цікавую і, на першы погляд, дакладную інфармацыю можна паставіць пад сумненне, бо яна выходзіла ад сведкаў, зацікаўленых у апраўданні Якавюка і Барана перад польскім судом.

Так ці іначай, але ўжо праз месяц пасля заняцця палякамі Горадні Сымон Якавюк далей бярэ актыўны ўдзел уновае палітычным жыцці. Праўда, кірунак ягонай дзейнасці ўжо пэўнае здзіўленне. Вядомы раней сваімі антыпольскімі поглядам, вядомы як галоўны барацьбіт з паланафільскай лініяй П. Алексюка ўлетку 1919 г., цяпер с. Якавюк ідзе на адкрытае супрацоўніцтва з Беларускім палітычным камітэтам таго ж П. Алексюка.

Восенню 1920 г. Беларускі палітычны камітэт, на чале якога стаяў П. Алексюк, скампраметаваў сябе супрацоўніцтвам з польскімі ўладамі. Сам П. Алексюк і В. Адамовіч, які ў 1923 г. будзе ўдзельнічаць у падрыхтоўцы нападу на Гродна і ў 1929 г. на генерала С. Булак-Балаховіча на ўсходняй Беларусі, падзелілі некаторых звестак, выконваў абавязкі ваеннага міністра Беларускай вайсковай арміі. Лашанскай гэтым самым

[64] Centralne Archiwum Wojskowe (CAW). Oddział II Sztabu Generalnego. Sygn. I.303.4.2664.

[65] Нашае жыццё. 1923. 6 ліпеня.

[66] Нашае жыццё. 1923. № 6.

[67] Зарава. 1923. 25 траўня.

[68] Нашае жыццё. 1923. № 5.

[69] Нашае жыццё. 1923. 5 ліпеня.

[70] Зарава. 1923. 25 траўня.

[71] Адамовіч у Аўтобіяграфіі сцвярджаў, што ён быў супраць нападу на Гродна і ў 1929 г. адмовіўся ад прапановы генерала С. Булак-Балаховіча.

[72] Архіў БНР. Дакл. № 2462.

[73] Нарыс гісторыі Беларускай вайсковай арміі. С. 36.

[74] Гэта справе вярбоўкі добраахвотнікаў у польска-беларускія вайсковыя злучэнні[71].

24 кастрычніка 1920 г. адбыўся сход Гарадзенскага БНК. Пасля дакладу В. Адамовіча сход выступіў у падтрымку «бацькі Булак-Балаховіча». Пад пратаколам сходу стаіць подпіс Сымона Якавюка, што ў той час выконваў абавязкі старшыні Камітэта[72] замест Сяргея Барана, які ўцёк ад бальшавікоў і вярнуўся ў Горадню толькі дзесьці 24–25 кастрычніка[73]. У той жа дзень у памяшканні БНК на агульным сходзе кааператыва «Беларусь» с. Якавюк быў абраны яго новым кіраўніком.

27 кастрычніка дэлегацыя Нацыянальнага камітэта ў складзе с. Якавюка і Я. Натусевіча была прынятая гарадзенскім старастам, а 5 лістапада с. Баран, с. Якавюк і Я. Натусевіч сустрэліся з начальнікам другога аддзела 3-й арміі маёрам Бернерам. Гутарка вялася наконт арыштаваных беларускіх дзеячаў[74]. Цяжка сказаць, ці была выклікана падтрымка с. Якавюком акцыі Булак-Балаховіча няздольнасцю разабрацца ў бягучай сітуацыі, ці не, але выйшла так, што Гарадзенскі БНК быў адной з нямногіх беларускіх арганізацый, якія станоўча паставіліся да гэтай авантурнай спробы адраджэння БНР паводле плана польскага Генеральнага штаба.

Відаць, пэўную карысць прыносіў с. Якавюку і ўдзел у кааператыўнай дзейнасці, якой беларускія дзеячы планавалі стварыць эканамічны фундамент нацыянальнага руху. 14 лістапада 1920 г. праходзіў кааператыўны з’езд у Горадні, і на ім быў закладзены «Саюз спажывецкіх кааператываў Гарадзеншчыны», у склад праўлення якога ўвайшлі Баран, Якавюк і інш.[75].

ПАРТЫЗАН. ПАСОЛ. ПАДСУДНЫ (1921–1923 гг.)

Падпісанне прэлімінарнай мірнай дамовы паміж савецкім урадам і Польшчай адкрыла перспектыву падзелу Беларусі на дзве часткі, супраць чаго выказвалася большасць беларускіх арганізацый, у тым ліку і Гарадзенскі БНК. Асабліва непакоіла беларускіх дзеячаў перспектыва ваенна-палітычнай стабілізацыі ў дачыненнях Польшчы і савецкай Расіі. Гэта пазбаўляла іх надзеі на дасягненне незалежнасці Беларусі. Аднак полымя польска-літоўскага канфлікту адрадзіла гэтыя спадзяванні.

[75] Чарнукевіч А. Гарадзенскія апосталы… с. 36.

[image]
Пасля захопу войскамі польскага генерала Л. Жалігоўскага Віленшчыны і стварэння там марыянеткавай «Сярэдняй Літвы», літоўскі ўрад зноў звярнуў увагу на беларускі фактар у барацьбе з палякамі, паколькі шырокія масы беларускага насельніцтва (асабліва праваслаўнага) ставіліся да адраджэння Рэчы Паспалітай выключна варожа. Супрацоўніцтва літоўцаў і беларусаў адбывалася ў палітычнай сферы (актывізацыя Міністэрства беларускіх справаў, байкот рэферэндуму аб далучэнні «Сярэдняй Літвы» да Польшчы і інш.) і ў ваеннай галіне праз узмацненне літоўска-беларускіх вайсковых адзінак на тэрыторыі Літвы і арганізацыю антыпольскага партызанскага руху ў Заходняй Беларусі. Менавіта ў апошнім суджана было адыграць пэўную ролю і с. Якавюку.

Яшчэ ў пачатку 1921 г. Гарадзенскі БНК дзейнічаў цалкам легальна. Захавалася праграма спектакля-балю Дабрачыннага аддзела пры Беларускім нацыянальным камітэце на карысць беларускага прытулку ў Горадні, які меўся адбыцца 9 студзеня 1921 г. Драматычнай секцыяй пры Грамадзе беларускай моладзі рыхтавалася пастаноўка «Паўлінкі», далей былі запланаваны танцы. «Распараджальнікам» гэтага мерапрыемства быў Сымон Якавюк[76]. Менш чым праз два тыдні, 21 студзеня 1921 г., польскія ўлады зачынілі БНК. Прычыны забароны палякамі ягонай дзейнасці невядомыя, аднак выглядае на тое, што ў палякаў былі пэўныя падазрэнні адносна кантактаў гарадзенскіх беларусаў з літоўцамі. І гэтыя падазрэнні мелі пад сабой рэальную аснову.

Пасля закрыцця Гарадзенскі БНК працягваў працаваць падпольна. 19 сакавіка 1921 г. кіраўнік Камітэта Сяргей Тарасаў склаў на імя старшыні Рады Міністраў Літоўскай рэспублікі даклад, у якім пісаў аб закрыцці БНК і пералічваў бягучыя арганізацыі ў горадзе. У дакладзе Сымон Якавюк па-ранейшаму фігуруе як намеснік старшыні камітэта[77]. Цікава, што да даклада далучаліся каштарысы штомесячных выдаткаў на ўтрыманне Гарадзенскага БНК, Беларускай гімназіі і прытулку[78].

[76] Праграма Дабрачыннага балю Беларускім нацыянальным Камітэце на карысць беларускага прытулку ў

Гродні 9 студня 1921 г.*

Аднак літоўцы і намеснік старшыні БНК с. Якавюк мелі куды больш сур'ёзныя планы, чым фінансавая падтрымка беларускай адукацыі. Яшчэ ў канцы 1920 г. літоўцы падзялілі ўсю акупаваную палякамі тэрыторыю на чатыры ўчасткі, у кожным з якіх было прызначана асобнае камандаванне для арганізацыі дыверсійных акцый і партызанскага руху. Заходняя частка Гарадзеншчыны ўвайшла ў склад чацвёртага ўчастку «Ліда–Горадня–Друскенікі» са штабам у Мерачы, на чале якога стаяў старшы лейтэнант літоўскай арміі Сяргей Хмара-Разумовіч. Акурат с. Разумовіч у дакладзе начальніку літоўскага генеральнага штаба, датаваным 19 лютага 1921 г., акрэслівае месца і ролю Якавюка ў дзейнасці літоўска-беларускага падполля:

Вся созидательная работа главным образом была мною сосредоточена в Гродне, где моими помощниками являлись вице-старшина гродненского Национального комитета Яковюк, а также члены правления Белорусского кооператива: Ильючек, Юречко, Чулков, Карпович, а в Ковна чиновник Министерства беларуских спрау Козячий и священник Корчинский, а также член (закрэслена) *Боев* (апошнія два прозвішчы закрэслены. – **Аўт.**). *После разгона поляками Национального комитета Яковюк, как вице-старшина, во избежание ареста поляками, бежал в феврале с. г. из Гродна и прибыл в Ковна, сообщил мне фамилии командиров взводов и места, где они образованы*[79].

Наступная вядомая нам паездка Якавюка на тэрыторыю Літвы адбылася перад Вялікаднем (верагодна, праваслаўным), у штаб Беларускага асобнага батальёна, які размяшчаўся ў мястэчку Сярэях.

С. Разумовіч апісваў гэтае спатканне так:

Перед св. Пасхой из Ковно прибыл предс. Союза литовских стрелк[ов] г. Путвинский со своим помощн. г. Михалкевиче[м] на совещан[ие] со мною и вызванным к этому времени из Гродно начальн[и]ком отдела г. Яковюком и его заместителем г.

77 Архіды БНР. Дак. № 2672.

78 Тамсама. Дак. №№ 2673–2674.

79 ДАРФ. Ф. 650. Воп. 1. Спр. 2. Арк. 1 адв.

Меленкевиче[м] (…). *Совещание состоялось у [ме]ня на квартире и затянулось до 3–4 ч. утра. Затем гг. Яко[вюк] и Меленкевич были отвезены на автомобиле к границе, а г[г]. Путвинский и Михалкевич на том же автомобиле уехали обратно в г. Ковно*[80].

Прыкладна ў гэты прамежак часу с. Якавюк атрымаў адрэс Разумовіча на патрэбы арганізацыі 60–70 тысяч остмарак (прыкладна 1000 долараў ЗША).

[80] Архівы БНР. Дак. № 3652.

Са словаў намесніка с. Якавюка А. Мілінкевіча, недзе ў лістападзе ці снежні 1921 г. яны абодва, перасекшы мяжу, наведалі Мерач, дзе перадалі с. Разумовічу справаздачу за атрыманыя грошы[81]. Варта запомніць гэты факт, бо «грашовыя справы» Сымона Якавюка ўсплывуць яшчэ неаднаразова.

Усе ўзгаданыя матэрыялы сведчаць аб немалой ролі с. Якавюка ў стварэнні падпольнай паўстанцкай арганізацыі на Гарадзеншчыне. Больш за тое, с. Разумовіч кажа пра яго як пра свайго намесніка на акупаванай палякамі тэрыторыі, як мінімум з пачатку 1921 г.

[81] Справка [*складзена ў 1933 г.*].

У пачатку сакавіка 1922 г. польскія ўлады правялі шэраг арыштаў, фактычна разграміўшы беларускую падпольную арганізацыю. Большасць затрыманых паходзілі з мястэчак Крынкі і Саколкі і іх ваколіц.

Апрача шараговых сяброў арганізацыі была арыштаваная кіраўнічка «Беларускага брацтва» Вера Маслоўская. У сувязі з гэтай справай у 1922 г. на некаторы час быў затрыманы с. Баран. Увогуле, пра дзейнасць Сымона Якавюка ў першай палове 1922 г. вядома няшмат. Вясною 1922 г. ён працаваў сакратаром адваката Самарына ў Горадні на вуліцы Паўночнай, 17, не забываючыся, аднак, і пра беларускую справу. Так, 1 сакавіка таго ж года Сымон Міхайлавіч бярэ ўдзел у арганізацыйным пасяджэнні Гарадзенскага камітэта Беларускага таварыства дапамогі ахвярам вайны, а ў сярэдзіне сакавіка нават арыштаваны палякамі разам з іншымі гарадзенскімі беларускімі дзеячамі, але ўжо 24 сакавіка выпушчаны на волю. Тое, што ўлады ўжо тады лічылі с. Якавюка небяспечным і нелаяльным да польскай дзяржавы

чалавекам, пацвярджаецца і тым фактам, што 28 сакавіка 1922 г. следчы Я. Ясінскі звяртаўся да каменданта паліцыі ў Горадні з прапановай арганізаваць за Якавюком тайны нагляд[82].

Удзельнікі падполля на чале з Германам Шыманюком (атаман Скамарох), якія не трапілі ў рукі паліцыі, арганізавалі адзеі, які ў красавіку-маі 1922 г. дзейнічаў на поўдні Беларускай пушчы, аднак хутка быў разбіты палякамі. Але Якавюк сваёй дзейнасці не спыніў.

Квартальныя справаздачы гарадзенскай павятовай паліцэйскай камендатуры за 1922 г. паведамлялі аб пашырэнні сярод насельніцтва злачыннай агітацыі, якая праводзілася «асобамі з левага лагеру, на чале якіх стаяць Баранаў, Якавюк і іншыя, якіх падтрымлівае ўрад Ластоўскага ў Коўна»[83].

Найвялікшым дасягненнем такой агітацыі стаў поспех на выбарах у сойм у лістападзе 1922 г., калі Сымон Якавюк і Сяргей Баран былі абраныя пасламі (дэпутатамі) у вёсы найвышэйшы заканадаўчы орган Другой Рэчы Паспалітай.

Адбывалася гэта так. 5 верасня 1922 г. у Горадні прайшоў з'езд прадстаўнікоў акруговых і павятовых беларускіх выбарчых камітэтаў Беластоцкага ваяводства, дзе было вырашана далучыцца да пастановы Беларускага цэнтральнага выбарчага камітэта (БЦВК) у Вільні аб удзеле ў выбарах разам з іншымі нацыянальнымі меншасцямі[84].

Аўтарытэт с. Якавюка і с. Барана паспрыяў таму, што яны ўзначалілі спісы кандыдатаў ад Блока нацыянальных меншасцяў. с. Якавюк стаў на першым месцы ў спісе па

[82] Чарадзеіч А. Пасляпі беларускага нацыянальнага руху ў Гродне 1909–1939 гг.… с. 279.

[83] Тоўсць с. Беларуская вёска на мяжы эпох: Змены этнічнай самаевядомасці сялянства ва умовах распаду традыцыйнага аграрнага грамадства (на матэрыялах Гарадзеншчыны 19 – перш. трэці 20 ст.). – Гродна, 2003. с. 106.

[84] Кнупіса. 1922. № 2.

Бельскай выбарчай акрузе[85].

«Крыніца» гэтак характарызавала дзейнасць Сымона Якавюка, пачынаючы з 1918 г.:

*Кіпіў 1918 г. Ён з'яўляўся адным з арганізатараў беларускіх арганізацый у Гародні. Прадстаўнік Гародні на Усебеларускім з'ездзе. Прадстаўнік Гародні на Усебеларускай канферэнцыі. Член Беларускага нацыянальнага камітэта. Член Беларускага нацыянальнага камітэта ў Гародні. Член Беларускага нацыянальнага камітэта ў Гародні. Член Беларускага нацыянальнага камітэта ў Гародні

выбараў і вызначыла шляхі далейшай дзейнасці. Аднак фактычна яна актыўнай дзейнасці не разгарнула, і вядучыя пазіцыі ў беларускім руху на пэўны час перайшлі да Беларускага пасольскага клуба[91].

[image]

Пачаткам палітычнай работы БПК можна лічыць 23 студзеня 1923 г., калі Браніслаў Тарашкевіч з соймавай трыбуны прадставіў праграму Клуба.

[91] БДАЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 210. Арк. 372 адв.

Пасольская дзейнасць Сымона Якавюка працягвалася ўсяго некалькі месяцаў і была перапынена «працэсам 45-ці». Як спецыяліст-чыгуначнік, ён працаваў у камунікацыйнай камісіі сойма, што займалася пытаннямі шляхоў зносін[92], і разам з с. Баранам 17 красавіка 1923 г. паспеў падаць інтэрпеляцыю (зварот-скаргу да старшыні сойма) у справе ўрэгулявання прэтэнзій жыхароў яго родных Дубінаў адносна зямлі, занятай урадам пад хімічную фабрыку[93].

Як сцвярджае гісторык Д. Фіёнік, с. Якавюк таксама каардынаваў справу вяртання царкоўнай маёмасці (у прыватнасці, званоў), якая была вывезена ў Расію ўлетку 1915 г.[94]. Наогул падчас працы ў сойме і шмат гадоў пасля с. Якавюк цікавіўся справамі праваслаўнай царквы, выступаў яе абаронцам.

Гэта, аднак, не перашкаджала яму браць актыўны ўдзел у міжсобнай барацьбе гарадзенскіх, а пасля літоўскіх праваслаўных духоўнікаў. Так, вясной 1923 г. Якавюк выступіў на баку архірэя Уладзіміра супраць гарадзенскага святара Лепцкага, якога абвінавачвалі ў прыхільнасці да палякаў, і удзельнічаў у нападзе праваслаўных фанатыкаў на яго дом[95]. Старыя сувязі с. Якавюка з літоўцамі, магчыць, таксама паспрыялі таму, што ў лютым 1923 г. ад імя ВНК ён быў накіраваны ў Коўна для ўсталявання кантакту з літоўцамі, так і з урадам ВНР у асобе В. Ластоўскага[96].

[image]

Гарадзенскі палацовы ансамбль Сыгізмунда I Старога. Фота пач. XX ст.

[92] Posłowie i senatorowie… S. 278.

[93] Інтэрпеляцыі Беларускіх паслоў у польскі сойм 1922–1926 гг. Зборнік дакументаў аб панскіх гвалтах, катаваньях і зьдзеках над сялянамі і рабочымі ў Заходняй Беларусі. — Менск: Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва, 1927. с. 32.

[94] Фіёнік Д. Эвакуацыя царкоўнай маёмасці ў 1915 годзе і спробы яе вяртання пасля 1921 года на прыкладзе Беласточчыны.

[95] CAW. Oddział II Sztabu Generalnego Sygn. I.303.4.2664.

[96] Гарадзенскі Сядзь. Ф. 303. Воп. 1. Спр. 147.

[97] Гл. таксама Sygn. I.303.4.2475. К. 169.

Такі спакойны, на першы погляд, пасцюлова змушалі яго сяброў адносна вырашэння самых набалелых пытанняў, што стаялі перад «беларусамі пад

Польшчай».

Пытанне «З кім будуць беларускія паслы?» асабліва цікавіла і польскія спецслужбы, якія адносна кожнага прадстаўніка беларусаў у сойме спрабавалі скласці пэўнае меркаванне. Скажам адразу, наконт с. Якавюка нічога зрабіць не атрымалася. Так, паводле аднаго з даносаў, разам з П. Мятлой, В. Рагулем і с. Бараном с. Якавюк уваходзіў у склад камуністычнай групоўкі БПК[97]. У другім паведамленні чытаем: «Ворагам палякаў не з'яўляецца. У поглядах памяркоўны сацыяліст. Імкнецца да культурнай і эканамічнай аўтаноміі для беларусаў»[98]. І яшчэ цікавей – у адной зводцы с. Якавюк быццам бы папракае старшыню Клуба Б. Тарашкевіча за ўгодніцтва перад палякамі. У другой выказвае незадавальненне тым, што той жа Тарашкевіч устаўляе ў свае прамовы «маскоўскія» акцэнты.

І цяпер не разабрацца, што адлюстроўвае падобная стылістыка: ці ўменне хаваць перад палітычнай паліцыяй свае погляды, ці поўную адсутнасць такіх поглядаў. Праўда, самі палякі схіляліся да другога: «Вядомы сярод людзей як спекулянт, чалавек, які хоча добра жыць і нічога не рабіць; у Горадні ён не папулярны, а ў Сакольскай акрузе, адкуль прайшоў у сойм, наогул невядомы. Скамбінаваў пасла – паставіў сябе на спіс № 16 на першае месца тым, што даў грошы настаўніку, які стаяў у спісе першы, і той адмовіўся на карысць Якавюка»[99]. Ад сябе дадамо толькі, што гэтым «беларускім настаўнікам», хутчэй за ўсё, быў У. Федарук, настаўнік беларускай школы ў Горадні. Пасля верасня 1939 г. ён трапіў пад сталінскія рэпрэсіі. Суд, а пасля ўцёкі з Польшчы перарвалі дэпутацкую кар'еру Сымона Якавюка. 15 траўня 1925 г. ягоны пасольскі мандат страціў сілу[100].

[98] Там самае. Ягоны ці I.303.4.2660.

[99] Там самае. Кулінят. I.303.4.2664.

Не зважаючы на тое, што Сымон Якавюк і Сяргей Баран сталі пасламі, прывід падпольнага мінулага працягваў вісець над імі. Арыштаваныя беларускія партызаны чакалі суда ў беластоцкай і гарадзенскай вязніцах. Ужо 9 сакавіка 1923 г. «Gazeta Wileńska» надрукавала зацемку пра тое, што Сымон Якавюк ёсць тайным агентам Літвы. Такая выснова была зробленая на падставе справы Станіслава Пузырэўскага, які быў

прыгавораны судом у Коўне да катаргі за тое, што, будучы супрацоўнікам тайнай польскай паліцыі, перашкаджаў рабоце беларускага дзеяча Якавюка[101]. Выснова, зробленая газетай, добра зразумелая. Дзеля чаго ж было заступацца літоўцам за нейкага беларускага дзеяча? Паліцыя і дэфензіва працягвалі следства, сабраўшы патрэбную колькасць доказаў, каб прыцягнуць да крымінальнай адказнасці абодвух дэпутатаў.

Судовы пераслед с. Якавюка і с. Барана быў распачаты перад 13 сакавіка 1923 г. Менавіта ў гэты дзень паслы-беларусы кс. А. Станкевіч і М. Кахановіч ужо падалі ў Сойм інтэрпеляцыю з патрабаваннем скасаваць гэтую судовую справу[102]. Яна ніяк не падзейнічала на кіраўніцтва парламента Другой Рэчы Паспалітай, бо праз тыдзень, 20 сакавіка, усё той жа Адам Станкевіч і на гэты раз сам Сяргей Баран выступілі ўжо з іншай прапановай: аб неабходнасці паскорыць разгляд судовых справаў беларускіх паўстанцаў[103]. Суд сапраўды пачаўся даволі хутка – 14 траўня таго года ў Беластоку, але і Сымон Якавюк, і Сяргей Баран апынуліся на лаве падсудных у ліку 45-ці абвінавачаных[104].

Абодва яны падчас суда знаходзіліся на волі, бо рашэнне ўзяць іх пад варту мог вынесці толькі сойм. Абаронцам паслоў быў пляменнік рэвалюцыянера Валерыя Урублеўскага знакамітых віленскі адвакат Тадэвуш Урублеўскі, які яшчэ ў 1906 г. спрабаваў выратаваць у судзе жыццё лейтэнанта Шыманюка. Абвінавачванне грунтавалася асноўным чынам на показаннях правакатара Эдварда Лянкевіча і звестках, атрыманых ад агентаў дэфензівы. Э. Лянкевіч увайшоў у беларускую арганізацыю ў снежні 1921 г. і ў лютым 1922 г. «здаў» яе палякам. Большасць арыштаваных трапіла пад суд, дзякуючы сведчанням Лянкевіча і спісам, знойдзеным пасля разгрому аддзела Германа Шыманюка ў Белавежскай пушчы.

Непасрэдных доказаў вінаватасці Сымона Якавюка і Сяргея Барана не было. Адзіным рэчавым доказам супраць Сымона Якавюка быў спіс, знойдзены падчас ператрусу ў Васіля Кажанава, які падазраваўся ва ўдзеле ў падрыхтоўцы паўстання. У спісе насупраць прозвішча с. Якавюка быў зроблены надпіс «Рэв. ком.», які польскі абвінаваўца патлумачыў як «Рэвалюцыйны камітэт», а не «Рэвізійная

[100] Rozkaz 13 sekcji Wileńskiej.
[101] Gazeta Wileńska, 1923, 9 marca, № 55.
[102] Інтэрпэляцыі Беларускіх паслоў у Сойм.
[103] Krynica, 1923, № 3.
[104] Міранові Я. Партызаны ці тэрарысты? // Ніва, 2000, № 20.
[105] Клейн Б. Найдено в архиве. – Минск: Беларусь, 1968, с. 132.

камісія»[106].

Капітан другога аддзела генеральнага штаба ў Горадні Ярэцкі сведчыў: «Ёсць звесткі, дастаўленыя ў наш штаб былым афіцэрам расійскай арміі капітанам Лазаравым, падуладным мне агентам, аб шэрагу асоб, якія ў якасці літоўскіх шпіёнаў служаць за грошы літоўскага ўрада». У ліку гэтых асоб на адным з першых месцаў фігуруе Сымон Якавюк[107]. Ярэцкі гаворыць таксама пра 18 найбліжэйшых супрацоўнікаў Барана і Якавюка, якія падазраваліся ў шпіянажы на карысць Літвы і савецкай Расіі[108]. Цяжка нешта сцвярджаць аб набліжаных да с. Барана людзях. Аднак ніхто са згаданых с. Разумовічам у ягоным рапарце ад 19 лютага 1921 г. памагатых с. Якавюка на лаву падсудных не трапіў. Больш за тое, іх імёны (апрача протаярэя І. Карчынскага) увогуле не згадваюцца ў матэрыялах следства. З усіх падсудных асоба с. Якавюка звязваецца толькі з Бараном. Ніхто з абвінавачаных паказанняў супраць с. Якавюка не даў.

Тым не менш, дэфензіва ў асобе капітана Ярэцкага была абсалютна ўпэўненая ў вінаватасці Якавюка і Барана:

Усе данясенні агентаў з розных бакоў, усе паведамленні – афіцыяльныя, сакрэтныя, прыватныя, польскія, літоўскія, беларускія – усе ў адзін голас гавораць аб іх выдатнай ролі ў працівапольскай дзейнасці. Гэтыя дзве асобы – цэнтр усяго, што рабілася ў Гродзеншчыне ў сэнсе рэвалюцыйнай дзейнасці проціў Польшчы. Дзеля гэтага і былі абраны ў сойм, як самыя папулярныя дзеячы паказанага тыпу. Агент Лазараў, якому было дадзена спецыяльнае даручэнне, выясніў, што абодва атрымалі грошы з Коўні[109].

На свой жаль, Ярэцкі не мог даваць дакладнай інфармацыі аб дзейнасці сваіх сакрэтных агентаў, што ва ўмовах хаця б адноснай дэмакратычнасці суда сур’ёзна падрывала доказную базу абвінавачвання.

Інфарматар Ярэцкага электратэхнік Вацлаў Мазуркевіч, сусед Сымона Якавюка, паказаў, што паводле звестак упраўніка дома, у якім жыў Якавюк, у кватэры апошняга адбываліся тайныя сходы беларусаў, куды нікога з старонніх не пускалі, і якія наведваў Сяргей Баран[110].

[106] Ярэцкі. Там сама.

[107] Нашае жыцьцё. 1923. № 6.

[108] Там сама.

[109] Там сама.

Самую канкрэтную інфармацыю аб падпольнай дзейнасці Якавюка даў суду галоўны сведка абвінавачвання Э. Лянкевіч, які не меў ніякіх асабістых кантактаў з Якавюком, аднак паспеў наведаць Мерач, дзе даволі грунтоўна ўзгарыў з самім с. Разумовічам. Наогул варта адзначыць, што зробленая Лянкевічам «класіфікацыя» палітычных плыняў у падпольнай арганізацыі вызначаецца немалой арыгінальнасцю. Ён вылучаў тры асноўныя групоўкі. Першая на чале з Якавюком – «расійска-манархічная», другая – Алексючанкі – «савецка-расійская» і трэцяя – Разумовіча – «літоўская». Прычым правакатар зазначае, што гэта «тры самастойныя і незалежныя адна ад другой асобныя беларускія арганізацыі Якавюка; Алексючанкі і ці то Разумовіча, ці то Ластоўскага»[111]. Апошняе, у сваю чаргу, дрэнна суадносіцца са звесткамі пра падпарадкаванасці Якавюка Разумовічу, ператварачы ўсю гэту гісторыю ў сапраўдны дэтэктыў.

[110] ДАРФ. Ф. 5999. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 1.

[111] Нашае жыццё. 1923. № 6.

У судовай залі Лянкевіч пераказаў пачутыя ім 10 лютага 1922 г. у Мерачы словы Разумовіча пра Якавюка: «Гаварыў у Штабе сам Хмара, што Якавюк узяў у яго 70 000 нямецкіх марак, абяцаў закупіць аружжа і ўзброіць штосьці 30 ці 60 тысяч чалавек, але што з імі зрабіў, невядома»[112].

Як бачым, існуе яўная супярэчнасць з ужо цытаванымі звесткамі Мілінкевіча аб тым, што яны з Якавюком ужо ў 1921 г. вазілі Разумовічу справаздачу з гэтай сумы.

[112] Нашае жыццё. 1923. № 5.

Паспрабуем прасвятліць сітуацыю. З верасня 1920-га да вясны 1923-га г. Разумовіч перадаў падпольшчыкам прыкладна 2400 долараў[113]. Выходзіць, што ў руках Сымона Якавюка апынулася ледзь не палова ўсёй гэтай сумы (1000 долараў), і куды падзеліся гэтыя грошы, мы не ведаем. Э. Лянкевіч сцвярджаў, што Якавюк купіў на гэтыя сродкі ў Горадні два дамы[114]. Калі грунтавацца на гэтых паказаннях Лянкевіча, то ў лютым 1922 г. паміж Разумовічам і Якавюком сувязь ужо адсутнічала. Акрамя таго, Лянкевіч паведаміў, што ў гэты час у штабе чацвёртай групы ў Мерачы хадзілі размовы пра тое, што Якавюк працуе на два фронты і «наогул, казалі, што ён чалавек няпэўны»[115]. Сітуацыю яшчэ больш заблытвае меркаванне пра існаванне трох «самастойных» арганізацый…

Ужо падчас новага следства па справе Якавюка ўвосень 1923 г. з падобнымі паказаннямі выступіў нейкі с. Новік, які ведаў пра суду словы беларускага міністра Я. Варонкі аб тым, што Якавюк і доктар Бялецкі прысвоілі грошы для беларускіх афіцэраў літоўскай арміі, за якія першы купіў дом і быццам бы нават рэстаран[113].

Ананіч у падалі са сцверджаннямі Э. Лянкевіча і с. Новіка словы міністра Варонкі[114]. У падвалах кнігарні ў Вільні, што прагучалі на пасяджэнні Беларускага навуковага таварыства ў Вільні амаль праз год пасля суда, у красавіку 1924 г. Гэты літовец акурат і паведаміў віленскім беларусам, што с. Якавюк прысвоіў выдадзеныя яму на паўстанне літоўскія грошы. Інфармацыя выклікала ў былых яго калегаў па БПК сапраўдны шок[115].

Так ці інакш, але прыняць у якасці доказаў гэтыя і нам цяпер не да канца зразумелыя довады дэфензівы і правакатара суд не змог. А звязаць дзейнасць Якавюка з дзейнасцю створанай у канцы 1921-га – пачатку 1922-га г. у ваколіцах Крынак і Саколкі падпольнай арганізацыі не ўдалося. Абвінавачванне за ўдзел у працы скасаванага ў студзені 1921 г. Гарадзенскага БНК у любым разе не магло быць вельмі сур'ёзным.

Пракурор патрабаваў для Сымона Якавюка бестэрміновай катаргі, аднак апошні, разумеючы ўсю слабасць доказнай базы абвінавачвання, вінаватым сябе не прызнаў, сказаў, што грошай у Коўне не атрымліваў і ўвогуле туды не ездзіў[116].

22 мая 1923 г. Беластоцкі акруговы суд апраўдаў Якавюка. Менш пашанцавала с. Барану. Рэчавых доказаў супраць яго не было, аднак вялікая грамадзянская актыўнасць, прыналежнасць да партыі беларускіх эсэраў, а таксама ўдзел у пражскай беларускай канферэнцыі ўвосень 1921 г. разам з В. Маслоўскай, якая прызнала сябе стваральніцай падполля, кантакты з урадам В. Ластоўскага, прызначэнне с. Барана на пражскай канферэнцыі на выпадак антыпольскага паўстання гарадзенскім ваяводам – усё гэта саслужыла яму дрэнную службу. Праўда, мы можам спаслацца на словы Э. Лянкевіча: «На маю прапазіцыю ўцягнуць у арганізацыю і Баранава, як віднага дзеяча ў Горадзеншчыне, Хмара сказаў, што Баранаў, як

[113] Зарава. 1923. 25 траўня.
[114] Наша жыццё. 1923. № 5.
[115] CAW. Oddział II Sztabu Generalnego. Sygn. I.303.4.2664. Kartoteka 1.
[116] Пагоня. 1924. № 4. Кн. 1. С. 24.
[117] Беларускі архіў. 1923. № 1. С. 3.
[118] Зарава. 1923. 25 траўня.

ён ведае, фантазёр, гэта – паэт і для справы некарысны»[119]. Таму можна сцвярджаць, што ў лютым 1922 г. с. Баран да падполля ўжо не належаў, або не належаў да яго ўвогуле.

[image]

Тым не менш, с. Баран быў прызнаны вінаватым і прысуджаны да шасці гадоў катаргі[120], але арыштавалі яго толькі 1923 г. Звязня ў Горадні[121]. Якавюк застаўся на волі і летам 1923 г. нават захаваў уплывы сяброў у спіс афіцэраў рэзерву польскай арміі, але 27 ліпеня таго ж года Афіцэрскі трыбунал прызнаў ягоныя паводзіны «супярэчнымі з духам статута аб асноўных правах і абавязках афіцэра войска польскага» і адхіліў просьбу[122].

«Працэс 45-ці» быў першым сур'ёзным ударам, нанесеным палякамі па БПК. Паслы дзейсна абаранялі сваіх калегаў. 2 чэрвеня 1923 г., выступаючы ў сойме, Б. Тарашкевіч заявіў: «Што датычыць пасла Якавюка, дык усе закіды адпалі, што ж да першага, Баранава, – справа яшчэ не закончаная і будзе апеляцыя»[123].

Апеляцыя сапраўды была пададзеная, але следства ўзнавілі і супраць Якавюка (9 кастрычніка 1923 г. у сойм прыйшло прапанова віленскага пракурора ў справе дазволу на новае следства супраць абодвух паслоў). Суд, які адбыўся ў Мінску, значна перагледзеў прыгавор «працэсу 45-ці» і зняволення с. Барана быў зменшаны з шасці да чатырох гадоў[124].

[119] Нашае жыццё. 1923. № 5.
[120] Krynica. 1924. № 2.
[121] Krynica. 1923. № 6.
[122] Posłowie i senatorowie... S. 278.
[123] Тарашкевіч Б. Выбранае. – Мінск: Маст. літ-ра, 1991. с. 113.
[124] Krynica. 1924. № 2.

А вось Якавюка 30 снежня 1923 г. Варшаўскі акруговы суд прысудзіў да чатырох гадоў катаржнай працы[125] (паводле іншых крыніц, прысуд быў вынесены яму 31 снежня[126]). Вядома, што ён адбываў пакаранне ў Варшаўскай цэнтральнай турме[127]. Якавюк быў адным з тых, хто ў 1925 г. падпісаў ліст-пратэст супраць гвалтаў польскіх акупантаў на Віленшчыне[128].

[125] Справы [за чатыры гады] катаржнай працы // Наша ніва. 1924. № 2.
[126] Архівы БНР. Дакум. № 3580.
[127] Інтэрнэт-старонка Беларускага гістарычнага таварыства.
[128] CAW. Oddział IKK. Strony Generalnego Sygn. 1303/4/2475. Protokuły, t. 15 (XI/A/21a/7). K. 5–6.

Пасля 1925 г. Якавюк не меў афіцыйных кантактаў з беларускімі паслами ў гэты час. Апошні дакумент, падпісаны сябрамі БПК, сярод якіх быў і с. Якавюк, датуецца 14 снежня 1923 г.[127]. Калі верыць даносам канфідэнтаў польскай паліцыі, то ў верасні 1923 г. Якавюк паспеў узяць удзел у адкрыцці праваслаўнай царквы ў Дубінах[128]. Праўда, інфарматар дэфензівы пачуў таксама плётку аб тым, што гэтую царкву Якавюк абяцаў мясцовым сялянам адкрыць яшчэ ў пачатку лета, а пасля, сабраўшы з іх

па некалькі яек, знік, за што тыя пагражалі яму судом[129].

28 верасня с. Якавюк наладзіў пасольскае веча ў Бельску, дзе заклікаў беларусаў аб’яднацца на выбарах у гмінныя рады. Паводле некаторых звестак, у гэты час ён таксама меў дачыненне да распаўсюджання на Гарадзеншыне антыпольскіх брашур, што прывозіліся з-за літоўскай мяжы[130].

[129] Тамсама. Sygn. I.303.4.2664. Podteczka 5.

[130] Тамсама. Sygn. I.303.4.2475.

[131] Рагулаў В. Учебнік. – Менск, ВЦ «Бацькаўшчына», 1993 г.

[132] Архівы БНР. Дак. № 3580.

Прадугледзець небяспеку – Менск, ВЦ «Бацькаўшчына», 1993 г. 1923 г. Сымон Якавюк уцякае праз Гданьск у Літву[131]. Палякі спахарчыць Гарадзеншчыну, мусілі яго ў знаёмых, у прыватнасці, на кватэры Р. Зямкевіча, якога абвінавачвалі ў тым, што ён параіў і дапамог выехаць «злачынцу» ў Гданьск[132]. Недавер палякаў да Зямкевіча меў пад сабою пэўную аснову, бо той, як мы ўжо казалі, у нейкай ступені сімпатызаваў нашаму герою і ў сваім паведамленні паліцыі пра дзейнасць с. Якавюка пасля арышту с. Барана падаваў яго ледзь не ахвярай паліцэйскага сваволля: «…напужаны беластоцкім працэсам, закрыў у Гродне сваю пасольскую канцылярыю, па вёсках ездзіць не хоча, агітацыю спыніў і апроч дробнай спекуляцыі нічым займацца не хоча»[133].

У святле згаданых фактаў аб палітычнай актыўнасці Сымона Якавюка ў другой палове 1923 г. гэтае сцверджанне магла вельмі насцярожыць паліцыю (нельга пакінуць па-за ўвагай і тое, што паказанні Зямкевіча нямала паспрыялі нашаму герою ў апраўдальным прысудзе ў маі 1923 г.).

[133] CAW. Oddział II Sztabu Generalnego Sygn. I.303.4.2664. Podteczka 1.

Ад гэтага часу пачынаецца новы этап у жыцці с. Якавюка, калі месцам ягонага жыхарства больш чым на 30 гадоў стала Коўна.

З АПОШНІМ УРАДАМ БНР
(1924-ТЫ – КАНЕЦ 1920-х гг.)

У пачатку 1924 г., калі с. Якавюк апынуўся ў Коўне, роля беларускіх арганізацый у замежнай палітыцы літоўскай дзяржавы была ўжо не такой значнай, як у папярэднія гады. Пасля таго, як 15 сакавіка 1923 г. Ліга Нацый фактычна прызнала Віленшчыну часткай Польскай дзяржавы, Літва спыніла падтрымку паўстанцкіх арганізацый, ліквідавала

Міністэрства беларускіх справаў і расфармавала беларускія вайсковыя адзінкі. Менавіта ў 1923 г. Якавюк перастаў быць чыноўнікам Міністэрства беларускіх справаў і сябрам Саюза літоўскіх стральцоў[134].

Тым не менш, Літва працягвала заставацца базай для беларускіх палітычных арганізацый. У Коўне з 1920 г. жыў Вацлаў Ластоўскі. Часта наведваў Літву тагачасны прэм'ер-міністр урада БНР Аляксандр Цвікевіч. З дзейнасцю гэтых людзей і звязаў сваю працу Сымон Якавюк цягам наступных некалькіх гадоў.

[134] Справка [*складзена ў 1933 г.*]. *

Паводле наяўных звестак, Якавюк з 15 студзеня 1924 г. жыве ў Коўне[135] і ў першыя месяцы сваёй эміграцыі неаднаразова выязджае за межы Літвы. Паўнамоцны прадстаўнік беларускага народу, с. Якавюк уяўляў вялікую цікавасць для беларускіх дзеячаў, якія, нягледзячы на пасады сяброў урада БНР, падобнай легітымнасцю пахваліцца не маглі.

Палітычная біяграфія Сымона Якавюка 1924–1925 гг. вядома нам толькі фрагментарна. Між тым, менавіта ў гэты час ён шчыльна супрацоўнічае з урадам БНР, дзейнічае, бясспрэчна, надзвычай актыўна. Ужо 4 лютага 1924 г. ён арганізаваў у Коўне лекцыю пад назвай «Польшча – Віленшчына – Беларусы», дзе, пэўна, направа і налева граміў палякаў[136].

[135] Тамсама.

Якавюк амаль адразу далучыўся да групоўкі Аляксандра Цвікевіча, у той момант прэм'ер-міністра ўрада БНР, які канфліктаваў з папярэднім прэм'ерам Вацлавам Ластоўскім.

[136] Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 325. Воп. 1. Спр. 217. Арк. 269.

Мяркуючы па ўсім, у студзені 1924 г. Якавюк пэўны час знаходзіўся ў Коўне. Такую выснову можна зрабіць з ліста Палуты Бадуновай да Вацлава Ластоўскага, які таксама пражываў у літоўскай сталіцы. Сутнасць справы не разумелая, аднак словы Бадуновай гавораць самі за сябе: «…ніякага ліста да каго-кольвек, апрача Вас, у Коўну я не пісала і не пасылала і дзіву далася, калі пачула, што Якавюк нейкі мой ліст чытаў. Ці не выйшла тутака якая-небудзь іншая афёра. (…) Цяпер жа перадайце Якавюку, што я напісала Вам, і калі ён чэсны, дык няхай ведае, з кім мае дзела. Але Мамонька аб ім нядобра штосьці думае»[137].

Гэтую своеасаблівую паштовую «перлюстрацыю», праведзеную

[137] Архіў

Якавюком, можна разумець як форму здабыцця інфармацыі аб справах В. Ластоўскага – суперніка Аляксандра Цвікевіча. Тым болей, што парушэнне перапіскі ў палітычных справах – рэч звычайная, аб чым згадвае ў тым жа лісце Бадунова, апісваючы падобны выпадак са свайго жыцця. Зноў жа, зусім не выключана, што с. Якавюк меў нейкія іншыя прычыны, каб цікавіцца перапіскай Ластоўскага і Бадуновай.

Ужо ў студзені 1924 г. Якавюк уключыўся ў актыўную грамадскую работу. Бюлетэнь Беларускага прэс-бюро ў Коўне паведамляў, што Якавюк прыбыў у сталіцу Літоўскай Рэспублікі з мэтай арганізацыі супольнай з урадам БНР дэлегацыі ў Лігу Нацый «для абароны беларускіх нацыянальных інтарэсаў пад акупацыяй (зразумела, польскай. – **Аўт.**)»[138].

[image]

Магчыма, па лініі ўрада БНР Якавюк атрымаў ад Міністэрства замежных справаў Нямеччыны дазвол на бязвізавы ўезд у гэтую краіну з 1 па 15 лютага 1924 г. Аднак ці скарыстаўся ён ім – невядома[139]. У канцы студзеня 1925 г. А. Цвікевіч і У. Пракулевіч абмяркоўвалі ў лістах адзін да аднаго перспектыву выкарыстання с. Якавюка ў рэалізацыі сваіх палітычных планаў, у прыватнасці, запрашэнне на канферэнцыю ў Празе, дзе збіраліся выкарыстаць яго як наймацнейшы рупар антыпольскай прапаганды. Іх цікавіла ўсё: ці мае Якавюк якія матэрыялы для друкавання (натуральна, аб гвалце палякаў над беларусамі), ці будзе ён даваць інтэрв'ю на гэтую тэму, якія яго ўплывы сярод насельніцтва Заходняй Беларусі і якія ён мае кантакты з пасольскімі клубамі іншых нацыянальных меншасцяў Польшчы[140]. 31 студзеня А. Цвікевіч у сваім дакладзе з задавальненнем падсумаваў:

Прыезд с. Я[кавюка. – **Аўт.**] *у Коўну вельмі ўзмацніць беларускую справу за кардонам, дзякуючы яго становішчу, і магчыма будзе мець некаторыя рэальныя вынікі. Сталае перабыванне яго тут, у Коўне, – не карысна, бо працы тут ніякай няма. Тое, што можна рабіць у сэнсе нажыму на Літву ў звязку з яго прыездам – робіцца. Таму, праектуецца, што с. Я. паедзе спачатку ў Прагу, а пасля – у залежнасці ад таго, як разаўецца справа адносін да*

[138] Тамсама. Дакт. № 3546.

[139] Auswärtiges Amt, Basstelle, Bescheinigung [*Пасведчанне с. Якавюку ў справе бязвізавага ўезду ў Нямеччыну ад 1.02.1924 г.*].

[140] НАРБ. Ф. 325. Вуд. 1. Спр. 217. Арк. 306–308.

ўсходу – ці ў Менск, ці ў Амерыку. Найбольш магчыма апошняя камбінацыя[141].

У Амерыку Сымон Якавюк не трапіў, але ўжо 8 лютага Трабіўма. Цвікевічу добрую паслугу – ад імя Беларускага пасольскага клуба і Віленскага беларускага нацыянальнага камітэта публічна прызнаў паўнамоцтвы ўрада БНР (хаця такімі паўнамоцтвамі яго ніхто не надзяляў)[142]. Аднак далёка не ўсе былі ў захапленні ад дзейнасці героя нашага апавядання. Знакаміты беларускі сацыяліст-рэвалюцыянер Мамонька працягваў думаць пра яго «нешта нядобрае». На сходзе пражскай групы эсэраў у канцы сакавіка 1924 г. ён адкрыта заявіў, што Якавюк – падазроная асоба, спекулянт і г. д.[143]. Між тым, Сымон Якавюк з самага пачатку свайго супрацоўніцтва з урадам БНР выступіў не проста як шараговы выканаўца планаў А. Цвікевіча. Ва ўжо цытаваным дакладзе А. Цвікевіч кажа:

VI. Што да стасунку да ўсходу, дык трэба адзначыць, што ніякіх адносін да яго ўрад БНР не маець – ні благіх, ні добрых. Фармуліроўка стасунку да ўсходняга саюзу была зроблена ўрадам у яго дэкларацыі ад 24 жніўня 1923 г. (у свой час пасланай у Край). Аднак варункі пераживаемага моманту прымушаюць беларускую палітыку за граніцай знайсці з усходнім саюзам [агульную мову]. Апошнімі днямі, асабліва з прыездам пасла с. Я. – у гэтым напрамку пачалі рабіцца захады. Варункі, на якіх можа адбыцца сустрэча паўнамоцных прадстаўнікоў абедзвюх старон, фармуляваны мной у такі спосаб: (…) *2) Наша старана мае азнаёміцца дакументальна з пытаннем аб аб'яднанні беларускай этнаграфічнай тэрыторыі з Менскам і з бюджэтам Савецкае Беларусі. Аб гэтым 25 студзеня даведзена да ведама полпрэда СССР у Коўне п. Лорэнца ў пісьменнай форме, за подпісам А. Галавінскага (полуафіцыяльна). У асабістай гутарцы зазначана (С. Якавюком), што «Краёвыя беларускія арганізацыі перадалі справу фармулявання звязі Заходняе Беларусі з СССР – урада БНР…*[144]

Просім чытача звярнуць увагу на дзве надзвычайна важныя акалічнасці. Па-першае, Сымон Якавюк яшчэ раз заявіў аб сваіх паўнамоцтвах ад Краю (лічы, ад Заходняй Беларусі), не толькі прызнаць урад БНР, але і распрацаваць планы

[141] Трабіўма. Арк. 324–325.

[142] Тамсама. Арк. 186.

[143] Тамсама. Арк. 213.

[144] НАРБ. Ф. 825. Воп. 1. Спр. 217. Арк. 324–

Заходняй Беларусі з СССР і гэтым фактычна адмовіцца ад ідэі незалежнай Беларусі. Па-другое, прэм’ер урада БНР сцвярджае, што справа кантактаў з усходнім саюзам (СССР) пайшла наперад менавіта пасля прыезду Якавюка. Прызнацца, і сам Цвікевіч неяк млява разважае «аб аб’еднанні беларускай этнаграфічнай тэрыторыі з Менскам і з бюджэтам Савецкае Беларусі», быццам бы і не разумеючы, што гэты план – па сутнасці, адмова ад таго адзінага, што мелі дзеячы БНР – ад барацьбы за незалежную беларускую дзяржаву. Так або іначай, роля Якавюка ў гэтай справе была далёка не апошняя.

5 чэрвеня 1924 г. А. Цвікевіч, с. Якавюк, А. Галавінскі і шэраг іншых беларускіх грамадскіх дзеячаў накіравалі тэлеграму на імя Панлевэ, Эрыё, Ралана, Блюма, у рэдакцыі некаторых французскіх газет з падзякай гэтым асобам, якія заявілі публічны пратэст супраць тэрору польскіх уладаў у дачыненні да нацыянальных меншасцяў і выказалі пажаданні, «что ваш призыв к человечности послужит поводом к истинно справедливому акту – пересмотру Рижского трактата, поделившего на части живое тело белорусского народа»[145]. Якавюк падпісаў тэлеграму як дэпутат ад Заходняй Беларусі ў польскім сойме. Гэта яшчэ раз пацвярджае меркаванне, што ён у сваёй палітычнай дзейнасці актыўна карыстаўся статусам легітымнага прадстаўніка беларускага народу.

Наступная інфармацыя пра дзейнасць Сымона Якавюка паходзіць з даклада К. Дуж-Душэўскага, найбліжэйшага паплечніка В. Ластоўскага. К. Душэўскі прыводзіць [словы вядомага нам Разумовіча, перададзеныя яму праз нейкага Бароўскага. Паводле Разумовіча, 12 ліпеня 1924 г. у Гданьску мусіла адбыцца сустрэча ўрада БНР і Якавюка з афіцэрамі польскага Генеральнага штаба. Планаваліся перамовы аб пераездзе ўрада БНР у Варшаву. Аднак прадстаўнікі беларускага боку насуперак свайму жаданню не змаглі прыехаць[146]. Гэты факт на фоне ўсёй папярэдняй антыпольскай работы Якавюка выглядае папросту ашаламляльна. Мы можам адзначыць толькі, што прыводзіў яго чалавек з групы, варожай да атачэння старшыні ўрада Цвікевіча.

У кантэксце ўзаемнага канфлікту пішуць пра Якавюка ў верасні 1924 г. Цвікевіч і Ластоўскі. Цвікевіч гаворыць аб спробах Дак.

[145] Голос беларуссов [*справка з нейкага май у Гданьску 1924 г.*].*

[146] Архіў БНР.

дыпламатычнага прадстаўніка Літвы ў Берліне Пурыцкага дамовіцца з Якавюком. Са словаў Цвікевіча, дамоўленасць не была дасягнутая, «таму што Якавюк з намі, таму што ён мае акрэсленыя інструкцыі ад Краю быць разам з цэнтрам беларускай, а не літоўскай палітыкі»[147]. «Цэнтрам літоўскай палітыкі» ў разуменні Цвікевіча быў акурат В. Ластоўскі… Праўда, варта адзначыць, што ўвосень 1924 г. А. Цвікевіч ужо не давяраў так моцна с. Якавюку, напрыклад, стараўся не пускаць яго аднаго на сустрэчы з прадстаўнікамі літоўскай бюракратыі[148].

У сваю чаргу, В. Ластоўскі і К. Дуж-Душэўскі друкуюць у газеце «Lietuva» за 24.09.1924 паведамленне аб неправамоцнасці ўрада Цвікевіча. Коратка перакажам змест гэтага дакумента. Пасля таго, як 20 траўня 1920 г. урад БНР на чале з Ластоўскім склаў свае паўнамоцтвы, новы ўрад мог быць абраны толькі пленумам Рады Рэспублікі. Але некалькі чалавек, жадаючы выкарыстаць імя няіснага ўжо беларускага ўрада, у сваіх мэтах назваліся гэткім. Узначаліў новы ўрад Аляксандр Цвікевіч. У верасні 1924 г. склалася наступнае становішча:

Эти лица в настоящее время в количестве 5 человек (А. Цвикевич, А. Валькович, Яковюк, Бедрицкий и А. Головинский), пытаясь присвоить себе право говорить от имени белорусского народа, выступают от имени пяти несуществующих организаций:

1) от имени правительства Белорус. Народн. Республики,

2) от имени Белорусскаго Национальнаго Союза,

3) от имени Белорусской Колонии в Литве,

4) от имени Белорусскаго Пресс-бюро и, кроме того, в связи с несколькими лицами, находящимися в Праге,

5) от имени Белорусской Рады

[149].

Невядома, ці прадстаўляў Якавюк адну з названых арганізацый, але важна наступнае – Ластоўскі называе Якавюка сярод найбліжэйшага атачэння апошняга прэм’ера БНР.

[147] Архівы БНР. Дак. № 3629.

[148] НАРБ. Ф. 325. Воп. 1. Адз. зах. 217. Арк. 16.

[149] Архівы БНР. Дак. № 3631.

Наступны 1925 г. – вельмі важны ў сэнсе палітычных падзей, на жаль, прадстаўлены ў нашай біяграфіі толькі некалькімі фактамі. У траўні 1925 г. Рамуальд Зямкевіч «перадаваў паклоны» Якавюку праз В. Ластоўскага, хутчэй за ўсё, слаба ўяўляючы сабе адносіны паміж гэтымі дзвюма асобамі[150]. 27 ліпеня 1925 г. на беларускай канферэнцыі ў Коўне Сымона Якавюка выбралі віцэ-старшынём наваствoранага Беларускага нацыянальнага камітэта. Пасяджэнне адбывалася ў будынку гімназіі «Аўшра». Старшынём БНК быў абраны А. Галавінскі, сакратаром – Гузней[151]. Канферэнцыю разглядалі як спробу літоўцаў зноў прыцягнуць беларусаў да барацьбы супраць палякаў за Віленшчыну. Вядома, што выступалі Цвікевіч (другі віцэ-старшыня БНК) і Якавюк, якія яшчэ некалькі месяцаў таму кляймілі Ластоўскага за ўгодніцтва перад Літвой (на канферэнцыі прысутнічаў той самы Пурыцкі, прапанову аб супрацоўніцтве якога Якавюк нядаўна з гонарам адхіліў). Якавюк у сваім рэфераце заявіў, што ўсе беларускія арганізацыі пад Польшчай ставяцца да палякаў выключна варожа і што паміж беларусамі і літоўцамі не існуе ніякіх непаразуменняў адносна будучыні Вільні, літоўцам трэба толькі заняць больш рашучую пазіцыю ў гэтым пытанні[152].

Хаця беларускасць арганізатараў БНК у Заходняй Беларусі ставілася пад сумнеў, урад БССР з задавальненнем дапрыняў факт стварэння арганізацыі. 1 жніўня ЦВК КП(б)Б прыняў рашэнне як мага хутчэй дапамагчы камітэту грашыма і літаратурай, усталяваўшы з ім больш шчыльны кантакт. Сябры БНК, зразумела, і Сымон Якавюк, нават увайшлі ў склад сумоўнай з літоўцамі Вайсковай камісіі, якая, на думку палякаў, забяспечвалася зброяй і інструктарамі з Нямеччыны (палякі заўсёды зыходзілі з прынцыпу, што ў ацэнцы магчымасцяў працаўніка лепш пераацаніць, чым недаацаніць)[153].

У канцы 1925 г. адбыліся падзеі, якія значна змянілі расстаноўку сілаў на беларускай палітычнай арэне. У кастрычніку ў Берліне адбылася канферэнцыя, на якой старшыня ўрада БНР А. Цвікевіч, а таксама У. Пракулевіч і Л. Заяц прызналі ўрад БССР адзіным цэнтрам беларускай дзяржаўнасці і перадалі яму свае паўнамоцтвы. Пасля гэтага

[150] Там сама. Дак № 3731.

[151] Sylwester Wojewódzki przed sądem marszałkowskim. Warszawa, 1997. S. 258; Организован Белорусский Национальный Комитет // Сегодня, 1925. 1 августа.

[152] CAW. Oddział II Sztabu Generalnego. Sygn. I.303.4.2696. S. 56–58.

[153] Krótki zarys zagadnienia białoruskiego. Warszawa, 1928. S. 374.

[154] CAW. Oddział II Sztabu Generalnego. Sygn. I.303.4.2696. S. 100.

яны пераехалі ў Менск. Аднак старшыня ўрада БНР П. Крэчэўскі, а таксама В. Захарка і Я. Варонка БССР не прызналі і абвясцілі аб неправамоцнасці ліквідацыі БНР. Сымон Якавюк таксама браў удзел у Берлінскай канферэнцыі. Аднак яго пазіцыя ў пытанні далейшага лёсу БНР застаецца загадкай. Мы не ведаем, падтрымаў ён у той момант учынак Цвікевіча або выказаўся супраць. Паводле некаторых звестак, Якавюк да Гданьска не даехаў[154].

Пад сцягам адраджэння ідэі БНР і з шырэйшай мэтай актывізацыі ўсяго незалежніцкага беларускага руху 24–27 лютага 1926 г. у Гданьску сустрэліся беларускія дзеячы, якія не прынялі пастанову Берлінскай канферэнцыі. Сярод прысутных былі П. Крэчэўскі і В. Захарка – міністры-бээнэраўцы; Я. Мамонька – адзін з найбольш паслядоўных беларускіх эсэраў; В. Адамовіч – у пачатку 1920-х гг. прыхільнік прапольскай арыентацыі, паплечнік П. Алексюка; с. Хмара-Разумовіч – кіраўнік беларуска-літоўскіх партызанаў, які, па чутках, пазней звязаўся з польскім Генеральным штабам.

Прыехаў і У. Пракулевіч з Менска, які літаральна за чатыры месяцы да гэтага здаў свой мандат урада БССР. Ён, праўда, у апошні момант ад удзелу ў канферэнцыі адмовіўся[155]. Аб Пракулевічу гаварылі, што ён спецыяльна прыехаў з Менска, каб сарваць гэтую нараду, і пасля таго, як асноўная частка дэлегатаў адкінула ягоную прапанову запрасіць на пасяджэнне Курляндскага, прадстаўніка СССР у Гданьску, пакінуў канферэнцыю[156].

Старшынём канферэнцыі стаў менавіта Сымон Якавюк, а галоўны натхняльнік барацьбы за захаванне БНР П. Крэчэўскі выконваў толькі абавязкі сакратара. Цяжка зразумець, як розныя людзі маглі сабрацца за адным сталом. Прынамсі сходам рашэнні выглядаюць яшчэ больш дзіўна. Яны маштабны і адначасова супярэчлівы характар: аднавіць дзейнасць беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў, стварыць новы галоўны беларускі нацыянальны камітэт у Гданьску, звярнуцца да расійскіх манархічных арганізацый з просьбай падтрымаць БНР на чале з П. Крэчэўскім і матэрыяльна дапамагчы беларускім арганізацыям у барацьбе з бальшавікамі

[155] Глагойская Т. Беларусы ў Гданьску // Спадчына. 1995. № 4. с. 206–207.

[156] CAW. Oddział II Sztabu Generalnego. Sygn. I.303.4.2696. S. 34.

[157] Глагойская Т. Беларусы ў Гданьску // Спадчына. 1995. № 4. с. 206–207.

і Польшчай; аднавіць Саюз беларускіх стральцоў (існаваў у пачатку 1920-х як філіял Саюза літоўскіх стральцоў) са штабам у Гданьску і г. д.[157].

Ніколі яшчэ не звярталіся беларускія дзеячы, тым больш эсэраўскага кшталту, па дапамогу да расійскіх манархістаў, якія стаялі на пазіцыях адзінай і непадзельнай Расіі. Гэта быў кардынальны паварот справы. Гэта асабліва добра адчулі беларускія палітычныя дзеячы ў Польшчы, якія на фоне ўздыму Беларускай сялянска-работніцкай грамады не хавалі сімпатый да БССР. Так, у першай палове сакавіка таго ж года Радаслаў Астроўскі на пасяджэнні прэзідыума віленскага БНК гаварыў, што ў канферэнцыі ў Гданьску ўзялі ўдзел асобы, далёкія ад эсэраўскай ідэалогіі, мэты якіх не маюць нічога супольнага з мэтамі беларускіх эсэраў[158].

[image] Рашэнні канферэнцыі, аднак, выявіліся не больш, чым з вопыт. Ідэя Замежнага галоўнага нацыянальнага камітэта хутка была адкінутая, а пасля смерці П. Крэчэўскага ў 1928 г. Рада БНР перастала прадстаўляць колькі-небудзь значную палітычную сілу.

[image] Сымон Якавюк у другой палове 1920-х гг. жыве ў Коўне, дзе трымае кнігарню «Knyga» з бібліятэкай пры ёй. Актыўнага ўдзелу ў грамадска-палітычнай дзейнасці ён у гэты час не бярэ. Тым не менш, паводле звестак віленскіх газет за май 1927 г., менавіта с. Якавюк атрымаў ад літоўскага ўрада прапанову выступіць арганізатарам беларускай канферэнцыі, якая сумесна з літоўцамі мусіла даць пачатак новай барацьбы за далучэнне Віленшчыны да Літвы[159].

Таксама і Васіль Захарка ў лютым 1929 г. праз с. Якавюка звяртаўся да беларускай эміграцыі ў Літве ў справе збору грошай на помнік старшыні Рады БНР Пятру Крэчэўскаму.

[image] Праз месяц, 21 сакавіка, с. Якавюк адправіў у Прагу падпісны ліст на 117 літаў, а таксама просьбу высылаць яму па адным асобніку ўсіх беларускіх газет, якія выходзілі ў Празе[160].

[158] БДАЛіМ. Ф. З. Вопыт. Спр. 195. Арк. 21.

[159] CAW. Oddział II Sztabu Generalnego. Sygn. L303.4.2475.

БКПТ СУПРАЦЬ БЦЛ (1932–1939 гг.)

Наступны ўздым дзейнасці с. Якавюка звязаны з работай у беларускіх арганізацыях Ковенскай Літвы. З гэтай прычыны трэба апавесці пра беларускае грамадскае і культурнае жыццё ў Літоўскай дзяржаве. Паколькі тэрыторый, заселеных беларусамі, у рэспубліцы было мала (паводле звестак перапісу 1923 г., у Літве жыў усяго 4421 беларус, з якіх 200 былі эмігрантамі), то размова аб утварэнні буйных беларускіх палітычных арганізацый тут ісці не магла.

Але ў першай палове 1920-х гг. гэтая невялікая прыбалтыйская краіна была важным арганізацыйным цэнтрам усяго беларускага руху. Паколькі пачынаючы з 1923 г. Літва канчаткова страціла надзею атрымаць акупаваныя Польшчай тэрыторыі, у яе адпала патрэба актыўнай падтрымкі беларускіх палітычных арганізацый. Міністэрства беларускіх справаў, якое існавала з канца 1918 г., фармальна распушчана не было, але ў сувязі са спыненнем фінансавання і звальненнем супрацоўнікаў фактычна завяршыла сваю дзейнасць.

На яго месца прыйшоў створаны 1 красавіка 1923 г. Беларускі цэнтр у Літве (БЦЛ)[161] (не зусім зразумелы факт, што Ластоўскі ў лісце да К. Езавітава гаворыць аб стварэнні Цэнтра толькі ў 1925 г.). БЦЛ складаўся з былых супрацоўнікаў Міністэрства беларускіх справаў (В. Ластоўскі, К. Душэўскі, В. Барысовіч, А. Матач), а таксама і Ё. Іонінаса, які быў прызначаны літоўскім урадам і соймам. Цэнтр, прынамсі ў першай палове 1920-х гг., знаходзіўся на дзяржаўным фінансаванні. Бюджэт Цэнтра складаўся сумесна беларусамі і чыноўнікам Ё. Іонінасам, які праводзіў дакумент праз сойм, атрымліваў грошы і адказваў за іх.

Сума бюджэту за 1925 г. склала 60 тысяч літаў, размеркаванне якіх было пакінутае беларусам. Але ўсе выдаткі мусілі быць зацверджаны дзяржаўным кантралёрам-літоўцам. Цэнтр існаваў не як грамадская арганізацыя. Ён не меў статута, аднак быў зацверджаны соймам[162]. Дзейнасць Цэнтра была накіравана асноўным чынам на беларускае замежжа: грашовая падтрымка беларускіх арганізацый (найперш, у Польшчы) і выдавецкая работа. Важна адзначыць, што, са словаў с.

160 БДАЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 255. Арк. 79 адв.–78.

161 Viesa Baruskaja Kryvi. Cantra 1933. № 22.

Якавюка, усе сябры БЦЛ былі супрацоўнікамі Міністэрства замежных справаў Літвы[163].

Ідэйным натхняльнікам і галоўным арганізатарам дзейнасці Цэнтра быў Вацлаў Ластоўскі. Разам з Клаўдзіем Душэўскім да свайго ад'езду ў БССР у 1927 г. ён паспеў наладзіць выданне часопіса «Крывіч», перакласці на беларускую мову і надрукаваць вялікую колькасць школьных падручнікаў, а таксама выдаць вялікую «Гісторыю беларускай (крыўскай) кнігі». Цэнтр аказваў падтрымку і літоўскім беларусам, што знаходзіліся ў цяжкім матэрыяльным становішчы. Яго сябры за 1920-я гг. прачыталі каля 150 дакладаў на розную тэматыку[164]. У 1925 г., са словаў самога В. Ластоўскага, у Літве існавала адна беларуская школа[165]. Аднак пасля яго ад'езду работа Цэнтра паступова пачала занепадаць. З таго часу ўся работа Цэнтра трымалася на К. Дуж-Душэўскім. Інжынер-будаўнік К. Душэўскі меў добрыя кантакты ў літоўскіх вярхах, і пасля таго, як у 1930 г. ён перастаў быць супрацоўнікам Міністэрства замежных справаў Літвы, дзейнасць БЦЛ залежала ад гэтых знаёмстваў.

У пачатку 1932 г. сярод літоўскіх беларусаў узнікла ідэя стварыць з мэтай актывізацыі іх дзейнасці арганізацыю, якая мусіла ўключыць як сяброў БЦЛ, так і іншых беларусаў. Як сцвярджаў пазней К. Душэўскі, стварэнне арганізацыі адбылося з ініцыятывы В. Барысовіча, І. Сіроткі, І. Ясінскага і «пары іншых асобаў»[166]. Абставіны ўзнікнення арганізацыі да канца невядомыя, аднак 27 лютага 1932 г. Беларускае культурна-прасветнае таварыства (БКПТ) распачало сваю дзейнасць[167]. БКПТ стваралася «для мэтаў спецыяльна школьніцкіх і прасветных»[168]. Са словаў таго ж Душэўскага, адносна БКПТ «у ініцыятараў і ў Беларускім цэнтру было поўна рожавых надзей»[169].

[image] Ці быў Сымон Якавюк сярод ініцыятараў БКПТ невядома, але з 28 лютага 1932 г. ужо з'яўляўся яго старшынём[170]. Кіраўнічы склад БКПТ быў наступны: старшыня с. Якавюк, віцэ-старшыня А. Матач, скарбнік К. Плескачэўская, сябра Ю. Радзюк, сакратар с. Дзядзевіч, рэвізійная камісія: Я. Гайдукевіч, У. Боеў, А. Мілінкевіч.

[163] БДАЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 30. Арк. 4.
[164] БДАЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 200. Арк. 4.
[165] Archiwum BNR… Дак. № 3788.
[166] БДАЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 200. Арк. 4.
[167] БДАЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 30. Арк. 3.
[168] Biełaruskaja Krynica. 1933. № 22.

Падзеі 1932 г. вядомыя нам у інтэрпрэтацыі Клаўдзія Дуж-Душэўскага. с. Якавюк як старшыня БКПТ пачаў звяртацца ў афіцыйныя літоўскія ўстановы, каб атрымаць грошы – спачатку 10 тысяч літаў, пасля 34 тысячы. Але на беларускую справу ніхто такіх грошай выдаткоўваць не збіраўся[177]. Больш за тое, «самачынная» дзейнасць Якавюка выклікала супраціўленне Душэўскага, які быў раней ці не адзіным прадстаўніком

[image]Стасункі с. Якавюка са старшынём Цэнтра К. Душэўскім «не склаліся», хутчэй за ўсё, з часоў канфлікту В. Ластоўскага і А. Цвікевіча. Пасля ад'езду Ластоўскага пачаліся адкрытыя сутыкненні, па-сутнасці, на глебе суперніцтва за ўплыў сярод беларусаў Літвы. Яшчэ 21 лістапада 1927 г. адбыўся міравы суд па справе абразы К. Душэўскім с. Якавюка. К. Душэўскі папрасіў у Якавюка прабачэння, і апошні згадзіўся спыніць судовую справу. Але канфлікт працягваўся аж да ўзгаданых намі падзей[173].

Былі ў Душэўскага нелады і з асобамі, што ўваходзілі ў акружэнне Якавюка. Напрыклад, яшчэ ў студзені 1924 г. Душэўскі звяртаўся да ўжо вядомага нам Усевалада Ігнатоўскага з лістом, дзе пытаў аб «сходзе грамадзян і палітычных дзеячаў Беларускай калоніі ў Літве» 22 жніўня 1923 г., на якім Боеў быў ледзь не старшынём[174]. Меншыта на гэтым з'ездзе было абвешчана аб правале беларуска-літоўскага супрацоўніцтва і зняцці з сябе абавязку «маральнай салідарнасці з Літвой», «штрэйкбрэхерстве» В. Ластоўскага і К. Душэўскага і абвяшчэнні ім «маральнага байкоту беларускага грамадзянства»[175]. В. Ластоўскі, у сваю чаргу, бачыў і ў гэтым сходзе ідэалагічную дыверсію з боку А. Цвікевіча[176].

Назва ініцыятыўнай групы, якая ў 1932 г. БКПТ наладзіла, – Беларускі Грамадзянскі Саюз. Антон Луцкевіч, які з Вільні назіраў за ўзнікненнем новай беларускай арганізацыі ў Літве, не быў у захапленні ад яе кіраўніцтва. «Сярод пералічаных імёнаў нам ведамы два, і, на жаль, яны не даюць гарантыяў нейкае запраўды творчае культурнае працы ў нацыянальна-беларускім духу. Гэта – Якавюк, якога выбаршчыкі ў Горадзеншчыне ўспамінаюць не вельмі ўдзячна, і расейскі нацыянальны дзеяч Боеў», – пісаў ён[172].

169 БДАДіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 200. Арк. 41
170 Справа 55 *сяброўна ў 1933 г.*
171 Беларускі звон. 1932. № 12.
172 Там жа.
173 Справа 55 *сяброўна ў 1933 г.*
174 БДАДіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 241. Арк. 104
175 Архівы ЗША. Да 174. № 8451.
176 Архівы ЗША. Да 174. № 3458.

беларусаў перад літоўскім урадам. Як пісала заходнебеларуская газета «Беларуская Крыніца», пачалося супрацьстаянне ў самім Культурна-прасветным таварыстве: «некаторым сябрам таварыства, а таксама сябрам праўлення закідваюць тое, што яны паднялі грызню сярод беларусаў і пачалі бясконцыя спрэчкі. Гэта напалохала многіх найбольш паважаных беларусаў, і яны пакінулі таварыства. Дзеля гэтага БКПТ траціць папулярнасць сярод беларусаў і пашану ў літвінаў»[178].

Невядома, каго з тых, хто пакінуў Таварыства, мела на ўвазе «Беларуская Крыніца». Аднак Душэўскі, гаворачы пра выхад БКПТ Барысовіча, Ясінскага і Сіроткі, тлумачыў гэта «канфліктамі Якавюка»[179]. К. Дуж-Душэўскі не меў фармальных прычын супраціўляцца беларускай дзейнасці Якавюка і таму вырашыў надаць Беларускаму цэнтру ў Літве новае жыццё.

[178] Bielaruskaja Krynica. 1933. № 22.

[179] БДАЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 200. Арк. 6.

Ужо ў канцы 1932 г. ён актыўна працуе над пераўтварэннем БЦЛ у грамадскую арганізацыю, зарэгістраваўшы ў снежні статут БЦЛ у паліцыі. 19 лютага 1933 г. адбыўся Кангрэс беларусаў Літвы, дзе Душэўскі паспрабаваў атрымаць падтрымку сваёй дзейнасці з боку мясцовых беларусаў. Са словаў сяброў БКПТ, у тым ліку і с. Якавюка, К. Душэўскі большасці на Кангрэсе не атрымаў і старшынём абраны не быў[180]. Сам Душэўскі інтэрпрэтуе падзеі Кангрэсу інакш, паведамляючы, што «Якавюк і прыкладна 35 чалавек з ім з'явіліся на кангрэс і сарвалі яго».

У адказ Душэўскі там жа вылучыў супраць Якавюка абвінавачванні, паклаўшы пачатак новай справе. 23 лютага 1933 г. на закрытым сходзе сяброў БЦЛ было абрана праўленне Цэнтра, куды ўвайшлі Душэўскі, а таксама Барысовіч і Сіротка, якія нядаўна пакінулі шэрагі БКПТ[181].

[177] БДАЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 200. Арк. 4.

[180] БДАЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 200. Арк. 30.

[181] БДАЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 200. Арк. 7.

[image]

Тым часам Беларускае культурна-прасветнае таварыства разгарнула дзейнасць. Шырока адзначалася сустрэча Новага 1933 году. Была пастаўлена п'еса «Міхалка», чыталіся рэфераты аб У. Галубку і В. Дуніну-Марцінкевічу[182]. 22 студзеня 1933 г. у памяшканні «Беларускай Хаткі» адбылося ўрачыстае адкрыццё Беларускага народнага універсітэта ў Літве. На адкрыцці

прысутнічалі прэзідэнт места Коўна, інжынер Граўрагкас, прафесар М. Біржышка ад літоўцаў, Кастылюк, Гусарэўскі, Дзямідаў ад беларусаў Латвіі, а таксама былы камандзір беларускага батальёна ў Літве палкоўнік Успенскі.

Кіраўніком універсітэта стаў А. Матач. Сымон Якавюк падчас свайго выступу «…выразіў пажаданні развіцця Народнага універсітэту, а таксама належную ўдзячнасць уладам Літвы за магчымасць развіцця ў Літве беларускай народнай 1933. № 4. прасветы»[183]. 29 студзеня ў «Беларускай Крыніцы» было надрукавана паведамленне, што старшыня БКПТ у Літве с. Якавюк «ад імя беларусаў Літвы прыслаў шчырыя прывітанні і найлепшыя пажаданні для беларускіх арганізацыяў і беларусаў Заходняй Беларусі, стоячых на незалежніцкім грунце»[184]. 19 лютага Таварыства адкрыла ў Коўне дзіцячы садок[185].

[182] Biełaruskaja Krynica. 1933. № 4.
[183] Biełaruskaja Krynica. 1933. № 7.
[184] Biełaruskaja Krynica. 1933. № 5.
[185] Biełaruskaja Krynica. 1933. № 7.

Усе гэтыя факты сведчаць аб тым, што кіраўнікі БКПТ атрымалі падтрымку не толькі сярод літоўскіх беларусаў, але і ад прадстаўнікоў літоўскага грамадства. Яшчэ 2 снежня 1932 г. у часопісе «Nauji Romova» быў змешчаны артыкул аб беларускай літаратуры і інфармацыя аб БКПТ у Літве, таксама фатаздымкі ўрада БКПТ і беларускага хору пад кіраўніцтвам А. Матача[186].

26 лютага адбыўся «Всебелорусский съезд белорусов Литвы», на якім Якавюк быў пераабраны на другі год старшынёй БКПТ, а таксама абраны ў праўленне «Центрального комитета белорусов Литвы»[187]. Маецца на ўвазе Нацыянальная ўзаемасувязь беларусаў Літвы, створаная ў снежні 1932-га – лютым 1933-га г. з ініцыятывы сяброў БКПТ[188].

[186] Biełaruskaja Krynica. 1933. № 5.
[187] Справка. [*складзена ў 1933 г.*]*
[188] БДАЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 30. Арк. 3.

Канфлікт Душэўскага і Якавюка працягваўся далей. Варта ўзгадаць справу аб абразе Душэўскім Якавюка, якая пачалася акурат на пачатку 1933 г.

На кангрэсе 19 лютага, у прысутнасці вялікай колькасці людзей, Душэўскі прыгадаў Якавюку гарадзенскі перыяд ягонага жыцця, абвінаваціўшы яго ў прысваенні літоўскіх грошай: «На жаль, пана Якавюка там судзілі, наколькі мне ведама, за зладзейскія справы, а не за палітыку, пан Якавюк прысвоіў грошы, якія, між іншым, перасылаліся з Літвы для беларускіх дзіцячых прытулкаў»[189]. Як вынікае з гэтай цытаты,

Душэўскі слаба ўяўляў сабе, на якія мэты Якавюк атрымліваў грошы ў 1921 г. Аднак нейкая інфармацыя аб грашовых справах Якавюка ў Душэўскага была. Якавюк, у сваю чаргу, не дараваў апошняму публічнай абразы і падаў на яго ў суд.

3 красавіка 1933 г. у Ковенскім міравым судзе адбыўся разгляд справы. Душэўскі, паводле ўласных словаў, на суд спазніўся, а вялікая колькасць сабраных Якавюком сведчанняў аб абразе яго Душэўскім дала магчымасць суду вынесці завочны прысуд[190]. Душэўскаму было прысуджана 14 дзён зняволення[191]. Вядома, што ў такой сітуацыі Душэўскі выглядаў як галоўны ініцыятар сварак сярод беларусаў Літвы. Так, 20 красавіка 1933 г. рэдактар штомесячніка «Беларуская школа ў Латвіі» К. Езавітаў звярнуўся да рэдакцыі віленскай «Беларускай Крыніцы» з лістом, у якім пісаў, што БКПТ вядзе пазітыўную працу па аб'яднанні беларусаў у Літве, а Душэўскі перанёс свае асабістыя спрэчкі на ўсю арганізацыю і перакрыў Таварыству доступ да грашовых сродкаў, рассылаючы мемарыялы прадстаўнікам літоўскай улады[192]. Душэўскі сапраўды спрабаваў выратаваць сваё становішча. 3 красавіка 1933 г. ён напісаў мемарандум «Усім грамадскім дзеячам…», дзе даводзіў, што ніколі не атрымліваў ніякіх субсідый на беларускую справу, а сам ён, прынамсі, з пачатку 1931 г. не з'яўляецца супрацоўнікам Міністэрства замежных справаў Літвы.

Недзе ў канцы красавіка ці пачатку траўня з прадстаўнікоў літоўскай і беларускай грамадскасці было ўтворана Літоўска-беларускае таварыства[193]. Такая арганізацыя існавала яшчэ ў часы Ластоўскага, і Душэўскі, які яе аднавіў, напэўна, спадзяваўся ўмацаваць кантакты з літоўскай інтэлігенцыяй.

Апагеем абвінавачванняў Душэўскага супраць Якавюка і яго паплечнікаў стаў складзены ім 1 траўня 1933 г. дакумент, дзе Душэўскі ў кароткай форме выклаў гісторыю канфлікту. Гледзячы па ўсім, К. Дуж-Душэўскі разаслаў яго ў беларускія арганізацыі за межамі Літвы. Многія факты прыводзіліся вышэй, працытуем толькі характарыстыку, дадзеную нашаму герою. Інфармацыя гэтая суб'ектыўная яшчэ больш, чым ранейшыя сцверджанні А. Луцкевіча, аднак пакінуць па-за

[189] БДАЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 200. Арк. 7.

[190] Тамсама.

[191] Литовский вестник. 1935. № 53.

[192] БДАЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 43. Арк. 84.

[193] Bielaruskaja Krynica. 1933. № 19.

ўвагай яе мы не можам:

У Літве, таксама як і ў Вільні, Якавюка ўсе добра ведаюць. У 1920–1921 гг. Якавюк быў патаемным платным агентам разведкі пад Польскай акупацыяй, ён быў у распараджэнні начальніка групы інфармацыйнага аддзела паручніка Р. (паміж іншым аб гэтым гаварыў сведка Якавюка Мілінкевіч у Ковенскім Міравым судзе 3 красавіка 1933 года пры разборы справы № 1189. Якавюк яму не пярэчыў). За гэты час у яго былі «непаразуменні» з чужымі грашамі. Ён прысвоіў чужыя грошы, для атчоту не з'явіўся і быў выгнаны са службы. Усім ведама, якім «цудам» ён трапіў у польскі сойм. Усім ведама, як лёгка ўздыхнулі сябры па фракцыі, калі Якавюк уцёк. Усе ведаюць, што ніводнага пратэсту супраць яго засуду не было. Ведаюць усе, што нягледзячы на тое, што ён сябра сойму, усё ж не дастаў візы ні ў Нямеччыну, ні ў Чэхію, бо там ведалі, што ён не за палітыку быў засуджаны, а за справы дужа непрыгожыя[194].

Душэўскі піша, што і ў Літве Якавюк паспеў пасудзіцца за перапродаж крадзенага і г. д., за што атрымаў ад літоўцаў мянушку «apsukrus» – абароцісты. Палітычныя погляды Якавюка вельмі невыразныя, з аднаго боку, ён агітуе за дружную і непадзельную Расію, а з другога, знаходзіцца ў дужа цесных адносінах з савецкай амбасадай, як былы адзіны прадстаўнік «савецкіх выданняў». Боева Душэўскі характарызуе як чарнасоценца, дэлегата на правых з'ездах, які пасля перайшоў у кальвінізм і служыць юрысконсультам у амбасадзе[195].

Гледзячы па ўсім, узяць на сябе ролю замірэнцаў вырашылі менавіта латышскія беларусы, больш цесна звязаныя з беларускай дыяспарай у Літве. 7–8 чэрвеня 1933 г. у Рызе адбыўся сход «Цэнтральнага праўлення Таварыства беларускіх вучыцеляў у Латвіі», на якім прысутнічаў Дуж-Душэўскі. Па выніках сходу была прынятая рэзалюцыя аб неабходнасці пошуку шляхоў да прымірэння і ў выніку стварэння супольнага БНК у Літве[196]. Якой была рэакцыя Якавюка і ўсяго БКПТ – невядома, аднак 17 чэрвеня 1933 г. на сходзе прадстаўнікоў БКПТ, Беларускай нацыянальнай сувязі ў Літве і Аб'яднання студэнтаў-беларусаў Ковенскага універсітэта вырашана было патрабаваць ад Душэўскага карыснай грамадскай працы[197].

194 ЦДАЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 200. Арк. 4–5.

195 Там самa.

Літаральна праз месяц тры вышэйзгаданыя арганізацыі выступілі з новай гучнай ініцыятывай. Быў створаны Ініцыятыўны камітэт Міжнароднай асацыяцыі беларускіх арганізацый, які 20 ліпеня звярнуўся «да беларускіх арганізацый усіх старон свету» з прапановай аб'яднаўшчыся намаганні ў барацьбе за інтарэсы беларусаў. Практычная дзейнасць камітэта на гэтым скончылася[198].

Між тым, размовы аб замірэнні не працягваліся нават двух месяцаў. 10 жніўня 1933 г. у раду БКПТ у Літве трапіў дакумент, які без перабольшання можна назваць кампраматам на Душэўскага. Склаў яго нейкі Я. Манцэвіч. Сутнасць справы была ў наступным. Незадоўга да ўзгаданай падзеі, 8 жніўня, Манцэвіч зайшоў да Душэўскага і меў з ім размову, змест якой пісьмова пераказаў сябрам Культурна-прасветнага таварыства. Душэўскі, Ма Ф. з. В. п. 1. С. М. 30. Арк. 5. выхадкамі чалавека, выхаванага ў Арк. 6-7.

Таварыства ў Літве, а ў іншым дзікім месце», нападаў на ўсе іншыя, акрамя Цэнтра, беларускія арганізацыі ў Літве. Аднак галоўным пунктам нападак стала БКПТ, дзе «Якавюк і Ко захапіў уладу і перарабіў на банду злодзеяў, каторыя хацелі і хочуць набіць сабе кішэні». Беларусаў жа ў Таварыстве няма, ёсць толькі дзве сям'і, з іх адна беларуская – Плескачэўскіх, і адна паўбеларуская – Матачовых. Душэўскі сцвярджаў, што таварыства вядзе працу не на карысць беларускага народу, бо «Якавюк і Ко ходзіць па хатах і агітуе за «адзіную і недзялімую», а беларускай работы ў Культурна-прасветным таварыстве няма». Напрыканцы Душэўскі сказаў, што дзейнасць Таварыства хутка перапыніцца, бо «калі я не буду рэпрэзентаваць якой-колечы беларускай арганізацыі, дык яна ніколі нічога ад літоўскага ўрада не даб'ецца, (…) бо я маю вялікі давер у літоўскіх урадавых колах, і ўсе міністры са мною на ты».

Пачутае зрабіла на Манцэвіча вельмі дрэннае ўражанне, і ён адкрыта назваў Душэўскага правакатарам накшталт Паўлюкевіча і заявіў, што «ён з'яўляецца аўтаматычным манекінам у рукох нейкіх цёмных сіл, якім моцна не па душы беларускі адраджэнскі рух, і слепа выпаўняе ён дадзеныя яму дырэктывы»[199]. Акрамя іншага, Манцэвіч паведамляе цікавую інфармацыю аб функцыянаванні Беларускага нацыянальнага

[196] Копія. Пратакол № 29 сходу Цэнтральнага праўлення Тчва Беларускіх вучыцеляў у Латвіі з удзелам прадстаўнікоў беларускіх арганізацый. *07.06.1933 г.*

[197] БЛАЛ, М. Ф. з. В. п. 1. С. М. 30. Арк. 5.

[198] Таварыства ў Арк. 6-7.

цэнтра, гаворачы, што дзейнымі сябрамі яго, са словаў Душэўскага, маглі быць толькі асобы, якія мелі грамадзянства Літвы, аб якіх наводзіліся даведкі ў крымінальнай паліцыі[200].

Не ведаем, які ход далі гэтаму дакументу сябры БКПТ, у чыіх руках К. Душэўскага хутка апынуўся новы козыр. Былы псаломшчык мерацкай царквы Іван Казунас расказаў нам пра сваё знаёмства з с. Якавюком яшчэ ў пачатку 1920-х гг.

…с Яковюком я знаком, и он работал ещё тогда в литовско-белорусской организации, когда я был в Меречи начальником комплектовочной группы. Начальник группы Разумович один раз мне говорил, что Синилло и Яковюк взяли деньги 6 тысяч рублей аксинов и не рассчитались, и даже были посланы за ними люди, чтобы попросить их для отчёта в Меречь.

[200] Там жа.

Душэўскі папрасіў І. Казунаса выкласці ўсё гэта пісьмова і паставіць асабісты подпіс[201]. Такая «неасцярожнасць» каштавала Казунасу пасады старшыні Мерацкага аддзела БКПТ, і 17 снежня 1933 г. на сумесным пасяджэнні БКПТ, Беларускай нацыянальнай сувязі і Беларускага студэнцкага саюза Казунас перапрашаў у Якавюка, не адмаўляючыся, аднак, ад усяго вышэй сказанага[202].

У другой палове 1933 г. і Беларускі цэнтр, і БКПТ працягвалі дзейнасць. Са снежня Цэнтр выдае часопіс «Беларускі Асяродак»[203]. Варта адзначыць, што змест гэтага часопіса быў даволі нейтральны. Адкрытай лаянкі на БКПТ не было, і пазіцыя К. Душэўскага, безумоўна, прасочвалася. Часопіс рассылаўся К. Душэўскім за межы Літвы, і віленская «Беларуская Крыніца» складала свае паведамленні аб сітуацыі беларусах менавіта на аснове пададзеных там звестак.

На выданне гэтага часопіса Мерацкі аддзел БКПТ адгукнуўся рэзалюцыяй, дзе сцвярджалася, што Душэўскі «з беларускім адраджэнскім рухам нічога супольнага не меў, не мае і мець не будзе», а Беларускі цэнтр утвораны «ў мэтах знішчэння ядынай

[199] Беларускага Кааператыўнага Т-ва ў Літве. *10.08.1933 г.** Аўтограф.

[201] Цэнтральному Праваслаўнаму Беларускага Культурна-Асветнага Т-ва ў Літве. *15.12.1933 г.** Аўтограф.

[202] Gudavičius E. Lietuvos Didžiojo Kunigaikščio Gedimino vardo Lietuvių studentų atstovų bendro posėdžio, įvykusio 1933 m. gruodžio mėn. 17d.,

[203] Беларускі Цэнтр у Літве. Беларускі Асяродак. Вільня, 1933–1934.

[204] Заявление Казуна Ивана. *15.12.1933 г.** Аўтограф.

Protokoły № 23 і 17 Мерацкага аддзела Таварыства, Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні прозвішчы і таму жыхары Ўзмен Беларускай хаты.

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш.[203]

На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[204].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[205].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[206].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[207].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[208].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[209].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[210].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[211].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[212].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[213].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[214].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[215].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[216].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[217].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[218].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[219].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[220].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[221].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[222].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[223].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[224].

У лістападзе 1933 г. Беларускі цэнтр у Літве і Беларускі Асяродак у Коўні правялі сумесную канферэнцыю, на якой прысутнічалі 14 чалавек, сярод іх Якавюк, Боеў, Манцэвіч, Мілінкевіч, Плескачэўская, Матач, Сініла і інш. На канферэнцыі абмеркавалі пытанні культурна-асветніцкай работы сярод беларусаў Літвы і Латвіі. Было вырашана стварыць пастаянную арганізацыю ў выглядзе Бюро беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі[225].

Прадстаўнікі Беларускага цэнтра прычыніліся да арганізацыі канферэнцыі, каб не выглядаць сабатажнікамі, бо ўжо 25 лютага Беларускі цэнтр зрабіў заяву, што пастановы сходаў Бюро носяць неабавязковы характар[213]. У заяве ад 4 сакавіка

---

203 Беларускі Асяродак. Нікога прозвішчы і таму жыхары Ўзмен Беларускай хаты.

204 Там самым.

205 Рэзалюцыя агульнага сходу сяброў Мэрэцкага аддзелу Беларускага культурна-асветнага таварыства ў Літве ў дні 20 студзеня 1934 году.*

206 БДАЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 400. Арк. 10.

207 Bielaruskaja Krynica. 1934. № 17.

208 БДАЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 30. Арк. 3.

209 Bielaruskaja Krynica. 1934. № 18.

210 Копія. Ліст дзеля арганізацыі прыняцця беларускае канферэнцыі Прыбалтыкі ў дні 27, 28 і 29 снежня 1933 году.*

211 Падпісны ліст дзеля арганізацыі прыняцця беларускае канферэнцыі Прыбалтыкі ў дні 27, 28 і 29 снежня 1933 году.*

212 Копія. Пратакол нарады беларускіх арганізацый Літвы для стварэньня арганізацыйнага Бюро па скліканьню Канфэрэнцыі беларускіх арганізацый Літвы і Латвіі 1934 году лютага месяцу 18 дня.*

213 Копія. Заява, пададзеная Беларускім Цэнтрам у Літве і рэдакцыяй «Беларускі Асяродак» супольнаму сходу прадстаўнікоў беларускіх арганізацый у Літве 25.02.1934 г.

214 БДАЛіМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 200. Арк. 11.

215 Падпісны ліст дзеля арганізацыі прыняцця беларускае канферэнцыі Прыбалтыкі ў дні 27, 28 і 29 снежня 1933 году.*

216 Pažymėimas [*пасведчанне Езасу Манцэвічуе, 22.09.1934 г.*].*

217 Bielaruskaja Krynica. 1935. № 7.

218 Литовский вестник. 1935. № 53.

219 Bielaruskaja Krynica. 1935. № 8.

220 Bielaruskaja Krynica. 1936. № 11.

221 Bielaruskaja Krynica. 1936. № 11.

222 Bielaruskaja Krynica. 1936. № 16.

223 Užrašų knygelė. Protokolo № 30, *27.12.1938 г.*.*

224 Запрашэнне на агульны сход Свята-Серафімаўскага брацтва, 15.01.1937 г.*

225 Новые дни. 1936. № 20 (32).

Цэнтр наогул гаварыў пра немэтазгоднасць правядзення канферэнцыі ў Коўне, бо ў такім выпадку на ёй не змогуць прысутнічаць беларусы з Польшчы[214]. Невядома, ці канферэнцыя адбылася. Але хутчэй за ўсё не, паколькі сабраныя сябрамі БКПТ грошы пайшлі на іншыя мэты, у прыватнасці, 30 літаў былі перададзеныя Якавюком як ахвяраванні ўжо добра вядомаму нам Я. Манцэвічу[215]. Варта звярнуць увагу, што ў чэрвені 1934 г. Манцэвіч адкрыў у Коўне мастацкую рукадзельную майстэрню[216].

З другой паловы 1934 г. звестак пра дзейнасць беларускіх арганізацый у Літве робіцца ўсё менш і менш. Гэта магло быць звязана як з агульнапалітычнай абстаноўкай у балтыйскіх краінах (прыход да ўлады аўтарытарных рэжымаў), так і з недастатковай колькасцю выяўленых намі фактаў.

У пачатку 1935 г. Беларускі народны універсітэт спрабаваў наладзіць друкаванне «Бюлетэня працы універсітэту»[217]. А 30 лістапада 1935 г. Беларускім народным тэатрам былі пастаўлены дзве аднаактавыя камедыі Л. Родзевіча «Пасланец» і «Збянтэжаны Саўка»[218]. У лютым 1935-га[219] і 1936-м[220] гг. адбываліся гадавыя сходы БКПТ. Дакладна вядома, што на гадавым сходзе 23 лютага 1936 г. с. Якавюк увайшоў у склад урада БКПТ[221] . Хутчэй за ўсё, у гэты час ён працягваў займаць пасаду старшыні Таварыства.

25 сакавіка 1936 г. на ковенскім радыё адбылася трансляцыя выступлення беларускага хору А. Матача, і нехта прачытаў з нагоды свята прамову па-літоўску, беларуску і французску[222]. Апошні вядомы нам факт дзейнасці БКПТ адносіцца да 27 снежня 1938 г., калі ўрад Таварыства вынес Сымону Якавюку падзяку за ахвяраваныя 50 літаў на куплю сцяга арганізацыі[223]. У архіве Якавюка захоўваецца запрашэнне на збор сяброў Свята-Серафімаўскага брацтва ад 15 студзеня 1938 г.[224].

У другой палове 1930-х Душэўскі неаднаразова спрабаваў перагледзець судовую справу з Якавюком і падаваў на апеляцыі. 25 лістапада 1935 г. суд зменшыў пакаранне Душэўскага да 3 дзён арышту, а 30 кастрычніка 1936 г. Вярхоўны трыбунал Літвы адмовіў яму ў апраўданні і пакінуў гэты прысуд у сіле[225].

Такім чынам, у 1933–1934 гг. у Літве аформіліся дзве беларускія групоўкі, якія праіснавалі ажно да 1940 г. У першую ўвайшлі арганізацыі, звязаныя з Беларускім цэнтрам у Літве: Беларуска-літоўскае таварыства, рэдакцыя «Беларускага Асяродка», магчыма, некаторыя іншыя. Другую групу ўзначаліла БКПТ – Студэнцкі саюз, Нацыянальная сувязь беларусаў Літвы, розныя філіяльныя арганізацыі пры Таварыстве (тэатр, хор, універсітэт).

Зразумела, раскол не мог спрыяць актыўнаму развіццю беларускай нацыянальнай дыяспары. Цікавая характарыстыка беларускага руху, дадзеная яму «Объединением литовских граждан русской национальности». У лісце рэдактару газеты «Новые Дни» адзначалася: «…есть центр «католической акции», есть центр «белорусской акции», но это монолитные организации, не состоящие ни в федерации, ни в унии с какой-либо другою»[226]. Ліст, напісаны прыкладна ў другой палове 1938 г., сведчыць, што беларускія арганізацыі (мелася на ўвазе, хутчэй за ўсё, БКПТ) сваім уплывам былі больш значныя, чым аб’яднанні расійцаў. Насамрэч, словы аб адзінстве беларусаў далёка не адпавядалі сапраўднасці.

У 1920-х – 1930-х гг. Якавюк знаходзіўся ў неблагім[226] г.Рэдактору матэрыяльным становішчы. У 1932–1933 гг. ён пазычыў дзейнасць сваёй крамы «Knyga» па 500 літаў[227] . А дзе яго сям’я валодала трыма дамамі агульнай плошчай[228] , а таксама 11,8 гектара зямлі, набытай ім у 1936 г. у Рамучанскай воласці непадалёку ад Коўна[229].

[227] Protesto Actas. *5.08.1932 г.**

[228] Да Прыкладам, у Літоўскім Камітэце Яшчэ ў 1939 г. Пры ўездзе ў Коўна з Усходу Мінскай шашы ў 22 км ад горада.

[229] Lietuvos Aušrinė. 1939. Nr. [illegible]. Kaunas. Lietuvos Respublikos Vidaus reikalų ministerijos leidinys.

[230] Гл. Зноскі 1 да Уводзін.

кіраўніцтвам прафесара А. г. Мэндэ з Берліна, нямецкага чыноўніка з ведамства Розэнбэрга. Мэндэ заявіў, што нямецкі ўрад падтрымае беларусаў у барацьбе з Польшчай, СССР, а таксама з краінамі Балтыі.

На канферэнцыі быў утвораны Беларускі камітэт самапомачы з цэнтрам у Берліне. У яго ўвайшлі Фабіян Акінчыц (старшыня), Васіль Захарка (намеснік старшыні), Анатоль Шкуцька (другі намеснік), прафесар Мэндэ (палітычны кіраўнік), Сяргей Табарыцкі (старшыня выведкі і прапаганды). Сябрамі камітэта сталі Кастусь Езавітаў (старшыня БНК у Латвіі), М. Дзямідаў, Гавенда, Сымон Якавюк, Янка Амельяновіч, Герасімовіч.

Са словаў Цанавы, немцы абяцалі Камітэту, што ён складзе будучы беларускі ўрад[231]. Як і з якімі мэтамі трапіў с. Якавюк у склад «будучага ўрада», мы можам толькі здагадвацца. Напэўна, ён прадстаўляў літоўскіх беларусаў.

АПОШНІЯ ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ (1939–1973 гг.)

З пачаткам Другой сусветнай вайны і ўключэннем Віленшчыны[231] Тамсама. ў склад Літоўскай дзяржавы становішча беларускіх арганізацый у Літве прынцыпова змянілася. Літва разам з Віленшчынай атрымала вялікую колькасць этнічных беларусаў, расселеных на землях, што былі раней часткай Другой Рэчы Паспалітай. Лідэрства ў беларускім нацыянальным руху ў Літве павінна было перайсці да віленскай беларускай інтэлігенцыі. На ролю правадыра беларусаў найбольш падыходзіў кс. Адам Станкевіч, былы пасол польскага сойму і сімпатык Літоўскай дзяржавы.

19–21 лістапада 1939 г. кс. Адам Станкевіч і ягоны паплечнік Адольф Клімовіч правялі ў Коўне, дзе сустракаліся з прэзідэнтам Антанасам Сметонам[232]. Магчыма, прадметам размовы быў лёс беларускіх арганізацый Літвы. Ужо 26 лістапада ў Коўне адбылося пасяджэнне Беларускага цэнтра ў Літве, на якім было вырашана перанесці яго ў Вільню. Быў выбраны новы ўрад арганізацыі: старшыня кс. А. Станкевіч, А. Клімовіч і Я. Шутовіч ад віленскіх беларусаў, В. Барысовіч і А. Матач ад беларусаў ковенскіх[233]. Аб удзеле К. Душэўскага ў гэтым мерапрыемстве нават не згадваецца. Ці працягваў А.

Матач заставацца сябрам БКПТ – невядома.

Праз два тыдні, 8 снежня 1939 г., у «Крыніцы» быў надрукаваны артыкул пад назвай «Цэнтр беларускага руху ў Літве», дзе віленчукам расказвалася аб жыцці беларусаў у Коўне. Аўтар артыкула пісаў пра тры ковенскія беларускія арганізацыі: Цэнтр беларускага руху ў Літве, Беларускае культурна-прасветнае таварыства і Беларускі нацыянальны саюз у Літве. Пра падзеі 26 лістапада 1939 г. гаварылася як пра «ўліццё» віленскага беларускага грамадства ў Цэнтр беларускага руху ў Літве, які толькі меў на мэце ўвайсці ў бліжэйшы кантакт з іншымі беларускімі арганізацыямі[234].

У новай палітычнай сітуацыі, калі на чале рэфармаванага Беларускага нацыянальнага цэнтра стаў аўтарытэтны кс. Адам Станкевіч, с. Якавюку можна было б спадзявацца на паляпшэнне адносін Цэнтра і Таварыства. 13 студзеня 1940 г. кс. Станкевіч атрымаў тэлеграму з віншаваннямі з нагоды 25 угодкаў сваёй святарскай і нацыянальнай дзейнасці. Тэлеграму падпісалі старшыня Беларускага нацыянальнага саюза У. Боеў, старшыня БКПТ с. Якавюк і старшыня Студэнцкага саюза ў Літве У. Кароль[235].

Спадзяванні на мірнае супрацоўніцтва, аднак, не спраўдзіліся. Нагодай для сутыкнення стала справа праваслаўнага архіяпіскапа Феадосія. У міжваеннай Польшчы Віленскі архіяпіскап Феадосій быў адным з кіраўнікоў Польскай праваслаўнай аўтакефальнай царквы, якая адкалолася ад Расійскай праваслаўнай царквы ў пачатку 1920-х гадоў. Са знікненнем Другой Рэчы Паспалітай Феадосій трапіў у няпростую сітуацыю, бо вымушаны быў падпарадкаваць Ковенскаму архіяпіскапу Элеўферыю, які належаў да ПЦ. Феадосій да таго ж нібыта выяўляў сімпатыі да беларускага руху. Менавіта гэта падкрэслівала ў канцы 1939-га – пачатку 1940-га г. газета «Крыніца».

У сваю чаргу, 25 лютага 1940 г. сябры Беларускага нацыянальнага саюза і БКПТ правялі ў Коўне з’езд, пад рашуча выступілі ў падтрымку Элеўферыя і сцвярджалі, што артыкулы ў «Крыніцы» «не выражают общего мнения всех православных белорусов, граждан Литовской республики, и потому Съезд

[232] Krynica. 1939. № 3.

[233] Krynica. 1939. № 5.

[234] Krynica. 1939. № 7.

[235] Ксёнія. Адам Станкевіч. У 25-й угодкі святарства і беларускай нацыянальнай дзейнасці (1911–1915 – 10.I.1940) / Рэдагаваў і выдаў Ян Шутовіч. – Вільня, 1940. с. 93.

считает позицию, занятую газетой «Крыніцей» в этих статьях в отношении к православию ошибочным, как с церковной, так и с национально-государственной точек зрения»[236].

«Крыніца» не прыняла пазіцыю з’езду і працягвала выказвацца пра Элеўферыя як пра «расійца, які робіць ганенні на беларусаў», у тым ліку і на віленскага ўладыку Феадосія. Пра справе рэзалюцый з’езду «Крыніца» ў артыкуле «Ці беларусы?» пісала: «Калі так, дык трэба з сумам прызнаць, што Культурна-асветнае таварыства, як беларуская арганізацыя, гэтым актам з нацыянальнага пункту гледжання сябе пахавала. З юрыдычнай стараны Таварыства выйшла з рамак свайго статуту і, ставячы сваёй мэтай падтрыманне расійскага праваслаўя, мусіць змяніць свой статут і назоў, каб, прынамсі, не злоўжываць беларускім імем»[237].

Да чаго дайшоў бы гэты канфлікт, сказаць цяжка (у красавіку 1940 г. пры Цэнтры беларускага руху паспелі стварыць праваслаўную камісію). Аднак падзеі наступных месяцаў зрабілі дыскусіі сярод беларускіх дзеячаў у справе беларусізацыі праваслаўнай царквы неактуальнымі – у чэрвені 1940 г. у Літве была ўсталявана савецкая ўлада, і неўзабаве Літва апынулася ў складзе СССР.

На гэтым скончыўся больш чым 20-гадовы ўдзел с. Якавюка ў беларускім нацыянальным руху. Усё, што адбывалася ў наступныя трыццаць гадоў, за рэдкім выключэннем належыць да сферы яго асабістага жыцця. Пасля прыходу бальшавікоў усе беларускія арганізацыі былі распушчаны, але сам с. Якавюк не пацярпеў, акрамя таго толькі, што ў 1941 г. былі нацыяналізаваны два ягоныя дамы ў Коўне[238]. Больш за тое, у жніўні 1940 г. ён атрымаў савецкі прафсаюзны білет, у якім фігураваў як рэжысёр і кіраўнік беларускай тэатральнай трупы[239].

Мала звестак пра жыццё с. Якавюка падчас Другой сусветнай вайны. Вясной 1942 г. ён жыў на тэрыторыі Рамучайскай воласці, верагодна, на сваёй зямлі[240]. Праз многа гадоў ён напіша, што быў удзельнікам антыфашысцкага руху ў партызанскім атрадзе «За Савецкую Літву»[241]. Сапраўды, атрад «За Савецкую Літву», які ўзначальваў П. Саломінас, дзейнічаў у

[236] Вестник Литовской Православной Епархии. 1940. № 1 (104). С. 15–16.

[237] Крыніца. 1940. № 27.

[238] Председателю Исполнительного Комитета

[239]

[240]

[241]

гады вайны ў Ковенскім павеце[242]. Але ў самім атрадзе Якавюк наўрад ці знаходзіўся, бо ягоная жонка мела маёмасныя справы ў Коўне ў 1943–1944 гг. Паводле даведкі, выдадзенай ёй пасля вайны, Якавюк быў сувязным, займаўся вярбоўкай партызанаў, збіраў інфармацыю і прадукты[243]. Гэта пацвярджае атрыманая ім 1 верасня 1943 г. распіска на буйную суму грошай[244].

Пасля заканчэння курсаў прадаўцоў[248] з верасня 1949-га да 2 студзеня 1951 г. г. Якавюк працаваў прадаўцом у краме № 51, адкуль быў звольнены па выніках інспектарскай праверкі, якая выявіла парушэнні правілаў савецкага гандлю (продаж навагодніх ёлак і драўляных ложкаў па завышаных цэнах)[249]. У гатай справе с. Якавюк накіроўвай ліст ў Міністэрства гандлю ЛССР[250] і ў пракуратуру СССР[251], дамогся частковай рэабілітацыі і атрымай пасаду прадаўца ў краме № 31. Адтуль ён быў зноў звольнены разам з персаналам цэлага аддзела крамы, які падазраваўся ў растраце. Нашу героі, аднак, з такім паваротам справаў не згадзіўся і звярнуўся са скаргамі ў розныя афіцыйныя ўстановы, дзе зноў атрымаў падтрымку. Так, у пракуратуры СССР Тр. Якавюк с. М. 12.12.1953 г. — Литовская ССР. Министерство Торговли. Тр-ну Якавюк с. М. Копия. Директору Каунасского Промторга тов. Кулинаускас. 19.09.1955 г. — Литовская ССР. Министерство Торговли. Директору Каунасского промторга тов. Кулинаускас А. К. Копия. Тр. Якавюку Семену Михайловичу. 24.06.1954 г. — На пытанку жыліщнага отдела города Каунаса Якавюка Семена Михайловича. Заявление 28.11.1956 г. — Lietuvos Aukščiausiasis Teismas. Vilnius. Lietuvos Respublikos Vardu. 2002 m. kovo 18 d. Vilnius. — Ценюй Л. Выбраныя творы. — Мінск: Беларускі кнігазбор, 2000. с. 193.

Пасля Якавюк працаваў у Каунасскім аддзяленні Саюзнай гандлёвай установы, але тым не менш прадаваўца перавесці с. Якавюка на пасаду прадаўца без матэрыяльнай адказнасці і шпагата, бо сваю ранейшую пасаду, якую ён мог[252]. Гэта і паспрыяла рашэнню аб аднаўленні ягонага папярэднім месцы працы ў краме № 31 у якасці прадаўца без матэрыяльнай адказнасці. У канцы 1956 г. ён

239 Аддзел рукапісаў ЦНБ імя Я. Коласа НАНБ. Ф. 23. Воп. 1. Спр. 55. Арк. 15.

240 Пасля вайны Якавюк працаваў у Коўне ў 1944–1949 гг. ён загадваў воцатнай і кававай вытворчасцю на кансервовым заводзе, а потым быў старшынёй праўлення Каунасскага спажывецкага таварыства.

241 Личный листок по учету кадров. 02.07.1954 г.*

242 Бацька Якавюка ў 1948 г. быў асуджаны на 25 гадоў пазбаўлення волі і сасланы ў Іркуцкую вобласць. Яго рэабілітавалі ў 1989 г.

243 Аддзел рукапісаў ЦНБ імя Я. Коласа НАНБ. Ф. 23. Воп. 1. Спр. 55. Арк. 16.

244 Расписка Н. Вол[*неразборліва*] Семёну Михайловичу Яковюку. 04.09.1943 г.

245 Личный листок по учету кадров. 02.07.1954 г.*

246 Копия. Показания. 27.01.1949 г.

247 Копия. Приказ № 26 к по каунасскому Промторгу от 12 марта 1949 г.

248 Аддзел рукапісаў ЦНБ імя Я. Коласа НАНБ. Ф. 23. Воп. 1. Спр. 55. Арк. 15.

249 Копия. Каунасскому Промторгу. Внутренний приказ № 16. 28.01.1953 г.

250 Литовская ССР. Министерство Торговли. Тр-ну Яковюк с. М. Копия. Директору Каунасского Промторга тов. Кулинаускас. 19.09.1955 г.

251 Прокуратура СССР. Тр. Яковюк с. М. 12.12.1953 г.

252 Литовская ССР. Министерство Торговли. Директору Каунасского промторга тов. Кулинаускас А. К. Копия. Тр. Яковюку Семену Михайловичу. 24.06.1954 г.

выкупіў адзін з нацыяналізаваных у 1941 г. дамоў[253], а яшчэ ў 1946 г. паспеў прадаць свой зямельны надзел[254].

У канцы 1950-х ці пачатку 1960-х гг. с. Якавюк разам з сям'ёй пераехаў у Горадню, дзе жыў у доме № 14 па вуліцы Астроўскага. Жыў ён даволі замкнёна. Пра сваё мінулае не гаварыў, але час ад часу трапляў на вока беларускім даследчыкам, якія на хвалі «адлігі» пачалі вывучаць нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі. Так, у 1965 г. да с. Якавюка з Менска прыязджаў Арсень Ліс, прыкладна ў той жа час з ім сустракаўся Аляксей Пяткевіч.

Гэтым сустрэчам з Якавюком паспрыяла Ларыса Геніюш, якая ведала яго асабіста. У лісце да Зоські Верас ад 20.09.1967 Л. Геніюш піша наступнае: «Мой муж – хвараблівы бібліяфіл, я аднойчы «адкрыла» Якавюка (былы пасол) і прывезла яму крыху старых кніг – быў шчаслівы, але пасля ўжо абрыд Якавюку, так часта да яго звяртаўся»[255].

На жаль, невядома, пры якіх абставінах Ларыса Геніюш, што жыла ў Зэльве, змагла «адкрыць» для сябе і свайго мужа асобу с. Якавюка. Як успамінаюць А. Ліс і А. Пяткевіч, іх размовы з с. Якавюком былі не вельмі змястоўнымі. [image] Апошні не толькі не расказаў нічога канкрэтнага аб падзеях 1918–1940 гг., але і адмовіўся дэманстраваць кнігі са сваёй бібліятэкі, якая, як стала вядома пазней, уключала значную колькасць рэдкіх беларускіх выданняў (пасля смерці гаспадара амаль уся бібліятэка знікла).

Памёр Сымон Якавюк на 93-м годзе жыцця, 25 жніўня 1973 г., і быў пахаваны ў Горадні на могілках на праспекце Касманаўтаў.

ЗАМЕСТ ЭПІЛОГА

Мы намагаліся ўстрымацца ад уласных ацэнак гэтай асобы, аддаючы перавагу дакументальным сведчанням. Але нават дакументы не даюць магчымасці зразумець глыбінныя матывы тых або іншых учынкаў нашага героя і іншых асоб.

Ёсць факты, якія могуць ахарактарызаваць с. Якавюка не з

найлепшага боку. Але нават калі б пацвердзіліся факты аб грашовых махінацыях с. Якавюка ці ягоная прыхільнасць да расійскіх самаўладцаў, пры дэталёвым аналізе біяграфій многіх беларускіх дзеячаў гэтыя звесткі не так кідаліся б у вочы – далёка не кожны беларускі палітык таго часу можа прэтэндаваць на ролю апостала адраджэння.

З другога боку, чым глыбей вывучаеш біяграфію той ці іншай асобы, тым больш паўстае пытанняў. Кожны вядомы факт цягне за сабою чараду падзей, пра якія ў гісторыка часта існавала толькі самае цьмянае ўяўленне.

Зрэдку трапляюць у рукі гісторыкаў сведчанні, якія хаця б збольшага даюць зразумець у дзейнасці асобы самае галоўнае – тое, што не ляжыць на паверхні…

У дадзеным выпадку нам пашанцавала, бо такое сведчанне пакінуў нам сам Сымон Якавюк. Разумеючы ўсю гістарычную вартасць гэтага дакумента, напісанага ягонаю рукою ўвосень 1955 г., падаём яго цалкам.

Копия

Председателю Комитета Госбезопасности при Совете Министров ЛССР т. Ляудису

Яковюка Семёна Михайловича

жив. гор. Каунас Крашевская № 34

Прошение

Сего 15/VI 55 г. тов. Якунас телефон № 99-364 пригласил меня в свой кабинет и объявил, что согласно распоряжения Министерства все Сотрудники, достигнувшие преклонного возраста, сняты с учёта, в том числе и я.

Я состоял Сотрудником с 18/IX 1918 г. по 15\VI 55 г. В Польше за политическую работу был 5 раз арестован. Сидел в Гродненской и Белостокской тюрьмах. В 1923 г. 31\XII

Варшавским Окружным Судом был приговорен к 4 годам каторги. В 1924 г. бежал из Польши в Литву, где связался с Полпредом тов. Александровским и Молочковым. Через каналы Полпредства и Торгпредства получал задания работы.

Руководящие Сотрудники Полпредства и Торгпредства менялись, но работа не прекращалась. По заданию принимал участие в Ликвидации Беларусского Эмигрантского правительства, которое возглавлялось Цвикевичем, Кречевским и Захарко. Последнее было ликвидировано в 1925 году.

Выполнил задание об организации и распространении Советской литературы и Антиквариата через Магазин «Книга» (по тому времени находился: Лайсвес, Алея, № 52 во дворе). За распространение нелегальной литературы был в Сметоновское время 3 раза арестован, а магазин «Книга» был закрыт и ликвидирован в 1933 году.

При посредстве «Книги» издавался Журнал «Поклич» на белорусском языке, который субсидировал я «Книгой».

Выполнил задание, организовал и несменно руководил с 1932 г. «Белорусским Культурным обществом в Литве», в которое как отдельные единицы входили Белорусский Народный Театр, Белорусский Народный Университет и Детский сад, Клуб «Белорусская Хатка».

Работа общества и организации продолжалась бесперебойно по 1940 год. Общество было создано с целью противодействия Белорусскому Центру в Литве, которым руководили Ластовский и Душевский, сотрудничавшие с Западом.

Участвовал в Партизанском движении за «Советскую Литву». Командиром отряда был Пустельник Виктор, а кассиром Соломин.

С 1944 по 1955 г. служил в разных учреждениях, но связь с органами М.Г.Б. не прерывалась до 15\VI 55 г.

Последними Сотрудниками были т.т. Душанский, Ященко, Бахманов, Стромилов, Кожаринов, Нарсеев и Серебряков.

Считаю, что за свою 37-годовую сознательную жизнь и честную работу Советскому Государству я вправе обратиться к Вам с покорнейшей просьбой оказать мне содействие на право получения персональной пенсии.

1\X 55 г.

[подпись Яковюка]

[image] Інфармацыя з гэтага дакумента дае магчымасць па-новаму звярнуцца да тых эпізодаў біяграфіі с. Якавюка, якія нам сталі вядомыя. Пра сваю ролю ў гісторыі, звязаную з ліквідацыяй урада БНР і ўдзел у грамадска-палітычным жыцці беларусаў Літвы ў пачатку 1930-х гг. Якавюк напісаў сам. Нам застаецца толькі здагадвацца пра ступень уплыву ягонай асобы на ход тых падзей. Як і пры якіх абставінах быў завербаваны Якавюк – таямніца. Але ўжо ўвосень 1918 г. ён распачаў працу ў Гарадзенскай губернскай расійскай управе як агент ВЧК. Магчыма, ён першапачаткова павінен быў выконваць сваё заданне ў асяроддзі «русских деятелей», якія таямнічым чынам з'явіліся ў Горадні прыкладна ў кастрычніку 1918 г.

З беларусамі і літоўцамі с. Якавюк, у сваю чаргу, звязаўся па волі абставін, калі Управа прыйшла ў заняпад. Сувязь з савецкімі органамі Якавюк мог аднавіць летам 1920 г. Дзейнасць беларускіх паўстанцаў пачатку 1920-х добра ўпісвалася ў планы савецкай Расіі дэстабілізаваць сітуацыю ў Польшчы.

Камбінацыі 1924–1926 гг. вядомыя вельмі слаба. Падазрэнні можа выклікаць звычка С. Якавюка чытаць чужыя лісты, аб якой піша Палута Бадунова, моцнае жаданне наладзіць сувязь урада БНР з СССР і яго дзіўны пераход у лагер праціўнікаў ліквідацыі таго ж урада ў лютым 1926 г. Заслону таямніцы над дзейнасцю с. Якавюка ў гэты перыяд прыадкрываюць тэзісы ЦК КП(б)Б «Белорусское движение за кордоном» ад 16 кастрычніка 1925 г.:

Наша задача в Литве – не допустить организации какого-то ни было комитета белорусской эмиграции, могущего быть

противопоставляемым единственному политическому и культурному центру всего белорусского движения – Минску. (…) Не исключена возможность в каждом отдельном случае использовывания отдельных фигур эмиграции и эмигрантских организаций. (…) В Ковно следует оставить Белорусский национальный комитет под председательством Головинского[256].

Пасля Берлінскай канферэнцыі, што была арганізавана групай А. Цвікевіча на прамое ўказанне савецкага паўнамоцнага прадстаўніка Ульянава планы Масквы змяніліся. З пастановы ЦК КП(б)Б аб канферэнцыі ў Берліне ад 22 кастрычніка 1925 г.: «Принять к сведению сообщение т. Ульянова о том, что в связи с запрещением Головинскому въезда в Литву временно во главе Белорусского национального комитета в Ковно оставлены Яковюк, Гузней и Волькович»[257].

I напрыканцы яшчэ адна цытата. Узялі мы яе з нядаўна надрукаванай дакладной запіскі І. Апанскага старшыні ОГПУ СССР В. Мяжлыцкаму, датаванай 28.12.1926 г. Прозвішча с. Якавюка ў ёй не згадваецца, аднак агульныя звесткі надзвычай цікавыя:

Теперь перейдем к обзору белорусского движения в Литве. Здесь каких-либо оформившихся организаций пока нет, и белорусское движение очень слабо, благодаря тому, что белорусов здесь не много, да и те крайне разрозненны. Однако за последнее время замечается оживление. Мы ведем довольно удачную работу по подчинению этого движения нашему влиянию. С этой целью нами привлечен известный белорусский деятель ГОЛОВИНСКИЙ, работа которого идет под нашим руководством и при нашем финансировании. Издается печатный орган «Поклич» – советской ориентации. На местах создаются гуртки наподобие громадовских. Для обеспечения нашего руководства в настоящее время поставлен вопрос о создании при Л[итовской] К[оммунистической] П[артии] белорусской секции, которая, с одной стороны, могла бы развить работу в белорусских массах, а с другой – оказала бы партийное влияние на гуртки. Другой активной силой в Литве является ЛАСТОВСКИЙ, который в рядах белорусской интеллигенции пользуется авторитетом, и с

[256] Идеологическая работа Коминтерна и Белоруссии 1918–1945. Ч. 1. – Минск: Беларусь, 1990. с. 195.

[257] Там самы сыскаму, с. 203–204.

ним считаются. До самого последнего времени ориентация ЛАСТОВСКОГО была неопределенна, и его старались перетащить на свою сторону различные политические группировки. После Минской Академической конференции возможен со стороны ЛАСТОВСКОГО некоторый поворот в сторону Минска, однако в искренности этого поворота мы сильно сомневаемся и пока от оценки его воздерживаемся[258].

Як бачым, ковенскі БНК ствараўся як арганізацыя, што павінна была праводзіць лінію савецкай агентуры сярод беларускай эміграцыі, а ў канцы 1926 г. з удзелам усё тых жа дзеячаў збіраліся разгарнуць у Літве рух накшталт Беларускай сялянска-работніцкай грамады ў Польшчы.

Як тут не ўспомніць справу «Трэста», створанага ў сярэдзіне 1920-х гг. савецкімі спецслужбамі з мэтай кантраляваць і нейтралізаваць дзейнасць расійскіх манархістаў (як яшчэ можна растлумачыць дзіўныя заклікі ўдзельнікаў лютаўскай канферэнцыі 1926 г. да расійскіх манархічных арганізацый?) Зробленая К. Душэўскім у пачатку 1930-х гг. характарыстыка с. Якавюка выкліканая, здавалася б, толькі асабістай непрыязнасцю, выяўляецца надзвычай трапнай. А ці не дзіўная прысутнасць старшыні Культурна-прасветнага таварыства на з’ездзе 1939 г., арганізаваным нямецкімі і беларускімі нацыстамі? Адольф Клімовіч, які меў магчымасць вельмі нядоўга спатыкацца з Якавюком, у сваіх нататках недвухзначна намякнуў пра нашага героя: «Замену ўлады ў Літве ў 1940 г. перажыў без ніякіх камплікацыяў, і гэта апраўдвае даўна яму прыпісваемыя сувязі і кантакты»[259]. Усе прыведзеныя факты ў кантэксце сцверджанняў самога Сымона Якавюка пачынаюць набываць пэўную яснасць. Але ці быў Сымон Якавюк выключэннем сярод беларускіх нацыянальных дзеячаў? Факты сцвярджаюць, што не быў.

Асабіста прызнаваўся ў супрацоўніцтве з савецкай агентурнай сеткай Кастусь Езавітаў, а яго жыццёвая дарога перакрыжоўвалася са сцежкамі Сымона Якавюка і ў Цэнтры знаходжання ў Горадні ў 1919 г., і на Другой Берлінскай канферэнцыі ў 1925 г., і ў пачатку 1930-х, і на з’ездзе 1939 г.[260].

[258] Дакладная запіска І. Айнскага старшыні ОГПУ СССР тав. Менжынскаму ад 28.12.1926 // Скарыніч. 2002. № 5. с. 154–155.

[259] Аддзел рукапісаў ЦНБ імя Я. Коласа НАНБ. Ф. 1. Воп. 1. Спр.

Быўшы ў лагеры ваеннапалонных, у лістападзе 1939 г. быў завербаваны ў якасці агента НКВД Ф. Кушаль. У яго характарыстыцы адзначалася: «Как осведомитель зарекомендовал себя толковым, знающим нашу работу. Материал давал информационного характера»[260].

[260] Вабішчэвіч А. «Але ж шлях да Свабоды старонка праложа!» // Сыны і пасынкі Беларусі. – Мінск: Полымя, 1996. с. 330.

[261] Ліцвін А. Пасляслоўе // Кушаль Ф. Спроба стварэння беларускага войска. – Мінск: Беларускі Гістарычны Агляд, 1999. с. 149.

Ліпень 2003-га – ліпень 2004-га г.

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

№ 5 (39) - 2005

[image]да Зьместу

[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/05
[image]

АЛЯКСЕЙ ДЗЕРМАНТ
філёзаф, этнакультуроляг. Нарадзіўся ў 1979 годзе ў Менску. Скончыў Акадэмію кіраваньня пры прэзыдэнту. Сябар цэнтру этнакасмалёгіі «Крыўя».

Аляксей Дзермант, Сяргей Санько
Этнагенез беларусаў: навука і ідэалогія

Наша паходжанне па-ранейшаму шмат каму рупіць. Рупіць нам самім прадчуваннем, што ў таямніцы нашага паходжання, як і ў таямніцы нашага этнічнага наймення – наш кон і нашая будучыня. Рупіць і нашым суседзям, асабліва ўсходнім, якія з зайздроснай упорлівасцю ўжо не адно стагоддзе дамагаюцца нашага братэрства. У гэтым таксама ёсць нейкая таямніца. Бо разгадка нашага этнагенезу дапаможа ў разгадцы таксама этнагенезу расіянаў і астатніх славянаў. І што калі гэта акурат тая голка, на кончыку якой – смерць? Смерць расійскага мандыялісцкага міфа.

СЯРГЕЙ САНЬКО
філёзаф, этнолаг. Нарадзіўся ў 1962 годзе ў Вершы. Апошняя кніга «Штудыі з кагнітыўнай і кантрастыўнай культуралёгіі» (БГКАЦ, 1998). Рэдактар і аўтар энцыкляпэдычнага слоўніка «Беларуская міталёгія» (Беларусь, 2004).

Надта многім жылося б куды спакайней, каб нас проста не было. Ды ці мала такіх, для каго нас і насамрэч няма? Дык, можа, калі перафразаваць Ф. Ніцшэ («Ecce homo»), гэта адно прымха, што мы жывём?

Пераконванні ў фантомнасці нашага існавання ўзрастаюць усякі раз напярэдадні чарговых пераломаў у грамадзкім жыцці, як, напрыклад, і цяпер, напярэдадні выбараў, калі для абодвух

палітыкаў-супернікаў прэзідэнцтва ў фантомнай саюзнай дзяржаве – гэта абсалютна легітымны спосаб падаўжэння паўнамоцтваў і адсоўвання канкурэнта на ўзбочыну палітычнага жыцця. Перавага тут будзе за тым, хто, апроч іншага, найлепей скарыстае з «братэрскай фразеалогіі»...

Вось і загаварылі. Уладзімір Пуцін, знаходзячыся ў ліпені на адпачынку ў Цвярской губерні, падчас сустрэчы з актывістамі моладзевай экстрэмісцкай арганізацыі «Нашы», што ладзілі шматтысячную «тусоўку» на возеры Селігер, адмыслова падкрэсліў, што расійцы і беларусы – гэта адзіны вялікі народ (зрабіўшы, што праўда, належны рэверанс у бок адметнасці і самабытнасці беларускай культуры і гісторыі). Падкрэсліў ён і заўважныя геапалітычныя дывідэнды ўз'яднання народу, які, відаць, адно гістарычнай недарэчнасцю, а можа, і злаключэннямі нядобразычліўцаў, стаўся раз'яднаны і падзелены дзяржаўнымі межамі. Нагодай загаварыць пра Беларусь стала пытанне нейкай «нашысткі» з Беларусі.

Клопатам пра правільны накірунак думак у моладзі прасякнуты выступы многіх расійскіх і беларускіх палітыкаў і вучоных. Як, напрыклад, выступ члена-карэспандэнта РАН У. Волкава падчас абмеркавання навуковага дакладу В. Сядова на Прэзідыуме РАН «Этнагенез ранніх славянаў»: «Зараз, напрыклад, у Кіеве, дый у Менску (мы сёння слухалі тут прэзідэнта беларускай Акадэміі навук), таксама з'явіліся свае трактоўкі старажытнарускай народнасці. Кажуць, што гэта міф[1], ніякай старажытнарускай народнасці не было, але затое спакон веку існавалі ўкраінцы і, скажам, беларусы. Гэта значыць наяве спроба ўстаражытнення своёй гісторыі. Я звяртаю вашую ўвагу на гэта ў звязку з тым, што праблема, закранутая сёння ў дакладзе В. Сядова, мае, апроч навуковага, таксама агромністае палітычнае і маральна-этычнае значэнне. Бо калі гістарычная навука будзе развівацца, у прыватнасці ва Украіне, у пазначаным накірунку і гэткімі ж тэмпамі, як цяпер, то ў наступным пакаленні насельніцтва Украіны можа стаць варожым у дачыненні да Расіі».

Таму зноўку на шчыт уздымаецца канцэпцыя «старажытнарускай народнасці», якая запанавала ў ўсенецкай

[1] Меў на

гістарычнай навуцы ў пасляваенны перыяд, асаблівы пачын, і г. публікацыі ў 1950 г. вядомай працы І. Сталіна «Марксізм і пытанні мовазнаўства» і тэзісаў ЦК КПСС «Аб святкаванні 300-годдзя ўз'яднання Украіны з Расіяй» ад 10 студзеня 1954 г. Ці не найбольш паказальным прыкладам «чуйнасьці» прыкмет, з інтуіцыі да ідэалагічнага клімату можа быць рэзкая змена даследніцкіх арыентацый В. Сядовым – аўтарам вядомай субстратнай (метыснай) тэорыі этнагенезу беларусаў (славянскія ббцькі, балцкія маткі), які пасля смерці Б. Рыбакова стаўся галоўным «стаўпом» тэорыі «старажытнарускай народнасці». Тэарытычная эвалюцыя гэтага даследніка прыкметна супадала з асноўнымі паваротнымі пунктамі развіцця савецкай (а затым – расійскай) грамадска-палітычнай думкі: ва ўмовах хрушчоўскай «адлігі» пры адносным паслабленні ў сферы ідэалогіі з'яўляецца ягоная «тэорыя балцкага субстрату», якая ішла ўразрэз з маркісцка-ленінскай этналогіяй, у часе «перабудовы» з яе атмасферай «вясны народаў», напярэдадні «параду суверэнітэтаў» В. Сядоў даводзіць апрычонасць асобных частак усходнеславянскага арэалу, акцэнтуючы, прыкладам, заходнія сувязі Наўгародчыны і Пскоўшчыны, у ельцынска-пуцінскую эпоху, калі ў расійскім грамадстве пачынае панаваць настальгія па страчаным славянскім адзінстве і вялікай дзяржаве, віноўнік коліжнага «балцкага пярэпалаху» пераглядае этнічную атрыбуцыю археалагічных культур, паўсюль знаходзіць прыкметы славянскай міграцыіі і сцвярджае існаванне на абшарах Усходняй Еўропы адзінай «старажытнарускай народнасці».

Так што этнічная гісторыя Беларусі надта шчыльна занітавана з перыпетыямі палітычнай гісторыі Усходняй Еўропы і, трэба думаць, яшчэ даўгі час будзе знаходзіцца ў самай гушчэчы ідэалагічных войнаў ува ўмовах канстатаванай с. Гантынгтанам «сутычкі цывілізацый». Ну, а тут, як нам імкнуцца давесці, ролі наперад размеркаваны і «радаводы» службовым нацыям раздадзены.

Зрэшты, сёння няма браку ў ахвотных «узгадніць» гістарычную ды этнагенетычную праўду з актуальнай палітычнай мэтазгоднасцю. Нядаўна адразу на некалькіх расійскіх дыскусійных інтэрнет-парталах[2] быў апублікаваны артыкул

Матчына, і г. Ісіхава, які ягоны 300-годдзя 1954 г. Ці прыкмет, з змена 80-х гомінулага сугагоддзя. Б. Рыбакова прыватнасці, яка станешчанне: Шлыхов-А. В. Древнерусская народность: ленинская мифы// Этногенез и этнокультурные контакты славянскім Труды VI Международного Конгресса славянской археологии. Т. 3. М., 1997. с. 376–385.

доктара біялагічных навук, члена Саюза пісьменнікаў Расіі К. Рэзнікава, які, апроч іншага, актыўна выступае і на геапалітычным «попрышчы», выказваючы свае сімпатыі да «расійскіх новых правых» (не блытаць з «еўрапейскімі новымі правымі»), у прыватнасці, да А. Дугіна. Артыкул называўся: «Балты ли белорусы?» і меў на мэце даць аргументаваную і паважную крытыку этнагенетычнай формулы «беларусы – гэта славянамоўныя балты», прапанаванай адным з аўтараў гэтага артыкулу 12 гадоў таму ў часе працы Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Балты і этнагенез беларусаў», арганізаванай Цэнтрам этнакасмалогіі «Крыўя» з нагоды 20-х угодкаў бясслаўнай забароны канферэнцыі «Этнагенез беларусаў»[3].

Адштурхоўваецца К. Рэзнікаў ад он-лайнавай публікацыі, [2] Гл. у прыватнасці: змешчанай на сайце «Беларускага калегіуму». Лекцыя lubrinemics.ru і сканчаецца згаданай ужо формулай беларускага этнагенезу. uhrenelib.ru.
«Беларусы – гэта славянамоўныя балты» – і завяршаецца словамі: «Якія гэта можа мець культуралягічныя наступствы, пакажа будучыня. Але слова сказанае». Вось гэтыя магчымыя наступствы і зарухнулі нашаму шаноўнаму апаненту. Бо нельга ж, як ён зрабіў ужо ў другім абзацы свайго артыкула, зыходзіць з двух відавочных дадатнасцяў гэтай канцэпцыі: 1) прастаты і 2) своечасовасці: «Новыя ідэі набываюць папулярнасць, калі яны камусьці патрэбныя і простыя для ўспрымання»; «Балцкая канцэпцыя, у першую чаргу, адрасавана беларускай моладзі».

[3] Санько сл. «Балцкая тэма» // Наша ніва. 1993. № 14. Пра забарону канферэнцыі і археалогію ў ролі службіткі ідэалогіі гл.: Крывальцэвіч М. Археалёгія і палітыка // Шуфлядка. Часопіс найноўшае гісторыі. 1999. № 1. с. 33–54.

Што да прастаты, то гэта дадатнасць любой тэорыі. Тэорыя тым жыццяздольнейшая, чым большую колькасць фактаў яна можа тлумачыць, засноўваючыся на мінімуме зыходных прыпушчэнняў. Аргументацыя нашага апанента гэтакай прастатой не вылучаецца: ледзь не кожны крок у яго контрдовадах патрабуе ўвядзення новых гіпотэз *ad hoc*. Зрэшты, гэтак робяць і больш спрактыкаваныя ў этнагенетычным дыскурсе папярэднікі К. Рэзнікава (напрыклад, А. Трубачоў, В. Сядоў, М. Шчукін, В. Булкін і інш.). Тут, далібог, ёсць дзе разгарнуцца «лязу Акама»!

Аўтахтанісцкая балцкая мадэль беларускага этнагенезу

паўстала не па прыхамаці таго або іншага даследніка і не з падачы спецслужбаў якой-колечы афарбоўкі, а з логікі развіцця двух асноўных канкуруючых этнагенетычных парадыгмаў, пададзеных адменамі славянскай аўтахтанісцкай і балта-славянскай міграцыянісцкай мадэляў, якія ў сваіх станоўчых частках (а гэта крытыка слабых месцаў канкуруючых канцэпцыяў) найлепшым чынам дэманстравалі ўзаемную недастатковасць і няздатнасць развязаць увесь комплекс наяўных праблем ці, прынамсі, вывесці этнагенетычны дыскурс на больш перспектыўныя пуцявіны. Аўтахтанісцкая балцкая мадэль беларускага этнагенезу паўстала з усведамлення блізка фатальнай залежнасці канкуруючых тэорый ад 1) цяжару неадрэфлектаваных (у тым ліку і метафізічных) прыпушчэнняў, спадкавых ад першых спробаў стварэння тэорый этнагенезу беларусаў, заснаваных на беднай факталагічнай базе; 2) некрытычнага прачытання звестак пісьмовых крыніц; 3) метадалагічна неправамернага змешвання этна-, глота- і культур-генетычных праблематык; 4) высокай ідэалагічнай наладаванасці этнагенетычных канцэпцый; 5) біблійнага міфа пра паходжанне народаў і моваў з натуральнай яго рацыяналізацыяй у мадэлях «радаводных дрэваў»; 6) рэпрэсіўнасці інтэрпрэтуючай рэтраспекцыі, якая адштурхоўваецца ад наяўнага стану, праектуючы яго на вялізныя храналагічныя зрэзы ў мінулае і шэрагу іншых.

Аўтахтанісцкая балцкая мадэль беларускага этнагенезу дазваляе менш-больш несупярэчліва (наколькі гэта наогул магчыма пры цяперашнім стане распрацоўкі гэтай праблематыкі) увязаць **увесь комплекс** дадзеных, назапашаных у прыярытэтных для этнагенетыкі дысцыплінах, такіх як фізічная антрапалогія і этнагеноміка, лінгвістыка, археалогія і гістарыяграфія, этнаграфія, фальклярыстыка і некаторых іншых, не залежаць ад даследніцкай прыхамаці аднясення фактаў да рэлевантных і нерэлевантных, ігнаравання (замоўчвання, а то і проста знішчэння) нерэлевантных фактаў і ў вытлумачэнні апошніх чэрпаць дадатковыя падмацункі фактам рэлевантным, г. зн. і ўсёй тэорыі.

Менавіта гэтую «прастату», цэльнасць, комплекснасць у

падыходзе да праблемы ўгледзеў у нашай канцэпцыі К. Рэзнікаў і падаў разгорнутую контраргументацыю.

Сваю крытыку наш апанент грунтуе на еўразійскай (ясная рэч – патрыятычнай!) адмене «расавай тэорыі», называнай ім сацыябіялогіяй. У дадзеным выпадку – да- заванай сумесі этнагенетыкі і гумілёўскай тэорыі пасіянарнасці. І адразу «бярэ быка за рогі», канстатуючы – са спасылкай на найноўшыя генетычныя штудыі варыятыўнасці мужчынскіх Y-храмасом – існаванне непераадольнага, яшчэ біялагічна абумоўленага, бар’еру паміж літоўцамі і беларусамі. Паводле К. Рэзнікава, «найцікавейшай ёсць наяўнасць генетычнага бар’ера агульнаеўрапейскага маштабу паміж беларусамі і літоўцамі, выяўленага пры матэматычнай апрацоўцы адрозненняў мутацый у Y-храмасоме. У той жа час, якіх-кольвек генетычных адрозненняў паміж славянскімі народамі: беларусамі, расійцамі Наўгародскай вобласці і паўночнымі ўкраінцамі не выяўлена. Гэты факт мае прынцыповае значэнне. Ён азначае, што продкі літоўцаў па бацькоўскім лініям пакідалі мала нашчадкаў сярод беларусаў, а мужчыны – продкі беларусаў не зрабілі прыкметнага ўнёску ў генафонд літоўцаў».

Звернемся да публікацый, на якіх грунтуецца гэтае меркаванне. Сапраўды, у адной з іх фіксуецца розніца беларусаў, літоўцаў і латышоў паводле наяўнасці 16 Y-храмасомнай гаплагрупы (г. зв. Tat-C-мутацыя): 2 %, 47 % і 37 %, адпаведна[4]. Іншыя даследнікі даюць ужо іншыя лічбы: беларусы – 11 %, літоўцы – ад 33 да 37 %, латышы – ад 29 да 40 %[6]. Розніца заходзіцца, але і павелічэнне адсоткаў у беларусаў у пяць разоў ды сур’ёзная разбежка ў літоўскіх ды латышскіх выбарках выклікае небеспадстаўныя сумневы і пытанні. У чым жа справа?

Па-першае, варыятыўнасць дадзеных абумоўленая розным колькасцю асоб, у якіх бяруцца пробы для генетычнага аналізу. Па-другое, прыведзеныя адсоткі адлюстроўваюць сярэдні «нацыяльны» паказнік, а ў нашым разе дзеля дакладных высноваў патрэбныя былі б звесткі пра рэгіянальнае размеркаванне, асабліва пры тым, што, прыкладам, жыхары заходняга Палесся антрапалагічна і генетычна істотна розняцца ад астатняга насельніцтва Беларусі. Па-трэцяе, да

[4] Roxan Z. H., Zerjal T., Hurles M. E., Adojaan M., Alavantic D., et al. Y-Chromosomal Diversity in Europe is Clinal and Influenced Primarily by Geography, Rather than by Language / American Journal of Human

сёння дагэтуль няма (!) спецыяльнага даследавання прысвечанага полімарфізму ДНК Y-храмасомы беларусаў, а таму іх параўнанне па гэтым маркеры можа мець пакуль што папярэдні і фрагментарны характар. Натуральна, прадказаць любыя далекасяжныя высновы, якія да таго ж відавочна пярэчаць матэрыялам фізічнай антрапологіі, вы ладзіць, прынамсі, некарэктным. Між тым, параўнанне полімарфізму мітахандрыяльнай ДНК беларусаў і літоўцаў сведчыць пра іх генетычную блізкасць, у распрацаў выяўляюцца дамешкі, звязаныя з фінна-вугорскім субстратам[5]. Ранейшыя штудыі сістэм групаў крыві АВО і MN выявілі значную ступень падабенства беларусаў і літоўцаў, якія амаль не адрозніваюцца ад прыбалтыйскага генетычна антраполагічнага тыпу[6]. Стаецца, што і ў Y-храмасомным ДНК-варыяцыях, дэманстраваных беларусамі, пераважаюць агульныя з прыбалтамі рысы[7]. Такім чынам, беларусы, якія ў сваёй большасці з'яўляюцца нашчадкамі крывічоў, дэманструюць генетычную блізкасць да прыбалтаў, што, відаць, можа быць растлумачана агульнасцю іх паходжання[8]. Аднак, на нашу думку, для больш дакладных высноваў неабходна правесці даследаванне Y-храмасомнага ДНК-полімарфізму ў беларусаў, прадставіць яго ў параўнанні з іншымі еўрапейскімі папуляцыямі і прааналізаваць з пункту гледжання гісторыі фарміравання беларускага этнасу.

Вынікі даследавання. Вывучэнне Y-храмасомнага ДНК-полімарфізму ў беларусаў дазволіла выявіць 11 гаплатыпаў, якія ўтвараюць 4 гаплагрупы (табл. 1). Найбольш частотнай з'яўляецца гаплагрупа R1a1 (52,2 %), якая ўласціва ў асноўным народам Усходняй Еўропы. Гаплагрупа I (21,7 %) характэрная для карэннага насельніцтва Скандынавіі, Усходняй Еўропы і Балкан. Гаплагрупы N3 (13 %) і R1b3 (13 %) распаўсюджаны ў Цэнтральнай і Заходняй Еўропе. Гаплатып 19 гаплагрупы R1a1 (39,1 %) і гаплатып 9 гаплагрупы I (13 %) з'яўляюцца найбольш частотнымі ў беларусаў. Гаплатып 19 гаплагрупы R1a1 (39,1 %) і гаплатып 9 гаплагрупы I (13 %) з'яўляюцца найбольш частотнымі ў беларусаў. Гаплатып 19 гаплагрупы R1a1 (39,1 %) і гаплатып 9 гаплагрупы I (13 %) з'яўляюцца найбольш частотнымі ў беларусаў.

Такім чынам, беларусы, якія ў сваёй большасці з'яўляюцца нашчадкамі крывічоў, дэманструюць генетычную блізкасць да прыбалтаў, што, відаць, можа быць растлумачана агульнасцю іх паходжання[8]. Аднак, на нашу думку, для больш дакладных высноваў неабходна правесці даследаванне Y-храмасомнага ДНК-полімарфізму ў беларусаў, прадставіць яго ў параўнанні з іншымі еўрапейскімі папуляцыямі і прааналізаваць з пункту гледжання гісторыі фарміравання беларускага этнасу.

Вынікі даследавання. Вывучэнне Y-храмасомнага ДНК-полімарфізму ў беларусаў дазволіла выявіць 11 гаплатыпаў, якія ўтвараюць 4 гаплагрупы (табл. 1). Найбольш частотнай з'яўляецца гаплагрупа R1a1 (52,2 %), якая ўласціва ў асноўным народам Усходняй Еўропы. Гаплагрупа I (21,7 %) характэрная для карэннага насельніцтва Скандынавіі, Усходняй Еўропы і Балкан. Гаплагрупы N3 (13 %) і R1b3 (13 %) распаўсюджаны ў Цэнтральнай і Заходняй Еўропе. Гаплатып 19 гаплагрупы R1a1 (39,1 %) і гаплатып 9 гаплагрупы I (13 %) з'яўляюцца найбольш частотнымі ў беларусаў.

Такім чынам, беларусы, якія ў сваёй большасці з'яўляюцца нашчадкамі крывічоў, дэманструюць генетычную блізкасць да прыбалтаў, што, відаць, можа быць растлумачана агульнасцю іх паходжання[8]. Аднак, на нашу думку, для больш дакладных высноваў неабходна правесці даследаванне Y-храмасомнага ДНК-полімарфізму ў беларусаў, прадставіць яго ў параўнанні з іншымі еўрапейскімі папуляцыямі і прааналізаваць з пункту гледжання гісторыі фарміравання беларускага этнасу.

Вынікі даследавання. Вывучэнне Y-храмасомнага ДНК-полімарфізму ў беларусаў дазволіла выявіць 11 гаплатыпаў, якія ўтвараюць 4 гаплагрупы (табл. 1). Найбольш частотнай з'яўляецца гаплагрупа R1a1 (52,2 %), якая ўласціва ў асноўным народам Усходняй Еўропы. Гаплагрупа I (21,7 %) характэрная для карэннага насельніцтва Скандынавіі, Усходняй Еўропы і Балкан. Гаплагрупы N3 (13 %) і R1b3 (13 %) распаўсюджаны ў Цэнтральнай і Заходняй Еўропе. Гаплатып 19 гаплагрупы R1a1 (39,1 %) і гаплатып 9 гаплагрупы I (13 %) з'яўляюцца найбольш частотнымі ў беларусаў.

5 Behar D. M., Thomas M. G., Skorecki K., Hammer M. F. Multiple Origins of Ashkenazi Levites: Y Chromosome Evidence for Both Near Eastern and European Ancestries // American Journal of Human Genetics. Vol. 73. 2003. P. 768–769.

6 Tambets K., Rootsi S., Kivisild T., Villems R. The Concepts of Richard Indrekvi About the Origin of the Finno-Ugric Speakers and the Population Genetics of the Extant North-East European Populations: Trames // Journal of the Humanities and Social Sciences. Vol. 5. № 1. 2001. P. 69; Kasperavičiūtė D., Kučinskas V., Stoneking M. Y Chromosomal and Mitochondrial DNA Variation in Lithuanians // Annals of Human Genetics. Vol. 68. 2004. P. 438–452.

7 Гарадуны К. Украінцы // Этнічны склад насельніцтва Беларусі. Мінск, 2002. С. 258–260; Behar D. M., Metspalu E., Kivisild T., Rosset S., Tzur S., Hadid Y., Yudkovsky G., Rosengarten D., Pereira L., Amorim A., Quintana-Murci L., Gurwitz D., Deutscher D., Rengel M., Loewenthal N., Balanovsky O. Counting the Founders: The Matrilineal Genetic Ancestry of the Jewish Diaspora // PLoS ONE. 2008. Vol. 3. Issue 4. P. e2062. doi:10.1371/journal.pone.0002062; Malyarchuk B. A., Derenko M. V. Mitochondrial DNA Variability in Russians and Ukrainians: Implication to the Origin of the Eastern Slavs // Annals of Human Genetics. Vol. 65. 2001. P. 63–78; Малярчук А. І., Дэрэнка М. У. Мітахандрыяльная ДНК беларусаў: вынікі папуляцыйнага даследавання // Генетыка. 2001. Т. 37. № 8. С. 1126–1131; Малярчук А. І. Эвалюцыйныя і гістарычныя аспекты полімарфізму мітахандрыяльнай ДНК беларусаў // Весці АН БССР. Серыя медыцынскіх навук. 1991. № 1. С. 91–95.

8 Кучинская С. А., Шевченко Н. А., Бетал Л. А., Бетрозова А. Ч., Мяркулова А. М. Полиморфизм STR-локусов Y-хромосомы в трех популяциях Восточных славян // Генетика. 2002. Т. 38. № 1. С. 80–86.

К. Разыкаваю не зусім тое, што яго інтэрпрэтацыя ў шэрагу папярэдніх *этнагенетычных* штудыяў карэнным чынам разыходзіцца з дагэтэшнімі фізічнай антрапологіі. Яны ў агульнасці вядомай канцэпцыі указваюць проста неарэлевантныя і да таму і не тлумачаць нагуль і ў іх, не выкліканыя.

Алексеев В. П. Историческая антропология и этногенез.

Меркіна. 1989. с. 152.

12 Мікулічы А. Гістарычны этнас і яго прыкметы // Беларускі этнаграфічны зборнік. Вып. 1. Мінск, 1996. с. 55.

13 Мікулічы А. Гістарычная геаграфія Беларусі: Сельніцтва, сельніцкія пабудовы і сельніцкая гаспадарка. Мінск, 1993. Ч. 1. Гістарычны нарыс. 1994. с. 68.

14 Гл. напр., Зализняк В. В. Опыт применения факторного анализа к антропологическим данным (для частного случая) // Антропологический сборник. Вып. 1. М., 1957. с. 253.

15 Алексеева Т. И. Этногенез восточных славян по данным антропологии. М., 1973. с. 253.

16 Ефимова с. Восточнославянский ареал на антропологической карте средневековой Европы // Восточные славяне: антропология и этническая история. Москва, 2002. с. 203.

17 Денисова Г. География антропологических типов балтских племен и этногенетические процессы на территории Литвы и Латвии // Балты, славяне, прибалтийские финны: этногенетические процессы. Рига, 1990. с. 68–69.

18 Татаренко Л. И., Салибон И. И. Экологические аспекты в антропологических исследованиях на территории БССР. Минск, 1982. с. 10–11.

19 Салибон И. И. Палеоантропология Белоруссии и вопросы происхождения белорусского народа (по краниологическим материалам II тыс. н. э.): Автореферат дисс. на соискание уч. степ. канд. ист. наук. – Москва, 1969; Алексеева Т. Восточные славяне: истоки, становление, формирование // Наука в России. 2003. №2. с. 63, 66, 69–70.

20 Вынак В. Антрапалагічныя тыпы і некаторыя вопросы этнической истории // Происхождение и этническая история русского народа. Труды института этнографии АН СССР. Новая серия. Т. 88. Москва, 1965. с. 268.

21 Алексеева Т. Этногенез восточных славян по данным антропологии... с. 231. Параўн. як К. Рэзнікаў «элегантна» забываецца згадаць і пра літоўцаў, і пра яшчэ зусім нядаўна

Антрапалагічнае вывучэнне беларускага этнасу за апошнія 25–30 гадоў дазволіла прапанаваць канцэпцыю перамяшчэння па эходнай генетычнай інфармацыі на працягу 100–150 пакаленняў, пра бок задоўга да вераломнай каланізацыі гэтай тэрыторыі ўсходнімі славянамі.[12] Методыка гістарычнай генеаграфіі яшчэ больш палаўжае радавод і генетычную пераемнасць каранных насельнікаў Беларусі. Паводле даследаванняў А. Мікуліча, уся тэрыторыя нашай краіны была напкам заселеная продкамі сучаснага насельніцтва 10–11 тысяч гадоў таму, і кадкуль вынікае і выснова, што беларусы ёсць «тутэйшымі» нашчадкамі сваіх тутэйшых продкаў.[13] Антрапалагічныя даследаванні паказваюць на адсутнасць слядоў масавых міграцыяў, якія маглі б прывесці да істотнай змены фізічнага аблічча насельніцтва Беларусі.[14]

Адмыслоўцы звяртаюць увагу на кадзінства фізічнага аблічча заходніх крывічоў, радзімічаў і дрыгавічоў, падабенства іх да сярэднявечнага лета-літоўскага насельніцтва», што апэньваецца «як праявы адзінага антрапалагічнага субстрату».[15] Насельніцтва з тэрыторыі Беларусі, якое ў IX–XIII стст. пакінула курганныя пахаванні, падобнае перадусім да тых балцкіх групаў, якія ў эпоху жалеза былі звязаныя з абшарам Верхняга Падняпроўя, да Панямоння (Сятвязі і носьбіты культуры

прыхаванай расійскі)[16]. Прыкладам, пра ніводзін
беларускага сцяга перакрасіць, ад трыбок жыхароў
Смаленшчыны, Бряніччыны, Цвярэчыны, Арцкіх дыямёнцкай
(рабочага сцяга Цэнтральнай Расіі). Пыль праз змаўчаныя
Украіны. Якія мовы не беларусаў на славянаў, па-першае,
штучна падзяляе генетычна адзіную валдайска-
верхнеднепроўскую папуляцыю – беларусаў і заходніх расійцаў,
і, па другое, процістаўляе беларусам антрапалагічна блізкіх ра-
сійцаў Цэнтральнай Расіі, палякаў і паўночных украінцаў»
(Резников К. Валты ли белорусы?).

[22] Денисова Г. Антропологический тип восточных литовцев //
Latvijas PSR zinatņu Akademijas vestis. 1965. № 9. с.
15endash;26; Деченко В. Д. Антропологічний склад
українського народу. Порівняльне дослідження народів УРСР і
суміжних територій. Київ, 1965. с. 120endash;121.

[23] Денисова Г. К вопросу об антропологическом составе
восточных латышей и восточных литовцев // Latvijas PSR
zinatņu Akademijas vestis. 1958. № 2. с. 27.

[24] Гл., прыкладам: Hesch M. Letten, Litauer, Weissrussen. –
Vienna, 1933. (Хеш лічыў нават дзеля гэтай блізіні, што
«заходнія беларусы – гэта пераважна рускамоўныя літоўцы», с.
4); Coon C. S. Races of Europe. – New York. Macmillan, 1939. –
739 p. (Паводле Куна: «Ідэнтычнасць або амаль ідэнтычнасць
беларусаў з літоўцамі, магчыма, абумоўлена тым, што першыя
былі некалі балтамі, якія падлеглі славянскім уплывам,
гэтаксама як усходнія прусы – гэта германізаваныя балты».)

[25] Тегако Л. И., Саливон И. И. Экологические аспекты... с. 109.
Тое, што тыя ж аўтары дагэтуль казалі пра шматлікасць
балцкага насельніцтва і генетычную перамнасць беларусаў
цягам тысячагоддзяў, сведчыць, што гэтае нярэчайне не мае
дачынення да антрапалагічнай навукі.

[26] Топоров В., Трубачев О. Лингвистический анализ
гидронимов Верхнего Поднепровья. Москва, 1962. с. 232.

[27] Катонава А. Праблемы інтэрпрэтацыі заходнядзвінскай
гідранімії // Беларуская анамастыка. Мінск, 1977. с. 14.

[28] Салівон І. Фарміраванне фізічнага тыпу беларусаў //
Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы
Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы). Усебеларуская
канферэнцыя гісторыкаў (Менск, 3–5 лютага 1993 г.): Тэзісы
дакладаў і паведамленняў. Ч. 1. Гісторыя Беларусі. Мінск,

1993 г. 47.

29 Падрабязней гл.: Чарняўскі М. Культурна-гістарычны экскурс ў *вынікі* шматгадовых антрапалагічных даследаванняў // Беларускі этнаграфічны зборнік. Вып. 1. Мінск, 1997. с. 5–17.

30 Алексеева Т. И., Хрущ С.Л. Древнейшее население Восточной Европы. / Восточные славяне: антропология и этническая история. Москва, 2002. с. 254–255.

31 Zinkevicius Z. Lietuviu tautos kilme. Vilnius, 2005. P. 40–51.

32 Топоров В. Н. О характере древнейших балто-финно-угорских контактов по материалам гидронимии // Uralo-Indogermanica. Балто-славянские языки и проблема урало-индоевропейских связей. Материалы 3-й балто-славянской конференции, 18–22 июня 1990 г. Москва, 1990. с. 105.

33 Ваба Л. Языковые контакты прибалтийских финнов с балтами и географическая терминология // XVII Всесоюзная финно-угорская конференция. I: Языкознание: Тезисы докладов. Устинов, 1987. с. 51–52; Ваба Л. Сепаратные балтизмы в прибалтийско-финских языках // Uralo-Indogermanica. Балто-славянские языки и проблема урало-индоевропейских связей. Материалы 3-й балто-славянской конференции, 18–22 июня 1990 г. Москва, 1990. с. 141–142.

34 Ванагас А. Максимальный ареал балтской гидронимии и проблема происхождения балтов // Этнографические и лингвистические аспекты этнической истории балтов. Рига, 1980. с. 119–123.

35 Параўн.: Schmid W. P. Baltisch und Indogermanisch // Baltistica. T. XII (2). 1976; Сейбутис А. Индоевропейцы: палеоэкология и природные сюжеты мифов // Природа. 1987. № 8. с. 96–106; Haudry J. The Indo-Europeans. Washington, 1998. с. 99–113.

36 Булкин В. А. О формировании границ в области днепро-двинского междуречья // Археологическое исследование Новгородской земли. Ленинград, 1984; Герд А. С. К реконструкции днепро-двинской диалектной зоны // Псковские говоры в историческом и настоящем. Ленинград, 1988. с. 118–122; Булкин В. А., Герд А. С. К этноисторической географии Белоруссии // С. славяне: Этногенез и этническая история: Междисциплинарные исследования. Ленинград, 1989. с. 67–76.

37 Падрабязней гл.: Чарняўскі М. Культурна-гістарычны экскурс ў *вынікі* шматгадовых антрапалагічных даследаванняў // Беларускі этнаграфічны зборнік. Вып. 1. Мінск, 1997. с. 5–17.

38 Алексеева Т. И., Хрущ С.Л. Древнейшее население Восточной Европы. / Восточные славяне: антропология и этническая история. Москва, 2002. с. 254–255.

39 Zinkevicius Z. Lietuviu tautos kilme. Vilnius, 2005. P. 40–51.

40 Топоров В. Н. О характере древнейших балто-финно-угорских контактов по материалам гидронимии // Uralo-Indogermanica. Балто-славянские языки и проблема урало-индоевропейских связей. Материалы 3-й балто-славянской конференции, 18–22 июня 1990 г. Москва, 1990. с. 105.

41 Ваба Л. Языковые контакты прибалтийских финнов с балтами и географическая терминология // XVII Всесоюзная финно-угорская конференция. I: Языкознание: Тезисы докладов. Устинов, 1987. с. 51–52; Ваба Л. Сепаратные балтизмы в прибалтийско-финских языках // Uralo-Indogermanica. Балто-славянские языки и проблема урало-индоевропейских связей. Материалы 3-й балто-славянской конференции, 18–22 июня 1990 г. Москва, 1990. с. 141–142.

42 Ванагас А. Максимальный ареал балтской гидронимии и проблема происхождения балтов // Этнографические и лингвистические аспекты этнической истории балтов. Рига, 1980. с. 119–123.

43 Параўн.: Schmid W. P. Baltisch und Indogermanisch // Baltistica. T. XII (2). 1976; Сейбутис А. Индоевропейцы: палеоэкология и природные сюжеты мифов // Природа. 1987. № 8. с. 96–106; Haudry J. The Indo-Europeans. Washington, 1998. с. 99–113.

44 Булкин В. А. О формировании границ в области днепро-двинского междуречья // Археологическое исследование Новгородской земли. Ленинград, 1984; Герд А. С. К реконструкции днепро-двинской диалектной зоны // Псковские говоры в историческом и настоящем. Ленинград, 1988. с. 118–122; Булкин В. А., Герд А. С. К этноисторической географии Белоруссии // С. славяне: Этногенез и этническая история: Междисциплинарные исследования. Ленинград, 1989. с. 67–76.

45 Падрабязней гл.: Чарняўскі М. Культурна-гістарычны экскурс ў *вынікі* шматгадовых антрапалагічных даследаванняў // Беларускі этнаграфічны зборнік. Вып. 1. Мінск, 1997. с. 5–17.

46 Алексеева Т. И., Хрущ С.Л. Древнейшее население Восточной Европы. / Восточные славяне: антропология и этническая история. Москва, 2002. с. 254–255.

47 Zinkevicius Z. Lietuviu tautos kilme. Vilnius, 2005. P. 40–51.

48 Топоров В. Н. О характере древнейших балто-финно-угорских контактов по материалам гидронимии // Uralo-Indogermanica. Балто-славянские языки и проблема урало-индоевропейских связей. Материалы 3-й балто-славянской конференции, 18–22 июня 1990 г. Москва, 1990. с. 105.

49 Ваба Л. Языковые контакты прибалтийских финнов с балтами и географическая терминология // XVII Всесоюзная финно-угорская конференция. I: Языкознание: Тезисы докладов. Устинов, 1987. с. 51–52; Ваба Л. Сепаратные балтизмы в прибалтийско-финских языках // Uralo-Indogermanica. Балто-славянские языки и проблема урало-индоевропейских связей. Материалы 3-й балто-славянской конференции, 18–22 июня 1990 г. Москва, 1990. с. 141–142.

50 Ванагас А. Максимальный ареал балтской гидронимии и проблема происхождения балтов // Этнографические и лингвистические аспекты этнической истории балтов. Рига, 1980. с. 119–123.

51 Параўн.: Schmid W. P. Baltisch und Indogermanisch // Baltistica. T. XII (2). 1976; Сейбутис А. Индоевропейцы: палеоэкология и природные сюжеты мифов // Природа. 1987. № 8. с. 96–106; Haudry J. The Indo-Europeans. Washington, 1998. с. 99–113.

52 Булкин В. А. О формировании границ в области днепро-двинского междуречья // Археологическое исследование Новгородской земли. Ленинград, 1984; Герд А. С. К реконструкции днепро-двинской диалектной зоны // Псковские говоры в историческом и настоящем. Ленинград, 1988. с. 118–122; Булкин В. А., Герд А. С. К этноисторической географии Белоруссии // С. славяне: Этногенез и этническая история: Междисциплинарные исследования. Ленинград, 1989. с. 67–76.

[37] Булкіна В. І., Гардзіенка А. С., Куль К. К. Этнічная прыродная і геаграфічная будова Беларусі. – с. 68.

[38] Толстой Н. И. Опыт изучения этногенеза славян // Славяне и их соседи. – М., 1968. – с. 68.

[39] Грубаєв О. Н. Этногенез и культура древних славян. – М., 2003. – с. 258.

[40] Там самае. – с. 104.

капытка Вы, Гардзіенка, Куль, у этнічную, і геаграфічную будову Беларусі, с. 68.

етарыстой Н. І. Опыт изучения этногенеза славян // Славяне и их соседи. – М., 1968. – с. 68.

Грубаєв О. Н. Этногенез и культура древних славян. – М., 2003. – с. 258.

Там самае. – с. 104.

адмоўнай камплімэнтарнасці беларусаў і літоўцаў К. Рэзнікаву наўрад ці ўдасца. Куды лягчэй на гэтай падставе растлумачыць «адмоўную камплімэнтарнасць» аўтара гэтай ідэі Л. Гумілёва і нелюбімых ім ворагаў Русі літоўцаў. Не талеруе К. Рэзнікаў, праўда, толькі літоўцаў. Іншых балтаў (латышоў, ятвягаў) ён прыроднымі ворагамі не лічыць і нават дапускае іх абмежаваны ўдзел у этнагенезе беларусаў. Чым жа назаліла Літва ідэолагу еўразійскага мандыялізму Л. Гумілёву і яго паслядоўнікам? Ці тым, што так і не паддалася асіміляцыі? Ці тым, што гэтак упарта супраціўлялася хрысціянізацыі? Супраціўлялася мандыялісцкай маскоўскай дактрыне «Новага Ерусаліма»? Увесь час ваявала з «адмоўна-камплімэнтарнай» Масквой?

Распрацоўваецца, што праўда, яшчэ адзін – запасны – спосаб «вызвалення» ад «цяжару» балцкай фактуры – г. зв. «фінскае пытанне». Вытокі яго сягаюць яшчэ ў дарэвалюцыйную гістарыяграфію, а ў Беларусі яно адрадзілася менавіта дзякуючы спробам проціпаставіць балцкаму субстрату нібыта яшчэ ранейшы фінскі. Але довады на карысць яго дагэтуль застаюцца вельмі хісткімі. Лінгвістычны аналіз гідронімаў у Верхнім Падняпроўі ды вывучэнне іх пашырэння на гэтай тэрыторыі сведчыць, што асноўным этнічным кампанентам тут, бясспрэчна, «былі балты, пачынаючы з самай аддаленай даўніны, даступнай лінгвістычнаму кантролю»[26], а пра наяўнасць «пласта фіна-угорскай гідранімііў беларускай частцы заходнядзвінскага басейна па-ранейшаму можна гаварыць толькі ў тэарэтычным, гіпатэтычным плане. (…)

Пытанне аб фіна-угорскім элеменце ў беларускай тапаніміі ў практычным плане пакуль што ставіцца не можа»[27]. Спробы выявіць сляды фіна-ўгорскіх моваў у беларускай гідра- і тапаніміі, а таксама лексічным складзе беларускай мовы ў бальшыні выпадкаў робяцца неспецыялістамі ды выдаюць на вельмі павярхоўныя і дылетанцкія.

Фінскі «аргумент» паспрабавалі выкарыстаць і некаторыя антраполагі. І. Салівон, падкрэсліваючы значную ролю ў працэсе фармавання фізічнага тыпу беларусаў неалітычнага насельніцтва, нашчадкі якога складалі асноўны кантынгент на тэрыторыі Беларусі, адзначала ў яго рысы «паслабленай еўрапеоіднасці». З'яўленне гэтых рысаў даследніца звязвала з носьбітамі культуры ямкава-грабеньчатай керамікі, для якой мяркуецца фінская этнічная прыналежнасць.

Не схільны быў дапускаць прысутнасць якіх-колечы індаеўрапейцаў (перадусім балтаў) у абшары на поўнач ад Прыпяці і А. Трубачоў і ў II-м, і ў III-м тыс. да н. э., пагатоў у ранейшыя часы, адводзячы яго цалкам фіна-уграм. Тут, зрэшты, усё зразумела: толькі так Трубачоў мог аспрэчыць уплывовую «балцкацэнтрычную» тэорыю індаеўрапейскай прарадзімы В. Шміда ў кантэксце сваёй уласнай сярэднедунайскай тэорыі.

Праз дваццаць гадоў гледзішча І. Салівон крыху змянілася, і яна ўжо кажа пра адсутнасць падстаў для атаесамлення неалітычнага насельніцтва Беларусі як з фіна-угорскай, гэтак і з балцкай ды агулам якой-кольвек іншай сучаснай этналінгвістычнай супольнасцю, бо паводле яе словаў «у неаліце не магло існаваць такіх вялікіх агульнасцяў», а ў антрапалагічным сэнсе «карані беларусаў, верагодна, пачынаюцца з неаліту, бо з таго часу дамінуе старажытны генафонд, які паглынаў усіх прышэльцаў – балтаў, а потым і славянаў»[28].

Высновы сапраўды цікавыя, пагатоў яны яшчэ раз звяртаюць увагу на аўтахтонны модус этнагенезу беларусаў. З іншага боку, дапушчэнні, на якіх яны грунтуюцца, больш як спрэчныя. Уплыў культуры ямкава-грабеньчатай керамікі на Беларусі быў досыць абмежаваны[29], а яе этнічную атрыбуцыю з улікам усіх

матэрыялаў нельга прызнаць адназначнай. Рысы «паслабленай еўрапеоіднасці» пры дэтальнейшым аналізе аказваюцца архаічнымі прыкметамі найдаўнейшых паўночнаеўрапеоідных папуляцый і маюць незалежнае ад «усходняга» ўплыву паходжанне[30]. Знаходзіцца шэраг важкіх падстаў для атаесамлення неалітычнага насельніцтва з тэрыторыі Беларусі і з пэўнымі этналінгвістычнымі супольнасцямі. Больш за тое, згодна з меркаваннем аўтарытэтных археолагаў (Д. Крайноў, Р. Рымантэне, Д. Цялегін, М. Чарняўскі) носьбіты культур беларускага неаліту могуць уважацца за пратабалтаў. У звязку з гэтым у новым святле паўстае праблема балтызмаў у фіна-вугорскіх мовах (асабліва Паволжа і Прыўралля), звязаных з архаічнымі з'явамі побыту і веранняў[31]. Этымалагічны аналіз геаграфічнай тэрміналогіі прыбалтыйска-фінскіх моваў выяўляе досыць істотны балцкі (і стараеўрапейскі) пласт. У. Тапароў заўважаў[32], што 1) балтызмаў у фінскіх мовах «на некалькі парадкаў болей, чым фінізмаў у балцкіх», 2) «балтызмы ахопліваюць большую плошчу і большую колькасць моваў, чым фінізмы ў дачыненні да балцкіх моваў», 3) «вельмі значная частка балтызмаў... датычыць ужо II тыс. да н. э., а большасць фінізмаў у балцкіх мовах (амаль выключна ўва ўсходня-балцкіх) істотна больш позняй пары», і рабіў выснову, што «ўсё гэта было магчыма, хутчэй, у тым выпадку, калі аснова субстрату была балцкая, а фінскі элемент з'явіўся тут пазней, у якасці суперстрату», і што «прыняцце балцкага элементу ўва Усходняй Еўропе у якасці субстратнага найбольш натуральным чынам вытлумачае і балцкую гідранімію на захад ад Сярэдняй Волгі і балтызмы ў паволжска-фінскіх мовах». Да гэткіх жа высноў прыйшоў і эстонскі даследнік Л. Ваба[33].

Усё гэта разам узятае ў купе са звесткамі пра надзвычайную канцэнтрацыю гідронімаў стараеўрапейскага тыпу на балцкім абшары, у тым ліку на тэрыторыі сучаснай Беларусі[34], дазваляе падтрымаць балцкацэнтрычную мадэль індаеўрапейскай прамовы і ўказвае, прынамсі, на больш «паўночны» кірунак пошуку прарадзімы індаеўрапейцаў[35] пры ўсёй умоўнасці самога паняцця «прарадзімы».

У любым разе казаць пра існаванне «генетычнага бар'еру», пра «адмоўную кампліментарнасць», засноўваючыся на

прэпараванай належным чынам сацыябіялогіі і жанглюючы рэлевантнасцю фактаў, яўна не выпадае. А вось канстатаваная многімі даследнікамі кансерватыўнасць генафонду беларусаў вельмі моцна абмяжоўвае кола магчымых этнагенетычных мадэляў, амаль цалкам выключаючы з яго скрайнія міграцыянісцкія канцэпцыі. Казаць пра «масавыя», «магутныя» міграцыі славянаў на нашу этнічную тэрыторыю – значыць станавіцца на слізкі шлях скажэння гістарычнай праўды, а значыць свядома ці несвядома рабіць сваю навуку службіткай ідэалогіі (пануючай або з прэтэнзіямі на панаванне).

Зрэшты, абшар, на якім адбываўся этнагенез беларусаў, вылучаецца яшчэ адной яскравай кансерватыўнай рысай: устойлівасцю лінгва-культурных арэалаў. На яе звярнулі ўвагу В. Булкін і А. Герд[36]. У прыватнасці, А. Герд, спрабуючы прасачыць вытокі багата якіх назіраных цяпер спецыфічных з'яваў у «днепра-дзвінскай дыялектнай зоне», прыходзіць да вельмі цікавых высноў: 1) зона гэтая ўяўляе даволі цэльны гісторыка-культурны тып; 2) гэтая цэльнасць праглядаецца ў культурнай пераемнасці насельнікаў памянёных краёў, пачынаючы сама мала з III тыс. да н. э. Падобныя высновы былі зроблены гэтымі даследнікамі і ў дачыненні да іншых гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі. Нягледзячы на тое, што некаторыя з параўнанняў і довадаў патрабуюць верыфікацыі і дадатковага абгрунтавання, наогул такі падыход здаецца вартым увагі, бо «якім бы рэдкім не быў такі выпадак», «а менавіта прасторавае супадзенне пучкоў ізаглос і археалагічных і гісторыка-этнаграфічных межаў», «ён дазваляе адтуліць некаторыя перспектывы міждысцыплінарнай кааперацыі»[37]. Сваё сумеснае даследаванне В. Булкін і А. Герд завяршаюць словамі М. Талстога: «Падобныя супадзенні не могуць быць ігнараваныя і застаюцца навуковым фактам, які патрабуе свайго тлумачэння, а не скептычнага стаўлення»[38].

Зразумела, што ў такім разе аўтахтанісцкія канцэпцыі будуць мець адчувальную перавагу перад міграцыянісцкімі. Менавіта з увагі на гэта ў сваім часе намі быў прапанаваны метадалагічны прынцып «прэзумпцыі аўтахтоннасці», паводле якога з'ява павінна разглядацца як мясцовая з паходжання, пакуль адваротнае не будзе пераканаўча даведзена, і карэгуючага

прынцыпу «дэканструкцыі традыцыі». Апошняя бярэцца на ўзбраенне ўсякі раз, калі ўзнікае непераадольны разрыў паміж наяўным станам культуры і культурнымі чаканнямі або спадзевамі асобы. Яна заўсёды звернута да першавытокаў, першапачаткаў і мае інтэнцыю на ачышчэнне іх ад «смецця» гісторыі і ўзнаўленне іх пракаветнай чысціні. Рэканструяваныя першавытокі далей праектуюцца на будучыню ў якасці не проста магчымай, але жаданай і чаканай будучыні. З гэтых трох момантаў – 1) рэфлексіі наяўнага культурнага разрыву (або разрываў), 2) звароту да першавытокаў і 3) праекцыі першапачатковага стану на жаданую будучыню – і складаецца любая дэканструктывісцкая стратэгія як метадалагічна апраўданая пазіцыя пры працы з гістарычным матэрыялам. У гэтым і сэнс той дэканструкцыі беларускага этнагенезу, які рэзюмуецца формулай «беларусы – гэта славянамоўныя балты».

Але пры адзначанай кансерватыўнасці генетычнай памяці беларусаў мы ў праве чакаць не меншай кансерватыўнасці і што да культурнай памяці. А яна не апошні арбітр у пытаннях этнічнай мінуўшчыны. Як слушна зацямляе А. Трубачоў: «Можа быць, нейкія прыклады «міфа-паэтычнай» памяці і маюць адносна кароткую працягласць, але наўрад ці неабходна распаўсюджваць гэта на ўсе віды народнай памяці, бо такім чынам прымяншаецца феномен узнаўлення памяці, з якім трэба асабліва лічыцца, калі гаворка ідзе аб этнічнай памяці як кампаненце этнічнай самасвядомасці, у дадзеным выпадку – аб памяці супольнага этнічнага мінулага»[39], «Не варта недаацэньваць ні глыбіню памяці мовы і народнай традыцыі, ні – адпаведна – важнасці падзеі (у дадзеным выпадку – …зваявання чужой краіны, перасялення ў чужыя землі). Да нас дайшла памяць этнасу і мовы аб арыйскім падзеле на іранцаў і індаарыйцаў (не пазней II тыс. да н.э.). (…) Значныя падзеі (найбуйнейшыя войны, прыродныя катаклізмы) памятаюцца надзвычай доўга»[40]. Тым больш, пісаў Юры Лотман, што ў якасці эфектыўнага механізму калектыўнай памяці, асабліва ў так званых «вусных» культурах, выступае сама культура і наяўныя ў ёй семіятычныя механізмы, якія гарантуюць трыванне культуры ў часе – пераемнасць традыцыі.

Такая надзвычайная падзея, як масавае зняцце з абжытых

месцаў і перасяленне за сотні і тысячы кіламетраў у іншаэтнічнае асяроддзе, павінна была б мець вельмі паважную прычыну і не магла не пакінуць аніякіх слядоў у народнай памяці. Іх немагчыма выявіць у багатай фальклорнай спадчыне беларусаў па той простай прычыне, што іх няма. Гэта магло б насцярожваць, бо ў іншых адносінах беларуская вусная культура дэманструе зайздросны кансерватызм. Гэта не раз адзначалася даследнікамі. Так, В. Іванаў і У. Тапароў ці не адны з першых прыкмецілі адмысловае значэнне беларускага матэрыялу для індаеўрапеістыкі. Яшчэ пару дзесяцігоддзяў таму яны пісалі: «У працэсе працы над кнігай, прысвечанай аднаўленню старажытных славянскіх міфалагічных сістэм, аўтары даволі нечакана для сябе выявілі ў фальклорных матэрыялах і апісаннях звычаяў беларусаў... вельмі вялікую колькасць архаічных уяўленняў, якія могуць супастаўляцца з найбольш старажытнымі сведчаннямі аб рэштках паганства ў самых старых помніках іншых славянскіх традыцый.

Паасобныя рысы падобнага характару згадваліся і раней у розных працах, аднак той факт, што беларускія дадзеныя наогул з'яўляюцца вельмі старажытнымі і асабліва важнымі для рэканструкцыі, не толькі не падкрэсліваўся, але нават выпадаў з увагі даследнікаў. Між тым, адметная даўніна беларускага матэрыялу выяўляецца нават побач з іншымі архаічнымі матэрыяламі: параўн. паўночнавялікарускі і сербска-харвацкі»[41].

Пазней адзін з прыгаданых аўтараў цвердзіў: «Параўнанне ўсходнеславянскіх (беларускіх) звычаяў асвячэння (сакралізацыі) новага дому з ерархічным парадкам жывёлін у ведыйскіх рытуалах, з аднаго боку, а з другога, з ахвярапрынашэннямі рымлянаў, якія цалкам супадаюць таксама з аксіялагічнымі (каштоўнаснымі) адрозненнямі паміж тымі ж хатнімі жывёлінамі ў хецкіх законах, дазволіла зрабіць высновы, што ўсе гэтыя традыцыі зводзяцца да агульнаіндаеўрапейскай»[42]. Той жа даследнік зацяжныя звязаныя з канём дэталі архаічнага рымскага рытуалу *October* багата ў якіх момантах супадаюць з беларускімі Ярылы[43].

[41] Іванаў В. У., Тапароў У. М. Архаічны пласт у народных уяўленнях пра свет і чалавека // Беларускае і

[42] Іванаў В. У., Тапароў У. М. Архаічны пласт у народных уяўленнях пра свет і чалавека // Беларускае і

[43] Іванаў В. У., Тапароў У. М. Архаічны пласт у народных уяўленнях пра свет і чалавека // Беларускае і

У гэты шэраг зараз можна ўлучыць і такую адметную рысу беларускай валачобнай паэзіі, як даволі добра захаваны ўжо пра зніклага бога ўрадлівасці, найбліжэйшыя адпаведнікі, якому таксама вядомыя з хецкай традыцыі, каштоўнасць якой у тым, што яна першая знайшла пісьмовае адлюстраванне ў шматлікіх тэкстах. Ключавыя элементы беларускіх касмаганічных паданняў маюць простыя аналагі ў арфічнай, ведыйскай і рымскай касмагоніях, часам з супадзеннямі на тэкставым узроўні: характарыстыцы беларускага дэмурга-светаўладкавальніка «над багамі бог» адпавядаюць формульныя тытулы вед. *deva-deva*, ст. гр. θεός, *ἰων*. θεῶν «бог багоў» і г. д.

Этнографическое изучение этнаконых средств культуры Ленинград, 1989. с. 55–57.

[42] Иванов В. В. Ритуальное сожжение конского черепа и колеса в Полесье и его индоевропейские параллели // Славянский и балканский фольклор. Москва, 1989. с. 80; Иванов В. В. О последовательности животных в обрядовых фольклорных текстах // Проблемы славянской этнографии: К 100-летию со дня рождения члена-корреспондента АН СССР Д. К. Зеленина. Ленинград, 1979. с. 150–154.

[43] Тамсама. с. 83; Иванов В. В. Проблемы этносемиотики // Этнографическое изучение этнаконых средств культуры. Ленинград, 1989. с. 55–57.

Як і належыць ключавому міфу традыцыі, ён адсылае да «першых часоў», калі не толькі ўсё ў свеце, але і сам гэты свет адно зачыналіся. Напачатку апавядаецца, як з пачатковых водаў з удзелам Перуна ўтвараецца ўсё існае, у гэтым ліку і расліны, звяры і сам чалавек. Першым насельнікам нашай зямлі быў Бай (князь Бой, паводле іншай версіі міфа), які меў трох сыноў і двух любімых сабак – Стаўры і Гаўры. Па смерці бацькі два сыны спадкаемілі ўсю бацькаву маёмасць, а малодшаму – Белаполю, які тым часам апынуўся на паляванні з бацькавымі сабакамі, – засталіся сабакі і бацькаў наказ: пусціць Стаўры і Гаўры па волі, і колькі зямлі яны аббягуць за дзень, гэтулькі яму і дастанецца спадчыны. Белаполь, злавіўшы дзвюх птушак, пусціў адну на поўдзень, другую – на захад, а ўслед ім сваіх сабак. Куды пабеглі сабакі, пацеклі найбуйныя нашыя рэкі: Дзвіна – на захад, Дняпро – на поўдзень. З тых часоў між гэтых рэчак і пасяліўся Белаполь, ад якога і пайшлі ўсе пляменні беларусаў[44]. А Стаўры і Гаўры на загад старога князя народ і дагэтуль ушаноўвае адзін раз на год перад Сёмухай, і завецца гэты дзень Стаўроўскія дзяды. Адзначым, што на архаічны характар гэтага міфа, апроч іншага, паказвае свайго

славянское монастырство. Минск, 1972. с. 163.

[44] Беларусы заказалі ўлучыць этнаконых средств культуры. Ленинград, 1989. с. 55–57.

роду «білінгва» ў звароце да Стаўры і Гаўры, прамаўляная падчас памінальнай вячэры на Стаўроўскія дзяды: «Стаўры, Гаўры, гам, прыхадзіце к нам!». Тут «прыхадзіце» патлумачае папярэдняе «гам», якое, такім чынам, паходзіць з і.-е. **gʷa/e-(m)-* «хадзіць», прадстаўленага ў багата якіх індаеўрапейскіх мовах, у тым ліку і ў беларускім слове *гаць* з пачатковы значэннем «праход». Два сабакі князя Бая, як і сама ягоная постаць першанасельніка і першага смяротнага, ставяць яго ў адзін шэраг з такімі персанажамі, як ведыйскі Яма, авестыйскі Йіма, старагрэцкі Гадэс (Аід), што дае падставы і ў імені князя бачыць нагадку на яго блізнючнае паходжанне (параўн. бел. *абое*, *абоі*, *абая*, ст.-прус. *abbai*, гоц. *bai* «абодва», прычым форма «абоі» ўважаецца даследнікамі за і.-е. архаізм).

Нічога падобнага, што падтрымлівала б міграцыянісцкую легенды і мадэль, мы не знойдзем. Паданне «Палешукі і палешукі», хутчэй, адбівае працэс засваення Палесся з паўночнай лясной зоны. І калі ўжо шукаць тут прывязкі да колішніх гістарычных рэалій, то найперш да працэсу ўтварэння т. зв. «кіеўскай культуры», якая на сёння адзіная прэтэндуе на статус галоўнай крыніцы славянізацыі нашага краю ўжо ў першай палове I тыс. н. э., але на характары якой чамусьці заўважна адбіліся імпульсы з лясной поўначы (посуд з расчосамі, жытлы слупавой канструкцыі і інш.). Славянскі характар «кіеўскай культуры» вызначаецца адно рэтраспектыўна на падставе яе сувязяў з пазнейшай пянькоўскай культурай, якая ўважаецца за пэўна славянскую. Але падставы для славянскай атрыбуцыі «кіеўскай культуры» настолькі слабыя, што яе адносяць або да рэліктавай галіны гіпатэтычнай прота-славяна-балцкай супольнасці, або проста да кола балцкіх культур лясной зоны. Тут цяжка не пагадзіцца з М. Шчукіным у тым, што «паўночны накірунак сувязяў кіеўскай культуры проста яшчэ недастаткова вывучаны, ніхто пакуль не аруплівaўся мэтай зрабіць гэта мэтанакіравана. Больш надавалася ўвагі паўднёвым элементам на паўночных помніках»[45].

Ёсць у нашых паданнях адзіная згадка пра славянаў – у паданні пра паходжанне назвы вёскі Холмеч (Рэчыцкі р-н. Гомельскай вобл.)[46]. Яно пачынаецца словамі: «Ішлі сюдою паўз дарогу воіны – яшчэ як славяне ваявалі. Тады ж не было тэхнікі, салдат ішоў, бачыць: ляжыць стары меч. Ён падняў яго,

[44] Дзеяненка М. Легенды і паданні Мінскага краю. Мінск, 1983. С. 78–79.

[45] Шукин М. Балто-славяне // Этнокультурная карта Европы. СПб., 1999. С. 70.

[46] Беларускія народныя паданні / Запісы Янкі Купалы. Мінск, 1986. С. 191.

падышоў к Дняпру, узышоў на холм, паглядзеў кругом, падзівіўся да і заткнуў гэту штуку ў зямлю». Умоўная «храналагічная» прывязка «яшчэ як славяне ваявалі з татарамі» кшталту, як і ў іншых паданнях пра часы заваёўніцкіх войнаў на нашай зямлі, напрыклад: «раней, калі ішла вайна са шведамі» («Адкуль узяліся ў нас кнігаўкі»); «гавораць, кагда-та, сямсот лет вольш таму назад, кагда ваяваў з Польшчай швед» («Адкуль татары на Беларусі»); «гавораць, як швед ваяваў, дык лагчынаю кроў лілася» («Красная горка»). Прыгадайма выслоўе «за дзядамі-шведамі» – пра старадаўнія часы. Паданне пра вёску Холмеч цікавае тым, што ў ім адлюстравалася адна цікавая этнаграфічная дэталь – уваткнуты ў пагорак меч. Толькі характэрна яна была ў жалезным веку паўднёвым суседзям нашых продкаў – скіфам, якія ўтыркалі свае мячы-акінакі ў насыпаны пахавальны насып. Характар жыцця з ваяўнічымі суседзямі тады і сапраўды быў далёкі ад міру-спакою, пра што сведчаць яўныя сляды скіфскіх нападаў на гарадзішчах мілаградскай культуры. Не выключана тут і сувязь з германскай пахавальнай традыцыяй.

46 Легенды і паданні. Мінск, 1978. с. 320.

Што казаць пра народную памяць, калі нават пачынальнік рускай пісанай гісторыі Нестар не ведаў, як упісаць крывічоў у «яфетычную», міграцыянісцкую схему рассялення славянаў. У недатаванай частцы летапісу ён не згадвае крывічоў сярод тых славянаў, што, рассяліўшыся па абшарах Усходняй Еўропы, атрымалі назвы паводле месца свайго асялення. Не згадвае ён іх і сярод тых, што гавораць па-славянску: «Вось толькі хто гаворыць па-славянску на Русі: паляне, драўляне, наўгародцы, палачане, дрыгавічы, севяране, бужане, празваныя гэтак таму, што сядзелі па Бугу, а потым сталі называцца валынянамі». Але няма іх і ў пераліку народаў, якія даніну даюць Русі: «А вось іншыя народы, што даюць даніну Русі: чудзь, мера, весь, мурома, чэрамісы, мардва, перм, пячэра, ям, літва, зімігала, корсь, нарова, лівы, – гэтыя гавораць на сваіх мовах, яны – ад калена Яфета і жывуць у паўночных краінах». Даніну крывічам устанавіў Алег ужо ў 882 г.

Як слушна з гэтай нагоды зацямляе А. Смірноў: «Крыніцы не ўтрымліваюць простых паказанняў на тое, кім, перадусім, адчуваў сябе, скажам, крывіч – крывічом або славянінам?

Аднак Нестар у сваіх этнагеаграфічных уводзінах да «Аповесці мінулых часоў» адзначае, што саюзы плямёнаў «имяху... обычаи свои и закон отец своих и преданья, кождо свой нрав». Між тым менавіта ў норавах і звычаях і праяўляюцца адрозненні паміж «сваімі» і «чужымі» – у характары, ментальнасці – тыя адрозненні, на якіх, уласна, і базуецца этнічная самасвядомасць»[47]. Гэтую акалічнасць асабліва падкрэсліваў А. Трубачоў[48].

Звесткі летапісу сведчаць пра абарыгеннасць і неславянскасць[49], прынамсі, крывічоў – аднаго з найважнейшых складнікаў будучага беларускага этнасу.

Наколькі гэтыя сведчанні і генетычнай памяці, і культурнай памяці, і пісьмовых крыніц кантрастуюць з тымі буйнамаштабнымі карцінамі, якія накідваюць гісторыкі і археолагі (а то і лінгвісты[50]), у тым ліку і датычна праблемы этнагенезу беларусаў, з лёгкасцю перакідваючы агромністыя людзкія масы на многія сотні кіламетраў. Толькі канцы з канцамі ніяк не сыходзяцца. Бо вельмі цяжка давесці масавую міграцыю – хоць з захаду, хоць з поўдня, калі масавай і магутнай міграцыі проста не было.

А як жа тады з славянізацыяй балтаў? А гэтаксама, як і з германізацыяй прусаў. Былі мірныя і канфліктныя кантакты. Было падпарадкаванне ўладзе гандлёва-вайсковых карпарацый (князі і яго дружыны). Была выпрацоўка і адпаведнай *lingua franca* – мовы міжнацыянальных зносін. Было накладванне новай ідэалогіі – хрысціянства. Была паступовая асіміляцыя – найперш моўная і культурная – мясцовага насельніцтва. Тым і адрозніцца гаткая як і ў нас канцэптуйнасць генафонду (пераважна брытанскай з вельмі выразнымі варыяцыямі ахват у вёсках – пэе, дарэчы, ледзь не ўдвая большы, чым у англасаксаў) была высокая (Цэнтральная Англія. Тайнонім. Ужыс. пераважна вясковы)[51]. І тым, як і ў нас, мовы айстратнатыпнага насельніцтва захоўваюцца толькі на перыферыі: колішняя зарадзіўшая гэтыя працэсы. Падобным чынам ішло ў ранніх старатысных часы адбывалася ары-заванне Міттані і хетызацыя Хеці ў Малой Азіі, санскрытызацыя большай часткі паўднёвай Індыстана і г. д.

[47] Смирнов А. А. Этнический и расовый факторы в истории Новгородской земли // Золотой лев: Издание русской консервативной мысли. № 17–18. 2001.

[48] Трубачев О. Н. Этногенез и культура древнейших славян: Лингвистические исследования. Москва, 2003. С. 97–99, 229–231 і інш.

[49] Гл. больш дэталёва: Лебедев Г. С. Эпоха викингов в Северной Европе. Историко-археологические очерки. Ленинград, 1985. С. 189–199.

[50] Гл.: Трубачев О. Н. В поисках единства. Взгляд филолога на проблему истоков Руси. – Москва, 1997. (Асабліва раздзел III: «А кто там идет? Взгляд на этногенез белорусов», с. 78–122.)

[51] Capelli C., Redhead N., Abernethy J. K., Gratrix F., Wilson J. F., Moen T., Hervig T., Richards M., Stumpf M. P. H., Underhill P. A., Bradshaw P., Shlana A., Thomas M. G., Bradman N., Goldstein D. B. A Y Chromosome Census of the British Isles // Current Biology. Vol. 13. 2003. P. 979–984; Weale M. E., Weiss D. A., Jager R. F., Bradman N., Thomas M. G. Y Chromosome Evidence for Anglo-Saxon Mass Migration // Molecular Biology and Evolution. Vol. 19.

Дэталі працэсу моўна-культурнай асіміляцыі можна прасочваць у тых рэгіёнах, дзе ён не дасягнуў завяршэння, напрыклад, у выпадку з кітаізацыяй Японіі або адачваннем Нарвегіі. У абодвух выпадках усталёўваецца нейкая раўнавага паміж гарадской культурай і мовай заваёўнікаў і вясковай мовай мясцовага насельніцтва. Гэта таксама добрая лабараторыя для верыфікацыі этнагенетычных канцэпцый.

Толькі вывучаць працэсы асіміляцыі надзвычай цяжка, бо ўвагу трэба засяроджваць на дэталях: на тым, *як, пры якіх умовах, калі, у якім напрамку* працякалі асіміляцыйныя працэсы ў кожным канкрэтным выпадку. Вырашальнае слова тут за гістарычнай дэмаграфіяй, гістарычнай сацыялогіяй і да іх падобнымі дысцыплінамі, якія яшчэ толькі імкнуцца канстытуявацца ў якасці самастойных накірункаў даследаванняў.

Але і тут ужо робяцца вельмі цікавыя назіранні. А. Мядзведзеў, параўнаўшы сведчанні генетычнай пераемнасці насельніцтва Беларусі і пранікнення іншаэтнічных групаў, робіць выснову, што паколькі сляды перасяленцаў не захаваліся ў генафондзе, іх колькасць, напэўна, не перавышала 10 %. Фактычна, гэта азначае, што меркаваныя мігранты былі фізічна цалкам асіміляваныя, але яны істотным чынам спрычыніліся да карэннай змены моўнага ландшафту будучай тэрыторыі Беларусі. Асіміляцыя мясцовых (балцкіх) плямёнаў магла, такім чынам, адбывацца толькі ва ўмовах славянамоўнага гораду, які дамінаваў над вясковай акругай, а гэта, бясспрэчна, «прыводзіла і да захавання ва ўсіх сферах матэрыяльнай і духоўнай культуры рысаў папярэдняга насельніцтва»[52]. г. Сагановіч таксама сцвердзіў, што супольная для вялікай часткі Усходняй Еўропы гарадская культура ахоплівала ў той час зусім нязначную частку насельніцтва – 2–5 %, тады як абсалютную бальшыню жыхарства складаў кансерватыўны вясковы люд, сярод якога пераважалі аўтахтоны, а не славяне[53].

Апрача «адміністрацыйнага», важным чыннікам асіміляцыі быў, бясспрэчна, і рэлігійны, калі хрост балтаў у «рускую» (праваслаўную) веру ўрэшце прыводзіў да іх менталітэтнай

[52] Мядзведзеў, А. М. О

Дэт. 7. 2002. Р. 1008–1021.

моўнай рутэнізацыі[54]. Э. Зайкоўскі дапускае, што «прыход славянаў-перасяленцаў колькасна быў не такім ужо і вялікім, таму славянізацыя тубыльцаў адбывалася найперш праз іх далучэнне славянскім гарадам, княжацкай дружыне, а з канца X ст. – хрысціянскай царкве, паколькі хрысціянізацыя вяла да славянізацыі»[55]. Нясным, аднак, па-ранейшаму застаецца паходжанне нешматлікіх славянамоўных перасяленцаў. Ці шмат сярод іх было ўласна славянаў? Відаць па ўсім, найістотнейшую ролю ў пашырэнні славянскай мовы адыгралі метаэтнічныя вайскова-гандлярскія карпарацыі «русі», сярод якіх пераважалі выхадцы са Скандынавіі. З'яўленне «русі» гэтаксама карэлюецца з пашырэннем матэрыяльнай культуры гарадскога тыпу амаль па ўсім абшары Усходняй Еўропы.

Яшчэ адзін важны аспект праблемы паходжання народу – псіхалагічны, звязаны з усведамленнем індывідамі належнасці да пэўнай этнічнай супольнасці, наяўнасці супольных продкаў, адрычонасці ад прадстаўнікоў іншых этнасаў. Усё гэта складнікі феномену самасвядомасці.

Самасвядомасць – адна з найістотнейшых прыкмет этнічнай і нацыянальнай ідэнтычнасці. Калі ў этнічнай супольнасці самасвядомасць і ідэнтычнасць разумеецца ў тэрмінах агульнай лакальнай своеасаблівасці, гэтак што «нашым» можа быць і тое, што суседняй вёскі, то нацыянальная свядомасць набывае больш глабальны, ідэалагічны змест і мае маштабнае вымярэнне[56]. Гэта ўжо і шматлікія калізіі Беларусь могуць быць прыкладам адной з іх, калі этнас працягвае сваё існаванне на спрадвечнай тэрыторыі, але ў выніку розных прычын перастае ідэнтыфікаваць сябе са сваімі гістарычнымі продкамі, больш за тое, з прапродкамі. Нягледзячы на тое, што тэрыторыю і культуру сучаснай Беларусі ў розны час насялялі розныя этнічныя супольнасці, прычым не толькі на абывацельскім узроўні ды ў «афіцыйнай» гістарыяграфіі, але і ў галовах «нацыянальна свядомых». Вось адно з ведамі характэрных выказванняў, якое належыць З. Пазьняку: «Тысячу гадоў таму, калі балты і славяне (цяперашнія беларусы) суіснавалі побач, то нашыя продкі стварылі гарады і перадавую рэлігію (Хрысьціянства). Балты нічога гэтага ня мелі і не стварылі. Вынік – яны растварыліся дазваньня ў славянскім моры, не пакінуўшы

---

54 Загановіч І. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. Мінск, 2001. с. 21.

55 Марзалюк І. Ад этнасу да нацыі // Гістарычны альманах. 2002. Т. VII. с. 161.

56 Зайкоўскі З. Балты цэнтральнай і усходняй Беларусі у 1 тыс. н.э. // Гісторыя, культуралогія, мастацтвазнаўства: Матэрыялы IIIМіжнароднага кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый» (Мінск, 2–25 мая, 4–7 снежня 2000 г.) (Беларуска – Albaruthenica. Кн. 21). Мінск, 2001. с. 37.

57 Пазьняк З. Новае стагоддзе. Вільня, 2002. с. 76.

прыход славянізацыю (характеристика источников) // Труды VI Международного Конгресса славянской археологии (Новгород, 26–31 августа 1996 года). – Т. I. Проблемы славянской археологии. Москва, 1997. с. 208.

пасьля сябе нават успамінаў, акрамя, хіба што, гідронімаў ды назоваў тыпу «Дулебы», «Яцьвягі» ці «Дзяволтва»[57].

Паказальна, што беларусы часта беспасярэдне атаесамляюцца з малаколькасным прышлым элементам, якому прыпісваецца «прагрэсіўная» культуртрэгерская місія сярод паўдзікіх абарыгенаў, хоць паводле справядлівасці мусіла б быць рыхтык наадварот. «Нязручныя» балцкія продкі беларусаў ператвараюцца ў рэпрэсаваную «нямотную бальшыню», уяўленне пра якія не надта розніцца ад вобраза «цёмнага» беларуса ў этнаграфіі часоў Расійскай імперыі. Вытокі падобнага стаўлення, з аднаго боку, угрунтаваныя ў папулярныя з эпохі Асветніцтва каланіяльныя-міграцыйныя тэорыі, у якіх місіянеры хрысціянскай веры і паладыны новаеўрапейскай цывілізацыі заўсёды выступалі ў якасці носьбітаў вышэйшай культуры, а з другога боку, у «заходнярускай» гістарыяграфіі, з яе супрацьпастаўленнем «святой», «культурнай», славянскай Русі і «паганай», «дзікай», балцкай Літвы.

Падобная «этнагенетычная вайна» адбывалася ў Францыі цягам XVII–XIX ст., калі ішло змаганне паміж прыхільнікамі кельцкай (гальскай) і германскай (франкскай) ідэнтычнасці французаў. Паводле апошніх, перавага германскага элементу мела расавае вытлумачэнне: даўгагаловыя германцы-франкі запанавалі над кароткагаловымі кельтамі і сталі пачынальнікамі французскіх арыстакратычных родаў. Галаманы цвердзілі, што кельты мелі культурную перавагу, былі спадкаемцамі рымскага этасу і пераўзыходзілі ваяўнічых прыхадняў творчым патэнцыялам. Пазней высветлілася, што даўгагаловы элемент прысутнічаў у абедзвюх этнічных групах, гэтаксама як кожная з іх мела ўласную самабытную культурную традыцыю. Адбылося замірэнне, але, што, у прынцыпе, натуральна, перамагла аўтахтонная гальска-кельцкая лінія. Менавата таму сімвал Парыжа – гальскі певень, а кельцкія «героі» Астэрыкс і Абелікс – папулярныя персанажы масавай культуры – змагаюцца з Цэзарам, дзякуючы якому, між іншага, французская мова вядома сёння як раманская. У Беларусі сітуацыя кардынальна розніцца: «славянскія мігранты» маюць выключна станоўчы «імідж», а нават некаторыя спецыялісты мяркуюць, што

Міндаўг, Гедымін, Вітаўт ды іншыя літоўскія князі гутарылі не іначай як толькі па-беларуску!

Адсутнасць усвядомленай пераемнасці з найдаўнейшымі насельнікамі краю вынікае з абсалютызацыі моўнага крытэру як этнічнага ідэнтыфікатару і фармавання скажонай перспектывы самасвядомасці. Мова, бясспрэчна, можа быць асноўным этнічным паказнікам, аднак, як слушна зацямлялі В. Аляксееў і Ю. Брамлей, «моўная прыналежнасць і паходжанне народу – з'явы далёка не ідэнтычныя».

Прыклады з гісторыі, калі этнічная тоеснасць не супадае з моўнай тыпалогіяй – не адзінкавыя, гэтаксама як і выпадкі адраджэння ў іншамоўным асяроддзі культурных традыцыяў, якія, здавалася б, назаўсёды зніклі праз асіміляцыю іх носьбітаў. Згадайма шатландцаў, валійцаў, ірландцаў, брэтонцаў, якія не сталі германцамі або раманцамі, страціўшы траха не зусім свае кельцкія гаворкі, або тых жа французаў, якія паходзяць ад раманізаваных галаў і, нават атрымаўшы свой назоў ад нешматлікіх германскіх заваёўнікаў – франкаў, усё адно звяртаюцца перадусім да сваіх гальска-кельцкіх вытокаў. Раманскамоўныя румыны ганарацца сваім дакійска-фракійскім паходжанем. Харваты і славенцы ўважаюць сябе за нашчадкаў ілірыйцаў ды адчуваюць сябе больш звязанымі з неславянамі Цэнтральнай Еўропы, як з сербамі, македонцамі і балгарамі.

Бясспрэчна, навуковы тэрмін «балты» – досыць умоўны. Ён найперш дастасоўны да балтафонаў, г. зн. цяперашніх і гістарычных літоўцаў, латышоў, гістарычных ятвягаў, прусаў і г. д. У гэткай відалі формула «Беларусы – славяна-балты» сапраўды выглядае парадаксальна. Але не больш парадаксальна, чым дастасаванне навуковага тэрміна да англамоўнага насельніцтва Шатландыі і Ірландыі, франкамоўных арабаў Алжыра ў асобны раманскі этнас ніколі не вылучыць. Тэрмін «балты», як і ўсякае імя (у лагічным сэнсе), – гэта канвенцыйны, адвольны знак, Дэ Сасюра. Але не больш канвенцыйны за тэрміны «германцы», «кельты», «італійцы», «славяне» і г. д. Мы маглі б з гэтым поспехам назваць нашу мадэль аўтахтанісцкай

58 Гаворов В. Н. К бунтарскім языковым и культурным типам // А вось Бахтанское языкознание. Москва, 1973. С. 30.

59 Гаворов В. К

паўночнафракійскай, зважыўшы, натуральна, і на адрыстойныя старажытныя ізаглосныя стасункі балцкіх і дака-фракійскіх моваў[58], і на тое, што само слова *Thrakia* (Фракія) можа тлумачыцца ў звязку з літ. *trakas* ’прагаліна, паляна, падлесак, прасека’[59] (параўн. літ. Trakai і бел. Трацылава – чыгуначная станцыя блізу Талачына, Тракішкі ў Браслаўскім раёне, Тракелі, Тракенікі на Гарадзеншчыне, прозвішчы Трацэнка, Трацэўскі, дыял. «трачынне» ў значэнні «пілавінне» і дарнік.), а *Pannonia* – у звязку з прус. *pannean* ’балота’ і бел. *паньва* ’пелька, тваністае месца ў рацэ’, *Pelso* (Балатон) – у звязку з нашай *Пелясой*, а паводле адной з прапанаваных этымологій, таксама і з нашым *Палессем*...[60] А потым прыгадалі Трубачев О. нашых дрыгавічоў-балотнікаў (параўн. літ. *drėgnas*, нат. *drēgns* ’вільготны’) і балканскіх другувітаў... Маглі б. Толькі гэта істотна не паўплывае на галоўныя складнікі прапанаванай мадэлі.

А гэта:

1) паводле наяўных на сёння звестак розных навук спрадвечнымі насельнікамі, то бок аўтахтонамі нашага краю былі балцкамоўныя плямёны;

2) кансерватыўнасць антрапалагічна-генетычнага аблічча беларусаў не дазваляе прыняць тэорыю пра масавую славянскую міграцыю на тэрыторыю будучай Беларусі;

3) славянізацыя мясцовага балцкага насельніцтва мела збольшага моўны (часткова культурны) характар;

4) асаблівасці працэсу фармавання беларускай этнічнай супольнасці адпавядаюць этнагенетычнай сітуацыі, калі меркаваныя перасяленцы складалі меншыню, якая праз адміністрацыйна-рэлігійны чыннік выклікала змены ў моўна-культурным ландшафце мясцовага насельніцтва;

5) балцкая іста беларусаў знаходзіць пацверджанне не толькі ў спецыфічных антрапалагічных, этнаграфічных, лінгвістычных рысах, але, апроч іншага, яна таксама магла б патлумачыць факт працяглага гістарычнага суіснавання продкаў беларусаў і літоўцаў у межах адной дзяржавы – Вялікага Княства

[58] Rimša V. Trakų baltų leksikos bendrybės (pagal dabartinių Balkanų kalbų medziaga) // Leksikos ir sintaksės klausimai. Siauliai, 1974. L. 72&ndash,73.

[59] Катонова Е. М. Балто-славянские контакты и проблемы этимологии гидронимов // Проблемы этногенеза и этнической истории балтов. Вильнюс, 1985. с. 211–218.

[60] Трубачев О. Н. Этногенез и культура древнейших славян: Лингвистические исследования. – Москва, 2003.

Літоўскага, як і арганічны характар яе ўтварэння.

Падаецца, што дыскусія ў любым разе вартая працягу, бо аргументы і факты далёка яшчэ не вычарпаныя. І лепей, калі сапраўды ініцыятыва ў развязанні праблем этнагенезу беларусаў будзе зыходзіць ад беларускіх даследнікаў.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 5 (39) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/12
[image]

[image]

A R C H E П а ч а т а к № 5 (39) - 2005

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image]2005

да Зміцера

паэзія • аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Віктар Жыбуль Футурыст Пятрусь Броўка

ВІКТАР ЖЫБУЛЬ паэт, літаратурны крытык. Аўтар паэтычных кніг «Рогі гор» (1997), «Прыкры крык» (2001), «Дыяфрагма» (2003). Летась у «ARCHE» было апублікаванае ягонае эсэ «Два галоўныя скандалісты 20-х».

Пра пачатак свайго творчага шляху народны паэт Беларусі Пятрусь Броўка неаднойчы пісаў у аўтабіяграфічных нататках:

Першы надрукаваны верш «Ой, не шапчы, мая бярозка» напісаў у Полацку. А было так: я быў адкліканы на працу у Полацкі акруговы ЛКСМБ з пасады старшыні сельсавету. Давялося жыць у горадзе, але я ня мог хутка разьвітацца зь вёскай... Памятаю, часта хадзіў за горад і падоўгу глядзеў у свой бок, адкуль я прыехаў. Вось пад такім уражаньнем я напісаў верш «Ой, не шапчы, мая бярозка» і паслаў у рэдакцыю «Чырвонай Полаччыны». Калі яго надрукавалі, быў вельмі ўзрадаваны, і ўжо нішто не магло спыніць майго паэтычнага захапленьня. Многа чытаў, шмат пісаў, пачаў вучыцца на вячэрніх агульнаадукацыйных курсах.

Не хаваў П. Броўка і сваіх тагачасных літаратурных прыхільнасьцяў, якія, вядома ж, спрыялі станаўленьню яго ўласнай творчай індывідуальнасьці:

Люблю паэзію Пушкіна, Някрасава, Лермантава, Шаўчэнкі.

Сваёй злабадзённасьцю прыцягвае мяне і паэзія Дзям'яна Беднага. Папераменна захапляўся то Ясеніным, то Маякоўскім, знаходзячы ў кожнага геніяльнае… Шмат даў мне і «Маладняк». Мы ўсе ў ім расьлі. Шукалі. Шукаў і я.

Гэтыя пошукі аднойчы прывялі паэта ў «Беларускую літаратурна-мастацкую камуну» – суполку левага кірунку, што вылучалася скандальнымі паводзінамі й творчай ваяўнічасьцю. Вось толькі сам Броўка не любіў апавядаць пра такі «кампраматны» факт сваёй біяграфіі. Дый складальнікі яго дзевяцітомнага Збору твораў не палічылі патрэбным згадаць у «Летапісе жыцьця і творчасьці» пра Броўкаў удзел у «Камуне», напэўна, непакоячыся, што гэта можа неяк сапсаваць аўтарытэт Народнага паэта Беларусі, героя сацыялістычнай працы, ганаровага грамадзяніна гораду Менску… Але ў далёкую пару юнацтва будучы клясык савецкай эпохі яшчэ наўрад ці ўяўляў, што чакае яго наперадзе.

Зрэшты, пачнём па парадку.

Зарэкамэндаваўшы сябе як пэрспэктыўны малады паэт, П. Броўка быў залічаны ў Полацкую філію «Маладняка». Вось анкета для ўліку сяброў філіі, запоўненая П. Броўкам на пачатку 1927 году[1]:

1. Прозьвішча, імя і імя па бацьку	Броўка Пятрусь Юстынаў.
2. Партыйнасьць і стаж	Сябра Л.К.С.М.Б. з 1923 году.
3. Праца ў грамадзкіх арганізацыях	Сябра МОПР-у, Авіяхіму.
4. Узрост	21 год. Нар. 1905 году.
5. Якую займае пасаду	Супрацоўнік Рэдакцыі газэты.
6. Праца ў літ. арганізацыях	Маладняк.
7. Від творчасьці	Вершы.

8. Ці друкаваўся Друкаваўся.

Подпіс <П. Броўка>

Улетку таго самага 1927 году Пятрусь Броўка зь нейкіх прычынаў пакінуў «Маладняк». Што яго прымусіла зрабіць гэта – гісторыя літаратуры пакуль замоўчвае. Магчыма, Петруся падахвоціў таварыш па Полацкай філіі Паўлюк Шукайла, які ўжо тады задумаў стварыць «Беларускую літаратурна-мастацкую камуну» – арганізацыю, якая б стала супрацьвагой ня толькі традыцыйна-клясычнай літаратурнай традыцыі, часткова працягнутай «Узвышшам», але нават «Маладняку». Гэта была адзіная ў Беларусі суполка, удзельнікі якой сьвядома абвесьцілі сябе футурыстамі. І трэба думаць, П. Броўка ахвотна ўспрыняў шукайлаўскія ідэі – пагатоў, Барыс Мікуліч нават згадваў Броўку як аднаго з «завадатараў» «Камуны»[2]. Пра актыўны ўдзел паэта ў гэтай арганізацыі сьведчыць шэраг публікацыяў у літкамунаўскім часопісе «Росквіт»: у першым нумары зьмешчаны верш «Чую звон...», у другім – «Не выгінай свае далоні», «Дайце новую музыку» і «Даўнейшае».

У вершы «Дайце новую музыку» паэт заклікае:

[1] БДАМЛіМ. Ф. 225. Воп. 1. Спр. 13. Арк. 24.

[2] Мікуліч Б. Аповесць для сябе. - Мінск: Маст. літ., 1993. С. 16.

Дайце
новыя струны!
Я хачу:
новы марш –

новую музыку!

і мэлёдыі дзіўныя дайце!

каб замест паніхіды хаўтурнай

Беларусі іграць.

Аднак лірычны герой першых савецкіх дзесяцігодзьдзяў ніколі не абмяжоўваўся абнаўленьнем толькі «музыкі» (гэта значыць папярэдняй эстэтычнай традыцыі) – ён жадаў абнавіць увесь лад жыцьця. Гэтак і ў П. Броўкі:

Я хачу:
і на вёску

на трактар ускласьці

завезьці горад.

Падобным патасам маладосьці й бадзёрасьці напоўнены таксама верш «Чую звон...», які паэт прысьвяціў рэвалюцыі («Гэты звон / Кастрычнікам зваўся, / што прагнаў / фабрыкантаў, / паноў»). Эпізод барацьбы з «панамі-палякамі», дзе герой Янка «скарыстаў на сабе» апошні патрон, апісаны ў вершы «Даўнейшае». Але трапіў у «Росквіт» і адзін верш, напісаны ў рэчышчы інтымнай лірыкі – «Не выгінай свае далоні». Герой спрабуе супакоіць дзяўчыну, пакінутую каханым. Вядома ж, да каханьня «літкамунаўцы» ставіліся больш легкадумна, чым да камуністычна-ўтапічных ідэалаў:

Ну што з таго,
калі другую
Любоў, няйначай,
цьвіце,
і зноў

калі ён здрадзіў,

ўжо кахае...

звонкі садзік –

красуе, ападае

нанова расквітае.

Як і ў многіх іншых сяброў суполкі, гэтыя творы маюць мала супольнага з футурызмам – у «Літаратурнай камуне» тэорыя часта разыходзілася з практыкай, бо разумелася самімі паэтамі даволі павярхоўна. Многія зь іх лічылі, што супрацьпаставіўшы «новы марш» старой «паніхідзе хаўтурнай», яны ўжо могуць называць сябе футурыстамі, хаця нават да гэтага імкнуліся далёка ня ўсе літкамунаўцы. Ідэйна-эстэтычныя разыходжаньні і зьявіліся галоўнай прычынай нядоўгага існаваньня «Камуны». Рознагалосьсі ў арганізацыі адбыліся ўжо ў час складаньня першага нумару часопісу «Росквіт», пра што згадвае пісьменьнік Ян Скрыган (у часы «Камуны» – паэт Янка Відук):

Сяк-так склалі нумар. Як у людзей, паявілася ў ім дэкляpацыя, напісаў яе Паўлюк Шукайла, і мы яе ўбачылі толькі тады, калі трэба было падпісваць нумар часопісу ў сьвет. Гэта было ў друкарні, мы стаялі між друкарскіх машын – Броўка, Шалай і я, – чыталі яе, і нашы сэрцы сьціскаліся болем. Такая дэкляpацыя была проці нашых пераканаьняў, яна як бы адбірала ў нас права на тое, што мы любілі, чым жылі: на Купалу, на Коласа, на тую манеру, якой мы дагэтуль умелі пісаць. Нам вельмі не хацелася, каб такая дэкляpацыя рабіла нас адшчапенцамі. Абараняў яе толькі Шукайла, і калі зь ціхага, спакойнага наш пратэст пачаў пераходзіць на раздражненьне, калі выявілася наша аднадушная трывога ў выпадку яе паяўленьня ў сьвеце, і каб палажыць канец спрэчкам, я зь нецярпліваю асалодаю вырваў гэтую старонку, набраную адразу за тытулам сечанымі радкамі, як верш.

А 29 сакавіка 1928 году, пасьля здачы ў друк другога нумару «Росквіту», адбыўся першы і адзіны зьезд «Камуны», які чымсьці нагадваў тэатар абсурду. Аб тым, як ён праходзіў, успамінаў у мюзенскай «Бацькаўчыне» Рыгор Казак:

Прафэсар Пятуховіч выступіў з дакладам аб творчасьці Цішкі Гартнага. Пасьля дакладу на парадку дня стаялі арганізацыйныя

пытаньні. І тут, як гаворыцца, началася бура пасьля зацішша. Бальшыня сяброў «Літаратурна-мастацкай камуны» выступіла супраць ідэалягічных установак «Росквіту». Але гэта была толькі прычэпка. Ужо загадзя рыхтаваўся развал «Літаратурнай камуны». Ёйны сябра Алесь Гародня ўзяў на сябе галоўную ролю ў змове. На зьезьдзе прысутнічалі і сябры «Маладняку». «Маладняк» у той час быў напаўразвалены: галоўныя літаратурныя сілы зь яго выйшлі разам з кіраўніком арганізацыі Міхасём Чаротам. Рэшта была зацікаўленая ў тым, каб захаваць «Маладняк» і аднавіць былых сяброў. Зразумела, што развал іншых літаратурных згуртаваньняў і прыцягненьне адтуль у свой бок пісьменьнікаў адпавядаў іхным імкненьням. Алесь Гародня запэўніў сваіх калегаў, што мэтазгодна пакінуць Шукайлу аднаго і перайсьці ізноў у «Маладняк», як гэта зрабілі некаторыя сябры «Пробліску». Нехта сеў у залі за раяль і зайграў хаўтурны марш.

Барыс Мікуліч прыгадвае, што Пятрусь Броўка паводзіў сябе на гэтым зьезьдзе эпатажна – «залез на стол і патрабаваў распусьціць «Камуну»[3].

Улетку 1928 году «Хроніка» часопісу «Маладняк» засьведчыла: «На паседжаньні ЦБ ад 29 мая разглядалася заява Я. Віцеса, П. Броўкі, Шалая і Атавы – былых сяброў зьліквідаванай Ліс. Маст. Камуны, з просьбай аб залічэньні іх у «Маладняк»[4]. Такім чынам, разам з таварышамі П. Броўка вярнуўся ў «Маладняк», які неўзабаве быў рэарганізаваны ў Белмаладняк. Але пра П. Шукайлу не забываўся. У 1929 годзе ў часопісе «Маладняк» П. Броўка апублікаваў «выкрывальніцкую» паэму «Рапарт» (у Зборы твораў яе няма), скіраваную супраць паэтаў, якія пішуць выключна дзеля ганарару, а заадно і супраць літаратурнай багемы і «шкодных элемэнтаў», да якіх тады любілі прылічваць Уладзімера Дубоўку і Язэпа Пушчу. Ёсьць у паэме і пэрсанаж Саваль Грымайла, які ўвасабляе камічны вобраз заўзятага барацьбіта з гэтай самай багемай – ягоны прататып Шукайла спадзяваўся, што імідж заўзятага барацьбіта з упадніцтвам дапаможа яму зрабіць кар’еру. Маналёг Саваля Грымайлы пад назваю «Стогнуць жабы» напісаны «лесьвічкаю» і, акрамя таго, утрымлівае яскравыя алюзіі на Шукайлавы

[3] Мікуліч Б. Я. Віцеса, П. Ліс. С. 16.

[4] Хроніка // МАПП. Але 1928. № 6. С. 127.

вершы «На Беларусі», «Ветру» і «Эй, націсьнем!..»:

На Беларусі
Хто нож
А я

вада з крыві...

ёй у грудзі

ня ўбіў.

прымушаны

для вёскі

жабаю

квакаць,

пагаджацца

з рудым

сабакам.

Я –

за рубля

не адзін

зраблю

шаг!

Хто мне шлях

прыпыніць,

перарэжа?

Натачыўшы

«сталёвага нажа»,

мільён

галоў

адрэжу.

Я – за левае,

лявей,

лявей!

Адчынеце

ўсе

вэнтылятары!

Бяры ў свой час

сьмялей!

сьмялей!

Пакой устаўляй

дыванамі,

люстрамі,

шафамі!

Я –

за росквіт

жыцьця!

Цымбалы,

цымбалы,

пазванчэй!

П’ю «каўкаскае» я,

каб было

весялей,

весялей!

5

Гэтак П. Броўка высьмеяў кар’ерызм Шукайлы, а заадно ўзняў асаблівасьці ягонай паэзіі, у тым ліку «лесьвічку». Нападзем, што П. Шукайла пачаў прапагандаваць творчыя прынцыпы ЛЕФу ў сярэдзіне 1920-х гадоў, калі беларуская літаратурная грамадзкасьць да ўсяго «левага» ставілася яшчэ давольна насьцярожана, а паэты аддавалі перавагу эстэтыцы Пралеткульту і часткова імажыністаў. Але пасьля сьмерці В. Маякоўскага ў 1930 годзе ягоныя творчыя прынцыпы пачалі выдавацца за ўзор «сапраўднай» паэзіі, ператварыліся ў свайго кшталту літаратурны мэйнстрым, ад якога нікуды не падзеўся і П. Броўка.

Іроніяй лёсу большасьць вершаў зь яго першых зборнікаў «Гады, як шторм» (1930), «Цэхавыя будні» (1931) і «Паэзія» (1932) напісаныя якраз «лесьвічкаю» і ўяўляюць зь сябе тыповую вершаваную публіцыстыку з характэрнымі заклікамі:

Досыць нам работы
трэба сьвет
Слухайце,
станьце

самапасам,

нанова пераліць!

5 Броўка П. Рапарт. Паэзія фактаў // Маладняк. 1929. № 9. С. 37-38.

таварышы з калгасаў,

камандзірамі зямлі!

Гэтыя і іншыя Броўкавы радкі атрымаліся вельмі сугучнымі з шукайлаўскімі («Мы падначалілі / сонца / і неба / І залічылі іх / у калгас»; «Сусьветны зробім рэўком!»[6] і інш.). Толькі сам Шукайла тады ўжо амаль перастаў выступаць у друку з паэзіяй, апублікаваўшы адно верш «Стогне, рыдае зямля» і «Паэму бальшавіцкай вясны». Броўка ж наадварот адчуў небывалы творчы ўздым, стаў адным з найбольш актыўных камсамольскіх паэтаў, апяваў савецкі лад жыцьця, пісаў творы па гарачых сьлядох тагачасных падзеяў. Напрыклад, зборнік «Цэхавыя будні» стаў своеасаблівым паэтычным рэпартажам з заводаў і фабрык, куды П. Броўка езьдзіў разам з брыгадаю іншых пісьменьнікаў. Вядома ж, творы атрымліваліся лёзунгава-патэтычныя, перапоўненыя дэклярацыйнасьцю й рыторыкай. Часам, праўда, апісаньні «вытворчага працэсу» разбаўляліся больш-менш удалымі вобразамі:

А за гоні ад нас
дзе вусы распусьціла
забаўляла гармонікам
каля новых баракаў апошняя зьмена.

праз кусты і лагчыны,

крывая антэна,

свой адпачынак

[6] Шукайла П. Акрываўленая зямля. - Менск БДВ, 1930. С. 57.

Да гэтага пэрыяду творчасьці сам паэт ставіўся неадназначна, хоць і вынес зь яго для сябе пэўную карысьць:

У гады першай пяцігодкі мы пісалі пра ўсё. Хадзілі на заводы, чыталі, бічавалі прагульшчыкаў, гультаёў, рвачоў. Часта

выходзіла рытарычна. Што ж, многае стала аднадзёнкай, але ніколі не шкадаваў працы, аддадзенай лёзунгам і агіткам. Працуючы над імі, даводзілася быць у віры жыцця і многае спазнаваць.

Лёс амаль усіх удзельнікаў «Літаратурнай камуны» склаўся трагічна. Першым у 1929 годзе ў выніку тэрарыстычнага акту загінуў фэльетаніст Уладзімер Варава. Сталінскі рэжым прысудзіў да расстрэлу Юрку Лявоннага, Язэпа Сукалу, Макара Шалая, Паўлюка Шукайлу. У высылцы апынуліся Алесь Гародня, Барыс Мікуліч, Ян Скрыган (толькі апошні зь іх здолеў вярнуцца жывым), зьехаў у эміграцыю Рыгор Казак. Мабыць, адчуўшы набліжэньне рэпрэсіяў, адышоў ад літаратурнай дзейнасьці Апанас Атава, так і ня выдаўшы аніводнага зборніка. На пачатку Другой сусьветнай вайны абарвалося жыццё Ўладыся Прыбыткоўскага. І толькі Пятрусь Броўка працягваў быць «у віры жыцьця», заняўшы трывалае месца на літаратурным Парнасе савецкай Беларусі, а заадно і некалькі важных пасадаў – старшыні праўленьня Саюзу пісьменьнікаў, галоўнага рэдактара Беларускай Савецкай Энцыкляпэдыі, дэпутата Вярхоўнага Савету. Ён выдаў каля 30 кніг паэзіі, паспрабаваў сябе і ў многіх іншых жанрах, атрымаў дзьве Сталінскія, Ленінскую, Коласаўскую і Купалаўскую прэміі, стаў Народным паэтам, Заслужаным дзеячам навукі БССР. І пра бурлівае «літкамунаўскае» юнацтва згадваў рэдка. Дый у сучасных беларусаў імя П. Броўкі асацыюецца не з «авангардам», а найперш з хрэстаматыйным лірычным вершам «Пахне чабор», зь песьняроўскай «Александрынай» ці з трагічна-шчымлівай паэмай «Голас сэрца»...
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 5 (39) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/12
[image]

[image]

A R C H E

П а ч а т а к

№ 5 (39) - 2005

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

5 [image] [image]2005

"да Зміласту"

[image]

Сяржук Няхамес
Мой шлях да Беларусі

СЯРЖУК НЯХАМЕС нарадзіўся ў Менску ў 1964 годзе. За адукацыяй – інжынэр-энэргетык. Рэдагаваў газэту «Беларуская трыбуна» (1988–1991), уваходзіў у рэдкалегію часопісу «Унія», узначальваў праект «Рэлігія і грамадзтва» НІСЭПД (1992–1994). З 1994 году на эміграцыі.

Гартаючы час ад часу старонкі беларускіх выданьняў, міжволі згадваеш словы аднаго з старажытных кітайскіх філезафаў: «Калі не зьяўляюцца ўспаміны ўдзельнікаў, то іншыя твораць легенды…» Менавіта новай легендай робіцца сапраўдная гісторыя беларускага адраджэньня сярэдзіны 1980-х – пачатку 1990-х гадоў у падачы некаторых маладых журналістаў.

Мае ўспаміны ня ёсьць спробай праславіць сваё імя альбо даць гістарычную ацэнку пэўным падзеям. Няхай нашыя нашчадкі самі ставяць нам адзнакі ды разьбіраюць нашыя посьпехі і паразы. Я проста паспрабую апавесьці аб уласным шляху да Беларусі.

Для мяне гістарычна-палітычнае выхаваньне пачалося яшчэ ў 1980 годзе, калі ў нашу 75-ю менскую школу прыйшоў новы настаўнік гісторыі Міхаіл Казімеравіч Пліска. Так, нашым настаўнікам у 9–10 клясах быў адзін з будучых стваральнікаў АДПБ. Акурат ён стварыў у школе гістарычна-палітычны гурток, які адразу вызначыўся досыць высокім навуковым узроўнем і палітычнай сьмеласьцю. Мы нават перамагалі на раённым і гарадзкім конкурсах паліглётаў. Але конкурсы былі не галоўным, на паседжаньнях мы разьбіралі творы Караткевіча, упершыню дазналіся пра ролю ВКЛ у гісторыі

Беларусі і Эўропы… Для некаторых з нас, асабліва пасьля заканчэньня школы, гурток пасьпяхова перайшоў у хатнія вечарыны, што ладзіў Міхаіл Казімеравіч у сябе на маленькай кухні.

Да «перабудовы» большасьць з нас прыйшла перакананымі антыкамуністамі і беларускімі патрыётамі. Іншых поглядаў у радыкальна настроеных і гістарычна падкаваных людзей, што прайшлі жорсткую школу савецкага войска, проста не магло быць. Ужо ў 1985 годзе ўтвараецца «Краязнаўчы вэляклюб», і я раблюся ягоным старшынём. Пачынаюцца краязнаўчыя вандроўкі па Беларусі і ня толькі. Але, як ні дзіўна, на той час асабіста я зь вялікім недаверам ставіўся да існых беларускіх суполак. Яны мне падаваліся нейкімі штучнымі, што жывуць у сваім сьвеце, які, на маю думку, быў вельмі далёкі ад мяне і маіх сяброў. Тут спрацоўваў тыповы канфлікт «фізыкаў і лірыкаў». Усе мы, першапачатковы склад вэляклюбу, паходзілі зь сем'яў гарадзкой тэхнічнай і вайсковай інтэлігенцыі 2–3 пакаленьня, працавалі на заводах, і «творчае кола» было нам досыць чужым асяродзьдзем. Падазраю, што і беларускія гуманітары ставіліся да нас зь недаверам… Але й да гурткоў касмапалітаў тыпу «Профілю» вялікай любові мы не адчувалі.

Пералом настаў у сакавіку 1988 году, калі я і Толя Бухвалаў наважыліся зрабіць роварную вандроўку, прысьвечаную 25 сакавіка. Мы нават павесілі абвестку ў Менскім турклюбе: «Запрашаем у вандроўку па Беларусі на беларускае сьвята». На гэтую абвестку адгукнулася некалькі чалавек, у тым ліку Алесь Жынкін, зь якім, як высьветлілася, мы жылі ў суседніх дамох.

Менавіта Алесь Жынкін і ягоная будучая жонка Сьвятлана далучылі нас да беларускага руху і ператварылі «Краязнаўчы вэляклюб» у «Краязнаўчы вэляклюб «ПАГОНЯ». Кожныя выходныя і сьвяточныя дні мы ладзілі краязнаўчыя вандроўкі па Беларусі. Да нас далучаліся дзяўчаты і хлопцы зь менскай «Талакі», а мы далучаліся да іхных паседжаньняў, талокаў, акцыяў пратэсту супраць разбурэньня гістарычнай спадчыны Менску. Паступова мы інтэграваліся ў беларускае культурнае асяродзьдзе, але заставалася прага палітычнае барацьбы. Мне, як і некаторым маім сябрам, здавалася, што беларускія суполкі

занадта паглыбленыя ў этнаграфічна-культурнае жыццё; што «гуканьнем вясны» і «купальлем» волі не здабудзеш; што мы губляем час, і трэба дзейнічаць.

На адных з чарговых вячорак на кухні Міхаіл Казімеравіч, які на той час быў яшчэ ў дэмплятформе КПСС, запрапанаваў мне прыйсьці на «Сучасьнік». Апошні быў рэпрэзэнтаваны як востры палітычна-дыскусійны клюб.

На той час (пачатак лета 1988 году), у адрозьненьне ад «сьвядомых» беларускіх суполак, «Сучасьнік» уяўляў сабой прыклад вядомай байкі Крылова «Лебедзь, рак і шчупак». Дэмакратычныя камуністы і жыды-адмоўнікі; трацкісты і прагрэсіўныя сацыялісты; славянафілы і інтэрнацыяналісты – усе спрачаліся, і ніхто нікога ня слухаў. Што аб'ядноўвала гэтых людзей? На маю думку, найперш антыпатыя да беларушчыны. Памятаю, як, пачуўшы беларускую мову, Леў Крывіцкі сказаў мне: «Говорите нормальным языком, молодой человек. Тут вам не сходка националистов». На мой бок стала толькі некалькі чалавек, у тым ліку спадар Пліска. Наагул, менавіта нацыянальная ідэя ў далейшым назаўсёды падзяліла былых сучасьнікаўцаў, але пра гэта крыху пазьней.

Калі разглядаць склад «Сучасьніка», то ён складаўся з дэклясаванай дэмакратычнай інтэлігенцыі. Яны жадалі рэформаў і баяліся іх; жылі ў Беларусі і не вызнавалі яе права на дзяржаўнасьць. Недарэмна напрыканцы 1989-га і пачатку 1990 гадоў гасьцямі клюбу былі шматлікія прадстаўнікі інтэрфрантоў Прыбалтыкі і Ўкраіны. А сам клюб знаходзіўся за паўкроку ад утварэньня арганізацыйнага камітэту «Інтэрфронту» БССР. Ад перараджэньня яго выратаваў толькі путч і развал СССР.

Ці быў «Сучасьнік» цэнтрам палітычнага і культурнага жыцьця Менску ў 1988 годзе? Натуральна, не. Культуратворчыя працэсы адбываліся ў беларускім нацыянальным асяродзьдзі, на паседжаньні «Талакі» ды іншых беларускіх суполак. Колькасьць людзей на шараговых талакоўскіх паседжаньнях была значна большая, чым на сустрэчах клюбу «Сучасьнік». Менавіта талакоўцы ладзілі сапраўдныя справы. Але…

Было адно «але». Да часу «Талака» заставалася па-за палітыкай, рэпрэзэнтуючы сябе як выключна нацыянальна-культурную суполку. А прага змаганьня рвалася на волю. У адной з вандровак да нас далучыўся сябра маладэчанскай «Беларускай хаткі» Ўладак Сьвянціцкі і прапанаваў стварыць арганізацыю (зьвяз) беларускага палітычнага змаганьня. Да таго часу ідэя стварэньня радыкальнай палітычнай арганізацыі ўжо, як кажуць, «насілася ў паветры». Пачалося зьбіраньне аднадумцаў, але ўтварэньне «Менскай альтэрнатывы» на паседжаньні «Сучасьніка» сталася выпадковасьцю.

На адным з паседжаньняў клюбу ў кінатэатры «Вільнюс» я вельмі рэзка выступіў у абарону незалежнасьці Беларусі, дзяржаўнасьці беларускай мовы ды прапанаваў выйсьці на вуліцы дзеля змаганьня з рэжымам. Мяне, што было абсалютна нечаканым, падтрымалі Зьміцер Шаравер, Зьміцер Емяльянаў і Юра Ганчар. Пазьней да нас далучыліся Ўладак Сьвянціцкі і яшчэ некалькі чалавек. Адзначу: большую частку альтэрнатыўнікаў складалі сьвядомыя беларусы. Беларуская сьвядомасьць, а галоўнае – вызнаньне прынцыпаў незалежнасьці Беларусі, было падмуркам палітычнай дзейнасьці «Альтэрнатывы». Пры гэтым сяброўства ў новай арганізацыі не выключала магчымасьці заставацца сябрам іншых суполак. Напрыклад, працягваў сваё існаваньне роварны клюб «Пагоня».

Некаторыя сучасныя журналісты, у прыватнасьці Сяргей Носаў, павязваюць «Альтэрнатыву» з «Сучасьнікам». Альбо, беручы пад увагу тагачасныя пераканаьні большасьці ягоных сяброў, называюць альтэрнатыўнікаў «сацыял-дэмакратамі». Але ані Крывіцкі асабіста, ані «Сучасьнік» у цэлым ніякай ролі ў дзейнасьці альтэрнатыўнікаў не адыгрывалі, больш за тое, неўзабаве большасьць зь іх наагул перасталі наведваць паседжаньні клюбу.

Разам з тым, «Менская альтэрнатыва» ніколі не існавала як самастойная і трывалая адзінка беларускага дэмакратычнага руху 1988 году. На маё меркаваньне, яна была выключна вастрыём радыкальнага моладзевага руху. Менавіта радыкальнага і беларускага, бо інакш не было б выступу на

мітынгу «Саюдзісу» ў Вільні пад бел-чырвона-белым сьцягам і закліку да адмовы ад савецкага грамадзянства ды шэрагу іншых радыкальных акцый. Зьнікненьне «Альтэрнатывы» зьвязана з утварэньнем Беларускага народнага фронту і Канфэдэрацыі беларускіх суполак, калі патрэба ў яе самастойнай дзейнасьці адпала. Практычна ўсе альтэрнатыўнікі зрабіліся актывістамі групаў падтрымкі БНФ, увашлі ў рэдакцыі незалежных газэтаў…

СПРАВЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ

Ужо на пачатак 1988 году пераважная большасьць маіх сяброў і знаёмых былі пераканаыя – сапраўдная дэмакратыя немагчымая без нацыянальнага адраджэньня. Нават тыя, хто пакуль не разумеў патрэбы ўтварэньня беларускай дзяржавы, без ваганьняў выступалі за дзяржаўнасьць беларускай мовы, вяртаньне нацыянальных сымбаляў і спыненьне русіфікацыі. Частка карысталася беларускай мовай, частка працягвала гаварыць па-расейску, але ў размове зь беларускамоўнымі намагалася гаварыць па-беларуску.

Менавіта ў 1988 годзе ўпершыню выйшлі на палітычную арэну і «расейскамоўныя беларускія дэмакраты». Гэтая «расейскамоўная частка беларускага дэмакратычнага руху» заўсёды востра адчувала сваю непаўнавартаснасьць, якая вымушала шукаць уласныя шляхі аб'яднаньня, адным зь якіх у далейшым зрабілася АДПБ.

Дзякуючы кантактам з М. Пліскам, я быў добра знаёмы з настроямі і думкамі «расейскамоўнага беларускага дэмакратычнага руху». Іх пазыцыя была і застаецца вельмі асаблівай, і яе, на маю думку, лепш за ўсё апісаў былы талаковец Вадзім Александровіч: *«Пажыцьцёва недаробленыя. Ад маскалёў сышлі, а да беларусаў не прыйшлі»*.

У 1988–1989 гадох у «недаробленых» існавала два крылы.

Першае, тыповым прадстаўніком якога быў Крывіцкі, не

вызнавала словаў «Беларусь» і «адраджэньне». Яны выступалі за дэмакратычную Расею (замест СССР), новы саюз і г. д. Пераважная большасьць уваходзіла ў «Дэмакратычную плятформу» КПСС альбо лічыла магчымай трансфармацыю савецкага ладу. Пасьля шматлікіх падзелаў гэтае крыло зьнікла недзе паміж 1991 і 1995 гадамі. Адна частка далучылася да ўлады, другая, значна меншая, – да АДПБ ды падобных груповак.

Другое крыло, рэпрэзэнтаванае пераважна габрэямі ды этнічнымі расейцамі, панічна баялася ўсяго «нацыянальнага». Да іх належалі: са старэйшых – пісьменьнік Букчын, а з маладзейшых – Дзьмітры Зільбер зь Сяргеем Носавым.

У далейшым усе яны зрабіліся таемнымі альбо яўнымі ворагамі нацыянальнага руху. Напрыклад, Д. Зільбер паспрабаваў зрабіць на «беларускім фашызьме» імя ў Ізраілі, надрукаваўшы расейскамоўны артыкул аб уціску габрэяў беларускімі нацыяналістамі на гістфаку БДУ. Артыкул, праз знаёмую С. Носава Натальлю Мальгіну, патрапіў на гістфак і выклікаў абурэньне выкладчыкаў і студэнтаў. Дарэчы, пэўныя яго выразы вельмі нагадваюць выразы артыкулу С. Носава, зьмешчанага ў адным з нумароў «ARCHE».

Цікава і тое, што сярод «беларускіх фашыстаў» Зільбер згадвае і Зьмітра Левіта. Апошні, яшчэ з часоў «Альтэрнатывы», прадстаўляўся «беларускім жыдом», гаварыў выключна па-беларуску і выступаў пад бел-чырвона-белым сьцягам.

РЭПРЭСІІ

Ці былі ў 1988–1991 гадох палітычныя рэпрэсіі?

Сёньня большасьць журналістаў спрабуе давесьці іх існаваньне і нават уключыць сябе ў лік рэпрэсаваных. Ці ўсё было так страшна?

Сапраўды, кіраўнікоў і актывістаў нефармальных аб’яднаньняў

выклікалі на допыты ў пракуратуру, затрымлівалі на акцыях. Але штрафаў і турэмных прысудаў практычна не было. Пасьля некалькіх гадзінаў затрыманых адпускалі дамоў, склаўшы пратаколы. Калі-нікалі адбіралі незалежныя газэты і літаратуру.

Выдатна памятаю, як пасьля мітынгу ў Вільні мяне і яшчэ некалькіх альтэрнатыўнікаў проста на вакзале арыштавалі і даставілі ў рэспубліканскую пракуратуру. На працягу амаль пяці гадзінаў у нас бралі тлумачэньні, пераконвалі ў «фашысцкім» паходжаньні бел-чырвона-белага сьцягу і пагражалі распачаць крымінальную справу па некалькіх артыкулах тагачаснага крымінальнага кодэксу. Але… пасьля ўсіх допытаў нас адпусьцілі і нават вярнулі сьцяг і газэты «Саюдзісу».

Асабліва бясьпечна адчувалі сябе студэнты. Так, прэзыдэнт менскай «Талакі» Сяржук Вітушка спакойна вучыўся на гістфаку БДУ, а ў Тэхналягічным інстытуце – Алесь Гуркоў; вучыліся ў асьпірантуры Караліна Мацкевіч і Алесь Бяляцкі. Нават адзін з ідэолягаў «Талакі» Ігар Лапша, які марыў пра кар'еру палітыка, у 1990 годзе паступіў у асьпірантуру на спэцыяльнасьць… «гісторыя КПСС». У рэжымных установах працавалі Алесь і Сьвятлана Жынкіны… Мая былая жонка спакойна скончыла той самы гістфак БДУ з «чырвоным дыплёмам», дарма што яе прозьвішча значылася ў рэдкалегіі «Беларускай Трыбуны» ў 1989–1991 гадох, а ў верасьні 1989 году яна пакінула шэрагі ЛКСМБ…

Разам з тым, са словаў студэнтаў, некаторыя выкладчыкі-такі заніжалі адзнакі беларускім актывістам, калі тыя нядбала рыхтаваліся да іспытаў. Узгадваю паседжаньне «Талакі», калі студэнтаў-удзельнікаў абавязалі дасканала рыхтавацца і нават ня ўдзельнічаць у талакоўскіх акцыях падчас сэсіі. Але ці можна лічыць уласнае нядбайства ў навучаньні палітычнымі рэпрэсіямі?

Наагул, адзіным выпадкам, калі ўдзельніка беларускага руху судзіў крымінальны суд (рашэньні аб штрафах выносіліся адміністрацыйнымі камісіямі, а адміністрацыйныя суды вызначаліся прысутнасьцю аднаго судзьдзі) і вынес карны

прысуд, была справа мастака Алеся Пушкіна. Але і ў гэтым выпадку абышлося ўмоўным прысудам, і ён застаўся студэнтам.

Крыху іншая справа была з тымі, хто працаваў… Сапраўды, некаторых, асабліва настаўнікаў і выкладчыкаў, калі-нікалі вымушалі пісаць заявы пра звальненьне «на ўласнае жаданьне» альбо знаходзілі падставы накшталт «скарачэньня штату». Але такіх было відавочна няшмат. Напрыклад, працаваў выкладчыкам БДУ і ня быў звольнены правы радыкал Анатоль Астапенка. Акурат у школах працавала і большасьць талакоўскіх дзяўчат, але пра іх звальненьні з палітычных падставаў я ня памятаю. Досыць спакойна працавала ў навуковых установах і пераважная большасьць аргкамітэту БНФ.

Такім чынам, ці былі тады рэпрэсіі, кожны мае вырашыць сам адпаведна ўласнаму сумленьню.

КАНЕЦ, ЯКІ СТАЎ ПАЧАТКАМ

Пераломнай кропкай у найноўшай гісторыі Беларусі стаўся артыкул З. Пазьняка «Курапаты – дарога сьмерці», надрукаваны ў «ЛіМе», ды стварэньне арганізацыйнага камітэту «Мартыралёгу Беларусі». У канцы лета зьявіўся і арганізаваны цэнтар беларускага руху, які меў праграму і мэту. Кожная суполка, кожны сьвядомы беларус мусілі ўзгадняць свае дзеяньні з агульным цэнтрам. Гэта быў добраахвотны выбар, і ніхто з нас пра гэта не шкадаваў.

Адначасна адбывалася палярызацыя і нефармальных аб’яднаньняў. Беларускія суполкі ўзялі курс на кансалідацыю і пачалі падрыхтоўку да 2-га Вальнага сойму, выпрацоўку статуту канфэдэрацыі, іншыя, напрыклад, «Сучасьнік», засталіся па-за агульным працэсам. Заставалася некалькі месяцаў да ўтварэньня аргкамітэту БНФ.

Але гэта ўжо іншая старонка нашай гісторыі…

ГАРАЧЫЯ ДНІ
(ВОСЕНЬ–ВЯСНА 1988–1989 ГАДОЎ)

Лета 1988 году паказала, што ў Беларусі існуе досыць моцны і арганізаваны беларускі нацыянальны рух. Час ад часу зьяўлялася інфармацыя аб стварэньні нейкіх «аргкамітэтаў Народнага Фронту». Усе чакалі ПАДЗЕІ, але, здавалася, нічога не адбываецца.

Менавіта здавалася, бо насамрэч ішлі актыўныя перамовы розных беларускіх суполак і групаў аб утварэньні адзінай арганізацыі. Пераважная большасьць суполак выступала за скліканьне 2-га Вальнага сойму і ўтварэньне Канфэдэрацыі беларускіх суполак, але частка беларускай інтэлігенцыі сьвядома тармазіла гэты працэс, спадзеючыся найперш утварыць сваю агульнабеларускую структуру.

Тут, на маё меркаваньне, нараджаўся канфлікт беларускай моладзі і больш сталага пакаленьня.

Сябры беларускіх суполак выступалі з радыкальных пазыцыяў, іхным прыкладам былі прыбалтыйскія рухі. Ужо тады гаварылі аб незалежнай Беларусі, вяртаньні нацыянальных сымбаляў, дзяржаўнасьці беларускай мовы, забароне камуністычнай партыі…

Здавалася, старэйшае пакаленьне беларускай інтэлігенцыі мусіла падтрымліваць падобныя лёзунгі. Але… Пераважная большасьць творчай інтэлігенцыі лічыла іх вельмі радыкальнымі і нясвоечасовымі. Памятаю, як на чарговых раскопках Верхняга гораду ў Менску З. Пазьняк казаў прыкладна так: «Хлопцы, я з вамі згодны, але шырокія колы беларускай грамадзкасьці падобныя лёзунгі не падтрымаюць». Дзіўна было нам, гатовым выйсьці на барыкады, што сьвядомыя беларускія патрыёты старэйшага пакаленьня (асабліва пісьменьнікі і працаўнікі навуковых інстытутаў) не

рабілі аніякіх захадаў, каб выйсьці з шэрагаў КПСС.

Працягам канфлікту былі дыскусіі вакол складу аргкамітэту БНФ, што адбываліся ў жніўні-кастрычніку 1988 году. Кіраўнікі беларускіх моладзевых суполак – а менавіта гэтыя суполкі складалі тады найбольш актыўную і шматлікую групу беларускага адраджэнскага руху – настойвалі, каб у склад аргамітэту ўвайшлі прадстаўнікі ўсіх існуючых суполак альбо – па адным з вобласьці. Але хворая на кланавасьць творчая інтэлігенцыя не пагаджалася і, на жаль, перамагла. Беларускую моладзь прадстаўлялі толькі В. Вячорка і А. Бяляцкі.

Падзеі 30 кастрычніка 1988 году (Дзяды) радыкалізавалі беларускае грамадзтва. На паседжаньні менскай «Талакі» пачалі прыходзіць сотні людзей, выйшаў зварот аргкамітэту БНФ, і пачалося ўтварэньне групаў падтрымкі.

Я меў магчымасьць амаль месяц (зь лістападу па сьнежань 1988-га) дзяжурыць у Доме літаратараў, дзе знаходзіўся аргкамітэт БНФ, і прымаць заявы ад асобных людзей і групаў падтрымкі. Сёньня мяне пытаюць: хто першы падтрымаў БНФ?

Першая, найбольш шматлікая група – гэта людзі, што прагнулі зьменаў. Але зьменаў найперш эканамічных. Яны не задаваліся пытаньнем мовы альбо гісторыі, іх цікавіла магчымасьць нармальнай працы. Менавіта яны ўпершыню пачалі ўздымаць пытаньне эканамічнай праграмы, фінансаваньня дзейнасьці БНФ. І, што мяне тады вельмі зьдзівіла, ніхто з кіраўнікоў аргкамітэту падобнай лягічнай праграмы ня меў.

Другая паводле колькасьці група – пакрыўджаныя. Іх пакрыўдзілі на працы, у судох і г. д. Яны спадзяваліся знайсьці праўду з дапамогай БНФ. На жаль, аргкамітэт мог іх толькі выслухаць. Некаторыя зь іх уключаліся ў барацьбу, але большая частка паступова сыходзіла.

Нарэшце, найбольш цікавая група – беларускія патрыёты, якія доўгі час ня ведалі, дзе знайсьці аднадумцаў. Менавіта на іх прыкладзе я пераканаўся, наколькі каставае і замкнёнае кола творчай інтэлігенцыі. Інжынэры, настаўнікі, простыя рабочыя… Яны любілі Беларусь і жадалі працаваць дзеля яе дабра, але

доўгі час перабывалі ў культурным вакуўме, без надзеі знайсьці аднадумцаў.

Стварэньне аргакамітэту БНФ паставіла перад кіраўнікамі беларускіх моладзевых суполак пытаньне аб неабходнасьці 2-га Вальнага сойму. Частка сяброў суполак казала аб немэтазгоднасьці правядзеньня Сойму і ўтварэньня КБС, бо ўтварэньне БНФ робіць падобную арганізацыю непатрэбнай. Іншая, больш радыкальная частка, выступала за правядзеньне Сойму. Найбольш актыўнымі прыхільнікамі ўтварэньня КБС былі Вадзім Александровіч, Караліна Мацкевіч, Віктар Івашкевіч, Уладак Сьвянціцкі…

Усе мы лічылі – як выявілася ў далейшым, небеспадстаўна, – што БНФ ня будзе беларускай нацыянальнай арганізацыяй. У яго шэрагі ўступала ўсё больш і больш «агульных дэмакратаў», а асоба Пазьняка згасала сярод «дэмакратычных камуністаў». У шэрагах фронту павялічвалася група «лібэралаў» (сучасная АГП), што лічыла пытаньне нацыянальнага адраджэньня другасным. Менавіта гэтую групу Л. Крывіцкі ахрысьціў «Другой Альтэрнатывай»… Паўставала рэальная пагроза пераўтварэньня БНФ у лібэральна-дэмакратычны рух, дзе нацыянальнае будзе толькі афарбоўкай. Не задавальняў беларускіх нацыяналістаў і склад аргкамітэту, занадта вялікай была доля сяброў КПСС, выхаванцаў розных партшколаў.

Але і кіраўнікі аргакамітэту выдатна разумелі: вастрынёю БНФ, найбольш актыўнай ягонай часткай, ёсьць сябры беларускіх суполак. Сыход апошніх у іншую арганізацыю быў бы крытычны для Фронту. Больш за тое, створаная моладзьдзю арганізацыя можа зрабіцца рэальнай альтэрнатывай аргкамітэту БНФ. Менавіта таму, на маю думку, чыніўся ціхі супраціў правядзеньню 2-га Вальнага сойму з боку пэўных колаў у аргкамітэце БНФ.

Прыхільнікі правядзеньня Сойму адчувалі ціск і з боку уладаў. Так, нягледзячы на шматлікія захады, мы не знайшлі памяшканьня для правядзеньня Сойму ня толькі ў Менску, але і ў Беларусі. Толькі Вільня выказала гатовасьць прыняць Сойм.

БЕЛАРУСКІ НЕЗАЛЕЖНЫ ДРУК

У тыя ж зімовыя дні 1988 году пачалі выходзіць беларускія незалежныя газэты. Іх пік прыпадзе на лета 1990-га, а тады зьявіліся толькі першыя ластаўкі. Як ні парадаксальна, іх пачалі рабіць людзі, далёкія ад журналістыкі.

Так, першы нумар сваёй вэрсіі «Беларускай Трыбуны» я рабіў практычна сам. Таксама самастойна рабіў першыя нумары «Студэнцкай Думкі» Алесь Гуркоў, а Вадзім Александровіч і Караліна Мацкевіч – «Супольнасьць». Газэты друкаваліся ў Вільні і перавозіліся ў Менск цягніком. Цікава, але затрыманьня накладаў газэтаў альбо распаўсюднікаў практычна не бывала. Яны пачаліся пазьней, у 1990 годзе, калі незалежную прэсу пачалі распаўсюджваць проста на вуліцах.

Ці давалі першыя незалежныя газэты прыбытак? Сёньня шмат хто зьвязвае першы беларускі бізнэс з друкам, але гэта далёка ня так. Сапраўды, людзі, што выпускалі газэты, зь цягам часу вымушаны былі кінуць дзяржаўную працу, бо занадта шмат часу займала падрыхтоўка выданьня, перавозка і распаўсюд. Але асабістыя «заробкі» заставаліся параўнальна невялікімі, на ўзроўні 150–200 савецкіх рублёў. Гэта потым, пасьля пераменаў жніўня 1991-га, прадпрымальніцкая дзейнасьць у галіне беларускага друку стала мець пэўны фінансавы сэнс. А тады, у 1988–1991 гадах, распачаць выпуск выданьня было вельмі рызыкоўным эканамічна крокам – ты, апрача ўсяго іншага, заставаўся без гарантаванага заробку.

У канцы 1988-га – пачатку 1989-га году Алесь Суша і Алесь Гуркоў прапанавалі стварыць беларускі выдавецкі цэнтар, каб зарабляць грошы. На пачатку 1989 году была распрацаваная канцэпцыя супрацоўніцтва і дасягненьня фінансавай самастойнасьці. Але супраць гэтай ідэі рашуча выступіў З. Пазьняк, абвінаваціўшы яе ініцыятараў у спробе «зарабіць грошы на беларускай справе», і ідэя не была рэалізаваная. (У далейшым падобны цэнтар быў створаны як выдавецкі аддзел БНФ. Натуральна, у ім рыхтаваліся толькі падцэнзурныя асабіста З. Пазьняку выданьні.)

На працягу вясны 1989-га – лета 1991-га году адбывалася разьвіцьцё беларускага незалежнага друку. Практычна кожныя два-тры месяцы зьяўлялася новае выданьне. Нават у невялікіх гарадох выпускалі свае газэты. Напрыклад, у Маладэчне А. Капуцкі, У. Сьвянціцкі і М. Казлоўскі распачалі выпуск газэты «Раніца»…

Амаль усе выдаўцы былі знаёмыя міжсобку. Сярод выданьняў практычна не было канкурэнцыі ў прамым сэнсе гэтага слова, усе дапамагалі адно аднаму з матэрыяламі, друкам, распаўсюдам…

Нельга абысьці факт шматлікіх спробаў кіраўніцтва БНФ (спачатку – аргкамітэту) узяць пад цэнзурны кантроль незалежныя беларускамоўныя пэрыёдыкі. Адбывалася гэта рознымі спосабамі: ад ідэйнай апрацоўкі выдаўцоў да абвінавачаньняў іх у антыбеларускай дзейнасьці. І гэта ім практычна ўдалося. На старонках незалежнае прэсы таго часу практычна нельга знайсьці крытычнага аналізу дзейнасьці БНФ і ягоных структураў. Ці была падобная пазыцыя слушнай? Пакідаю гэтае пытаньне без адказу…

Паралельна зь беларускамоўным паўстаў і расейскамоўны незалежны друк. Такім прыкладам могуць быць расейскамоўныя выпускі «Беларускай трыбуны», газэты «Факт» і «Гражданин». Але гэтыя выданьні распаўсюджваліся па-за нацыянальным асяродкам. І калі мой – беларускамоўны – варыянт «БТ» яшчэ нёс беларускую ідэю (большая частка накладу распаўсюджвалася ў Прыбалтыцы), то іншыя рэпрэзэнтавалі расейскамоўны дэмакратычны спэктар. Асаблівасьцю расейскамоўнага самвыдаву былі шчыльныя сувязі з расейскімі дэмакратамі. Нават хадзілі чуткі пра іх фінансаваньне з Масквы. Мабыць, падобныя сьцьверджаньні небеспадстаўныя.

Актыўнасьць незалежнага друку назіралася ня толькі ў Беларусі. Гэта была супольная зьява, прынамсі, для прыбалтыйскіх рэспублік, Беларусі, Украіны і Расеі. Ужо да лета 1989 году адчувалася патрэба ў абмене інфармацыяй, тэхналёгіямі і практычнымі навыкамі. Першымі гэта адчулі незалежныя выдаўцы і журналісты Прыбалтыкі. Менавіта таму і

першыя сустрэчы (зьезды) незалежнае журналістыкі адбыліся ў Вільні. Там жа ўсталёўваліся першыя кантакты з буйнымі заходнімі інфармацыйнымі агенцыямі…

2-ГІ ВАЛЬНЫ СОЙМ

Як я ўжо пісаў раней, падрыхтоўка да 2-га Вальнага сойму беларускіх суполак трывала зь лета 1988 году, але пік яе прыпаў на другую палову сьнежня – студзень 1989 году. Менавіта тады яскрава праявіліся два абсалютна розныя падыходы да будучай Канфэдэрацыі беларускіх суполак.

Першы, прэзэнтаваны В. Вячоркам, А. Бяляцкім і В. Івашкевічам, прадугледжваў пераўтварэньне суполак у групы падтрымкі БНФ. Падобны падыход адпавядаў тагачаснай мэце БНФ як мага хутчэй стварыць разгалінаваную структуру. Сяброў суполак меркавалася рэкрутаваць на ролю агітатараў і дробных партыйных функцыянэраў. Асаблівая ўвага надавалася суполкам у абласных і раённых цэнтрах Беларусі, тамтэйшым кіраўнікам абяцалі пасады абласных (раёных) кіраўнікоў БНФаўскай герархіі.

Чаму перамог падобны падыход да будучага КБС? На маю думку, найперш з жаданьня яе прыхільнікаў займацца палітыкай прафэсійна.

Другі падыход – культурніцкі. Прыхільнікі падобнага падыходу (С. Вітушка, В. Якімовіч, М. Казлоўскі) лічылі, што культурніцкая беларуская праца суполак нясе значна больш карысьці беларускаму руху. Поўная інкарпарацыя сяброў суполак у БНФ зьнішчыць культурніцкую працу, або іх пераважная большасьць папросту распусьціцца ў агульнай масе БНФ.

Наша прапанова была наступная: захаваць суполкі як профільныя культурна-палітычныя арганізацыі і працаваць з тымі, хто ідзе ў беларускі рух ня толькі з палітычных, але і з нацыянальна-культурных перакананьняў.

На жаль, да пачатку Сойму прыйсьці да паразуменьня не ўдалося…

Яшчэ адно пытаньне, што актыўна дыскутавалася, – якую арганізацыю лічыць «беларускай суполкай». Частка людзей спрабавала вызначыць цьвёрдыя крытэры: праграма, мэты, мова… Напрыклад: ці лічыць «беларускай суполкай» групу падтрымкі БНФ альбо палітычную арганізацыю, што ёсьць беларускай выключна паводле тэрытарыяльнай прыкметы? Але і гэта не было вызначана…

Няпэўнасьць мэтаў, прыезд на Сойм прадстаўнікоў арганізацыяў, далёкіх ад беларускага адраджэньня, нявызначанасьць з прапарцыйным прадстаўніцтвам пры галасаваньні – усё гэта ператварыла 2-гі Вальны сойм у шараговую беларускую тусоўку. Луналі сьцягі, гучалі прыгожыя заклікі, але мэтаскіраванае працы не адбылося.

Рэальная барацьба пачалася ўвечары першага дня, калі З. Пазьняк паставіў жорсткае пытаньне аб пераўтварэньні КБС у калектыўную групу падтрымкі БНФ. Пагражаючы палітычнай паразай усяго беларускага руху, ён уласным аўтарытэтам прымусіў кіраўнічы склад КБС (В. Вячорка, А. Суша і А. Бяляцкі) прыняць свой пункт гледжаньня. Словы Вадзіма Александровіча аб тым, што падобная акцыя робіць немэтазгодным само ўтварэньне КБС (бо пераважная большасьць сяброў беларускіх суполак і так былі членамі групаў падтрымкі БНФ) і што КБС у стане выконваць значна больш пэрспэктыўныя задачы беларускага адраджэньня і г. д., былі адкінуты на карысьць вырашэньня бягучых задачаў БНФ. (Але нават пасьля выступу З. Пазьняка галасаваньне па пытаньні далучэньня КБС да БНФ у якасьці групы падтрымкі не было адзінагалосным.)

Наступныя падзеі паказалі, наколькі падобнае палітычнае рашэньне было згубнае для беларускага культурніцкага руху. Ужо да восені 1990 году практычна зьнікла менская «Талака», іншыя дзейныя культурніцкія аб’яднаньня. Даўжэй за ўсіх мужна трымаліся на энтузіязьме Валянціны Якімовіч талакоўскія «сьпеўкі».

У далейшым неабходнасьць у беларускай культурніцкай працы зразумеў прафэсар Юры Хадыка (праект Народнага ўнівэрсытэту). З усіх існых беларускіх аб'яднаньняў здолела выжыць Задзіночаньне беларускіх студэнтаў, але і яно практычна страціла сувязь паміж пакаленьнямі…

Аналізуючы падзеі мінулага, я вылучаю адну прычыну ліквідацыі КБС шляхам падпарадкаваньня БНФ. Ёй была фактычная канкурэнцыя, якую складалі суполкі КБС новым БНФаўскім структурам. Гэтыя суполкі былі добра арганізаваныя, ідэйна маналітныя і мелі разгорнутую структуру практычна па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Амаль кожная зь іх выдавала друкаваныя матэрыялы, удзельнічала ў акцыях. Моладзі не было чаго губляць, яна яшчэ не набыла ўплывовых пасадаў, не зрабілася сябрамі разнастайных творчых саюзаў і партыйна-прафсаюзных адміністрацыяў. І, на маю думку, акурат гэтая незалежнасьць, радыкальнасьць і бескампраміснасьць вельмі палохалі «старэйшых таварышаў» з аргкамітэту БНФ.

РАСЕЙСКАЯ ДЭМАКРАТЫЯ

Першыя знаёмствы з расейскімі дэмакратамі адбыліся ў мяне ў 1988 годзе на паседжаньнях клюбу «Сучасьнік». Яшчэ тады я заўважыў цікавую рэч: калі мае знаёмыя з Украіны, Літвы і Армэніі гаварылі пра культурнае, эканамічнае супрацоўніцтва з пункту гледжаньня сваіх нацыяў (як найменей падкрэсьліваліся сувязі Ўкраіна–Беларусь, Літва–Беларусь і г. д.), расейцы ўсе заганы Савецкага Саюзу прыпісвалі кіраўніцтву КПСС, асобным палітыкам і падзеям, але ні ў якім разе не імпэрскай сутнасьці Расеі (СССР). Прыкладна тое самае адбывалася падчас прыезду расейскіх дэмакратаў на «Менскі гайдпарк» – сквэр Янкі Купалы – улетку таго ж 1988-га.

Разам з тым, эпізадычныя кантакты 1988 году не маглі скласьці цэльнага малюнку стаўленьня расейскіх дэмакратаў да Беларусі.

Пэўнае ўражаньне пра адносіны расейскага «дэмакратычнага» руху да нацыянальнага адраджэньня (ня толькі беларускага, але й наагул усіх нацыянальных ускраін імпэрыі), мы атрымалі ўвесну 1989 году, калі разам з Вадзімам Александровічам патрапілі на «Зьезд паняволеных народаў СССР», што адбываўся ў Вільні.

Ня буду падрабязна апавядаць аб усіх дыскусіях, што гучалі на зьезьдзе. Адзначу толькі: беларусы знайшлі паразуменьне з усімі. Усімі, апроч расейцаў.

Дыскусія пачалася з дакладу аднаго з дарадцаў акадэміка Сахарава пра ягонае бачаньне «новага саюзу». Ён прыгадаў барацьбу РВА генэрала Ўласава, шасьцідзясятнікаў і г. д., і зрабіў такую выснову: у новым саюзе ўсё будзе добра, а паасобку мы згінем. І калі незалежнасьць краін Прыбалтыкі расейскія дэмакраты са скрыпам, але ж прымалі, то незалежнасьці Ўкраіны, а тым больш Беларусі, не ўспрымалі наагул. Тут ішлі ў ход стандартныя тэзы «славянскага адзінства», «трыадзінства рускага народу» і г. д. Натуральна, што падобны падыход сустрэў ваяўнічы адпор украінскай (Ляўко Лук'яненка, Алесь Шаўчэнка, Пятро Прыходзька) і беларускай (Вадзім Александровіч і я) групаў.

Нягледзячы на вострую ідэйна-палітычную канфрантацыю, нашы імёны запомніліся расейскім дэмакратам і неўзабаве мы атрымалі запрашэньне на палітычныя форумы ў Маскву і Пецярбург. Яны запомніліся антыкамуністычнай скіраванасьцю і адчувальнай настальгіяй аб Расейскай імпэрыі (ці, прынамсі, рэспубліцы Керанскага).

Пра Маскоўскі форум і яго дыскусіі хачу апавесьці асобна, бо менавіта на гэтым форуме я ўпершыню сутыкнуўся асабіста з акадэмікам Сахаравым.

Ягоны даклад быў прысьвечаны перабудове і бачаньню «новага саюзу». Нават аддзяленьне Літвы, Латвіі і Эстоніі, якое тады ўжо было амаль зьдзейсьненым фактам, успрымалася акадэмікам як «фатальная памылка» гэтых народаў. Але больш за ўсё мяне ўразіла атаесамленьне нацыянальнага патрыятызму з фашызмам: нацыянальныя рухі ўспрымаліся ім

выключна ў адмоўным сэнсе. Нават патрабаваньне дзяржаўнасьці ўкраінскай (пра беларускую гаворкі ўвогуле не вялося) мовы на Ўкраіне падавалася як крайні нацыяналізм.

Мы з адным украінцам спрабавалі ўзяць слова, але да мікрафону пусьцілі толькі мяне (пэўна, спадзеючыся на памяркоўнасьць і дэнацыяналізаванасьць беларусаў).

У кароткім выступе я толькі ў агульных рысах акрэсьліў стаўленьне беларускага нацыянальнага руху да праблемы расейска-беларускай гісторыі, прагу беларусаў да незалежнасьці. Да майго выступу далучыліся і ўкраінцы. Але заля сустрэла нашу пазыцыю крайне варожа. Абвінавачаньні ў «фашызьме» і «нацыяналізьме» гучалі амаль з усіх бакоў.

Акурат з гэтага моманту я зразумеў: ніколі расейскія дэмакраты не пагодзяцца з існаваньнем незалежнай беларускай дзяржавы, якія б цудоўныя словы яны нам ні казалі.

«Другі прыход» расейскай дэмакратыі ў Беларусь распачаўся ўвесну 1990 году. Досыць нечакана ў Менск пачалі наведвацца прадстаўнікі разнастайных дэмакратычных расейскіх рухаў і, што асабліва дзіўна, для сустрэчы зь імі ўлады давалі памяшканьні. Зноў атрымаў трывалае памяшканьне й «Сучасьнік» Крывіцкага. Збольшага менавіта на яго базе і адбываліся выступы сустрэчы з «расейскімі дэмакратамі». Агульным матывам, бясспрэчна, было захаваньне саюзу, расейская мова і культура як аб'яднальны фактар. Расейцы пачалі актыўна залучаць «Крывіцкага і К» у стварэньне філіяў расейскіх арганізацыяў на тэрыторыі Беларусі. Спачатку – у якасьці карэспандэнцкіх пунктаў «незалежных» СМІ, потым – палітычных структураў. З словаў былой супрацоўніцы НІСЭПД Натальлі Мальгіной, адным з падобных «карэспандэнтаў» быў у той час і Сяргей Носаў.

Досыць хутка зрабілася відавочна, што ўлады ў асобе Крывіцкага і ягонага «Сучасьніка» рыхтуюць падмурак беларускага «інтэрфронту». Так, Вадзім Александровіч даведаўся, што ўлетку мае быць абвешчана нейкая «дэмакратычная ініцыятыва». Збор яе камітэту мусіў праходзіць у кінатэтры «Піянэр». Цікава, але адной зь сілаў, што была

тады гатовая далучыцца да гэтай «ініцыятывы», былі «дэмакратычныя камуністы» на чале зь Міхасём Пліскам.

Менавіта ў гэты пэрыяд узмацніўся ціск уладаў на беларускія нацыянальныя арганізацыі і незалежны друк. Як мне потым апавядаў Дзіма Левіт і іншыя распаўсюднікі незалежнай прэсы, іх затрымлівалі і адбіралі беларускія выданьні, а распаўсюднікі расейскай «дэмакратычнай» прэсы працавалі вольна. У шапіках РПЦ прадавалася манархічная, антыбеларуская, антысэміцкая літаратура, а супраць Алеся Пушкіна і ягоных сяброў была разгорнута афіцыйная кампанія. І гэта была мэтаскіраваная палітыка антыбеларускай камуністычнай улады.

Магчыма, што задума тагачасных уладаў і зьдзейсьнілася б, але перашкодзілі дзьве рэчы: гатовасьць далучыцца да «дэмакратычнай ініцыятывы» такіх адыёзных асобаў, як сумнавядомы Бягун, і рашучае супрацьдзеяньне нацыянальнае моладзі. Улады зразумелі – створаны камітэт ня знойдзе падтрымкі ў масах. Аўтарытэт БНФ, дзякуючы праўдзе аб Курапатах, ЧАЭС і г. д., быў тады вельмі высокі. Тым ня менш, менавіта ўлетку 1990 году зьявіўся і досыць хутка пашырыўся цікавы тэрмін – «расейскамоўны дэмакратычны беларус». Апошняе слова ў ім вызначала выключна месца пражываньня.

Але, нягледзячы на спыненьне ўладнай падтрымкі, расейскія «дэмакраты» здолелі стварыць у Беларусі шэраг аддзелаў сваіх арганізацыяў. У будучыні, ужо пасьля 1991 году, большасьць зь іх перацякла ў шэрагі АГП.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 5 (39) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/12
[image]

[image] [image] [image]

Я не магу ня быць у апазыцыі да такой улады
Гутарка з Генадзем Бураўкіным

ГЕНАДЗЬ БУРАЎКІН (нар. 28.08.1936 г. у вёсцы Шуляціна Расонскага раёну Віцебскай вобласьці) паэт, публіцыст. Сябра Беларускага ПЭН-цэнтру з 1989 г. Працаваў аглядальнікам газэты «Беларускі Час» датуль, пакуль кантроль над ёй не пераняў клан Козіка.

– Генадзь Мікалаевіч, давайце пачнём нашу гутарку з Вашых успамінаў пра дзяцінства і юнацтва. Як пісаў Анатоль Сыс, «пачнём з Радзімы», малой радзімы. Што захавалася ў Вас у памяці зь дзіцячых гадоў? Як здарылася, што яшчэ вучнем полацкай школы Вас завабіла паэзія?

– Самыя першыя дзіцячыя ўспаміны зьвязаныя ў мяне зь Вялікай Айчыннай вайною і вёскай Малюціна ў Расонскім раёне на беразе чыстай і вірыстай Дрысы. Там перажыў я першыя свае ўсьвядомленыя жахі, першае замілаваньне прыродай, першыя маленькія радасьці. І на сёньня са зьдзіўленьнем успрымаю выратаваньне ад немінучай сьмерці ў блякадныя дні, вяртаньне бацькі-інваліда, выжываньне пасьля нішчымніцы і хвароб. Толькі Бог і людзі, а найперш – маці пакінулі мяне на гэтай зямлі і далі магчымасьць нямала прайсьці па ёй і тое-сёе зрабіць…

Пасьля было мястэчка Расоны, Расонская школа, любімыя кнігі і спробы нешта зарыфмаваць. І потым ужо – Полацак, восьмы, дзявяты, дзясяты клясы ў першай сярэдняй школе. Тады

зьявіліся першыя публікацыі ў абласной (тады яшчэ была Полацкая вобласьць) газэце і нават у Менску, у «Чырвонай змене» і «Полымі»…

Чаму мяне пацягнула да творчасьці, да паэзіі? Толкам і сам ня ведаю. Мне вельмі падабаліся вершы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Кандрата Крапівы, якія ў цёмныя трывожныя вечары, калі невядома было, хто пагрукае ў хату – паліцаі, партызаны ці карнікі, – на памяць чытала нам маці. У іх усё было так складна, так прыгожа! Аднойчы захацелася і самому паспрабаваць скласьці словы так, каб гучалі яны і суладна, і цікава…

– Што сабой уяўляў літаратурны асяродак тагачаснага Полацку?

– Пры рэдакцыі газэты ў Полацку ў пяцідзясятыя-шасьцідзясятыя гады мінулага стагодзьдзя працавала літаратурнае аб'яднаньне, якое пэўны час узначальваў супрацоўнік рэдакцыі, празаік Алесь Савіцкі, а пасьля, калі газэта стала гарадзкой і раённай, калі ліквідавалі вобласьць, а Савіцкі паехаў вучыцца ў Маскву, «вялі» яго Павал Шадзеўскі і Ніна Антонава. На не такія ўжо і частыя паседжаньні зьбіраліся найбольш настаўнікі, студэнты і старшаклясьнікі. Памятаю журналіста Міколу Бадзюкова, выкладчыка беларускай літаратуры Ўладзімера Клімянкова, зусім маладых навучэнца лясного тэхнікуму Валянціна Лукшу і школьніка Навума Гальпяровіча. Не скажу, што гэта быў вялікі і актыўны «атрад» пачаткоўцаў, але «Літаратурная старонка» ў газэце «Сцяг камунізму» выходзіла рэгулярна, і нейкае ўзаемнае спрыяньне ўвазе да новых кніг і новых імёнаў у мастацкіх часопісах у нас было. Прыкметнымі падзеямі рабіліся рэдкія прыезды ў Полацак менскіх пісьменьнікаў. Памятаю, напрыклад, сустрэчу з Тарасам Хадкевічам, Міхасём Машарам і Пятром Прыходзькам.

– Ведаю, што Вы сябравалі з полацкім кампазытарам, аўтарам славутай песьні «Ручнікі» Міколам Пятрэнкам.

– Зь Міколам Пятрэнкам мы сапраўды добра і доўга сябравалі. Гэта быў чалавек надзвычайна тонкай і чулай душы, вялікага

музычнага таленту, шчыры, самаадданы беларус. Ён вельмі любіў і бліскуча ведаў нашу айчынную паэзію, сачыў за кожнай новай вершаванай кніжкай і па-хлапчукоўску захапляўся паэтычнымі знаходкамі, шукаў у іх схаваную для недасьведчанага вуха мэлёдыю. Пакутны лёс фашыстоўскага вязьня, нялёгкая доля вясковага настаўніка, часам абыякавыя, а то і грэблівыя адносіны да ягонай творчасьці з боку некаторых музычных мэтраў зусім не забралі ў яго аптымізму, і ён увесь проста сьвяціўся дабрынёй і спагадлівасьцю. Ягоныя «Ручнікі» (на верш Веры Вярбы) і «Твае рукі» (на верш Янкі Сіпакова) безь перабольшваньня зьяўляюцца пэрлінамі песеннага майстэрства. Іх сьпявалі і сьпяваюць ня толькі ў Беларусі, ня ведаючы аўтара, лічачы народнымі… Ён вельмі любіў Полацак, Полаччыну, і яны яму плацілі ўзаемнасьцю. Зь ім было хораша і на сустрэчах са студэнтамі, і за бяседным сталом, і ля ціхага вячэрнага вогнішча на беразе Дзьвіны. Выдатны, непаўторны чалавек быў мілы, сьветлы Мікола Макаравіч.

– Ці існавала сымпатыя, цеплыня, настальгія да Полаччыны ў Петруся Броўкі, які таксама пачаў сваю пісьменьніцкую кар'еру ў Полацку?

– Трапятлівы, шчыры і па-мужыцку хітраваты Пятрусь Усьцінавіч вельмі любіў Полацак. Пра гэта ён гаварыў ня раз і заўсёды зь нехаванай замілаванасьцю. Для яго, як і для многіх вяскоўцаў з Ушаччыны, Расоншчыны, Дрысеншчыны, Полацак (казалі менавіта так) быў самым блізкім і жаданым горадам, таямнічымі варотамі ў сьвяты сьвет гісторыі і духоўнасьці. Некалькі разоў мы з Рыгорам Барадуліным былі разам зь ім у Полацку – і нельга было не заўважыць ягонага глыбокага хваляваньня, калі мы стаялі каля Сафійкі ці шукалі вулачкі, па якіх Броўка хадзіў у свае маладыя гады… Ды гэта і ў творах ягоных засьведчана…

– Ці маглі беларускія пісьменьнікі за савецкім часам больш істотна ўплываць на жыцьцё рэспублікі, прынамсі, у справе беларусізацыі?

– Цяжка сказаць адназначна. Для мяне ясна адно, што пісьменьнікі ў так званы савецкі час (ува ўсякім разе ў тыя гады, што на маёй памяці) былі людзьмі бясспрэчна

паважанымі і, гучна кажучы, народам, і дзяржавай. Броўка, Крапіва, Лынькоў, Танк, Мележ, Панчанка, Шамякін, сябруючы зь першымі партыйнымі асобамі, маглі ўзьдзейнічаць і на сытуацыю ў рэспубліцы. Але ня думаю, што ў кардынальных пытаньнях іхнія меркаваньні сур'ёзна ўлічваліся. А што датычыць беларусізацыі, дык тут роля пісьменьнікаў была безь перабольшаньня вялізная. Варта прыгадаць, якія пасады займалі яны ў Акадэміі навук, установах культуры і адукацыі, у выдавецтвах і часопісах. Калі па ўсім Савецкім Саюзе распаўзалася сьвінцовая лавіна русіфікацыі, найбольш пасьлядоўнымі і рашучымі абаронцамі нацыянальных інтарэсаў і – найперш – роднай мовы былі якраз майстры слова. Я сам, яшчэ зусім малады вершатворца, некалькі разоў прысутнічаў на сустрэчах з членамі Бюро ЦК КПБ, дзе вельмі рэзка і Броўка, і Танк, і Мележ, і Брыль, і Панчанка ставілі пытаньне аб выцясьненьні беларускай мовы з грамадзкага ўжытку, аб масавым пераводзе школ на рускую мову навучаньня, аб скарачэньні накладаў беларускамоўных кніг. Лічу, будзе справядліва сказаць, што менавіта пісьменьнікі не далі расейскім шавіністам і мясцовым манкуртам ужо ў сямідзесятыя–васьмідзесятыя гады мінулага стагодзьдзя канчаткова «вырашыць» нацыянальнае пытаньне ў Беларусі. Ратуючы родную мову, рабілі яны шмат, а вось ці ўсё магчымае – сьцьвярджаць не бяруся. Вытаптаная сталінскімі рэпрэсіямі наша інтэлігенцыя, на жаль, не заўсёды падтрымлівала пісьменьнікаў, і водгульле тых спалохаў, як мне здаецца, яшчэ жыве ў беларусах і сёньня.

– Як вы ацэньваеце постаць Пятра Машэрава?

– Постаць Пятра Машэрава, ягоная асоба, ягоная дзейнасьць выклікалі і выклікаюць у мяне шчырую цікавасьць і павагу. Так, ён быў чалавекам свайго часу. Дзеячам сваёй эпохі; пры ягоным непасрэдным удзеле праводзілася і масавая мэліярацыя, і настойлівая русіфікацыя, і далёкія ад дэмакратычнасьці ідэалягічныя кампаніі. Але гэта – будзем справядлівымі – не ягоныя ініцыятывы, гэта была славутая «генэральная лінія», якую ён, як адданы і дысцыплінаваны камуніст, ажыцьцяўляў, з партыйнай паслухмянасьцю і верай у гістарычную неабходнасьць. Ня ведаю, ці былі ў яго пры гэтым

душэўныя пакуты, а што сумненьні былі – дакладна ведаю, бо пра гэта ён мне сам казаў падчас некалькіх шчырых гутарак. Быў ён патрыётам Беларусі, дзеля яе славы і дабрабыту ня раз рызыкаваў. Героем Вялікай Айчыннай вайны стаў ён не за пасады, а за асабістую адвагу. Сын рэпрэсаванага селяніна зь Віцебшчыны, ён добра адчуваў людзкі боль. Ягонай любові да нацыянальнай інтэлігенцыі нельга было не заўважыць, настолькі яна была глыбокая і адкрытая. Ён доўгія гады сябраваў з Аркадзем Куляшовым і сьцішана плакаў каля труны Івана Мележа. Я памятаю, зь якім захапленьнем казаў ён пра вершы Рыгора Барадуліна, як аберагаў ад чыноўных зласьліўцаў Андрэя Макаёнка. Ды і да Быкава ён ставіўся з разуменьнем значнасьці ягонага таленту… Гэта трагедыя для нашай культуры, што жыцьцё ягонае абарвалася якраз тады, калі ён пачаў усьведамляць сябе нацыянальным лідэрам…

– Ці існаваў за савецкім часам у пісьменьніцкім асяродку выразны падзел, як гэта адбылося ў другой палове 1990-х, на «канфармістаў» і «дэмакратаў» (патрыётаў, дзяржаўнікаў)?

– Выразнага, відавочнага падзелу на «канфармістаў» і «дэмакратаў» у так званыя савецкія часы, у якія я жыў і працаваў, магчыма, і не было. Хаця «групаваньне» па маральных пазыцыях і літаратурных сымпатыях было даволі прыкметным. Адны больш хінуліся да Васіля Быкава, іншыя – да Івана Шамякіна ня толькі па чыста мастакоўскіх прынцыпах (як сёньня, скажам, паплечнікі Рыгора Барадуліна і Віктара Казька «трымаюць дыстанцыю» ад Эдуарда Скобелева і Таісы Бондар ня толькі з-за прафэсійнага ўзроўню іхняй творчасьці). Урэшце, такое, напэўна, было заўсёды. Проста ў часы «застою» разьмежаваньне было, так бы мовіць, больш «схаваным». Але, я думаю, і тады, і цяпер вызначальным зьяўляецца стаўленьне да айчыннай гісторыі, да лёсу беларускай мовы, да служэньня праўдзе.

– Ці запрашалі Вас уступіць у менскую гарадзкую пісьменьніцкую арганізацыю Вераб'ёва?

– У менскую гарадзкую арганізацыю мяне не запрашалі. Яе «бацькі» добра ведаюць мае пазыцыі, маіх сяброў, мае асабістыя

адносіны да сёньняшніх уладаў. Быць разам мы ніяк ня можам.

– Ці ўсе Вашыя сябры і знаёмыя вытрымалі выпрабаваньне «часам Лукашэнкі»?

– Гэта адна з самых вялікіх радасьцяў майго жыцьця ў апошнім дзесяцігодзьдзі: абсалютная большасьць сяброў вытрымалі выпрабаваньне і «перабудовай», і «рынкавым сацыялізмам». Ня здрадзілі ні прынцыпам дэмакратыі, ні сяброўству ні Васіль Быкаў, ні Мікола Матукоўскі, ні Рыгор Барадулін, ні Валянцін Болтач, ні Віктар Казько, ні Сяргей Законьнікаў, ні Анатоль Кудравец… Ня здрадзілі нашаму паэтычнаму братэрству і ўкраінцы Іван Драч, Дзьмітро Паўлычка, Раман Лубкіўскі, рускі Андрэй Вазьнясенскі, літовец Юсьцінас Марцінкявічус, латыш Марыс Чаклайс… А некаторыя (на шчасьце – адзінкі), што лічыліся сябрамі, ня вытрымалі «ўдараў лёсу», кінуліся халуйнічаць перад новымі чыноўнікамі, але – дзякуй Богу – яны ніколі не былі асабліва блізкімі і дарагімі для мяне.

– Чаму беларускія пісьменьнікі, якія за савецкім часам былі элітаю краіны, апынуліся практычна «за бартом» дзяржаўнай палітыкі?

– Гэта трэба спытаць у тых, хто вызначае сёньня дзяржаўную палітыку Рэспублікі Беларусі. Як мне здаецца, здарылася гэта таму, што да ўлады ў нас прыйшлі людзі недастаткова адукаваныя і выхаваныя, зь нізкім узроўнем культуры, зь неразьвітай нацыянальнай сьвядомасьцю. Для іх на першым пляне стаяць асабістыя палітычныя, а то і матэрыяльныя інтарэсы, а ў гэтым ім таленавітыя і прынцыповыя пісьменьнікі помочнікамі, а тым больш паслугачамі быць ня могуць.

– Як здарылася, што Вы апынуліся ў шэрагах «непрымірымых» апазыцыянэраў да сёньняшняга рэжыму?

– Усё сваё сьвядомае жыцьцё, як мог, я стараўся быць карысным беларускай справе. Для мяне не існуе будучыні маёй і маіх дзяцей і ўнукаў безь незалежнасьці Радзімы, бяз роднай мовы, без разьняволенасьці людзкога духу. І калі я ня бачу на самым высокім чыноўным узроўні жаданьня кіравацца інтарэсамі сувэрэннай Беларусі, я не магу ня быць у апазыцыі

да такой улады. Я не знаходжуся ні ў якой партыі, не прэтэндую ні на якія дзяржаўныя пасады, але хачу, каб мая Бацькаўшчына была самастойнай і багатай краінай, каб яе кіраўнікі гаварылі на матчынай мове, каб любы яе грамадзянін меў гарантаваную магчымасьць прынародна выказаць свае думкі, каб паважаліся нашы гістарычныя сымбалі, каб на грамадзтва наша не глядзелі, як на прыстанішча кансэрватызму і паліцэйшчыны… Калі гэта зьвязваецца з апазыцыйнасьцю, значыць я – у апазыцыі.

– Ствараючы Раду беларускай інтэлігенцыі, Вы насамрэч лічылі, што беларуская інтэлігенцыя – гэта моцная палітычная сіла, але толькі не арганізаваная і не аб'яднаная?

– Я лічу, што інтэлігенцыя (ня толькі ў Беларусі, а ўсюды) павінна адыгрываць надзвычай важную ролю ў жыцьці грамадзтва. Да яе павінны прыслухоўвацца і шараговыя грамадзяне, і найвышэйшыя службоўцы, бо яна звычайна акумулюе ў сабе і сучасныя навуковыя веды, і традыцыі свайго народу. І высокія маральныя прынцыпы сусьветнай цывілізацыі. Калі задумвалася і стваралася Рада беларускай інтэлігенцыі, асабіста я спадзяваўся, што яна стане своеасаблівым дарадцам і для палітычных партыяў, і для дзяржаўных інстытутаў. Не дыктаваць, а падказваць разумныя рашэньні няпростых праблемаў – яе пакліканьне. Але, на жаль, ні нашы саманадзейныя чыноўнікі, ні лідэры палітычных партыяў чамусьці не захацелі мець такога памочніка (ува ўсякім разе – пакуль што). Ды і інтэлігенты не праявілі ні цярплівасьці, ні настойлівасьці, ні рашучасьці – задуманае так дасюль і не ажыцьцявілася.

– Што Вы адчулі, аб чым падумалі, калі міліцыянты зьявіліся ў радашковіцкім лесе і пачалі Вам замінаць весьці III Усебеларускі сход інтэлігенцыі?

– Сьпярша мне стала крыўдна і горка, што прыстойным, законапаслухмяным людзям не даюць магчымасьці абмеркаваць спакойна тое, чым яны жывуць, аб чым думаюць, ад чаго пакутуюць. І стала нават трошкі страшнавата, што вось-вось зьявяцца амапаўцы і пачнуць хапаць ні ў чым не вінаватых

дэлегатаў, павязуць іх у менскі пастарунак, затрымаюць іх там надоўга, а дома – у Гародні, Полацку, Берасьці – іх будуць чакаць родныя, будуць хвалявацца, кідацца ў трывозе і роспачы. І я паставіў сабе задачу: зрабіць усё, каб зьезд адбыўся, каб былі прыняты галоўныя рашэньні. Таму было вырашана не ўступаць у рэзкія спрэчкі зь міліцыянтамі, паспрабаваць па-добраму дамовіцца зь імі, бо былі відны ў іх і няёмкасьць, і нават пэўная разгубленасьць. Калі мне сказалі, што як толькі пачнецца галасаваньне, міліцыянты вымушаны будуць разагнаць «несанкцыянаваны мітынг» і затрымаць яго ўдзельнікаў, я «знайшоў выйсьце», прапанаваў не галасаваць, а ўсім паставіць свае подпісы пад рэзалюцыяй. Гэта было і юрыдычна правамерна, і цалкам легітымна. Такім чынам удалося пазьбегнуць скандалу, якога хацелі ня дужа разумныя сталічныя сілавікі зь вялікімі зоркамі на пагонах…

– Апошнім часам Вы часта выступалі ў друку як публіцыст. Ці плянуеце выдаць кнігу публіцыстыкі?

– Так, я ў апошнія гады рэгулярна выступаю ў дэмакратычнай прэсе з аўтарскай публіцыстыкай. Можна сказаць, ужо склалася цэлая кніга. У яе нават ёсьць назва – «Беларускі час. Палітычны дзёньнік трывожнага дзесяцігодзьдзя (1995–2005)». Застаецца знайсьці выдаўца, а гэта для мяне – справа нялёгкая: «несучасны» я чалавек у гэтым пляне.

– Якая з Вашых паэтычных кніг для Вас самая дарагая?

– Хітрае пытаньне… Хай бы лепш на яго адказалі мае чытачы. Але, калі ўжо яно пастаўлена, ня буду ўцякаць ад яго. Найбольш блізкія, а значыць і дарагія – апошнія па часе выхаду: «Паміж зоркай і сьвечкай» і «Жураўліная пара». Гэта, як зь дзецьмі: сэрца баліць найчасьцей за «меншанькіх».

Гутарыў Алесь Аркуш
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 5 (39) - 2005
[image]да Зьместу

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/02/12**
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (39) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image]2005

да Зміста

ПАЛЕМІКА • АНАЛІТЫКА • КРЫТЫКА • ЭСЭІСТЫКА • **ЛІТАРАТУРА** • РЭЦЭНЗІІ

[image] [image] [image]

Аляксей Бацюкоў

Уся праўда пра горад Бобер Апавяданьне

АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ філёзаф, тэлежурналіст. Яго апошні крытычны аналіз у «ARCHE» меў назву «Як вы ставіцеся да крывавай Мэры?». Апавяданьне «Уся праўда пра горад Бобер» заснаванае на рэальных падзеях, адбытых на ўсходзе краіны.

2005-ты год, вясна, ціхмяны ўсходнебеларускі гарадок пад сінім-сінім не- бам, і – стрэл з «Вальтэра», кроў на драўлянай падлозе. Ад удару кулі цела ўздрыгвае ў крэсьле і мякка асядае. Аслабелая рука выпускае фатаздымкі. Агаломшаны хлапком ад стрэлу, я бачу гэта, яшчэ нічога не ўсьведамляючы, таму і дзірка ў кашулі, і кроў зь яе, і асяданьне забітага – у першыя імгненьні, не абцяжараныя ніякім сэнсам, падобныя да спэктаклю. Застаючыся недзе па-за сьвядомасьцю яшчэ сэкунду пасьля стрэлу, я азіраюся. Прабітае куляй акно трэснула павуцінкай, твар забойцы ня бачны. Толькі цяпер першыя кроплі крыві зрываюцца з набрынялага крэсла на падлогу. Спачатку цяжкія, густыя ўдары вільгаці аб дрэва, затым вільгаць люпае ў вільгаць. Цёмна-карычневыя пырскі прыцерушылі верхні фатаздымак.

Я паглядзеў спачатку на здымак. Затым на апэратара. Затым назад на картачку і толькі цяпер пачаў разумець усё няяснае, зашыфраванае дагэтуль. Вузел распусьціўся сам сабой амаль без майго ўдзелу, бо дзеля таго, каб разьвязаць яго раней, трэба было ня быць часткай гэтага вузла. А я быў.

Пачыналася ўсё досыць будзённа, наколькі будзённаю можа быць рэальнасьць тэлежурналіста. Выезд у далёкі, на мяжы з Расеяй гарадок. Наша задача – зьняць прызямленьне паветранага шара. Рэпартаж мусіць быць жалезна – пазыцыя рэдакцыі непахісная. У нас такога яшчэ не было. Два старыя бразыльцы паветрам перасякаюць Эўропу і не абмінаюць Беларусі. «Чаму менавіта ў Боберы яны сядуць?» – пытаюся начальніка аддзелу. Той адказвае шчыра і ёміста, але я ня ў моцы перадаць яго словы.

Акрамя пералётчыкаў, нам у плечы сунулі тэму «Вызваленьне Боберу ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў» для аналітычнай праграмы «Рэгіён». У ліхаманцы веснавых юбілейных сьвятаў ім трэ было забіць этэр ваеннай рубрыкай. Адказны рэдактар, прабягаючы паўзь мяне ў калідоры, паведаміў сутнасьць – успаміны вэтэранаў, даты і лічбы, ура-нашым-патэтыка. «Толькі пішы так, – дадаў ён мне потым, прабягаючы ў адваротны бок, – каб шэсьць-сем тэлегледачоў дзіка кончылі ад твайго рэпартажу».

У дарозе мне было даволі цяжка, увесь час пражыла піць і ніяк не маглося заснуць. На нейкі момант высьветлілася, што мы едзем ня той дарогай, бо праехалі гарады, зусім ня злучаныя міжсобку нашай шашой. Аднак нягледзячы на гэта, хутка нам сустрэўся ўказальнік «Бобер». У прыдарожнай краме я купіў кефіру. Беленькая старая прадавачка зрабіла цішэй магнітафон – шыпеньне заглынула «Модэрн Токінг» амаль па горла, – паказала на халадзільнік каля ўваходу. Яна прапанавала мне ўзяць пакет самому і прысела на крэсла за прылаўкам, адначасова выкручваючы Дытэра Болена на паверхню з бурбалак радыёстракаты.

На нашай «Волзе» на дзьвярах кіраўніцтва здагадалася вывесьці вялікія сінія літары «тэлеканал М-1». Так што пакуль я вяртаўся да машыны, побач зь ёй ужо чакаў мяне высокі бялявы мужчына ў пінжаку наверх на швэдрык. На другім баку дарогі стаяў яго службовы джып з танаваным шклом.

– Добры дзень! – першым пачаў я, разумеючы ўжо, што, як і паўсюль пры такіх сустрэчах на сяле, ён акажацца мясцовым начальнікам якога-небудзь упраўленьня і пачне распытваць,

што мы здымаем.

– Добры дзень, я начальнік упраўленьня ідэалёгіі райвыканкаму! – рука мяккая, а поціск усё роўна моцны. Я пастараўся сьціснуць далонь так, каб крыху храбуснулі касьцяшкі ягоных пальцаў. Размаўляў ён па-расейску, але з рэзкім акцэнтам задняпроўскіх беларусаў. Цьвёрды «ч», цьвёрды «г» і самы разнастайны «р».

– Слухаю вас.

Адразу пасьля стрэлу за павуціньнем расколін, я чамусьці нейкі час уяўляў сабе менавіта гэтага начальніка ўпраўленьня. Мая сьвядомасьць у тое імгненьне ўпершыню спрацавала на стрэл, і я думаў яшчэ не пра забойства і сьмерць, а жахаўся толькі, што ў момант нашай першай сустрэчы тут, каля крамы, ён ужо трымаў пісталет у бардачку машыны.

– Менавіта пра паветраны шар?

Цень тады яшчэ толькі-толькі напаўзаў на ягоны твар.

– Не. Яшчэ нам трэба зьняць рэпартаж пра вызваленьне вашага гораду. – Ён працягваў уважліва слухаць. – Ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Баі, апэрацыя па вызваленьні, успаміны вэтэранаў.

Вось цяпер цень напоўз увесь, але тады яшчэ досыць бяскрыўдны.

– Ведаеце што, – крыху ненатуральна засьмяяўся ён. – Тут ёсьць некаторыя праблемы. Я сам боберскі, адсюль перайшоў у раённае ўпраўленьне. Я мог бы дапамагчы адшукаць матэрыял і людзей. Ёсьць вэтэраны, яны заўсёды выступаюць у нас. Але вы разумееце, яны вельмі старыя людзі. Што яны вам скажуць? І яшчэ ў нас няма музэю.

– Нават пры школках?

– Гэта наша недапрацоўка, я разумею.

Хутка гэтая фраза стане ключавой у нашых адносінах. Аднак першым часам самае страшнае, у чым я падазраваў мясцовых краязнаўцаў – што прадалі ўсе нямецкія каскі і вэтэранскія ордэны калекцыянэрам у Маскву. Пытаюся:

– А дзе ў вас маглі б захавацца якія фатаздымкі?

– Я думаю, што знайду вам стары нумар раёнкі. І вэтэрана. Ён заўсёды выступае.

У гэтыя самыя хвіліны за фіранкай аднаго з дамоў насупраць крамы стаяў чалавек, сэрца і розум якога рыпелі ад сьмяротнай, затаптанай у дзесяцігодзьдзі пылу й сну, нуды. Ён узіраўся, мусіць, у адзін толькі надпіс на нашай машыне, ня бачачы больш нічога ў цэлым сусьвеце. Але гэта не сусьвет звузіўся, проста ў ім дадаўся новы элемэнт, настолькі вабны й навязьлівы, хлусьлівы й выкрывальны, скандальны й патэтычны, настолькі рэальны й ілюзорны, што чалавек зьнямеў і некалькі хвілінаў адно спрабаваў глыбока, зь сіпеньнем удыхаць у сябе смурод свайго старэчага жытла, пыл і водар гарбаты на стале. Пад скронямі біліся й лопаліся пухіры пачуцьцяў, увушшу то рваліся снарады, то падступала ціша, нібыта дзірка ў суквецьці ўсіх магчымых касьмічных гукаў. Прыкладна так стаяў гэты чалавек, пазіраючы на нашу машыну празь фіранку, чытаючы надпіс са студыйным нумарам. Толькі цераз некалькі хвілінаў ягоная рука, яшчэ дрогкая ад усіх думак, ад апошняга двубою рашучасьці й страху, намацае тэлефон.

У той час, калі тэлефонны сыгнал пабяжыць па дратах над нашымі галовамі, на цэнтральную боберскую падстанцыю, затым, па магістральнай лініі, у абласны цэнтар, наша апэратарская група, кіруючы за джыпам галоўнага раённага ідэоляга, рушыла на другі канец гораду. Там, у паўзе перад прылётам паветранага шару мы запішам інтэрвію вэтэрана, «які заўсёды выступае».

Ну, тут, на другім канцы гораду мы з сваім інтэрвію сталі міжвольнымі ўдзельнікамі аднаго з эпізодаў глыбокай чалавечай трагедыі. Скручаная ў вузел праўда вырывалася праз вочы, праз асяданьне голасу, праз правалы ў памяці й

блытаніну ў словах, праз рухі, паварот галавы, праз саму постаць гэтага галоўнага героя трагедыі, але мы не заўважылі трагедыі і тут, бо галоўны герой быў і галоўным акторам, і галоўным гледачом, і галоўным рэжысэрам, а больш у цесны змрок ягонай сцэны ніколі не пранікаў ніхто. Вэтэрана, у якога мы бралі інтэрвію, мы з апэратарам Толем першым часам палічылі за старога маразматыка. Ужо ў машыне, па вяртаньні з дому вэтэрана, Толя загуў: «Ну, мляха, ну, яго маць», – ад бясьсільнай злобы пасьля гэткага нечаканага ступару суразмоўцы. Цяпер толькі я ўсьведамляю, з чым канкрэтна мы сутыкнуліся тады, і тое павярхоўна. А калі ўлічыць яшчэ каханьне? Усё ішло супраць нас – падумаў я сьпярша, вось у мяне й выйшла найгоршае інтэрвію за ўсю працу на тэлебачаньні. Па-першае, замінала прысутнасьць ідэоляга – яго, дарэчы, звалі Юр'ем Аляксандравічам Лісіцыным. Па-другое, супраць нас была ўся атмасфэра сустрэчы ад пачатку да канца.

Ідэоляг першым прайшоў на двор, спыніўся ў калідорчыку паміж двума рэдзенькімі платамі, што вёў да дзьвярэй. Вецер дзьмуў цёплы, нічога дзіўнага, што дзьверы былі расхінутымі. Уткнуўшы рукамі ў бакі, Лісіцын паволі азірнуў гаспадарку. Гародзік вэтэрана шырокай падковай ахінаў дом з хляўкамі. Справа, у цяньку пад голымі яшчэ яблынямі завіхалася жанчына. Лісіцын ня клікаў яе, пачакаў, пакуль яна заўважыць нас, падымецца ў поўны рост. Стоячы ззаду за ідэолягам, я заўважыў толькі, як ён лёгка павёў галавой, варухнуўшы губамі. Жанчына так жа лёгка, нават грэбліва кіўнула ўбок, і зноўку апусьцілася на кукішкі. Ідэоляг перавёў позірк у кірунку, паказаным жанчынай, і заўважыў каля сьцяны хляўка, на лаўцы, ссутуленага старога. Сьціснуўшы калені, той падносіў да раскрытага ззаду будзільніка адвёртку і нешта слабенька пакручваў.

– Барыс Пятровіч! – гучна паклікаў Лісіцын і адразу дадаў нам цераз плячо: – Глухаваты. Інтэрвію трэба даць!

Ідэоляг паказаў пальцам на нас, узяў у мяне з рукі мікрафон і патрос ім у паветры. Моўчкі, не зьмяніўшы выразу твару, Барыс Пятровіч кіўнуў. Не чакаючы ад яго іншых рэакцыяў, Лісіцын першым пайшоў у хату. Слухаючы, як ён тупае па пакоях, мы

чакалі дзеда на ўваходзе. Барыс Пятровіч паявіўся хутка, абцёр рукі аб штаны і прайшоў міма нас.

– Добры дзень! – пракрычалі мы з Толем яму над вухам.

Дзед крыху прысеў, азірнуўся на нас і кіўнуў у адказ. У залі нас ужо чакаў Лісіцын, закінуўшы нагу за нагу, разглядаючы бліскучы насок свайго правага чаравіка. Толя скамандаваў, каму дзе сесьці, я прымусіў вэтэрана адшукаць у шафе кіцель з мэдалямі. Мэдалі былі адно юбілейныя, ордэн Айчыннай вайны другой ступені на правым баку кіцеля з усіх бакоў абступілі значкі ўдарніка сацыялістычнай працы, ГТО і 250-годзьдзя райцэнтру.

– Назавіце, калі ласка, сваё імя і прозьвішча!

Зноўку крыху спалохана скрывіўшыся, вэтэран спакойна адазваўся Барысом Пятровічам Карацеевым. Пытаньні на трэцім я зразумеў, што чуе ён цудоўна для старога, а глухаватасьць у яго, хутчэй, абарона ад навакольля.

– Я быў прызваны на фронт увосень 44-га году, вадзіцелем у мэхчасьць 602-га гаўбічнага артылерыйскага палка 172-й стралковай дывізіі.

– А калі быў вызвалены ваш горад? – я азірнуўся на Лісіцына.

Той уважліва паглядзеў на мяне і на старога, чакаючы, што адкажа ён. Стары маўчаў, Лісіцын нарэшце выдаў:

– 23 чэрвеня 44-га году.

– Ага, – я мякка, каб не спалохаць дзеда рэзкімі рухамі, выкрасьліў з блякнота фразу «ўдзельнік вызваленьня». – Вы прызываліся адсюль?

– Не, з сваёй вёскі, я нарадзіўся пад Смаленскам. А сюды прыехаў у 58-м годзе, калі ажаніўся з сваёй… жонкай – апошняе слова ён вымавіў неяк няўклюдна.

– Дык вы не былі сьведкам вызваленьня гораду?

– Не, ня быў. Я ваяваў на Прыбалтыйскім фронце, мы вызвалялі Кёнігсбэрг.

– Добра, значыць, можа, раскажыце, што расказвалі вам тутэйшыя жыхары пра вызваленьне гораду?

Пакуты пачаліся адсюль. Марнуючы стужку і дзедавы нэрвы, я выпытваў у яго, як тут што было ў час вызваленьня. Дзед адказваў гучна і блытана, раптоўна змаўкаючы, пераходзячы на лірыку, але шторазу – выключна сьвядома. Лісіцын нечакана спыняў яго: «Раскажыце, як вы юшку варылі». «Пры чым тут ён? – вырвалася ў Толі. – Мы пра горад здымаем».

– Ну хоць штосьці вам вядома пра баі за Бобер, пра вызваленьне?! – нечакана ўзгадваў я пра ягоную глухату і крычаў зноў.

– Да, эта былі шэсьцьдзесят вялікіх лет, – згаджаўся з сабой Барыс Пятровіч.

– Можа, мы возьмем інтэрвію ў вашай жонкі?

Лісіцын абыякава хітае галавой. Дзед паціскае плячмі.

– Яна нічога ня памятае, ёй было гады тры. Я старэйшы за яе.

Беручы на сябе гэтую дробную хлусьню, ён, па сутнасьці, абараняў яе ад таго, на што з такім болем ішоў сам. Магчыма, яна не адчувала б тых жа эмоцыяў, як ён, але гэтага не разумеў ён. Пакутуючы, ён не разумеў, як можна не пакутаваць.

З вэтэрана нарэшце вырвалася абстрактная і зручная фраза: нам было цяжка ўсе тры першыя гады вайны, але немцам у 44-м стала цяжка ўтрая.

– Што ён табе расказаў? Ну што ён табе такога расказаў? – празь дзесяць хвілінаў крычаў на мяне ў машыне Толя, плюючыся ад злосьці.

– Тое, што расказвае заўсёды, – вочы старога дакрычаліся тады да мяне, я не злаваўся на яго, як Толя, а неяк неўсьвядомлена яшчэ шкадаваў.

– Ну, ты хоць бы спытаў штосьці такое, ну я ня ведаю!

Падчас усяго нашага інтэрвію на мой мабільны тэлефон ірваўся іншы крык адной асьмялелай душы. Ужо калі працавала камэра, тэлефон зьвягнуў першы раз. Барыс Пятровіч спыніўся, я похапкам скінуў званок і адключыў трубку. Хвілін дзесяць пасьля гэтага, сэкунда за сэкундай, званкі разьбіваліся аб маўчаньне. Стомленая старая рука ў доме насупраць крамы адпускала дыск і зноўку ўгрызалася ў яго, як толькі з трубкі грала гітара – прабачце, абанэнт часова недасягальны. Нарэшце чалавек за фіранкай адклаў апарат на крэсла, абняў спатнелы лоб далоньмі.

Паветра зноўку не хапала. Каб разарваць смурод рэчаіснасьці, ён у першы раз дастаў фатаздымкі. Ад чорна-белых, дакладней, ад картак, пакрытых усімі пераходамі карычневага ў жоўты, жоўклы – палілося лета 1944-га. Квецень, музыка, крокі, далёкая кананада, водар травы і крыху яшчэ халоднай зямлі. Як моцна хацелася выжыць! Як моцна хацелася жыць! Гэтымі словамі ён сустрэне мяне потым, за некалькі хвілінаў да сьмерці. Проста так, прахрыпіць некуды ўніз, ведучы ў пакой. Апраўдваючыся і апраўдваючы.

На двары, пасьля інтэрвію з вэтэранам, я прыціснуў Лісіцына да сьцяны. Знайдзіце мне старажыла, яшчэ якога вэтэрана. Цяпер. Лісіцын зноўку прамармытаў пра стары нумар раёнкі і нагадаў, што мы павінны сустрэць паветраны шар.

– Заўважце, якім блакітным ёсьць неба, – заўважыў Лісіцын на пасадачным полі праз паўгадзіны.

Гэтым разам у яго вельмі ўдала выйшла па-беларуску, а ад аднаго толькі «ёсьць» хацелася прымружыцца ў асалодзе.

Мы стаялі ўтрох, Толя праціраў аб'ектыў камэры. Машыны засталіся на краі поля, там жа ў засені дрэваў сядзелі школьнікі і некалькі чыноўнікаў. Да мяне не адразу дайшлі ягоныя словы, я ўсё пракручваў «рамштайнаўскае» «Ду, ду хаст міх» – яно раўло ад суседзяў вэтэрана на ўсю вуліцу. У адчыненым акне суседзяў паблісквалі высокія калёнкі, а побач

жанчына гадоў сарака палівала кветкі і хістала галавой у такт музыкі. На словы Лісіцына я міжволі адказаў Гайдэгерам:

– Сапраўды, Himmel ist blau. Blauhimmel тут не падыходзіць. Нават мы з вамі залежым ад гэтага неба і ад таго, што яно блакітнае. Яно для нас ёсьць.

– Вы вучылі нямецкую мову?

– Не, ангельскую. І філязофію.

Пастаяўшы хвілінаў пяць, аглядзеўшы магчымыя ракурсы, я пайшоў назад у машыну.

У гэты самы час стары чалавек з фатаздымкамі нарэшце закрываў сваю каробку назад у шафу. Ён хацеў толькі знайсьці іх, каб потым не шукаць, а адарваўся ад здымкаў хіба праз гадзіну. Ён хацеў толькі *яшчэ раз* іх знайсьці, бо апошнім часам не праходзіла дня, каб ён не раскрываў гэтай каробкі зноў і зноў. Вечарам, часьцей за ўсё вечарам. Так было не заўсёды, і нават не адразу пасьля сьмерці жонкі. Проста пры ёй ён бы ніколі іх не дастаў, і нават не прызнаўся б, што яны ёсьць. І што маглі б быць.

Хаваючы каробку ў шафу, ён ужо без былога энтузіязму яшчэ раз пазваніў мне, пасьля першых акордаў гітары кінуў слухаўку.

Валяючыся ў машыне, высунуўшы нагу ў раскрытую дзьверку, я выпадкам намацаў рукой тэлефон у кішэні і ўключыў.

За хмызамі, кроках у дзесяці ад нас адзін з чыноўнікаў ціха і пагрозьліва нешта загергетаў на школьнікаў. Яны яму крыкнулі ў адказ штосьці пра рускіх і засьмяяліся. З-за хмызоў паявіліся два твары мужчынаў у гадах, на выгляд дырэктары мясцовых школаў. Краем вока я заўважыў, як адзін зь іх папіхнуў яшчэ дваіх чыноўнікаў, якія ляжалі на траве побач і ціха апавядалі адзін адному пра сябе.

Спачатку мне падалося, што гэта сонца зайшло за неспадзяваную хмару, аднак тут жа закрычалі дзеці, а з поля

мне засьвістаў Толя. Наш кіроўца Міша падскочыў у сваім крэсьле і прыліп да лабавога шкла: «Да-а-а! Нішто сабе штуковіна!»

Агромністая паласатая кропля праплыла над полем, скінутая з каша вяроўка крыху не дасягала зямлі. Адзін з чыноўнікаў, сярэдняга ўзросту пузан у касьцюме, першым дабег да яе, ускрыкнуў, падскочыў і завіс. Тут жа вяроўку падхапілі другія, трэція рукі.

Пакуль шар асядаў на траву, з валтузьнёй, крыкамі, школьнікі выстраіліся роўненькай лінейкай зьлева ад нашай камэры, збоку ад іх сталі дзяўчаты з кветкамі і незанятыя вяроўкай чыноўнікі.

У кашы сядзелі двое, старая сямейная пара. Я ведаў, што гэта пэнсіянэры, вандроўнікі з Канады. Іхны пералёт Райн–Волга ні да чога не прымяркоўваўся і павінен быў толькі засьведчыць маладосьць душаў.

Пасьля сустрэчы вандроўнікаў, як мы і дамовіліся, Лісіцын павёз нас да сябе дахаты паказаць старыя газэты. Канадзкіх пэнсіянэраў у гэты час павінны былі накарміць і прывесьці ў клюб.

Газэта, якую вынес нам Лісіцын, была выпушчаная яшчэ да трыццацігодзьдзя Перамогі. «Чырвоная зара над Проняй», друкаваны орган райкаму партыі. Партрэт Брэжнева на першай старонцы, зьлева і зьверху – адносна невялікі, хоць пад ім заставалася багата месца. Як я ведаў, у рэдакцыях быў адмысловы загад, каб партрэт Брэжнева не ламаўся выгінам газэты. Артыкул «Як вызвалялі Бобер» завяршаў нумар. Я коратка прабег палосы вачмі. Тут жа разанула – успаміны Барыса Пятровіча Карацеева, вэтэрана. Чорт ведае што такое. «Мы гналі іх і гналі на Захад!» Піянэры заўсёды з удзячнасьцю слухаюць вэтэрана. Затым узгадвае настаўнік нямецкай мовы Боберскай школы. «Бой за горад быў вельмі імклівы, нямецка-фашысцкія захопнікі не пасьпелі арганізаваць доўгатэрміновай абароны, пагэтаму горад не падвяргаўся бамбардзіроўкам і захаваў свае даваенныя помнікі архітэктуры, напрыклад,

будынак школы-васьмілеткі».

Фатаздымак на гэтай жа паласе падаўся мне знаёмым – Т-34 з салдатамі на брані. Такі вісеў у абласным музэі, мы амаль на кожны ваенны рэпартаж давалі яго.

Пакуль Толя прыстройваў газэціну на капот машыны, каб зьняць, я адышоў убок, адказваючы на нечаканы тэлефонны званок. Тады, напэўна, Лісіцын і пачуў мой ускрык – «фатаздымкі?»

Сьпешна разьвітваемся з ідэолягам, у машыне крычу «А-га-га! Будзе матэрыял! Толькі што дазваніўся адзін дзед, знайшоў нас цераз абласную студыю. У яго захаваліся ваенныя фатаздымкі. Абяцаў шмат расказаць».

Далёка пасьля стрэлу, мы з Толем глуха звалiліся на падлогу. Рука адчула вільгаць, адпаўзла ад крэсла. Напэўна, ад нашага руху цела дзеда асела зноў і нарэшце папаўзло, нахілілася, і, падаючы галавой уніз, накрыла Толевы ногі. Я інстынктыўна згроб фатаздымкі сабе пад грудзі, задам адпаўзаючы пад ложак ля акна. Толя вытаргнуў ногі з-пад цела і маланкай кінуўся пад стол. У гэтае імгненьне зь дзедавага пінжака нешта грукнула аб падлогу, і з-пад ягоных грудзей бліснула рукаятка пісталету. Страсаючы кроў з картачак, я выцягнуў нагу і паспрабаваў дастаць яго, вылаяўся, дастаў рукой. Мэтал быў цёплы, пісталет прыемна адцягнуў руку. Крутануўшыся на сьпіну, падпоўз пад самае акно.

Тым часам Толя запікаў тэлефонам. Гаварыў, прыкрываючы трубку рукой.

– Алё, міліцыя, тут чалавека забілі! Так, мы сьведкі! Які адрас? – ён азірнуўся на мяне. Я павёў плячыма. – Насупраць прадуктовага магазыну, як заяжджаеш у горад. Як яго звалі? – зноўку да мяне. Я асьцярожна ўспаўзаў па сьцене. Справа была прабітая шыба, зьлева цэлая. Я пакруціў галавой. – Мы не пасьпелі спытацца. Ён стары фатограф. А, вы яго ведаеце?

У левым акне хісталася гольле, крыху жартаўліва

прыцярушанае першым лісьцем. Далей плот, сьляды ботаў на кветніку. Магчыма, угледзеўшыся, я пабачыў бы і гільзу.

– Яны зараз прыедуць, – Толя ўжо расслаблена ляжаў, абапіраючыся на адзін локаць.

Я ня мог яму адказаць нічога, бо ў маёй галаве ў гэты час разрываліся некалькі выбухаў, гэта ўсё адно, як даведацца што ваша жонка была зь іншым, гэта складаецца з тысячы дробязяў, і вы ўжо зьлёгку ўсё ведаеце, да ўсяго гатовыя, але раптам вы застаяце іх разам, і тады вы пэўны час глядзіце на гэта ўсё, а галава міжволі пракручвае: ага, у той вечар яна паехала нібыта на рынак, але нічога не купіла і ні на што не папрасіла грошай. А ў гэты вечар у госьці да мамы яна надушылася, а мне яшчэ стала так прыемна ад яе водару. Гледзячы ў акно я пераживаў нешта падобнае, і як падманутый муж, абвінавачваў яшчэ і сябе. Так захапіўшыся тэмай вызваленьня Боберу, я прапусьціў асноўнае. Я нават гатовы ўжо быў сам апавесьці тому вэтэрану, як вызвалялі Бобер. Напэўна, бачачы выраз майго твару і як бязвольна апусьцілася мая рука зь пісталетам, Толя зусім спакойна ўстаў і таксама паглядзеў у акно.

Дзесьці праз хвіліну я адышоў і стаў зьбіраць з падлогі фатаздымкі. У вушах зноўку загучалі дзедавы словы. «Я быў зь беларусаў, немцы не трымалі нас за людзей, аднак мая прафэсія ім падабалася, пагэтаму ў сваю эвакуацыю, як яны называлі, яны чамусьці ўзялі і мяне. Гэта потым там паявіліся іншыя нашы людзі, пасьля вайны. Вось той жа вэтэран закахаўся, вы ўжо сустракаліся зь ім? Ён тут як блазан. А сказаць нічога ня можа. Адчувае сам усё, зразумеў сытуацыю ён яшчэ гадах у шэсьцьдзясятых. І ўцякаў, і піў, потым прыпаўзаў да яе, сам бачыў, не магу, кажа, ты мая душа».

– Яны што, нашага Колю ўзялі?

Якія мэханізмы круціліся цяпер у Толевай галаве, я магу адно здагадвацца, аднак, пабачыўшы тое, што бачыў я, ён заўважыў толькі Колю з рукамі за галавой, схіленага і ўткнутага лбом у дзьверцы машыны.

Гэты фатаздымак, зь якога дзед меркаваў пачаць свой расказ,

найбольш адліваў бісэрам чырвоных кропляў.

– Толя, нам пі..а, – ціха сказаў я. – У мяне пісталет ёсьць, а ты сабе шукай.

Якім прыгожым здаўся мне Бобер, і як прадказальна я адчуў яго чужым! «Вы заўважылі наш магістрат? – не ўтрымаўся тады, на полі падчас сустрэчы вандроўнікаў, ідэоляг. – Гэта наш самы прыгожы будынак». Ён не дадаў толькі, хто быў у гэтым магістраце бурмістрам. А гэтае «неба ёсьць блакітным»?! А я яшчэ спачатку падумаў, што ён проста па-беларуску няверна падбірае словы! А дзядзькі, што не-не дый гаварылі самі сабе?!

Міліцэйскі козьлік віскнуў каля магазыну. Двое ў бронекамізэльках і з тупа абрэзанымі аўтаматамі падышлі да мужчыны з аўтаматам. Яшчэ некалькі чалавек у цывільным залеглі праз кожныя дваццаць крокаў, я бачыў, як з-за дрэваў ці бардзюру тырчаць іх бялявыя чубы і енчаць па зямлі ногі. Чалавек, які трымаў на мушцы нашага кіроўцу Колю, ня быў бачны адсюль, але можна было назіраць, як перамінаецца з нагі на нагу ягоны цень.

Мужчына з аўтаматам завёў міліцыянэраў за іх машыну, прыгнуўся сам, каб не тырчэла галава, і нешта коратка расказаў. Міліцыянэры паківалі галовамі, паглядзелі ў наш бок праз шкло сваёй машыны.

Расказваючы мне пра вызваленьне Боберу, Лісіцын вельмі неакуратна карыстаўся лічбамі. Пра тое, што наша 173-я дывізія яшчэ летам 1941-га ўся лягла на Мсьціслаўшчыне, я ведаў даўно. Спачатку гэта выглядала звычайнай неадукаванасьцю. А вось дата 30 сакавіка 1944-га – нібыта ў гэты дзень актывізаваліся падпольшчыкі, каб дапамагчы вызваліцелям – ужо насьцярожыла. Бобер, горад адразу за Проняй, уваходзіў у трыццацікілямэтровую паласу поўнага высяленьня карэнных жыхароў падчас зацішша на франтах паміж восеньню 1943-га і летам 1944-га.

Адскочыўшы ад сьцяны, я выцягнуў пісталет і знайшоў у пляшцы рулі адзіную гарызанталь зь цёмнай плямай за акном. Н-на! Дзед нават загадзя зьняў яго з засьцерагальніка, ясна ж,

ведаў, чым рызыкуе з сваім інтэрвію.

Пісталет кульнуўся тройчы, пасьля трэцяга стрэлу я паваліўся на падлогу і зноўку адкаціўся да сьцяны. Толя ў гэты час хаваўся за шафай.

Некалькі стрэлаў з вуліцы, у адным месцы куля прашыла сьцяну і ўпілася ў самы кут печы.

Загаварыў мэгафон. Пракашляўшыся, чалавек заявіў:

– Эй, вы, рускія, перастаньце супраціўляцца альбо будзеце забітыя.

Нашы не здаюцца. Гэта раптам сказаў Толя, у ім прачнулася нарэшце злосьць. Я крыкнуў, што мы ня рускія, і яшчэ раз стрэліў у акно, наўздагад.

– У іх наш Коля.

Я цяпер толькі заўважыў, што Толік знайшоў у шафе паляўнічае ружжо, а пад яго нагамі ляжала каробка з патронамі.

– За мной.

Мы праскочылі ў іншы пакой на сэкунду раней, чым закашляў кулямёт. З стала побач рыкашэтам падняло нейкі лісток. Ён трапятнуўся і сплыў на падлогу. Яны пастрэльваюць увесь дом – мільганула ў галаве. Толя зразумеў гэта таксама і трымаўся печы, пакуль я хапаў з-за стала крэсла і кідаў ім у шыбу. Гэтае акно выходзіла ў сад. Рама зьехала вонкі разам зь фіранкамі. Далёка зьлева ў садзе мільганулі два сылюэты.

Толя выскачыў першы, рыбкай нырнуўшы ў акно. Прыкрываючы яго, я спачатку сунуўся пісталетам, потым кульнуўся ўніз. Той чалавек, які павінен быў нас забіць, сядзеў за смародай. Я не заўважыў тады нават яго постаці. Шэрае на шэрым, ён глядзеў на нас бясколернымі вачыма, – чалавек, якому даверылі прыкрыць задняе акно. Праважаючы нас позіркам, ён мякка вёў пальцам па спускавым кручку сваёй вінтоўкі і нясьпешна жаваў губамі запалку. Вінтоўка не

пусьціла. Потым Лісіцын раскажа мне пра яго.

Страляем па сылюэтах. Сад завяршаецца ярком. Зьбіваючы ногі, ляцім уніз. Хмызы прыкрываюць нас уздоўж усяго пагорку. Імчымся, не разьбіраючы бадай нічога, проста там, наперадзе, канчаюцца дамы. Стрэлаў ззаду больш не чуваць, за хрыпам у грудзях не чуваць крыкаў.

– Толя, яны немцы. Яны ўсе немцы, – крычу яму ў вуха, а ён думае, што я хачу зачапіцца за яго, каб лягчэй было бегчы, і адпіхвае. – Іх ніхто не вызваляў, іх не вызвалілі. Яны немцы, Толя!

Яр расплываецца ў бакі, мы ўжо бяжым ускрайкам поля, і раптам наперадзе, блізу купінкі дрэў я бачу людзей.

– Хутчэй!

Толя таксама заўважае паветраны шар і паддае хады. Нарэшце, азіраючыся, знаходжу вачыма тых са зброяй. Некалькі чалавек толькі цяпер зьбягалі з пагорку.

Дзеці, настаўніцы, некалькі чыноўнікаў. Кветкі ў руках старой вандроўніцы. Яшчэ бачачы нас здалёк, уся разьвітальная працэсія нямее, нарэшце жанчыны пачынаюць хаваць за сабой дзяцей і ўцякаць за дрэвы. Старыя вандроўнікі, заўважыўшы ў Толевых руках ружжо, а ў маіх пісталет, дапамагаючы адно аднаму, пакараскаліся ў кош. Нам было да іх мэтраў дваццаць, але ніхто з чыноўнікаў не застаўся каля шара, і ён так і боўтаўся, прывязаны вяроўкамі.

– Ноў, ноў! – старыя махалі рукамі, пакуль мы ўзлазілі да іх.

– Донт ворі! Фрэндшып! – хрыпеў Толя, адбіваючыся ад бабулькі, што ўчапілася ў мяне.

Стрэліўшы па даганятых, я змусіў іх легчы. У адказ яны не стралялі, аднак надзіва жвава паўзьлі.

Канаты мацавалі кош з трох бакоў, і якраз у пісталеце мусіла застацца тры патроны.

Куды мяне і як яны ўкалолі, я ня памятаю і ня ведаю. Памятаю толькі, як прачнуўся ў боберскай паліклініцы. Зрэшты, гэтае абуджэньне яшчэ з гадзіну здавалася працягам палёту, а белая столя – палонам хмар.

Другі раз мяне абудзіў Лісіцын. Ён сказаў, што мы можам ні за што не хвалявацца, ён дамовіўся з сваімі, нас выпусьцяць з гораду. Я рвануўся з ложку, але толькі абадраў плячо аб рэмень.

Нараніцу мы зь ім, з Толем і Міколам сядзелі ў рэстаране адны. Жанчына за барнай стойкай, хударлявая вастратварая бляндынка несупынна назірала за кожным нашым рухам. Толя курыў, не падымаючы вачэй. Мікола непрыемна выскаляўся, але маўчаў. Я слухаў.

– Гэта было ў 43-м. Бобер быў адзіным горадам, які трапіў у зону адсяленьня. Дакладней, нават, ня горадам. І тады, і цяпер – да тысячы чалавек. Калі штаб дванаццатай спэцчасьці SS прыбыў, усе дамы былі пустымі. Толькі пасьля вайны самы старшы з афіцэраў, маёр Дорндарф распарадзіўся знайсьці карэнных жыхароў, і пошукавы атрад знайшоў брацкую магілу. Гэта пастараліся ваякі. Рэгулярныя часьці арміі ляглі летам 44-га на берагох Проні, і шлях на горад аказаўся свабодным. У Боберы на той час жылі толькі некалькі дзясяткаў афіцэраў, большасьць зь сем'ямі. Прадбачачы канец вайны, да іх з радзімы прыяжджалі жонкі, некаторыя нават зь дзецьмі. У спэцчасьці заўсёды быў адметны дух, расказваў мне дзед, – душачы цыгарэту, уздыхнуў Лісіцын. – Ён быў фэльчарам. Фуш, Карл Фуш. Адсюль і Лісіцын. Пасьля пасьпяховай атакі воіны Чырвонай Арміі без адзінага стрэлу ўвайшлі ў горад. На загад Дорндарфа ім кідалі кветкі. Дзяўчаты, якія збольшага ведалі па-беларуску, дзякавалі. А на галоўнай плошчы рускія знайшлі цыстэрну са сьпіртам. Цераз два дні фронт быў ужо на Дняпры, ім прыйшлося даганяць сваіх, асабліва не азіраючыся на тое, што яны пакінулі за сьпінай.

Ён узяў у рукі адзін фатаздымак.

– Тут якраз сустрэча рускіх. Бачыце, на заднім пляне, у

дзьвярах дому Дорндарф. Ён настолькі добра ўсё разьлічыў і быў упэўнены, што ня зьняў формы. Пасьля якога здымку вы ўсё зразумелі?

Я моўчкі выбраў той, з крывёй.

– А, тут ужо 48-мы год. Дорндарф нарэшце паставіў мясцовае начальства перад фактам. Ня ўсіх, двух-трох чалавек. Як я вас цяпер. Пагадненьне было больш чым міравым. Нам пакінулі права проста жыць, а большага мы не жадалі. Дорндарф тут, бачыце, яшчэ ў фуражцы. Вось гэты савецкі афіцэр потым забярэ ўсю форму войскаў SS у нашых салдатаў і сам уласна спаліць. Чаму Віктару Майсееву дазволілі здымаць і гэта, я не магу і здагадвацца.

Пасьля задушлівай, гнятлівай паўзы ён закурыў ізноў, і гэта быў ужо наступны пачак цыгарэт.

– Вядома ж, вам цяжка гэта ўсё ўявіць. Для вас вайна праходзіла па адной схеме. А вось давайце падумаем, цяпер вы ўсім усё расказваеце. Людзі даведваюцца праўду. Што зробяць з намі? Тых вэтэранаў, хто ваяваў, у нас ужо сапраўды амаль няма. Я не пра таго, беларуса. Ён няшчасны чалавек. Ваяваць і пражыць шэсьцьдзесят гадоў сярод немцаў. Я пра нашых. Іх засталося ўсяго чацьвёра, з Майсеевым было пяцёра. Ніхто ня можа папракнуць, што мы забыліся пра іх. – Тут ён своечасова спыніўся. – Паверце, паступова межы паміж намі і вамі размываюцца. У нас амаль ніхто зь дзяцей не размаўляе міжсобку па-нямецку. Зрэшты, гэта мы іх прывучылі, каб не выдзяляліся, і каб у санаторыі можна было адпраўляць. Яны любяць расейскую папсу. Яны людзі іншага пакаленьня, і магчыма, яшчэ праз шэсьцьдзесят гадоў ніхто ня ўспомніць ні пра тое, што быў Дорндарф, ні пра тое, хто мы ёсьць.

Нарэшце ўступіў Толя.

– Вы стралялі па нас.

– Толькі пасьля вас.

– Вы забілі гэтага дзеда, Майсеева. Хто за гэта адкажа?

– Вы ня ведаеце, але падчас перастрэлкі з вамі быў сьмяротна паранены адзін з нашых. А з Майсеевым мне сапраўды шкада. Я любіў яго, ён яшчэ ў дзяцінстве вучыў мяне здымаць. І цяпер мы шмат размаўлялі зь ім. Да вас. А вы прыехалі, ня вытрымаў дзед, сарваўся. Што мы па вас стралялі, вы маеце рацыю. Лішне было. Але сярод нас ёсьць розныя людзі, ёсьць агрэсіўныя, у іх рукі чэшуцца паўтарыць дзедаўскія баталіі. Мне цяжка было спыніць іх.

– Скажыце, – я адсунуў фатаздымкі ад сябе, – гэтыя бабуля з дзядулем, хто яны?

Тут Лісіцын засьмяяўся зь яўным гонарам.

– Пляменьнік Дорндарфа і ягоная жонка. Пасьля акупацыі Ўсходняй Германіі рускімі ўцяклі на амэрыканскі кантынэнт. Сувязь аднавілі ўжо мы зь імі, у васьмідзясятыя. І не хвалюйцеся, яны ўсыпілі вас абсалютна бясшкодным прэпаратам.

Па дарозе назад мы маўчалі. Я лёг, зрабіў выгляд, што сплю. Толя піў піва.

На касэце, якую нам вярнулі, усё пасьля паветранага шару было сьцёрта. Таму рэпартаж пра вызваленьне Боберу прыйшлося перакрываць адной хронікай. У канцы я паставіў сынхрон вэтэрана пра тое, як, калі і каму было цяжка. Напісаць пасьпеў да суботы, якраз праз два дні выйшаў сюжэт. Назаўтра мне пазваніў Лісіцын. Падзякаваў, папрасіў перапісаць сюжэт на касэту. Ім спатрэбіцца, у наступным годзе яны зьбіраюцца зрабіць музэй.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 5 (39) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/12

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (39) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image][image]2005

да Зміцера Санюты

паэзія • аналітыка • крытыка • эсэістыка • **літаратура** • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Андрэй Хадановіч Папрыка зорак Новыя вершы

АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ паэт. Сёлета ў выдавецтве «Логвінаў» выйшаў яго чарговы зборнік «Землякі, або Беларускія лімэрыкі».

НА ДАРОЗЕ

па пояс у джынсах брыдзеш супраць плыні шашы
твае непужаныя думкі як іншаходцы ў прэрыі
і стэрэа-скавышы як госьці на сьвяце душы
новаю аранжыроўкай гудуць у плэеры

аблокі ўгары няспынныя як аўто
між пятым і трыццаць пятым агораным кілямэтрам
ня спыніш нікога й цябе ня спыніць ніхто
і першы сустрэчны акажацца проста ветрам

будуеш замкі з паветра і першы блін
выходзіць нечым сярэднім між бібліятэкай і вежай
на гэтым сьвеце так многа кніг і цаглін
а ты з усіх акадэмій ня скончыў нават мядзьведжай

і можна згубіцца ў трох дарожных слупох
і ў думках так ціха – чуваць як робіцца муха
сланом і ты так доўга ў дарозе што Бог

здаецца сузор'ем Вялікага Віні-Пуха

ПАПРЫКА ЗОРАК

згубіўшыся ў небе робіш памылку зрокавую
бо цяжка кожную ноч на яе дзівіцца
красуня мае хваробу на шчасьце зоркавую
на подыюме нябёсаў адзетая ў мілавіцу

блукаючы ў тропіках ракаў нябёсны экватар
з бляшанкаю miller*'а перасякаеш бамжом*
і два сузор'і вялікі й малы экскаватар
на знак старога знаёмства матляюць табе каўшом

сатурн баскетбольным мячом спыняецца ў кошыку
і пляскаеш у далоні яму з паддашша
стаміліся вочы ды не спыняюцца ў пошуку
калі ж над зямлёю ўзыдзе й загляне і ў наша

аконца як орган зроку
ды сьлёзы з органа
у папрыцы зорак замнога зямнога перцу
і ты вандруеш па сьвеце з дакладнай мапаю зорнага
неба і бачыш вэнэру няўзброеным сэрцам

ДОЖДЖ ЗАПОЙ І ВЯСЁЛКА

хмарная хмарнасьць падводнае шоў
на глыбіні беспрабуднай вады
не прасыхаць ад сэрыйных даждджоў
што недарэчна прыйшлі ў гарады

ранішні чад нібы возера чад
тым хто з учора яшчэ не прасох
сьвята даждджынак вільготных дзяўчат
што заблукалі ў тваіх валасох

выйсьці за дзьверы на бераг дажджу
быць на мяжы й перакрочыць мяжу
у вэртыкальную скочыць раку
плыць на баку й быць на ейным баку

нешта ўгары працякае па швах
справы тапельцаў зрабіліся швах
бо ўсё ніжэй апускаецца дно
і берагоў не відно ўжо даўно

колькі гадзінаў наўрад ці скажу
недзе палова – палова дажджу
ды на прыборы ад фірмы «Прамень»
блісьне агнём аднайменны прамень

зыркімі кроплямі сьвеціцца шкло
нібы на хвілю акно ажыло
вадкая плынь каляровага шкла
перацякла ў семісьвечнік сьвятла

* * *

невядомыя кветкі паўзуць на сьвятло з вазоніка
зеляніны ўсё болей – болей чым на даляры
безьбілетны спутник земли *пералётнае сонейка*
робіць кола па небе і сядае на твае акуляры

матылёк на далоні як сэрца б'ецца бяз допінгу
па-пластунску ў атаку вусень паўзе па камлі
і вясна распранае зямлю да зялёнага топіка
і цікаўным відаць аголены пуп зямлі

* * *

ты ведаеш хто такія боб дылан і дылан томас
я ведаю толькі тое што я твой верны фанат

што я – калі я з табою – бываю ручны як тормаз
а ты са мною – самай ручною з усіх на сьвеце гранат

што я з табою маленькі і голы нырэц з абтоку шры-ланка
калі ты здымаеш нумар і майткі хоць я далёка ня бог
маланка тваёй сукенкі нібы шаравая маланка
б'е электрычным токам па пальцах і па зубох

што мы зьбіраемся пазлам бываем плазмай і плазам
што я кладуся а ты сядзіш на мне нібы наркаман
і чуючы твае словы: чакай давай кончым разам
хто скажа што мы дачытваем адзін на дваіх раман

чэрвень 2005

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/13
[image]

Мінулыя (9’2000)

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (39) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image]

[image]2005

"да Зміласту"

паэмыка • аналітыка • крытыка • эсэістыка • **літаратура** • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Габрыель Гарсія Маркес Каханьне падчас халеры

ГАБРЫЕЛЬ ГАРСІЯ МАРКЕС [image] (нар. у 1928) – калюмбійскі пісьменьнік, ляўрэат Нобэлеўскай прэміі ў галіне літаратуры (1982). Раман «Каханьне падчас халеры» быў прыкмечаны ў 1985 годзе. Лятэнтына Арыса адвёў яе і сказаў: «Ня трэба, у мяне дзіўнае адчуваньне, быццам на нас глядзяць». Яна зноўку спудзіла какаду санізацыю шчасьлівым сьмехам і адказала: «Такія адгаворкі для Хімкавай жонкі». Яна не прыняла ягоных тлумачэньняў, аднак выкупленыя падначалілася яму, што тут скажаш, і яны доўгі час даной адно аднаго ў цішыні, у асалодзе спакою. А пятай, калі кудаўскай стаяла яшчэ высока, яна саскочыла з ложка, як заўжды, аголеная, з газавым банцікам на галаве, і пайшла на кухню, каб

Заканчэньне. Пачатак у нумары 4 за 2005 г.

П

рачнуўшыся пасьля сіесты, Флярэнтына Арыса яшчэ каханьне у памяці крыкі какаду, чый пранізьлівы віск супярэчыў падчас прыгажосьці пёраў. Але сьпякотная ціша а чацьвёртай дня была празрыстай, і праз акно спальні вымалёўваўся профіль старажытнага гораду з сонцам на плячох і з бліскучым каюрам да самай Ямайкі. Аўсэнсія Сантандэр працягнула юрыстам у руку, намацваючы прыспанага драпежніка, аднак Флярэнтына Арыса адвёў яе і сказаў: «Ня трэба, у мяне дзіўнае адчуваньне, быццам на нас глядзяць». Яна зноўку спудзіла какаду санізацыю шчасьлівым сьмехам і адказала: «Такія адгаворкі для Хімкавай жонкі». Яна не прыняла ягоных тлумачэньняў, аднак выкупленыя падначалілася яму, што тут скажаш, і яны доўгі час даной адно аднаго ў цішыні, у асалодзе спакою. А пятай, калі кудаўскай стаяла яшчэ высока, яна саскочыла з ложка, як заўжды, аголеная, з газавым банцікам на галаве, і пайшла на кухню, каб

прынесьці чаго папіць, аднак ледзь яна пераступіла парог спальні, як зь ейнага горла вырваўся пранізьлівы енк.

Ня кожны дзень у Аўсэнсіі можна пабачыць такі цуд, як Аўсэнсія Сантандэр у сваім ружовым пеньюары. Ейны пеньюар, падораны ёй Кабралем Шэрманам, быў з самага тонкага шоўку, і ён ня ведаў, дзе ён больш прыгожы: на ейным целе ці ў ейнай спальні. Ён ня ведаў, ці ёсьць на сьвеце яшчэ нешта, што можа спалучаць у сабе такую колькасьць прыгажосьці

абмінуць безабаронную птушачку, імя якой так і не спытаў, бо давялося пражыць зь ёю толькі палову бурлівае ночы, чаго хапіла, каб азмрочыць да скону наіўна-бязладную радасьць карнавалу.

Яна зьвярнула на сябе ўвагу абыякавасьцю сярод агульнага сьвяточнага ўзбуджэньня. Ёй было гадоў дваццаць, і па ёй нельга было сказаць, што ў горадзе адбываецца карнавал, хіба што адмыслова ўбралася пад нябогу: ейныя вельмі сьветлыя і даўгія валасы натуральна спадалі на плечы, а апранутая яна была ў белую туніку з простае тканіны без упрыгожваньняў. Яе зусім не цікавіла музыка, што тарабаніла па вуліцах гораду, рысавая пудра і цуркі вады, якімі вясёла абпырсквалі пасажыраў трамвая, мулы якога, белыя ад крухмалу, працягвалі свой шлях з кветкавымі капелюшамі ўсе тры дні радаснага шаленства. Карыстаючыся з гармідару, Флярэнтына Арыса запрасіў яе на марозіва, бо ня думаў, што яна пойдзе на большае. Яна паглядзела на яго безь зьдзіўленьня і сказала: «З задавальненьнем, але папярэджваю – я вар'ятка». Ён прыняў жарт, пасьмяяўся і павёў яе глядзець парад карнавальных карэтаў з балькону кавярні. Потым апрануў узятае напракат кароткае даміно, і яны зьліліся з натоўпам, што танчыў на Мытным пляцы, і весяліліся разам, нібыта толькі што заручоныя, бо ейная абыякавасьць з наступам шумнае ночы абярнулася вялікай радасьцю: яна танчыла, як прафэсіяналка, праяўляючы багатае ўяўленьне і вясёлую адвагу, адным словам, была самім зачараваньнем.

– Ты не ўяўляеш, у якую гісторыю ты са мной уліпнуў, – крычала яна, паміраючы ад сьмеху ў пякельным гармідары карнавалу. – Я ж вар'ятка з дурдому.

Флярэнтына Арыса адчуваў, што гэта была ноч вяртаньня да нявінных хлапчуковых авантураў, калі каханьне яшчэ не спрычыніла няшчасьця. Аднак ён ведаў, хутчэй інтуітыўна, чымся з досьведу, што такое лёгкае шчасьце не магло трываць доўга, так што да таго, як весялосьць пачала згасаць, калі толькі пачалі ўручаць прызы за найлепшыя строі, ён прапанаваў дзяўчыне пайсьці сустракаць золак на маяку. Яна адразу ж пагадзілася, але толькі пасьля ўручэньня прызоў.

Флярэнтына Арыса быў цалкам пэўны, што затрымка ўратавала яму жыццё. Насамрэч, дзяўчына падала яму знак, маўляў, хадзем, калі два санітары і мэдсястра псыхіятрычнае клінікі «Боская пастырка» накінуліся на яе. Яе шукалі з моманту ўцёкаў а трэцяй дня, і ня толькі яны, а ўсе сілы грамадзкага парадку. Яна адсекла галаву вартаўніку і цяжка параніла яшчэ двух супрацоўнікаў клінікі мачэтэ, якое выхапіла ў садоўніка, бо ёй дужа хацелася патанчыць на карнавале. Але нікому з пагоні ні разу не прыйшло да галавы, што яна пусьціцца ў скокі проста на вуліцы, думалі, што яна стаілася і сьвяткуе карнавал у адным з дамоў, дзе бывала раней, і паліцыя абшукала тыя дамы літаральна да цыстэрнаў для пітное вады.

Скруціць яе выявілася няпростай справай. Яна баранілася садовымі нажніцамі, якія хавала пад вопраткай на грудзях, і спатрэбілася шасьцёра мужчынаў, каб нацягнуць на яе ўтаймоўную кашулю, а натоўп на Мытным пляцы ў гэты час пляскаў у далоні і сьвісьцеў ад радасьці, бо людзі падумалі, што крывавая бойка была адной з карнавальных пастановак. Флярэнтына Арыса стаяў, і сэрца ў яго шчыміла ад спагады, таму ад Попельнай серады* ён стаў хадзіць на вуліцу, дзе месьцілася клініка, са скрыначкай шакалядных цукерак для яе. Ён разглядаў хворых, што сыпалі на яго з высокіх вокнаў адборнай лаянкай ці камплімэнтамі, і дражніў іх цукеркамі, спадзеючыся, што на пошум у закратаванае акно выгляне і яна. Але ён больш ніколі яе ня бачыў. Калі праз колькі месяцаў пасьля здарэньня ён выходзіў з трамвая, маленькая дзяўчынка, што шпацыравала з бацькам, папрасіла ў яго цукерку. Бацька штосьці буркнуў дзяўчынцы і перапрасіў у Флярэнтына Арысы, але той аддаў усю скрынку, падумаўшы, што ўчынак пазбавіць яго ад горычы, і супакоіў бацьку, паляпаўшы яго па плячы.

– Цукеркі былі для маёй каханкі, каб ёй бакі парвалі, – патлумачыў ён.

Попельная серада – у каталікоў першы дзень посьця пасьля карнавалу, пачатак вялікага

Кампэнсацыяй, быццам дасланай лёсам, зрабілася для Флярэнтына Арысы сустрэча ў трамваі зь Леонай Касіяні, якая сталася адзінай сапраўднай жанчынай у ягоным жыцьці, хоць ні ён, ні яна так і не даведаліся пра гэта: яны ніколі не кахаліся. Ён адчуў яе раней, чымся ўбачыў, вяртаючыся дамоў

трамваем а пятай гадзіне: матэрыялізаваны позірк мурынкі
кранўў яго, нібы тыцнуў пальцам. Ён узьняў вочы і заўважыў яе
ў супрацьлеглым канцы вагона, адразу адзначыўшы яе сярод
іншых пасажыраў. Яна не адвяла вачэй, насупраць, глядзела на
яго так нахабна, што ён мог падумаць адно тое, што і падумаў:
мурынка, маладая ды гожая, але прастытутка, няма сумневу. І
выкрасьліў яе са свайго жыцьця, бо не ўяўляў сабе нічога больш
гнюснага, чымся каханьне за грошы: ён не рабіў гэтага ніколі.

Флярэнтына Арыса выйшаў на Карэтным пляцы, канцавым
прыпынку трамвая, і шпарка нырнуў у гандлёвы лябірынт. Маці
чакала яго а шостай, але калі ён прашыў натоўп і аказаўся ў
другім баку, дык пачуў вясёлы перагук жаночых абцасаў па
брукаванцы і павярнуўся, каб упэўніцца ў тым, у чым ужо быў
упэўнены: гэта была яна. Мурынка была апранутая, нібыта
рабыні на гравюрах, – сукенка з фальбонкамі, якую яна
ўскідвала, бы ў танцы, калі пераскоквала вулічныя лужыны,
дэкальтэ, што агаляла ейныя плечы і шыю ў каляровых
каралях, ды белы турбан. Ён ведаў такіх па матроскім гатэлі.
Почасту з самага ранку і да шостай вечара яны сядзелі
галодныя, і ім не заставалася нічога іншага, як карыстацца
сваёй адзінай зброяй – сэксам, як дарожны рабаўнік
карыстаецца фінкай: яны хапалі за горла першага сустрэчнага і
патрабавалі: чэлес альбо сьмерць. Каб канчаткова пераканацца,
Флярэнтына Арыса зьмяніў напрамак, зьвярнуўшы ў пусты
Ліхтарны завулак, і яна пайшла за ім, набліжаючыся з кожным
крокам. Тады ён спыніўся, павярнуўся і загарадзіў ходнік,
абапіраючыся рукамі на парасон. Яна стала перад ім.

– Ты памылілася, прыгажуня, – сказаў ён, – я ня твой кліент.

– Само сабой, – адказала яна, – на тваім твары гэта напісана.

Тут Флярэнтына Арыса прыгадаў фразу, пачутую ў маленстве
ад сямейнага доктара, яго хроснага бацькі, з нагоды хранічнага
запору: «Чалавецтва дзеліцца на тых, хто сярэ добра, і тых, хто
сярэ дрэнна». На гэтай выснове доктар пабудаваў цэлую
тэорыю пра характары і ўважаў яе больш дакладнай, чым
астралёгія. Але пазьней дасьведчаны ўжо Флярэнтына Арыса
перайначыў фразу: «Чалавецтва дзеліцца на тых, хто трахаецца,
і тых, хто ня трахаецца». Да апошніх ён ставіўся зь недаверам:

калі яны выбіваліся з наежджанай каляіны, гэта было для іх такой навіною, што яны выхваляліся сваёй любоўю, нібыта самі вынайшлі яе. Тыя, хто займаўся ёю звычайна, насупраць, жылі адно для любові. Яны адчувалі сябе так добра, што маўчалі, як магілы, бо ведалі, што ад уласнае стрыманасьці залежыць іхнае жыцьцё. Яны ніколі не распавядалі пра свае подзьвігі, не давяраліся нікому, і іх уяўная абыякавасьць дасягала такой ступені, што да іх прыліпала слава імпатэнтаў, недаробкаў, а то і сарамлівых пэдэрастаў, як у выпадку з Флярэнтына Арысам. Аднак яны радаваліся падобным памылковым чуткам, і памылка таксама іх бараніла. Яны складалі замкнёную лёжу, сябры якой пазнавалі адзін аднаго ва ўсім сьвеце надта проста, хоць і размаўлялі на розных мовах. Вось чаму Флярэнтына Арыса не зьдзівіўся, пачуўшы адказ жанчыны: яна была свая і, адпаведна, ведала, што ён гэта разумее.

Але тады ён памыліўся, і сьвядомасьць будзе нагадваць яму пра гэта няўмольна, штогадзіны ажно да скону. Яна хацела не любові, і тым больш – ня аплачванае любові, ёй патрэбна была праца, любая, за любыя грошы, у Карыбскай параходнай кампаніі. Флярэнтына Арысе зрабілася гэтак сорамна за свае паводзіны, што ён павёў яе да кіраўніка аддзелу кадраў, і той даў ёй стаўку найніжэйшай катэгорыі ў агульным аддзеле, і яна выконвала службовыя абавязкі сур'ёзна, сьціпла і старанна на працягу трох гадоў.

Кантора КПК з дня ейнага заснаваньня знаходзілася каля рачнога прычалу, які нічога агульнага ня меў з марскім портам альбо з рынкавым прычалам на беразе бухты Прывідаў і месьціўся на супрацьлеглым беразе бухты. Будынак быў драўляны, з двухсхільным цынкавым дахам, адным доўгім бальконам на слупах з боку фасаду і некалькімі вокнамі, забранымі мэталічнаю сеткай, празь якія было відаць караблі ля прычалу, нібыта карціны, што віселі на сьценах. Калі немцы, заснавальнікі фірмы, збудавалі дом, дык пафарбавалі дах чырвонай фарбай, а драўляныя перагародкі – блішчастымі бяліламі, так што будынак чымсьці нагадваў рачны карабель. Пазьней яго цалкам перафарбавалі ў сіні колер, і да таго часу, калі Флярэнтына Арыса паступіў на працу ў кампанію, дом ператварыўся ў пыльны барак няпэўнай афарбоўкі, а на

ржавым даху віднеліся латы з новых лістоў гонты. За будынкам, у патынкаваным дворыку, які абнесьлі сеткай, нібы загарадзь для курэй, знаходзіліся два склады пазьнейшае пабудовы. У глыбіні двара праходзіў закрыты смуродны канал, дзе гнілі адкіды рачнога суднаходзтва, што назьбіраліся за паўстагодзьдзя. Гэта былі парэшткі гістарычных параходаў ад самых прымітыўных, аднатрубных, пры ўрачыстым спуску на ваду якіх прысутнічаў Сымон Балівар, і да пазьнейшых, што мелі ўжо электрычныя вэнтылятары ў каютах. Бальшыню зь іх пасьпелі разабраць, каб выкарыстаць матэрыялы на іншых караблёх, але шмат зь іх былі ў такім добрым стане, што, здавалася, варта іх пафарбаваць, і льга было зноўку пускаць у навігацыю. Толькі разам з ігуанамі і з зарасьцямі вялізных жоўтых кветак, якія надавалі годным караблям налёт настальгіі.

На другім паверсе будынку знаходзіўся адміністрацыйны аддзел – у памяшканьнях маленькіх, але ўтульных і добра абстаўленых, падобных на карабельныя каюты: дом збудавалі не звычайныя дойліды, а інжынэры-карабельнікі. Пры канцы калідору, нароўні з усімі, у такім жа малым кабінэце працаваў дзядзька Леон XII. Розьніца была толькі ў тым, што раніцой на ягоным пісьмовым стале заўжды зьяўлялася шкляная вазачка з духмянымі кветкамі, якія ён любіў. На першым паверсе зьмяшчаўся пасажырскі аддзел з пачакальняй, абсталяванай простымі лавамі і прылаўкам для продажу квіткоў і прыёму багажу. У самым канцы месьціўся няпэўны агульны аддзел, назва якога сама наводзіла на думку пра няяснасьць ягонага прызначэньня, туды сьцякаліся на павольную сьмерць праблемы, якія не вырашаліся ў іншых аддзелах прадпрыемства. Тамака і сядзела за школьнай партай Леона Касіяні, забытая сярод мяхоў з маісам, заваленая рознымі бязглуздымі паперамі, у той дзень, калі дзядзька Леон XII вырашыў асабіста разабрацца і хоць штосьці прыдумаць, – на што ж можа згадзіцца агульны аддзел. Пасьля трох гадзінаў падрабязных запытаў, абстрактных прапановаў і канкрэтнага разбору з усімі супрацоўнікамі ў поўным складзе ён вярнуўся да сябе, з горыччу прызнаўшыся ў тым, што ён усё-ткі не знайшоў вырашэньня праблемаў, а наадварот, выявіў новыя пытаньні, якія не паддаваліся вырашэньню.

На наступны дзень Флярэнтына Арыса ўвайшоў у свой кабінэт і ўбачыў на стале справаздачу Леоны Касіяні, якая пакорліва прасіла азнаёміцца са зьместам дакумэнту і пасьля паказаць дзядзьку, калі яму гэта падасца мэтазгодным. Яна адна ня вымавіла ні слова падчас рэвізійнага сходу наконадні. Яна сьвядома і з годнасьцю прытрымлівалася рамак свайго становішча, бо працавала з чужой ласкі, але змаўчала не таму, што ёй не было чаго сказаць, а дзеля захаваньня службовае герархіі ў аддзеле. Ейныя высновы ўразілі яго. Дзядзька Леон XII вырашыў правесьці глыбокую рэарганізацыю, але Леона Касіяні думала інакш: паводле элемэнтарнай лёгікі, агульнага аддзелу, у сутнасьці, не існавала, ён быў толькі месцам звальваньня запушчаных, але нязначных справаў, якіх пазбываліся астатнія аддзелы. Слушным рашэньнем, адпаведна, было б закрыцьцё агульнага аддзелу і вяртаньне справаў для вырашэньня ў аддзелы, якія іх і спарадзілі.

Дзядзька Леон XII зусім ня ведаў, хто такая Леона Касіяні, і нават не прыгадваў, ці бачыў яе наагул падчас учорашняга сходу, але, толькі прачытаўшы справаздачу, выклікаў яе ў свой кабінэт і прагаварыў зь ёю сам-насам на працягу дзьвюх гадзінаў. Яны размаўлялі аб усім патроху, такім быў ягоны спосаб пазнаньня людзей. Справаздача была адметнай сваім здаровым сэнсам, і рашэньне, якое яна прапанавала, насамрэч прывяло да пажаданых вынікаў. Аднак гэта ўжо Леона XII не цікавіла: яго зацікавіла яна. Больш за ўсё выклікала ўвагу тое, што пасьля пачатковай школы яна вучылася толькі на мадыстку. Апрача таго, яна без настаўніка вывучала ангельскую мову паскораным мэтадам і ўжо тры месяцы займалася на вечаровых курсах машыністак, гэта было новае рамяство зь вялікай пэрспэктывай, як казалі раней пра тэлеграф і – яшчэ да тэлеграфу – пра паравую машыну.

Калі яна пакінула кабінэт, дзядзька Леон XII ужо клікаў яе – ды так ужо надалей і называў, – цёзка Леона. Адным росчыркам пяра ён зьліквідаваў канфліктны аддзел і разьмеркаваў справы сярод тых, хто тыя справы стварыў, адпаведна прапанове Леоны Касіяні, а таксама прыдумаў для яе пасаду бяз назвы і пэўных функцыяў – фактычна яна сталася ягоным асабістым дарадцам. Удзень, пасьля бясслаўнага пахаваньня агульнага

аддзелу, дзядзька Леон XII спытаўся ў Флярэнтына Арысы, дзе ён выкапаў Леону Касіяні, і той распавёў яму праўду.

– Дык вярніся ў трамвай і прывядзі мне яшчэ дзьвюх-трох вось такіх жа, – адказаў дзядзька. – Тады, спадзяюся, мы дастанем з марскога дна твой патанулы галеон.

Флярэнтына Арыса ўспрыняў гэта як тыповы жарт дзядзькі, аднак на наступны дзень дазнаўся, што яго пазбавілі пэрсанальнага экіпажа, які быў замацаваны за ім шэсьць месяцаў назад, і зрабілі гэта дзеля таго, каб ён працягваў пошук прытоеных талентаў у трамваі. Леона Касіяні, дарэчы, надта хутка пазбавілася былое сьціпласьці і праявіла ўсё, што так умела хавала цягам першых трох гадоў працы. Яшчэ праз тры гады яна кантралявала ўсё прадпрыемства, а за чатыры наступныя падступіла да дзьвярэй агульнай управы, але ўвайсьці адмовілася, бо ўжо стаяла толькі на адну прыступку ніжэй за Флярэнтына Арысу. Да тае пары яна працавала пад ягоным ачольніцтвам і хацела, каб так было і наперад, хоць насамрэч справы складваліся інакш: сам Флярэнтына Арыса не здагадваўся, што гэта ён падначалены ёй. Ён толькі выконваў ва ўправе тое, што яна падказвала, каб дапамагчы яму прасоўвацца на працы насуперак хітрыкам патаемных супраціўнікаў.

У Леоны Касіяні быў д’ябальскі талент зьведваць таямніцы, і яна заўсёды апыналася там, дзе мусіла быць, менавіта ў патрэбны момант. Яна была дынамічнай, нешматслоўнай, мудрай і пяшчотнай. Але калі ўзьнікала неабходнасьць, з болем у сэрцы давала волю сталёваму характару. Аднак ніколі не карысталася гэтым дзеля сябе. Ейнай адзінай мэтай было любой цаной, цаною крыві, калі не праходзілі іншыя способы, расчысьціць лесьвіцу, каб Флярэнтына Арыса ўздымаўся па ёй, як ён колісь задумаў, не разьлічыўшы ўласных сілаў. Яна б зрабіла гэта так ці інакш, зразумела, нібыта з-за неўтаймаванага памкненьня да ўлады, але насамрэч з пачуцьця сардэчнае ўдзячнасьці. Яна ішла да мэты гэтак няўрымсьліва, што Флярэнтына Арыса сам заблытаўся ў ейных камбінацыях. У пэўны цяжкі момант ён спрабаваў перакрыць ёй хаду, мяркуючы, што яна імкнецца скінуць яго. Леона Касіяні

паставіла яго на месца.

– Узважце ўсё добра, – сказала яна. – Я магу ўвогуле сысьці, як толькі вы пажадаеце, але ўсё ж вы як сьлед падумайце.

Флярэнтына Арыса тады абмазгаваў становішча, як толькі мог, і склаў зброю. Справа ў тым, што ў гнюснай вайне ўнутры прадпрыемства, якое пакутавала ад хранічнага крызісу, у паразах неўтаймаванага паляўнічага, у ягоных усё менш пэўных ілюзіях, зьвязаных з Фэрмінай Дасай, вонкава непарушны Флярэнтына Арыса ня ведаў ніводнага імгненьня ўнутранага спакою. Ён бачыў чароўную і адважную мурынку, якая, захраснуўшы ў мярзоцьці й каханьні, працягвала сваё змаганьне. Почасту ён употайкі шкадаваў, што яна не аказалася такой, якой ён уявіў яе ў дзень знаёмства, каб можна было плюнуць на прынцыпы і кахаць яе, нават калі б давялося плаціць залатымі самародкамі. Бо Леона Касіяні была такой самай, як тады ў трамваі. Насіла тую ж вопратку няўрымсьлівай мурынкі, тыя ж шалёныя турбаны, завушніцы з падвескамі і касьцяныя бранзалеты, каляровыя каралі і пярсьцёнкі з фальшывымі камянямі на ўсіх пальцах, – адным словам, гэта была тая самая вулічная львіца* . Усё тое, што дадалося да яе з гадамі, якраз ёй вельмі пасавала. Яна плыла ў асьляпляльнай сьпеласьці, ейныя жаночыя чары хвалявалі, цела афрыканкі сталася ядраным. Флярэнтына Арыса і намёкам не выдаваў свайго стаўленьня да яе цягам дзесяці гадоў, нібы гэтак плацячы за пачатковую памылку, і яна дапамагала яму ва ўсім, толькі ня ў гэтым.

Аднойчы ўвечары ён застаўся працаваць запозна, як ўлавіў усё часьцей пасьля сьмерці маці, і, сыходзячы, заўважыў, што ў кабінэце Леоны Касіяні гарыць сьвятло. Ён адчыніў дзьверы без стуку, – яна была там, засяроджаная, сур'ёзная, у нейкіх акулярах, якія надавалі ейнаму твару выгляд прафэсара. Флярэнтына Арыса здагадаўся з трапяткой радасьцю, што яны ў канторы адны, прычалы былі пустыя, спрадвечная ноч ахінала змрочнае мора, сумны рык карабля чуўся здалёк, да ягонага прыбыцьця міне больш за гадзіну. Флярэнтына Арыса абапёрся рукамі на парасон, як зрабіў тады ў Ліхтарным завулку, загарадзіўшы ёй дарогу, толькі цяпер ён зрабіў так,

каб схаваць дрыжыкі ў каленях.

– Скажы мне, ільвіца маёй душы, – сказаў ён, – калі ж мы выйдзем з гэтага становішча?

Яна зьняла акуляры безь зьдзіўленьня, не зьбянтэжылася і асьляпіла яго сваім сонечным сьмехам. Яна ніколі не была зь ім на «ты».

– Ай, Флярэнтына Арыса, – усклікнула яна, – я дзесяць гадоў сяджу тут і чакаю гэтага пытаньня.

Так, ён безнадзейна спазьніўся: мажлівасьць збліжэньня была ў трамваі, потым у тым жа кабінэце, дзе яна сядзела, але цяпер усё мінулася бязь сьледу. Прайшлі незьлічоныя і прытоеныя спрэчкі, жорсткія гнюснасьці, да якіх яна прыбягала дзеля яго, узмацнілася адчуваньне дваццацігадовае розьніцы ў гадах, і Леона таксама састарылася. Яна так яго кахала, што вырашыла не падманваць, а сказаць праўду, няхай і жорсткую.

– Не, – дадала яна. – Гэта было б, нібыта я пераспала з уласным сынам, якога Бог мне ня даў.

Флярэнтына Арыса застаўся са стрэмкаю ў душы, бо не ягонае слова было апошнім. Ён думаў, што калі жанчына кажа «не», дык чакае, каб настойвалі, і толькі потым прымае канчатковае рашэньне, але зь ёю было інакш: ён ня мог рызыкаваць, каб не памыліцца другі раз. Так і сышоў, нібыта нават у добрым гуморы, што далося яму нялёгка. З тае ночы ўсялякі цень, які пралягаў паміж імі, адразу расьсейваўся бяз горычы, і Флярэнтына Арыса, нарэшце, уцяміў, што можна быць сябрам жанчыны безь фізычнае блізкасьці.

Леона Касіяні была адзіным чалавекам у сьвеце, якому Флярэнтына Арысу карцела адкрыць таямніцу пра Фэрміну Дасу. Малое кола людзей, якія ўсё ведалі, за прамінулы час пасьпелі на тое забыцца. Трое зь іх зьнесьлі таямніцу ў магілу: маці, якая задоўга да сьмерці страціла памяць; Гала Плясыдыя, якая сканала ў глыбокай старасьці на службе ў Фэрміны Дасы, што была для яе амаль дачкою, дый незабыўная Эскалястыка Даса, якая занесла яму ў малітоўніку першы любоўны ліст,

наўрад ці была жывой, бо прайшло зашмат гадоў. Лярэнса Даса, пра якога ён здаўна нічога ня чуў, мог распавесьці ўсё манашцы Францы дэ ля Люс, спрабуючы ўратаваць дачку ад выключэньня са школы, але далейшае распаўсюджаньне таямніцы было малаверагодным. Заставаліся ў сьпісе адзінаццаць тэлеграфістаў далёкае правінцыі, дзе жыла Ільдэбранда Санчас, якія ў тэлеграмах пазначалі іхныя імёны цалкам і дакладныя адрэсы кожнага, і, зрэшты, сама Ільдэбранда Санчас са сваім картэжам няўрымсьлівых кузін.

Чаго ня ведаў Флярэнтына Арыса, дык гэта таго, што доктара Хувэналя Ўрбіна таксама трэба было ўключыць у сьпіс. Ільдэбранда Санчас адкрыла яму таямніцу падчас аднаго зь першых візытаў у горад. Але яна зрабіла гэта так выпадкова і недарэчна, што доктару Ўрбіна нават ня тое, каб заляцела ў адно вуха, а ў другое вылецела, як яна думала, а проста не заляцела ў ніводнае. Ільдэбранда насамрэч назвала Флярэнтына Арысу невядомым паэтам, які, на ейны погляд, меў шанец стацца ляўрэатам Паэтычных гульняў. Доктар Урбіна зь цяжкасьцю прыгадаў, пра каго ішла размова, і яна дадала яму без усялякай неабходнасьці, але й бяз злога намеру, што гэта быў адзіны кавалер Фэрміны Дасы да яго. Яна была ўпэўненая ў тым, што наіўны, імгненны сказ мог выклікаць адно што замілаваньне. Доктар Урбіна адказаў, ня гледзячы на яе: «Я ня ведаў, што гэны тып – паэт». І сьцёр яго з памяці. Між іншым, праз прафэсійную здольнасьць забывацца на многае дзеля этыкі.

Флярэнтына Арыса адзначыў, што ахоўнікі ягонае таямніцы, за выняткам маці, належалі да сьвету Фэрміны Дасы. У ягоным сьвеце ён быў адзін, сам-насам з гэтым невыносным цяжарам, якім яму ня раз карцела падзяліцца, але да тае пары ніхто не заслугоўваў такога даверу. Леона Касіяні была адзіным магчымым кандыдатам, і яму трэба было знайсьці спосаб і спрыяльны выпадак. Ён абдумваў гэта менавіта ў той сьпякотны дзень, калі доктар Хувэналь Урбіна ўзьняўся па стромкай лесьвіцы КПК, прыпыняючыся на кожнай прыступцы празь дзённую сьпякоту, а потым зьявіўся, задыхаючыся, у кабінэце Флярэнтына Арысы, прапацелы з галавы да ног, і сказаў, ледзь дыхаючы: «Здаецца, на нас насоўваецца цыклён».

Флярэнтына Арыса бачыў яго часта, ён прыходзіў да дзядзькі Леона XII, але ніколі раней не ўзнікала такога яснага ўражаньня, што гэтым разам нежаданы візыт меў нейкае дачыненьне да ягонага жыцьця.

Гэта здарылася ўжо той парой, калі доктар Хувэналь Урбіна таксама пераадолеў усялякія рыфы на шляху да прызнаньня па прафэсійнай частцы і абыходзіў горад дом за домам, нібыта жабрак, просячы ўнёскаў на мастацкія імпрэзы. Адзін з самых частых і шчодрых мэцэнатаў быў дзядзька Леон XII, які менавіта ў момант прыходу госьця пачаў сваю штодзённую дзесяціхвілінную сіесту, седзячы ў мяккім крэсьле кабінэту. Флярэнтына Арыса ветліва папрасіў доктара Хувэналя Ўрбіна пачакаць у ягоным кабінэце, што месьціўся побач зь дзядзькавым і быў, у прынцыпе, чымсьці накшталт прыёмнага пакою.

Яны сустракаліся пры розных акалічнасьцях, але ніколі не сядзелі сам-насам, і Флярэнтына Арыса зноў стала моташна ад адчуваньня чужой перавагі. Гэта былі дзесяць бясконца доўгіх хвілінаў, на працягу якіх ён тройчы падымаўся са спадзевам на тое, што дзядзька прачнуўся да пары, і за гэны час выпіў цэлы тэрмас кавы. Доктар Урбіна ад кавы адмовіўся. Ён сказаў: «Кава – гэта атрута». І працягваў гамонку, чапляў адну тэму за другую, ня думаючы пра тое, слухаюць яго ці не. Флярэнтына Арыса ня мог трываць натуральнай шляхетнасьці доктара, красамоўнасьці і трапнасьці ягоных словаў, загадкавага камфарнага духу, абаяльнасьці, дзякуючы якім найбанальнейшыя фразы здаваліся сутнаснымі толькі таму, што выказваў іх ён. Раптам доктар рэзка зьмяніў тэму:

– Ці любіце вы музыку?

І гэтым засьпеў яго зьнянацку. Флярэнтына Арыса не прапускаў ніводнага канцэрту або опэрнага выступу ў горадзе, але не адчуваў сябе здольным падтрымаць размову з дэталёва інфармаваным эрудытам. Ён вельмі любіў модную музыку, асабліва сэнтымэнтальныя вальсы, безумоўна блізкія да ўласных твораў юнацтва, да яго патаемных вершаў. Даволі было пачуць такі вальс аднойчы, быццам бы між іншым, – і потым на працягу многіх бяссонных начэй гучала ў ім няхітрая

мэлёдыя, і не знайшлося б сілы нябеснай, здольнай яе спыніць. Але гэта не магло быць сур'ёзным адказам на пытаньне дасьведчанага чалавека.

– Мне падабаецца Гардэль*, – вымавіў Флярэнтына Арыса.

Доктар Урбіна зразумеў. «Безумоўна, – сказаў ён. – Гардэль, цяпер модны». І адышоў ад размовы, пагрузіўшыся ў дзіўнае пералічэньне сваіх новых праектаў. Ён меў намер адкрыць іх, як заўсёды, безь дзяржаўнай датацыі, і між іншым – заўважыў, што яго прыводзіць у адчай узровень сучасных спэктаклеў, асабліва ў параўнаньні з бляскам паказаў мінулага стагодзьдзя. Так яно і было. Ён ужо год прапаноўваў абанэмэнты ў Тэатры камэдыі на трыё Карто–Касальс–Тыбо**, і не было чым хацеў ўрадзе, які б ведаў, хто яны такія. Аднак у тым жа месцы расхапалі ўсе квіткі на спэктакль трупы дэтэктыўных Рамона Каральта. Тое ж здарылася з Тэатрам апэрэты з сарсуэлы*** дона Манолы дэ ля Прэсы, а таксама з братамі Сантанэла і Плюшлянскімі мімамі, якія перапраналіся на вачох у публікі за час аднае ўспышкі фасфарэсцэнтнага сьвятла. Пайшлі на даніз Д'Альтэн, якая называла сябе былой танцоркай Фалі-Бэржэру****, і нават на мірзоўнага з ягуара, шавеняга баска, які змагаўся з рукапашную з магутным быком, якога падавалі для карыдаў. Скардзіцца, аднак, не было чаго, бо самі эўрапейцы зноўку давалі дурны прыклад сваёй жудаснай вайной, ледзь мы дасягнулі міру пасьля дзевяці грамадзянскіх войнаў за паўстагодзьдзя, якія, калі добра падумаць, былі адной бясконцай вайной. У чароўнай плыні размовы доктара Флярэнтына Арыса для сябе вылучыў перадусім мажлівае адраджэньне Паэтычных гульняў, самай вядомай і трывалай ініцыятывы Хувэналя Ўрбіна з ажыцьцёўленых у мінулым. Флярэнтына Арыса змаўчаў, не хацеў казаць, што сам быў заўзятым удзельнікам штогадовых конкурсаў, якія выклікалі зацікаўленьне слынных паэтаў ня толькі з усёй краіны, але і зь іншых дзяржаваў Карыбскага басэйну.

Як толькі завязалася гамонка, сьпякотнае паветра раптам сталася сьцюдзёным, і бура зь перакрыжаванымі вятрамі страсянула дзьверы і вокны моцнымі парывамі, будынак

Гардэль, Карлас (1887–1935) – славуты спявак, кампазытар і выканаўца танга, чые песні і сёньня карыстаюцца вялікай папулярнасьцю.

Карто, Альфрэд Дані (1877–1962) – вядомы піяніст і дырыжор.

Тыбо, Жак (1880–1953) – знакамітый французкі скрыпач.

Касальс, Пабла (1876–1973) – вялікі гішпанскі віяланчэліст, дырыжор і кампазытар, скалалі выдатнае трыё ў 1905 годзе.

Сарсуэла – від гішпанскае оперэты.

Фалі-Бэржэр – знакамітый тэатар вар'етэ ў Парыжы.

канторы ўвесь зарыпеў, як ветразьнік у шторм. Доктар Хувэналь Урбіна нібыта і не заўважыў нічога. Быццам выпадкова ён згадаў месяцовыя чэрвеньскія цыклёны і зусім нечакана, нават недарэчы, загаварыў пра ўласную жонку. Яна была ня толькі памочніцай, але і душой ягоных ініцыятываў. Ён сказаў: «Мяне б не было безь яе». Флярэнтына Арыса слухаў, не выдаючы эмоцыяў, выказваў згоду галавою, і не адважыўся вымавіць ані слова з боязі, каб ягоны голас ня здрадзіў яму. Аднак дзьвюх альбо трох фразаў выявілася досыць, каб уцяміць: у доктара Хувэналя Ўрбіна, не зважаючы на вялікую занятасьць, часу было ўдосталь, і ён кахаў жонку, амаль як Флярэнтына Арыса. Усьведамленьне гэтага агаломшыла Флярэнтына. Але ён ня змог адрэагаваць, як хацеў бы, бо сэрца па-блядзку здрадзіла яму, як гэта можа зрабіць толькі чалавечае сэрца: яно адкрыла, што ён і доктар, якога Флярэнтына заўсёды ўважаў за асабістага ворага, былі ахвярамі аднаго лёсу і сплачвалі мыта агульнаму каханьню, нібыта пара валоў пад адным ярмом. Упершыню за дваццаць сем гадоў бясконцага чаканьня Флярэнтына Арыса адчуў нясьцерпна пякельны боль, бо гэты выдатны чалавек мусіць памерці дзеля ягонага шчасьця.

Цыклён прамінуў раптоўна, як і прыйшоў, але за пятнаццаць хвілінаў ягоныя паўночна-заходнія парывы спляжылі цэлыя кварталы каля багнаў і зруйнавалі паўгораду. Доктар Хувэналь Урбіна, задаволены ня першы раз шчодрасьцю дзядзькі Леона XII, не дачакаўся поўнага праясьненьня і няўцям зьнёс парасон Флярэнтына Арысы, які той даў яму, каб дайсьці да пралёткі. Але Флярэнтына не шкадаваў. Насупраць, яго ўзрадавала думка: Фэрміна Даса мусіць задумацца, калі дазнаецца, чый гэта парасон. Ён яшчэ быў усхваляваны, узрушаны сустрэчай, калі Леона Касіяні праходзіла каля ягонага кабінэту, і, натуральна, вырашыў, што вось ён – чаканы выпадак; ён адкрые ёй таямніцу, нібы разаб'е гняздо ластавак, што не давалі жыць, – зараз альбо ніколі. Ён спыніў яе і напачатку спытаў, што яна думае пра доктара Хувэналя Ўрбіна. Яна адказала адразу ж: «Чалавек, заклапочаны мноствам справаў, мажліва, надта заклапочаны, але, хутчэй за ўсё, ніхто ня ведае, пра што ён думае». Затым пагрызла ласьцік алоўка вострымі, буйнымі зубамі вялікае мурынкі і нарэшце паціснула плячыма,

нібыта закрываючы пытаньне, якое яе не хвалявала.

– Мажліва, ён выдумляе сабе заняткі, – сказала яна, – каб ня думаць.

Флярэнтына Арыса паспрабаваў затрымаць Леону.

– Мне баліць, што ён мусіць памерці, – выказаў ён.

– Усім наканавана памерці, – адказала яна.

– Зразумела, але яму больш, як каму, – настойваў Флярэнтына.

Яна нічога ня ўцяміла, зноўку паціснула плячыма ды моўчкі пайшла. Тады Флярэнтына Арыса на пэрспэктыву вырашыў, што аднойчы ў будучыні, уначы, ён распавядзе Фэрміне Дасе ў шчасьлівым ложку, што нікому не адкрыў таямніцы іхнага каханьня, нават адзінаму чалавеку, які заслугоўваў права ведаць пра гэта. Не, ён не адкрыецца ніколі, нават самой Леоне Касіяні, і не таму, што не хацеў ёй адчыніць куфар, дзе так надзейна хаваў таямніцу на працягу паўжыцьця. Рэч у іншым: толькі тады ён здагадаўся, што сам згубіў ключ.

Аднак ня гэта сталася самай узрушальнай падзеяй дня. Ён адчуў настальгію па часох далёкага юнацтва, наноў ажыў успамін пра Паэтычныя гульні, якія мелі моцны водгук штогод пятнаццатага красавіка ва ўсім Антыльскім сьвеце. Флярэнтына Арыса быў іх абавязковым удзельнікам, але заўсёды, як амаль ва ўсім, заставаўся ўдзельнікам патаемным. З дня першага конкурсу, дваццаць чатыры гады таму, ён так і не атрымаў нават заахвочвальнага прызу. Але гэта не хвалявала, бо ўдзельнічаў ён ня дзеля амбіцыйнага жаданьня атрымаць прэмію, а таму што спаборніцтва мела для яго дадатковую вартасьць. У першым конкурсе менавіта Фэрміне Дасе даручылі ўскрыць запячатаныя сургучом капэрты і абвясьціць імёны пераможцаў, і яшчэ тады пастанавілі, што падобны гонар належыць ёй і на наступныя гады.

Уначы першага конкурсу Флярэнтына Арыса, схаваўшыся ў прыцемках партэру, з жывой камэліяй, што ўсхвалявана трапятала ў пятліцы пінжака, глядзеў, як Фэрміна Даса

расьпячатвала тры капэрты на сцэне старажытнага Нацыянальнага тэатру. Ён спытаў сябе, што адбудзецца ў ейным сэрцы, калі яна раптам высьветліць, што менавіта ён ганаруецца Залатой архідэяй. Ён быў упэўнены, што яна пазнае ягоны почырк і імгненна згадае вечары з вышыўкай пад мігдалавымі дрэвамі сквэрыку, пах засушаных гардэніяў у капэртах, ягоны вальс каранаванай багіні, прынесены ветрам на золку. Але гэтага ня здарылася. Горш за ўсё тое, што Залатой архідэяй, самай вялікай паэтычнай узнагародай, уганаравалі кітайскага імігранта. Публічны скандал, выкліканы неверагодным рашэньнем, паставіў пад сумнеў сур'ёзнасьць спаборніцтва. Але вэрдыкт быў слушным, і аднадушнасьць журы была апраўданая цудоўным санэтам пераможцы.

Ніхто не паверыў, што кітайскі ляўрэат – сапраўдны аўтар санэту. Ён прыехаў на сыходзе мінулага стагодзьдзя, гнаны эпідэміяй жоўтае ліхаманкі, якая зьнішчала насельніцтва Панамы падчас будаўніцтва міжакіянскай чыгункі, прыехаў разам са шматлікімі імігрантамі, якія засталіся ў краіне да самага свайго скону, – яны жылі па-кітайску, памнажаліся па-кітайску і былі гэтак падобныя адзін да аднаго, што ніхто ня мог іх адрозьніць. Напачатку іх было ня больш за дзясятак, некаторыя зь іх – з жонкамі, дзецьмі ды сабакамі, якіх яны елі, але за колькі гадоў чатыры вулкі партовага прадмесьця перапоўніліся новымі і новымі кітайцамі, якія прыяжджалі ў краіну, не пакідаючы сьледу ў мытных рэгістрах. Маладзёны ператварыліся ў шаноўных патрыярхаў гэтак хутка, што ніхто ня мог уцяміць, калі яны пасьпелі састарыцца. Народная інтуіцыя разьдзяліла іх на дзьве клясы: дрэнныя кітайцы і добрыя кітайцы. Дрэнныя трымалі змрочныя партовыя тавэрны, дзе аднолькава можна было паесьці па-каралеўску альбо раптоўна памерці ад стравы з пацучынага мяса з праснакамі са сланечнікавай макухі, і людзі падазравалі, што гэтыя тавэрны служылі адно што шырмаю для гандлю белымі жанчынамі і ўсялякага іншага цёмнага набыцьця-продажу. Добрымі былі кітайцы, якія заснавалі пральні, спадкаемцы сьвятое мудрасьці, што вярталі кашулі чысьцейшымі за новыя, каўнерыкі і манжэткі нагадвалі толькі што спрасаваныя аплаткі. Якраз адзін з гэтых добрых кітайцаў перамог на Паэтычных гульнях, і семдзесят два спаборнікі перажывалі паразу.

Фэрміна Даса, сумеўшыся, зачытала ягонае імя, аднак ніхто яго не разабраў. Ня толькі праз тое, што імя было чужым іхнаму слыху, а таму што так ці інакш ніхто пэўна ня ведаў, як увогуле могуць зваць кітайца. Але доўга думаць не давялося, бо ляўрэат вынырнуў з глыбіні партэру зь нябеснай усьмешкай, што бывае ў кітайцаў, калі яны рана вяртаюцца дамоў. Ён быў настолькі ўпэўнены ў перамозе, што прыйшоў у тэатар у жоўтай кашулі для вясновых абрадаў, каб узьняцца на сцэну. Ён атрымаў Залатую архідэю 750-й пробы і радасна пацалаваў яе пад кпіны недавяркаў. Ляўрэат не засмуціўся. Ён чакаў на сцэне, акамянелы, нібы апостал зь нябёсаў, не драматызуючы ад відавочнай нэгатыўнай рэакцыі, і пры першай паўзе прачытаў верш, які ўганаравалі прэміяй. Ніхто не зразумеў ні слова. Але пасьля новага залпу сьвісту Фэрміна Даса спакойна паўтарыла санэт ціхім, пяшчотным голасам, і зьдзіўленьне авалодала публікай зь першага радка. Гэта быў санэт высакароднага парнаскага паходжаньня, дасканалы, прасякнуты налётам натхненьня, якое магло кіраваць рукой толькі сапраўднага віртуоза. Факт мог мець толькі адно тлумачэньне: хтосьці зь вялікіх паэтаў стварыў санэт жартам, каб пазьдзекавацца з Паэтычных гульняў, і кітаец пагадзіўся на суўдзел, але вырашыў захаваць таямніцу да самае сьмерці. «Камэрцыйная газэта», тыднёвік традыцыйнага кшталту, спрабавала залатаць грамадзянскі гонар эрудаваным, але, хутчэй, сырым эсэ пра старажытны культурны ўплыў кітайцаў у краінах Карыбскага басэйну і іх заслужанае права ўдзельнічаць у Паэтычных гульнях. Эсэ ня выклікала сумневу ў тым, што аўтар санэту і ёсьць названы ляўрэат, і прызнавала гэта ўжо назвай: «Кожны кітаец – паэт». Арганізатары змовы, калі яна мела месца, згнілі ў сваіх магілах разам з таямніцай. Са свайго боку, ляўрэат памёр бяз споведзі ў цалкам усходнім веку і быў пахаваны з Залатой архідэяй, але ён зьнёс і горыч, бо пры жыцьці яму так і не ўдалося дабіцца прызнаньня таго, што ён сапраўды паэт. З прычыны ягонай сьмерці прэса згадала забыты інцыдэнт першых Паэтычных гульняў. Газэты перадрукавалі санэт зь віньеткай у мадэрновым духу, якая адлюстроўвала пухкіх дзеў з залатымі рагамі заможнасьці, а багі-ахоўнікі паэзіі скарысталіся аказіяй, каб расставіць усё па месцах – санэт быў так стрымана ўспрыняты новым пакаленьнем, што ўжо ніхто не сумняваўся: насамрэч напісаў

яго нябожчык кітаец.

Флярэнтына Арыса заўсёды зьвязваў той скандал з успамінам пра пышную незнаёмку, што сядзела побач зь ім. Ён заўважыў яе напачатку, але тут жа адвёў позірк, бо страшна хваляваўся, чакаючы вынікаў. Яна выклікала ўвагу пэрлямутравай скурай, шчасьлівым водарам пышнасьці, бязьмежнымі грудзямі сьпявачкі-сапрана са штучнай кветкай магноліі. Яна была ў цеснай вопратцы з чорнага аксаміту, чорнага, як яе прагныя, цёплыя вочы, а валасы былі яшчэ чарнейшыя, сабраныя ззаду цыганскім грабеньчыкам. Кінуліся ў вочы завушніцы-падвескі, каралі ў такім жа стылі і аднолькавыя пярсьцёнкі на пальцах, усе як адзін з бліскучымі штучнымі камянямі, а правую шчаку ўпрыгожвала намаляваная алоўкам радзімка. У мітусьні фінальнай авацыі яна паглядзела на Флярэнтына Арысу са шчырай горыччу.

– Паверце мне, я ад душы шкадую, – шапнула яна.

Флярэнтына Арыса ўсхваляваўся, але ня сутнасьці сказанага, а таму, што хтосьці, выяўляецца, ведаў ягоную таямніцу. Яна ўдакладніла: «Я здагадалася, вельмі дрыжэла кветка ў вас на штрыфэлі, калі ўскрывалі капэрты». Яна паказала плюшавую магнолію, якую трымала ў руцэ, і адкрыла яму сэрца:

– Таму я і зьняла сваю кветку.

Яна ледзь ня плакала ад горычы паразы, але Флярэнтына Арыса, начны паляўнічы, вырашыў зьмяніць ейны настрой.

– Хадземце куды-небудзь, паплачам разам, – прапанаваў ён.

І правёў яе дамоў. Ужо ля парогу, паўтарыўшы, што блізіцца поўнач і на вуліцы ні душы, ён угаварыў даму і быў запрошаны на кілішак брэндзі ды прагляд альбомаў з выразкамі і фатаздымкамі з розных імпрэзаў апошніх дзесяці гадоў. Фокус ужо тады быў стары, але на гэты раз узьнік міжволі, бо яна сама апавядала пра свае альбомы, пакуль яны ішлі пешшу ад Нацыянальнага тэатру. Першае, што прыкмеціў Флярэнтына Арыса, уваходзячы ў гасьцёўню, былі адчыненыя дзьверы ў спальню і ложак з расшытай золатам капай – вялікі ды

раскошны, аздоблены бронзавай лістотай. Выгляд спальні, як ні дзіўна, засмуціў яго. Яна, верагодна, здагадалася, бо апярэдзіла Флярэнтына Арысу, шпарка перасекла пакой і зачыніла дзьверы. Потым запрасіла яго заняць месца на канапе, абабітай пярэстым крэтонам, на якой спаў кот, і паклала перад ім на стол калекцыю альбомаў. Флярэнтына Арыса гартаў іх нясьпешна, больш думаў пра наступныя крокі, чым пра тое, што бачыў, раптам узьняў позірк і заўважыў, што вочы дамы поўныя сьлёзаў. Флярэнтына параіў ёй плакаць, колькі заўгодна, без засмучэньня, бо нішто так не палягчае душу, як сьлёзы, толькі ён намякнуў, каб яна разьняволіла гарсэт: ён замінае вольнаму плачу. І пасьпяшаўся ёй на дапамогу, бо гарсэт быў зацягнуты ўздоўж сьпіны крыжаванымі шнуркамі. Яму не давялося расшнуроўваць яе да канца, гарсэт, зрэшты, расслабіўся сам ад унутранага ціску, і яна задыхала ўволю сапраўды астранамічна поўнымі грудзьмі.

Флярэнтына Арыса так ніколі і не пазбыўся страху першае ночы нават у самых мімалётных выпадках і не адразу адважыўся на лёгкую ласку шыі пальцамі; яна здрыганулася з жалобным стогнам расьпешчанае дзяўчыны, не спыняючы плачу. Тады Флярэнтына Арыса пацалаваў яе ў тое самае месца вельмі пяшчотна, нібыта зноўку датыкаўся пальцамі, і ўжо ня змог паўтарыць пацалунак, бо яна прагна павярнулася да яго ўсім сваім манумэнтальным корпусам і абодва пакаціліся ў абдымках па падлозе. Кот прачнуўся на канапе і зь віскатам скочыў на іх. Яны шукалі адно аднаго навобмацак, пасьпешліва, нібыта падлеткі, і знаходзілі, перакатваліся цераз раскінутыя альбомы, апранутыя, потныя, зьвяртаючы ўвагу больш на бязьлітасныя лапы ашалелага ката, чым на вэрхал, які яны ўтваралі сваім любаваньнем. Але ад наступнае ночы, нягледзячы на крывавыя драпіны, яны працягнулі сустрэчы, і лёс пажадаў, каб сустрэчы доўжыліся некалькі гадоў.

Калі Флярэнтына Арысу прыйшло да галавы, што ён прывязаўся да яе і нават пачынае кахаць, яна была ў поўным росквіце сарака гадоў, а яму было ўжо амаль трыццаць. Яе звалі Сара Нар'ега, яна дасягнула пятнаццаці хвілінаў славы ў юнацтве, перамогшы на паэтычным конкурсе зборнікам вершаў пра каханьне жабракоў, які так і застаўся нявыдадзеным.

Працавала яна настаўніцай добрых манераў і грамадазнаўства ў дзяржаўных школах. Жыла з заробку і здымала кватэру ў маляўнічым праезьдзе Закаханых старажытнага Гефсэманскага* кварталу. Яна мела некалькі палюбоўнікаў, аднак без сур'ёзных намераў. Наўрад ці чалавек таго асяродку і таго часу ажаніўся б з жанчынай, зь якой пераспаў. Яна таксама ня цешыла сябе ілюзіямі з тае пары, як ейны першы афіцыйны жаніх, якога яна сапраўды кахала, як гэта толькі можна ў васямнаццаць гадоў, уцёк, парушыўшы заручыны за тыдзень да вясельля, і яна засталася з рэпутацыяй падманутае нявесты. Або скарыстанае дзеўкі, як тады казалі. Аднак той першы досьвед, горкі і мімалётны, пакінуў ёй ня сьлед горычы, а асьляпляльную ўпэўненасьць у тым, што ў шлюбе альбо па-за шлюбам, бяз Бога і па-за законам, жыць варта толькі ў тым выпадку, калі маеш мужчыну ў ложку. Больш за ўсё Флярэнтына Арысу займала тое, што ў момант любові ёй было неабходна смактаць дзіцячую соску, каб дасягнуць найвялікшай асалоды. Яны сабралі цэлую вязку сосак рознай велічыні, формы і колеру, якія толькі можна было набыць на рынку, і Сара Нар'ега вешала соскі над ложкам, каб можна было знайсьці навобмацак у патрэбны момант.

Хоць яна была свабоднай, як і ён, і, верагодна, ня ст[illegible] супрацівіцца, калі б іхная сувязь не хавалася ад людзей, Флярэнтына Арыса з самага пачатку настояў на захаванні кансьпірацыі. Ён прасьлізваў у дом цераз чорны ход і заставаўся вельмі позна, глыбокай ноччу, а зьнікаў на дыбачках задоўга да досьвітку. І ён, і яна разумелі, што ў цесным і густанаселеным доме суседзі ведаюць шмат больш за тое, што ўдаюць, няхай кансьпірацыя застанецца толькі простай фармальнасьцю, Флярэнтына Арыса быў такім, і такім ён будзе зь любой жанчынай да скону. Ён ні разу не дазволіў сабе ў гэтых адносінах ніводнага правалу, ні зь ёю, ні зь іншымі, выкрыць яго было немажліва. Гэта не было перабольшаньнем: толькі аднойчы ён пакінуў па сабе здрадлівы сьлед – ліст, і гэта магло каштаваць яму жыцьця. Насамрэч ён заўсёды паводзіў сябе, як вечны муж Фэрміны Дасы, муж няверны, але ўпарты, які нястомна змагаўся за вызваленьне ад сваёй залежнасьці, ня здраджваючы, аднак, сваім пачуцьцям.

Нават [illegible] дзяцей, [illegible] кватэру [illegible] сустракаецца [illegible] Аднак [illegible] Магчыма, [illegible] побач [illegible] Ерусаліму.

Падобная замкнёнасьць не магла не спарадзіць чутак. Сама Трансыта Арыса памерла з упэўненасьцю, што ейны сын, зачаты ў каханьні і выхаваны для каханьня, меў стойкі імунітэт да ўсялякіх праяваў пачуцьця з-за першай юнацкай няўдачы. Аднак менш зычлівыя людзі зь яго блізкага кола, знаёмыя зь ягоным загадкавым характарам і цягай да містычнай вопраткі ды дзіўных парфумаў, падзялялі падазрэньне ў тым, што ягоны імунітэт тычыцца не любові, а жанчын. Флярэнтына Арыса ведаў пра гэта і ніколі нічога не зрабіў дзеля абвяржэньня. Гэта не турбавала і Сару Нар'егу. Яна прымала яго, як усе незьлічоныя жанчыны, якія задавальнялі яго, не разьлічваючы на асаблівыя пачуцьці, як мужчыну часовага. Урэшце, Флярэнтына стаў зьяўляцца ў ейным доме а любой гадзіне дня і ночы, часьцей за ўсё – у нядзелю зраньня, у самы спакойны час. Яна адразу кідала тое, чым займалася, і аддавала сябе дарэшты, каб зрабіць яго шчасьлівым на вялізным размаляваным ложку, які заўжды чакаў яго і на якім не было месца царкоўным абмежаваньням. Флярэнтына Арыса ня мог зразумець, як незамужняя жанчына з такім малым досьведам магла столькі ведаць пра жаданьні мужчынаў і як яна давала рады свайму салодкаму целу, якое рухалася ў ложку так лёгка, бы рыбіна ў вадзе. Яна адказвала яму, што майстэрства кахаць, перадусім, ёсьць прыроджаным талентам: «Ты альбо нараджаесься з гэтай ведай, альбо так і памрэш невукам». Флярэнтына Арысу ажно круціла ад думкі, што яна, магчыма, была больш дасьведчанай, чым удавала, але ён мусіў суцішваць сваю рэўнасьць, бо і сам сказаў ёй, як казаў усім сваім жанчынам, што яна была ягонай адзінай каханкай. Акрамя шмат чаго іншага, што было яму не даспадобы, Флярэнтына мусіў зьмірыцца з прысутнасьцю ў ложку разьюшанага ката, якому Сара Нар'ега сточвала кіпцюры, каб ён іх не разьдзёр, пакуль яны кахаліся.

Аднак акрамя заўсёднае прагі давесьці сябе ў ложку да зьнямогі, яна аддавала сябе ўсю пакутам паэзіі. І ня толькі мела дзівосную памяць на сэнтымэнтальныя вершы таго часу, што прадаваліся ўсё новымі двухграшовымі брашурамі на вуліцах гораду, але і прыколвала да сьценаў шпількамі самыя кранальныя зь іх, каб чытаць услых у любы час. Яна пераклала тэксты падручніка па добрых манерах і лекцыі грамадазнаўства

на мову клясычнай паэзіі паўнагучнай рыфмай, але не дабілася афіцыйнага прызнаньня. Часам яе так даводзіў дэкляматарскі сьверб, што яна працягвала выкрыкваць радкі падчас любоўных уцехаў, і Флярэнтына Арыса змушаны быў усоўваць ёй у рот соску гвалтам, як робяць зь дзецьмі, каб перасталі плакаць.

У разгар іхнай сувязі Флярэнтына Арыса спытаў сябе, які з двух станаў льга лічыць любоўю – стан буйных любоўных уцехаў альбо спакой вечарамі ў нядзелю, і Сара Нар'ега супакоіла яго простым аргумэнтам, маўляў, што б мы ні рабілі аголенымі, гэта і будзе любоў. І дадала: «Для любові душэўнай – вышэй за талію, для любові цялеснай – ніжэй». Гэтае ўласнае вызначэньне здалося ёй удалай тэмай для паэмы пра шчасьлівае каханьне, яны напісалі паэму ў чатыры рукі, і Сара Нар'ега прадставіла яе на V Паэтычных гульнях, упэўненая ў тым, што ніхто такой арыгінальнай паэмы ніколі не абіраў. І зноўку прайграла.

Флярэнтына Арыса правёў яе дамоў, і ўсю дарогу яна гнявілася. Ня могучы таго патлумачыць, яна была ўпэўненая ў тым, што ёй не далі прэміі праз інтрыгі Фэрміны Дасы. Флярэнтына Арыса не зьвяртаў на яе ўвагі, ён пагрузіўся ў змрочны настрой з моманту ўручэньня ўзнагароды, бо вельмі даўно ня бачыў Фэрміны Дасы, і той ноччу ў яго склалася ўражаньне, што яна глыбока зьмянілася: упершыню няўзброеным вокам можна было заўважыць, што, як ні круці, яна маці. Гэта не было навіной для яго, бо ён ведаў, што ейны сын ужо ходзіць у школу. Аднак мацярынскі век раней не здаваўся яму так відавочным, як цяперака, мяркуючы не адно па памерах таліі, зьменах у хадзе, а й па тым, што ёй не ставала паветра пры чытаньні вынікаў конкурсу.

Каб дакумэнтальна падмацаваць свае ўражаньні, ён наноў перагледзеў альбомы, прысьвечаныя Паэтычным гульням, пакуль Сара Нар'ега гатавала вячэру. Ён разглядаў хромалітаграфіі з часопісаў, зжаўцелыя паштоўкі, што прадаваліся, як сувэніры, ля Натарыяльнае брамы, і гэта было нібыта прывідным пераглядам фальшу ягонага ўласнага жыцьця. Да тае пары ён трымаўся ілюзіі, што ўвесь сьвет старэе, мяняюцца звычаі, моды, толькі не яна. Але цяпер ён

упершыню сьвядома ўгледзеў, што і жыцьцё Фэрміны Дасы мінае, і ягонае жыцьцё зьбягае, а ён толькі і робіць, што чакае. Ніколі ён не гаварыў пра яе ні з кім, бо разумеў, што ня здольны вымавіць ейнае імя так, каб людзі не заўважылі, як ён хвалюецца, – нават вусны зьбялелі б. Але ў той вечар, калі ён разглядаў альбомы ўжо соты раз вечарамі падчас нядзельнай нудоты, Сара Нар'ега чарговым разам выпадкова ўжыла тое трапнае вызначэньне, ад якіх стыла кроў.

– Яна сапраўдная прастытутка, – сказала яна.

Яна выказала гэта мімаходзь, убачыўшы здымак, на якім Фэрміна Даса на маскарадным балі была ў вопратцы чорнай пантэры, і Сары не давялося называць імя, каб Флярэнтына Арыса здагадаўся, пра каго яна сказала. Баючыся выкрыцьця, якога страшыўся ўсё сваё жыцьцё, ён паспрабаваў быў асьцярожна бараніць Фэрміну. Адзначыў толькі, што ён амаль ня ведаў Фэрміны Дасы – знаёмства зводзілася да фармальных вітаньняў – і нічога ня ведаў пра ейнае асабістае жыцьцё, але думаў, што гэта цудоўная жанчына, якая стварыла сябе зь нічога, дзякуючы ўласным вартасьцям.

– Дзякуючы шлюбу па разьліку з чалавекам, якога не кахае, – перарвала яго Сара Нар'ега. – Гэта самы агідны ўзор прастытуцыі.

Не такімі рэзкімі словамі, але таксама ў тоне суворай маралі маці казала Флярэнтына Арысу тое самае, спрабуючы сьцішыць ягонае гора. Узрушаны, ён не знайшоў адпаведнага адказу на словы бязьлітаснай Сары Нар'егі і вырашыў зьмяніць тэму. Аднак Сара Нар'ега не паддалася і працягвала паліваць брудам Фэрміну Дасу, пакуль не адвяла душу. Усплёск інтуіцыі, які Сара Нар'ега ня здолела б вытлумачыць, падказваў: Фэрміна Даса зладзіла змову, каб не даваць ёй прэміі. Прычынаў для такога сьцьверджаньня не было: яны не былі знаёмыя, ня ведалі адна адну ў твар, і Фэрміна Даса ня мела ніякага дачыненьня да конкурснага вэрдыкту, хоць была ў курсе справаў журы. Сара Нар'ега дадала безапэляцыйным тонам: «Мы, жанчыны, – празарлівіцы». І гэтым спыніла спрэчкі.

Тады Флярэнтына Арыса і яе ўбачыў іншымі вачыма. Для яе

таксама міналі гады. Няўрымсьлівая натура бясслаўна марнела, гадамі стрымванае каханьне вымушала яе ўсхліпваць, на павекі ўжо леглі цені мінулай горычы. Гэта была ўчорашняя кветка. Апрача таго, ад гневу паразы яна страціла лік кілішкам брэндзі. Гэта не была ейная ноч: пакуль елі падагрэты ёю рыс з какосам, яна спрабавала высьветліць унёсак кожнага ў стварэньне паэмы, каб дазнацца, колькі пялёсткаў Залатой архідэі яны маглі атрымаць паасобку. Не ўпершыню яны пускаліся ў беспрадметныя дыскусіі, але ён скарыстаўся выпадкам з тым, каб гаварыць, вярэдзячы адкрытую рану абразы. Вось так яны схапіліся ў бязглуздай спрэчцы і прыгадалі ўсе дробныя крыўды, што назапасіліся за пяць гадоў любоўнае сувязі.

Заставалася дзесяць хвілінаў да поўначы, калі Сара Нар'ега стала на крэсла, завяла насьценны гадзіньнік і паправіла стрэлку на вока, верагодна, з намерам сказаць яму бяз словаў, што час сыходзіць. Тады Флярэнтына Арыса адчуў тэрміновую неабходнасьць вырваць з карэньнем гэную сувязь безь любові і стаў шукаць зачэпку, каб узяць ініцыятыву ў свае рукі, – так ён дзейнічаў заўсёды. Ён маліў Бога, каб Сара Нар'ега паклікала ў ложак – вось тады ён бы сказаў ёй, што не, усё скончана, – ён папрасіў яе, калі яна спусьцілася з крэсла, прысесьці побач. Аднак яна вырашыла трымацца на адлегласьці і села ў крэсла для гасьцей. Тады Флярэнтына Арыса працягнуў ёй указальны палец, абмакнуўшы яго ў брэндзі, – Сара Нар'ега любіла ссаць яго ў прэлюдыях любові. Яна адвярнулася.

– Ня трэба, – сказала яна, – я чакаю чалавека.

З тае пары, як яму адмовіла Фэрміна Даса, Флярэнтына Арыса навучыўся пакідаць за сабой апошняе слова. Пры менш горкіх абставінах ён бы дабіўся згоды Сары Нар'егі і завяршыў бы ноч зь ёю ў раскошным ложку, бо ён быў упэўнены ў тым, што жанчына, якая аднойчы легла з мужчынам, і надалей будзе спаць зь ім, толькі б мужчына таго захацеў ды здолеў абудзіць ейную пяшчоту. Ён напакутаваўся дзеля ўласнае ўпэўненасьці, ішоў на што заўгодна нават пры самых цёмных прыгодах, толькі б не даваць аніводнай жанчыне мажлівасьці сказаць апошняе слова. Але тае ночы ён адчуў сябе гэтакім

зьняважаным, што ўраз выпіў брэндзі, паказваючы, як толькі мог, сваю крыўду, і пайшоў моўчкі, нават не разьвітаўшыся. Яны больш ніколі ня бачыліся.

Сувязь Флярэнтына Арысы з Сарай Нар'егай была адной з найдаўжэйшых і найстабільнейшых, хоць і не адзінай за тыя пяць гадоў. Калі ён зразумеў, што яму зь ёю добра, перадусім у ложку, але што яна ніколі не заменіць яму Фэрміны Дасы, ягоныя ночы самотнага паляўнічага зноў пачасьціліся, і ён даваў рады часу і сілам, дзе толькі мог. Аднак Сара Нар'ега сталася на пэўны час цудам палёгкі. Ва ўсялякім разе на той час ён здолеў жыць, ня бачачы Фэрміны Дасы, чаго раней не ўдавалася: ён у любы момант мог кінуць свае справы, каб выйсьці шукаць яе там, дзе падказвала ягонае прадчуваньне. Шукаў ён яе на самых невергодных вулках, у месцах, дзе яе быць не магло, бяздумна хадзіў з такою нудой у душы, што ня мог знайсьці спакою, пакуль ня ўгледжваў яе хоць на хвілю. Расстаньне з Сарай Нар'егай зноў патрывожыла яго прыспаныя летуценьні, і ён зноўку адчуў сябе, як у тыя вечары бясконцага чытаньня ў сквэрыку, але гэтым разам усё стала складанейшым праз думку пра тое, што доктар Хувэналь Урбіна мусіць памерці.

Здаўна Флярэнтына Арыса ведаў, што ягоны лёс – ашчасьлівіць удаву, якая ашчасьлівіць і яго, але гэта ніяк не турбавала яго. Наадварот, ён быў да гэтага падрыхтаваны. Ён так добра ведаў іх па сваіх прыгодах, што ўрэшце ўпэўніўся: сьвет поўны шчасьлівых удоваў. Ён бачыў, як яны шалелі ад гора, калі хавалі мужа, як малілі, каб іх пахавалі жыўцом у той жа труне і пазбавілі такім чынам ад бядотаў змрочнае будучыні, але паступова прыходзіла замірэньне з рэальнасьцю новага становішча, і яны адраджаліся з попелу, праяўлячы маладую жывучасьць. Яны пачыналі жыць, нібыта інсэкты ў цені вялізных пустых дамоў, выслухоўвалі споведзі прыслужніц, лашчылі пустыя падушкі і пакутавалі ад адсутнасьці клопатаў пасьля мноства гадоў бясплённага рабства. Яны марнавалі час, прышываючы гузікі да вопраткі нябожчыка, чаго раней ніколі не пасьпявалі зрабіць, бясконца прасавалі кашулі з накрухмаленымі каўнерыкамі і манжэткамі, каб яны віселі ў ідэальным парадку. Працягвалі класьці ў прыбіральні мыла,

якое ён любіў, мянялі навалкі зь ягонай манаграмай у ложку, ставілі прыбор там, дзе ён звычайна сядаў за стол, на выпадак, калі ён раптам вернецца адтуль без папярэджаньня, як рабіў пры жыцьці. Але ў тых рытуалах самоты яны пачыналі ўсьведамляць, што зноў атрымалі свабоду пасьля таго, як адмовіліся ня толькі ад свайго прозьвішча, але і ад сваёй самасьці, і ўсё – замест жыцьцёвай трываласьці, якая насамрэч была адной са шматлікіх нявесьціных ілюзіяў. Толькі яны ведалі, як цяжка было з чалавекам, якога шалёна кахалі і які, мажліва, іх таксама кахаў. Але яго ж даводзілася даглядаць да апошняга ўздыху, карміць грудзьмі, мяняць яму запэцканыя пялюшкі, адцягваючы ўвагу матчынымі прыгаворкамі, каб зьменшыць страх, які ён адчуваў перад ранішнім выхадам на вуліцу і сутыкненьнем з рэчаіснасьцю. Аднак варта было мужу выйсьці з дому пад жончыны падбухторваньні скарыць сьвет, і ўжо яна заставалася сам-насам з жахам, ці вернецца ён калі. Такім было жыцьцё. Каханьне, калі яно існавала, было нечым асобным, нечым у іншым жыцьці.

Тым часам, узнаўляючы жыцьцёвыя сілы ў самоце, удовы знаходзілі, што адзіна сумленны спосаб жыцьця патрабуе падначаленьня целу, калі ясі, калі хочаш есьці, кахаеш без маны, сьпіш без патрэбы ўдаваць, што ты заснула, каб пазьбегнуць ганебнасьці каханьня паводле раскладу, калі маеш, нарэшце, поўнае права на ложак толькі для сябе, і ніхто не аспрэчвае паловы прасьціны, паловы паветра, паловы ночы, каб цела насыцілася ў сьне, каб прачнуцца самотнай. Падчас сваіх золкаў патаемнага паляўнічага Флярэнтына Арыса сустракаў іх каля выхаду з храму пасьля ранішняе імшы а пятай, апранутых у чорную жалобную вопратку і з крумкачом лёсу на плячы. Ледзь заўважыўшы яго ў першых промнях золку, яны пераходзілі вуліцу і ішлі па ходніку на супрацьлеглым баку дробнымі нэрвовымі крокамі, крокамі птушкі, бо нават проста прайсьці паўз мужчыну на ходніку азначала заплямiць сваю годнасьць. Аднак ён быў упэўнены, што роспачная ўдава куды болей, чымся якая іншая жанчына, магла несьці ў сабе зерне шчасьця.

Колькі ўдоваў у ягоным жыцьці, пачынаючы ад Назарэцкай удавы, дазволілі яму дазнацца, якімі стаюцца шчасьлівыя

пашлюбёнкі пасьля сьмерці мужа! Тое, што для яго датуль было марнай ілюзіяй, дзякуючы ім ператварылася ў рэальную магчымасьць. Ён не знаходзіў прычынаў, зь якіх Фэрміна Даса не магла б быць такой самай удавой, падрыхтаванай самім жыцьцём, каб прыняць яго, якім ён быў, бяз прывіднае віны перад нябожчыкам мужам, гатовай адкрыць зь ім другое шчасьце ў другім каханьні, здольнай зрабіць з кожнае хвілі цуд жыцьця, які належаў бы толькі ёй і які прышчэплены самой сьмерцю ад любое заразы.

Мабыць, ён ня быў бы такім аптымістам, калі б хоць падазраваў, як далёка была Фэрміна Даса ад ягоных ілюзорных разьлікаў, калі яна толькі ўваходзіла ў сьвет, дзе для яе было прадугледжана ўсё, акрамя няшчасьця. Быць заможным тады азначала мець мноства пераваг – зразумела, і мноства невыгодаў таксама, але паўсьвету прагла заможнасьці, бачачы ў ёй спосаб дасягнуць несьмяротнасьці. Фэрміна Даса адмовіла Флярэнтына Арысу, калі якраз пачынала сталець, і тут жа расплацілася пакутамі шкадаваньня, але ніколі не сумнявалася ў слушнасьці свайго ўчынку. У свой час яна не магла патлумачыць сабе, якія патаемныя прычыны прывялі да працінальнага прадбачаньня, аднак шмат гадоў пазьней, ужо на парозе старасьці, яна раптоўна, ня ведаючы, якім чынам, знайшла тыя прычыны падчас выпадковай размовы пра Флярэнтына Арысу. Прысутныя ведалі, што ён быў спадкаемцам Карыбскай параходнае кампаніі ў эпоху ейнага росквіту, усе былі ўпэўненыя, што бачыліся зь ім шмат разоў, вялі зь ім нейкія справы, аднак ніхто ня мог узнавіць ягонага вобразу ў памяці. Вось тады Фэрміна Даса адкрыла падсьвядомыя прычыны, якія заміналі кахаць яго. І яна вымавіла: «Гэта нібыта не чалавек, а цень». Так, цень чалавека, якога ніхто ніколі не спазнаў. Але пакуль яна супраціўлялася заляцаньням доктара Хувэналя Ўрбіна, які быў чалавекам сапраўды супрацьлеглага кшталту, яна пакутавала ад прывіду вінаватасьці: адно што гэтае пачуцьцё яна ня здолела сабе падначаліць. Калі Фэрміна Даса адчувала, што вінаватасьць звальваецца на яе, жанчыну ахоплівала невытлумачальная паніка, і ёй удавалася кантраляваць сябе, толькі калі побач знаходзіўся чалавек, які яе суцяшаў. Яшчэ зусім малой, разьбіўшы талерку на кухні, прышчаміўшы палец у дзьвярах,

убачыўшы, як нехта ўпаў, Фэрміна Даса паварочвалася ў жаху да дарослага, які знаходзіўся бліжэй за іншых, і адразу казала яму: «Гэта ты вінаваты». Хоць насамрэч яе не турбавала, хто вінаваты, альбо ці вінаватая яна сама, – ёй досыць было кагосьці зьвінаваціць.

Комплекс быў настолькі відавочным, што доктар Урбіна своечасова здагадаўся, да якой ступені гэта пагражае гармоніі ў сям'і, і як толькі заўважаў ягоную прысутнасьць, сьпяшаўся сказаць жонцы: «Не хвалюйся, мая каханая, ва ўсім вінаваты я». Ён больш за ўсё пабойваўся раптоўных і незваротных рашэньняў жонкі і ведаў, што прычына ўсяго хавалася ў пачуцьці вінаватасьці. Аднак унутраны канфлікт, выкліканы тым, што яна адмовіла Флярэнтына Арысу, ня мог вырашыцца адной суцяшальнай фразай. Фэрміна Даса па-ранейшаму адчыняла балькон раніцой цягам некалькіх месяцаў, і заўсёды сумавала па самотным прывідзе, які мусіў чакаць на лаўцы пустэльнага сквэрыку, яна бачыла ягонае дрэва, самую непрыкметную лаўку, дзе ён сядаў чытаць, думаючы пра яе, пакутуючы празь яе, і яна мусіла зачыняць балькон, уздыхаючы: «Няшчасны, няшчасны». Яна нават перажыла расчараваньне, што ён выявіўся не такім упартым, як яна меркавала, калі было запозна цыраваць мінулае, і часам жадала прачытаць запозьнены ліст, які ёй ужо ніколі было не прачытаць. Але калі давялося наважыцца на шлюб з Хувэналем Урбіна, яе напаткаў яшчэ большы крызіс, бо яна ўцяміла, што няма істотных падставаў, каб аддаваць перавагу яму, калі яна адмовіла Флярэнтына Арысу. Насамрэч яна амаль не кахала доктара, як і папярэдняга прэтэндэнта, да таго ж ледзь яго ведала, і ягоныя лісты былі пазбаўленыя палкасьці тых, папярэдніх, ня ўтрымлівалі ўзрушальных доказаў ягонага каханьня. Па праўдзе, памкненьні Хувэналя Ўрбіна ніколі не былі сфармуляваныя моваю каханьня, і ва ўсялякім разе было дзіўна, што такі ваяўнічы каталік, як ён, прапаноўваў ёй толькі зямныя даброты: упэўненасьць у будучыні, лад, шчасьце, – нібыта лічбы, падсумаваньне якіх, мажліва, магло быць падобным на каханьне, амаль каханьнем. Але гэта не было ім, і сумневы множылі ейную разгубленасьць, бо яна таксама не была ўпэўненая, што для сапраўднага жыцьця ёй бракавала менавіта каханьня.

Галоўны факт супраць доктара Хувэналя Ўрбіна тоіўся ў ягонай падазронай падобнасьці да ідэальнага мужчыны, пра якога Лярэнса Даса марыў для дачкі. Немажліва было ня бачыць у доктару дзіця бацькоўскае змовы – хоць гэта было і ня так, – і Фэрміна Даса паверыла ў гэтую вэрсію тады, калі ён увайшоў у дом другім разам, зь лекарскім візытам бяз выкліку. Размовы з кузінай Ільдэбрандай заблыталі яе ўшчэнт. Быўшы сама ахвяраю нешчасьлівага каханьня, там яна ледзь не атаясамлівала сябе з Флярэнтына Арысам, забываючыся на тое, што Лярэнса Даса зладзіў ейны прыезд менавіта дзеля таго, каб яна паўплывала на Фэрміну Дасу на карысьць доктара Ўрбіна. Толькі Бог ведае, якіх высілкаў каштавала Фэрміне Дасе ня скласьці кампанію кузіне, калі тая пайшла ў тэлеграфную кантору, каб пабачыць Флярэнтына Арысу. Фэрміна Даса таксама хацела б пабачыць Флярэнтына Арысу зноўку, супаставіць ягоны воблік з успамінам і пазбыцца сумневу. Яна б пагутарыла зь ім сам-насам, зьведала б яго дарэшты. Толькі так яна магла ўпэўніцца ў тым, што ейнае імгненнае рашэньне не штурхне да іншага, больш цяжкога, якім сталася б капітуляцыя ў асабістай вайне супраць бацькі. Але яна прыняла рашэньне ў крытычны момант свайго жыцьця, не зважаючы ні на мужчынскую гожасьць прэтэндэнта, ні на легендарную заможнасьць, ні на ягоную раньнюю славу, ні на іншую рэальную годнасьць, а толькі праз жах таго, што можа ўпусьціць такі шанец і празь немінучасьць дваццаці аднаго году, скрайняе рысы, якую яна сабе ўпотайкі прызначыла, каб скарыцца перад лёсам. І адзінай хвілі выявілася досыць, каб прыняць рашэньне, як Бог загадаў і як чалавечыя законы таго патрабуюць, – да самага скону. Тады разьвеяліся ўсе сумневы, і Фэрміна Даса магла зрабіць без згрызотаў сумленьня тое, што розум абраў: яна годна, бязь сьлёз цалкам сьцерла ўспаміны пра Флярэнтына Арысу, і на тым месцы ейнай памяці, дзе ён раней жыў, пасеяла макавы дол. І толькі дазволіла сабе больш глыбокі, чым звычайна, апошні ўздых: «Няшчасны, няшчасны!»

Найстрашнейшыя сумневы, аднак, пачаліся, як толькі Фэрміна Даса вярнулася зь вясельнай вандроўкі. Ледзь яны пасьпелі адчыніць куфры, распакаваць мэблю і разабраць адзінаццаць скрыняў, прывезеных ёю дзеля таго, каб належным чынам прыняць лейцы кіраваньня ў якасьці гаспадыні старажытнага

палацу маркіза Касальдуэра, яна ледзь ня страціла прытомнасьць, бо ўсьвядоміла: яна сталася вязьніцай у чужым доме і, што яшчэ горай, ня з тым мужам, пра якога марыла. І шэсьць гадоў пайшло на тое, каб выбрацца адтуль. Шэсьць найгоршых гадоў ейнага жыцьця і адчаю ад горкага суму доньні Блянкі, ейнай сьвякрухі, і ад разумовае недаразьвітасьці заловак, якія ня згнілі жыўцом у кляштарным вязеньні толькі таму, што іхныя душы здаўна існавалі ў нябачных, унутраных кельлях.

Доктар Урбіна, з пакорай аддаючы даніну прыналежнасьці да ўласнага роду, стаўся глухім да ейнага маленьня і спадзяваўся на Боскую мудрасьць і на жончыну здольнасьць прыстасоўвацца да чужога асяродку; з часам, маўляў, усё стане на месца. Яму балюча было бачыць, што маці, чыя прага да жыцьця колісь давала моцы жыць нават самым разгубленым, зламалася. Гожая ды разумная жанчына зь незвычайнай для ейнага асяродку пяшчотай у сэрцы на працягу амаль сарака гадоў была душою і целам сьвецкага раю. Сьмерць мужа кінула яе ў бездань горычы да такое ступені, што ад колішняе аптымісткі не засталося нічога, бо яна сталася ў душы змрочнай і калючай, увесь сьвет нібы стаў супраць яе. Адзіна мажлівае тлумачэньне дэградацыі маці хавалася ў крыўдзе за тое, што муж сьвядома ахвяраваў жыцьцём дзеля зграі мурынаў, як яна казала, бо адзіным апраўданьнем ягонай сьмерці для яе магло быць самаахвяраваньне дзеля яе. Так ці іначай, шчасьлівы шлюб Фэрміны Дасы доўжыўся столькі, колькі доўжылася вясельная вандроўка, а побач быў муж, які мог бы ўратаваць яе ад канчатковага крушэньня спадзеваў, але быў паралізаваны страхам перад матчынай уладай. Менавіта яго, а не дэбільных заловак альбо напаўзвар'яцелую сьвякруху Фэрміна Даса вінаваціла за прыгатаваную для яе сьмяротную пастку. Яна вельмі позна зразумела, што за прафэсійным аўтарытэтам і вялікасьвецкай прывабнасьцю чалавека, які стаўся ейным мужам, хаваліся бездапаможнасьць і слабасьць, – адным словам, убоства, якое харобрылася грамадзкаю вагою ягоных імёнаў і прозьвішчаў.

Фэрміна Даса знайшла суцяшэньне ў нованароджаным сыне. Яна нарадзіла яго з такой палёгкай, нібы вызвалілася ад

чагосьці чужога, і перажыла страх ад самое сябе, калі зразумела, што не адчувае аніякае пяшчоты да той маленечкай істоты са свайго ўласнага жывата, якую павітуха паказала ёй. Ён быў голы, бы засалены і заляпаны крывёю, з абматанай укола шыі пупавінай. Але ў самоце палацу яна зьведвала яго ўсё болей і болей, яны пазналі адно аднаго, і Фэрміна Даса зь вялікай радасьцю адкрыла, што дзяцей любяць не таму, што яны нашыя дзеці, а з-за блізкасьці, якая ўзьнікае, пакуль іх гадуеш. З часам яна ўжо нікога і нічога не магла трываць у тым доме ейнай нягоды, акрамя сына. Яе душылі самота, сад, падобны да могілак, застаяласьць часу ў агромністых пакоях бяз вокнаў. Яна адчувала, што шалее доўгімі начамі, калі чуліся крыкі вар'ятак з суседняй псыхіятрычнай клінікі. Ёй было зусім няёмка ад звычаю штодня накрываць банкетны стол, з вышываным абрусам, срэбнымі прыборамі і хаўтурнымі кандэлябрамі, каб пяць прывідаў вячэралі нязьменным кубкам кавы з малаком і мядовымі пернікамі. Яна зьненавідзела вечаровыя малітвы, застольную манернасьць, бясконцую крытыку таго, як яна ўпраўляецца са сталовымі прыборамі, як шпарка яна ходзіць – бы якая вулічная дзеўка, як апранаецца – бы ў цырку, яе крытыкавалі нават за тое, што яна абыходзіцца з мужам, бы якая сялянка, за тое, што карміла сына, не прыкрываючы грудзей мантыльляй. Калі яна ўпершыню самастойна запрасіла сяброў на гарбату а пятай са здобным печывам і кветкавым канфітурам згодна з апошняй ангельскай модай, доньня Блянка стала колам напярок таго, каб у ейным доме падавалі людзям патагоннае замест кубка шакаляду і юкавых хлябцоў з расплаўленым сырам. Сьвякруха не абышла прыдзірлівай увагай нават ейныя сны. Аднойчы раніцой Фэрміна Даса распавяла, што бачыла ў сьне, нібыта незнаёмец шпацыруе аголеным, раскідваючы жменькі попелу па залях палацу, і тады доньня Блянка рэзка пераравала яе:

– Прыстойнай жанчыне ня могуць сьніцца такія сны.

Да непарыўнага адчуваньня таго, што яна ў чужым доме, дадаліся дзьве вялікія бяды. Першая – гэта амаль штодзённая бакляжанная дыета на ўсе спосабы, якую доньня Блянка адмаўлялася адмяняць з павагі да нябожчыка мужа, а Фэрміна Даса цярпець не магла бакляжаны. Яна іх зьненавідзела з

маленства, яшчэ не пакаштаваўшы, таму што ёй заўсёды здавалася, што яны маюць колер атруты. Праўда, на гэты раз ёй давялося прызнаць, што так ці іначай штосьці зьмянілася ў жыцьці, цяпер яе не прымусіш гэта есьці, а калі ў пяць гадоў яна вымавіла нешта пра колер атруты за сталом, бацька змусіў яе зьесьці цэлы рондаль на шэсьць пэрсонаў. Яна думала, што памрэ, спачатку праз тое, што яе званітавала здрабнёнымі бакляжанамі, а потым праз кубак з касторкай, якую ўлілі ў яе гвалтам, каб вылечыць ад бацькавага пакараньня. Гэтыя два моманты зьмяшаліся ў памяці, ператварыліся ў адно паслабляльнае, як ад згадак пра смак, так і зь перапуду перад атрутай, і падчас мярзотных абедаў у палацы маркіза Касальдуэра ёй даводзілася адводзіць вочы, каб ня вывернуць вонкі ежу – такія сьцюдзёныя касторавыя ваніты падступалі да горла.

Другой бядой была арфа. Аднойчы, цалкам усьведамляючы вагу сваіх словаў, доньня Блянка сказала: «Я ня веру ў прыстойнасьць жанчын, якія ня ўмеюць граць на піяніна». Гэта быў загад, якому паспрабаваў запярэчыць нават сын, бо найлепшыя гады ягонага маленства прайшлі ў галерным рабстве ўрокаў граньня на фортэпіяна, хоць у сьпелым веку ён быў удзячны бацькам за іхную настойлівасьць. Ён ня мог сабе ўявіць, як можна прымусіць займацца гэтым чалавека ў дваццаць пяць гадоў ды яшчэ з такім характарам, як у ягонай жонкі. Але ад маці ён дамогся толькі згоды на замену піяніна арфай, па-дзіцячы давёўшы ёй, што гэта інструмэнт анёлаў. Зь Вены выпісалі для іх цудоўную арфу, якая здавалася залатой выглядам і гучаньнем: пазьней арфа станецца бясцэннай рэліквіяй гарадзкога музэю, пакуль знакаміты пажар ня зьнішчыць літаральна ўсіх экспанатаў. Фэрміна Даса скарылася, спрабуючы зрабіць апошні высілак, каб прадухіліць развал сям'і. Яна пачала займацца ў слыннага пэдагога, якога адмыслова прывезьлі з Мампоксу, але ён празь пятнаццаць дзён нечакана памёр, і яна некалькі гадоў працягвала заняткі з галоўным музыкам сэмінарыі, які сваім настроем далакопа скажаў любое арпэджыё.

Фэрміна Даса сама дзівілася сваёй пакоры. Не пагаджаючыся ў думках і ў глухіх спрэчках з мужам у гадзіны, якія раней

прысьвячалі любові, Фэрміна Даса хутчэй, чымся сама магла падумаць, заблыталася ў зарасьцях умоўнасьцяў і прымхаў свайго новага сьвету. Напачатку яна карысталася рытуальнай фразай для сьцьверджаньня свабоды думкі: «Да чорта веер, вее вецер». Аднак пазьней яна пачала даражыць атрыманымі шлюбам прывілеямі, баялася сораму і насьмешак, і была гатовая трываць нават зьнявагі, спадзеючыся на тое, што Бог, нарэшце, пашкадуе доньню Блянку, якая ў малітвах нястомна прасіла паслаць ёй сьмерць.

Доктар Урбіна апраўдваў уласную слабасьць крызісам стаўленьня да жонкі, нават не спытаўшы сябе, ці не супярэчыць ягоная думка ўстанаўленьням касьцёлу. Ён не дапускаў, што канфлікты з жонкаю ўзьнікаюць з прычыны напружанай атмасфэры ва ўсім доме, і верыў: прычына закладзена ў самой прыродзе шлюбу – абсурднай вынаходцы, якая існуе толькі дзякуючы бясконцаму цярпеньню Бога. Шлюб ня меў аніякага навуковага абгрунтаваньня: чаму дзьве ледзь знаёмыя асобы рознага полу бязь зьвязкі роднасьці, з розным культурным узроўнем раптам прымаюць абавязак жыць разам, спаць разам, падзяляць лёс, які, магчыма, быў прадвызначаны зусім іначай. Ён казаў: «Праблема ў тым, што шлюб завяршаецца штоноч пасьля мілаваньня, і штораніцы трэба ўзнаўляць яго да сьняданку». Яшчэ горш складваліся стасункі ў межах іхнага шлюбу, тлумачыў ён, бо яны былі прадстаўнікамі дзьвюх антаганістычных клясаў, ды яшчэ ў горадзе, які па-ранейшаму марыў пра вяртаньне віцэ-каралёў. Адзіным магчымым матэрыялам, які мог зьвязаць іх, было ўяўнае і зьменлівае каханьне, калі яно ўвогуле існавала, а ў іхным выпадку яго дакладна не было падчас вясельля, а надалей лёс толькі балюча сутыкнуў іх ілбамі ў той час, калі яны ледзь не прыдумалі сабе сваю гісторыю каханьня.

Вось так яны і жылі ў арфавы пэрыяд. Засталіся ззаду гожыя выпадковасьці, калі, напрыклад, яна магла ўвайсьці ў ванны пакой, дзе ён мыўся, і, не зважаючы на спрэчкі, на атрутныя бакляжаны, на сясьцёр-вар'ятак і на такую ж вар'ятку сьвякруху, у ім яшчэ было досыць пяшчоты, і ён прасіў, каб яна пацерла яму сьпіну. Яна намыльвала яго, трымаючыся тых дробак каханьня, якія засталіся пасьля Эўропы, і яны абое

паддаваліся мане ўспамінаў, міжволі расслабляліся, кахаліся моўчкі, пакуль не паміралі ад любові на падлозе ваннага пакою, запырсканыя водарнай пенай, чуючы гамонку прыслужніц, якія пралі бялізну за сьценкай: «У іх няма больш дзяцей, бо яны ня трахаюцца». Час ад часу, калі яны вярталіся дамоў пасьля якой шалёнай вечарыны, нуда, што вычэквала іх за дзьвярыма, раптам валіла іх долу, і тады адбываўся дзівосны выбух, калі ўсё адраджалася наноў, рабілася, як раней, і на працягу пяці хвілінаў яны былі тымі неўтаймаванымі каханкамі, як падчас вясельнае вандроўкі.

Але за выключэньнем тых рэдкіх аказіяў, адзін зь іх заўсёды быў страшэнна стомленым у час, калі яны клаліся ў ложак. Яна затрымлівалася ў прыбіральні, круцячы цыгаркі з араматызаванае паперы, паліла на самоце, зноўку аддавалася ўцехам юнацтва, калі яна жыла ў сваім доме і ейнае цела належала ёй адной. У яе заўсёды балела галава альбо было надта сьпякотна, заўсёды, ці яна ўдавала, што ўжо сьпіць альбо зноў пачалася мэнструацыя, мэнструацыя, заўсёды мэнструацыя. І так часта, што доктар Урбіна наважыўся сказаць на лекцыі, каб палегчыць душу без намёкаў на асабістае жыцьцё, што пасьля дзесяці гадоў шлюбу ў жанчын мэнструацыя можа быць да трох разоў на тыдзень.

Бяда адна ня ходзіць. Фэрміне Дасе давялося перажыць у найгоршы год свайго жыцьця тое, што яна мусіла зьведаць раней ці пазьней: праўду пра звышпрыбытковыя і патаемныя справы бацькі. Губэрнатар правінцыі выклікаў Хувэналя Ўрбіна ў свой кабінэт, каб увесьці яго ў курс злачынстваў цесьця, і падсумаваў адной фразай: «Няма такога боскага альбо чалавечага закону, цераз які б гэны тып не пераступіў». Найбольш цяжкія злачынствы былі ажыцьцёўленыя ў цені зяцевага аўтарытэту, і было цяжка паверыць, каб зяць і ягоная жонка ня ведалі пра гэта. Разумеючы, што толькі ягоная рэпутацыя магла іх уратаваць, бо іншай такой сілы не было, доктар Хувэналь Урбіна зрушыў усе спружыны і важкасьць уласнага становішча, каб згасіць скандал, даўшы слова гонару. У выніку, Лярэнса Даса выехаў з краіны на першым караблі, каб больш ніколі не вярнуцца. Шлях ён трымаў на радзіму, нібыта кіруючыся ў адну з тых вандровак, на якія пускаўся час

ад часу, каб замарыць чарвяка настальгіі, і ва ўсім гэтым была доля праўды: ён ужо здаўна меў звычку ўздымацца на караблі, што прыходзілі зь ягонай радзімы, каб проста выпіць шклянку вады, набранай у яго родным мястэчку. Лярэнса Даса зьехаў, хоць і ня здаўся, бо ўпарта працягваў цьвердзіць, што ён не вінаваты, імкнучыся ўпэўніць зяця ў тым, што ён стаўся ахвярай палітычнае змовы. Ад'яжджаючы, ён плакаў па сваёй дзяўчынцы, як ён называў Фэрміну Дасу ад дня вясельля, плакаў па ўнуку, па зямлі, дзе стаў заможным і незалежным чалавекам, дзе ўчыніў бацькоўскі подзьвіг, ператварыўшы дачку ў вытанчаную даму, дзякуючы сваім цёмным справам. Зьехаў ён састарэлым ды хворым, але пражыў нашмат болей, чымся жадалі яму ахвяры ягоных махінацыяў. Фэрміна Даса ня здолела стрымаць уздыху палёгкі, калі да яе дайшла вестка пра бацькаву сьмерць, і яна не прытрымлівалася канонаў жалобы, каб пазьбегнуць пытаньняў, але цягам колькіх месяцаў зачынялася ў прыбіральні, каб папаліць-паплакаць з глухой злосьцю, ня ведаючы прычынаў, – насамрэч, гэтак яна плакала па бацьку.

Самым абсурдным у іхным становішчы было тое, што ніколі яны не здаваліся такімі шчасьлівымі на людзях, як у тыя нешчасьлівыя гады. Напраўду, гэта быў час іхных вялікіх перамог над стоенай варожасьцю асяродзьдзя, якое не хацела іх прымаць такімі, якімі яны былі, – адрознымі ды сучаснымі, адпаведна, і парушальнікамі заведзенага ладу. Аднак гэтаму Фэрміна Даса давала раду лёгка. Сьвецкае жыцьцё, што дагэтуль здавалася ёй чымсьці няпэўным, было ўсяго сыстэмай атавістычных пактаў, банальных цырымоніяў, прадвызначаных шаблёнаў, з дапамогай якіх бамонд забаўляўся, каб не пазабіваць адно аднаго. Галоўнай азнакай у гэтым раі правінцыйнае легкадумнасьці быў жах перад невядомым. Яна вызначыла гэта даволі простым чынам: «Праблема жыцьця ў грамадзтве – навучыцца стрымліваць страх, а праблема сямейнага жыцьця – навучыцца адольваць нуду». Ёй адкрылася гэта, як нейкае пасланьне зь нябёсаў, калі яна ўвайшла, цягнучы за сабой бясконцы шлейф вясельнага строю, у вялізны салён Грамадзкага клюбу. Тамака атмасфэра была зусім іншай, чым заўсёды, ад зьмяшанага водару мноства кветак, бляску вальсаў, вальяжнае гаманы ўспацелых мужчынаў і

нэўрастэнічных жанчын, якія разглядвалі яе, яшчэ ня ведаючы, што б такога змысьліць з гэтай асьляпляльнай пагрозай, пасланай ім вонкавым сьветам. Ёй толькі споўніўся дваццаць адзін год, і датуль яна выходзіла з дому толькі дзеля таго, каб дайсьці да школы, але досыць было зірнуць на прысутных, каб уцяміць: яны не былі ахопленыя нянавісьцю – іх паралізаваў жах. Яна, таксама зь перапуду, раптам міласэрна зрабіла крок насустрач. Яны выявіліся такімі, якімі яна меркавала іх бачыць, так здаралася і з гарадамі, ня горшымі і ня лепшымі за іхны вобраз у ейным сэрцы. Парыж, не зважаючы на бесьперапынны дождж, жміндаў-крамнікаў ды гамэрычную грубасьць возьнікаў, заўсёды прыгадваўся як найпрыгажэйшы горад сьвету, не таму, што ён быў альбо ня быў такім, а таму, што яна зьвязвала яго з настальгіяй па гадох шчасьця. Доктар Урбіна, са свайго боку, вёў змаганьне той зброяй, якую выкарыстоўвалі супраць яго, але ён рабіў гэта з дыхтоўным розумам і разьлічанай урачыстасьцю. Нічога не адбывалася бязь іхнага ўдзелу: ці то публічныя гуляньні, ці то Паэтычныя гульні, культурныя імпрэзы, дабрачынныя лятарэі, патрыятычныя сходы, першы палёт на паветраным шары. Паўсюль былі яны, і амаль заўсёды – каля вытокаў і на грэбені справы. Ніхто ня мог і ўявіць сабе, каб нехта быў шчасьлівейшы за іх, каб недзе ў сьвеце існавала такая сямейная гармонія.

Кінуты бацькам дом даў Фэрміне Дасе ўласны прытулак ад удушша родавага палацу. Пры першай магчымасьці схавацца ад вачэй сьвету яна ўпотайкі зьбягала ў дом перад Эвангельскім сквэрыкам і там прымала новых сябровак і некаторых былых – па школе альбо па ўроках жывапісу: гэта быў нявінны сурагат шлюбнай нявернасьці. Яна бавіла свае гадзіны самотнае маці ва ўспамінах пра сваё насычанае падзеямі дзяцінства. Зноўку набыла крумкачоў, пазьбірала вулічных катоў, якіх даглядала Гала Плясыдыя, ужо старая і абмежаваная ў рухах з-за раматусу, але ў якой яшчэ ставала сілаў, каб адрадзіць дом. Фэрміна Даса зноў адчыніла пакой для шытва, дзе Флярэнтына Арыса ўбачыў яе ўпершыню, дзе доктар Хувэналь Урбіна загадаў ёй паказаць язык, спадзеючыся ўгледзець ейнае сэрца, і ператварыла пакой у сьвяцілішча мінулага. Адным зімовым вечарам Фэрміна Даса ішла зачыняць балькон, бо набліжалася бура, і ўбачыла Флярэнтына Арысу на ягонай нізенькай лаўцы

пад мігдалавым дрэвам сквэрыку, у перашытым пад яго бацькавым строі і з раскрытай кніжкай на каленях. Але не такім, якім бачыла яго выпадкова ды ня раз, а ў тым веку, у якім ён застаўся ў ейнай памяці. Яна спужалася, што гэтая мара магла быць прадвесьцем сьмерці, і ёй зрабілася балюча. Яна адважылася сказаць сабе, што, магчыма, яна была б шчасьлівай зь ім у доме, які з такім каханьнем рэстаўравала дзеля яго, як і ён узнаўляў свой дзеля яе. Ад гэтага простага дапушчэньня яе ажно страсянула, бо яна ўцяміла, да якіх скрайнасьцяў няшчасьця яна дайшла. Тады яна сабрала рэшткі сілаў і змусіла мужа размаўляць адкрыта, твар да твару. Яны спрачалася да сьлёзаў ад гневу за страчаны рай, спрачаліся да трэціх пеўняў, і сьвятло прабралася да іх цераз палацавыя карункі, і ўзышло сонца, і муж, хрыплы ад доўгай гамонкі, стомлены ад бяссоннае ночы, з умацаваным ад пралітых сьлёзаў сэрцам завязаў шнуркі на чаравіках, зацягнуў пас, патужэй зацягнуў тое з мужчынскага, што заставалася ў ім, і сказаў: «Так, любая, мы зноў адшукаем каханьне, якое пакінулі ў Эўропе – і ўжо назаўжды». Рашэньне было незваротным. Ён дамовіўся са Скарбовым банкам, сваім паўнамоцным прадстаўніком, пра неадкладны продаж саліднай фамільнай маёмасьці, здаўна раскіданай па розных бізнэсах, капіталаўкладаньнях, недатыкальных каштоўных паперах, якія марудна назапашвалі прыбытак. Гэта быў скарб, пра які толькі ён сапраўды ведаў, што ён ня быў бязьмерным, як сьцьвярджала легенда. Скарб быў рыхтык такім, каб пра яго ня думаць. І грошы, абмененыя на золата найвышэйшае спробы, мусілі паступова пераводзіцца на ягоныя замежныя рахункі, пакуль для яго і жонкі не застанецца ў гэтым неміласэрным краі нават цалі зямлі, каб быць тут пахаванымі.

А Флярэнтына Арыса ўсё ж існаваў, хоць да тае пары яна спрабавала верыць у адваротнае. Ён быў на пірсе, куды прычаліў трансатлянтычны карабель з Францыі, калі яна пад'ехала з мужам і сынам у ляндо, запрэжаным залацістымі коньмі, ён бачыў, як яны выйшлі з экіпажу такімі, як гэта было неаднойчы на грамадзкіх урачыстасьцях, – беззаганнымі. Яны ішлі з сынам, выхаваньне якога ўжо дазваляла здагадвацца, якім ён станецца з гадамі. Хувэналь Урбіна павітаў Флярэнтына Арысу, вясёла прыўзьняўшы капялюш: «Едзем на

заваёву Фляндрыі». Фэрміна Даса ледзь схіліла галаву ў знак вітаньня. Флярэнтына Арыса тут жа зьняў капялюш, адказаў лёгкім рэвэрансам, і яна паглядзела на яго бязь ценю спачуваньня яго заўчаснаму палысеньню. Так, гэта быў ён, якім яна і бачыла яго. Гэта быў цень чалавека, якога яна так і не спазнала.

Флярэнтына Арыса таксама перажываў не найлепшыя часіны. Да ўсё больш напружанай працы, да злыбедаў патаемнага паляўнічага, да мёртвага штылю ягоных гадоў дадаўся фінальны крыз Трансыты Арысы, чыя памяць ужо не захоўвала ўспамінаў і сьцерлася дабела. Дайшло да таго, што часам яна паварочвалася да яго, калі ён чытаў, як заўсёды, у сваім фатэлі, і зьдзіўлена пыталася: «А ты чый будзеш?» Ён заўжды адказваў сур'ёзна, але яна тут жа перарывала:

– А скажы мне, сынку, – казала яна, – а хто я такая?

Трансыта Арыса растаўсьцела настолькі, што ледзьве рухалася, і таму бавіла цэлы дзень у галянтарэйнай краме, дзе ўжо нічога не заставалася для продажу. Яна амаль ня спала. Клалася позна, прачыналася зь першымі пеўнямі і пачынала ўпрыгожвацца: насоўвала нейкія вянкі на голаў, фарбавала вусны, пудрыла твар і рукі, пасьля чаго пытала ў таго, хто быў побач, як яна выглядае. Суседзі ведалі, чаго яна чакала, і заўсёды адказвалі: «Ты Прусачка Мартынэс». Толькі гэтае імя, запазычанае ў пэрсанажа дзіцячае казкі, задавальняла яе. Яна гойдалася, абмахваючы сябе зьвязкай вялізных ружовых пёраў, пакуль не пачынала ўсё спачатку: насоўвала вянок з папяровых кветак на голаў, намазвала мускусам павекі, кармінам – вусны, бяліламі – твар. І зноўку пыталася ў таго, хто быў бліжэй: «Як я выглядаю?» Калі зь яе стаў сьмяяцца ўвесь квартал, Флярэнтына Арыса загадаў разабраць за адну ноч прылавак і сэкцыі са скрынямі былой галянтарэі, зачыніў назаўсёды дзьверы з вуліцы, абсталяваў памяшканьне так, як яна ўяўляла сабе спальню Прусачкі Мартынэс, і наперад Трансыта Арыса больш ніколі не пыталася, хто яна такая.

Як падказаў яму дзядзька Леон XII, для догляду за маці Флярэнтына Арыса знайшоў жанчыну ў гадах, але тая, няшчасная, больш спала, чымся займалася маці, а часам

стваралася ўражаньне, што і сама забывалася ўласнае імя. Так што Флярэнтына Арыса вырушваў наўпрост дамоў, як толькі выходзіў з канторы, і заставаўся пры маці, пакуль тая не засынала. Ён ужо не гуляў у даміно ў Камэрцыйным клюбе і падоўгу ня бачыўся з былымі сяброўкамі, бо нешта ў ягоным сэрцы зламалася пасьля жахлівай сустрэчы з Алімпіяй Сулетай.

Сустрэча была фатальнай. Флярэнтына Арыса адвёз дзядзьку Леона XII дамоў у разгар кастрычніцкай буры – з разраду тых, ад якіх доўга адыходзіш. І на зваротным шляху раптам заўважыў з экіпажа невысокую і вельмі спрытную дзяўчыну ў адзеньні з мноствам фальбонак, больш падобным на ўбраньне нявесты. Яна мітусілася туды і сюды, бо вецер вырваў з рук ейны парасон і зьнёс у бок мора. Ён выратаваў дзяўчыну ад буры, прапанаваўшы месца ў экіпажы, і збочыў з кірунку, каб падвезьці яе дамоў, у старажытную, уладкаваную для жытла капліцу на беразе мора, на двары якой было поўна клетак з галубамі, – іх відаць было з вуліцы. Па дарозе яна распавяла яму, што менш за год таму выйшла замуж за гандляра, што прадаваў на рынку ганчарныя вырабы. Флярэнтына Арыса часта бачыў, як той сыходзіў з караблёў ягонай кампаніі, цягнучы скрыні з рознымі збанамі для продажу альбо несучы цэлы сьвет галубоў у лазовых клетках, якімі карысталіся маці на рачных караблёх для правозу немаўлятак. Алімпія Сулета, верагодна, належала да сямейства асіных, і ня толькі праз доўгія лыткі ды невыразны бюст – яна ўся была нейкая такая: валасы нібы зь меднага дроту, на твары – сонечнае рабаціньне, вочы – круглявыя і жывыя, расстаўленыя шырэй, чым у іншых людзей, галасок – танклявы, да таго ж яна гаварыла зрэдчас і выказвала адно што слушныя і вясёлыя думкі. Флярэнтына Арысу яна падалася больш забаўнай, чым прыцягальнай, і ён забыўся пра яе, толькі высадзіў ля дому, дзе яна жыла з мужам, цесьцем і іншымі мужавымі сваякамі.

Колькі дзён пазьней ён зноўку заўважыў ейнага мужа ў порце – той не згружаў скрыні, а наадварот – загружаў іх, і калі карабель адплыў, Флярэнтына Арыса дакладна пачуў каля самага вуха голас д'ябла. Увечары ён адвёз дзядзьку Леона XII дамоў, затым праехаў нібыта выпадкова побач з жытлом Алімпіі Сулеты і ўгледзеў яе праз паркан: яна карміла

неспакойных галубоў. Не выходзячы з экіпажу, ён крыкнуў ёй праз агароджу: «Колькі каштуе адна галубка?» Яна пазнала яго і вясёла адказала: «Яны не прадаюцца». Тады ён зноў спытаў: «Што ж мне рабіць, каб займець галубку?» Не перапыняючы свайго занятку, яна адказала: «Досыць ураставаць галубятніцу ад навальніцы, як у мінулую пятніцу». Гэтак, Флярэнтына Арыса вярнуўся ўвечары дамоў з падарункам ад Алімпіі Сулеты ў знак падзякі – паштовым голубам з мэталёвым колцам на лапцы.

Наступным днём, якраз падчас абеду, гожая галубятніца ўбачыла падараную птушку ў сябе на двары і падумала, што тая зьляцела ад новага гаспадара. Яна ўзяла яе ў рукі, каб разглядзець, і знайшла пад бляшаным пярсьцёнкам паперку – гэта было прызнаньне ў каханьні. Флярэнтына Арыса пакінуў пісьмовы сьлед у першы раз, але не ў апошні, хоць жа тады ён меў пільнасьць не падпісацца. Назаўтра, у сераду, ён ужо ўваходзіў у дом, калі нейкі хлапчук з вуліцы ўручыў яму тую ж птушку ў клетцы з вусным наказам, маўляў, што вось галубятніца прасіла ўручыць і яшчэ перадаць: трымайце птушку, калі ласка, у зачыненай клетцы, каб не зьлятала, бо яна вяртае яе вам у апошні раз. Флярэнтына Арыса ня мог уцяміць: ці то птушка, летучы, згубіла ліст, ці то галубятніца вырашыла прыкінуцца дурніцай, ці то вяртала птушку для таго, каб ён зноўку перадаў ліст. Аднак у гэтым разе натуральна было б вярнуць птушку з адказам.

У суботу раніцой, пасьля доўгага роздуму, Флярэнтына Арыса накіраваў галубку з чарговым лістом бяз подпісу. І ўжо ўвечары той самы хлапчук зноў прынёс птушку ў іншай клетцы і сказаў, што вось яшчэ раз вяртаюць вам птушку, што зьляцела, тры дні назад вярнулі яе пану з выхаванасьці, а сёньня з-за шкадаваньня, але цяперака вы сапраўды не пабачыце яе, калі зноў адпусьціце. Трансыта Арыса дапазна забаўлялася з птушкай, даставала яе з клеткі, трымала ў руках, як немаўля, люляла яе пад калыханку, і раптам заўважыла, што за пярсьцёнкам была паперка, а ў ёй толькі тры словы: «Не прымаю ананімак». Калі Флярэнтына Арыса прачытаў гэтыя словы, сэрца забілася так, нібыта тое была кульмінацыя першай у жыцьці любоўнай прыгоды, і ўначы спалося яму

кепска, ён усё круціўся ў ложку ад нецярплівасьці. Раніцой, да таго, як сысьці на працу, ён зноў адпусьціў птушку з амурным пасланьнем, пад якім паставіў выразны подпіс і, да таго ж, прычапіў да пярсьцёнка самую сьвежую, яркую ды духмяную ружу са свайго саду.

Ня ўсё было так проста. Нават пасьля трох месяцаў заляцаньняў гожая галубятніца адказвала аднолькава: «Я ня з тых». Але яна не пераставала прымаць цыдулкі і прыходзіць на сустрэчы, якія Флярэнтына Арыса ладзіў так, нібыта яны сустракаліся выпадкова. Яго было не пазнаць: палюбоўнік, які ніколі ня дзейнічаў адкрыта, самы прагны, але й самы сквапны ў справах каханьня, які нічога не даваў, але браў, ён, які ніколі не дазваляў сабе захаваць у сэрцы нават бліскавічнага сьледу, патаемны паляўнічы раптам выйшаў на сьвет боскі з плыньню падпісаных лістоў, галянтных падарункаў, недарэчных шпацыраў каля хаты галубятніцы, у двух выпадках нават ведаючы, што ейны муж не ў вандроўцы і не на рынку. Тое быў першы выпадак, калі ён адчуў стралу Амура ў самым сэрцы.

Праз шэсьць месяцаў, нарэшце, адбылася іхная першая інтымная сустрэча ў каюце рачнога карабля, які стаяў ля прычалу для пафарбоўкі. Вечар быў цудоўным, Алімпія Сулета любіла вясёла, сапраўды з душою шумлівай галубятніцы, потым доўга ляжала распранутая ў млявым спакоі, напаўняючы прастору адпачынкам, ад якога атрымлівала такую самую асалоду, як ад мілаваньня. Каюта была напаўразабраная, яе толькі пачалі фарбаваць, і доўгія гады пах шкіпінару выклікаў у памяці згадкі пра шчасьлівы вечар. Раптам, у парыве нахабнага натхненьня, Флярэнтына Арыса адкрыў бляшанку з чырвонай фарбай, што валялася пад ложкам, абмакнуў указальны палец і намаляваў на лабку гожае галубятніцы крывавую стралу з накірункам на поўдзень, а над стралою вывеў словы: «Гэтая птушка – мая». Уначы Алімпія Сулета распранулася перад мужам, забыўшыся на гэта, і ён ня вымавіў ані слова, толькі пайшоў у прыбіральню па лязо, пакуль яна апранала начную кашулю, і з аднаго ўзмаху перарэзаў ёй горла.

Флярэнтына Арыса дазнаўся пра гэта шмат дзён пазьней, калі схапілі мужа, што кінуўся наўцёкі, і той распавёў журналістам

аб прычынах і спосабе забойства. Цягам многіх гадоў Флярэнтына Арыса з жахам думаў пра лісты з подпісам, ведучы рахунак гадам зьняволеньня забойцы, які добра ведаў яго па справах, бо ён жа карыстаўся караблямі кампаніі. Ён ня так баяўся ўдару лязом па шыі альбо публічнага скандалу, як фатальнасьці таго, што Фэрміна Даса можа дазнацца пра ягоную нявернасьць. Адным з тых дзён прыдушанага чаканьня жанчына, якая даглядала Трансыту Арысу, затрымалася на рынку даўжэй, чым заўсёды, праз раптоўную навальніцу, і калі вярнулася дамоў, знайшла Трансыту Арысу мёртвай. Яна сядзела ў гойдалцы зь вянком з папяровых кветак на галаве, нафарбаваная, як заўжды, але з вачыма такімі жывымі і з такой хітраватай усьмешкай на вуснах, што жанчына толькі празь дзьве гадзіны заўважыла, што Трансыта была нежывая. Незадоўга да сьмерці Трансыта Арыса раздала суседзкім дзецям каштоўныя камяні і залатыя рэчы са збаноў, што датуль перахоўваліся пад ложкам, прыгаворваючы, што гэта цукеркі, іх можна есьці, і некаторыя найкаштоўнейшыя рэчы вярнуць не ўдалося. Флярэнтына Арыса пахаваў маці ў старажытным маёнтку Ля-Мана-дэ-Д'ёс, які быў вядомы як Халерныя могілкі, і над магілкай пасадзіў ружовы куст.

У часе самых першых наведваньняў могілак Флярэнтына Арыса выявіў, што непадалёк пахаваная і Алімпія Сулета, бяз помніка, але імя і дата былі выведзеныя пальцам па сьвежым бэтоне надмагільнай пліты, і Флярэнтына Арыса ў жаху падумаў, што тое была крывавая кпіна ейнага мужа. Калі ружовы куст квітнеў, ён употай пакідаў адну ружу на магілцы Алімпіі Сулеты, а пазьней пасадзіў чаранок ад матчынага куста. Кусты так забуялі, што Флярэнтына Арыса мусіў браць з сабою садовыя нажніцы ды іншыя інструмэнты, каб іх парадкаваць. Але гэта было вышэй за ягоныя сілы, – праз пару гадоў кусты распаўзьліся, як пустазельле, сярод магілаў, і людзі перайменавалі былыя Халерныя могілкі ў Ружовыя, пакуль нейкі алькальд, які сваім здаровым сэнсам саступаў народнай мудрасьці, не загадаў выкарчаваць за ноч усе ружы і павесіць на ўваходнай арцы новую назву ў рэспубліканскім стылі: Унівэрсальныя могілкі.

Матчына сьмерць зноўку прысудзіла Флярэнтына Арысу да

суворага распарадку: кантора, сустрэчы з чарговымі палюбоўніцамі па жорсткім графіку, партыі даміно ў Камэрцыйным клюбе, тыя ж кніжкі пра каханьне, нядзельныя наведваньні могілак. Гэта была іржа руціны, ганебная і страшная, якая, аднак, ратавала яго ад усьведамленьня свайго веку. Але неяк нядзельным сьнежаньскім днём, калі садовыя нажніцы ўжо не дапамагалі ў барацьбе супраць ружовага кустоўя, ён заўважыў, што ластаўкі сядзяць на толькі што працягнутых электрычных лініях. Ён раптоўна ўцяміў, колькі часу мінула пасьля матчынай сьмерці, і колькі – з дня забойства Алімпіі Сулеты, а яшчэ колькі – зь іншага, далёкага сьнежаньскага вечара, калі Фэрміна Даса даслала яму ліст, у якім пісала, што так, што будзе кахаць яго вечна. Да гэтага дня ён жыў так, нібы час мінае толькі для іншых. А вось на мінулым тыдні ён сустрэў на вуліцы адну са шматлікіх параў, якія злучыліся дзякуючы напісаным ім лістам, і не пазнаў першынца, свайго хроснага. Ён выйшаў зь няёмкага становішча пры дапамозе гучнай дзяжурнай фразы: «О, дык ён ужо сапраўдны мужчына!» Флярэнтына Арыса застаўся, якім быў раней, і пасьля першых сыгналаў трывогі ягонага цела, бо датуль здароўе ў яго было бы каменным, як ва ўсіх зьнешне хваравітых людзей. Трансыта Арыса часта казала: «Мой сын хварэў толькі на халеру». Яна блытала халеру з каханьнем, зразумела, яшчэ задоўга да таго, як згубіла памяць. Але так ці інакш, яна памылялася, бо ейны сын патаемна перажыў шэсьць трыпэраў, хоць лекар сьцьвярджаў, што іх было ня шэсьць, а адзін – усё той самы, які чапляўся зноў пасьля кожнага прайгранага двубою. Апрача таго, у яго быў аднойчы бубон, чатыры разы чыры і шэсьць разоў экзэмы, аднак ні яму, ні якому-кольвек іншаму мужчыну не прыйшло б да галавы лічыць гэта нечым іншым, чым баявымі трафэямі.

Толькі-толькі адзначыўшы саракагодзьдзе, яму давялося зьвярнуцца да лекара са скаргай на незразумелы боль у розных частках цела. Пасьля некалькіх аглядаў лекар зрабіў выснову: «Гэта праблемы веку». Ён заўсёды вяртаўся дамоў і нават не пытаўся ў сябе, ці сапраўды ўсё гэта мае дачыненьне да яго. Адзіная кропка адліку яго мінулага была ў каханьні да Фэрміны Дасы, і толькі тое, што адносілася да яе, тычылася і пражытага жыцьця. Так што ў дзень, калі Флярэнтына Арыса

бачыў ластавак на электрычных лініях, ён перабіраў мінулае з самага далёкага ўспаміну. Ён прыгадваў выпадковых палюбоўніц, незьлічоныя рыфы, якія абыходзіў, каб здабыць пасаду загадчыка кампаніі. На памяць прыйшло мноства інцыдэнтаў, справакаваных бязьлітасным рашэньнем пра тое, што Фэрміна Даса будзе зь ім і ён зь ёю, што б ні здарылася, насуперак перашкодам. І толькі тады ён уцяміў, што жыцьцё мінае. Яго ўсхваляваў глыбінны жар, які ішоў зь нетраў цела, у вачох сьцямнела, і яму давялося кінуць на зямлю садовыя інструмэнты і абаперціся аб глухую сьцяну могілак, каб яго ня кінуў на зямлю першы ўдар драпежнай лапы сьмерці.

– Чорт падзяры, – ускрыкнуў ён у жаху, – усё гэта – трыццаць гадоў таму!

Так яно і было. Трыццаць гадоў мінулі таксама, зразумела, і для Фэрміны Дасы, але для яе гэтыя гады былі самымі прыемнымі і плённымі ў ейным жыцьці. Страшныя дні ў палацы Касальдуэра засталіся на сьметніку ейнай памяці. Яна жыла ў новым доме, у раёне Ля-Манга, будучы поўнай гаспадыняй свайго лёсу. Жыла з мужам, якога абрала б сярод усіх мужчынаў сьвету, калі б давялося абіраць зноў. Зь ёю былі сын, які працягваў сямейную традыцыю ў Школе мэдыцыны, і так падобная да яе дачка, што часам яе трывожыла адчуваньне паўторанасьці. Тройчы яна езьдзіла ў Эўропу пасьля трагічнай вандроўкі, зь якой вырашыла не вяртацца ніколі, каб пазбавіцца ад няспыннага жаху жыцьця ў родавым палацы зь сям'ёю мужа.

Напэўна, Бог пачуў, нарэшце, ейныя малітвы: праз два гады жыцьця ў Парыжы, калі Фэрміна Даса і Хувэналь Урбіна ледзь намацвалі рэшткі каханьня сярод руінаў мінулага жыцьця, начная тэлеграма страсянула іх весткай пра тое, што доньня Блянка дэ Ўрбіна ў цяжкім стане, а затым амаль адразу прыйшло паведамленьне пра ейную сьмерць. Яны тут жа вярнуліся. Фэрміна Даса сышла з карабля, апранутая ў чорную туніку, свабодны пакрой якой ня здолеў схаваць яе стану. Насамрэч, яна зноўку зацяжарала, і чуткі пра гэта спарадзілі ананімную песеньку, не зласьлівую, хутчэй, хітраватую, чый рэфрэн застаўся модным да канца году: «І што гэта робіць

прыгажуня ў Парыжы, што заўжды вяртаецца дамоў, каб нарадзіць?» Нягледзячы на грубасьць тэксту, доктар Хувэналь Урбіна замаўляў гэтую песьню і шмат гадоў пазьней на сьвятах у Грамадзкім клюбе як знак добрага настрою.

Палац маркіза Касальдуэра і ягонага роду, пра паходжаньне і пра геральдыку якога ня мелася дакладных сьведчаньняў, напачатку быў прададзены муніцыпалітэту за разумную цану, а пасьля, калі галяндзкі дасьледчык правёў раскопкі і даказаў, што там знаходзілася сапраўдная магіла Хрыстафора Калюмба – пятая па ліку, – дом перапрадалі за вялізныя грошы цэнтральнаму ўраду. Сёстры доктара Ўрбіна засталіся бяз воты ў кляштары салесіянак, і Фэрміна Даса жыла ў старым бацькавым доме, пакуль ня скончылі будоўлю вілы ў раёне Ля-Манга. Яна ўвайшла ў новы дом цьвёрдым крокам, увайшла гаспадыняй, з ангельскай мэбляй, прывезенай зь вясельнай вандроўкі і дадаткова купленай падчас ваколсьветнага круізу. Зь першага дня яна ўзялася напаўняць дом рознымі відамі трапічных жывёлаў, якіх сама набывала на шхунах з Антыльскіх астравоў. Яна ўвайшла з адваяваным мужам, з добра выгадаваным сынам і з дачкою, якая нарадзілася праз чатыры месяцы пасьля вяртаньня, і яе ахрысьцілі імем Афэлія. Доктар Урбіна, са свайго боку, зразумеў, што ня зможа вярнуць сабе жонку цалкам, каб яна была настолькі ягонай, як падчас вясельнай вандроўкі, бо частка любові, якой яму так не ставала і па якой ён сумаваў, была аддадзена дзецям разам з большаю часткай ейнага часу, але доктар навучыўся жыць і быць задаволеным рэшткамі ейнага каханьня. Жаданая гармонія дасягнула кульмінацыі, калі менш за ўсё чакалі, – падчас аднае ўрачыстай вячэры падалі вельмі смачную страву, якую Фэрміна Даса ня здолела апазнаць. Яна зьела вялікую порцыю, але ёй так спадабалася, што яна тут жа ўзяла яшчэ і ўжо шкадавала, што нельга замовіць яшчэ праз прымхі добрага тону, калі дазналася, што зьела зь вялізнай асалодай дзьве поўныя талеркі бакляжаннага пюрэ. І прайграла яна з годнасьцю: з тае пары ў віле, якая ўпрыгожвала раён Ля-Манга, падавалі бакляжаны на ўсе способы амаль гэтак сама часта, як гэта рабілі ў палацы Касальдуэра. І ўсе елі іх, ды так, што доктар Хувэналь Урбіна жартаваў на старасьці гадоў, прыгаворваючы, што хацеў бы мець яшчэ адну дачку, каб назваць яе самым

любімым у доме імем: Бэрэнхэна* Ўрбіна.

Фэрміна Даса ведала, што прыватнае жыццё, у адрозненне ад грамадзкага, зьменлівае і непрадказальнае. Ня проста было вызначыць істотную розьніцу паміж дзецьмі і дарослымі, аднак, добра падумаўшы, яна аддавала перавагу дзецям, бо іхнія крытэры выяўляліся больш слушнымі. Ледзь яна абжанулася ў сьпеласьці і пазбавілася, нарэшце, усялякіх міражоў, яе ад ёй замаячыла расчараваньне, бо яна ніколі не была такой, якой марыла быць у маладосьці, у Эвангельскім сквэрыку, а сталася – хоць ніколі раней не асьмельвалася прызнацца ў гэтым – прывілеяванай прыслужніцай. У грамадзтве з часам яе палюбілі, і яна трымалася вольна, таму яе баяліся больш за ўсё, але ні ў чым не патрабавалі больш і не прабачалі менш, чымся ў кіраваньні домам. Заўсёды яна адчувала, што жыве жыццём, якое міласэрна пазычыў ёй муж – паўнаўладная каралева бязьмежнай дзяржавы шчасьця, якое збудаваў ён і толькі для сябе самога. Яна ведала, што ён кахае яе больш за ўсё на сьвеце, але кахае толькі для сябе, найлепшага ў сьвеце.

Але ад чаго ўсур'ёз пакутавала яна, дык гэта ад пажыцьцёвага прысуду гатаваньня штодзённых абедаў. Яны ня толькі мусілі падавацца своечасова – ад іх патрабавалася дасканаласьць, да таго ж, гэта мусіла быць менаваіта тое, чаго яму ў дадзеным выпадку хацелася, без папярэдніх узгадненьняў. Калі яна часам зьвярталася да яго з пытаньнем на гэты конт, захоўваючы бяздумную цырымонію хатняга рытуалу, дык ён нават не адводзіў вачэй ад газэты для адказу: «Што заўгодна». І ён казаў праўду, і тон яго быў прыемным, бо цяжка было ўявіць сабе менш дэспатычнага мужа. Але падчас абеду трэба было падаваць ня што заўгодна, а менавіта тое, што ён жадаў, і без наймізэрнейшых адхіленьняў: каб мяса ня пахла мясам, рыба – рыбай, сьвініна – скурай, а птушка пёрамі. Яшчэ да наступу сэзону спаржы трэба было даставаць яе за любыя грошы, каб ён мог суцешыцца выпарэньнямі сваёй уласнай мачы ў прыбіральні. Яна не вінаваціла яго – вінаваціла сваё жыццё. Досыць было яму толькі засумнявацца, як ён адсоўваў талерку са словамі: «Ежа прыгатаваная безь любові». У гэтым ён праяўляў фантастычнае натхненьне. Аднойчы, ледзь пакаштаваўшы рамонкавы настой, ён вярнуў кубак з фразай:

«Гэтае пойла аддае акном». Фэрміна Даса з усёй прыслугай зьдзівіліся, яны ня ведалі чалавека, які мог бы выпіць адвар акна, але толькі пакаштаваўшы яго, яны зразумелі: так, менавіта такі быў смак старога падгнілага акна.

Гэта быў узорны муж: ніколі не падымаў нічога з падлогі, не гасіў сьвятла, не зачыняў дзьвярэй. У змроку раніцы, калі ў вопратцы не ставала аднаго гузіка, яна чула ягоныя словы: «Добра было б мець дзьвюх жонак, – адну для каханьня, а другую – прышываць гузікі». Штодня, толькі пачаўшы піць каву альбо ўзяўшы першую лыжку поліўкі, ён раптам пачынаў раўці, нікога ўжо не пужаючы, і тут жа сьледавалі словы палёгкі: «Калі я сыду з гэтага дому, ведайце, што мне абрыдла жыць з абпаленым ротам». Ён казаў, што ў доме ніколі не гатавалі такіх смачных і разнастайных абедаў, як у тыя дні, калі ён ня мог есьці з-за разгрузкі з выкарыстаньнем паслабляльнага, і верыў, што гэта – жончыны хітрыкі, і ўрэшце ён адмовіўся ад прыманьня паслабляльнага, калі яна не прымала яго разам зь ім.

Ён дапёк яе сваім бяздушшам, і аднойчы Фэрміна Даса сказала, што на дзень народзінаў хоча атрымаць нязвыклы падарунак: каб ён адзін дзень пазаймаўся хатнімі справамі. Ён радасна пагадзіўся і на золку насамрэч прыняў лейцы кіраваньня домам. І загадаў падаць сапраўды выдатны сьняданак, але забыўся на тое, што яна не магла есьці яечню, да таго ж, не піла каву з малаком. Потым распарадзіўся гатаваць урачысты абед на восем пэрсонаў і загадаў накрываць сьвяточны стол, – словам, так імкнуўся гаспадарыць лепш за яе, што апоўдні яму давялося капітуляваць без адзінай адзнакі сораму. Зь першага моманту ён здагадаўся, што ня ведае, дзе што знаходзіцца, асабліва на кухні, і прыслужніцы дазволілі яму перавярнуць усё ў пошуках кожнае драбязы, бо яны таксама ўвайшлі ў гульню. А дзясятай ён не пасьпеў вырашыць адносна дэталяў абеду, бо не была скончаная ўборка ў доме і не прыбраная спальня. Ванны пакой застаўся нявымытым, ён забыўся папоўніць запас гігіенічнай паперы, памяняць прасьціны і накіраваць возьніка па дзяцей. Заадно пераблытаў ролі прыслужніц, то бок загадаў кухарцы перасьцілаць пасьцелі, а пакаёвак накіраваў на кухню. Аб адзінаццатай, калі вось-вось мусілі прыйсьці госьці, у доме

быў такі хаос, што Фэрміна Даса зноўку прыняла лейцы кіраваньня, душачыся са сьмеху. Але не зь пераможным выглядам, як меркавала, а ўзрушаная шкадобаю пры выглядзе бездапаможнасьці мужа ў хатніх справах. Ён уздыхнуў з сумам і выказаў спрадвечны аргумэнт: «Прынамсі, я справіўся ня горш, чымся ты б лекавала людзей». Але навука была карыснай, і ня толькі для яго. Праз шмат гадоў кожны сваім шляхам прыйшоў да мудрай высновы пра тое, што яны не маглі жыць разам і кахаць адно аднаго інакш: на гэтым сьвеце няма нічога складанейшага за каханьне.

У зэніце свайго новага жыцьця Фэрміна Даса бачыла Флярэнтына Арысу на розных грамадзкіх мерапрыемствах, і тым часьцей, чым вышэй уздымаўся ён па службовай лесьвіцы, але яна навучылася паводзіць сябе пры гэтым так натуральна, што з расьсеянасьці не аднойчы забывалася вітаць яго. Яна чула пра яго часта, бо ў дзелавым сьвеце стала агучвалася тэма ягонага асьцярожнага, але нястомнага руху ўгару па адміністрацыйнай лесьвіцы Карыбскай параходнай кампаніі. Яна заўважыла, што ягоныя манеры мяняліся ў лепшы бок, а нясьмеласьць прымала выгляд загадкавага аддаленьня, яму пасавала лёгкая дабаўка вагі, і была да твару нетаропкасьць сталага чалавека, ён нават здолеў годна вырашыць праблему падступнага аблысеньня. Адным толькі Флярэнтына Арыса кідаў выклік часу і модзе – змрочнай вопраткай, анахранічнымі сурдутамі, адзіным капелюшом, страшным парасонам, гальштукамі ў выглядзе стужкі з матчынай крамы, якія насілі хіба што паэты. Фэрміна Даса павольна звыклася глядзець на Флярэнтына Арысу іншымі вачыма і, зрэшты, перастала атаясамліваць яго з млявым юнаком, які сядзеў і ўздыхаў па ёй пад парывамі ветру ў пажоўклым лістападзе Эвангельскага сквэрыку. Ва ўсялякім разе, яна ніколі не пазірала на яго абыякава і заўсёды радавалася добрым весткам пра яго, бо гэтыя весткі паступова аблягчалі цяжар ейнай віны.

Аднак калі яна паверыла ўжо самой сабе, што сьцерла яго назаўсёды з памяці, ён зноў зьявіўся там, дзе яна менш за ўсё чакала, прывідам ейнай настальгіі. Гэта супала зь першымі знакамі старасьці і праявілася так, нібыта ў ейным жыцьці здарылася непапраўнае, і адчуваньне гэтае абвастралася, калі

яна чула грымоты перад дажджом. Самотны гром, каменны і пунктуальны, грымеў у кастрычніку штодня роўна а трэцяй за абедам недзе ў гарах Вільянуэвы, і, як стала нагадвае пра сябе невылечная рана, успаміны з гадамі сталіся яшчэ больш натуральнымі. Новыя падзеі блыталіся ў памяці празь некалькі дзён, а легендарная вандроўка па правінцыі кузіны Ільдэбранды прыгадвалася так дэталёва, нібыта езьдзіла яна ўчора, і ўсё – праз вусьцішную дакладнасьць настальгічных успамінаў. Яна прыгадвала горны Манаўрэ, адзіную вуліцу ў ім, роўную і зялёную, з птушкамі шчасьця, з домам жахаў, дзе яна прачыналася ў кашулі, мокрай ад сьлёз Пэтры Маралес, што памерла ад каханьня шмат гадоў таму ў тым самым ложку, дзе Фэрміна Даса тады спала. Яна згадвала смак гуаявы, які больш ніколі ня быў такім, свае прадчуваньні, такія моцныя, што іхны шэпт заглушаў пошум дажджу, тапазавы бляск вечароў у Сан-Хуан-дэль-Сэсары, калі яна выходзіла на шпацыр з чародкаю шумных кузін і сьціскала зубы, каб ня выскачыла сэрца, калі яны праходзілі паўз тэлеграфную кантору. Яна, не гандлюючыся, прадала дом бацькі. Ёй балюча было прыгадваць юнацтва, бачыць з гаўбца пусты сквэрык, адчуваць прарочы водар гардэніяў душнымі начамі і зноў перажываць страх перад старасьвецкім дамскім партрэтам таго лютаўскага дня, калі вырашыўся ейны лёс, і куды б ні павярнула памяць тых часоў, яна абавязкова сутыкала яе з Флярэнтына Арысам. Аднак яна заўсёды цьвяроза ацэньвала сытуацыю і разумела, што гэта не былі ўспаміны пра каханьне альбо каяньне, а толькі памяць пра горкі сум, які пакідаў па сабе доўгі сьлед сьлёзаў. Яна ня ведала, што і ёй пагражала тая самая пастка спагады, у якую траплялі выпадковыя ахвяры Флярэнтына Арысы.

Фэрміна Даса трымалася за мужа. Тым часам і муж усё больш адчуваў патрэбу ў ёй, бо апярэджваў яе ў веку на дзесяць гадоў, хістаючыся самотна ў тумане старасьці і слабеючы як мужчына. Зрэшты яны настолькі спазналі адно аднаго, што, дасягнуўшы трыццацігодзьдзя сумеснага жыцьця, сталіся нібыта адной істотай з двума тварамі і пачуваліся няёмка, калі часта ненаўмысна ўгадвалі думкі адно аднаго альбо калі прылюдна незнарок вымаўлялі тое, што мусіў сказаць другі. Яны разам пераадолелі будзённыя непаразуменьні, раптоўныя пыханьні гневу, наўзаемныя гідоты і казачныя бліскавіцы шлюбнае

блізкасьці. Пад той час яны кахалі адно аднаго бязь сьпеху, не перагінаючы палкі, і абое былі сьвядома ўдзячныя адно аднаму за невераемныя перамогі над злыбедамі. Жыцьцё, зразумела, гатавала ім і іншыя сьмяротныя выпрабаваньні, але гэта ўжо не было такім важным: яны былі на другім беразе жыцьця.

З прычыны наступленьня новага стагодзьдзя была падрыхтаваная незвычайная праграма ўрачыстасьцяў, сярод якіх самай незабыўнай сталася першая вандроўка на паветраным шары, плён невычэрпнай ініцыятывы доктара Ўрбіна. Паўгораду сабралося на Арсэнальным пляцы, каб палюбавацца вялізным шарам з тафты колераў нацыянальнага сьцяга, які павёз першую паветраную пошту ў Сан-Хуан-дэ-ля-Сіенагу – трыццаць ліг на паўночны ўсход напрасткі. Доктар Хувэналь Урбіна з жонкаю, якія зьведалі хваляваньні палёту на Сусьветнай выставе ў Парыжы, першымі ўзьняліся ў лазовую гандолу, за імі рушыў бартавы інжынэр і шэсьць ганаровых гасьцей. Яны везьлі муніцыпальным уладам Сан-Хуан-дэ-ля-Сіенагі ліст губэрнатара правінцыі, у якім фіксаваўся гістарычны факт першай перасылкі пошты паветраным шляхам. Рэпартэр з «Камэрцыйнай газэты» спытаў у доктара Хувэналя Ўрбіна, якія былі б ягоныя разьвітальныя словы ў выпадку, калі ён загіне ў палёце, і доктар, не задумваючыся, выдаў адказ, за які пасьля многія яго лаялі.

– На мой погляд, – сказаў ён, – XIX стагодзьдзе скончылася для ўсяго сьвету, але толькі не для нас.

Згублены сярод наіўнага натоўпу, які засьпяваў нацыянальны гімн, калі паветраны шар пачаў набіраць вышыню, Флярэнтына Арыса пагадзіўся з чалавекам, які камэнтаваў у натоўпе, што падобная авантура не пасуе жанчыне, тым больш, у веку Фэрміны Дасы. Дарэчы, вандроўка выявілася не такой ужо небясьпечнай. Прынамсі, было болей прыгнечанасьці, чым небясьпекі. Паветраны шар даляцеў да пункту прызначэньня безь перашкодаў, палёт быў спакойны, неба – неверагодна сінім. Яны ляцелі добра і вельмі нізка з прыемным спадарожным ветрам, спачатку над засьнежанымі вяршынямі ўзгор'я, а пасьля над бясконцаю багнай Сіенагі-Грандэ.

Зь нябёсаў яны бачылі, як бачыць іх Бог, руіны старажытнага і гераічнага гораду Картахэна-дэ-Інд'яс; гэта быў найпрыгажэйшы горад у сьвеце, пакінуты жыхарамі ў паніцы перад халерай, хоць да таго яны цягам трох стагодзьдзяў трывалі блякады ангельцаў ды флібуст'ерскія набегі. Яны бачылі некранутыя муры фартэцыі, пустазельле на вуліцах, умацаваньні, ахінутыя дываном з братак, мармуровыя палацы і залатыя аўтары, віцэ-каралёў, што згнілі жыўцом ад халеры ў сваіх дасьпехах.

Яны ляцелі над старажытнымі забудовамі на пблях Трохас-дэ-Катакі, пафарбаванымі ў вар'яцкія колеры, угледзелі фэрмы, дзе разводзілі ігуанаў на мяса, гронкі бальзаміну і вадзяныя астры ў садовых сажалках. Сотні голых дзяцей кідаліся ў ваду. Яны былі радасна ўзбуджаныя ад азартных выклікаў і скакалі з вокнаў, ляцелі ў ваду з дахаў дамоў, а таксама з лодак, якімі яны кіравалі зь дзівосным спрытам. Яны сноўдалі ў вадзе, нібыта рыбіны-шалёнкі, каб злавіць торбу з вопраткай, флякон зь пілюлямі ад кашлю, харчы – гожая жанчына ў капелюшы з плюмажам кідала ім усё гэта з гандолы паветранага шара.

Яны ляцелі, пакідаючы за сабой бананавыя плянтацыі, падобныя да акіяну, поўнага таямніцаў і ценяў, і ціша ўздымалася да іх выпарэньнямі сьмерці. Фэрміна Даса прыгадала сябе малой дзяўчынкай – ёй было тры, сама больш чатыры гады, калі яна шпацыравала па змрочным лясным гушчары за руку з маці. Маці таксама выглядала зусім маладой сярод дам у мусьлінавых строях, як і яна, у газавых капелюшах і зь белымі парасончыкамі. Кіроўца паветранага шара, які разглядаў навакольле празь бінокль, раптам сказаў: «Яны як мёртвыя». Ён перадаў бінокль доктару Хувэналю Ўрбіна, і той убачыў калёсы сярод ральлі з упрэжанымі валамі, межавыя слупы ўздоўж чыгункі, застылыя ірыгацыйныя каналы, і паўсюль, дзе толькі спыняўся позірк, ён бачыў раскінутыя целы людзей. Хтосьці сказаў, што зноў халера спусташае паселішчы ў раёне Сіенагі-Грандэ. Доктар Урбіна адказаў, не адводзячы вачэй ад бінокля:

– Гэта мусіць быць вельмі спэцыфічны від халеры, бо ў кожнага чалавека ў патыліцы – сьлед ад «кулі міласэрнасьці».

Трохі пазьней яны праляцелі над усьпененым морам і без асаблівых прыгодаў завершылі пасадку на сьпякотным пляжы, які паліў жывым полымем: уся зямля наўкола была разьедзеная салетраю. Там іх сустрэлі прадстаўнікі мясцовых уладаў, што бараніліся ад сонца адно звычайнымі парасонамі. Вучні пачатковых школаў размахвалі сьцяжкамі ў такт гімну. Каралевы прыгажосьці, з упрыгожваньнямі з павялых красак і ў залатых каронах з кардону, пакутавалі ў чаканьні, а побач стаяла гаспадыня папаевай плянтацыі з заможнай сялібы Гайра, якая ў тыя часы была найлепшай на Карыбскім узьбярэжжы. Фэрміна Даса хацела толькі пабываць яшчэ раз у роднай вёсцы, каб параўнаць існае з самымі даўнімі сваімі згадкамі, аднак ім не дазволілі гэтага зрабіць з-за халеры. Доктар Хувэналь Урбіна ўручыў гістарычнае пасланьне губэрнатара, якое пазьней назаўсёды згубілася сярод нікому не патрэбных паперак, а дэлегацыя ў поўным складзе ледзь не задыхнулася ад сьпякоты ды манатоннасьці прамоваў. Пры канцы ўрачыстасьці гасьцей павезьлі на мулах да самае прыстані ў Пуэбла-Б'еха, дзе багна сыходзілася з морам, бо бартавы інжынэр ня здолеў зноў узьняць паветраны шар. Фэрміна Даса была ўпэўненая, што зусім малой яна з маці праяжджала па гэтым шляху ў фурманцы, запрэжанай валамі. Калі Фэрміна падрасла, яна неаднойчы распавядала бацьку пра гэта, але бацька так і памёр, перакананы, што яна ніяк не магла прыгадаць штосьці падобнае.

– Я насамрэч згадваю тую вандроўку, – сказаў ён, – але гэта было, найменей, за пяць гадоў да твайго нараджэньня.

Удзельнікі экспэдыцыі на паветраным шары вярнуліся ў родны порт праз тры дні, адпакутаваўшы ад жорсткага начнога шторму, і былі сустрэтыя, як героі. У натоўпе, зразумела, стаяў і Флярэнтына Арыса, які на твары Фэрміны Дасы ўгледзеў сьляды змучанасьці. Аднак крыху пазьней, удзень, калі ён зноўку назіраў за ёю на выставе роваряў, таксама арганізаванай ейным мужам, Фэрміна Даса выглядала так, нібыта стому рукой зьняло. Яна праехала на неверагодным ровары, які б больш падыходзіў для цыркавых відовішчаў, з задужа высокім пярэднім колам, над якім яна сядзела, і з маленькім заднім, якое ледзьве спраўлялася з роляй апоры. З

гэтай нагоды яна апранула шальвары з разрэзам і чырвонай аблямоўкай, што выклікала асуджэньне старэйшых дам і канфуз сярод мужчынаў, аднак ніхто не застаўся абыякавым да ейнага спрыту.

Гэты вобраз любай жанчыны, як і мноства іншых, якія раптоўна ўзьнікалі цягам столькіх гадоў у памяці Флярэнтына Арыса, калі тое было заўгодна лёсу, ды гэтак жа раптоўна зьнікалі, разьвярэдзіў ягонае сэрца. Аднак успаміны тыя сталіся тычкамі на ягоным жыцьцёвым шляху, бо ён зьведваў жорсткасьць часу ня гэтак праз старэньне ўласнага цела, як празь незаўважныя зьмены, якія ён адкрываў у Фэрміне Дасе пры кожнай сустрэчы.

Аднойчы ўвечары Флярэнтына Арыса зайшоў у «Шынок дона Санча» – рэстарацыю найвышэйшага кшталту ў каляніяльным стылі – і сеў за самы аддалены столік, як звычайна рабіў, калі самотна заходзіў сюды, каб зьесьці яшчэ адзін птушыны падвячорак. І тут раптам ён убачыў Фэрміну Дасу ў вялікім люстры на задняй сьцяне залі – яна сядзела за сталом з мужам і яшчэ дзьвюма парамі, ды пад такім вуглом, што ён мог любавацца адлюстраваньнем Фэрміны Дасы ва ўсёй ейнай прыгажосьці. Яна вяла застольную гамонку грацыёзна, ейны сьмех выбухаў, нібы сьвяточны фаервэрк, а гожасьць здавалася ярчэйшай пад вялікім крышталёвым кандэлябрам з падвескамі: Аліса зноў перасекла казачнае люстэрка.

Флярэнтына Арыса любаваўся ёю – глядзеў, стаіўшы подых, як яна ела, як ледзь пакаштавала віно, як жартавала з праўнукам дона Санча, заснавальніка рэстарацыі; Флярэнтына Арыса пражыў разам зь ёю імгненьне ейнага жыцьця за сваім самотным столікам, тое імгненьне, якое цягнулася цэлую гадзіну, ён нясьпешна прайшоўся, бы нябачны прывід, па запаветным краі ейнага прыватнага жыцьця. Пасьля выпіў яшчэ чатыры філіжанкі кавы, каб расьцягнуць час, пакуль не заўважыў, што Фэрміна Даса са сваёй кампаніяй выходзіць з рэстарацыі. Яны прайшлі так блізка ад яго, што ён вылучыў водар парфумы Фэрміны Дасы сярод парфумаў ейных сябровак.

З гэтага вечара і амаль на працягу году Флярэнтына Арыса ўпарта трымаў у асадзе ўладарніка рэстарацыі, прапаноўваючы

яму, што заўгодна, гатоўкай альбо ў іншым выглядзе на выбар, толькі б той прадаў яму люстэрка. Гэта было ня так проста, бо чацьвёрты ў радаводзе ўладальнікаў рэстарацыі стары дон Санча верыў у легенду пра тое, што нібыта разьбяная рама, справа рук венскіх чырванадрэўшчыкаў, была ідэнтычнай раме, якая належала Марыі Антуанэце і зьнікла бясьсьледна: размова ішла пра дзьве ўнікальныя каштоўнасьці. Калі ўладар рэстарацыі нарэшце здаўся, Флярэнтына Арыса павесіў люстэрка ў залі свайго дому, але не з прычыны непераўзыдзенай гожасьці рамы – яго пакарыла ўнутраная прастора люстэрка, якую любы вобраз займаў цягам цэлых дзьвюх гадзінаў.

Амаль заўсёды, калі Флярэнтына бачыў Фэрміну Дасу, яна ішла пад руку з мужам у поўнай гармоніі, яны нібыта рушылі ў асаблівым полі зь дзівоснай кантактнасьцю, уласьцівай хіба што сіямскім блізьнятам, якая парушалася, толькі калі віталі Флярэнтына. Сапраўды, доктар Хувэналь Урбіна паціскаў яму руку з сардэчнай цеплынёй і нават часамі дазваляў сабе папляскаць яго па плячы. Затое Фэрміна Даса прысудзіла яго да абыякавага рэжыму прынятых фармальнасьцяў і ніколі не зрабіла ні найменшага жэсту, які дазволіў бы падазраваць жанчыну ва ўспамінах часоў ейнага дзявоцтва. Яны жылі ў адрозных сусьветах, аднак калі ён спрабаваў скарачаць адлегласьць паміж імі, яна не рабіла ніводнага кроку насустрач. Прайшло шмат часу перад тым, як ён насьмеліўся падумаць, што абыякавасьць Фэрміны Дасы магла быць толькі ахоўнай бранёй ад пачуцьцяў, якія яе пужалі. Гэтая думка ўзьнікла раптам на цырымоніі хрышчэньня першага рачнога карабля, які быў збудаваны на мясцовай вэрфі. З нагоды афіцыйнай цырымоніі Флярэнтына Арыса таксама ўпершыню прадстаўляў дзядзьку Лявона XII у якасьці першага віцэ-прэзыдэнта параходнай кампаніі. Гэтае супадзеньне надало сьвяту асаблівую ўрачыстасьць, і на караблі прысутнічалі ўсе, хто хоць нешта значыў у жыцьці гораду.

Флярэнтына Арыса прымаў гасьцей у галоўным салёне карабля, які яшчэ захоўваў пахі сьвежае фарбы і бітуму, калі прычал узарваўся воплескамі і духавы аркестар зайграў трыюмфальны марш. Ён зь цяжкасьцю схаваў даўнія пачуцьці,

якія былі зь ім амаль аднаго ўзросту, калі пабачыў жанчыну сваёй мары пад руку з мужам, гожую ў сваёй сьпеласьці, якая праходзіла, нібыта каралева іншых часоў сярод ганаровага каравулу ў параднай форме, пад яркімі стужкамі сэрпантыну і дажджом з натуральных пялёсткаў, якія кідалі з вокнаў. Яны салютавалі ў адказ, аднак Фэрміна Даса была настолькі асьляпляльнай, што, здавалася, стаіць адна перад натоўпам у залацістай вопратцы, якую насілі толькі манархі, у чаравіках на высокіх абцасах, з чарнабуркай на шыі і ў модным капелюшы, падобным да звона.

Флярэнтына Арыса чакаў іх на мастку побач з уладамі правінцыі, пад гукі музыкі, выбухаў фаервэрку і трох моцных гудкоў карабля, якія абдалі парай увесь прычал. Хувэналь Урбіна павітаў уладных асобаў з толькі яму ўласьцівай натуральнасьцю, якая кожнага прымушала думаць, што доктар шануе яго неяк асабліва. Першым стаяў капітан карабля ў параднай форме, за ім паказаўся арцыбіскуп, далей былі губэрнатар з жонкай, алькальд, таксама з жонкай, і вайсковы камэндант гораду, які толькі што прыехаў з андыйскай правінцыі. Апошнім стаяў Флярэнтына Арыса ў строі цёмнага колеру, амаль непрыкметны сярод такіх знакамітасьцяў. Павітаўшы вайсковага камэнданта, Фэрміна нібыта завагалася перад працягнутай рукой Флярэнтына. Вайсковец ужо быў гатовы іх прадставіць адно аднаму, і спытаў яе, ці яны знаёмыя. Яна не адказала ні так, ні не, але падала руку Флярэнтына з салённай усьмешкай. Тое ж самае здаралася двойчы ў мінулым і мусіла здарацца наперад, і Флярэнтына Арыса прымаў гэта як паводзіны, уласьцівыя характару Фэрміны. Аднак на караблі ён раптам спытаў сябе, паддаючыся сіле свайго запаленага ўяўленьня: ці ня ёсьць жорсткая абыякавасьць папросту ўлоўкай, каб схаваць ад яго любоўныя пакуты?

Сама ідэя гэтага абудзіла ягоныя жарсьці. Ён зноўку бадзяўся каля дому Фэрміны Дасы ў такім жа рамантычным парыве, як і шмат гадоў таму ў Эвангельскім сквэрыку, аднак намер быў іншым: не прайсьці, каб яна запрыкмеціла яго, а проста ўбачыць каханую, каб ведаць, што яна яшчэ жыве на белым сьвеце. Аднак пад тыя часы там цяжка было заставацца незаўважным. Квартал Ля-Манга быў ледзь не паўпустэльным

востравам, аддзеленым ад гістарычнага цэнтру гораду каналам, па якім цяклі пазелянелыя воды, з кустоўем ікака па берагах, дзе ў каляніяльныя гады па нядзелях знаходзілі прытулак закаханыя пары. Апошнім часам там разабралі каменны мост, збудаваны яшчэ гішпанцамі, паставілі новы з бэтону з шарападобнымі ліхтарамі і запусьцілі па ім трамвай на мулах. Напачатку жыхарам Ля-Мангі давялося цярпець пакуты, не прадугледжаныя праектам, – яны спалі паблізу першае ў горадзе электрастанцыі, – ейная вібрацыя нагадвала няспынны землятрус. Нават доктар Хувэналь Урбіна з усёй ягонай уладай ня здолеў дабіцца, каб станцыю перанесьлі ў такое месца, дзе б яна нікому не замінала, пакуль не ўмяшалася Воля Нябёсаў, спрычыненасьць доктара да якой была агульнавядомым фактам. Аднойчы ўначы кацёл станцыі выбухнуў, праляцеў са страшнай сілай над новымі дамамі, перасёк паўгораду і разваліў вялікую галерэю старажытнага манастыра Сьвятога Юліяна Гасьціннага. Стары будынак быў закінуты яшчэ да выбуху і пуставаў цэлы год, але кацёл забіў адразу чатырох вязьняў, якія той ноччу ўцяклі зь мясцовай турмы і хаваліся ў капліцы.

Ціхае прадмесьце з добрымі традыцыямі каханьня перастала быць прывабным для закаханых з таго часу, як ператварылася ў квартал багацеяў. Вуліцы пыліліся ўлетку, ператвараліся ў багну ўзімку і былі пустэльнымі круглы год, рэдкія дамы патаналі ў зеляніне садоў, мазаічныя тэрасы, нібыта зробленыя наўмысна, каб патаемныя закаханыя ўпадалі ў адчай, замянілі сабой лёгкія бальконы з каванай аздобай. На шчасьце, тады сталася модным наймаць старажытны экіпаж, перароблены пад аднаго каня, і катацца ўвечары. Маршрут завяршаўся на ўзгорку, адкуль можна было назіраць нібыта разадраны кастрычніцкі захад сонца лепш, чым зь вежы маяка, і людзі бачылі асьцярожных акулаў, якія сачылі за пляжам сэмінарыстаў, а ў чацьвер – аграмадны белы трансатлянтычны карабель, да якога можна было амаль дакрануцца, калі ён праходзіў па канале порту. Звычайна Флярэнтына Арыса наймаў экіпаж пасьля працоўнага дня ў канторы, але ён не апускаў капот, як было прынята ў сэзон сьпякоты, а заставаўся ў глыбіні сядзеньня, нябачны ў цені, заўсёды самотны, заўжды мяняючы маршрут, каб не ўзбудзіць дурных думак у

рамізьніка. Насамрэч шпацыры цікавілі Флярэнтына адным: партэнонам з ружовага мармуру, які хаваўся сярод густой зеляніны плятанавых дрэваў і кустоўя манга, партэнонам, які бездапаможна паўтараў ідылічныя палацы сярод бавоўнавых плянтацыяў Луізіяны. Дзеці Фэрміны Дасы вярталіся дамоў а пятай альбо крыху раней. Флярэнтына Арыса назіраў, як яны набліжаліся да дому ў фамільнай пралётцы, потым бачыў, як доктар Хувэналь Урбіна выяжджаў на штодзённыя візыты да хворых, але амаль за год ягоных назіраньняў ні разу ня ўгледзеў вобраз, пра які марыў.

Аднойчы ўвечары ён настаяў на самотным катаньні, нягледзячы на чэрвеньскую навальніцу, якая вось-вось мусіла пачацца. Тады конь пасьлізнуўся ў гразі ды ўпаў. Флярэнтына Арыса з жахам усьвядоміў, што яны знаходзяцца дакладна перад домам Фэрміны Дасы, і маліў рамізьніка прыдумаць што-кольвек, упусьціўшы, што ягоны адчай мог выдаць сапраўдную мэту шпацыру.

– Толькі ня тут, малю вас, – усклікнуў ён, – дзе заўгодна, толькі ня тут!

Зьдзіўлены трывожным голасам кліента, рамізьнік спрабаваў узьняць кабылу, не расьперазаўшы яе, і колавы стрыжань экіпажа трэснуў. Флярэнтына Арыса выйшаў, як мог, церпячы сорам пад моцным дажджом, і людзі зь іншых экіпажаў прапаноўвалі адвезьці яго дамоў. Пакуль ён чакаў, пакаёўка сям'і Ўрбіна ўгледзела чалавека ў мокрай вопратцы, які боўтаўся па калена, і вынесла яму парасон, каб ён перачакаў на тэрасе. Флярэнтына Арыса ня мог і марыць пра падобную ўдачу ў сваіх неўтаймаваных мроях, аднак тады лепш было б памерці, чымся паказацца Фэрміне Дасе ў гэткім выглядзе.

Калі яны жылі ў старой частцы гораду, кожную нядзелю Хувэналь Урбіна зь сям'ёю хадзілі пешшу ў катэдральны сабор на ранішнюю імшу а восьмай. Гэта была, хутчэй, сьвецкая, чым рэлігійная звычка. Пазьней, калі яны пераехалі ў новы дом, то езьдзілі на экіпажы некалькі гадоў запар, і часам затрымліваліся зь сябрамі пад пальмамі парку. Але празь нейкі час у межах кварталу Ля-Манга сэмінарыя збудавала храм з закрытым пляжам і ўласнымі могілкамі, і сям'я ўжо езьдзіла ў

катэдральны сабор толькі ў асабліва ўрачыстых выпадках. Ня ведаючы пра гэта, Флярэнтына Арыса чакаў некалькі нядзеляў на тэрасе Прыходзкай кавярні і назіраў за выхадам паствы з кожнай імшы. Урэшце ён зразумеў сваю памылку і зьезьдзіў у новы касьцёл, які доўга заставаўся ў модзе, і там знайшоў доктара Хувэналя Ўрбіна зь дзецьмі, яны прыходзілі дакладна а восьмай усе чатыры нядзелі жніўня, але Фэрміны Дасы зь імі не было. У адну зь нядзеляў ён наведаў новыя могілкі, якія месьціліся побач, дзе жыхары Ля-Мангі будавалі свае шыкоўныя пантэоны, і ягонае сэрца здрыганулася, калі ён угледзеў найлепшы з пантэонаў пад раскідзістымі сэйбамі, ужо завершаны. Флярэнтына Арыса бачыў гатычныя вітражы і мармуровых анёлаў, надмагільныя камяні ўсёй сям'і з надпісамі золатам. Сярод іх, зразумела, было і надмагільле доньні Фэрміны Дасы дэ Ўрбіна дэ ля Калье, а затым і ейнага мужа, але з агульнай эпітафіяй: «Разам і ў Божым спачыне».

Да канца году Фэрміна Даса не зьявілася ні на адной з грамадзкіх урачыстасьцяў. Не зьявілася і на калядных сьвяткаваньнях, на якіх яна разам са сваім мужам зазвычай былі ганаровымі галоўнымі ўдзельнікамі. Але асабліва заўважнай сталася ейная адсутнасьць на інаўгурацыі опэрнага сэзону. Падчас антракту Флярэнтына Арыса застаў людзей, якія, безумоўна, гаварылі пра Фэрміну Дасу, не называючы яе. Гаварылі, што хтосьці бачыў, як апоўначы аднаго зь дзён чэрвеня мінулага году яна паднялася на борт трансатлянтычнага карабля фірмы Кунард, які накіроўваўся ў Панаму, што на ёй быў цёмны вэлюм, каб ніхто не заўважыў псоты ад саромнае хваробы, што жэрла яе. Другі спытаў, якая страшная хвароба асьмелілася прыстаць да жанчыны з такой уладай, на што атрымаў злосны адказ:

– Слынная дама здольная захварэць толькі на сухоты.

Флярэнтына Арыса ведаў, што багацеі ягонай зямлі не хварэлі па дробязях. Яны альбо раптоўна паміралі, амаль заўсёды напярэдадні вялікага сьвята, якое адмянялася з прычыны жалобы, альбо згасалі ад доўгіх і мярзотных захворваньняў, інтымныя падрабязнасьці якіх, зрэшты, даходзілі да публікі. Зьняволеньне ў Панаме было амаль абавязковым пакаяньнем у

жыцьці багацеяў. Яны скараліся Божай волі ў Адвэнтысцкай лякарні, у вялізным белым бараку, забытым сярод дагістарычных навальніцаў Дар'ена, дзе хворыя гублялі лік дням рэшткі жыцьця; у самотных пакоях з зацягнутымі фіранкамі ніхто ня мог ведаць пэўна, сымбалем чаго зьяўляецца пах карболавае кіслаты – жыцьця альбо сьмерці. Тыя, хто паправіўся, вярталіся зь цяжарам выдатных падарункаў і раздавалі іх шчодра, нават з адчаем, нібыта перапрашаючы за тое, што засталіся жывыя. Некаторыя вярталіся з жахлівымі шрамамі на жываце, нібыта іх зашыў шавец. У гасьцёх яны ўздымалі кашулі, паказвалі швы на целе, параўновалі са шрамамі тых, хто памёр у тумане наркозу, стойваючы подых ад шчасьця. І да сьмерці бясконца распавядалі пра зьяўленьні анёлаў, якіх яны ўгледзелі пад узьдзеяньнем хлараформу. Аднак ніхто ніколі не апавядаў пра бачаньне тых, хто не вярнуўся, хто памёр выгнаньнікам у аддзяленьнях для сухотнікаў, хутчэй ад суму, што наганяў дождж, чым ад непрыемнасьцяў хваробы.

Флярэнтына Арыса ня ведаў, якая бяда зачапіла Фэрміну Дасу. Аднак перадусім ён хацеў праўды, якой бы яна ні была невыноснай, і ён яе шукаў, але дарэмна. Было неверагодна, што ніхто ня можа падказаць хоць сьлед у сьцьверджаньні пачутае вэрсіі. У сьвеце рачных караблёў, то бок у ягоным сьвеце, не было таямніцаў альбо канфідэнцыйных ведаў, якія надоўга заставаліся такімі. Тым ня менш, ніхто не пачуў ні слова пра жанчыну пад чорным вэлюмам. Ніхто нічога ня ведаў у горадзе, дзе ўсё заўсёды было вядомым, дзе часьцяком даведваліся пра падзеі нават раней, чым яны адбываліся. Асабліва, калі справа тычылася вышэйшага грамадзтва. Аднак ніхто ня здолеў вытлумачыць зьнікненьня Фэрміны Дасы. Флярэнтына Арыса, як і раней, бадзяўся па кварталe Ля-Манга, як чужы слухаў імшу ў базыліцы сэмінарыі, прысутнічаў на грамадзкіх мерапрыемствах, якія б ніколі не зацікавілі яго, будзь ён у іншым душэўным стане, але зь цягам часу ў яго толькі расла вера ў вэрсію пра хваробу каханай. У доме Ўрбіна ўсё выглядала нармальна, калі не лічыць адсутнасьці Фэрміны Дасы.

У сваіх пошуках Флярэнтына Арыса сутыкаўся зь невядомымі

яму раней фактамі, і сярод іх была вестка пра сьмерць Лярэнса Дасы ў роднай кантабрыйскай сялібе. Зяць, які не адбыўся, згадваў, што доўгія гады сустракаў яго падчас шумных шахматных баталіяў у Прыходзкай кавярні, дон Лярэнса ахрып ад бясконцай балбатні, ён стаўся мажным і ўсё больш грубым, пагружаючыся ў зыбкія пяскі нешчасьлівай старасьці. Яны ні разу не размаўлялі пасьля кілішка анісавай падчас незабыўнага сьняданку яшчэ ў мінулым стагодзьдзі, і Флярэнтына Арыса быў упэўнены: Лярэнса Даса ўсё яшчэ памінаў яго ліхам, як і ён – цесьця, які таксама не адбыўся, нават пасьля таго, як дон Лярэнса дабіўся жаданага – багатай партыі для дачкі, што было адзіным сэнсам ягонага жыцьця. Аднак Флярэнтына Арыса так хацеў знайсьці беспамылковую інфармацыю пра здароўе Фэрміны Дасы, што зноў наведваў Прыходзкую кавярню, каб спытацца ў бацькі, і гэта мела месца пад той час, калі разыгрывалі гістарычны турнір, у якім Ерэмія дэ Сэнт-Амур змагаўся адзін супраць сарака двух шахматыстаў. Менавіта тады Флярэнтына Арыса дазнаўся, што Лярэнса Даса памёр, дазнаўся і ледзь ня ўзрадаваўся, нават разумеючы, што цаной ягонай радасьці можа быць жыцьцё бяз праўды пра Фэрміну Дасу. Зь цягам часу ён усё ж паверыў у варыянт пра лякарню і несуцешна паўтараў выслоўе: «Хворая жанчына – вечная жанчына». У дні адчаю ён задавальняўся думкаю пра тое, што вестка пра сьмерць Фэрміны Дасы, калі такі ейны лёс, крый Божа, так ці інакш дойдзе да яго без асаблівых перашкодаў.

Але гэтая вестка ніколі да яго не прыйшла, бо Фэрміна Даса была здаровая і жыла ў маёнтку кузіны Ільдэбранды Санчас, забытая, як яна думала, усім сьветам за паўлігі ад сялібы Флёрэс-дэ-Марыя. Фэрміна Даса зьехала без скандалу і са згодаю мужа, бо яны зь ім заблыталіся, як юнакі, у адзіным сур'ёзным крызісе, які ўзьнік за дваццаць пяць гадоў стабільнага сямейнага жыцьця. Бяда застала іх неспадзявана падчас спакою і сьпеласьці, калі яны ўжо лічылі, што мінулі ўсе рыфы і засады лёсу, а дзеці былі дарослыя і атрымалі добрае выхаваньне, будучыня вымалёўвалася без аблокаў, і яны маглі цалкам засвоіць навуку старасьці бяз горычы. Гэта было так нечакана для іх, што яны не схацелі выпраўляць становішча крыкамі, сьлязьмі і пасярэднікамі, як гэта было прынята ў Карыбскім басэйне. Яны аддалі перавагу мудрасьці эўрапейскіх

нацыяў, але будучы не зусім карыбцамі ды не зусім эўрапейцамі, яны загрузьлі ў стане, хутчэй, інфантыльным і не зьвязаным з характарам людзей якога-кольвек рэгіёну. Зрэшты, яна вырашыла сысьці, нават ня ведаючы, чаму і навошта, яна кіпела ад чыстае злосьці, і ён ня здолеў яе адгаварыць, бо замінала ўсьведамленьне ўласнае вінаватасьці.

Фэрміна Даса сапраўды ступіла на борт карабля апоўначы з усімі перасьцярогамі для захаваньня інкогніта, схаваўшы твар жалобным вэлюмам. Аднак гэта ня быў трансатлянтычны карабель фірмы Кунард, які трымаў шлях на Панаму, а толькі рэйсавы караблік у Сан-Хуан-дэ-ля-Сіенагу, сялібу, дзе яна нарадзілася, жыла ў маленстве, і куды вяла настальгія па родных мясьцінах, якая з гадамі рабілася невыноснай. Супроць волі мужа і звычак эпохі яе суправаджала толькі адна пятнаццацігадовая дзяўчына, якую яна ўдачарыла, яна выхоўвалася разам са служанкамі, але капітаны рачных караблікаў і ўлады ўсіх портаў сьледаваньня былі папярэджаныя пра вандроўку сэньёры. Калі Фэрміна Даса прыняла неабдуманае рашэньне, яна абвясьціла дзецям, што зьбіраецца адпачыць у цёткі Ільдэбранды, аднак сама мела намер застацца ў сялібе назаўсёды. Доктар Хувэналь Урбіна добра ведаў цьвёрдасьць ейнага характару і пакутаваў за тое, што прыняў ад'езд Фэрміны Дасы з пакорай, нібыта Божую кару за цяжкі грэх. Аднак яшчэ не пасьпелі растаць у змроку агні рэйсавага карабліка, як абое ўжо каяліся і кідалі праклёны ўласным слабасьцям.

Нягледзячы на фармальную перапіску, якая тычылася дзяцей і іншых хатніх справаў, прайшло амаль два гады, але ні яна, ні ён не знаходзілі шляху да ейнага вяртаньня, які б ня быў замінаваны ганарлівасьцю. Дзеці паехалі ў Флёрэс-дэ-Марыя на другія ў жыцьці школьныя вакацыі. Фэрміна Даса зрабіла немажлівае, каб паказацца задаволенай новым жыцьцём. Ва ўсялякім разе, так зразумеў Хувэналь Урбіна, які меркаваў пра стан жонкі па лістах сына. Апрача таго, у тыя дні праехаў празь сялібу біскуп Рыёачы, які выяжджаў да паствы пад паліюмам на слыннай белай муліцы з вышытай золатам папонай. За ім валам валілі паломнікі з самых далёкіх сялібаў, музыкі, што гралі на акардэоне, бадзяжныя гандляры ежай і амулетамі. На

працягу трох дзён маёнтак быў набіты калекамі і цяжка хворымі, якія насамрэч ішлі за біскупам ня з тым, каб слухаць мудрыя казаньні і прасіць пра адпушчэньне грахоў, а каб дабіцца міласьці ад муліцы, пра якую гаварылі, што яна творыць цуды ўпотайкі ад гаспадара. Біскуп быў блізкі да дому Ўрбіна дэ ля Калье з тае пары, калі пачаў службу шараговым ксяндзом, і вось аднойчы апоўдні ён уцёк ад цэлага кірмашу, што сачыў за ім, каб паабедаць у маёнтку Ільдэбранды. Пасьля абеду, калі гаварылі толькі пра зямныя справы, біскуп адклікаў Фэрміну Дасу і прапанаваў ёй споведзь. Яна адмовілася далікатна, але цьвёрда і аргумэнтавала адмову тым, што ёй няма ў чым каяцца. Хоць яна не надумала канкрэтнае мэты, прынамсі, сьвядома, усё ж засталася з думкаю, што ейны адказ абавязкова дойдзе да адпаведнага адрасата.

Доктар Хувэналь Урбіна звычайна гаварыў не бяз долі цынізму, што тыя два гады жыцьця аказаліся надта горкімі не зь ягонай віны. Усё здарылася праз дурную звычку жонкі, якая нюхала вопратку ўсёй сям'і і нават уласную, каб вызначыць па пахах, ці ня час іх аддаць у пральню, хоць на першы погляд вопратка выглядала чыстай. Яна рабіла так з маленства і ніколі ня думала, што гэта заганна, пакуль муж не заўважыў за ёю гэтай звычкі ў першую шлюбную ноч. Ён таксама ведаў, што жонка паліла ня менш як тройчы на дзень, замыкаючыся ў ванным пакоі, але не зьвяртаў увагі на гэта, бо жанчыны ягонага кола зазвычай вялі сябе так у кампаніі, каб пагаманіць аб мужчынах, а часамі нават расьпівалі бутэльку ці дзьве вінаграднае гарэлкі і валяліся на падлозе, п'яныя, бы муляры. Аднак манера абнюхваць любую вопратку, якая трапляла ёй пад руку, здавалася доктару ня толькі недарэчнай, але і небясьпечнай для здароўя. Яна прымала ягоныя заўвагі за жарт, як усё, што не жадала абмяркоўваць, і гаварыла, што Бог угнараваў яе выдатным носам івалгі не для аздобы твару. Аднойчы раніцой, калі яна выйшла купіць чагосьці, хатняя прыслуга падняла на ногі ўвесь квартал у пошуках яе трохгадовага сына, бо ня здолела знайсьці яго ў доме. Фэрміна Даса прыйшла, дазналася аб прычыне панікі, пакружляла трохі па доме, нібыта натрэніраваны сабака, і знайшла сына, які заснуў у шафе, дзе ніхто і не дадумаўся шукаць. Зьдзіўлены муж спытаў у яе, якім

чынам яна яго знайшла, і жонка адказала:

– Па паху какашак.

Насамрэч нюх служыў ёй ня толькі для вызначэньня ступені чысьціні вопраткі і пошуку зьніклых дзяцей: гэта быў сродак каардынацыі ва ўсіх аспэктах жыцьця, і перадусім у сьвецкіх справах. Хувэналь Урбіна назіраў фэномэн з моманту нараджэньня іх сям'і, і найбольш яскрава ягонае ўзьдзеяньне праяўлялася на самым пачатку. Фэрміна Даса была чужынкай у коле, якое было настроенае супраць яе, – яна плыла сярод вострых, як нож, густых каралаў непрыязі, не сутыкаючыся ні з кім, і трымалася перад арыстакратыяй з такім самавалоданьнем, што прычынай мог быць толькі звышнатуральны інстынкт. Страшэнны талент, вытокамі якога маглі быць тысячагадовая мудрасьць продкаў альбо хіба што каменнае сэрца, успыхнуў бядой аднойчы ў нешчасьлівую нядзелю перад імшой, калі Фэрміна Даса панюхала па звычцы вопратку, што муж надзяваў напярэдадні ўдзень, і пражыла трывожнае адчуваньне, нібыта ён спаў зь іншай жанчынай.

Напачатку яна абнюхала жакет і камізэльку. Выцягнула са штрыфэля кішэнны гадзіньнік, дастала асадку, партманэт і некалькі дробных манэтак з кішэняў. Потым склала ўсё на начным століку: кашулю, зьняўшы заціск для гальштука і запінкі з тапазамі, а таксама залаты гузік і ўстаўны каўнерык. Пазьней – штаны, дастаўшы бірульку з адзінаццацьцю ключамі і ножычак з пэрлямутравай ручкай. Нарэшце ўзялася за сподняе, шкарпэткі з чыстай бавоўны і з вышытай манаграмай. Ужо не заставалася ні ценю сумневу: кожная рэч выдавала пах, якога яна ні разу не адчула за гады і гады сумеснага жыцьця. Гэта быў пах, які не паддаваўся вызначэньню, бо ня меў нічога агульнага з кветкамі альбо штучнымі эсэнцыямі і быў больш блізкі да чалавечай прыроды. Яна нічога не сказала, пах сустракаўся ёй ня кожны дзень, але Фэрміна Даса ўжо нюхала вопратку мужа ня дзеля таго, каб ведаць, ці час яе праць, – яе мучыў непакой, які нібыта грыз душу.

Пакутліва было тое, што Фэрміна Даса не магла апазнаць гэты пах і суаднесьці яго з распарадкам дня мужа. Паміж ранішняй лекцыяй і абедам гэтага быць не магло, бо, як яна лічыла, ні

адна жанчына ў здаровым розуме ня пойдзе на пасьпешлівую сувязь у той час, калі трэба прыбраць дом, заправіць ложкі, схадзіць на кірмаш ды згатаваць абед. А тут яшчэ страх, што раптам прывядуць дзіця са школы раней, напрыклад, праз тое, што хтосьці параніў яго кінутым у галаву каменем, і недарэка засьпее маму аголенай аб адзінаццатай раніцы, у непрыбраным пакоі ды яшчэ ў абдымках доктара. Зь іншага боку, Фэрміна Даса ведала, што доктар Хувэналь Урбіна аддаваў перавагу любові ўначы, у поўнай цемры, у крайнім выпадку перад сьняданкам пад першае птушынае буркаваньне. Пазьней за гэтую гадзіну, як ён казаў, цяжэй за ўсё распранацца і нанава цалкам апранацца, і гэта зьнішчала асалоду ад любові ўдзень. Так што вопратка магла насыціцца пахамі толькі падчас наведваньня хворага альбо ўвечары, калі ён нібыта хадзіў у кіно альбо гуляць у шахматы. Гэта было цяжкавата высьветліць, бо ў адрозьненьне ад іншых жонак Фэрміна Даса была надта ганарлівай, каб шпіёніць за мужам альбо прасіць каго-кольвек займацца гэтым для яе. Час наведваньня хворых здаваўся найбольш прыдатным для здрады, і гэта было найлягчэй адсачыць, бо доктар Хувэналь Урбіна вёў падрабязныя нататкі пра стан кожнага кліента і сумы ганарару за лекаваньне зь першага агляду і да разьвітаньня зь ім на гэтым сьвеце апошнім жагнаньнем і кароткаю малітваю за спачын душы.

Праз тры тыдні Фэрміна Даса ня выявіла чужога паху ў вопратцы мужа. Пах адсутнічаў некалькі дзён. Пах вярнуўся тады, калі яна менш за ўсё чакала, прычым цяпер ён быў больш яскравы, чым калі раней, і трымаўся цягам некалькіх дзён запар, хоць адзін з тых дзён, якраз нядзеля, супаў зь сямейным сьвятам, падчас якога яна і ён не адлучаліся ні на імгненьне. Неяк удзень яна аказалася ў кабінэце мужа супраць сваёй волі і нават уласнага жаданьня, нібыта не яна, а іншая рабіла тое, чаго ніколі сабе не дазваляла, – разабрала нататкі пра візыты апошніх месяцаў скрозь зграбную бэнгальскую люпу. Упершыню яна ўвайшла адна ў кабінэт, насычаны парамі крэазоту, поўны кніг у пераплётах са скуры невядомых жывёлаў, з выцьвілымі гравюрамі, якія адлюстроўвалі школьныя групавыя партрэты, з ганаровымі граматамі з пэргамэнту, са старажытнымі астралябіямі і фантастычнымі кінжаламі, якія ён калекцыянаваў здаўна. Яна ўлезла ў

патаемнае сьвяцілішча, якое заўсёды заставалася адзінай сфэрай прыватнага жыцьця яе мужа, куды ўваход ёй быў забаронены, бо гэта не вязалася зь сямейным жыцьцём, яны бывалі там толькі разам, і тое зрэдчас, па мімалётных і нязначных справах. Яна адчувала, што ня мае права ўваходзіць у кабінэт адна, тым больш для патаемнай праверкі, якую сама ж лічыла несумленнай. Аднак яна была там. Хацела знайсьці праўду і шукала яе зь неўтаймаваным імпэтам, які можна было параўнаць хіба што з жахлівым страхам перад тым, што яна, крый Божа, знойдзе. Фэрмінай Дасай кіраваў бескантрольны парыў, больш патрабавальны, чым яе прыроджаная ганарлівасьць і нават годнасьць: гэта была захапляльная пакута.

Фэрміна Даса нічога ня выявіла, бо пацыенты мужа, за выключэньнем агульных сяброў, былі таксама часткаю манапольнага ўладаньня, неапазнанымі людзьмі, якія адрозьніваліся ня тварамі, а болем, ня колерам вачэй альбо сардэчнымі справамі, а павялічанай печаньню, белым на языку, пяском у мачы і галюцынацыямі ад начнога жару. Гэта былі людзі, якія верылі яе мужу, верылі, што яны яшчэ жывыя, дзякуючы яму. Насамрэч яны жылі для яго, і апошняя нататка, якую муж дадаваў у гісторыю хваробы, сьведчыла пра гэта: «Вечны спачын, Бог чакае цябе за парогам». Фэрміна Даса кінула пошук пасьля дзьвюх бяздумных гадзінаў з такім адчуваньнем, нібыта яна спакусілася на згубу годнасьці.

Фэрміну Дасу штурхала ўяўленьне, і яна пачала адкрываць зьмены ў характары мужа. Хувэналь Урбіна здаваўся ўхілістым, страціў апэтыт за сталом і жаданьне ў ложку, часьцяком упадаў у раздражненьне, дазваляў сабе іранічныя рэплікі на яе адрас; знаходзячыся дома, ён ужо ня быў былым спакойна-разважлівым чалавекам, а хутчэй, ільвом у клетцы. Упершыню з моманту іхнага шлюбу яна пачала адсочваць ягоныя спазьненьні, кантралявала час ажно да хвіліны, ілгала, каб выцягнуць зь яго праўду, але потым адчувала сябе сьмяротна параненай ад новых супярэчнасьцяў. Аднойчы ўначы прачнулася зь перапуду, нібыта ў прывідным стане, – муж разглядаў яе ў цемры, як ёй здалося, зь нянавісьцю. Фэрміна Даса здрыганулася, як колісь у квецені дзявоцтва, калі ёй

прымроілася, нібыта Флярэнтына Арыса стаяў каля ложка. Але паміж імі была і розьніца: тое зьяўленьне несла ў сабе не нянавісьць, а каханьне. Апрача таго, на гэты раз размова не ішла пра гульню ўяўленьня. Муж прачнуўся а другой ночы, прысеў на ложак і глядзеў на яе ўва сьне. Калі яна спытала, у чым рэч, ён нанава паклаў голаў на падушку і адказаў:

– Пэўна, табе гэта прысьнілася.

Пасьля тае ночы былі і іншыя падобныя эпізоды, і Фэрміна Даса ўжо не магла вызначыць, дзе завяршаецца сапраўднасьць і дзе пачынаецца мроіва. Раптам яе асьляпіла думка, што яна паціху вар'яцее. Нарэшце Фэрміна Даса згадала, што яе муж не прычасьціўся ў чацьвер целам Хрыстовым, як не зрабіў гэтага ані ў адну зь некалькіх апошніх нядзеляў, і ніводнага разу ў гэтым годзе ён не адвёў сабе часу для адасабленьня з мэтаю духоўнага самаачышчэньня. Калі яна спытала, што выклікала небывалы пералом у ягоным духоўным здароўі, дык атрымала няўцямны, змрочна-раздражнёны адказ, які здымаў усялякі сумнеў, бо муж ні разу не абышоўся бяз важкага касьцельнага абраду з моманту першага прычасьця ў восем гадоў, а тым больш у сьвяточныя дні. Такім чынам Фэрміна Даса зразумела: муж ня толькі ўпаў у сьмяротны грэх, але яшчэ і ўпарціцца ў ім, не зьвяртаючыся па дапамогу да свайго спаведніка. Яна ніколі не ўяўляла, што пройдзе пякельныя пакуты праз тое, што, па сутнасьці, зьяўляецца антыподам каханьня. Што ж, нічога ня зробіш, у такім выпадку найлепшы сродак ад маруднае сьмерці – спаліць зьмяінае кубло, якое атручвала душу. Так яна і зрабіла. Аднойчы ўдзень яна цыравала шкарпэткі на тэрасе, якраз калі муж завяршаў штодзённае чытаньне пасьля сіесты. Раптам яна адклала працу, узьняла акуляры да ілба і зьвярнулася да яго без найменшай адзнакі жорсткасьці:

– Доктар!

Муж быў заглыблены ў чытаньне «Востравa пінгвінаў», раману, які ўвесь сьвет чытаў у тыя дні*, і адказаў ёй, не выплываючы на паверхню: «Так». Яна патрабавала:

– Паглядзі мне ў твар.

Вядомы раман

Ён гэта зрабіў, зірнуў, ня бачачы яе ў тумане ад акуляраў для чытаньня, аднак і не было патрэбы іх здымаць, каб абраць вугольлем яе позірку.

– Што здарылася? – спытаў ён.

– Ты гэта ведаеш лепш за мяне, – парыравала яна.

Анатоль Франсіс (1844–1924) быў выдадзены ўпершыню ў 1908 годзе.

І больш нічога ня вымавіла. Зноўку апусьціла акуляры і працягвала цыраваць. Тады доктар Хувэналь Урбіна ўцяміў, што доўгія дні пакутлівае трывогі засталіся ззаду. Ён уяўляў сабе гэты момант зусім інакш, сэйсьмічнага ўздрыгу сэрца не было, ён перанёс толькі разьлічаны ўдар і вялікую палёгку, бо здарылася гэта рана, а ня позна, і гэта ўсё роўна мусіла здарыцца: прывід сэньярыты Барбары Лінч увайшоў, нарэшце, у дом.

Доктар Хувэналь Урбіна быў знаёмы зь ёю чатыры месяцы, з тае пары, калі ўгледзеў яе ў чарзе па кансультацыю ў шпіталі Міласэрнасьці і імгненна ўцяміў: штосьці непапраўнае здарыцца ў ягоным лёсе. Яна была высокая элегантная мулатка шырокае косьці, са скураю таго самага колеру і прыроды, што й мёд; той раніцай на ёй быў чырвоны строй у белы гарошак і капялюш з тае самае тканіны з шырокімі палямі, якія зацянялі нават вейкі. Стваралася ўражаньне, што яна больш акрэсьленага полу, чым якая-кольвек іншая чалавечая істота. Доктар Хувэналь Урбіна не прымаў хворых у клініцы, хоць калі праходзіў побач і ня дужа сьпяшаўся, заглядваў, каб старэйшыя студэнты не забываліся: няма лепшых лекаў за добра пастаўлены дыягназ. Так што ён умудрыўся папрысутнічаць на лекарскім аглядзе мулаткі і вёў сябе з засьцярогай, каб вучні не заўважылі нават жэсту, які мог бы быць зразуметы як невыпадковы, ён амаль не глядзеў на яе, аднак добра запомніў зьвесткі пра яе. Удзень, пасьля хатніх візытаў, загадаў спыніць пралётку ля дому па адрасе, які яна называла ў клініцы, і неўзабаве ўжо сядзеў на тэрасе і радаваўся сакавіцкай сьвежасьці.

Дом быў тыпова антыльскі, афарбаваны ў жоўты колер да цынкавага даху, – жалюзі на вокнах, папараць і гвазьдзікі ў гліняных гаршчках, што віселі на сьценах порціку. Дом стаяў

на драўляных палях каля багны заліву Дурнога Выхаваньня. У порціку таксама вісела клетка, а ў ёй сьпявала івалга. Якраз насупраць дому Барбары Лінч месьцілася пачатковая школа, і на той момант, калі доктар загадаў спыніцца, школьнікі выбеглі чародкай, рамізьнік ледзь стрымаў спуджаную кабылу, нацягнуўшы лейцы да ўпору. Усё складвалася ладна, сэньярыта Барбара Лінч пасьпела пазнаць доктара. Яна павітала яго фамільярным жэстам, нібыта старога знаёмага, запрасіла, уважыўшы ягонае засмучэньне, на кубак кавы, і ён выпіў тую каву з задавальненьнем насуперак уласнай завядзёнцы, слухаў яе аповед пра сябе, – адзінае, што яго цікавіла з тае раніцы і што не пакіне яму ні хвілі спакою ў бліжэйшыя месяцы. Неяк неўзабаве пасьля шлюбу з Фэрмінай Дасай адзін зь сяброў сказаў яму ў прысутнасьці маладой жонкі, што рана ці позна ім прыйдзецца мець справу з вар'яцкай жарсьцю, здольнай паставіць пад удар стабільнасьць шлюбу. Доктар, які верыў у тое, што ведае сябе, як і ў моц сваіх маральных прынцыпаў, засьмяяўся, пачуўшы падобны прагноз. І вось адбылося.

Сэньярыта Барбара Лінч займалася тэалёгіяй і была адзінай дачкою нэгрыцянскага сьвятара Джонатана Б. Лінча, хударлявага пратэстанцкага пастара, які аб'яжджаў на муле бедныя хутары заліву, прапаведаваў слова аднаго са шматлікіх багоў, імёны якіх Хувэналь Урбіна пісаў з прапісной літары, каб адрозьніць ад свайго. Яна гаварыла на добрай кастыльскай мове, але часьцяком спатыкалася аб каменьчыкі сынтаксісу, што надавала яе мове асаблівую грацыёзнасьць. У сьнежні ёй будзе дваццаць восем гадоў, незадоўга да сустрэчы з доктарам Барбара Лінч скасавала шлюб з пастарам, вучнем яе бацькі, зь якім пражыла два гады не найлепшым чынам, таму не гарэла жаданьнем рэцыдыву. Яна сказала: «Нікога не люблю, апрача маёй івалгі». Але доктар Урбіна быў надта сур'ёзным, каб падумаць, што яна сапраўды мела гэта на ўвазе. Насупраць, доктар спытаў сябе ашалела, а раптам такая лёгкая ўдача – толькі Божая пастка, пасьля якой наступіць жорсткая расплата, але тут жа ён адкінуў думку, як тэалягічную драбязу, народжаную засмучэньнем.

Ужо разьвітваючыся, доктар Хувэналь Урбіна нібыта выпадкова завёў гаворку пра ранішнюю кансультацыю, ён ведаў, што

хворыя схільныя гаварыць пра ўласныя пакуты з асалодаю, і яна так міла распавяла дэталі хваробы, што ён абяцаў вярнуцца заўтра а чацьвёртай для больш падрабязнага агляду. Яна спужалася, ведаючы, што лекар такой катэгорыі вышэй за яе мажлівасьці, але ён яе супакоіў: «Мы ў нашай прафэсіі імкнёмся да таго, каб багацеі плацілі і за бедных». Затым ён занатаваў: «Сэньярыта Барбара Лінч. Заліў Дурнога Выхаваньня, субота а чацьвертай». Празь некалькі месяцаў Фэрміна Даса прачытала гісторыю хваробы з дэталямі дыягназу, прадпісаньняў і разьвіцьця хваробы. Яна зьвярнула ўвагу на імя, нечакана вырашыла, што гаворка ідзе пра адну з распусных артыстак з караблёў, якія везьлі садавіну ў Нью-Арлеан, аднак адрас падказаў, што, хутчэй за ўсё, гэта жанчына зь Ямайкі, да таго ж, само сабой, нэгрыцянка, і Фэрміна Даса без сумневу вывела яе з кола магчымых прыхільнасьцяў мужа.

Доктар Хувэналь Урбіна прыбыў на суботнюю сустрэчу хвілінаў на дзесяць раней за прызначаны час, і сэньярыта Лінч не пасьпела апрануцца. Яшчэ са студэнцтва ў Парыжы, калі ён неаднойчы абміраў пры думцы пра неабходнасьць здачы вусных іспытаў, доктар не адчуваў падобнай напругі. Сэньярыта Лінч ляжала ў пасьцелі, засланай бялюткай прасьцінай, у тонкай шаўковай камбінацыі, і была бясконца гожай. Усё ў ёй было дакладным і працінальным: буйныя сьцёгны сырэны, скура, пры выглядзе якой доктар гарэў на марудным агні юрлівасьці, дзівосныя грудзі, тачоныя зубы, – словам, усё цела выпраменьвала здароўе, і менавіта пах здаровага цела знаходзіла ў вопратцы мужа Фэрміна Даса. Барбара Лінч зьвярнулася ў кансультацыю, бо пакутавала ад нейкай хваробы, якую яна трапна назвала «кучаравымі колікамі», і доктар Урбіна лічыў, што да падобных сымптомаў нельга ставіцца бесклапотна. Так што доктар абмацваў яе ўнутраныя органы, не сьпяшаючыся, хутчэй, мэтанакіравана, чымся проста ўважліва. Ён паступова забываўся на ўласную мудрасьць, адкрываючы ў поўным зьдзіўленьні, што цудоўнае стварэньне было гэтак прыгожым знутры, як і звонку, і тады ён аддаўся ўцехам мацаньня. Ужо не як лекар найвышэйшай кваліфікацыі на ўсім карыбскім узьбярэжжы, а як бедны боскі чалавек, які пакутаваў ад бязладзьдзя пачуцьцяў. Толькі аднойчы здарылася штосьці падобнае ў суворым прафэсійным

жыцьці, і тое быў дзень яго найбольшага сораму, бо абураная пацыентка адвяла ягоную руку, села на ложак і сказала яму: «Тое, чаго вы жадаеце – магчыма, але толькі ня з вамі». Сэньярыта Лінч, насупраць, даверылася ягоным рукам, і калі не заставалася сумневу, што лекар ужо ня думае пра дыягназ, раптам сказала:

– Я думаю, што гэта не вітаецца этыкай.

Доктар, мокры ад поту, нібыта залез у сажалку апрануты і пасьля выйшаў на бераг, выцер рукі і твар ручніком.

– Этыка, – адказаў ён, – мяркуе, што дактары драўляныя.

Яна ўдзячна працягнула яму руку.

– Мала што я падумала, гэта не азначае, што нельга, – шапнула яна. – Уяві сабе, што такое для беднай нэгрыцянкі, як я, быць даспадобы чалавеку з такой шумнай славай.

– Я не пераставаў думаць пра вас ні на імгненьне, – прызнаўся ён.

Прызнаньне было гэтак трапяткім, як і вартым жалю. Аднак яна ўратавала яго ад зьбянтэжанасьці гучным шчырым сьмехам, ад якога стала сьветла ў спальні.

– Я зразумела гэта, калі зірнула на цябе ў шпіталі, доктар, – патлумачыла яна. – Я нэгрыцянка, але ж не пачвара.

Іхныя адносіны складаліся далёка ня проста. Сэньярыта Лінч хацела мець незаплямленую годнасьць, хацела ўпэўненасьці ў каханьні, і лічыла, што цалкам гэтага заслугоўвае. Доктару Ўрбіна яна дазваляла ўсяляк спакушаць яе, але не заходзячы, аднак, у спальню нават у тых выпадках, калі яна была адна ў доме. Самае большае, што яна дазваляла яму, быў паўтор цырымоніі агляду, мацаньня і праслухоўваньня, як ён хацеў, з этычнымі парушэньнямі, але не здымаючы зь яе вопраткі. Са свайго боку, праглынуўшы кручок, ён ня мог выпусьціць нажыўку і таму не спыняўся, прыставаў да яе штодня. З прычынаў чыста практычнага пляну працяглая сувязь з

сэньярытай была амаль немажліваю, аднак доктар выявіўся занадта слабавольным, каб спыніцца своечасова, таксама як пазьней яму не хапіла духу працягваць. Ён проста дайшоў да межаў мажлівасьці.

Пастар Лінч жыў даволі неўпарадкаваным жыцьцём. Ён мог зьехаць з дому ў любы момант на муле, нагружаным бібліямі і брашурамі Эвангелічнай царквы з аднаго боку, і з прадуктовымі прыпасамі з другога, а вяртаўся, калі гэтага менш за ўсё чакалі. Яшчэ адной перашкодай была школа насупраць, бо дзеці расьпявалі на занятках, гледзячы ў акно на вуліцу. І лепш за ўсё бачылі дом насупраць, яго адчыненыя з шасьці гадзінаў раніцы дзьверы і вокны, сэньярыту Лінч, калі яна вешала клетку пад навесам даху, каб івалга таксама засвойвала ўрокі сьпеваў, бачылі яе ў адмысловым пярэстым турбане, і яна таксама сьпявала сваім бліскучым карыбскім голасам, займаючыся хатнімі справамі. Пазьней, седзячы пад порцікам, яна сьпявала вечаровыя псальмы на ангельскай мове сола.

Доктар Хувэналь Урбіна і сэньярыта Барбара Лінч мусілі абраць час, калі школа пуставала, а таму мелі дзьве мажлівасьці: у перапынку на абед, паміж дванаццацьцю і дзьвюма, але ў гэты час доктар абедаў дома, альбо напрыканцы дня, калі дзеці разыходзіліся па дамох. Апошні варыянт быў лепшым, але да гэтага часу доктар ужо завяршаў візыты і неўзабаве мусіў вяртацца дамоў, бо там па традыцыі ўвечары зьбіраліся разам. Трэцяя і найцяжэйшая праблема хавалася ва ўласным сацыяльным становішчы, якое змушала езьдзіць на візыты ў пралётцы, даволі вядомай у горадзе, якая мусіла заўсёды чакаць яго каля дзьвярэй. Зразумела, ён мог адкрыць таямніцу рамізьніку, як рабілі амаль усе ягоныя сябры па клюбе, аднак гэта выходзіла за межы ягоных звычаяў. Калі візыты да сэньярыты Лінч сталіся надта відавочнымі, дайшло да таго, што фамільны ліўрэйны рамізьнік асьмеліўся спытаць, ці ня лепш для яго вяртацца па доктара пазьней, каб не стаяць так доўга каля дзьвярэй. Доктар Урбіна адрэагаваў дзіўным чынам: адказаў рамізьніку, як адрэзаў:

– З тае пары, як я цябе ведаю, упершыню чую ад цябе ня тое,

што трэба, – рэзка сказаў ён. – Будзем лічыць, што я не пачуў.

Выйсьця не было. У такім горадзе здавалася немажлівым хаваць ад людзей хваробу, калі пралётка доктара стаяла каля дзьвярэй. Часамі сам лекар браў ініцыятыву на сябе і ішоў пешшу, калі адлегласьць дазваляла, альбо наймаў экіпаж, каб пазьбегнуць наўмысна злых альбо дачасных меркаваньняў. Аднак падман практычна нічога не даваў, бо рэцэпты, якія траплялі ў аптэку, заўсёды дазвалялі дазнацца праўду. Даходзіла да таго, што доктар Хувэналь Урбіна прапісваў уяўныя лекі разам з патрэбнымі, каб абараніць сьвятое права хворых на ціхую сьмерць і на тое, каб зьнесьці таямніцу хваробы ў магілу. Доктар таксама меў мажлівасьць апраўдваць прысутнасьць пралёткі каля дому сэньярыты Лінч рознымі сумленнымі спосабамі, але гэта не магло доўжыцца доўга. Тым больш столькі, колькі б ён хацеў: усё жыцьцё.

Сьвет ператварыўся ў апраметную. Як толькі доктар Хувэналь Урбіна задаволіў першаснае шаленства, абое ўсьвядомілі рызыку, але доктар ніколі не адважыўся пайсьці на скандал. У фэбрыльных трызьненьнях ён абяцаў сабе што заўгодна, але потым усё праходзіла і нанава вярталася на заганнае кола. Аднак паступова, як расло жаданьне быць зь ёю, рос і страх страціць яе, і сустрэчы сталіся больш пасьпешлівымі і цяжкімі. Ні пра што іншае ён ня думаў. Доктар Урбіна чакаў на свой час зь невыноснаю жарсьцю, ён забываўся на іншыя абавязкі, забываўся на ўсё, але калі пралётка набліжалася да заліву Дурнога Выхаваньня, ён маліў Госпада Бога, каб у апошнюю хвілю непрадбачаная перашкода ня змусіла яго прамінуць яе дом. Ён езьдзіў да яе ў такім стане адчаю, што часам нават радаваўся, угледзеўшы зь перакрыжаваньня вуліц сівую, як бавоўна, галаву пастара Лінча, схіленую над кніжкай на тэрасе, у той час як дачка ў залі навучала катэхізісу дзяцей кварталу і сьпявала зь імі эвангельскія псальмы. Тады доктар ад'яжджаў дамоў на вяршыні шчасьця, пазбаўлены неабходнасьці выпрабоўваць лёс, але пазьней страчваў розум ад жарснага жаданьня, каб тут жа настаў заўтрашні дзень і гадзіна, і гэта паўтаралася штодня а пятай па абедзе.

Любоўныя сустрэчы зрабіліся для яго цяжарам, калі пралётка

ля дзьвярэй сталася ўжо занадта заўважнай, і праз тры месяцы ператварыліся ў суцэльную пакуту. Яны не пасьпявалі нават пагаманіць, сэньярыта Лінч бегла ў спальню, як толькі яе пякельны палюбоўнік уваходзіў у дом. Яна пускала ў ход розныя хітрыкі, у дні чаканьня апранала шырокую, вельмі гожую ямайскую сукенку з чырвонымі кветкамі на фальбонках, але бяз сподняй, на аголенае цела, думаючы, што лёгкасьць задачы дапаможа яму пазбавіцца страху. Аднак доктар зводзіў на нішто ўсе яе намаганьні, накіраваныя на тое, каб зрабіць яго шчасьлівым. Ён ішоў за ёю, задыхаючыся, да спальні, кідаючы на хадзе куды заўгодна кій, партфэль лекара, панаму, – словам, усё, і аддаваўся панічнай любові. Спушчаныя штаны блыталіся ля каленяў, жакет заставаўся зашпіленым, каб менш замінаў, залаты ланцужок з гадзіньнікам боўталіся між імі не да месца, нават чаравікі ён не здымаў, напружана думаючы больш пра тое, як бы хутчэй пайсьці, чымся пра ўцеху. Яна заставалася незадаволенай, нанава ўваходзячы ў тунэль уласнай самоты. А ён ужо зноўку зашпільваўся на ўсе гузікі, зьнясілены, быццам бы любіў яе ўсімі пачуцьцямі на мяжы жыцьця і сьмерці, у той час калі насамрэч рабіў немалаварты, але скамечаны фізычны подзьвіг. Аднак доктар захоўваў распарадак: подзьвіг займаў роўна столькі, колькі трэба было для шараговай унутрывеннай іньекцыі. Пасьля гэтага доктар вяртаўся дамоў, саромеючыся сваёй слабасьці, з жаданьнем памерці, кідаючы праклёны сабе за адсутнасьць мужнасьці прасіць Фэрміну Дасу, каб тая зьняла зь яго штаны і ўсадзіла голым азадкам на патэльню. Ён не вячэраў, маліўся няўпэўнена, прыкідваўся, нібыта ў ложку працягвае чытаньне, пачатае падчас сіесты, пакуль жонка завіхалася па доме, прыводзячы свой сьвет у парадак перад сном. Неўзабаве ён дзюбаў носам над кніжкай і патанаў у немінучых мангавых зарасьцях трызьненьняў пра сэньярыту Лінч, у выпарэньні лясной гушчобы, у ложку ягонае сьмерці. Тады ён ня мог думаць больш ні пра што, апрача як пра тую хвіліну наступнага дня, калі ягоны гадзіньнік пакажа безь пяці хвілінаў пяць, і яна будзе чакаць яго ў пасьцелі, адкінуўшы вар'яцкую ямайскую сукенку, агаляючы пяшчотны ды цёмны ўзгорак, які замыкаў апраметнае кола яго жарснага прыцягненьня.

У апошнія гады доктар Хувэналь Урбіна пачаў адчуваць вагу

ўласнага цела. Ён ведаў гэтыя сымптомы, чытаў пра іх у спэцыяльных тэкстах, бачыў, як яны пацьвярджаліся ў рэальным жыцьці ў пацыентаў, якія былі старэйшыя за яго, і раптам у іх пачыналі праяўляцца дакладныя, нібыта скапіяваныя з мэдыцынскіх кніжак сындромы, якія пазьней выяўляліся ўяўнымі. Ягоны настаўнік па дзіцячай клініцы Ля Сальпэтрыер рэкамэндаваў яму пэдыятрыю як самую сумленную спэцыяльнасьць, бо толькі дзеці хварэюць, калі насамрэч хворыя, і не гавораць доктару ўмоўных словаў, а дэманструюць канкрэтныя сымптомы рэальных хваробаў. Затое людзі сталага веку альбо знаходзілі ў сябе сымптомы, але не хварэлі, альбо, што яшчэ горш, пакутавалі цяжкімі хваробамі, якія праяўляліся праз сымптомы іншых, бяскрыўдных хваробаў. Доктар Урбіна адводзіў іх, сьцішаючы боль сродкамі, спасылкамі на ўзрост, і паступова яны вучыліся не зьвяртаць увагі на недамаганьні, суіснаваць зь імі на сьметніку старасьці. Але доктар Урбіна ніколі б не падумаў, што лекар ягоных гадоў, які нібыта ўсялякае бачыў у жыцьці, ня здольны пераадолець трывожнага пачуцьця хваробы, сапраўды не хварэючы. Альбо горш: не лічыць сябе хворым, кіруючыся навуковымі прымхамі, будучы насамрэч хворым. У веку сарака гадоў доктар напаўжартам сказаў сваім студэнтам: «Адзінае, што мне патрэбна ў гэтым жыцьці – чалавек, які б мяне разумеў». Але калі ён заблытаўся ў лябірынце пачуцьцяў да сэньярыты Лінч, ён ужо думаў пра гэта не на жарт.

Рэальныя і ўяўныя сымптомы старэйшых пацыентаў акумуляваліся ў целе доктара Ўрбіна. Ён адчуваў форму ўласнай печані з такой яснасьцю, што мог вызначыць яе памеры, ня мацаючы яе. Ён адчуў буркатаньне санлівага ката ў сваіх нырках, нібыта сваімі вачыма бачыў пераліўчаты бляск жоўцевага пухіра, да яго даходзіла цурчаньне крыві ў артэрыях. Часам доктар прачынаўся на золку, задыхаючыся, як рыбіна на сушы. Ён адчуваў ваду ў сэрцы. Бывала, што здараўся імгненны збой у сардэчным рытме, быццам бы затрымка на адзін удар, – так часамі фальшывілі ягоныя сувучні ў школе, граючы вайсковы марш, – і гэта паўтаралася, але затым ён адчуваў, што рытм узнаўляецца, бо Бог вялікі. Але замест таго, каб карыстацца тымі самымі паліятыўнымі сродкамі, якія ён прапісваў сваім хворым, доктар апускаўся ў бездань жаху.

Праўда ж таілася ў тым, што доктар Урбіна ў сваіх пяцьдзясят восем гадоў сапраўды адчуваў патрэбу ў чалавеку, які б яго зразумеў. У выніку ён зьвярнуўся да Фэрміны Дасы, якая яго кахала як мае быць, і якую ён кахаў больш за ўсё на сьвеце, зь ёю ён знаходзіў спакой, і празь яе здолеў нарэшце супакоіць сваё сумленьне.

Гэта здарылася пасьля таго, як Фэрміна Даса перапыніла ягонае дзённае чытаньне і загадала зірнуць ёй у вочы, а ён адчуў першы сыгнал: апраметнае кола выяўлена. Доктар, аднак, не зразумеў, як гэта здарылася, бо немажліва было ўявіць, каб Фэрміна Даса магла адкрыць праўду адно сваім выключным нюхам. Як бы тое ні было, гэты горад ніколі ня быў прыгодным для захоўваньня таямніцы. Неўзабаве пасьля ўсталяваньня першых хатніх тэлефонаў некалькі сямейных пар разышліся праз ананімныя намовы. Шмат якія спужаныя сем'і адключылі свае тэлефоны альбо наагул адмовіліся ад паслуг тэлефоннай кампаніі на доўгія гады. Доктар Урбіна ведаў, што ягоная жонка надта паважала сябе, каб паверыць у ананімную намову па тэлефоне, і ня мог уявіць сабе настолькі дзёрзкага чалавека, які б адважыўся зрабіць гэта ад уласнага імя, не хаваючыся. Аднак ён баяўся клясычнага мэтаду: паперы, якую прасоўвалі пад дзьверы незнаёмыя рукі. Гэты спосаб мог быць эфэктыўным, бо гарантаваў ня толькі падвойную ананімнасьць – таго, хто накіроўваў, і таго, хто атрымліваў паперу, але і наданьне гэтаму здарэньню мэтафізычнай афарбоўкі з прычыны знакамітасьці і легендарнасьці яго роду. Маўляў, усё, што адбываецца з дэ ля Калье – адбываецца праз Боскую Волю.

Дом доктара Хувэналя Ўрбіна ня ведаў рэўнасьці: на працягу трыццаці гадоў сямейнага спакою лекар хваліўся ўслых, і да тае пары было праўдай, што ён, як швэдзкая запалка, запальваўся толькі ад уласнае скрыні. Аднак ён ня ведаў, якая магла быць рэакцыя ганарлівай і годнай жанчыны зь цьвёрдым характарам перад відавочнай нявернасьцю. Словам, пасьля таго, як лекар на яе загад паглядзеў ёй у вочы, ён толькі засмуціўся і рабіў выгляд, нібыта ўсё яшчэ блукае па прыгожых абрысах выспы Алька, пакуль прыдумваў, што рабіць. Са свайго боку, Фэрміна Даса таксама больш нічога не сказала. Яна скончыла цыраваць шкарпэткі, кінула ўсё бязладна ў кошык,

распарадзілася на кухні наконт вячэры і пайшла ў спальню.

Тады доктар Хувэналь Урбіна адважыўся настолькі, што безь пяці хвілінаў пяць ён не зьявіўся ў доме сэньярыты Лінч. Словы пра спрадвечнае каханьне, пра сьціплы дом для яе, дзе б ён мог бываць бяз страху, пра нясьпешнае шчасьце да самае сьмерці, – усё, што ён наабяцаў у полымі любові, было адмененае адразу і назаўжды. Апошняе, што сэньярыта Лінч атрымала ад яго, была смарагдавая дыядэма, якую рамізьнік уручыў ёй бяз словаў і бяз допісу ў скрыні, якую доктар абгарнуў аптэчнай фірмовай паперай, каб нават рамізьнік паверыў: гаспадар тэрмінова перадаў лекі. Ён больш не сустрэў яе нават выпадкова да канца сваіх дзён, і аднаму Богу вядома, які боль ён адчуў ад геройскага рашэньня, колькі горкіх сьлёзаў праліў, зачыняючыся ў прыбіральні, каб перажыць крушэньне інтымнага жыцьця. А пятай, замест сустрэчы зь ёю, ён пайшоў на споведзь, несучы ў сабе словы найглыбейшага раскаяньня, а ў наступную нядзелю прыняў прычасьце з разадраным на кавалкі сэрцам, але са спакойнай душой.

Уначы канчатковай адмовы ад палюбоўніцы, пакуль доктар укладваўся спаць, ён паўтарыў Фэрміне Дасе горкі аповед пра ягоную перадзолкавую бессань, пра раптоўны калючы боль, пра жаданьне плакаць на захадзе сонца, пра зашыфраваныя сымптомы прытоенай любові, якія ён тады выдаваў за прыкметы старасьці. Яму трэба было выгаварыцца, каб не памерці, і заадно распавесьці праўду, і, нарэшце, ягоная душэўная палёгка перайшла б у хатні рытуал любові. Фэрміна Даса слухала яго ўважліва, але не глядзела на яго, нічога не казала, прымаючы вопратку, якую ён зь сябе здымаў. Яна нюхала кожную рэч без адзінага жэсту, які б выдаў яе злосьць, клала рэчы абы-як, і не знайшла вядомага паху, але ёй было ўсё роўна: у Бога дзён многа. Перад тым, як стаць на калені для малітвы каля маленькага аўтара ў самой спальні, ён завершыў сьпіс сваіх бедаў сумным і шчырым уздыхам, і заключыў: «Я, напэўна, хутка памру». Яна нават не міргнула вокам.

– Гэта было б лепш, – сказала яна, – так для абаіх будзе спакайней.

За некалькі гадоў да гэтых падзеяў доктар, падчас крызісу небясьпечнай хваробы, таксама загаварыў пра мажлівую сьмерць, на што яна кінула аднолькава жорсткую рэпліку. Доктар Урбіна аднёс яе словы да натуральнай жаночай неміласэрнасьці, на якой зямля трымаецца. Тады ён ня ведаў, што жонка заўсёды ўзводзіла перашкоду злосьці, каб пераадолець страх. У тым, даўнім выпадку – страх застацца безь яго.

Той ноччу яна, наадварот, пажадала ягонай сьмерці ўсёй душой, і пэўнасьць гэтага яе пачуцьця яго ўстрывожыла. Пазьней ён пачуў, як яна ўсхліпвала ў цемры, плакала ціха, кусаючы падушку, каб ён не пачуў. Гэта канчаткова заблытала доктара, ён ведаў, што яна амаль ніколі ня плакала з-за цялесных альбо душэўных боляў. Яна плакала толькі ад вялікае злосьці, асабліва, калі прычынаю служыў страх уласнае вінаватасьці, – тады яна яшчэ больш злавала ад сваіх сьлёзаў, бо не магла дараваць сабе падобнай слабасьці. Доктар не асьмеліўся суцешыць жонку, ведаючы, што немажліва суцешыць тыгрыцу, працятую дзідай, ён таксама не знайшоў у сабе адвагі сказаць ёй, што чыньнік яе сьлёз зьнік сёньня ўдзень, што ён быў выдраны з каранямі назаўсёды, як зь ягонай душы, так і зь ягонай памяці.

Стома ненадоўга перамагла доктара. Калі ён прачнуўся, яна ляжала з расплюшчанымі вачыма, бязь сьлёз, пры сьвятле матавага начніка. Штосьці канчаткова высьпела ў ёй, пакуль ён спаў: асадак, назапашаны ў глыбінях яе душы цягам доўгіх гадоў, ускіпеў ад пакут рэўнасьці, выйшаў на паверхню і састарыў яе імгненна. Усхваляваны раптоўна ўзьніклымі зморшчынкамі, завялымі вуснамі, попелам яе сівізны, ён рызыкнуў сказаць ёй, каб яна паспрабавала заснуць: гэта было амаль а трэцяй ночы. Яна загаварыла, не зірнуўшы на яго, але ўжо бязь сьледу злосьці ў голасе, амаль спакойна.

– Я маю права ведаць, хто яна, – вымавіла Фэрміна Даса.

І тады доктар Урбіна распавёў ёй усё, адчуваючы, што здымае зь сябе сусьветны цяжар, бо ён быў упэўнены, што жонка ўсё ведала загадзя і яму толькі заставалася пацьвердзіць дэталі. Аднак гэта было, зразумела, ня так. Таму, пакуль ён гаварыў,

яна зноўку заплакала, але тое не былі сарамлівыя ўсхліпы, як напачатку. Яна заплакала буйнымі салёнымі сьлязьмі, якія цяклі па твары, гарэлі на начной кашулі і спальвалі яе жыцьцё. Бо ён не зрабіў таго, чаго яна чакала з душою на валаску, ён не адмовіў усё ўшчэнт, не разьюшыўся ад паклёпу, не крычаў, што сраць хацеў на праклятае грамадзтва, якое без згрызотаў сумленьня топча чужую годнасьць. Ён не захаваў, як мусіў мужчына, непарушны спакой перад неабвержнымі доказамі ягонай нявернасьці. Потым, калі доктар распавёў ёй, што ўдзень быў у свайго спаведніка, яна ледзь не асьлепла ад нянавісьці. Яшчэ са школы Фэрміна Даса была ўпэўненая, што сьвятары пазбаўленыя якой-кольвек боскай сьвятасьці. Гэта была істотная расколіна ў хатняй гармоніі, якую яны дагэтуль абыходзілі бяз спрэчак. Але тое, што муж дазволіў сабе да такой ступені пасьвяціць спаведніка ў інтымныя справы, якія тычыліся ня толькі яго, а таксама і яе, пераўзышло ўсялякія межы.

– Гэта ўсё роўна, што апавядаць пра гэта першаму стрэчнаму ашуканцу каля гарадзкой брамы.

Для яе гэта быў канец. Яна ўпэўнілася, што яе годнасьць безнадзейна растапталі яшчэ да таго, як муж завяршыў споведзь раскаяньня, і пачуцьцё зьнявагі было невыносна большым за сорам, злосьць і боль ад здрады мужа. І горш за ўсё, чорт бы яго пабраў, што ён зблытаўся з нэгрыцянкай. Доктар яе паправіў: «Яна мулатка». Але ўдакладненьне было залішнім, Фэрміна Даса ўжо скончыла размову.

– Адна халера, – сказала яна, – цяпер я ўцяміла: гэта быў пах чарнамазай.

Гэта здарылася ў панядзелак. У пятніцу а сёмай вечара Фэрміна Даса ступіла на борт рэйсавага карабліка, які вёз яе ў Сан-Хуан-дэ-ля-Сіенагу, з адным куфрам, у суправаджэньні хросьніцы, хаваючы пад вэлюмам твар, каб пазбавіць сябе і мужа ад увагі цікаўных. Доктар Хувэналь Урбіна не зьявіўся ў порт празь іх дамову, якая была дасягнутая ў выніку стамляльнай гаворкі, што доўжылася тры дні. Падчас гаворкі яны вырашылі, што яна паедзе ў маёнтак стрыечнай сястры Ільдэбранды Санчас, у сялібу Флёрэс-дэ-Марыя, і пабудзе там,

колькі трэба, каб падумаць, перад тым як прыняць канчатковае рашэньне. Ня ведаючы аб чыньніках, дзеці ўспрынялі разлуку як неаднойчы адкладаную вандроўку, да якой самі імкнуліся здаўна. Доктар Урбіна ўладкаваў усё так, каб ніхто зь яго пляткарскага сьвету ня здолеў скарыстаць зь няшчасьця са злога намеру, і гэта яму ўдалося. Так што Флярэнтына Арыса не знайшоў і сьледу, які б падказаў, куды і як зьнікла Фэрміна Даса, і не праз адсутнасьць сродкаў і спосабаў дакапацца да ісьціны, а выключна ў сілу таго, што сьлядоў не засталося. Муж не сумняваўся: яна вернецца, як толькі пройдзе злосьць. Аднак яна была пэўнаю ў тым, што злосьць ня пройдзе ніколі.

Тым ня менш, вельмі хутка яна зразумела, што яе нястрымная рашучасьць ня столькі плён крыўды, як наступства застарэлае настальгіі. Пасьля вясельнай вандроўкі Фэрміна Даса неаднойчы наведвала Эўропу, нягледзячы на тое, што трэба было плыць дзесяць дзён, і заўсёды знаходзіла час для шчасьця. Яна бачыла сьвет, навучылася жыць і думаць інакш, але ніколі не вярталася ў Сан-Хуан-дэ-ля-Сіенагу пасьля няўдалага палёту на паветраным шары. Вандроўка ў правінцыю да стрыечнай сястры Ільдэбранды была няхай позьнім, але збавеньнем. Яна падумала пра гэта ня ў сувязі зь сямейнай катастрофай: патрэба ў такой разрадцы жыла ў ёй здаўна. Так што адна думка пра адраджэньне юнацкіх пачуцьцяў суцяшала яе ад сямейнага няшчасьця.

Фэрміна Даса з падчаркай выйшла на прычал Сан-Хуан-дэ-ля-Сіенагі, прывяла ў дзеяньне немалыя рэзэрвы свайго характару і пазнала сялібу насуперак найгоршым чаканьням. Грамадзянскі і вайсковы камэнданты гарнізону, да якіх яна мела рэкамэндацыйныя лісты, запрасілі яе на шпацыр у афіцыйнай карэце да адыходу цягніка на Сан-Пэдра-Алехандрына, дзе ёй схацелася пабываць, каб праверыць чуткі, нібыта ложак, на якім памёр Вызваліцель, быў маленькі, амаль што дзіцячы*. Тады Фэрміна Даса нанава пабачыла сваю вялізную сялібу ў сьпякоце – было роўна дзьве гадзіны папаўдні. Яна зноўку бачыла вуліцы, хутчэй, падобныя на долы з пазелянелымі лужынамі; заможныя дамы партугальцаў з разнымі родавымі гербамі на порціках і бронзавымі жалюзі на вокнах; дамы, у змрочных салёнах якіх бязьлітасна паўтараліся

адны і тыя ж трапяткія і сумныя практыкаваньні на піяніна, так яе маладая мама вучыла граць дзяўчатак з заможных дамоў. Яна глядзела на пустэльны пляц без адзінага дрэва ў патэльні каменнае глебы, шэраг хаўтурных экіпажаў і кабыл, якія спалі стоячы, жоўты цягнік на Сан-Пэдра-Алехандрына, а за рагом вялікага касьцёлу стаяў найлепшы, найпрыгажэйшы дом з арачным калідорам з пазелянелага каменьня, з кляштарнымі варотамі. Яна ўгледзела акно спальні, дзе шмат гадоў пазьней народзіцца Альвара, калі ў яе ня будзе ўжо і памяці, каб прыгадаць пра гэта. Фэрміна Даса падумала пра цётку Эскаластыку, якую безнадзейна працягвала шукаць на небе і на зямлі, і, думаючы пра яе, яна раптам згадала вобраз Флярэнтына зь ягонай кніжкай вершаў пад мігдалавымі дрэвамі сквэрыку, як згадвала яго зрэдчас, калі на памяць прыходзілі ўспаміны пра цяжкія школьныя гады. Афіцыйная карэта зрабіла некалькі кругоў, аднак Фэрміна Даса так і ня здолела пазнаць стары фамільны дом, бо там, дзе, як ёй здавалася, ён стаяў, месьцілася сьвінафэрма, а за рагом пачыналася вуліца бардэляў, і путаны ўсяго сьвету спраўлялі сіесту ў порціках на выпадак, калі раптам пройдзе паштар ды прынясе ім ліст з дому. Гэта ўжо не было сялібай яе дзяцінства. Напачатку шпацыру Фэрміна Даса схавала паўтвару мантыльляй, не таму што баялася быць пазнанай – не, тут ніхто ня мог ведаць яе, – а каб ня бачыць нябожчыкаў, якія пухлі на сонцы паўсюль ад чыгуначнай станцыі да могілкаў. Грамадзянскі і вайсковы камэнданты гарнізону сказалі ёй: «Гэта халера». Яна здагадалася, што так і было, угледзеўшы белую пену каля рота абпаленых сонцам целаў, але таксама заўважыла, што ні ў каго не было сьледу ад кулі ў патыліцы, як падчас вандроўкі на паветраным шары.

– Гэта так – сказаў афіцэр, – Бог таксама ўдасканальвае мэтады.

Адлегласьць ад Сан-Хуан-дэ-ля-Сіенагі да старажытнай сядзібы цукровага заводу Сан-Пэдра-Алехандрына складала ўсяго дзевяць лігаў. Жоўтаму цягніку, каб пераадолець іх, патрабаваўся ажно цэлы дзень, бо машыніст сябраваў з заўсёднымі пасажырамі, і яны часам прасілі яго спыніцца, каб разьмяць ногі, шпацыруючы па палёх для гольфу, якія належалі

Аўтар вае задумаў напісаць кнігу пра жыцьцё Сымона Вялівара, калі працаваў

бананавай кампаніі. Мужчыны купаліся аголеныя ўнадзрэтых і сьцюдзёных рэках, што сьцякалі з гор; праехаўшы рамэнаду ці дзьве лігі і адчуўшы голад, некаторыя выходзілі з вагонаў і даілі кароў, што пасьвіліся побач. Фэрміна Даса даехала ў жаху, і ў яе ледзь хапіла часу, каб палюбавацца велічнымі тамарындамі, на галінках якіх Вызваліцель вешаў гамак ужо на мяжы сьмерці, і пабачыла ложак, на якім ён памёр, і, як ёй і казалі, ён быў малы ня толькі для такога слыннага чалавека, але і для неданошанага дзіцяці. Аднак другі наведнік, які нібыта ўсё добра ведаў, патлумачыў, што ложак – толькі падробка, бо, на самай справе, паплечнікі Айца Радзімы кінулі яго аднаго паміраць на падлозе. Фэрміна Даса была прыгнечаная тым, што пабачыла і пачула з моманту адплыцьця з дому. На зваротным шляху, які яна праехала ў экіпажы, ужо не адчувалася асалода ўспамінаў аб той даўняй вандроўцы, як да гэтага марылася. Наадварот, яна старалася абмінаць сялібы, зь якімі была зьвязаная яе настальгія, ратуючы сябе ад расчараваньня. Яна чула акардэоны са сьцежак, па якіх уцякала ад нудоты, чула сьпевы байцовых пеўняў у загонах, вінтовачныя і рэвальвэрныя стрэлы, якія маглі аднолькава сьведчыць пра бойку і пра сьвята, і калі мусіла перасекчы сялібу, хавала твар за мантыльляй і заплюшчвала вочы, каб прыгадаць усё такім, якім яно было раней.

Аднойчы ўвечары Фэрміна Даса, якая пазьбягала сустрэчаў зь мінулым, усё ж прыбыла ў маёнтак стрыечнай сястры Ільдэбранды. Яна пабачыла яе і ледзь ня страціла прытомнасьць: гэта было як глядзець на сябе ў люстэрка праўды. Кузіна сталася мажная і пастарэла. Нарадзіла некалькі неўтаймаваных дзяцей, прычым не ад чалавека, якога па-ранейшаму кахала безнадзейна, а ад вайсковага адстаўніка, зь якім пайшла пад вянец з прычыны расчараваньня і крыўды, хоць вайсковец кахаў яе да шаленства. Але ў душы, у глыбінях старога цела кузіна заставалася такой жа, як у юнацтве. За некалькі дзён на шпацырах з Ільдэбрандай Фэрміна Даса прыйшла ў сябе ад уражаньняў, якія яе прыгняталі. Яна патанала ў прыемных успамінах, але імкнулася не выходзіць далей за паркан маёнтку, калі не лічыць традыцыйных паходаў у касьцёл на нядзельную імшу. Туды Фэрміна накіроўвалася з унукамі незацугляных сябровак юнацтва, з увішнымі хлапцамі

на выдатных конях, з гожымі і добра апранутымі, як колісь іхныя маці, дзяўчатамі. Яны ехалі стоячы на пралётках, запрэжаных валамі, і сьпявалі хорам ажно да місіянэрскага касьцёлу ў глыбіні даліны. Фэрміна Даса прайшлася толькі па сялібе Флёрэс-дэ-Марыя, дзе не была з часоў папярэдняй вандроўкі, бо і не падумала, што сяліба можа ёй спадабацца, але там адчула захапленьне. Яе бяда альбо бяда сялібы была ў тым, што раней ёй ніяк не ўдавалася прыгадаць, якой была сяліба сапраўды, а ўяўленьне прадстаўляла яе ў скажоным выглядзе.

Доктар Хувэналь Урбіна вырашыў ехаць за жонкай пасьля паведамленьня біскупа Рыёачы. Выснова была такой: жонка затрымлівалася наагул не таму, што не хацела вярнуцца, а таму што ня ведала, як адолець перашкоды ўласнае ганарлівасьці. Так што доктар Урбіна пусьціўся ў шлях без папярэджаньня, абмяняўшыся з Ільдэбрандай лістамі, зь якіх высьветліў, што жончына настальгія нібыта вывернулася, цяперака яна думала толькі пра дом. Аб адзінаццатай раніцы Фэрміна Даса была на кухні, гатавала фаршаваныя бакляжаны, калі пачула радасныя выкрыкі сялянаў, іржаньне коней, стрэлы ў паветра, а затым – рашучыя крокі ў вітальні і голас мужа:

– Лепш самому прыехаць своечасова, чымся быць запрошаным запозна.

Фэрміна Даса думала, што памрэ ад радасьці. Неяк памыла рукі і шапнула: «Дзякуй, Божа мой, дзякуй за тваю дабрыню», шкадуючы, што яшчэ не прыняла ванну праз клятыя бакляжаны; іх замовіла Ільдэбранда, якая, дарэчы, не сказала, хто запрошаны на абед. Фэрміна пакутавала ад думкі, што яна старая і непрыгожая, з аблезлым ад сонца тварам і што муж пашкадуе аб сваім прыезьдзе, калі пабачыць яе ў такім нядобрым стане. Але яна зноў жа выцерла рукі фартухом, крыху прывяла сябе ў парадак, сабрала ўсю ганарлівасьць, зь якой маці нарадзіла яе на сьвет, каб суняць ашалелае сэрца, і пайшла насустрач мужу салодкай паходкай аленіхі. Ішла з паднятай галавой і сьветлым позіркам, з кірпатым носам івалгі, і дзякавала лёсу за аграмадную палёгку, якую ёй давала вяртаньне дамоў. Усё гэта муж, зразумела, прыняў за чыстую

манэту, бо ад’яжджала зь ім, само сабой, на шчасьце. Тым часам яна для сябе вырашыла абавязкова расквітацца за горкія пакуты, якія ледзь не пазбавілі яе жыцьця.

Амаль праз два гады, якраз пасьля вяртаньня Фэрміны Дасы, адбылася адна зь неверагодных выпадковасьцяў, якую Трансыта Арыса назвала б Божымі жартамі. Флярэнтына Арыса ня надта цікавіўся такім вынаходніцтвам, як кіно, але Леона Касіяні адвяла яго без супраціву на нашумелую прэм’еру «Кабірыі», чыя слава трымалася на дыялёгах, напісаных паэтам Габрыелем д’Анунцыё. Вялікае патыё пад адкрытым небам у дона Галілеа Даконтэ, дзе ўначы больш захапляла прыгажосьць зорак у небе, чым нямая любоў на экране, было перапоўнена гледачамі з найвышэйшага грамадзтва. Леона Касіяні сачыла за акалічнасьцямі сюжэту, амаль ня дыхала. Флярэнтына Арыса, насупраць, драмаў, усыплёны кіношнай драмай. За ягонай сьпінай нейкая жанчына нібыта разгадала ягоныя думкі і ўскрыкнула:

– Божа мой, гэта цягнецца даўжэй за любы боль!

Яна сказала толькі гэта, бо яшчэ не прышчапіўся звычай суправаджаць нямыя кінастужкі п’есамі на піяніне, а зь цёмнае залі толькі чулі, быццам шэпт дажджу, пошум праектара. Флярэнтына Арыса прыгадваў Бога толькі ў найцяжэйшых сытуацыях, але на гэты раз ён дзякаваў Яму ад усёй душы. Бо нават у дваццаці пядзях пад зямлёй ён адразу ж пазнаў бы гэты голас з глухім мэталічным тэмбрам, які хаваў у душы з таго дня, калі, гледзячы на пажоўклую лістоту ў пустэльным сквэрыку, яна сказала яму: «Цяпер ідзіце і не вяртайцеся, пакуль я не паведамлю». Флярэнтына Арыса ўцяміў, што яна сядзіць за сьпінай, побач зь непазьбежным мужам, ён адчуў яе цёплы ды роўны подых і дыхаў адным зь ёю паветрам, нібыта ўзбагачаным, поўным здароўя, каханьня. Ён адчуваў, што яе ня зжэрла моль сьмерці, як часьцяком уяўлялася яму за апошнія месяцы яе адсутнасьці, і зноўку прыгадаў Фэрміну Дасу ў сьветлым і шчасьлівым узросьце, акругленую цяжарнасьцю першынцам пад тунікай Мінэрвы. Ён уяўляў яе так, нібыта глядзеў ёй у твар, і ўсе жарсьці, якія мелі месца на экране, былі яму зусім чужымі. Ён адчуваў асалоду ад водару мігдальнай

парфумы, якая вяртала яму інтымнае жыццё, і хацеў зьведаць яе думку адносна таго, як улюбляюцца жанчыны ў кіно, каб іх каханьне прыносіла менш пакутаў, чым у сапраўдным жыцьці. Яшчэ да канца фільму ён раптам здагадаўся ў пробліску радасьці, што ніколі ня быў так доўга і блізка да жанчыны, якую кахаў спрадвечна.

Калі запалілі сьвятло, Флярэнтына Арыса даў час падняцца іншым гледачам. Затым павольна ўстаў, расьсеяна павярнуўся, звыкла зашпільваючы камізэльку, і ўсе чацьвёра аказаліся твар да твару, ды так блізка, што міжволі мусілі павітаць адно аднаго, няхай нават хтосьці зь іх і не хацеў гэтага. Хувэналь Урбіна павітаў спачатку Леону Касіяні, якую добра ведаў, а потым са звычайнай вытанчанасьцю працягнуў руку Флярэнтына Арысу. Фэрміна Даса накіравала ім усьмешку ветлівасьці. Ва ўсялякім разе, гэта была ўсьмешка жанчыны, якая часьцяком бачыла іх, ведала, хто яны такія, і ёй ня трэба было, каб іх ёй прадставілі. Леона Касіяні адказала з грацыёзнасьцю мулаткі. Затое Флярэнтына Арыса ня ведаў, як паводзіць сябе, ашаломлены выглядам Фэрміны Дасы.

Гэта была іншая жанчына. Флярэнтына Арыса не знайшоў ні сьледу ад страшнай і моднай хваробы на яе твары, ні сьлядочку ад іншых і яму вядомых захворваньняў, цела Фэрміны Дасы захоўвала прыкметы прыгажосьці лепшых часоў, але было відавочна, што апошнія два гады даліся ёй за дзесяць. Ёй была да твару кароткая стрыжка з выгінам крыла каля шчакі, але колішні мядовы колер валасоў ужо стаўся алюмінавым, гожыя пранізьлівыя вочы страцілі палову свайго сьвятла праз бабульчыны акуляры. Флярэнтына Арыса бачыў, як яна аддалялася пад руку з мужам у натоўпе, што пакідаў залю кінэматографу, і зьдзівіўся, што Фэрміна Даса зьявілася на вачох у публікі ў старой хустцы і хатніх чаравіках. Аднак больш за ўсё яго ўсхвалявала, што мужу трэба было трымаць яе за локцік, каб накіраваць да выхаду, і нават так яна не разьлічыла вышыні прыступак перад дзьвярыма і ледзь ня ўпала.

Флярэнтына Арыса быў вельмі чулы да гэтых цяжкасьцяў сталага веку. Яшчэ ў маладосьці ён перапыняў чытаньне вершаў у сквэрыках гораду і назіраў за парамі старых людзей,

за тым, як яны дапамагалі адно аднаму перайсьці вуліцу, і гэта была навука жыцьця, якая дазваляла яму спрычыняцца да законаў немінучай уласнай старасьці. Ён падумаў, што ва ўзросьце доктара Хувэналя Ўрбіна, якім ён бачыў яго ў кіно, мужчыны нібыта квітнелі восеньскай маладосьцю. Яны здаваліся больш высакароднымі зь першай сівізной, выпраменьвалі спакусьлівасьць дасьведчаных мужчынаў. Асабліва ў вачох маладых жанчын, а іхныя завялыя жонкі шукалі апору ў руцэ мужа, каб не спатыкацца нават аб уласны цень. Празь некалькі гадоў, аднак, перад мужамі раптоўна раскрывалася бездань жахлівай старасьці цела і душы. Тады ачунялыя жонкі вялі іх за руку, як сьляпцоў, што стаяць на паперці, і шапталі ім на вуха, каб ня раніць іх мужчынскую годнасьць, просячы быць уважлівым, маўляў, наперадзе – тры прыступкі, а ня дзьве, пасярод вуліцы вялізная лужына, а той пак, што ляжыць на ходніку, – гэта памерлы жабрак. І жанчыны, няхай зь цяжкасьцю, дапамагалі ім перайсьці вуліцу, нібыта знаходзілі адзіны брод у апошняй рацэ жыцьця. Флярэнтына Арыса неаднойчы глядзеў на сябе ў тым люстэрку, ён больш за ўсё баяўся страшнага ўзросту, калі жанчына вяла б яго пад руку. Ён ведаў, што тады і толькі тады мусіць адмовіцца ад надзеі, імя якой Фэрміна Даса.

Сустрэча ў кіно яго абудзіла. Замест таго, каб адвезьці Леону Касіяні на пралётцы, ён праводзіў яе пешшу праз старажытную частку гораду, дзе крокі гучалі, нібыта капыты па брукаванцы. Часам з адчыненых бальконаў даносіліся абрыўкі фразаў, алькоўныя шчырасьці, усхліпы любові, перабольшаныя прывіднай акустыкай і цёплым водарам язьмену ў сонных завулках. Яшчэ раз Флярэнтына Арыса мусіў сабраць усе сілы, каб не распавесьці Леоне Касіяні пра каханьне да Фэрміны Дасы. Яны ішлі пад руку марудным крокам, нібыта здаўна заручаныя, яна думала пра пякноты Кабірыі, ён – пра ўласнае няшчасьце. На адным з бальконаў Мытнага Пляцу сьпяваў мужчына, і песьня паўтаралася ў прасторы ланцугом адгалоскаў: «Калі я прайшоў па хвалях бязьмежнага мора...» На вуліцы Каменных Сьвятых, якраз перад разьвітаньнем на парозе яе дому, Флярэнтына Арыса папрасіў Леону Касіяні, каб яна запрасіла яго на кілішак брэндзі. Ён прасіў пра гэта ў падобнай сытуацыі двойчы. Упершыню, дзесяць гадоў таму, яна

адказала: «Калі ты ўвойдзеш зараз, мусіш застацца назаўсёды». Тады ён не ўвайшоў. Аднак на гэты раз ён так ці інакш выкарыстаў бы прапанову, нават калі б давялося парушыць дадзенае слова. Аднак Леона Касіяні запрасіла яго безь якіх-кольвек умоваў.

Вось так ён зусім нечакана апынуўся ў сьвяцілішчы любові, якая была зьнішчаная яшчэ да свайго нараджэньня. Яе бацькі памерлі, адзіны брат стаўся багацеем на Курасао, і яна жыла адна ў старажытным фамільным доме. За некалькі гадоў да гэтага, калі Флярэнтына Арыса яшчэ не адмовіўся ад спадзеваў стацца яе палюбоўнікам, ён зазвычай наведваў яе па нядзелях са згоды бацькоў, часам заходзіў позна ўначы. Ён так часта рабіў унёскі ў падтрыманьне састарэлага дому, што ўрэшце лічыў яго ледзь не сваім. Але гэтай ноччу пасьля кіно адчуў, што гасьцёўня ўжо ня тая, якая жыла ў ягоных успамінах. Мэбля была расстаўленая інакш, на сьценах віселі іншыя хромалітаграфіі, і ён падумаў, што такія жорсткія зьмены не адбыліся самі па сабе, яны былі зьдзейсьненыя, каб замацаваць упэўненасьць у тым, што яго ніколі не існавала. Кот не пазнаў яго. Спужаны жорсткасьцю гэтага забыцьця, ён сказаў: «Ён ужо мяне ня памятае». Але яна адказала, стоячы сьпінай да яго і наліваючы брэндзі: «Калі гэта цябе хвалюе, можаш спаць спакойна, каты ня здольныя прыгадваць нікога».

Адкінуўшыся на сьпінку канапы, седзячы побач, яны гаварылі пра тое, якімі былі абое да таго дня Бог ведае якога году, калі сустрэліся ў трамваі, які цягнулі пакорлівыя мулы. Іх жыцьцё працякала ў суседніх службовых пакоях, і да гэтае пары яны ніколі не гаманілі адно з адным ні пра што, што не датычыла б звычайнай працы.

Пакуль ішла гамонка, Флярэнтына Арыса паклаў ёй руку на калена, стаў лашчыць яе пяшчотна, як дасьведчаны спакусьнік, і яна не замінала яму, але не адказала нават лёгкім знакам узаемнасьці. Толькі калі ён зайшоў занадта далёка, яна ўзяла ягоную руку і пацалавала далонь.

– Паводзь сябе добра, – сказала яна, – я даўно здагадалася, што ты ня той, каго я шукаю.

У раньнім юнацтве дужы ды спрытны чалавек, твару якога яна так і не разгледзела, раптам паваліў яе на хвалярэзе, распрануў, нібыта ўдарамі драпежных лапаў, і авалодаў ёю імгненна і жарсна. Кінутая на камянёх з драпінамі па ўсім целе, яна хацела аднаго: каб мужчына застаўся зь ёю назаўсёды і дазволіў ёй памерці ад каханьня ў ягоных руках. Леона не разгледзела ягонага твару, не пачула і голасу, але верыла, – яна пазнае яго сярод тысячаў па фігуры, росьце і моцы любові. З тае пары яна гаварыла ўсім, хто згаджаўся яе слухаць: «Калі ты калі-небудзь пазнаеш вялікага ды моцнага чалавека, які згвалціў бедную нэгрыцянку на вуліцы Хвалярэза Тапельцаў аднойчы а палове на дванаццатую ночы 15 кастрычніка, скажы яму, дзе ён зможа мяне знайсьці». Яна казала гэта звычайна, і столькім людзям, што ўрэшце засталася без надзеі. Флярэнтына Арыса слухаў яе кароткі аповед столькі разоў, колькі чуў па начах разьвітальныя гудкі параходаў. Да другой гадзіны па поўначы яны выпілі па тры кілішкі брэндзі, і ён ужо ведаў напэўна, што ня ёсьць тым доўгачаканым мужчынам, і гэта яго ўзрадавала.

– Малайчына, ільвіца*, – сказаў ён, сыходзячы, – нарэшце мы забілі тыгра.

На гэтым ноч ня скончылася. Злыя плёткі пра лякарку, якая сухотнікаў спудзілі ягоныя мроі, бо пасеялі ў ім падазрэньне, што Фэрміна Даса таксама сьмяротная і ёй нішто не [illegible] памерці раней за свайго мужа. Але калі ён убачыў, як яна спатыкнулася каля выхаду з кіно, Флярэнтына Арыса [illegible] яшчэ адзін крок насустрач бездані, адкрыўшы раптам, што не яна, а ён сам можа сысьці ў іншы сьвет першым. Гэта і быў жахлівы знак, бо пацьвярджаўся рэальнасьцю. Ззаду засталіся гады бязглуздага чаканьня, спадзеваў на шчасьце, але на гарызонце бачылася толькі бяздонная багна ўяўных хваробаў, супакаяльныя кроплі ў перадзолкавай бессані, штодзённая сьмерць увечары. Флярэнтына Арыса падумаў, што кожнае пражытае імгненьне, якое раней здавалася ягоным сябрам і абавязковым саюзьнікам, цяпер уступала ў змову са сьмерцю супраць яго. Пару гадоў назад ён ішоў на сустрэчы з боязьзю перад лёсам, дзьверы былі не зачыненыя, каб ён увайшоў бязгучна, але ў апошнюю хвілю ён раскаяўся, збаяўшыся

спрычыніць лагоднай чужой жанчыне непапраўную шкоду, памершы ў ейным ложку. Так што ён меў права думаць, што самая каханая на зямлі жанчына, якую ён чакаў яшчэ зь мінулага стагодзьдзя без адзінага ўздыху расчараваньня, ледзь пасьпела б узяць яго пад руку на вуліцы пад поўняй, дзе вецер заблытвае сьцяблінкі макаў на клюмбах, каб дапамагчы яму без трывогі перайсьці на той бок да ягонае сьмерці.

Праўда крылася ў тым, што паводле крытэраў тае эпохі Флярэнтына Арыса ўжо ўступіў у межы старасьці. Яму было пяцьдзясят шэсьць гадоў, і ён лічыў, што пражыў іх добра, бо гэта былі гады любові. Аднак тады не было мужчыны, які б згадзіўся выклікаць агульны сьмех, выглядаючы маладзей за свой узрост, нават калі гэта было так, альбо калі ён верыў, што гэта так; і ніхто б не адважыўся прызнаць бяз сораму, што ён яшчэ плача ўпотайкі праз сваю зьняважаную любоў, якая мела месца ў мінулым стагодзьдзі. Гэта былі ня лепшыя часы для маладых: кожны ўзрост меў уласны стыль вопраткі, але старэчы стыль пачынаўся адразу пасьля юнацтва і захоўваўся да скону. Гаворка ішла ня столькі пра ўзрост, колькі пра грамадзкую годнасьць. Юнакі апраналіся, як іхныя дзяды, дачасна надзявалі на пераносьсе акуляры, якія надавалі ім рэспэктабэльнасьць, кій выглядаў салідна ўжо ў трыццаць гадоў. Для жанчын існавалі толькі два ўзросты: шлюбны, які ніколі не сягаў за дваццаць два гады, і ўзрост вечных незамужак, незапатрабаваных. Першыя зь іх – жонкі, маці, удовы, бабулі – складалі асаблівы від, які зьвязваў уласны век не з пражытымі гадамі, а з набліжэньнем сьмерці.

Флярэнтына Арыса, са свайго боку, сутыкнуўся з хітрыкамі старасьці жорстка і дзёрзка, хоць ён ведаў, што дзіўны лёс зрабіў яго падобным да старога ўжо з маленства. Напачатку гэта было неабходна. Трансыта Арыса разьбірала вопратку, падкінутую ягоным бацькам, і перашывала сыну, так што ён хадзіў у пачатковую школу ў сурдутах, якія падмяталі падлогу, калі ён садзіўся, у міністэрскіх капелюшах, якія спаўзалі на вушы нягледзячы на тое, што маці зьмяншала іхны памер, набіваючы вату пад падкладку. Апрача таго, ён насіў акуляры ад блізарукасьці зь пяці гадоў, а ягоныя валасы былі непаслухмяныя, як у маці, грубыя, як конскі волас; выгляд

Флярэнтына Арысы ні аб чым не казаў. На шчасьце, пасьля неверагоднага беспарадку ў калідорах улады з прычыны шматлікіх грамадзянскіх войнаў, якія ішлі адна за адной, школьныя крытэры былі не асабліва суворымі, дзеці розных сацыяльных становішчаў перамяшаліся ў дзяржаўных школах. Яшчэ зусім зялёныя малыя прыходзілі ў клясу з пахам барыкаднага пораху, у форме паўстанцкіх афіцэраў са знакамі адрозьненьня, якія былі зароблены пад сьвінцовымі кулямі ў сумнеўных баёх, з табэльнай зброяй, якая тырчала з-пад пасу. На перапынках яны ладзілі перастрэлкі пры самай малой спрэчцы, пагражалі настаўнікам за благія вынікі на іспытах. Адзін зь іх, вучань трэцяй клясы ў школе Ля-Салье, ён жа палкоўнік апалчэнцаў у адстаўцы, лоўкім стрэлам забіў сьвятара Хуана Эрэміта, галаву прыходу, за тое, што на занятках катэхізісу той сказаў, нібыта Бог быў дзейсным сябрам кансэрватыўнае партыі.

Аднак дзеці зьбяднелых слынных сямей апраналіся, нібыта старажытныя прынцы, а найбяднейшыя зь іх хадзілі босымі. На фоне ўсіх гэтых дзівосаў Флярэнтына Арыса займаў месца ўсё ж у групе найбольш экстравагантных школьнікаў, хоць не настолькі, каб зьвяртаць на сябе чыюсьці пільную ўвагу. Самае крыўднае, што ён чуў на свой адрас, было кімсьці кінутае на вуліцы: «Бедны, гадкі, да салодкага падкі». Так ці інакш, вопратка магільшчыка ўжо тады і да канца ягонага жыцьця найбольш пасавала да яго загадкавай натуры і змрочнага характару. Калі Флярэнтына Арыса ўпершыню ўступіў на высокую пасаду ў параходнай кампаніі, ён замовіў строі ў тым жа стылі, што і бацька, якога ён згадваў старым чалавекам, памерлым у ганаровым узросьце Хрыстовым – трыццаці трох гадоў ад нараджэньня. Флярэнтына Арыса заўсёды выглядаў старэйшым, чымся быў насамрэч. Настолькі, што языкастая Брыхіда Сулета, мімалётная палюбоўніца, якая заўжды гаварыла праўду, сказала яму, не задумваючыся, што зь першага дня ён больш падабаўся ёй, калі распранаўся, бо аголеным Флярэнтына Арыса скідваў дваццаць гадоў. Аднак ён ня здолеў пазбавіцца ад старой звычкі, па-першае, праз свой густ, які не дазваляў апранацца інакш, а па-другое, праз тое, што ніхто толкам ня ведаў, які стыль вопраткі патрабуецца, каб выглядаць маладзей у дваццаць гадоў, хоць адкрый шафу і

апрані кароткія штонікі, дзіцячую бесказырку. Да таго ж, ён сам ня мог абыходзіцца без усьведамленьня свайго ўзросту, так што калі ён заўважыў, што Фэрміна Даса спатыкнулася каля выхаду з кіно, яго ўзрушыла цалкам натуральная думка, нібыта бліскавіца жаху, – гэтая блядзкая сьмерць немінуча пераможа ў жорсткай вайне за каханьне.

Якраз тады Флярэнтына Арыса ўжо завершыў другую баталію не за жыцьцё, а за сьмерць, і ён прайграў яе бясслаўна, бо змагаўся ні з чым іншым, як з аблысеньнем. Ён упершыню прыкмеціў зблытаныя валасы на грабеньчыку, і ўсьвядоміў, што асуджаны на апраметную, пакутаў якой не разумеюць тыя, хто гэтага не перажываў. Флярэнтына супраціўляўся гадамі. Не было мазяў і супрацьгрыбковых сродкаў, якіх бы ён ня выпрабаваў і ў якія б ён ня верыў, не было пакутаў, якіх бы ён не перажыў, абараняючы кожную цалю галавы ад ненажэрнага спусташэньня. Ён вывучыў на памяць інструкцыі «Брыстальскага альманаху сельскай гаспадаркі», бо аднойчы чуў ад кагосьці, што рост валасоў непасрэдна залежыць ад тых самых цыкляў, што і ў збожжавых расьлінаў. Ён перастаў хадзіць да свайго сталага цырульніка, валадара шыкоўнае лысіны, і памяняў яго на замежніка, які нядаўна прыехаў у горад і стрыг толькі ў тыя дні, калі месяц уваходзіў у чвэрць маладзіка. Новы цырульнік ужо давёў выдатнае ўзьдзеяньне сваёй рукі, як раптам высьветлілася, што яго шукае паліцыя некалькіх антыльскіх краінаў за згвалтаваньне паслушніцы. Яго зьвезьлі ў кайданах.

Флярэнтына Арыса выразаў усялякія абвесткі, якія друкаваліся ў газэтах Карыбскага басэйну: побач два партрэты аднаго і таго ж чалавека, у першым выпадку ён быў лысым, як дыня, а ў другім – з густой шавялюрай ільва: пасьля прыёму надзейных лекаў. На працягу шасьці гадоў ён выпрабаваў сто семдзесят два такія сродкі, калі не лічыць дадатковых мэтадаў, якія рэклямаваліся на бірках кожнага флякону. З дапамогай аднаго з гэтых сродкаў ён абзавёўся толькі чарапной экзэмай. Яна выклікала сьверб і сьмярдзела. Сьвятошы з Мартынікі назвалі гэтую хваробу паўночным зьзяньнем, бо ў цемры чэрап выпраменьваў фасфарычны бляск. Флярэнтына Арыса зьвярнуўся, нарэшце, да зёлак, якімі індзейцы гандлявалі на

кірмашы, да магічных сродкаў і ўсходніх напояў, якія прадаваліся каля Натарыяльнай Брамы. Але калі ён усё ж упэўніўся, што яго падманваюць, на макушцы ўжо зьзяла манашая танзура. У нулявым годзе, калі тысячадзённая грамадзянская вайна пасьпела як сьлед абяскровіць краіну, па горадзе прайшоў італьянец, які на замову рабіў парыкі з натуральных валасоў. Парык каштаваў зашмат, а майстра не адказваў за сваю працу пасьля трох месяцаў носкі, аднак мала хто з лысых багацеяў устаяў перад спакусай. Флярэнтына Арыса быў адным зь першых. Ён прымерыў парык настолькі блізкі па колеры да яго асабістай масьці, што баяўся, а раптам гэты парык заварушыцца на ім ад зьмены настрою, але ўсё-ткі ня здолеў зьмірыцца з думкай пра тое, што носіць на галаве валасы нябожчыка. Натуральным суцяшэньнем сталася ненажэрнасьць лысіны, яна не дала яму часу пазнаць колер уласнае сівізны. Аднойчы вясёлы п'янтос, які сустракаўся яму і раней на рачной прыстані, але гэтым разам быў у стане раскрыцьця пачуцьцяў больш, чым зазвычай, абняў Флярэнтына Арысу, калі той выходзіў з канторы, зьняў зь яго капялюш, выклікаўшы сьмех грузчыкаў, і звонка пацалаваў у лоб.

– Лысы прыгажун! – крыкнуў весялун яму сьледам.

Тады Флярэнтына Арыса, якому было сорак восем гадоў, загадаў выстрыгаць слабы пушок, які заставаўся на скронях і патыліцы, і цалкам прыняў лёс абсалютна лысага чалавека. Да такой ступені, што ўранку перад душам намазваў пенай ня толькі падбародак, але і тыя часткі чэрапу, дзе зноўку зьяўляўся пушок, і здымаў яго небясьпечнай брытвай, ператвараючы голаў у азадак гадавалага немаўляці. Да тае пары ён не здымаў капялюш нават у канторы, бо лысіна выклікала ў ім пачуцьцё амаральнай аголенасьці. Аднак, усьвядоміўшы становішча, ён прыпісаў гэтую аголенасьць да ліку мужчынскіх годнасьцяў, пра што раней чуў са зьнявагай, бачачы ў падобных высновах плён уяўленьня ўжо аблыселых фантазэраў. Пазьней ён успрыняў новы звычай, ня стрыг валасы каля правай скроні і перачэсваў іх цераз лоб улева. На гэтым Флярэнтына Арыса спыніўся. Аднак ён працягваў насіць капялюш, заўсёды ў хаўтурным стылі, нават пасьля таго, як увайшлі ў моду капелюшы тартарыта – такой была мясцовая

назва французскіх канат’е.

Страта зубоў не была зьвязаная з натуральнай хваробай, наадварот, чыньнікам паслужыла бязладная памылка прышлага дантыста, які надумаў выразаць жыўцом элемэнтарную інфэкцыю. Страх перад борам, які круціўся нажной пэдальлю, не дазваляў яму наведаць зубнога лекара, нягледзячы на стабільны боль, пакуль той ня стаўся невыносным. Маці спужалася, пачуўшы ўначы несуцешныя стогны з суседняга пакою, ёй здавалася, што паўтараюцца разьвеяныя туманом памяці часы яго першага каханьня, аднак, загадаўшы яму адкрыць рот, каб зірнуць, скуль гэты боль, яны знайшла, што ўсе дзясны былі пакрытыя гнайнікамі. Дзядзька Леон XII накіраваў яго да доктара Франсіса Аданая, нэгрыцянскага волата ў ботах і галіфэ, які плаваў на рачных параходах з поўным зубным кабінэтам у дарожнай сумцы і больш быў падобным на коміваяжэра, што наводзіў жах у прырэчных сялібах. Доктар зазірнуў у рот і адразу вызначыў, што Флярэнтына Арысу трэба выдаліць нават здаровыя зубы, каб уратаваць яго ад наступстваў запушчанасьці. У параўнаньні з воляй на змаганьне з аблысеньнем, асьлінае лекаваньне далося яму лёгка, калі не лічыць натуральнага страху перад катаваньнем без анэстэзіі. Яго таксама не пужала думка пра зубныя пратэзы, перадусім праз настальгію па маленстве. Ён часьцяком згадваў кірмашовага штукара, які здымаў сківіцы, клаў іх на стол, і яны працягвалі размаўляць самі; апрача таго, ён уцяміў, што апэрацыя пакладзе канец зубному болю, ад якога ён пакутаваў зь дзяцінства, амаль такога ж жорсткага, як пакуты ад каханьня. Гэта не падавалася яму такім страшным ударам старасьці, як аблысеньне. Флярэнтына Арыса быў пэўны, што, нягледзячы на рэзкі пах вульканізаванага каўчука ад устаўной сківіцы, ён будзе выглядаць лепш з артапэдычнай усьмешкай. Такім чынам, ён без супраціву скарыўся абцугам доктара Аданая і перанёс выздараўленьне з асьлінай цярплівасьцю.

Дзядзька Леон XII займаўся дэталямі апэрацыі, нібыта рэзаць зьбіраліся яго. Ён меў асаблівую цікавасьць да зубных пратэзаў, якая ўзьнікла падчас яго першых вандровак па рацэ Магдалене, празь яго маніякальнае захапленьне бэльканта. Аднойчы пад

поўняй на падыходзе да порту Гамары дзядзька Леон XII пайшоў у заклад зь нямецкім землямерам, маўляў, ён абудзіць жыхароў сэльвы нэапалітанскім рамансам з капітанскага мастка. І ледзь ня выйграў. У рачным змроку ўзьляцелі чаплі над багнай, раздаліся ўдары каймана хвастом па вадзе, зь перапуду біліся рыбіны-шалёнкі, нібыта спрабавалі скочыць на бераг, аднак на самай высокай ноце, калі пасажыры баяліся, што ў яго ад напругі лопнуць артэрыі, зубны пратэз быў выкінуты з рота сілай заключнага выдыху і патануў у вадзе.

Карабель затрымаўся ў порце Тэнэрыфэ на тры дні, пакуль яму тэрмінова рабілі другі пратэз. Ён падышоў выдатна. Аднак на зваротным шляху, спрабуючы патлумачыць капітану, як ён згубіў папярэдні пратэз, дзядзька Леон XII набраў поўныя лёгкія гарачага паветра сэльвы і выдаў найвышэйшую ноту, на якую быў здольны, зноўку нагнаўшы страх на кайманаў, якія загаралі, гледзячы неміргаючымі вачыма на карабель, што праходзіў міма, і... зноў плынь аднесла новенькі пратэз. З тае пары ён трымаў дублікаты пратэза паўсюль – у розных месцах дому, у скрыні пісьмовага стала і на борце кожнага з трох караблёў кампаніі. Апрача таго, калі абедаў дзе-кольвек па-за домам, запасныя зубы заўсёды былі пры ім у скрыні з-пад таблетак ад кашлю, бо аднойчы пратэз трэснуў, калі ён спрабаваў разжаваць скварку на пікніку. Баючыся, што пляменьнік стане ахвярай падобных непрыемнасьцяў, дзядзька Леон XII загадаў доктару Аданаю зрабіць адразу два пратэзы: адзін з таньнейшых матэрыялаў на кожны дзень і другі для выходных і сьвятаў – з залатымі іскрынкамі на карэнных зубах, якія б упрыгожвалі ўсьмешку і прыдавалі твару пляменьніка выраз шчырасьці. У вербную нядзелю, усхваляваны сьвяточнымі перазовамі званоў, Флярэнтына Арыса нарэшце выйшаў на вуліцу ў новым абліччы, і беззаганная ўсьмешка пакідала ў яго пачуцьцё, нібыта яго месца заняў нехта іншы.

Якраз у той час памерла маці, і Флярэнтына Арыса застаўся адзін у доме, у кутку, які як найлепш падыходзіў для каханьня, бо хаця вуліца і была досыць далікатная, мноства вокнаў усё ж змушала думаць пра лішнія вочы за фіранкамі. Аднак у доме ўсё было зроблена дзеля шчасьця Фэрміны Дасы, і толькі яна дачакаецца яго, так што Флярэнтына Арыса палічыў за лепшае

страчваць шматлікія мажлівасьці на працягу самых плённых гадоў, але не заплямiў дом іншай любоўю. На шчасьце, кожная новая ступень у параходнай кампаніі прымяркоўвала новыя прывілеі, перадусім негалосныя, і самая карысная зь іх была ў мажлівасьці выкарыстоўваць офіс уначы альбо ў выходныя і сьвяточныя дні з маўклівае згоды вартаўніка. Аднойчы, калі Флярэнтына Арыса быў ужо віцэ-прэзыдэнтам, ён любіўся зь дзяўчынай, якая дзяжурыла ў нядзелю, на канторскім крэсьле, калі раптам адчыніліся дзьверы. Дзядзька Леон XII зазірнуў, нібыта пераблытаўшы офісы, і паглядзеў на спужанага пляменьніка паўзьверх акуляраў. «Карамба, – сказаў дзядзька безь зьдзіўленьня, – ты такі ж, як твой бацька! – І перад тым, як зачыніць дзьверы, дадаў з расьсеяным паглядам: – А вы, дзяўчына, працягвайце. Клянуся сумленьнем, я ня бачыў вашага твару».

Пра гэта больш не гаманілі, але ўвесь наступны тыдзень у кабінэце Флярэнтына Арысы немажліва было працаваць. У панядзелак зьявіліся чародкай электрыкі, каб прыладзіць лопасны вэнтылятар да столі. Сьлесары прыйшлі без папярэджаньня і нарабілі шуму, уразаючы новы замок, каб дзьверы зачыняліся знутры. Сталяры зьнялі меркі, не тлумачачы, навошта, мэбляры прынесьлі ўзоры тканіны і праверылі, ці пасуюць яны да шпалераў кабінэту, а праз тыдзень даставілі аграмадную дзьвюхспальную канапу, абіўку якой упрыгожвалі пышныя кветкі. Канапа ўсё-ткі ня ўлезла ў дзьверы, і давялося зацягваць яе праз акно. Людзі працавалі ў самы нечаканы час, вялі сябе нахабна, як здалося Флярэнтына Арысу, – на любы яго пратэст адказ быў адзіны: «Гэта загад генэральнай дырэкцыі». Ён губляўся ў здагадках, ці было падобнае ўмяшальніцтва ветлівасьцю дзядзькі і паблажлівага стаўленьня да яго бурлівых любоўных прыгодаў, альбо ва ўласьцівай яму манеры ён даваў зразумець, што не ўхваляе легкадумных паводзінаў. Флярэнтына Арысу нават да галавы не прыйшло, што дзядзька Леон XII заахвочваў яго, бо да яго таксама дайшлі чуткі, што пляменьнік не падобны да бальшыні мужчынаў у сваіх сэксуальных звычках, і гэта наганяла сум на дзядзьку, перашкаджаючы пляменьніку на шляху да лёсу адзінага пераемніка.

Леон XII Ляайса быў супрацьлеглым свайму брату, пражыў шэсьцьдзесят гадоў у стабільным шлюбе і вельмі ганарыўся тым, што ніколі не працаваў у нядзелю. Ён меў чацьвёра сыноў і дачку. Усіх ён рыхтаваў да атрыманьня высокіх пасадаў ва ўласнай імпэрыі, але жыцьцё падкінула шэраг выпадковасьцяў, звычайных для раманаў таго часу, хаця ніхто ня верыў у мажлівасьць падобнага ў сапраўдным жыцьці. Сыны памерлі адзін за адным па меры таго, як прызначаліся на новыя ўладныя пасады, а дачка была цалкам пазбаўленая рачнога прызваньня і адышла ў іншы сьвет, назіраючы за чужымі караблямі на Гудзоне праз акно на вышыні пяцідзесяці мэтраў. Гэта настолькі ўразіла людзей, што нават пайшлі чуткі, нібыта Флярэнтына Арыса, заўсёды змрочна апрануты, з чорным парасонам у руцэ – вампір дый годзе – штосьці такое нарабіў і справакаваў ланцуг выпадковасьцяў.

Калі дзядзька насуперак уласнай волі адышоў ад справаў, скарыўшыся дактарам, Флярэнтына Арыса ахвотна ахвяраваў любоўю па нядзелях дзеля яго. Езьдзіў у ягоны прытулак на адным зь першых аўто, якія зьявіліся ў горадзе, чыя заводная ручка мела такую аддачу, што адарвала руку першаму кіроўцу. Яны гаманілі гадзінамі, стары ляжаў у гамаку са сваімі ініцыяламі, вышытымі шоўкам, сьпінай да мора, далёкі ад сусьветнай мітусьні, у старажытным рабаўладальніцкім маёнтку, дзе з тэрасы, што патанала ў астрах, на заходзе сонца бачыліся засьнежаныя горныя вяршыні. Флярэнтына Арыса і ягоны дзядзька ніколі не гаварылі пра штосьці іншае, акрамя рачнога параходзтва, і так было і ў тыя доўгія вечары, калі сьмерць прысутнічала ў доме нябачнай госьцяй. Дзядзьку Леона XII хвалявала адно: каб рачная гаспадарка не апынулася ў руках прадпрымальнікаў з унутраных правінцыяў, зьвязаных з эўрапейскімі канцэрнамі. «Гэта заўсёды было нашай справай з часоў гандлю рабамі, – сказаў ён. – Калі гэтым завалодаюць франты са сталіцы, усё дастанецца задарам немцам». Такі быў ягоны заўсёдны клопат, які падтрымліваўся і палітычнымі перакананьнямі, і ён любіў паўтараць гэта пры ўсякай нагодзе альбо безь яе.

– Мне хутка будзе сто гадоў, я бачыў перамены ва ўсім, нават у зрухах нябесных целаў, але яшчэ нічога не зьмянілася ў нашай

краіне. Мы тут маем новыя канстытуцыі, новыя законы, новыя войны кожныя тры месяцы, аднак мы па-ранейшаму жывём, як у каляніяльныя часы.

Братбм, прыхільнікам масонаў, якія лічылі, што ўсе беды маюць месца з-за паразы фэдэралізму, ён заўсёды пярэчыў: «Тысячадзённая вайна прайграная за дваццаць тры гады да яе пачатку, у вайне семдзесят шостага году». Флярэнтына Арыса, бязьмежна абыякавы да палітыкі, слухаў усё больш частыя тырады, нібыта пошум марскіх хваляў. Аднак ён жорстка аспрэчваў палітыку самога прадпрыемства. Насуперак крытэрам дзядзькі, Флярэнтына Арыса думаў, што адсталасьць рачнога параходзтва, якое заўсёды было на мяжы катастрофы, можна было пераадолець толькі добраахвотнай адмовай ад манаполіі на эксплюатацыю параходаў, дараванай Карыбскай параходнай кампаніі Нацыянальным кангрэсам на дзевяноста дзевяць гадоў і адзін дзень. Дзядзька пратэставаў: «Гэта мая цёзка Леона зь яе анархісцкімі замашкамі ўнушае табе такія думкі». Але гэта было слушна толькі часткова. Флярэнтына Арыса абгрунтоўваў стратэгію адмоўным досьведам нямецкага камадора Ёгана Б. Эльбэрса, які зьвёў высакародную справу на нішто празьмернымі ўласнымі амбіцыямі. Дзядзька лічыў, са свайго боку, што параза Эльбэрса была зьвязаная не зь ягонымі манапольнымі правамі, а зь нерэальнымі абавязальніцтвамі, якія ён прыняў на сябе ўвадначас, нібыта цяжар поўнай адказнасьці за ўсю нацыянальную геаграфію. Ён адказваў за ўтрыманьне ракі ў прыдатным для навігацыі стане, за партовыя забудовы і абсталяваньне, за транспартныя сродкі. Апрача таго, як сьцьвярджаў дзядзька, рашучы супраціў гэтаму прэзыдэнта Сымона Балівара не належаў да шэрагу дробных перашкодаў.

Большасьць партнэраў успрымалі гэтыя дэбаты як сямейныя спрэчкі, у якіх абодва бакі мелі рацыю. Упартасьць старога здавалася цалкам натуральнай, і не таму, што старасьць пазбавіла яго заўсёднай дальнабачнасьці, як лічылі легкадумцы, – адмовіцца ад манаполіі азначала выкінуць на сьметнік трафэі гістарычнае бітвы, выйгранай ім і ягонымі братамі ў магутных супраціўнікаў з усяго сьвету. Так што дзядзька аформіў свае правы такім чынам, што ніхто ня мог аспрэчваць іх да законнага завяршэньня тэрміну. Аднак

раптам, калі Флярэнтына Арыса ўжо склаў зброю ў тыя вечары роздуму на тэрасе маёнтку, дзядзька Леон XII пагадзіўся на адмову ад стогадовых прывілеяў з адзінай умовай: каб яны захоўваліся да ягонай сьмерці.

Гэта было яго апошняе рашэньне. Ён больш не гаварыў пра справы, не раздаваў парадаў, ня страціў ніводнага воласу з сваёй пышнай шавялюры, ні кроплі яснасьці розуму, але зрабіў усё мажлівае, каб пазьбегнуць сустрэчы з тымі, хто мог глядзець на яго са шкадаваньнем. Ён праводзіў дні ў назіраньні спрадвечных сьнягоў з тэрасы, марудна гойдаўся ў венскім гамаку каля століка, на якім служанкі заўсёды трымалі каструлю гарачае кавы і шклянку содавага раствору з двума зубнымі пратэзамі, якімі ён карыстаўся толькі для прыёму наведнікаў. Ён зрэдчас бачыўся зь сябрамі і гаварыў адно што пра далёкае мінулае, задоўга да пачаткаў рачной навігацыі. Аднак у яго ўзьнікла новая тэма: ён пажадаў, каб Флярэнтына Арыса ажаніўся. Стары выказваў гэтую думку заўсёды ў аднолькавай форме.

– Мне б скінуць зь сябе пяцьдзясят гадоў, – паўтараў ён, – я б пайшоў пад вянец са сваёй цёзкай Леонай. Уявіць сабе не магу лепшай жонкі.

Флярэнтына Арыса дрыжаў ад аднае думкі, што намаганьні ўсяго жыцьця могуць быць змарнаваныя ў апошнюю хвілю празь нечаканую ўмову старога. Ён, хутчэй, адмовіўся б ад спадчыны, выкінуў бы ўсё за борт, памёр бы, чым здрадзіў Фэрміне Дасе. На шчасьце, дзядзька Леон XII так і не настаяў на сваім. Калі яму стукнула дзевяноста два гады, ён прызнаў пляменьніка адзіным нашчадкам і здаў свае паўнамоцтвы.

Праз шэсьць месяцаў партнэры аднадушна прызначылі Флярэнтына Арысу рэзыдэнтам рады прадпрыемства і генэральным дырэктарам. У дзень уступленьня пляменьніка на пасаду стары адстаўны леў узьняў кубак шампанскага, перапрасіў за тое, што выступае, седзячы ў гамаку, і зымправізаваў кароткую прамову, блізкую да элегіі. Ён сказаў, што ягонае жыцьцё пачалося і завяршаецца поўнымі сэнсу падзеямі. Напачатку Вызваліцель узяў яго на рукі ў сялібе Турбака, калі завяршаў нешчасьлівую вандроўку, якая прывяла

яго да сьмерці. Другая падзея адзначалася тым, што, нягледзячы на ўсе супярэчлівасьці лёсу, ён знайшоў годнага пасьлядоўніка і нашчадка. Напрыканцы прамовы, спрабуючы адвесьці напругу ад ягонай асабістай драмы, ён дадаў:

– Адзінай няўдачай у маім жыцьці я лічу тое, што, прасьпяваўшы за сваё доўгае жыцьцё на шмат чыіх пахаваньнях, я, пэўна, ня здолею прасьпяваць на ўласным.

На фінал цырымоніі ён засьпяваў арыю Тоскі «Бывай, жыцьцё». Сьпяваў а капэла, як яму больш падабалася, і ягоны голас быў яшчэ моцны. Флярэнтына Арыса ўсхваляваўся, але наўрад ці хто заўважыў дрыжыкі ў ягоным голасе, калі ён дзякаваў дзядзьку. У адпаведнасьці зь ягонымі намаганьнямі і задумаю жыцьця, Флярэнтына Арыса дасягнуў вяршыні ў жорсткай барацьбе з адзінай мэтай – дажыць здаровым да ажыцьцяўленьня ягонага лёсу разам з Фэрмінай Дасай.

Аднак успаміны ня толькі пра яе суправаджалі яго ўначы на сьвята, якое зладзіла Леона Касіяні. Ён прыгадаў усіх: і тых, хто знайшоў спачын на могілках пад кустоўем пасаджаных ім ружаў, і тых, хто яшчэ дзяліў падушку са сваімі мужамі, чые рогі прыгожа залаціліся пры сьвятле поўні. У адсутнасьць адной-адзінай ён хацеў быць з усімі адначасна, як бывала ў моманты перапуду і хваляваньня. Нават у найцяжэйшыя часы, у горшыя хвіліны ён падтрымліваў хоць слабую сувязь са шматлікімі палюбоўніцамі на працягу многіх гадоў: заўсёды сачыў за ніткаю іхнага жыцьця.

Так што той ноччу ён згадаў Расальбу, самую першую, якая зьнесла ў якасьці трафэю ягоную нявіннасьць, і памяць выклікала боль, як у першы дзень разлукі. Досыць было заплюшчыць вочы, і ён бачыў яе ў мусьлінавым строі і капелюшы з доўгімі шаўковымі стужкамі, яна пакалыхвала клетку-зыбку з малым на борце карабля. Некалькі разоў за доўгія гады жыцьця ён гатовы быў пусьціцца ў пошукі, ня ведаючы, дзе яе шукаць, ня ведаючы яе прозьвішча, ня будучы ўпэўненым, што знойдзе яе хоць недзе ў зарасьцях архідэяў. Шораз праз рэальную перашкоду ў апошнюю хвілю альбо празь нечаканую асечку волі ён адкладваў вандроўку, калі вось-вось мусілі прыбраць сходні карабля, і заўсёды прычыны

былі так ці інакш зьвязаныя з Фэрмінай Дасай.

Ён згадаў Назарэцкую ўдаву, адзіную, з кім ён апаганіў матчын дом на вуліцы Вэнтанас, хоць якраз ня ён, а Трансыта Арыса запрасіла яе. Ён разумеў яе лепш за каго іншага. Толькі яна, нягледзячы на яе ляноту ў ложку, выпраменьвала столькі пяшчоты, што нават магла б замяніць яму Фэрміну Дасу. Аднак яе пакліканьне спрадвечнае коткі, больш неўтаймоўнае, чымся сіла яе пяшчоты, асудзіла іх на нявернасьць. Тым ня менш, яны кахалі адно аднаго зь перапынкамі на працягу трыццаці гадоў, паводле мушкетэрскага дэвізу: «Ня верныя, але не вераломныя». Апрача таго, толькі пры ёй Флярэнтына Арыса дарэшты выканаў свой абавязак: калі яму перадалі, што яна памерла, што яе няма каму пахаваць, і гэтым зоймецца служба міласэрнасьці, ён узяў усе выдаткі на сябе і адзін прысутнічаў на хаўтурах.

Ён прыгадаў і іншых, некалі каханых удоваў: Прудэнсію Пітрэ, найстарэйшую з тых, хто яшчэ жыў, вядомую як Удаву Двух, бо яна ўдавела двойчы, і другую Прудэнсію, удаву Арэляны, якая зь любові да яго пускалася на самыя мудрагелістыя хітрыкі: напрыклад, зрывала ўсе гузікі ягонага строю, каб ён затрымаўся, пакуль яна прышые іх нанава; і Хасэфу, удаву Суньнігі, – тая настолькі шалела ад каханьня, што ледзь не пазбавіла яго мужчынскай годнасьці падчас сну пры дапамозе садовых нажніцаў, каб ён нікому не належаў, калі не належаў ёй.

У ягонай памяці ўзьнікла Анхелес Альфара, эфэмэрная і любая, якая прыехала на шэсьць месяцаў вучыць дзяцей граць на смычковых інструмэнтах у Музычнай школе. Яна праводзіла зь ім ночы пад поўняй на тэрасе ягонага дому, у чым маці нарадзіла, граючы найгажэйшыя сюіты на віялянчэлі. Голас зграбнага інструмэнту набываў мужчынскі тэмбар у абдымках яе залацістых сьцёгнаў. Зь першай ночы пад месяцам яны жорстка паранілі сабе сэрцы любоўю, нібыта звар'яцелыя навічкі. Аднак Анхелес Альфара зьехала, з чым і зьявілася – зь пяшчотаю ў сэксуальных забаўках і віялянчэльлю, якая гучала грэшна, – на трансатлянтычным караблі пад сьцягам разлукі, пакінуўшы на тэрасе пад промнямі поўні толькі разьвітальныя

ўзмахі белае хусткі, якая замаячыла самотнай і сумнай галубкай на гарызонце, нібыта ў вершах Паэтычных гульняў. Зь ёю Флярэнтына Арыса засвоіў тое, ад чаго пакутаваў не аднойчы, сам таго не разумеючы: можна кахаць некалькіх жанчын адначасна з аднолькавай жарсьцю, ня здрадзіўшы ніводнай зь іх. Самотны ў натоўпе на прыстані, ён сказаў сабе ў парыве злосьці: «У сэрцы столькі ж пакояў, колькі ў бардэлі». Ён абліваўся сьлязьмі ад болю расстаньня. Але як толькі карабель зьнік за лініяй гарызонту, думкі пра Фэрміну Дасу зноўку запоўнілі ягонае сэрца дарэшты.

Ён згадаў Андрэ Варон, перад домам якой прайшоў на мінулым тыдні, але памаранчавы колер анучы з акна ваннага пакою і запаленае сьвятло падказалі, што да яе нельга: хтосьці апярэдзіў яго. Хтосьці, мужчына альбо жанчына, бо Андрэ Варон не спынялася перад падобнымі дробязямі ў любоўных справах. З усіх жанчын ягонага сьпісу толькі яна зарабляла сваім целам, але больш па ахвоце і не прыбягаючы ў сваім прадпрыемствы да паслуг сутэнэра. За немалыя гады яна зрабіла галавакружную кар'еру падпольнай куртызанкі і заслужыла баявую мянушку: Сьвятая Дзева Ўсіх Прагных. Яна зводзіла з глузду губэрнатараў і адміралаў, яна бачыла сьлёзы на вачох у некаторых герояў вайны і пісьменьнікаў, не такіх, дарэчы, знакамітых, як яны самі думалі. Але ў яе бывалі і слынныя асобы. Скажам, прэзыдэнт Рафаэль Рэес за паўгадзіны ў сьпешцы паміж двума выпадковымі візытамі ў горад прызначыў ёй пажыцьцёвую пэнсію за выдатную службу ў Міністэрстве фінансаў, дзе яна не прарабіла ані дня. Яна міласэрна, да поўнае стомы раздавала ўцехі любові, і хоць людзі ведалі пра яе паводзіны, ніхто ня здолеў прад'явіць бездакорных доказаў супраць яе, бо слынныя суўдзельнікі абаранялі яе, як баранілі б уласнае жыцьцё, яны ж разумелі, што страцілі б ад скандалу больш, чым яна. Празь яе Флярэнтына Арыса парушыў свой сьвятарны прынцып – не плаціць, і яна парушыла правіла – не любіць задарма нават уласнага мужа. Яны пагадзіліся на сымбалічнай плаце, адзін пэса за раз, але яна не прымала грошай і ён не даваў іх ёй на рукі, а кідаў у капілку ў выглядзе сьмешнага парасяці, якая поўнілася, пакуль не набіралася сума, дастатковая для набыцьця якой-кольвек заморскай рэчы каля Натарыяльнай

Брамы. Менавіта яна прыпісвала асаблівую пажадлівасьць клізмам, да якіх прыбягала пры моцных запорах, і ўпэўніла яго разьдзяліць слодыч працэдуры – прымаць яе адначасна шалёнымі вечарамі і тым самым знайсьці яшчэ больш любові ў самой любові.

Ён лічыў, што яму пашанцавала, бо сярод безьлічы ўдалых сустрэчаў толькі адна жанчына змусіла яго зьведаць кроплю горычы, і гэта была замкнёная Сара Нар'ега, якая скончыла свае дні ў вар'яцкім доме Боскае Пастаркі, чытаючы старэчыя вершы з такімі нахабнымі непрыстойнасьцямі, што прыйшлося ізаляваць яе, каб канчаткова ня зьвесьці з глузду астатніх пацыентак. Аднак калі Флярэнтына Арыса прыняў на сябе поўную адказнасьць за лёс параходнай кампаніі і ўжо не было ні часу, ні жаданьня замяніць Фэрміну Дасу кім-кольвек, ён ведаў, што ніхто яе не заменіць. Паступова ён упадаў у звычку наведваць старых палюбоўніц, і тыя дарылі яму любоў, наколькі гэта было магчыма, наколькі хапала ім жыцьця. У нядзелю Сьвятой Сёмухі, калі памёр Хувэналь Урбіна, зь ім заставалася толькі адна, чатырнаццаці гадоў ад нараджэньня, якая мела ўсё, што ніводная зь яе папярэдніц у поўнай меры не магла мець, каб ён звар'яцеў ад любові.

Яе звалі Амэрыка Вікуньня. Яна прыбыла два гады назад з прыморскай сялібы Пуэрта Падрэ, накіраваная ўласнай сям'ёй да яе апекуна Флярэнтына Арысы, зь якім мела прызнаныя сваяцкія сувязі. Яна атрымала ўрадавую стыпэндыю на пэдагагічную адукацыю і прыехала зь невялічкім клункам адзеньня і маленькім, рыхтык лялечным, бляшаным куфрам. Ледзь яна спусьцілася з борту карабля ў белых чаравіках і з залатой коскаю, Флярэнтына Арысу працяла прадчуваньне, што яны будуць бавіць разам шмат якія нядзельныя сіесты. Яна была яшчэ дзяўчынкай ва ўсіх адносінах, зь няроўнымі зубкамі і драпанымі каленкамі. Але ён адразу здагадаўся, якая гэта будзе неўзабаве жанчына. Ён выхоўваў яе для сябе доўгі год з суботамі ў цырку, зь нядзелямі ў парках з марозівам, зь вечарамі, падчас якіх ён дабіваўся яе даверу і пяшчоты. Ён пяшчотна вёў яе за руку да свайго патаемнага халасьцяцкага пакою з хітрасьцю добранькага дзядулі. Для яе ўсё здарылася раптоўна: нібыта перад ёю адчынілася нябесная брама. Яна

быццам бы разарвалася ў буйной квецені, ад якой лунала ў німбе шчасьця, і гэта эфэктыўна стымулявала вучобу, бо яна заўсёды імкнулася быць першай на курсе, каб не пазбавіцца права на адлучку з інтэрнату напрыканцы тыдня. Для яго гэта быў найцяплейшы прытулак у бухце старасьці. Пасьля доўгіх гадоў разьлічаных любоўных справаў прэсны смак цнатлівасьці прынёс яму дзівосы абноўленага пароку.

Усё супала. Яна паводзіла сябе натуральна, як дзяўчынка, гатовая адкрываць жыцьцё пад апекай шаноўнага чалавека, які нічому не зьдзіўляўся, а ён сьвядома паводзіў сябе, як састарэлы жаніх, хоць усё жыцьцё больш за ўсё баяўся гэтага. Ён ніколі не атаясамліваў яе з Фэрмінай Дасай, нягледзячы на тое, што параўнаньне міжволі напрошвалася: узрост, школьная форма, каса, паходка аленіхі і, нарэшце, ганарлівы і непрадказальны характар. Так, нягледзячы на гэта, сама думка пра падмену, якая так падагравала яго ў пошуках міласэрнай любові, зьнікла ўшчэнт. Яна яму падабалася, якой была, і, нарэшце, ён пакахаў яе зь нейкай трапяткой змрочнасьцю. Зь ёю ён упершыню прыняў жорсткія меры прадухіленьня выпадковай цяжарнасьці. Пасьля паўтузіна сустрэчаў яны ўжо толькі і марылі пра сумесныя нядзельныя вечары.

Адзін Флярэнтына Арыса меў права забіраць яе з інтэрнату. Ён езьдзіў па яе ў шасьціцыліндравым «Гудзоне» Карыбскай параходнай кампаніі, і часам, калі не было сонца, яны каталіся на аўто з апушчаным верхам уздоўж пляжу. Ён, як звычайна, у змрочным капелюшы, – і яна, сьмеючыся ад шчырае радасьці, і прытрымліваючы рукамі матроскую шапку школьнае формы, каб яе ня зьдзьмула ветрам. Хтосьці сказаў ёй, каб яна не заставалася даўжэй чым трэба з апекуном, каб ня ела ежу, якую ён пакаштаваў, і трымалася на адлегласьці ад ягонага дыханьня, бо старасьць заразная. Але яна не зьвяртала ніякае ўвагі на гэтыя парады. Яна ставілася абыякава да таго, што маглі падумаць пра іх, бо ўсе ведалі пра сваяцтва, да таго ж, крайняя розьніца ва ўзросьце ратавала ад усялякай падазронасьці.

У нядзелю Сьвятое Сёмухі, толькі яны скончылі займацца любоўю, калі а чацьвёртай па абедзе званы зазванілі па

нябожчыку. Флярэнтына Арыса ледзь стрымаў хваляваньне. У ягонай маладосьці рытуал уключаўся ў цану пахаваньня і адмаўлялі ў ім хіба што самым бедным і невядомым. Аднак да завяршэньня апошняй вайны ў краіне, якраз на мяжы двух стагодзьдзяў, рэжым кансэрватараў падмацаваў каляніяльныя звычаі, і хаўтуры з ганараваньнем сталіся настолькі дарагімі, што былі даступныя толькі багацеям. Калі памёр арцыбіскуп Дантэ дэ ля Люна, званы ўсёй правінцыі званілі безупынна дзевяць дзён і дзевяць начэй, і так давялі народ, што спадкаемца нябожчыка зусім адмяніў хаўтуры са званамі, зрабіўшы выключэньне толькі для самых знакамітых і слынных. Таму, ледзь Флярэнтына Арыса пачуў званы катэдральнага сабору а чацьвёртай па абедзе ў нядзелю Сьвятое Сёмухі, ён адчуў, нібыта яго наведаў прывід страчанай маладосьці. Флярэнтына Арыса ня здолеў уявіць, што гэта быў той самы звон, які ён так жадаў пачуць на працягу доўгіх гадоў з тае нядзелі, калі ўгледзеў Фэрміну Дасу на шостым месяцы цяжарнасьці пры выхадзе з абедні.

– Чорт пабяры, – сказаў ён у цемры, – гэта мусіць быць надта буйная акула, калі звоніць катэдральны сабор.

Аголеная Амэрыка Вікуньня канчаткова прачнулася.

– Пэўна, у гонар Сьвятое Сёмухі, – адказала яна.

Флярэнтына Арыса ня быў знаўцам альбо хоць бы крыху азнаёмленым са справамі касьцёлу, ён не наведваў імшы з тае пары, як граў на скрыпцы ў хоры зь немцам, які да таго ж навучыў яго тэлеграфнай навуцы, альбо калі шукаў зьвесткі пра Фэрміну Дасу. Пра лёс немца ён ня ведаў нічога дакладнага. Але, безумоўна, ён ведаў, што званы ня звоняць у гонар Сьвятое Сёмухі. Гэта быў сапраўды жалобны звон. Раніцой камісія карыбскіх уцекачоў наведала ягоны дом і паведаміла, што Ерэмія дэ Сэнт-Амур быў знойдзены мёртвым на золку ў сваёй фотамайстэрні. Флярэнтына Арыса ня быў блізкім сябрам нябожчыка, але ведаў шмат каго з уцекачоў, якія заўсёды запрашалі яго на ўрачыстыя сходы і перадусім на хаўтуры. Аднак ён быў упэўнены, што званы званілі не па Ерэмію дэ Сэнт-Амуру, які быў ваяўнічым бязбожнікам і зацятым анархістам, да таго ж, ён скончыў жыцьцё

самагубствам.

– Не, – запярэчыў ён, – так звоняць па губэрнатары альбо вышэй.

Амэрыка Вікуньня, на целе якой чарадаваліся сьветлыя і цёмныя палосы з-за не да канца зачыненых жалюзі, была ня ў тым узросьце, калі думаюць пра сьмерць. Яны займаліся любоўю пасьля абеду і адпачывалі ў сьпякоце сіесты, аголеныя, пад лопасным вэнтылятарам, гудзеньне якога не маглі заглушыць гулкія, нібыта град, крокі аўраў па раскаленым жалезным даху. Флярэнтына Арыса кахаў Амэрыку Вікуньню, як і шмат выпадковых жанчын у ягоным доўгім жыцьці, але яе ён кахаў адчайна, бо быў упэўнены, што памрэ ад старасьці, ледзь яна скончыць школу.

Пакой, хутчэй, нагадваў карабельную каюту, сьцены з вагонкі былі афарбаваныя паслойна некалькі разоў, як на караблях, а сьпякота а чацьвёртай па абедзе была больш невыноснай, чым у каюце любога рачнога карабля, нягледзячы на намаганьні электрычнага вэнтылятара над ложкам, – жалезны дах назапашваў сьпякоту. Фармальна гэта не была спальня, а наземная каюта, якую Флярэнтына Арыса загадаў збудаваць за канторай параходнай кампаніі з адзінай мэтай – знайсьці добры прытулак для старэчага каханьня. У працоўныя дні тут, праўда, не далі б паспаць крыкі партовых грузчыкаў, грукат кранаў і караблёў каля самай прыстані. Аднак у нядзелю для дзяўчынкі гэта быў рай.

У дзень Сьвятое Сёмухі, яшчэ за пяць хвілінаў да вечаровага звону, яны думалі заставацца разам да яе вяртаньня ў інтэрнат, але звон па нябожчыку нагадаў Флярэнтына Арысу, што ён абяцаў прысутнічаць на пахаваньні Ерэміі дэ Сэнт-Амура, і ён апрануўся шпарчэй звычайнага. Але перад тым, як заўсёды, заплёў дзяўчынцы касу, якую ён сам распускаў перад любоўнымі ўцехамі, пасадзіў яе на стол і завязаў ёй шнуркі форменных чаравікаў, што яна заўжды рабіла кепска. Ён дапамагаў ёй бяз хітрыкаў, а яна прымала гэта як належнае: абое страцілі ўсьведамленьне свайго ўзросту зь першых сустрэчаў і ставіліся адно да аднаго з даверлівасьцю шлюбнае пары, якая столькі адкрыла ў жыцьці, што амаль не заставалася

словаў.

У выходны дзень кантора была зачыненая, і каля прычалу стаяў толькі адзін карабель з пагашанымі катламі. Сьпякота прадракала дажджы, першыя ў гэтым годзе, але празрыстае паветра і нядзельная ціша порту нагадвалі прыемны сухі сэзон. На вуліцы сьвятло было больш жорсткім, чымся ў змроку каюты, больш сумна гучалі званы, хоць Флярэнтына Арыса ня ведаў, па кім яны званілі. Яны зь дзяўчынкай спусьціліся ў салетравы двор, які калісьці служыў гішпанцам у якасьці рабагандлёвага порту, – тут яшчэ захаваліся рэшткі шаляў і іншыя ржавыя жалязякі, зьвязаныя з эпохай. Аўто чакала пад ценем пакгаўзу, яны не пабудзілі кіроўцу, які спаў за стырном, пакуль не ўладкаваліся на заднім сядзеньні. Аўто разьвярнулася за пакгаўзам, абведзеным мэталічнай сеткай, нібы пішклятня, яны мінулі стары базар каля бухты Прывідаў, дзе напаўаголеныя дарослыя гулялі ў мяч, і выехалі з рачнога порту, уздымаючы аблокі гарачага пылу. Флярэнтына Арыса думаў, што пасьмяротнае ганараванньe ня мела адносінаў да Ерэміі дэ Сэнт-Амура, але ўпартасьць званоў змусіла яго засумнявацца. Ён паклаў руку на плячо кіроўцы і спытаў яго голасна каля самага вуха, па кім звоняць званы.

– Па тым доктару, што з вострай бародкай, – адказаў кіроўца. – Як гэта яго звалі?

Флярэнтына Арысу не давялося ламаць галаву, каб зразумець, пра каго ён гаворыць. Аднак калі кіроўца распавёў, як той памёр, імгненная ілюзія разьвеялася, настолькі ўсё выглядала непраўдападобным. Нішто так не адпавядае сапраўднаму вобліку чалавека, як спосаб ягонай сьмерці, але гэтая сьмерць ня мела нічога агульнага з асобай, пра якую казалі. Тым ня менш, гэта быў ён, нягледзячы на поўны абсурд: доктар з найвялікшым стажам і найлепшай кваліфікацыяй у горадзе, знакаміты заслугамі, памёр з разьбітым ушчэнт хрыбтом васьмідзесяці аднаго году ад народзінаў – упаў з мангавага дрэва, спрабуючы злавіць папугая.

Усё, што Флярэнтына Арыса рабіў з тае пары, як Фэрміна Даса пайшла пад шлюб, было зьвязана з надзеяй пачуць гэтую навіну. Аднак прабіла гадзіна, і ён адчуў не пераможнае

ўзрушэньне, якое прадбачыў у начах бессані, а ўдар страху: фантастычную яснасьць ва ўсьведамленьні таго, што яны маглі памяняцца месцамі і званы маглі быць вестунамі ягонай сьмерці. Седзячы побач у аўто, якое падскоквала на брукаванцы, Амэрыка Вікуньня спужалася ягонай бледнасьці і спытала, што зь ім. Флярэнтына Арыса ўзяў яе ручку сьцюдзёнай рукой.

– О, мая дзяўчынка, – уздыхнуў ён, – трэба б яшчэ пяцьдзясят гадоў, каб распавесьці табе пра ўсё.

Ён забыўся аб пахаваньні Ерэміі дэ Сэнт-Амура. Пакінуўшы дзяўчынку каля дзьвярэй інтэрнату з таропкім абяцаньнем, што прыедзе па яе ў наступную суботу, ён загадаў кіроўцу ехаць да дому доктара Хувэналя Ўрбіна. Яны сутыкнуліся з мноствам аўто і наёмных экіпажаў на прылеглых вуліцах, з натоўпам разявакаў каля дому. Госьці Лясыдэса Алівэльлі дазналіся пра сумную вестку ў разгары сьвята і прыбылі разам. У доме было цяжка прасунуцца з-за масы людзей, але Флярэнтына Арыса прабіў сабе шлях да спальні, выцягнуў голаў над групай, якая блякавала дзьверы, і пабачыў Хувэналя Ўрбіна на шлюбным ложку так, як хацеў бачыць з тае пары, калі пачуў пра яго ўпершыню: доктар патанаў у гнюсоце сьмерці. Сталяр зьняў меркі для труны. Побач зь нябожчыкам, яшчэ ў вопратцы, у якой езьдзіла на сьвята, Фэрміна Даса была засяроджанай і сумнай.

Флярэнтына Арыса ўяўляў сабе гэты момант да самай малой драбязы зь дзён далёкага юнацтва, калі ён прысьвяціў сябе без астачы свайму адважнаму каханьню. Празь яе ён зрабіў сабе імя і багацьце, ня дужа разборліва ставячыся да сродкаў на шляху да мэты. Празь яе бярог здароўе і сачыў за сваім выглядам, што ніяк не лічылася адзнакаю мужнасьці ў ягоным коле. І ён чакаў гэтага дня, як ніхто ніколі не чакаў на белым сьвеце: безь якіх-кольвек знакаў нуды. Ён упэўніўся, што сьмерць заступілася за яго, і гэта надало яму сьмеласьці паўтарыць Фэрміне Дасе ў першую ўдовіну ноч клятву спрадвечнай вернасьці і каханьня.

Ён не адмаўляў перад сваім сумленьнем, што ўчыніў бяздумна, што момант быў абраны ня лепшым чынам, – загаварыў ад

страху, што аказія ніколі не паўторыцца. Ён хацеў, і ня раз да гэтага плянаваў, каб размова адбылася не ў такіх жорсткіх абставінах, але лёс ня даў яму іншай магчымасьці.

Ён выйшаў з жалобнага дому з болем: яна засталася ўзрушаная ад пачутага, як і ён, аднак не ў ягоных сілах было зьмяніць хаду падзеяў, бо ён адчуваў, што жахлівая ноч запісаная назаўсёды на старонках іхных лёсаў. На працягу двух апошніх тыдняў ён амаль ня спаў. Ён пытаўся ў сябе ў адчаі, як там Фэрміна Даса безь яго, пра што думае, што зьбіраецца рабіць у астатнія гады са страшным цяжарам свайго няшчасьця. Нэрвовае напружаньне справакавала невядомы раней запор, жывот надзьмуўся як бубен, і давялося зьвярнуцца да малапрыемных сродкаў. Старэчае недамаганьне, зь якім ён спраўляўся лягчэй за сваіх сучасьнікаў, бо яно было вядомае яму з маладосьці, падступала з усіх бакоў. Ён зьявіўся ў канторы ў сераду пасьля тыднёвай адсутнасьці, і Леона Касіяні спужалася, пабачыўшы яго бледным і млявым. Але ён яе супакоіў: маўляў, зноў, як заўсёды, давяла яго бессань. І прыкусіў язык, каб праўда не прасачылася праз шматлікія адтуліны яго зьнявечанага сэрца. Дождж даў сонцу перадых для роздуму. Яшчэ адзін тыдзень мінуў, нібы ў тумане, ён ня мог засяродзіцца, еў дрэнна, спаў яшчэ горш, спрабуючы ўлавіць зашыфраваныя сыгналы, якія б паказалі шлях да паратунку. Але ў пятніцу безь вядомай прычыны на яго раптам напаў спакой, і ён тлумачыў яго як знак таго, што нічога новага не адбудзецца, усё, што ён зрабіў у жыцьці, было бессэнсоўным і ня мела працягу: усяму прыходзіць канец. У панядзелак, аднак, ён прыйшоў дамоў на вуліцу Вэнтанас, угледзеў ліст, які плаваў у лужыне, што ўзьнікла ў вітальні, і на мокрай капэрце адразу пазнаў ганарлівы почырк, які не змаглі зьмяніць паваротy жыцьця, яму нават прымроіўся начны водар завялых гардэніяў, сэрца ўжо ўсё падказала зь першага погляду. Гэта быў ліст, якога ён чакаў, ня ведаючы ні імгненьня спакою, на працягу паўстагодзьдзя.

Фэрміна Даса і ўявіць не магла, што яе ліст, прадыктаваны сьляпой злосьцю, будзе ўспрыняты Флярэнтына Арысам як любоўнае пасланьне. Яна ўклала ў яго ўсю жорсткасьць, на якую была здольная, напісала самыя прыкрыя словы і

пякельныя праклёны, няхай няслушныя, але мізэрныя ў параўнаньні зь перанесенай абразай. Гэта было на зыходзе двух тыдняў горкіх заклінаньняў, сілаю якіх яна спрабавала замірыцца са сваім новым становішчам. Яна зноў хацела стаць сабой, жадала вярнуць тое, што была вымушаная саступіць за паўстагодзьдзя рабства, якое несумнеўна рабіла яе шчасьлівай, але як толькі памёр муж, не пакінула ёй і сьледу ўласнай індывідуальнасьці. Яна была прывідам у чужым доме, які раптоўна стаўся аграмадным, поўным самоты, яна бадзялася па доме бяз мэты, у адчаі пытала сябе, хто зь іх больш мёртвы: ён, насамрэч памерлы, альбо яна, што засталася безь яго?

Яна не магла пазбавіцца ад падсьвядомага пачуцьця крыўды на мужа, што кінуў яе на прыхамаць лёсу ў акіяне жыцьця. Усё, што належала яму, выклікала сьлёзы: піжама пад падушкай, хатнія тапачкі, якія чамусьці здаваліся ёй шпітальнымі, успамін пра тое, як ён распранаўся ў глыбіні люстэрка, пакуль яна расчэсвала валасы перад сном, пах ягонай скуры, які застанецца зь ёй доўгі час пасьля ягонай сьмерці. Часам яна перапыняла хатнія справы лёгкім пляскaньнем даланёй па ілбе, бо нечакана згадвала – штосьці забыла яму сказаць. На кожным кроку ўзьнікалі пытаньні, на якія мог адказаць толькі ён. Аднойчы ён ёй распавёў, што хворыя пасьля ампутацыі адчуваюць боль, сутаргі, казытаньні ў назе альбо руцэ, якой ужо не было. Так яна цяпер адчувала сябе і прысутнасьць мужа там, дзе яго не было.

Яна прачнулася ў сваю першую ўдовіну раніцу, круцілася ў ложку яшчэ з заплюшчанымі вачыма ў пошуках больш зручнай позы, каб нанава аддацца сну, і менавіта тады ён для яе памёр. Яна зразумела, што ўпершыню ён начаваў па-за домам. Другое падобнае ўражаньне ўзьнікла за сталом, і не ад болю, што выклікала самота, а ад дзіўнай упэўненасьці, што яна сьнедае з чалавекам, якога ўжо няма. Яна дачакалася прыезду дачкі Афэліі з мужам і трыма дочкамі зь Нью-Арлеану і зноў села за стол, але не за звычайны, – яна загадала паставіць другі, меншы, у калідоры. Да тае пары, дарэчы, яна ніколі ня ела своечасова. Зазірала на кухню ў любую хвілю, як толькі адчувала, што хацела есьці, лезла відэльцам у кожную каструлю і перакусвала пакрысе без талеркі, стоячы перад

плітою, размаўляючы з жанчынамі, якія служылі ў доме, адзінымі людзьмі, зь якімі яна пачувалася добра. Аднак, як Фэрміна Даса ні імкнулася, яна не магла пазбавіцца ад перасьледу нябожчыка мужа: куды б ні ішла, у кожным кутку дому сутыкалася з рэчамі, якія нагадвалі пра яго. На яе погляд, боль быў натуральны і слушны, але страшыла пагроза замкнуцца ў жалобных пачуцьцях. Так што яна прыняла жорсткае рашэньне выдаліць з дому ўсё, што нагадвала пра нябожчыка мужа, бачачы ў гэтым адзіны спосаб працягу жыцьця безь яго.

Яна прыступіла да цырымоніі зьнішчэньня. Сын пагадзіўся ўзяць бібліятэку, каб маці магла ўладкаваць у кабінэце мужа пакой для шытва, якога ніколі ня мела пры ягоным жыцьці. Дачка, у сваю чаргу, зьвезла якуюсьці мэблю і шматлікія рэчы, якія ёй здаліся прыдатнымі для аўкцыёнаў антыкварыяту ў Нью-Арлеане. Гэта прынесла палёгку Фэрміне Дасе, хоць было ня вельмі прыемна даведацца, што рэчы, набытыя ёю падчас вясельнай вандроўкі, ужо ўяўлялі цікавасьць для антыквараў. Насуперак маўкліваму зьдзіўленьню служанак, суседзяў і блізкіх сяброваў, якія бывалі зь ёю, яна загадала раскласьці вогнішча на заднімі двары за домам і там спаліла тое, што нагадвала пра мужа. Яна спаліла самую каштоўную і элегантную вопратку, якую бачылі ў горадзе зь мінулага стагодзьдзя, самы зграбны абутак, капелюшы, больш здольныя прэтэндаваць на падабенства зь ім, чымся яго маляваныя партрэты, гамак для сіесты, зь якога ён падняўся ў апошні раз насустрач сьмерці, – словам, шматлікія рэчы, настолькі зьвязаныя зь ім, што ўжо складалі частку ягонай асобы. Яна зрабіла гэта бязь ценю сумневу, у поўнай упэўненасьці, што муж ухваліў бы ўчынак, ды ня толькі з гігіенічных прычынаў. Неаднойчы ён выказаў жаданьне быць крэміраваным, а не закратаваным у цемры кедравай труны без адзінай шчыліны. Рэлігія не дазваляла, зразумела. Ён адважыўся выведаць погляды арцыбіскупа на гэты конт, але той запратэставаў катэгарычна. Дый не магло быць інакш: касьцёл не дазваляў будаваць крэматорыі на могілках нават для людзей іншых канфэсіяў, ня кажучы ўжо пра каталікоў. І трэба ж было здарыцца, каб самому Хувэналю Ўрбіна прыйшла думка пра мэтазгоднасьць іх будоўлі. Фэрміна Даса не забылася на страхі

мужа і нават у мітусьні першых гадзінаў загадала сталяру пакінуць яму суцяшэньне – шчыліну, якая б прапускала сьвятло да яго ў труну.

Так ці інакш, ахвярапрынашэньне выявілася дарэмным. Памяць пра мужа-нябожчыка была трывала гарачай, не гарэла ў полымі вогнішча, не зьвярталася ў попел з хадой дзён. Горш за тое, пасьля спаленьня вопраткі Фэрміна Даса ня толькі працягвала сумаваць па ўсім, што любіла ў ім, але таксама па тым, што больш за ўсё раздражняла: па шуме, які ён заўсёды рабіў, калі ўставаў раніцой. Гэтыя ўспаміны дапамаглі ёй выйсьці з мангавага кустоўя яе жалобы. Перадусім яна прыняла цьвёрдае рашэньне працягваць жыць, прыгадваючы мужа, нібыта ён быў жывы. Фэрміна Даса ведала, што ёй будзе цяжка прачынацца штораніцы безь яго, але з кожным днём яна адчувала гэта менш і менш.

Напрыканцы трэцяга тыдня яна пачала бачыць першыя праменьчыкі сьвятла. Але паступова, як нарастала яснасьць, яна ўсьвядоміла, што шлях яе жыцьця перайшоў прывід, які не пакідаў ёй ні хвіліны спакою. Гэта быў ня той прывід, варты жалю, які сачыў за ёю ў Эвангельскім сквэрыку, якога яна, бывала, згадвала нават зь пяшчотай на схіле гадоў, – гэта быў мярзотны прывід у сурдуце ката, які прыціскаў капялюш да грудзей, чыё нягеглае нахабства так яе разьюшыла, што ўжо немажліва было ня думаць пра яго. Здаўна, з моманту адмовы яму ў васямнаццаць гадоў, яна была ўпэўненая, што пасеяла ў ім зярняткі нянавісьці, якія з часам прарасьлі і разрасталіся. Яна адчувала ягоную нянавісьць у паветры, калі прывід узьнікаў паблізу, адзін ягоны выгляд прыгнятаў яе, страшыў да такой ступені, што яна страчвала натуральнасьць паводзінаў, калі ён прысутнічаў. Той ноччу, калі ён зноўку пакляўся ў каханьні амаль каля ложка нябожчыка мужа пры яе завялых кветках, якія напаўнялі дом сваім водарам, яна ня здолела ўцяміць, што гэтая дзёрзкая выхадка наагул не была першым крокам д’ябальскага намеру, зьвязанага з жахлівай помстай.

Упартасьць успамінаў аб ім узмацняла ейны гнеў. Калі на наступны дзень пасьля хаўтураў яна прачнулася, думаючы пра яго, яна здолела выгнаць яго з памяці простым рухам волі. Але

ён нанава вяртаўся, і неўзабаве Фэрміна Даса ўсьвядоміла, што жаданьне забыць яго сталася наймацнейшым стымулам да адваротнага – да згадак пра яго. Тады яна, адоленая настальгіяй, упершыню адважылася скарыцца ўспамінам пра далёкія часы яе іррэальнага каханьня. Фэрміна Даса спрабавала прыгадаць дакладней, як тады выглядалі сквэрык, мігдалавыя дрэвы з паламанымі галінкамі, лава, дзе ён сядзеў, закаханы, бо там нічога не захавалася ў былым выглядзе. Усё зьмянілася: сьпілавалі і вывезьлі дрэвы, так што не відаць ёй больш дывана з пажоўклай мігдалавай лістоты. Замест помніка абезгалоўленаму герою паставілі манумэнт іншаму чалавеку ў параднай форме без імя і жыцьцёвых датаў, якія б апраўдвалі само існаваньне помніка на вялізным і пышным пастамэнце. Унутры пастамэнта змантавалі электрашчыт, які абслугоўваў квартал. Стары дом Фэрміны Дасы, прададзены шмат гадоў таму, ператвараўся ў руіны ў руках ураду правінцыі. Ёй цяжка было ўявіць, якім быў тады Флярэнтына Арыса. Тым больш, яна ня здолела зразумець, што сумны юнак, які выклікаў шкадобу тым, што дзеля адзінага погляду на яе гадзінамі мок пад дажджом, і спарахнелы стары, зьедзены мольлю, які ўзьнік перад ёю без усялякай павагі да яе стану, без пашаны і разуменьня яе болю, які абпаліў ёй душу пякельнай абразай, – што гэтыя двое былі адной і той жа асобай.

Неяк кузіна Ільдэбранда Санчас прыехала да яе пагасьцяваць. Гэта было пасьля вяртаньня Фэрміны Дасы з маёнтку Флёрэс-дэ-Марыя, якраз перад прыездам Ільдэбранды Фэрміна Даса сустрэла Флярэнтына Арысу ў кіно з сэньярытай Касіяні. Кузіна сталася мажная, пастарэла, але была шчасьлівая, яе суправаджаў старэйшы сын, вайсковы палкоўнік, як і ягоны бацька, але якога сын асуджаў за бессаромны ўдзел у расстрэле рабочых на бананавай плянтацыі Сан-Хуан-дэ-ля-Сіенагі. Стрыечныя сёстры сустракаліся ня раз і заўсёды бавілі час ва ўспамінах эпохі іх першага знаёмства. Апошнім разам Ільдэбранда аддалася настальгіі, як ніколі, і ўсё ж адчувала цяжар уласнага ўзросту. Каб зьведаць большую асалоду ад успамінаў, яна прывезла копію даўняга партрэту дзьвюх старасьвецкіх дамаў, якіх здымаў фатограф-бэльгіец, калі малады Хувэналь Урбіна ўразіў вольналюбівую Фэрміну Дасу. У Фэрмінавым доме фота зьнікла, Ільдэбрандава копія была не

з удалых, аднак яны здолелі разгледзець сябе: маладыя і гожыя, якімі яны ўжо ніколі ня будуць.

Ільдэбранда не магла не гаманіць пра Флярэнтына Арысу, бо заўсёды атаясамлівала ягоны лёс з асабістым. Яна згадала дзень, калі Флярэнтына Арыса даў сваю першую тэлеграму сьледам за Фэрмінай Дасай, – такім ён застаўся ў сэрцы Ільдэбранды: нібыта сумная птушка, якую прысудзілі да забыцьця. Фэрміна, са свайго боку, бачыла Флярэнтына час ад часу, але, зразумела, не загаворвала зь ім і не магла ўявіць, што гэта той самы юнак першага каханьня. Да яе даходзілі весткі пра яго, бо рана ці позна яна ведала ўсё, што тычылася хоць крыху значных людзей гораду. Гаварылі, што ён не ажаніўся, быў іншай арыентацыі, але яна не ўважала на гэта, часткова таму, што не прыслухоўвалася да ўсялякіх чутак, а часткова праз тое, што падобнае гаварылі пра шмат якіх мужчынаў, якія былі па-за падазронасьцю. Аднак ёй здалося дзіўным, што Флярэнтына Арыса ўпарта працягваў насіць старамодную містычную вопратку, карыстаўся дзіўнымі лясьёнамі, заставаўся таямнічым чалавекам і пасьля таго, як праклаў сабе шлях у жыцьці сэнсацыйным, але сумленным чынам. Яна не магла паверыць, што гэта адзін і той жа чалавек, і заўсёды зьдзіўлялася, чуючы ўздыхі Ільдэбранды: «Бедны, бедны, як ён напакутаваўся!» Фэрміна Даса глядзела на яго, не адчуваючы болю ўжо здаўна: для яе гэта быў выкрасьлены з жыцьця цень.

Аднак увечары, калі яна сутыкнулася зь ім у кіно, а гэта было неўзабаве пасьля вяртаньня з Флёрэс-дэ-Марыя, штосьці дзіўнае адбылося ў яе сэрцы. Яе не зьдзівіла, што ён быў з жанчынай, да таго ж, нэгрыцянкай. Зьдзівіла, што ён так добра захаваўся, што паводзіў сябе даволі натуральна. Ёй не прыйшло да галавы, што гэта, напэўна, ня ён, а яна сама зьмянілася з разбуральным уваходжаньнем у асабістае жыцьцё сэньярыты Лінч. З тае пары і на працягу дваццаці гадоў яна глядзела на яго больш міласэрнымі вачыма. Уначы напярэдадні хаўтураў мужа ёй ня толькі была зразумелая ягоная прысутнасьць, але яна нават успрыняла гэта як натуральную прапанову міру, як акт дараваньня, калі забываюцца абразы і крыўды. Таму здалося такім нечаканым мэлядраматычнае

сьцьверджаньне ягонага каханьня, якога для яе ніколі не існавала, ды яшчэ ў такім узросьце, калі ні Флярэнтына Арыса, ні яна сама ўжо нічога не маглі чакаць ад жыцьця.

Лютая злосьць не прайшла пасьля сымбалічнай крэмацыі мужа, яна тым больш расла і разгаліноўвалася, чым менш Фэрміна Даса была здольная авалодаць сабою. Горш за тое, прастора памяці, якая вызвалілася ёю ад мужа, паступова і неадольна займалася макавым долам, дзе калісьці яна пахавала ўспаміны пра Флярэнтына Арысу. Яна думала пра яго міжволі, і чым больш думала, тым мацней злавалася, і ўжо сама злосьць змушала абярнуць думкі на яго. Гэта сталася настолькі невыносным, што яна ледзь ня страціла розуму. Тады яна і села за пісьмовы стол нябожчыка-мужа і напісала Флярэнтына Арысу ліст на трох шалёных старонках, дзе абсыпала яго лаянкай і подлымі інсынуацыямі, якімі аблегчыла душу, хоць і ўсьведамляла, што пайшла на самы нягодны ўчынак у сваім доўгім жыцьці.

Флярэнтына Арыса таксама пражыў тры тыдні ў пакутах, нібыта ў агоніі. Пацьвердзіўшы сваё каханьне да Фэрміны Дасы, ён выйшаў зь яе дому і бадзяўся ўначы бяз мэты па вуліцах, якія патаналі ў вечаровай навальніцы, і пытаў сябе ў жаху, што рабіць са шкураю тыгра, забітага ім пасьля паўстагодзьдзя аблогі. Горад, які згвалціла навальніца, жыў у стане трывогі. У некаторых дамах напаўаголеныя мужчыны і жанчыны спрабавалі ўратаваць ад патопу хоць бы тое, на што будзе Божая воля, і ў Флярэнтына Арысы ўзьнікла такое ўражаньне, што ўсеагульная бяда нейкім чынам зьвязана зь ягонай бядою. Але паветра сталася ціхае, і карыбскія зоркі зьзялі спакойна. Нечакана ў поўнай цішы Флярэнтына пазнаў голас чалавека, які ён і Леона Касіяні чулі шмат гадоў таму, ён сьпяваў на тым жа перакрыжаваньні вуліцаў: «Ад моста я вярнуўся, абліты сьлязьмі». Песьня нейкім дзіўным чынам – уначы і толькі для яго – мела адносіны да сьмерці.

Як ніколі, яму была патрэбная Трансыта Арыса, ён жадаў яе мудрых словаў, хацеў бачыць яе галаву, заўсёды поўную каралеўскіх досьціпаў, якую ўпрыгожвалі папяровыя кветкі. З гэтым нічога нельга было зрабіць: кожны раз, калі ён

знаходзіўся на мяжы катаклізму, яму трэба было знайсьці прытулак у жанчыны. Так што ён дайшоў да пэдагагічнай школы ў пошуках даступнай сустрэчы і ўгледзеў сьвятло ў доўгай чарадзе вокнаў, а менавіта – у спальні Амэрыкі Вікуньні. Яму прыйшлося сабраць усю сілу волі, каб ня ўпасьці ў шаленства і не забраць яе а другой ночы, цёплую ад сну, у начной кашулі ды яшчэ з пахам дзіцячага ложка.

У супрацьлеглым баку гораду жыла Леона Касіяні, самотная і свабодная, гатовая, зразумела, прытуліць яго і а другой ночы, і а трэцяй – у любы час і пры любых абставінах. Гэта быў ня першы раз, калі ён званіў у яе дзьверы, пакутуючы ў пустэльні бессані, аднак ён уцяміў, што яна надта разумная, і што яны надта любілі адно аднаго, каб плакацца ёй у камізэльку, не адкрываючы прычынаў свайго стану. Ён доўга раздумваў, бадзяўся, як люнатык, па пустэльным горадзе, пакуль не прыйшоў да думкі, што ні з кім не адчуе сябе лепш, чымся з Прудэнсіяй Пітрэ, Удавою Двух. Яна была на дзесяць гадоў маладзейшая за яго. Пазнаёміліся яны ў мінулым стагодзьдзі і перасталі сустракацца толькі таму, што яна ўпарцілася, не дазваляла бачыць сябе, якой яна сталася, напаўсьляпой і напаўразбуранай старасьцю. Як толькі Флярэнтына Арыса згадаў Прудэнсію Пітрэ, ён вярнуўся дамоў на вуліцу Вэнтанас, кінуў у торбу дзьве бутэлькі партвэйну і слоік марынаванай гародніны і пайшоў да яе, нават ня ведаючы, ці знойдзе яе ў яе старым доме, ці адна яна, ці наагул жывая.

Прудэнсія Пітрэ не забылася на ўмоўны сыгнал – два разы драпнуць пазногцем па дзьвярох, – якім ён абвяшчаў пра свой прыход, калі яны лічылі сябе маладымі, хоць такімі ўжо не былі, і адчыніла бяз словаў. Вуліца была ў цемры, яго цяжка было заўважыць у чорнай вопратцы, цыліндры і з парасонам-кажаном у руцэ. Яна магла бачыць яго толькі пры поўным асьвятленьні, але пазнала па водбліску мэталічнай асады акуляраў. Ён быў падобны да забойцы зь яшчэ крывавымі рукамі.

– Патрабуецца прытулак для беднага сіраты, – сказаў ён.

Толькі гэта прыйшло яму да галавы, каб сказаць хоць што-небудзь. Ён зьдзівіўся, як моцна яна пастарэла з часоў іх

апошняй сустрэчы, але тут жа ўцяміў, што і яна глядзіць на яго такім жа чынам. Яны суцешыліся тым, што пройдзе момант, і абое адыдуць ад першага ўдару, а затым менш будуць уважаць на хібы, нанесеныя жыццём, і зноў пабачаць адно аднаго маладымі, якімі яны пазнаёміліся сорак гадоў таму.

– Ты нібыта на пахаваньне, – сказала яна.

Ён якраз і быў на хаўтурах. Яна таксама прастаяла каля акна з адзінаццатай, як амаль увесь горад, каб паназіраць за самым шматлюдным і багатым пахавальным картэжам з часоў спачыну арцыбіскупа дэ Люна. Падчас сіесты яна прачнулася ад артылерыйскіх грымотаў, што трэсьлі зямлю, ад дысанансу вайсковых аркестраў, ад блытаніны хаўтурных сьпеваў, ад званоў усіх касьцёлаў, якія званілі па нябожчыку безупынна зь мінулага дня. З балькону яна бачыла вершнікаў у параднай форме, рэлігійныя прыходы, школы ў поўным складзе, доўгія чорныя лімузіны з танаванымі вокнамі, за якімі хавалася ўлада. Яна бачыла жалобны экіпаж, коней з плюмажамі на загрыўках і папоны, што пабліскваліе золатам, жоўтую труну на ляфэце гістарычнай гарматы, якую ахінулі нацыянальным сьцягам, і, нарэшце, – чараду старажытных адкрытых пралётак, якія захоўваліся толькі для сумнага цяжару жалобных вянкоў. Яны прайшлі пад бальконам Прудэнсіі Пітрэ апоўдні альбо крыху пазьней. Адразу ж зь нябёсаў рынуўся патоп, і картэж разьбегся шпарчэй за бліскавіцу.

– Як бязглузда ён памёр, – сказала яна.

– Сьмерць ня ведае, што такое бязглуздасьць, – адказаў ён, і дадаў: – Асабліва ў нашым узросьце.

Яны сядзелі на тэрасе каля самага мора, назіраючы за поўняй з арэолам, які займаў паўнеба, і бачылі рознакаляровыя агні караблёў каля лініі гарызонту, адчувалі асалоду ад цёплага і духмянага брызу, як заўсёды пасьля буры. Яны пілі партвэйн і елі гародніну з горным хлебам, які Прудэнсія Пітрэ накроіла на кухні. Разам яны пражылі шмат такіх начэй, як гэтая, пасьля таго, як яна аўдавела, не нарадзіўшы дзяцей, у трыццаць пяць гадоў. Флярэнтына Арыса сустракаўся зь ёю, калі яна была гатовая прымаць любога мужчыну, які гэтага хацеў, нават калі

б прыйшлося плаціць яму пагадзінны тарыф. Ім удалося наладзіць больш сур'ёзную і працяглую сувязь, чым ёй здавалася мажлівым.

Не дазваляючы сабе і намёку, Прудэнсія Пітрэ тады была гатовая пайсьці зь ім пад вянец трэцім разам. Яна ведала, што будзе няпроста падначаліцца ягонай сквапнасьці, крыўдлівасьці дачаснага старога, маніякальнай жарсьці да парадку, звычцы браць усё, не аддаючы нічога. Але затое не было мужчыны, які б дазволіў так сябе апякаць, як ён, бо не было на сьвеце іншага чалавека, якому так патрэбна было каханьне. Але не было й больш сьлізкага за яго, у тым сэнсе, што ён не дазваляў каханьню з кім-кольвек пераходзіць тую мяжу, за якой адчувалася б небясьпека ягонай свабодзе дзеля Фэрміны Дасы. Тым ня менш, іх сувязь доўжылася шмат гадоў. Нават пасьля таго, як Флярэнтына ўсё ўладкаваў, каб яна змагла пайсьці ў шлюб з камэрцыйным агентам, які прыяжджаў да яе на тры месяцы, а потым зьнікаў на такі ж тэрмін. Яна нарадзіла таму агенту дзяўчынку і чацьвёра сыноў, прычым адзін зь іх, як яна клялася, быў ад Флярэнтына Арысы.

Яны гаманілі, ня думаючы пра час, бо абое прызвычаіліся разьдзяляць бессань змоладу, і таму ў старасьці гэта не было для іх надта цяжка. Флярэнтына Арыса, які амаль ніколі не дазваляў сабе больш за два кубкі, нават не перавёў дух пасьля трэцяга. Пот зь яго цёк ручаямі, і Ўдава Двух сказала, каб ён зьняў пінжак, жакет, штаны, што захоча, чорт пабяры, бо ўрэшце яны лепш ведалі адно аднаго аголенымі, чым у вопратцы. Ён адказаў, што згодны, калі яна зробіць тое самае, але яна не захацела, бо ўжо даўно, убачыўшы сябе аголенай у люстэрку шафы, зразумела, што ёй ня хопіць сьмеласьці паказацца аголенай ні перад ім, ні перад кім-кольвек іншым.

Флярэнтына Арыса, у стане экзальтацыі, ня здолеў супакоіцца нават пасьля чатырох кубкаў партвэйну, і працягваў гамонку пра мінулае, аддаўшыся ўспамінам, якія здаўна складалі яго адзіную тэму, бо ён жадаў і шукаў у мінулым патаемны шлях да палёгкі. Менавіта гэта яму патрабавалася: выгаварыцца. Калі Флярэнтына Арыса заўважыў першыя водбліскі золку на гарызонце, ён паспрабаваў падысьці да галоўнага і спытаў,

нібыта зусім выпадкова: «Што б ты зрабіла, калі б табе раптам прапанавалі пайсьці пад вянец сёньня – удавой і ў тваіх гадох?» Яна засьмяялася зморшчаным старэчым сьмехам і раптоўна адказала пытаньнем:

– Ты маеш на ўвазе ўдаву Ўрбіна?

Флярэнтына Арыса забываўся, калі гэтага ніяк нельга было рабіць, што жанчыны думаюць больш пра патаемны сэнс пытаньняў, чымся пра іх просты сэнс, а Прудэнсія Пітрэ – больш за каго-кольвек. Агаломшаны яе кемлівасьцю, ён ажно здрыгануўся і вырашыў выйсьці са становішча празь несапраўдныя дзьверы: «Я кажу пра цябе». Яна зноў засьмяялася: «Ідзі, жартуй з сучкай, якая цябе нарадзіла, пухам ёй зямля». Затым яна настаяла на тым, каб ён сказаў, што меў на ўвазе, бо добра ведала: ні ён, ні любы іншы мужчына не падняў бы яе а трэцяй ночы толькі дзеля таго, каб выпіць партвэйну і закусіць горным хлебам з гароднінай у марынадзе. Яна дадала: «Так паводзяць сябе, калі шукаюць, каму б паплакацца». Флярэнтына Арыса вырашыў неяк зьбіць яе з тропу.

– Упершыню ты памыляесься, – адказаў ён. – Гэтая ночка, хутчэй, схіляе мяне да сьпеваў.

– Тады давай сьпяем, – падтрымала яна.

Добрым, цёплым голасам яна засьпявала модную песьню: «Рамона, безь цябе я не магу жыць». Гэта было заканчэньне ночы, ён не адважыўся гуляць у забароненыя гульні з жанчынай, якая вымоўна давяла, што ад яе не схаваеш адваротнага боку поўні. Ён выйшаў у іншы горад, ад апошніх чэрвеньскіх вяргіняў паветра здавалася разрэджаным, па вуліцы яго юнацтва ўдовы ішлі скрозь туман на пяцігадзінную імшу. Але не яны, а ён перайшоў на другі бок вуліцы, каб тыя ня бачылі ягоных сьлёзаў, якіх ён ужо ня мог стрымаць, і гэта не былі сьлёзы, якія душылі яго апоўначы, як яму напачатку здалося, а зусім іншыя, якія заселі ў горле пяцьдзясят адзін год, дзевяць месяцаў і чатыры дні таму...

Флярэнтына Арыса страціў адчуваньне часу і раптам

прачнуўся, не разумеючы, дзе ён знаходзіцца, каля асьляпляльна вялізнага акна. Голас Амэрыкі Вікуньні, якая гуляла ў мяч са служанкамі ў садзе, вярнуў яго да рэальнасьці: ён ляжаў на ложку маці, чыю спальню захоўваў бязь зьменаў, дакладна, як пры яе жыцьці, дзе звычайна спаў, каб адчуваць сябе менш самотным у тых рэдкіх выпадках, калі пакутаваў ад адзіноты. Насупраць ложка вісела вялікае люстэрка з карчмы дона Санча, дастаткова было зірнуць, калі ён прачынаўся, каб угледзець Фэрміну Дасу, адлюстраваную ў глыбіні. Ён здагадаўся, што была субота, бо ў гэты дзень кіроўца забіраў Амэрыку Вікуньню з інтэрнату і прывозіў яе дамоў. Ён усьвядоміў, што спаў, не здагадваючыся пра гэта, бо яму сьнілася, што ён ня можа заснуць, усхваляваны гнеўным тварам Фэрміны Дасы. Ён памыўся, абдумваючы свой наступны крок, нясьпешна надзеў найлепшую вопратку, надухмяніўся, намазаў сівыя, з вострымі кончыкамі вусы фіксатарам, выйшаў са спальні і ўгледзеў на калідоры другога паверху гожую істоту ў школьнай форме: дзяўчына лавіла мяч з грацыёзнасьцю, якая хвалявала яго штосуботы, але той раніцой ніколечкі не ўсхвалявала. Ён сказаў, каб яна ішла зь ім, і, седзячы ў аўто, дадаў без асаблівай патрэбы: «Сёньня мы ня будзем займацца гэтымі штучкамі». Ён павёз яе ў кавярню «Амэрыкана», у той час перапоўненую бацькамі, якія елі марозіва зь дзецьмі пад вялікім стольным вэнтылятарам. Амэрыка Вікуньня замовіла слаёнае ў вялікім фужэры, усе слаі былі рознага колеру, яна любіла гэны гатунак, бо ад яго ішлі якіясьці чарадзейныя выпарэньні. Флярэнтына Арыса выпіў кавы, гледзячы моўчкі на дзяўчыну, пакуль яна ела марозіва доўгаю лыжкай, што даставала да дна фужэра. Не адводзячы вачэй, раптам сказаў ёй:

– Я зьбіраюся ажаніцца.

Яна ўставілася на яго з бляскам недаверу ў вачох, затрымаўшы лыжку ў паветры, але тут жа ачомалася і ўсьміхнулася.

– Падманваеш, – заключыла яна, – старыя не ідуць пад шлюб.

Увечары ён адвёз яе ў інтэрнат да званоў пад моцнай навальніцай. Да гэтага яны схадзілі на лялечнае прадстаўленьне ў парку і паабедалі ля кіёскаў над хвалярэзамі,

дзе пакаштавалі смажанай рыбы. Затым глядзелі на драпежнікаў у клетках цырку, які толькі-толькі зьявіўся ў горадзе. Каля брамы набылі ўсялякія прысмакі, каб яна ўзяла іх з сабой у інтэрнат. Зрабілі некалькі кругоў па горадзе ў аўто з апушчаным верхам, каб яна прызвычаілася да думкі, што ён яе апякун, а не палюбоўнік. У нядзелю ён накіраваў ёй аўто – раптам яна пажадае пакатацца зь сяброўкамі, але сам не пажадаў яе бачыць, бо зь мінулага тыдня цалкам усьвядоміў розьніцу ва ўзросьце. Уначы ён вырашыў напісаць Фэрміне Дасе ліст і прасіць прабачэньня хоць бы дзеля таго, каб не капітуляваць, але, падумаўшы, пакінуў мерапрыемства на наступны дзень. У панядзелак, да зыходу трэцяга тыдня пакут, ён увайшоў у дом, мокры ад дажджу, і за парогам знайшоў ліст.

Гэта было а восьмай вечара. Служанкі ўжо адпачывалі, пакінуўшы ў калідоры, як заўсёды, лямпу, якая дазваляла Флярэнтына Арысу дайсьці да спальні. Ён ведаў, што сьціплая вячэра чакае яго на стале ў ядальні, што было вельмі дарэчы пасьля выпадковай ежы апошніх дзён, але голад адступіў перад хваляваньнем ад ліста. Флярэнтына Арыса ледзьве ўключыў агульнае сьвятло ў спальні, – так дрыжэлі ягоныя рукі. Ён паклаў мокры ліст на ложак, уключыў начнік на століку і, прыкідваючыся спакойным, што было яго асабістым спосабам супакоіцца, зьняў мокрую камізэльку і павесіў яе на сьпінку крэсла. Затым зьняў жакет і склаў яго акуратна паверх камізэлькі, зьняў стужку з чорнага шоўку і цэлюлёідны каўнерык, які здаўна выйшаў з моды ва ўсім сьвеце, расшпіліў кашулю да пасу, разьняволіў яго, каб лягчэй дыхалася, і, нарэшце, павесіў сушыць капялюш ля акна. Раптам ён спужаўся, бо забыў, куды паклаў ліст, ён быў настолькі знэрваваны, што вельмі зьдзівіўся, знайшоўшы яго на ложку, але пры гэтым ня памятаў, як яго туды паклаў. Перад тым як ускрыць, ён абсушыў капэрту сваёй насоўкай, імкнучыся не размазаць атрамант, якім яна напісала ягонае імя. Пакуль Флярэнтына Арыса рабіў гэта, ён здагадаўся, што ўжо не існуе таямніцы двух людзей. Прынамсі, цяпер гэта была таямніца трох. Хто б ні прынёс ліст, ён абавязкова зьвярнуў увагу, што ўдава Ўрбіна напісала чалавеку яе сьвету, ледзьве мінулі тры тыдні пасьля сьмерці мужа. Напісала ў такой сьпешцы, што не

накіравала ліст поштай, а паслала з кімсьці. Прычым, відаць, загадала засьцерагацца і не ўручаць ліст у рукі, лепш пакінуць пад дзьвярыма, як ананімку. Яму не давялося ўскрываць капэрту – клейстар распусьціўся дажджом, але ліст захаваўся сухі: тры шчыльна сьпісаныя старонкі, без загалоўку, падпісаныя шлюбным прозьвішчам.

Флярэнтына Арыса прачытаў ліст шпарка, седзячы на ложку, заінтрыгаваны, хутчэй, тонам, чым зьместам, і перад тым, як пачаць чытаньне зноў, ён ужо ведаў, – гэта быў той абразьлівы ліст, якога ён чакаў. Ён паклаў разгорнутыя старонкі на начным століку пад сьвятлом начніка, зьняў чаравікі і мокрыя шкарпэткі, падышоў да выключальніка каля дзьвярэй і пагасіў агульнае сьвятло, затым насунуў замшавыя тапачкі і прылёг у штанах і кашулі – дзьве вялізныя падушкі дазвалялі чытаць у вельмі зручным становішчы. Ён перачытваў ліст слова за словам, разглядваючы кожную літару, каб пранікнуць у тое, што было за радкамі, потым прачытаў ад пачатку і да канца яшчэ чатыры разы, ды так пранікнёна, што словы пасланьня пачалі страчваць сэнс. Нарэшце паклаў ліст у скрыню начнога століка, лёг на сьпіну, самкнуў рукі пад галавой, і на працягу чатырох гадзінаў безупынна глядзеў, стаіўшы дыханьне, на прастору вялікага люстэрка, у якім калісьці пабывала яна. Роўна апоўначы схадзіў на кухню, згатаваў каву, густую, як сырая нафта, і пераліў яе ў тэрмас. Потым вярнуўся ў спальню і кінуў зубны пратэз у шклянку з растворам борнае кіслаты, якая заўсёды была напагатове ля ложка. Зноў прылёг і ляжаў у позе мармуровай скульптуры, час ад часу адпіваючы каву, пакуль служанка не ўвайшла да яго а шостай раніцы з другім, поўным тэрмасам.

У тую гадзіну Флярэнтына Арыса ўжо ведаў, якія будуць яго наступныя крокі. Насамрэч яе абразы не прынесьлі болю, ён і ня думаў аспрэчваць незаслужаныя абвінавачаньні, яны маглі быць больш жорсткімі, калі ўлічыць характар Фэрміны Дасы і істотнасьць матыву. Ліст зацікавіў яго тым, што сам па сабе дапускаў мажлівасьць, прызнаваў ягонае права на адказ. Больш за тое, ліст патрабаваў адказу. Так што жыцьцё ўваходзіла ў рэчышча, у якое ён і хацеў яго ўвесьці. Астатняе залежала ад яго, і ён быў абсалютна ўпэўнены, што апраметная на

паўстагодзьдзя яшчэ рыхтуе яму шмат сьмяротных выпрабаваньняў, і быў гатовы супрацьстаяць ім з большай жарсьцю, болем і каханьнем, чым папярэднім іспытам, бо гэтыя будуць апошнія.

Празь пяць дзён пасьля атрыманьня ліста ад Фэрміны Дасы Флярэнтына Арыса прыйшоў у кантору і адчуў, нібыта лунае ў нязвыклай пустэчы друкарак, гук якіх, падобны да гуку дажджу, быў менш прыкметны за іхнае маўчаньне. Адбылася кароткая паўза. Калі пошум усчаўся зноў, Флярэнтына Арыса зазірнуў у кабінэт Леоны Касіяні, яна сядзела за пэрсанальнай машынкай, якая слухалася падушачак яе пальцаў, нібыта жывая. Яна адчула ягоны погляд, абярнулася да дзьвярэй, усьміхнулася яму гожай сонечнай усьмешкай, але не дадрукавала абзац да канца.

– Скажы мне, ільвіца маёй душы, – пачаў Флярэнтына Арыса, – як бы ты аднеслася да любоўнага ліста, надрукаванага на гэным ламаччы?

Яе нішто ўжо не магло зьдзівіць, і, тым ня менш, жэст у адказ быў поўным шчырага зьдзіўленьня.

– Карамба! – усклікнула яна. – Я б ні за што не дадумалася!

Яна не магла адказаць інакш. Флярэнтына Арыса таксама ня думаў пра гэта дасюль, і вырашыў рызыкнуць да канца – павёз дамоў адну з канторскіх машынак пад зычлівыя жарты падначаленых: «Стары папугай гаварыць не навучыцца». Леона Касіяні, энтузіяст любога пачатку, прапанавала хатнія заняткі машынапісу. Аднак ён быў супраць мэтадычнага вучнёўства з тае пары, як Лятары Тугут імкнуўся навучыць яго граць на скрыпцы па нотах, пагрозьліва сьцьвярджаючы, што трэба адзін год дзеля засваеньня асноваў, пяць, каб граць у больш-менш прафэсійным аркестры, і шэсьць гадзінаў штодня цягам усяго жыцьця, каб граць добра. Тым ня менш, Флярэнтына Арыса ўгаварыў маці, каб набыла яму скрыпку з тых, якімі карысталіся сьляпыя, і, засвоіўшы пяць асноўных правілаў, якія выдаў яму Лятары Тугут, менш чым за год набраўся сьмеласьці граць у катэдральным хоры і пасылаць сэрэнады Фэрміне Дасе з могілкаў для бедных, карыстаючыся спадарожным ветрам.

Калі гэта было магчыма ў дваццаць гадоў з такім складаным інструмэнтам, як скрыпка, ён ня бачыў прычынаў, якія маглі б перашкодзіць яму паўтарыць подзьвіг у семдзесят шэсьць, але з інструмэнтам, на якім ён мог граць адным пальцам, – зь пішучай машынкай.

Так яно і атрымалася. За тры дні ён вывучыў расклад літараў, за шэсьць навучыўся думаць і друкаваць адначасна, а яшчэ тры дні спатрэбіліся, каб скончыць першы ліст без памылак, папярэдне зьвёўшы паўстосу паперы. Ліст пачынаўся ўрачыстым зваротам: «Сэньёра». Ён падпісаўся адным ініцыялам, літарай «Ф», як зазвычай падпісваў духмяныя допісы ў юнацтве. Ён накіраваў ліст поштай у капэрце з жалобнымі віньеткамі, як трэба, калі ліст адрасаваўся нядаўна аўдавелай жанчыне, і без імя адпраўніка на адвароце.

Ліст быў на шасьці старонках і ня меў нічога агульнага з тым, што ён пісаў калісьці. Ён быў пазбаўлены тону, стылю і рытарычнага подыху першых гадоў каханьня, ягоныя аргумэнты былі такімі рацыянальнымі і памяркоўнымі, што водар гардэніі быў бы зусім недарэчы. Пэўным чынам ліст набліжаўся да камэрцыйных пасланьняў, якія ў яго раней ніколі не атрымліваліся. Некалькі гадоў пазьней ліст, надрукаваны на машынцы, успрыняўся б як абраза, але тады яшчэ машынка лічылася выключна канторскай жывёлай, пазбаўленай этыкі, утаймаваньне якой для прыватнага ліставаньня не было прадугледжана, а значыць, не было асуджана ў падручніках добрага тону. Мабыць, больш за ўсё ліст быў падобны да твору сьмелага мадэрнізму. Відаць, менавіта так быў зразуметы ліст Фэрмінай Дасай, бо ў другім лісьце да Флярэнтына Арысы пасьля атрыманьня ста сарака зь лішнім ягоных пасланьняў яна пачала з прабачэньняў за заганы свайго почырку; яна, маўляў, ня мае больш прасунутых прыладаў для пісьма, чым простае сталёвае пёрка.

Флярэнтына Арыса нават ня згадваў у сваім пасланьні пра яе першы жахлівы ліст, а з самага пачатку выбраў іншы мэтад спакусы, безь якой-кольвек згадкі пра мінулае каханьне, наагул пра мінулае: ён нібыта падвёў рысу і адкрыў новы рахунак. Гэта быў перадусім доўгі роздум пра жыцьцё на падставе

ягоных думак і вопыту ў адносінах паміж мужчынам і жанчынай, які аднойчы ён задумаў напісаць як дадатак да «Дапаможніка для закаханых». Толькі гэтым разам ён усё ахінуў аўрай патрыярхальнага стылю, уласьцівага ўспамінам старога чалавека, каб ня надта прыкметнае было тое, што насамрэч ліст быў сьведчаньнем ягонага каханьня. Сьпярша ён накрэмзаў шмат чарнавікоў на стары манер, якія доўга і адчужана перачытваліся і затым бязьлітасна спальваліся. Ён ведаў, што любая неасьцярожнасьць, любая нядбайная настальгічная спасылка можа выклікаць раздражненьне мінулым, і, хоць прадбачыў, што яна верне яму сто лістоў перад тым, як асьмеліцца ўскрыць першы, ён жадаў, каб гэтага ня здарылася ніколі. Так што ён прадумаў ліст да апошняе драбязы, як плян фінальнага бою: усё мусіць быць іншым, каб запаліць новую цікаўнасьць, задумацца пра новыя крокі жыцьця, абудзіць новыя спадзевы ў жанчыне, якая пражыла ўжо амаль усё жыцьцё шчасьліва і ў дабрабыце. Ён мусіць наладаваць яе шалёнай ілюзіяй, здольнай ускружыць ёй голаў адвагай, каб яна кінула на звалку прымхі тае клясы, да якой першапачаткова не належала, хоць за мінулыя гады і сталася першай дамай грамадзтва. Ён мусіць навучыць яе думаць пра каханьне як пра найвышэйшую міласьць, якая не была б сродкам для дасягненьня якіх-кольвек мэтаў, а сама была б крыніцай і мэтай у сваёй сутнасьці.

Яму хапіла розуму не чакаць хуткага адказу і задавальняцца тым, што Фэрміна Даса не вяртае ягоных лістоў. Яна, насамрэч, не вярнула ні першы ліст, ні пазьнейшыя. Дні ішлі, і ягонае хваляваньне, якое сілкавалася чаканьнем, узмацнялася, бо чым больш дзён мінала бязь вернутых лістоў, тым больш расла надзея, што адказ ён атрымае. Частата ягоных лістоў была зьвязаная з лоўкасьцю пальцаў: напачатку адзін ліст штотыднёва, потым два, а пазьней – ліст штодня. Ён узрадаваўся прагрэсу пошты з тых часоў, калі ўздымаў сьцяг, абвяшчаючы людзям, адкуль прыйшлі лісты, бо ня мог рызыкаваць і паказвацца штодня ў паштовай канторы, каб кінуць ліст, адрасаваны адной і той жа асобе, як і ня мог карыстацца кур'ерам, які б усё разбалбатаў. Затое лёгка было накіраваць клерка па маркі на цэлы месяц, і затым кідаць лісты ў любую з трох паштовых скрыняў у старой частцы гораду.

Неўзабаве рытуал стаўся звычайным: ён выкарыстоўваў бессань, каб напісаць ліст, а на наступны дзень, па дарозе ў кантору, прасіў кіроўцу спыніцца на хвілю каля паштовае скрыні на перакрыжаваньні вуліцаў і сам апускаў ліст, ні разу не дазволіўшы кіроўцу зрабіць гэта за яго, як той аднойчы дажджлівай раніцой прапанаваў. Час ад часу Флярэнтына Арыса прыбягаў да кансьпірацыі і накіроўваў некалькі лістоў адначасна, каб усё выглядала больш натуральна. Кіроўца ня ведаў, зразумела, што ў гэтых дадатковых лістах былі чыстыя старонкі, якія Флярэнтына Арыса накіроўваў сабе самому. Бо ён ніколі не перапісваўся ў асабістых справах ні з кім, калі не лічыць справаздачы, якую ён пісаў як апякун напрыканцы кожнага месяца бацькам Амэрыкі Вікуньні. Гэта былі асабістыя ўражаньні пра здароўе, паводзіны і настроі дзяўчыны і пра яе посьпехі ў навучаньні.

Флярэнтына Арыса пачаў нумараваць лісты празь месяц, і кожны новы ліст меў сьціплае рэзюмэ папярэдняга, як газэтныя раманы з працягам, каб Фэрміна Даса ня блыталася ў іх пасьлядоўнасьці. Калі лісты сталіся штодзённымі, ён замяніў капэрты з жалобнымі віньеткамі на іншыя, белыя і даўгія, што, зрэшты, надавала ім нэўтральнасьць камэрцыйных лістоў. На самым пачатку перапісцы Флярэнтына Арыса быў гатовы набрацца цярплівасьці, прынамсі, да поўнае яснасьці, што ён проста губляе час арыгінальным спосабам, які сам прыдумаў. Насамрэч Флярэнтына Арыса чакаў. Чакаў без жахлівых пакутаў, што маюць за чыньнік мроі маладосьці, але з жалезабэтоннай упартасьцю старога, якому не было пра што думаць альбо штосьці рабіць у параходнай кампаніі, бо яна ў той час плыла сама са спадарожным ветрам. Флярэнтына Арыса чакаў і верыў, што будзе жывы і захавае сваю мужчынскую годнасьць і заўтра. У кожным разе, пакуль Фэрміна Даса дарэшты ня ўпэўніцца, што яе трызьненьням самотнай удавы няма іншага выйсьця, як апусьціць перад ім пад'ёмны мост яе замку.

Тым часам Флярэнтына Арыса працягваў жыць. Рана ці позна ён прадбачыў станоўчы адказ Фэрміны Дасы, і таму распачаў другую рэканструкцыю ўжо выкупленага дому, каб надаць яму выгляд, годны будучай гаспадыні і сэньёры. Ён нанава наведаў

некалькі разоў Прудэнсію Пітрэ, як абяцаў, каб давесьці, што кахае яе насуперак бязьлітасным адбіткам узросту, і пад пякельным сонцам, і пры адчыненых дзьвярох, а ня толькі начамі адчаю. Ён бываў і ў доме Андрэ Варон, пакуль не прыкмеціў, што ў ваннай пагашанае сьвятло, і спрабаваў давесьці сябе да грубага шаленства ў яе ложку дзеля таго, каб ня страціць форму ў адпаведнасьці з даўнім ягоным пераканаьнем, якое ніхто не абверг і дагэтуль: цела годнае, пакуль чалавек карыстаецца ім.

Адзінай складанасьцю быў стан ягоных адносінаў з Амэрыкай Вікуньняй. Кіроўцу ён даў сталы загад – забіраць яе з інтэрнату штосуботы а дзясятай раніцы, але сам, на жаль, ня ведаў, што рабіць зь ёю на працягу двух выходных дзён. Упершыню ён не займаўся ёю, і гэтая зьмена яе злавала. Флярэнтына Арыса даручаў служанкам, каб адвялі яе ў кіно на дзённы сэанс, на канцэрт у дзіцячым парку, на розыгрыш дабрачыннае лятарэі. Ён прыдумваў нядзельныя праграмы для яе і дзяўчат яе курсу, каб ня трэба было везьці ў патаемны рай за кантораю, куды яна марыла вярнуцца з тае самае пары, як пабывала там упершыню. Флярэнтына Арыса не здагадваўся ў тумане новай ілюзіі, што жанчыны здольныя сталець за некалькі дзён, а з таго моманту, як ён сустрэў яе, калі яна прыбыла на карабліку з Пуэрта-Падрэ, мінула тры гады. Як ён ні імкнуўся падсалоджваць пілюлю, зьмены для яе былі надта жорсткімі, але яна не магла ўцяміць прычыну разлукі. У дзень, калі ён сказаў, седзячы ў кавярні, што зьбіраецца ажаніцца, і гэтым адкрыў праўду, дзяўчына перажыла страшэнны ўдар, але потым сама мажлівасьць ягонага шлюбу здалася ёй настолькі абсурднай, што яна ўшчэнт забылася на тое, што пачула. Аднак вельмі хутка паверыла, што ён паводзіць сябе так, нібыта тыя словы былі праўдай, бяз дай прычыны пазьбягаючы яе, нібыта ня ён старэйшы за яе на цэлых шэсьцьдзесят гадоў, а наадварот.

Аднойчы ў суботу Флярэнтына Арыса сустрэў яе ў сваёй спальні, яна рабіла спробу друкаваць на машынцы, і гэта атрымлівалася даволі прыстойна, бо ў школе выкладалі і машынапіс. Яна надрукавала больш за паўстаронкі тэксту, у пэўных месцах якога лёгка выдзяляліся фразы, што выяўлялі яе

настрой. Флярэнтына Арыса схіліўся над плячом Амэрыкі Вікуньні, каб прачытаць тое, што на дадзены момант выходзіла з друкаркі. Яна ўсхвалявалася ад цеплыні ягонага цела, ад няроўнага подыху, ад духмянае вопраткі, што мела водар ягонай падушкі. Яна ўжо не была той навапрышлай дзяўчынкай, якую ён распранаў, нібыта гадавалую малую, з хітрыкамі, разьлічанымі на дзяцей: напачатку гэтыя чаравікі – для мядзьведзя, потым кашульку для сабачкі, затым майточкі ў кветачкі для труса, а цяперака я пацалую салодкую пісеньку. Не, і фармальна, і па сутнасьці яна ўжо была жанчынай, гатовай браць ініцыятыву ў свае рукі. Працягваючы друкаваць адным пальцам правай рукі, левай яна прайшлася навобмацак угору па назе Флярэнтына Арысы, знайшла тое, што шукала, адчула, як драпежнік чакае, расьце, заходзіцца ад жаданьня; подых Флярэнтына Арысу стаўся перарывістым, цяжкім. Яна ведала: з гэтага імгненьня ён пераставаў валодаць сабой, у яго раздвойваўся розум, ён ужо залежаў ад яе і не знаходзіў шляхоў вяртаньня да сябе самога, пакуль не дабіраўся да фіналу. Яна павяла яго за руку ў ложак, як вядуць сьляпога цераз вуліцу, і нібыта разадрала яго на кавалкі мудрагелістай пяшчотай, пасаліла яго колькі трэба, паперчыла духмяным перцам, дадала зубчык часнаку, нарэзаную цыбулю, лімонны сок, ляўровы ліст, словам, прыправіла яго на патэльні ўласнай пяшчоты. І запаліла печку. У доме нікога не было. Служанкі кудысьці выйшлі, цесьляры і сталяры, якія рэканструявалі дом, не працавалі па суботах, – так што ўвесь сьвет належаў ім дваім. Але раптоўна ён выйшаў з экстазу на мяжы бездані, адвёў яе руку, прысеў і сказаў дрыготкім голасам:

– Асьцярожна, у нас няма гумкі.

Амэрыка Вікуньня праляжала ў ложку нерухома доўгі час, раздумваючы, што ж гэта здарылася, і калі вярнулася ў інтэрнат на гадзіну раней, чым зазвычай, яна была вельмі далёкая ад жаданьня плакаць, яна напяла нюх і навастрыла кіпцюры, каб знайсьці сьлед тае, што ўлезла ў яе жыцьцё. Тым часам Флярэнтына Арыса яшчэ раз дапусьціў вядомую мужчынскую памылку, думаючы, што яна ўпэўнілася ў бессэнсоўнасьці сваіх намераў і вырашыла забыць яго.

Флярэнтына Арыса стаяў на сваім. Калі прайшло шэсьць месяцаў безь якогасьці сыгналу ад Фэрміны Дасы, ён зноў праварочаўся ў ложку да золку, блукаючы ў пустэльні ўжо падзабытай ім бессані. Ён думаў, што Фэрміна Даса ўскрыла ліст з-за бяскрыўднага выгляду капэрты, заўважыла знаёмы ініцыял, як у лістах мінулага, і кінула яго ў полымя разам са сьмецьцем, нават ня ўзяўшы на сябе цяжар разарваць старонкі. Ёй было дастаткова зірнуць на наступныя капэрты, каб рабіць тое самае, не ўскрываючы іх, і так да таго часу, пакуль ён не завершыць свой пісьмовы роздум. Яму ня верылася, што хоць адна жанчына здольная супраціўляцца цікаўнасьці паўгоду, ня ведаючы нават, атрамантам якога колеру напісаныя лісты. Але калі б і знайшлася такая жанчына, гэта магла быць толькі яна.

Флярэнтына Арыса адчуваў, што ў старасьці час падобны не да бурлівай плыні, якая цячэ ў гарызантальнай плоскасьці, а да бяздоннай цыстэрны, празь якую памяць сьцякае ў нікуды. Ягоныя выдумкі былі на зыходзе. Ён бадзяўся некалькі дзён запар паблізу яе дому ў квартале Ля-Манга і зразумеў: падобным юнацкім спосабам не адчыніць клятыя дзьверы яе жалобы. Аднойчы раніцой ён шукаў чыйсьці нумар у тэлефонным даведніку і выпадкова сутыкнуўся зь яе каардынатамі. Пазваніў. Тэлефон званіў доўга, нарэшце ўзялі слухаўку, і ён пазнаў яе голас, засяроджаны і хрыплы: «Слухаю». Ён паклаў слухаўку, ня вымавіўшы ні слова, але бясконцая адлегласьць паміж ім і аддаленым голасам Фэрміны Дасы пазбавіла яго спакою надоўга.

Між тым Леона Касіяні запрасіла вузкае кола сяброў, каб адзначыць свой дзень народзінаў. Флярэнтына Арыса па расьсеянасьці праліў на сябе соўс, якім была прыпраўлена курыца. Яна замыла ягоны штрыфэль, макаючы край сурвэткі ў шклянку з вадою, і затым надзела яму сурвэтку, як сьлінючку, каб пазьбегнуць новых непрыемнасьцяў: ён сядзеў, нібыта старое немаўля. Падчас абеду Леона Касіяні некалькі разоў заўважала, што ён працірае акуляры насоўкай, бо вочы бясконца сьлязіліся. Калі падалі каву, ён заснуў з кубкам у руцэ, і яна спрабавала ўзяць кубак, не пабудзіўшы яго, але ён зрэагаваў зьбянтэжана: «Я толькі даў адпачыць вачам». Пазьней, кладучыся спаць, Леона Касіяні зьдзіўлена

раздумвала пра тое, як шпарка праявілася старасьць.

Да першых угодкаў сьмерці Хувэналя Ўрбіна сям'я разаслала пісьмовыя запрашэньні на памінальную імшу, якая мусіла адбыцца ў катэдральным саборы. Да таго часу Флярэнтына Арыса паслаў Фэрміне Дасе сто трыццаць два лісты і ні на адзін зь іх не атрымаў адказу, што пацягнула яго на адважнае рашэньне: пайсьці на імшу, ня будучы запрошаным. Грамадзе ўчынак падаўся, хутчэй, фанабэрыстым, чым кранальным. Флярэнтына Арыса прыйшоў сярод першых, каб заняць месца там, дзе Фэрміна Даса не магла б ня бачыць яго. Лавы, рэзэрваваныя пажыцьцёва з правам спадкаваньня, пазначаліся меднай біркай зь імем уладальніка. Ён падумаў, што ягонай задуме лепш за ўсё адпавядаюць месцы ў цэнтральным нэфе, за імяннымі лавамі, але ўжо набілася столькі людзей, што ён не знайшоў свабоднага кутка. Прыйшлося ўладкавацца ў нэфе, дзе зазвычай сядзелі бедныя сваякі. Адтуль ён бачыў, як увайшла Фэрміна Даса пад руку з сынам, апранутая ў чорны аксаміт да манжэтак без упрыгожваньняў, з шэрагам гузікаў ад шыі да ног, як на сутане біскупа, і пад шалем з кастыльскіх карункаў замест капелюша з вэлюмам, якія насілі ўдовы і іншыя дамы, што марылі аўдавець. Адкрыты твар паблісквaў, як алябастар, стрэлападобныя вочы жылі сваім жыцьцём пад вялізнымі жырандолямі цэнтральнага нэфу, і ішла яна так роўна, так ганарліва, так незалежна, што здавалася не старэйшай за сына. Флярэнтына Арыса стаяў, паклаўшы руку на сьпінку пярэдняе лавы, пакуль не перастала кружыцца галава, што здарылася таму, што ён адчуў: яны знаходзяцца не за сем крокаў адно ад аднаго, а ў розных днях.

Фэрміна Даса вытрывала цырымонію каля фамільнае лавы супраць галоўнага аўтара з тым жа выразам велічы, зь якім наведвала опэру. Аднак напрыканцы яна парушыла нормы паводзінаў, не засталася на месцы, каб выслухаць спачуваньні, як гэта было прынята, а рушыла па праходзе і дзякавала кожнаму запрошанаму: абнаўленчы жэст, які быў вельмі тыповым для яе характару. Вітаючы адных і другіх, яна нарэшце абышла лавы для бедных сваякоў і напасьледак азірнулася, каб упэўніцца, ці не абышла ўвагай кагосьці са знаёмых. Тады Флярэнтына Арыса адчуў, нібыта

звышнатуральны вецер зьбівае яго з ног: яна ўгледзела яго. Сапраўды, Фэрміна Даса адышла ад асобаў, якія суправаджалі яе, вельмі лёгка, так нязмушана яна заўсёды паводзіла сябе ў грамадстве, тады працягнула яму руку і сказала з салодкай усьмешкай:

– Дзякуй, што прыйшлі.

Рэч, зразумела, у тым, што Фэрміна Даса ня толькі атрымала ягоныя лісты, але і прачытала іх са шчырай цікавасьцю, і знайшла ў іх далёка не банальны роздум пра тое, як жыць далей. Яна сядзела за сталом, сьнедала з дачкою, калі атрымала першы ліст; разгарнула яго са зразумелай цікаўнасьцю – ліст быў надрукаваны на машынцы, і раптам пачырванела: яна пазнала подпіс. Але Фэрміна Даса адразу апамяталася і, паклаўшы ліст у кішэню фартуха, сказала: «Гэта спачуваньне ад ураду». Дачка зьдзівілася: «Усе спачуваньні ўжо прыйшлі». Яна не зьмянілася з твару: «Акрамя гэтага». Яна мела намер спаліць ліст, каб пазьбегнуць пытаньняў дачкі, але як было ўтрымацца ад спакусы і не зазірнуць у тэкст?

Фэрміна Даса чакала годнага адказу на яе абразьлівае пасланьне, пра якое пачала шкадаваць з моманту яго адпраўкі, але паважлівы зварот Флярэнтына Арысы і сутнасьць ягоных намераў, выкладзеных у першым абзацы, зьбілі яе з тропу: сапраўды, штосьці зьмянілася ў гэтым сьвеце. Фэрміна Даса была так заінтрыгаваная, што зачынілася ў спальні, каб перачытаць ліст спакойна, перад тым як спаліць, і перачытвала ня раз, а тройчы, не пераводзячы дых.

Гэта быў роздум пра жыцьцё і каханьне, старасьць і сьмерць, думкі, якія часьцяком праляталі, нібыта начныя птушкі, над яе галавой, але яна ня здолела зачапіцца за іх, яны зьнікалі, пакідаючы ёй толькі жменьку пёраў. Вось яны, дакладныя, простыя, выказаныя тымі словамі, якія чамусьці не даваліся ёй, і зноўку яна шкадавала, што ўжо не абмяркуе іх з мужам, як яны, бывала, абмяркоўвалі падзеі мінулага дня перад сном. Такім чынам, перад ёю праяўляўся невядомы Флярэнтына Арыса, яснасьць думак якога не адпавядала як ліхаманкавым допісам юнацтва, так і змрочным паводзінам ягонага жыцьця. Гэта былі, хутчэй, словы чалавека, пра якога цётка Эскалястыка

думала, што яго натхняе Сьвяты Дух, і гэтая думка спужала яе таксама, як і ў маладосьці. Аднак спакою душы спрыяла ўпэўненасьць, што ліст старога мудраца ня ўтрымлівае спробы паўтарыць нахабную выхадку, якую ён дазволіў сабе ў жалобную ноч, а было прадыктавана вельмі высакародным памкненьнем – сьцерці мінулае.

Наступныя лісты канчаткова супакоілі яе. Фэрміна Даса ўсё роўна іх спальвала пасьля чытаньня, хоць пры гэтым адчувала асадак вінаватасьці, які ніяк не магла разьвеяць. Так што калі яна пачала атрымліваць нумараваныя пасланьні, яна стала шукаць і знайшла для сябе маральнае апраўданьне, каб не зьнішчаць іх. Яе аргумэнты, прынамсі напачатку, былі зьвязаныя не з захаваньнем лістоў, а з чаканьнем аказіі, каб вярнуць іх Флярэнтына Арысу, – яна не магла ўзяць на сябе віну за страту таго, што было, як ёй здавалася, сапраўды карысным. На вялікі жаль, час ішоў, лісты працягвалі прыходзіць праз тры альбо чатыры дні на працягу году, і яна ўсё ня ведала, як іх вярнуць, каб гэта не аддавала неіснуючай ужо зьнявагай і каб ёй не прыйшлося тлумачыць гэта ў лісьце, бо гонар не дазваляў яго напісаць.

Ёй хапіла першага году, каб прыняць удовін лёс. Памяць пра мужа, якая нібыта ачысьцілася часам, перастала замінаць у будзённых учынках, патаемных думках, у самых простых намерах, і ператварылася ў сталую прысутнасьць, якая накіроўвала яе, не прыгнятаючы. Часам яна знаходзіла яго – і не як прывід, а як жывога чалавека – менавіта там, дзе ў ім была патрэба. Ён быў зь ёю, але без мужчынскіх капрызаў, патрыярхальнай патрабавальнасьці, напамінаў пра тое, што яна абавязаная кахаць яго з рытуалам недарэчных пацалункаў і пяшчотных словаў, якімі ён кахаў яе. Цяпер яна разумела яго лепш, чым пры жыцьці: ведала, як ён жадаў каханьня, у якім шукаў упэўненасьці, апоры ва ўласных грамадзкіх справах, чаго насамрэч так і не знайшоў. Аднойчы на мяжы адчаю яна крыкнула яму: «Ты не здагадваесься, што я нешчасьлівая жанчына». Хувэналь Урбіна ўласьцівым яму жэстам без хваляваньня зьняў акуляры, ахінуў яе празрыстасьцю сваіх хлапечых вачэй, і адной фразай раздушыў яе невыносным цяжарам сваёй мудрасьці: «Помні заўсёды: галоўнае ў шлюбе

ня шчасьце, а стабільнасьць». Зь першых дзён удовінае самоты яна засвоіла: тая фраза не хавала ў сабе сур'ёзнай пагрозы, пра якую яна тады падумала, а была месяцавым каменьчыкам, які прынёс ім шмат шчасьлівых гадзінаў.

Падчас вандровак па сьвеце Фэрміна Даса набывала ўсё, што прыцягвала яе ўвагу. Яе цягнула да гэтых рэчаў нейкім першасным парывам, якому Хувэналь Урбіна не пярэчыў, каб зрабіць жонцы прыемнасьць. Размова ішла пра рэчы гожыя і карысныя, пакуль яны знаходзіліся ў натуральным асяродку, на вітрынах Рыму, Парыжу, Лёндану, Нью-Ёрку, які ліхаманіла ад чарлстону, дзе пачыналі расьці хмарачосы. Але рэчы страчвалі гожасьць і карыснасьць у іншых абставінах, не выносячы, напрыклад, вальсаў Штраўса з цыкадамі і паэтычнымі гульнямі пад саракаградуснай сьпякотай у цені. Так ці інакш, на адваротным шляху яна везла паўтузіна вялізных вэртыкальных баулаў з храмаванага мэталу, з абабітымі медзьдзю куткамі, падобнымі да фантастычных трунаў. Яна рабілася гаспадыняй найноўшых цудаў сьвету, якія, тым ня менш, адпавядалі цане, заплачанай за іх золатам толькі ў той момант, калі нехта зь сяброў ці суседзяў бачыў іх упершыню. Яна ўсьвядоміла бязглуздасьць вобразу, які яна стварыла ў вачох грамадзтва задоўга да парогу старасьці, і ў доме часьцяком чулі яе словы: «Трэба вызваліцца ад гэтага сьмецьця, нам ужо няма дзе жыць». Доктар Урбіна сьмяяўся зь яе добрых намераў, ён ведаў, што пустыя месцы зноў будуць запоўненыя новым сьмецьцем. Але яна настойвала, бо іх зжывалі з дому рэчы, якім ужо ніколі не знайшлі б выкарыстаньня, нібыта кашулі, што віселі на клямках кожных дзьвярэй, альбо эўрапейскія зімнія паліто, складзеныя нават у шафках на кухні. Так што наступала раніца, і яна ў добрым настроі спусташала шафы і баулы, пераварочвала каморы, уздымала гвалт, нібыта пры вайсковых дзеях. Яна навальвала вакол сябе купы няношанай вопраткі, новенькіх капелюшоў, якія здаўна выйшлі з моды, а таксама чаравікаў, якія зьяўляліся копіямі тых, што імпэратрыцы надзявалі ў дзень каранацыі. Гэта былі копіі, зробленыя эўрапейскімі майстрамі, але дзяўчаты з радавітых сямей пагарджалі імі, бо чаравікі такога самага фасону набывалі нэгрыцянкі на базары, дзе яны прадаваліся як хатнія тапачкі. Усю раніцу ўнутраная тэраса заставалася нібыта ў абложным

становішчы, у доме было цяжка дыхаць з-за паху ад нафталінавых шарыкаў. Аднак спакой узнаўляўся за некалькі гадзінаў, бо ўрэшце ёй рабілася шкада ўсяго гэтага шоўку, што валяўся на падлозе, парчы, стужак і махроў, хвастоў чарнабуркі, якія былі асуджаныя на вогнішча.

– Спаліць усё гэта – грэх, – гаварыла яна, – калі шмат тых, у каго няма нават чаго паесьці.

Такім чынам, выкананьне прысуду адкладвалася на неакрэсьлены час, і рэчы толькі пераносіліся зь месца на месца, пакідалі прывілеяваныя куткі дому і траплялі ў стайню, якая ператваралася ў склад нерухомых рэшткаў. Тым часам вызваленая прастора, як гаварыў муж, нанава напаўнялася, забівалася рэчамі, якія жылі хіба што імгненьне, каб затым памерці ў шафах. Яна часьцяком паўтарала: «Дзе ж тыя вынаходцы, няхай бы прыдумалі, што рабіць з рэчамі, якія ўжо не патрэбныя, калі шкада выкінуць». Яе і насамрэч палохала ненажэрнасьць, зь якой рэчы, як агрэсары, займалі ўсю жыцьцёвую прастору, адштурхоўваючы людзей, заганяючы іх у кут. Фэрміна Даса не была акуратнай, але выпрацавала ўласны адчайны мэтад, што дапамагаў ёй здавацца такой: яна хавала беспарадак. Калі памёр Хувэналь Урбіна, прыйшлося вызваліць палову кабінэту і неяк скласьці рэчы ў спальнях, інакш не было б нават мажлівасьці пасядзець ля труны.

Прыход сьмерці ў дом вырашыў і гэтую праблему. Як толькі Фэрміна Даса спаліла вопратку мужа і выявіла, што пульс пры гэтым у яе не пачасьціўся, у адным парыве яна загадала час ад часу раскладваць вогнішча і наперад. Яна кідала ў агонь усё старое і нават сёе-тое новае, ня думаючы пра зайздрасьць багацеяў альбо помсту нябогаў, якія паміралі з голаду. Нарэшце яна загадала выкарчаваць мангавае дрэва, каб не засталося і сьледу ад няшчасьця, і падаравала жывога папугая новаму гарадзкому музэю. Толькі пасьля гэтага яна ўздыхнула з палёгкай у доме сваёй мары: прасторным, зручным, сваім.

Афэлія, яе дачка, пабыла зь ёю тры месяцы і вярнулася ў Нью-Арлеан. Сын прыводзіў сваю сям'ю на нядзельныя абеды, а час ад часу і сярод тыдня. Найбліжэйшыя сяброўкі Фэрміны Дасы зноў пачалі яе наведваць, як толькі яна пережыла крызіс

жалобы. Яны гулялі ў карты, спрабавалі новыя стравы, гатаваныя па рэцэптах, уводзілі яе ў курс падзеяў патаемнага жыцьця ненажэрнага сьвету, які працягваў існаваць безь яе. Адной з самых блізкіх была Люкрэсія дэль Рэаль дэль Абіспа, арыстакратка на стары манер, зь якой Фэрміна Даса заўсёды падтрымлівала сяброўскія адносіны, але асабліва зблізілася пасьля сьмерці Хувэналя Ўрбіна. Маларухомая праз жорсткі артрыт, Люкрэсія дэль Рэаль сама прайшла празь немалыя беды ў жыцьці і складала Фэрміне Дасе добрую кампанію ў сумны час. Яны абмяркоўвалі розныя грамадзкія праекты, якія рыхтаваліся ў горадзе, а таксама сьвецкія навіны, і ад гэтага Фэрміна Даса адчувала грамадзянскую карыснасьць незалежна ад патранажу магутнага мужа. Тым ня менш, ніколі раней Фэрміну Дасу так упарта ня зьвязвалі зь ім, бо цяпер апускалі дзявочае прозьвішча, зь якім зьвярталіся да яе пры жыцьці мужа, і яна сталася проста ўдавой Урбіна.

Паступова, як набліжаліся першыя ўгодкі сьмерці мужа, Фэрміна Даса ўваходзіла ў заценены, поўны сьвежасьці і цішы асяродак, нібыта ў гушчар непазьбежнасьці. Да пары яна не ўсьведамляла да канца, наколькі дапамаглі ёй знайсьці душэўны спакой пісьмовыя развагі Флярэнтына Арысы. Менавіта яны, прыкладзеныя да яе вопыту, дазволілі ёй зразумець уласнае жыцьцё і з вытрымкай чакаць таго, што наканавала ёй старасьць. Сустрэча падчас імшы, якую прысьвяцілі памяці мужа, сталася шчасьлівай аказіяй: яна дала Флярэнтына Арысу зразумець, што дзякуючы ягоным узьнёслым лістам, яна таксама гатовая сьцерці з памяці мінулае.

Праз два дні яна атрымала ад яго іншы ліст: напісаны ад рукі на шыкоўнай паперы і з поўным разборлівым подпісам на адвароце капэрты. Усё тым жа зграбным почыркам першых юнацкіх лістоў, зь лірычнай свабодай ён дзякаваў за ветлівасьць яе словаў у катэдральным саборы. Фэрміна Даса думала пра гэты ліст некалькі дзён запар, усхваляваная ўспамінамі пра юнацтва, якія былі такімі добрымі, што ў наступны чацьвер яна бяз дай прычыны спытала ў Люкрэсіі дэль Рэаль дэль Абіспа, ці ня ведае яна Флярэнтына Арысу, уладальніка рачных караблёў. Люкрэсія адказала

сьцьвярджальна: «Відаць, гэта прапашчы чалавек». Яна паўтарыла вядомую вэрсію пра тое, нібыта ён ня ведаў у жыцьці жанчын, хоць мог бы скласьці добрую партыю, і завёў сабе патаемнае жытло, куды прыводзіў хлапчукоў, за якімі ўначы ганяўся па прычалах. Фэрміна Даса чула гэтую легенду з даўніх часоў, але ніколі ў яе ня верыла, як і наагул не надавала значэньня чуткам. Аднак тая ж легенда, паўтораная Люкрэсіяй дэль Рэаль дэль Абіспа, пра якую таксама пляткарылі, нібыта ў яе дзіўныя густы, гучала ўжо інакш, і Фэрміна Даса захацела дакапацца да ісьціны. Яна распавяла, што ведала Флярэнтына Арысу з маленства. Нагадала, што ягоная маці трымала галянтарэйную краму на вуліцы Вэнтанас і, апрача таго, выкупала старую бялізну, дзерла зь яе корпію і прадавала як заменьнік ваты для першае дапамогі параненым падчас грамадзянскіх войнаў. Тыраду яна завяршыла ўпэўнена: «Ён рос у сумленнай сям'і і ўзьняў сябе сумленнай працай». Гэта было выказана з такім патасам, што Люкрэсія ўзяла свае словы назад: «Зрэшты, і пра мяне кажуць амаль тое самае». Фэрміна Даса не праявіла цікаўнасьці, не спытала сябе, чаму яна так моцна абараняла чалавека, які быў адно ценем яе жыцьця. Яна працягвала думаць пра яго, асабліва калі пошта не прыносіла чарговага ліста. Прайшло два тыдні бязь вестак, і раптам служанка абудзіла яе падчас сіесты трывожным шэптам.

– Сэньёра, – ледзь вымавіла служанка, – прыйшоў дон Флярэнтына.

Вось і ён зьявіўся. Першая рэакцыя Фэрміны Дасы была панічнай. Яна пасьпела падумаць, што не, няхай прыходзіць іншым разам, у больш зручны час, яна ня ў стане прымаць яго і ня ведае, пра што зь ім гаварыць. Аднак узяла сябе ў рукі і загадала, каб госьця праводзілі ў залю і прынесьлі яму кавы, пакуль яна прывядзе сябе да ладу.

Перад гэтым Флярэнтына Арыса стаяў ля дзьвярэй, спальваючы сябе пад пякельным паабедзенным сонцам, у жахлівай напрузе. Ён быў гатовы да адмовы зь якойсьці прычыны, і гэтая гатоўнасьць хоць часткова падтрымлівала яго. Аднак адказ Фэрміны Дасы, перададзены праз служанку, скалануў яго да вантробаў, ён увайшоў у прахалодны цень залі і ледзь пасьпеў

назваць пра сябе ўсё гэта цудам, як раптоўна ягоныя вантробы ўспушыла ад пеннага выбуху, і гэта выклікала моцны боль. Ён прысеў, прытаіў дыханьне, пакутуючы ад клятага ўспаміну пра птушыны памёт на першым любоўным лісьце, і сядзеў нерухома ў паўзмроку, адчуваючы першы прыступ дрыжыкаў, гатовы прыняць любое няшчасьце, толькі ня гэты злосны боль.

Флярэнтына Арыса ведаў сябе: нягледзячы на запоры ад нараджэньня, чэрава здраджвала яму публічна тройчы альбо і болей за доўгае жыцьцё, і кожнага разу ён мусіў ратавацца ўцёкамі. Менавіта гэты выпадак ды яшчэ некалькі іншых, ня менш ганебных, вымусілі Флярэнтына зразумець глыбінны сэнс фразы, якую ён раней паўтараў не інакш, як жартам: «Ня веру ў Бога, але баюся Яго». Ён стаў ліхаманкава шукаць у памяці любую малітву, каб памаліцца, але нічога ня згадвалася. У маленстве нейкі хлапчук навучыў яго чарадзейным словам, каб дакладна трапіць каменем у птушку: «Ціна-ціна, натраплю альбо стрэльну міма». Ён спрабаваў дзейнасьць гэтых словаў пры першым паходзе ў горы з новенькай рагаткай, і птушка ўпала, нібыта яе паразіла бліскавіца. Ён зачапіўся за гэтую саломінку і паўтарыў формулу, як малітву, але – ніякага эфэкту. Кішкі так закруціла ў сьпіраль, што ён змушаны быў прыўстаць. Пена ў вантробах, усё больш густая, выдала балючы стогн, ён адчуў сьцюдзёны пот па целе. Служанка прынесла каву і спужалася, пабачыўшы перад сабою твар мерцьвяка. Ён уздыхнуў: «Гэта ад сьпякоты». Яна адчыніла акно, але сонца біла ў твар, і акно давялося тут жа зачыніць. Ён уцяміў, што ня вытрывае больш ніводнае хвілі, і тут зьявілася Фэрміна Даса, амаль нябачная ў паўзмроку зацемненага пакою, і таксама спужалася, пабачыўшы яго ў такім стане.

– Можаце зьняць пінжак.

Флярэнтына Арысу ня так страшыў сьмяротны боль, колькі тое, што яна магла пачуць здрадніцкае бурчаньне. Аднак ён знайшоў у сабе сілы сказаць слабым голасам, што не, дзякуй, ён толькі прыйшоў спытаць, калі яна можа прыняць яго. Агаломшаная, яна адказала: «Але вы ўжо тут!» І прапанавала яму прайсьці на тэрасу над патыё, дзе было ня так сьпякота. Ён адмовіўся такім слабым голасам, што ёй здалося, нібы гэта быў

уздых шкадаваньня:

– Я вас малю... заўтра...

Яна згадала, што заўтра будзе чацьвер, дзень візыту пунктуальнай Люкрэсіі дэль Рэаль дэль Абіспа, таму вырашыла са звычайнай цьвёрдасьцю: «Пасьлязаўтра а пятай». Флярэнтына Арыса падзякаваў, тут жа разьвітаўся, прыціснуўшы капялюш да сэрца, і пайшоў, пакінуўшы нечапаны кубак кавы. Яна зьдзіўлена стаяла пасярод залі, не разумеючы, што ж усё-ткі здарылася, пакуль гудзеньне аўто не растала на тым канцы вуліцы.

Між тым Флярэнтына Арыса знайшоў найменш балючую позу на заднім сядзеньні, заплюшчыў вочы, расслабіўся і аддаўся на волю цела. Боль адразу адпусьціў. Кіроўца, які працаваў зь ім шмат гадоў і ўжо нічому не зьдзіўляўся, сядзеў непарушна. Але калі адчыніў дзьверцы каля парогу ягонага дому, усё ж сказаў:

– Асьцярожна, дон Флярэнтына, гэта падобна да халеры.

Аднак халерай тут, зразумела, і ня пахла. Флярэнтына Арыса падзякаваў Богу ў пятніцу а пятай, калі служанка правяла яго цераз паўзмрок залі на тэрасу над патыё і там ён пабачыў Фэрміну Дасу за столікам на дзьве пэрсоны. Яна прапанавала гарбату, шакаляд альбо каву. Флярэнтына Арыса папрасіў гарачую і вельмі моцную каву, і яна загадала служанцы: «Мне як заўсёды». Фэрміна Даса піла густы напой з розных усходніх траваў, які ўздымаў тонус пасьля сіесты. Пакуль яна скончыла сваю гарбату, а ён – свой кубак кавы, абое пасьпелі закрануць нязначныя тэмы, тактоўна абыходзячы галоўнае, пра што не наважваліся загаварыць. Абое былі крыху засмучаныя, не разумелі, што яны робяць так далёка ад іхнага юнацтва на шахматнай дошцы тэрасы нічыйнага дому, які дасюль хаваў пах жалобных кветак. Яны сядзелі так, што маглі б дацягнуцца адно да аднаго, і ў іх быў час на тое, каб спакойна пагаманіць упершыню за паўстагодзьдзя. Абое бачылі сябе такімі, якімі яны былі: старымі, якіх высочвае сьмерць, яны не захавалі нічога агульнага, калі не лічыць памяці пра мінулае, што належала ўжо ня ім, а двум маладым людзям, якія маглі быць іхнымі ўнукамі. Яна падумала, што Флярэнтына Арыса

нарэшце зразумее ўсю бязглуздасьць ягонай мары і гэтым выкупіць сваю недаравальную дзёрзкасьць.

Яна абыходзіла рыфы цяжкіх паўзаў альбо нежаданых тэмаў з дапамогай трывіяльных пытаньняў пра рачныя параходы. Гучала дзіўна, што ён, уладальнік параходнай кампаніі, толькі аднойчы пусьціўся ў вандроўку – шмат гадоў таму, калі яшчэ ня меў ніякіх адносінаў да прадпрыемства. Яна ня ведала, што тады паклікала яго ў дарогу; ён прадаў бы душу, каб распавесьці ёй пра гэта. Яна таксама ня ведала ракі. Муж падзяляў яе непрыязнасьць да паветра Андаў, але ён меў свае прычыны: тут і небясьпека вышыні для сэрца, і рызыка падхапіць пнэўманію, і двудушнасьць людзей, і несправядлівасьці цэнтралізму. Так што яны ведалі паўсьвету, але ня ведалі ўласнай краіны. Падчас сустрэчы Флярэнтына Арысы з Фэрмінай Дасай у яе доме гідрасамалёт «Юнкерс» лётаў зь сялібы ў сялібу па басэйне ракі Магдалены, нібыта алюміневы конік, які браў на борт апрача двух сяброў экіпажу шэсьць пасажыраў і мяхі з поштай. Флярэнтына Арыса пракамэнтаваў: «Лятучая труна». Яна ўдзельнічала ў першым пералёце на паветраным шары і не перажыла ніякай трывогі, хоць цяпер наўрад ці магла паверыць, што сама асьмелілася на падобныя прыгоды. Яна ўдакладніла: «Усё зьмянілася». Але хацела сказаць, што зьмянілася яна, а ня спосабы вандраваньня.

Часам да яе далятала гудзеньне самалётаў. Яна бачыла, як яны праляталі вельмі нізка і выконвалі акрабатычныя манэўры да сотых угодкаў сьмерці Вызваліцеля. Адзін зь іх, чорны, як вялізны грыф-аўра, праляцеў, чапляючы дахі кварталу Ля-Манга і пакінуўшы кавалак крыла на галінах суседняга дрэва, і сам павіс на электрычных правадах. Але нават пасьля гэтага Фэрміна Даса не схацела ўсьвядоміць, што самалёты насамрэч існуюць. Яна нават ня езьдзіла разам зь іншымі цікаўнымі знаёмымі ў бухту Мансанільля, дзе гідрасамалёты садзіліся на ваду пасьля таго, як караблі аховы разганялі рыбацкія і шпацырныя лодкі, бо іх кожным разам зьбіралася ўсё больш. Нягледзячы на сталы ўзрост, менавіта яе абралі для прыёму Чарлза Ліндбэрга з букетам ружаў, калі ён выконваў палёт

добрай волі. Але яна так і не зразумела, як мог такі вялізны, сьветлавалосы і гожы мужчына ўзьняцца ў паветра на апараце, зробленым нібыта зь мятай бляшанкі, яго нават два мэханікі штурхалі з хваста, дапамагаючы яму ўзьлятаць. Думка пра тое, што ў такім маленькім самалёце можна ўзьняць у паветра восем чалавек, не зьмяшчалася ў галаве. Тым часам яна чула, што рачныя караблі выдатныя, бо на іх не адчуваецца гойданка, як на марскіх караблях, хоць чалавек мусіць перажыць іншую небясьпеку: рачнікі траплялі на мелі, на пасажыраў нападалі бандыты.

Флярэнтына Арыса патлумачыў ёй, што гэта міты даўніх часоў: на сучасных караблях ёсьць залі для танцаў, прасторныя і раскошныя, каюты, нібыта нумары ў гатэлі, з асобнай ваннай і электрычным вэнтылятарам, а з часоў грамадзянскай вайны не было ўзброеных нападаў. Ён таксама сказаў не без задавальненьня ад уласнае перамогі, што прагрэс вызначаны больш за ўсё свабодаю навігацыі, за якую ён выступаў, бо гэта стымулявала канкурэнцыю: замест адзінай кампаніі, як раней, іх было тры, вельмі актыўныя і грунтоўныя. Аднак хуткі прагрэс авіяцыі стаўся рэальнай небясьпекай для ўсіх. Яна спрабавала суцешыць яго, маўляў, караблі будуць існаваць заўсёды, бо ня так шмат знойдзецца вар'ятаў, гатовых лезьці ў апарат, які здаваўся ёй вяршыняй ненатуральнасьці. Нарэшце, Флярэнтына Арыса загаманіў пра прагрэс як у галіне транспарту, так і ў дастаўцы пошты, спрабуючы падвесьці яе да размовы пра ягоныя лісты. Але – безвынікова.

Пазьней, аднак, аказія прадставілася сама. Яны адышлі далёка ад тэмы, калі служанка пераўрвала гамонку, каб уручыць Фэрміне Дасе ліст, толькі што дастаўлены спэцыяльнай гарадзкой поштай, якая выкарыстоўвала такую самую сыстэму, як пры дастаўцы тэлеграмаў. Яна не магла знайсьці акуляры для чытаньня, як здаралася зь ёю амаль заўсёды. Флярэнтына Арыса сядзеў спакойна.

– Няма патрэбы, – сказаў ён, – ліст ад мяне.

Ён напісаў ліст напярэдадні ў стане жахлівай дэпрэсіі, бо ня мог пераадолець сораму за свой першы, так бы мовіць, візыт. У лісьце ён перапрашаў за дзёрзкую спробу наведаць яе, не

атрымаўшы папярэдняе згоды, і адмаўляўся ад далейшых намераў на гэты конт. Ён кінуў ліст у скрыню, не раздумваючы, а калі спахапіўся, ужо было позна. Аднак ён лічыў непатрэбнымі гэныя тлумачэньні і папрасіў Фэрміну Дасу аб ласцы – не чытаць ліст.

– Добра, – адказала яна. – Зрэшты, лісты належаць таму, хто іх напісаў, ці ня так?

Ён зрабіў цьвёрды крок насустрач.

– Сапраўды, – пацьвердзіў ён. – Таму іх вяртаюць перадусім пры скасаваньні адносінаў.

Яна прапусьціла міма вушэй ягоныя словы і аддала яму ліст, але дадала: «Шкада, што не прачытаю, астатнія лісты вельмі дапамаглі мне». Ён набраў у грудзі паветра, зьдзіўлены спантанным прызнаньнем, якое пераўзыходзіла ягоныя чаканьні, і ўздыхнуў: «Вы не ўяўляеце, якое шчасьце для мяне дазнацца пра гэта». Але яна зьмяніла тэму, і яму не ўдалося разгаварыць яе да канца вечара. Ён разьвітаўся пасьля шостай, калі пачалі запальваць сьвятло ў дамох. Ён адчуваў сябе больш упэўнена, але бязь лішніх ілюзіяў, бо не забываў, які зьменлівы быў характар і нечаканыя рэакцыі Фэрміны Дасы ў дваццаць гадоў, і не было прычынаў думаць, што яна перамянілася. Таму толькі асьмеліўся спытаць з шчырай пакорай, ці можна зазірнуць да яе іншым разам, і адказ зноў зьдзівіў яго.

– Прыходзьце калі заўгодна, – сказала яна. – Я амаль заўсёды адна.

Праз чатыры дні, у аўторак, ён прыйшоў без папярэдняга паведамленьня, і яна, не дачакаўшыся кубка гарбаты, пасьпешліва распавяла, як дапамаглі ёй ягоныя лісты. Ён удакладніў, што гэта не былі лісты ў прамым сэнсе слова, а асобныя старонкі кнігі, якую ён хацеў бы напісаць. Так, яна так і зразумела, і зьбіралася вярнуць пасланьні, калі толькі гэта ня будзе ўспрынята за абразу, каб ён распарадзіўся імі па прызначэньні. Яна працягнула гамонку, сказаўшы, як лісты падтрымалі яе падчас цяжкіх выпрабаваньняў, і прамовіла гэта з такім энтузіязмам, удзячнасьцю і нават яўнай сымпатыяй да

яго, што Флярэнтына Арыса адважыўся ўжо не на цьвёрды крок, а на сьмяротны піруэт.

– Раней мы былі на «ты», – сказаў ён.

«Раней» было забароненым словам. Яна адчула набліжэньне хімэрычнага анёла мінуўшчыны, і паспрабавала пазбавіцца ад насланьня. Аднак ён удакладніў думку: «Я хацеў сказаць, у нашых колішніх лістах». Яна засмуцілася, ёй давялося праявіць волю, каб ён не прыкмеціў. Але ён і без таго ўцяміў: трэба прасоўвацца больш асьцярожна, хоць інцыдэнт паказаў – яна была неўтаймаваная, як у маладосьці, але з гадамі навучылася зьмякчаць уражаньне пяшчотай.

– Я хацеў сказаць, – паправіўся ён зноўку, – што гэтыя лісты – зусім іншая рэч.

– Усё зьмянілася ў сьвеце, – адказала яна.

– Я не, – дадаў ён. – А вы?

Яна спыніла ўзьняты кубак гарбаты на паўдарозе і паглядзела на яго дакорліва, вачыма, якія ўжо перажылі жорсткасьць.

– Якая розьніца, – сказала яна ціха. – Мне семдзесят два гады.

Флярэнтына Арыса прыняў удар, які прыйшоўся ў самае сэрца. Ён хацеў знайсьці рэпліку з хуткасьцю і трапнасьцю стралы, але адчуў сябе пераможаным цяжарам узросту: ніколі ён не адчуваў сябе такім стомленым пасьля кароткай гаворкі, балела сэрца, і кожная хваля крыві аддавалася мэталічным рэзанансам у сасудах. Ён адчуў сябе старым, сумным і бессэнсоўным чалавекам, раптам так захацелася плакаць, што ён ня здолеў вымавіць ні слова. Яны дапілі другі кубак у цішы, поўнай прадчуваньняў. Першай загаварыла Фэрміна Даса: папрасіла служанку, каб тая прынесла тэчку зь лістамі. Ён ледзь не сказаў, што яна можа пакінуць іх сабе, бо ён пісаў кожны ліст пад капірку, але ўсё ж падумаў, што гэтая перасьцярога падасца ёй невысакароднай. Гаманіць больш не было пра што.

Перад тым, як разьвітацца, ён папрасіў пра сустрэчу ў

наступны аўторак і ўдакладніў, ці падыходзіць гэты самы час.

– Я ня бачу сэнсу ў гэтых візытах, – сказала яна.

– І я не надаю ім асаблівай значнасьці, – супакоіў ён.

Тым ня менш, ён прыйшоў да яе ў аўторак а пятай вечара, а потым і ва ўсе наступныя аўторкі, а на зыходзе другога месяца гэтыя візыты сталіся іхнаю завядзёнкай. Флярэнтына Арыса прыносіў ангельскае печыва да гарбаты, глазураваныя каштаны, грэцкія масьліны, маленькія прысмакі, здабытыя ім на трансатлянтычных караблях. Аднойчы ён прынёс копію партрэта Фэрміны Дасы і Ільдэбранды Санчас, які зрабіў бэльгійскі фатограф больш за паўстагодзьдзя таму, ён набыў яго за пятнаццаць сэнтава на распродажы паштовак каля Натарыяльнай Брамы. Фэрміна Даса ня здолела зразумець, як копія трапіла туды, і ён ня мог гэта зразумець іначай, як цуд каханьня. Аднойчы раніцой, зразаючы ружы ў садзе, Флярэнтына Арыса не ўтрымаўся ад спакусы і вырашыў наступным разам падараваць ёй ружу. З улікам мовы кветак, гэта была складаная справа ў дачыненьні да нядаўна аўдавелай жанчыны. Чырвоная ружа, сымбаль палымянае жарсьці, пры гэтых абставінах магла быць прынятая як абраза яе жалобы. Ружы жоўтыя, якія разумеліся на мудрагелістай мове як кветкі ўдачы, папросту азначалі рэўнасьць. Калісьці яму казалі пра чорныя ружы з Турцыі, гэта, мажліва, было б лепшым рашэньнем, але ён ня змог дастаць іх для акліматызацыі ў сваім садку. Пасьля доўгага роздуму ён рызыкнуў паднесьці ёй белую ружу, якая пасавала нявіннасьцю і нематой: ні пра што не гаварыла. У апошнюю хвілю, каб Фэрміна Даса не надала кветцы ў сваёй хітрадумнасьці пэўнага сэнсу, ён адрэзаў усе шыпы.

Белая ружа была ўспрынятая належным чынам, як падарунак без патаемнага сэнсу, і тым самым ён узбагаціў рытуал кожнага аўторка. Гэта настолькі ўвайшло ў звычай, што калі ён прыходзіў зь белай ружай, кожнага разу ўжо была падрыхтаваная ваза з вадою ў цэнтры століка, за якім пілі гарбату. Пры шараговым візыце, ставячы ружу, ён нібыта выпадкова сказаў:

– У наш час прыносілі ня ружы, а камэліі.

– Вы маеце рацыю, – пацьвердзіла яна, – але за гэтым стаяла іншае, вы добра ведаеце.

Так было заўсёды: ён спрабаваў рабіць крок насустрач, а яна высьлізгвала. Але на гэты раз, нягледзячы на дакладны адказ, Флярэнтына Арыса здагадаўся, што трапіў у дзясятку, бо ёй прыйшлося адвярнуцца, каб ён не заўважыў чырвані, якая заліла яе шчокі. Гарачая юнацкая чырвань, якая нахлынула нахабна і выключна з уласнае волі, выклікаўшы ў яе незадаволенасьць сабой. Флярэнтына Арыса засьцерагаўся пераходзіць да больш далікатных тэмаў, але ягоная ветлівасьць была такой відавочнай, што яна яўна перайграла, і гэта абурыла яе. Той аўторак выдаўся няўдалым. Яна ледзь не папрасіла яго спыніць візыты назаўсёды, але думка пра спрэчкі, якія бываюць паміж жаніхом і нявестай, былі ў іхным узросьце і становішчы так абсурдныя, што яна толькі нэрвова засьмяялася і доўга не магла спыніцца. У наступны аўторак, калі Флярэнтына Арыса ставіў кветку ў вазу, яна пільна перагледзела свае пачуцьці і радасна ўпэўнілася: зь мінулага тыдня не засталося ні сьледу горычы!

Неўзабаве візыты набылі даволі двухсэнсоўны характар сямейных сустрэчаў, бо час ад часу сын Фэрміны, доктар Урбіна Даса, і ягоная жонка зьяўляліся нібыта выпадкова і заставаліся гуляць у карты. Флярэнтына Арыса гуляць ня ўмеў, але Фэрміна Даса навучыла яго за адзін візыт, і яны накіравалі Ўрбіна Дасу пісьмовы выклік на наступны аўторак. Турніры былі прыемныя ўсім і ўвайшлі ў звычай гэтак сама хутка, як і ягоныя візыты. Яны вызначылі нормы ўнёскаў кожнага ўдзельніка. Доктар Урбіна Даса і ягоная жонка, якая выдатна выпякала, прыносілі арыгінальныя, шораз новыя торты. Флярэнтына Арыса працягваў частаваць далікатэсамі, якія знаходзіў на борце эўрапейскіх караблёў, а Фэрміна Даса заўсёды прыдумвала новы сюрпрыз. Турніры праводзіліся ў трэці аўторак штомесяц, яны не рабілі грашовых ставак, але ад таго, хто прайграваў, патрабаваўся спэцыяльны ўнёсак на наступную партыю.

Доктар Урбіна Даса цалкам адпавядаў свайму грамадзкаму

вобразу: быў ня надта разумным, нягеглым, пакутаваў ад раптоўных узрушэньняў, ці то падзея радасная, ці то якая-кольвек непрыемнасьць, бяз дай прычыны чырванеў, што змушала задумацца пра яго душэўнае здароўе. Аднак ён быў добрым чалавекам, ягоная дабрыня відавочна прыкмячалася зь першага погляду, хоць Флярэнтына Арыса якраз не хацеў бы, каб пра яго самога гаварылі як пра добрага чалавека. Доктарава жонка, насупраць, адрозьнівалася хітрым норавам і вельмі дарэчнай іскаркай плебэйства, што надавала яе элегантнасьці вельмі чалавечнае адценьне. Нельга было пажадаць лепшае пары для гульні ў карты, і неспатольная прага да каханьня Флярэнтына Арысы спатольвалася ілюзіяй прыналежнасьці да сям'і.

Аднойчы ўначы, калі яны выходзілі з дому Фэрміны Дасы, доктар запрасіў яго на абед: «Заўтра а палове на першую ў Грамадзкім клюбе». У Флярэнтына было адчуваньне, нібыта яму падалі вытанчаную страву, якую прапаноўвалася запіць атручаным віном: у клюбе дзейнічалі забароны на ўваход з розных прычынаў, адно з важкіх правілаў, у прыватнасьці, абвяшчала, што ўваход забаронены незаконнанароджаным. Дзядзька Леон XII у гэтым сэнсе меў некаторы раздражняльны вопыт, дый сам Флярэнтына Арыса перажыў аднойчы абразу: яму ўказалі на дзьверы, калі ён ужо сядзеў за сталом, запрошаны адным з заснавальнікаў клюбу. Флярэнтына Арыса рабіў таму чалавеку неацэнныя паслугі, зьвязаныя з рачным гандлем, і чалавек не знайшоў лепшага выйсьця, як адвесьці яго на абед у іншае месца.

– Мы, хто стварае рэглямэнт, больш за іншых абавязаныя выконваць ягоныя патрабаваньні, – сказаў ён.

Аднак з доктарам Урбіна Дасам Флярэнтына Арыса рызыкнуў прыйсьці і быў прыняты з падкрэсьленай ветлівасьцю, хоць яму і не прапанавалі расьпісацца ў залатой кнізе ганаровых гасьцей. Абед быў нядоўгім, прысутнічалі яны ўдвух, і ўсё прайшло ў мінорным тоне. Страх, які непакоіў Флярэнтына Арысу з папярэдняга вечара ў сувязі з гэтай сустрэчай, разьвеяўся ад выпітага на апэрытыў кубка белага віна. Доктар Урбіна Даса хацеў пагаманіць зь ім пра маці. Флярэнтына

Арыса здагадаўся, што яна распавяла сыну пра яго. Да таго ж нахлусіла ў ягоную карысьць. Сказала, што сябравала зь ім з маленства, што яны гулялі разам з тае пары, як яна прыехала з Сан-Хуан-дэ-ля-Сіенагі, што менавіта ён прышчапіў ёй густ да чытаньня. За гэта яна захоўвала да яго даўнюю ўдзячнасьць. І яшчэ сказала сыну, што часьцяком, выходзячы са школы, бавіла час з Трансытай Арысай, якая тварыла вышываныя цуды ў галянтарэйнай краме, бо была выдатнай майстрыхай, і што ня бачыла Флярэнтына Арысу так часта, як хацела б, не па ўласнай волі, а толькі таму, што іх разьдзяліла само жыцьцё.

Перад тым, як дайсьці да галоўнага, дзеля чаго ладзілася сустрэча, доктар Урбіна Даса падзяліўся роздумам пра старасьць. Ён лічыў, што прагрэс у сьвеце прасоўваўся б шпарчэй, калі б не старыя: «Чалавецтва, як пяхота, рушыць з хуткасьцю самых павольных». Ён прадбачыў, што сьвет будзе больш чалавечым і цывілізаваным, калі пагадзіцца на будоўлю селішчаў для сталых людзей у гарадох-спадарожніках, дзе яны маглі б жыць па-свойму, пазьбягаючы сораму, пакутаў і жахлівай самоты на старасьці гадоў. Але пакуль грамадзтва не дайшло да падобнай ступені міласэрнасьці, адзінае рашэньне – гэта інтэрнаты, дзе старыя суцяшалі б адно аднаго, жывучы са сваімі густамі і агідамі, крыўдамі і сумам, вольныя ад натуральнае розьніцы з наступнымі пакаленьнямі. Ён сказаў: «Старыя сярод старых былі б менш старымі». Так доктар Урбіна Даса хацеў падзякаваць Флярэнтына Арысу за тое, што ён складаў добрую кампанію маці, пазбаўляючы яе ад удовінай самоты, і маліў яго, каб ён працягваў наведваць яе на карысьць і дзеля зручнасьці сям'і і не зьвяртаў увагі на яе старэчы настрой і нязносны характар. Флярэнтына Арыса ўздыхнуў з палёгкай. «Будзьце спакойны, – адказаў ён. – Я на чатыры гады старэйшы за яе, і гэтая розьніца ўзьнікла ня зараз, а існавала нават у тую пару, калі вас яшчэ не было на сьвеце». Затым ён паддаўся спакусе і адвёў душу іранічным выпадам.

– У тым грамадзтве, пра якое вы казалі, – завяршыў ён, – вам давялося б рабіць шпацыры на могілкі штодня з кветкамі ёй і мне.

Дагэтуль доктар Урбіна Даса не ўсьведамляў бязглуздасьці

ўласных сацыяльных праектаў. Цяпер жа ён, апраўдваючыся, трапіў у цясьніну малазразумелых тлумачэньняў, у якіх заблытаўся ўшчэнт. Аднак Флярэнтына Арыса дапамог яму выбрацца зь няёмкага становішча. Ён выпраменьваў радасьць, бо ведаў, што рана ці позна мусіць сустрэцца з доктарам, каб выканаць непазьбежнае патрабаваньне этыкету: фармальна прасіць рукі ягонай матулі. Абед абнадзейваў тым, што паказаў, як лёгка будзе прынятая незвычайная просьба. Калі б ён загадзя заручыўся згодаю Фэрміны Дасы, не было б больш зручнага выпадку. Між іншым, пасьля такой размовы за гістарычным абедам фармальная просьба магла быць нават залішняй.

Флярэнтына Арыса заўсёды ўздымаўся і спускаўся па лесьвіцы з асаблівай засьцярогай нават маладым, бо лічыў, што старасьць пачынаецца зь першага, няхай нават бяскрыўднага падзеньня, а сьмерць прыходзіць з другім. Самай небясьпечнай здавалася яму лесьвіца ягонай канторы, стромая і вузкая, і задоўга да таго, як ён засьпеў сябе на тым, што мусіць рабіць дадатковыя высілкі, каб ня шоргаць нагамі, ён уздымаўся, гледзячы, куды ступаць, і трымаўся за парэнчы з двух бакоў. Часьцяком яму прапаноўвалі перарабіць лесьвіцу, зрабіць яе менш небясьпечнай, але рашэньне кожнага разу адкладалася на наступны месяц, бо згода на рамонт для яго была роўнай прызнаньню ўласнай старасьці.

Ішлі гады, ён пераадольваў лесьвіцу ўсё марудней, але не таму, што рабіў гэта з большай цяжкасьцю, а таму, як ён сам тлумачыў, што з часам рабіўся больш асьцярожным. Аднак увечары, калі вяртаўся з слыннага абеду, падчас якога выпіў келіх белага віна для апэтыту і паўшклянкі чырвонага за ежай, а галоўнае – пасьля пераможнай размовы з сынам Фэрміны Дасы, ён паспрабаваў дасягнуць адразу трэцяй прыступкі нібыта танцуючы, з такой юнацкай гарачнасьцю, што вывіхнуў левую шчыкалатку, упаў на сьпіну і цудам не разьбіўся насьмерць. Калі падаў, пасьпеў падумаць, што ён не памрэ, лёгіка жыцьця не дазволіць, каб два чалавекі, якія так доўга і моцна кахалі адну жанчыну, загінулі падобным чынам з розьніцай адзін год. І ён меў рацыю. Яго нагу закратавалі ў гіпсавы панцыр ад пяткі амаль да калена і абавязалі яго ляжаць

бяз руху. Але ў ім было больш жыцьця, чым да падзеньня. Калі доктар прадпісаў яму шэсьцьдзесят дзён поўнага спакою, ён ня мог пагадзіцца.

– Так нельга, доктар, – выгукнуў ён, – для мяне два месяцы – гэта як для вас дзесяць гадоў.

Некалькі разоў Флярэнтына Арыса спрабаваў устаць, падымаючы нагу – нагу статуі – дзьвюма рукамі, і заўсёды адступаў перад рэальнасьцю. Але калі ўрэшце пачаў хадзіць, адчуваючы боль у шчыкалатцы і ў пабітай сьпіне, ахвотна паверыў, што выпадак быў знакам лёсу, узнагародай за шматгадовую ўпартасьць.

Горшым днём стаўся першы панядзелак. Боль адступіў, доктараў прагноз абнадзейваў, але ён ня мог прыняць фатальную відавочнасьць: упершыню за чатыры месяцы ў прызначаны аўторак ён не пабачыць Фэрміну Дасу. Аднак пасьля мірнай сіесты скарыўся перад рэчаіснасьцю і напісаў ёй ліст з прабачэньнямі. Напісаў яго ад рукі, на духмянай паперы і атрамантам, які сьвяціўся ў цемры, у допісе ён без згрызотаў сумленьня драматычна перабольшыў нешчасьлівасьць выпадку, жадаючы выклікаць яе шкадобу. Яна адказала праз два дні, усхвалявана, ветліва, але без адзінага лішняга слова, як падчас іх вялікага каханьня. Ён схапіў мажлівасьць зь лёту і зноў напісаў. Калі яна адказала другі раз, ён вырашыў прасунуцца далей шыфраваных размоваў па аўторках і загадаў устанавіць тэлефон каля ягонага ложка на той падставе, што яму трэба штодня сачыць за справамі прадпрыемства. Ён папрасіў тэлефаністку цэнтральнага камутатара злучыць яго з трохзначным нумарам, які яна, зразумела, тут жа запомніла зь першага званка. Голас прыглушанага тэмбру, напружаны ад таямніцы адлегласьці, любы голас адказаў. Яна таксама пазнала ягоны голас, але разьвіталася пасьля трох агульнапрынятых фразаў вітаньня. Флярэнтына Арысу засмуціла яе абыякавасьць: яны зноў вярнуліся туды, адкуль пачыналі.

Аднак прайшло яшчэ два дні, і Флярэнтына Арыса атрымаў ад Фэрміны Дасы ліст, у якім яна маліла яго больш не званіць. Матывы прыводзіліся важкія. У горадзе было так мала

тэлефонаў, што сувязь праз тэлефаністку, якая ведала ўсіх абанэнтаў, абарочваліся шырокай галоснасьцю: усе былі навідавоку. Нават калі абанэнт выходзіў з дому, усё роўна тэлефаністка яго знаходзіла, дзе б ён ні быў. Да таго ж яна была ў курсе ўсіх размоваў, ведала таямніцы асабістага жыцьця людзей, драмы, якія як сьлед ахоўваліся, і нярэдка раптам улазіла ў дыялёг, каб выказаць уласны пункт погляду альбо супакоіць тых, хто занадта распальваўся. Зь іншага боку, у тым годзе заснавалі вячэрнюю газэту «Справядлівасьць», адзінай мэтай якой было ўдарыць па шляхетных сем'ях, указваючы імёны бязь літасьці: уладальнік газэты помсьціў за тое, што ягоныя дзеці не былі дапушчаныя ў Грамадзкі клюб. Нягледзячы на чысьціню свайго жыцьця, Фэрміна Даса больш чым калі засьцерагалася размоваў, таілася нават перад блізкімі сяброўкамі. Такім чынам, яны абралі ліставаньне. Карэспандэнцыя ў той ці іншы бок сталася такой частай і працінальнай, што ён забыўся пра нагу, пра прысуд пасьцельнага рэжыму, пра ўсё – і цалкам аддаўся эпісталярнаму жанру за партатыўным столікам, якімі карысталіся для харчаваньня пацыентаў.

Яны нарэшце перайшлі на «ты», абменьваліся камэнтарамі пра жыцьцё, як у лістох маладосьці, але Флярэнтына Арыса праявіў пасьпешлівасьць, надрапаў шпількай яе імя на пялёстках камэліі і паслаў яе разам зь лістом. Праз два дні ён быў вернуты безь якіх-кольвек тлумачэньняў. Фэрміна Даса не магла інакш, гэта занадта нагадвала ягоныя дзіцячыя забаўкі з мэлянхалічнымі вершамі ў Эвангельскім сквэрыку, з тайнікамі па дарозе ў школу, з урокамі вышываньня пад мігдалавымі дрэвамі. Не бяз болю ў душы яна паставіла яго на месца нібыта выпадковым пытаньнем сярод іншых трывіяльных рэплік: «Чаму ты ўпарцісься і ўсё гаворыш пра тое, чаго ўжо няма?» Пазьней яна назвала бясплённай упартасьць, зь якой ён намагаўся супрацьставіць сябе натуральнай старасьці. На яе погляд, адсюль выцякалі ягоная шпаркасьць, няўмераная прыхільнасьць да ўспамінаў пра мінулае. Яна не магла ўцяміць, як чалавек, здатны да разважаньняў і высноваў, якія так дапамаглі ёй перанесьці ўдовіну самоту, блукаў, як немаўля, ня ў стане ўжыць іх у жыцьці ўласным. Ролі памяняліся. Тады яна зрабіла спробу ўзьняць яму настрой з дапамогай

шматабяцальнай фразы: «Няхай час сабе ідзе, а мы пабачым, што ён прынясе». Ён у недальнабачнай сьпешцы ня здолеў расшыфраваць фразу, бо ня быў такім добрым вучнем, як яна. Прымусовая нерухомасьць, усё большая ўпэўненасьць у хуткаплыннасьці часу, шалёнае жаданьне бачыць яе, – усё даказвала, што страх, перажыты пры падзеньні, быў больш абгрунтаваны і трагічны, чым яму здавалася. Упершыню ён пачаў думаць сур'ёзна пра рэальнасьць сьмерці.

Леона Касіяні дапамагала яму прымаць ванну і празь дзень мяняць піжаму, ставіла клізмы, падавала гаршчок, клала арніковыя кампрэсы на сьпіну, пакрытую язвамі ад удару, масіравала яго на параду лекара, каб пазбавіць ад ускладненьняў, зьвязаных зь нерухомасьцю. Па суботах і нядзелях яе замяняла Амэрыка Вікуньня, якая ў сьнежні таго году мусіла атрымаць дыплём настаўніцы. Ён абяцаў, што накіруе яе на вышэйшыя курсы ў Алабаму за кошт параходнай кампаніі, часткова дзеля таго, каб сунуць кляп у глотку ўласнаму сумленьню, але, перадусім, каб ня чуць яе папрокаў, якія яна ня ведала, як выразіць, і адтэрмінаваць уласныя тлумачэньні, безь якіх, ён адчуваў, не абыдзецца. Ён не ўяўляў, як яна пакутавала ў інтэрнаце бяссоннымі начамі, у выходныя дні безь яго, у жыцьці безь яго, бо ведаць ня ведаў, як яна яго кахала. Са школы паведамілі афіцыйным лістом, што зь першага месца ў пасьпяховасьці яна дакацілася да апошняга і была на мяжы правалу выпускных іспытаў. Але ён ня выканаў апякунскага абавязку, не напісаў пра гэта бацькам Амэрыкі Вікуньні: замінала пачуцьцё вінаватасьці, якога ён ня здолеў утаймаваць; ён і ёй нічога не сказаў, маючы падставы баяцца, што яна назаве сапраўдную прычыну сваёй паразы. Падсьвядома ён пачаў адкладваць рашэньні праблемаў са спадзевам на тое, што іх вырашыць сьмерць.

Ня толькі жанчыны, якія займаліся ім, зьдзіўляліся таму, як ён перамяніўся. Зьдзіўляўся і сам Флярэнтына Арыса. Усяго дзесяць гадоў таму ён узяў служанку пад параднай лесьвіцай дому, узяў як стаяла, і, нават не распрануўшы яе, хутчэй за філіпінскага пеўня пакінуў яе з пузам. Прыйшлося падараваць ёй цалкам абстаўлены дом, і яна паклялася, што аўтарам яе сораму быў нейкі нядзельны жаніх, які ні разу не пацалаваў яе,

і бацька з роднымі дзядзькамі служанкі, здаровыя мачэтэра* , што працавалі на сафры**, прымусілі небараку ажаніцца. Не, ня верылася, што гэта быў той самы чалавек, якога цяпер абмацвалі і пераварочвалі з боку на бок дзьве жанчыны, якія зусім нядаўна змушалі яго дрыжаць ад любові. Яны мылі яго з галавы да ног, выціралі ручнікамі з эгіпецкае бавоўны і рабілі яму агульны масаж цела, але ў яго гэта не выклікала ніякага хваляваньня. Кожная зь іх тлумачыла страту ім жыцьцёвага апэтыту па-свойму. Леона Касіяні думала, што гэта была прэлюдыя сьмерці. Амэрыка Вікуньня лічыла яго становішча зьявай, якую ёй ня дадзена разгадаць. Адзін ён ведаў праўду, і праўда мела ўласнае імя. Адно было так ці інакш няслушна: больш пакутавалі яны, калі прыслужвалі яму, чымся ён, прымаючы іхныя клопаты.

Трох аўторкаў хапіла Фэрміне Дасе, каб зразумець, як ён яе хапае візытаў Флярэнтына Арысы. Яна бавіла час з зборшчык найбліжэйшымі сяброўкамі вельмі добра, усё лепш цукровага таго, як аддалялася ад звычаяў нябожчыка мужа. Люкрэсія дэль Рэаль дэль Абіспа зьезьділа ў Панаму праверыцца зубрычны вушнога болю, які ніяк не адступаў, і вярнулася праз месяц у значна лепшым стане, але чула яна горш, чымся перад вандроўкай, і тое з дапамогаю слухаўкі, якую прыкладвала да вуха. Фэрміна Даса звыклася да канфузаў, зьвязаных з гэтым, хутчэй за іншых сябровак, і гэта так стымулявала Люкрэсію, што амаль не было дня, калі б яна не зьяўлялася ў доме. Але Фэрміна Даса нікім ня здолела замяніць Флярэнтына Арысу і спакой, які прыносілі вечары зь ім.

Мачэтэра – цукровага трысьнягу, Сафра – уборка цукровага трысьнягу.

Памяць пра мінулае ня вызваляла ад будучыні, як ён быў схільны думаць. Затое ўзмацняла заўсёдную ўпэўненасьць Фэрміны Дасы ў тым, што і пякельныя пакуты ў дваццаць гадоў былі чым заўгодна, няхай самымі высакароднымі і гожымі, толькі не каханьнем. Насуперак сваёй жорсткай шчырасьці, яна ня мела намеру выказаць яму гэта ні поштай, ні асабіста. Ёй не хапала сьмеласьці давесьці Флярэнтына, як фальшыва гучалі сантымэнты ў ягоных лістох у параўнаньні з чарадзейным суцяшэньнем, якое прыносіў ягоны эпісталярны роздум, і як ён шкодзіў сабе гэтай лірычнай лухтой, маніякальна настойваючы на вяртаньні да мінулага. Не, не было радка ў ягоных даўніх

лістох, не было ніводнага моманту ў яе мізэрным юнацтве, якія змусілі б яе адчуваць тое, што яна адчула цяпер: вечар кожнага аўторка быў такім доўгім безь яго, так пакутліва самотным безь яго.

У адным з парываў навядзеньня парадку ў доме яна сплавіла на стайню радыёлу, падараваную мужам на першыя альбо другія ўгодкі іхнага шлюбу, і якую яны думалі падараваць музэю, бо гэта была першая радыёла, што зьявілася ў горадзе. У змроку жалобы яна вырашыла не карыстацца радыёлай: удава зь яе прозьвішчам не магла нават у адзіноце слухаць музыку, якая б яна ні была, не апаганіўшы памяці нябожчыка. Але пасьля трэцяга аўторка разлукі з Флярэнтына Арысам яна загадала прынесьці радыёлу ў залю, і не для таго, каб атрымаць асалоду ад сэнтымэнтальных сьпеваў, што перадавала радыё Рыёбамба, як раней, а каб ажывіць мёртвы час, які амаль не цягнуўся, сьлязьлівымі радыёнавэлямі з Сант'яга-дэ-Кубы. Гэта было ўдалым рашэньнем, бо калі яна нарадзіла дачку, пачала губляць цягу да чытаньня, што муж старанна прышчапіў ёй з часоў вясельнай вандроўкі, а ад прагрэсуючай стомленасьці зроку яна наагул перастала чытаць, часам месяцамі ня ведала, дзе паклала акуляры.

Фэрміна Даса так звыклася да радыёнавэляў з Сант'яга-дэ-Кубы, што чакала штодзённыя перадачы зь нецярплівасьцю. Час ад часу яна слухала навіны, каб ведаць, што робіцца ў сьвеце, і калі зрэдчас яна заставалася ў доме адна, яна лавіла далёкія мэрэнгесы* з Санта-Дамінга і плэнасы** з Пуэрта-Рыка. Аднойчы ўвечары на нейкай незнаёмай радыёстанцыі, якая раптам загучала так моцна і ясна, нібыта перадавала з суседняга дому, яна пачула жахлівую навіну: пара вельмі сталага ўзросту, якая паўтарала мядовы месяц там жа, дзе праводзіла яго сорак гадоў таму, была забітая лодачнікам, які веславаў падчас марской прагулкі; забойства было зьдзейсьнена ўдарамі вясла, і мэтаю быў рабунак – лодачнік забраў у забітых усю гатоўку, што яны мелі – чатырнаццаць даляраў. Жахлівае ўражаньне ўзмацнілася, калі Люкрэсія дэль Рэаль распавяла гэты выпадак цалкам па публікацыі ў мясцовай газэце. Паліцыя высьветліла, што забітыя вяслом старыя – ёй было семдзесят восем гадоў, а яму – восемдзесят

чатыры, – былі насамрэч патаемнымі палюбоўнікамі, яны бавілі адпачынак разам сорак гадоў запар, хоць кожны зь іх жыў у стабільным і шчасьлівым шлюбе і меў вялікую сям'ю. Фэрміна Даса ніколі ня плакала, слухаючы радыёнавэлі, але ад гэтага аповеду ледзь стрымала сьлёзы, якія падступілі да горла. У наступным лісьце Флярэнтына Арыса даслаў выразку з газэты, што ўтрымлівала навіну, без камэнтару.

Але гэта былі не апошнія сьлёзы, якія Фэрміна Даса мусіла стрымаць. Яшчэ ня скончылася шасьцідзесяцідзённае пасьцельнае зьняволеньне Флярэнтына, як газэта «Справядлівасьць» апублікавала на ўсю шырыню першай паласы і з фатаздымкамі дзеячоў асобу артыкул пра Плянас і песьня, якая суправаджаюць сюжэты, папулярныя сьпевы. Маруся Пляс – таемнымі палюбоўнікамі, яны бавілі меркаваную любоўную сувязь Хувэналя Ўрбіна і Люкрэсіі дэль Рэаль дэль Абіспа. Газэта спэкулявала на падрабязнасьцях іх сувязі, частаце і характары сустрэчаў, прыгадвала і іншыя доктаравы забаўкі, – садамію з нэграмі на ўласным цукровым заводзе. Аповед, надрукаваны буйным шрыфтам крывавага колеру, раскаціўся катастрафічнай маланкай у пратрухлым асяродку мясцовай арыстакратыі. Аднак у ім не было ніводнага праўдзівага радка: Хувэналь Урбіна і Люкрэсія дэль Рэаль сябравалі з халасьцяцкай пары і працягвалі сяброўства пасьля, але ніколі не былі палюбоўнікамі. У цэлым жа ствараласяўражаньне, што публікацыя толькі міжволі зачапіла імя доктара Хувэналя Ўрбіна, чыя памяць шанавалася аднадушна, а мела іншую мэту: нашкодзіць мужу Люкрэсіі дэль Рэаль, абранаму прэзыдэнтам Грамадзкага клюбу на мінулым тыдні. Скандал замялі за некалькі гадзінаў, але Люкрэсія дэль Рэаль больш не наведвала Фэрміну Дасу, і тая ўспрыняла гэта як прызнаньне вінаватасьці.

Неўзабаве, аднак, сталася ясна, што Фэрміна Даса таксама не была застрахаваная ад падобнай рызыкі. «Справядлівасьць» зьдзекавалася зь яе з слабога флянгу: па лініі справаў ейнага бацькі. Калі бацька ў сілу невядомых абставінаў быў вымушаны зьехаць у выгнаньне, Фэрміна Даса дазналася пра эпізод яго цёмнай камэрцыі са словаў Галы Плясыдыі. Пазьней, калі доктар Урбіна пацьвердзіў пасьля сустрэчы з губэрнатарам, што саромны факт меў месца, яна засталася пры сваёй думцы: бацька стаўся ахвярай подласьці. Рэч была ў тым, што два

ўрадавыя агенты прыйшлі ў дом каля Эвангельскага сквэрыку з ордэрам на ператрус, агледзелі памяшканьні ад столі да падлогі, але не знайшлі таго, што шукалі, і ўрэшце загадалі адчыніць шафу зь люстэркам у былой спальні Фэрміны Дасы. Гала Плясыдыя была ў доме адна і, ня маючы мажлівасьці папярэдзіць сям'ю, адмовілася адчыніць шафу з прычыны, што ў яе, маўляў, няма ключоў. Тады адзін з агентаў разьбіў люстэрка рэвальвэрам і паміж люстэркам і драўлянай панэллю дзьверцаў выявілі прастору, набітую фальшывымі купюрамі ў сто даляраў. Так завяршыўся ланцуг сьлядоў, якія вялі да Лярэнса Дасы – апошняга зьвяна разгалінаванай міжнароднай апэрацыі. Гэта было махлярства майстэрскае, бо махляры захавалі вадзяныя знакі банкаўскае паперы: яны часткова сьцерлі фарбу на купюрах у адзін даляр хімічным спосабам, блізкім да чарадзейства, і дадрукавалі толькі нулі, ператварыўшы іх у сотні. Лярэнса Даса даказваў, што шафа, набытая ня так даўно, мусібыць, зьявілася ў доме ўжо са схаванымі купюрамі, але паліцыя здолела абвергнуць ягоныя сьцьверджаньні. Апрача яго самога, ніхто ня мог хаваць фальшывы скарб за люстэркам. Доктар Урбіна, калі дамовіўся з губэрнатарам, што накіруе цесьця на радзіму, каб не дапусьціць скандалу, распавёў жонцы толькі гэта. Аднак у газэце напісалі шмат болей.

Артыкул распавёў пра тое, што падчас адной са шматлікіх войнаў мінулага стагодзьдзя Лярэнса Даса быў пасярэднікам паміж лібэральным урадам Ахілеса Пары і невядомым польскага паходжаньня, якога звалі Юзаф К. Каржанеўскі. Ён затрымаўся ў горадзе на некалькі месяцаў з экіпажам гандлёвага карабля «Сэнт-Антуан», які быў пад французскім сьцягам, спрабуючы завяршыць цёмную зьдзелку са зброяй. Каржанеўскі, пазьней стаўшы знакамітым у сьвеце пад імем Джозэф Конрад, невядома як усталяваў кантакт зь Лярэнса Дасам, і той набыў у яго партыю зброі за кошт ураду, карыстаючыся паўнамоцтвамі, якія законна аформілі прыёмна-здатачнымі дакумэнтамі і аплацілі высакапробным золатам. У далейшым, адпаведна вэрсіі газэты, Лярэнса Даса абвясьціў, што зброя зьнікла ў выніку малаверагоднага нападу, а пасьля прадаў партыю за падвойную цану кансэрватарам, якія вялі вайну супраць ураду.

«Справядлівасьць» таксама апавядала, што калі генэрал Рафаэль Рэес заснаваў ваенна-марскі флёт, Лярэнса Даса набыў зусім танна цэлы транспарт ботаў – ангельская армія распрадавала лішкі – і толькі гэтай апэрацыяй падвоіў свой скарб за шэсьць месяцаў. Паводле артыкулу, калі груз прыбыў у порт, Лярэнса Даса адмовіўся яго прымаць, бо ўсе боты былі на правую нагу, але калі мытня распрадавала тавар на аўкцыёне ў адпаведнасьці зь дзейным заканадаўствам, у яго не знайшлося канкурэнтаў, і ён выкупіў груз за сымбалічную суму – сто пэса. У той самы час ягоны суўдзельнік набыў боты на левую нагу, якія паступілі ў порт Рыёача, і таксама амаль задарам. Калі ўсё было прыведзена да ладу, Лярэнса Даса выкарыстаў сваяцтва зь сям'ёю Ўрбіна дэ ля Калье і прадаў іх новаму Ваеннаму флёту зь дзьвюма тысячамі адсоткаў прыбытку.

Інфармацыя «Справядлівасьці» завяршалася тлумачэньнем, што Лярэнса Даса пакінуў Сан-Хуан-дэ-ля-Сіенагу напрыканцы мінулага стагодзьдзя ня ў пошуках лепшага асяродку для сваёй дачкі, як ён любіў паўтараць. Ён гэта зрабіў таму, што папаўся на прыбытковай справе зьмешваньня імпартнага тытуню з драблёнай паперай, якая вялася так хітра, што нават заўзятыя курцы не заўважылі падману. Таксама выявілі ягоныя сувязі з падпольным міжнародным прадпрыемствам, чыя найбольш плённая дзейнасьць напрыканцы мінулага стагодзьдзя крылася ў ажыцьцяўленьні нелегальнага ўезду кітайцаў з Панамы. Так што падазроны гандаль муламі, які так нашкодзіў ягонай рэпутацыі, выявіўся адзінай сумленнай справай, якой ён калі займаўся.

Калі Флярэнтына Арыса падняўся з ложка, хоць сьпіна яшчэ гарэла полымем і ён упершыню вымушаны быў карыстацца кіем замест парасону, першы выхад з дому прывёў яго да Фэрміны Дасы. Яе цяжка было пазнаць праз больш відавочныя прыкметы старасьці і крыўды, якая пазбавіла яе прагі да жыцьця. Доктар Урбіна Даса, які двойчы наведаў Флярэнтына Арысу за час яго вымушанага арышту, распавёў яму пра прыгнечаны стан маці, выкліканы публікацыямі ў «Справядлівасьці». Першы артыкул справакаваў такі гнеў на мужа за ягонае вераломства, што яна адмовілася ад наведаньня сямейнага маўзалею штомесяц: яе выводзіла зь сябе, што ён ня

здольны чуць са сваёй труны тых абразьлівых словаў, якія яна хацела выкрыкнуць: інакш кажучы, Фэрміна Даса змагалася зь нябожчыкам. Не даравала і сяброўцы. Яна загадала перадаць Люкрэсіі дэль Рэаль адкрыта: няхай, маўляў, нарадуецца суцяшэньнем, што, прынамсі, мела аднаго мужчыну сярод мноства тых, хто прайшоў празь яе ложак. Што тычыцца публікацыі пра Лярэнса Дасу, невядома было, што больш параніла яе: ці то сам артыкул, ці то спозьненае выкрыцьцё праўды пра сапраўдны воблік бацькі. Але артыкул зьніштожыў яе. Валасы колеру чыстае сталі, якія надавалі высакароднасьць яе твару, здаваліся цяпер пажоўклымі валокнамі маісу, гожыя вочы пантэры ня мелі былога бляску, нават калі яна гневалася. Фэрміна Даса вырашыла, што жыць ня мае сэнсу, і гэта было бачна ў кожным яе жэсьце. Яна здаўна адмовілася ад паленьня ў ваннай, але цяпер узнавіла дурную звычку публічна і зь нястрымнай ненажэрнасьцю. Напачатку сама рабіла самакруткі, як заўжды ёй падабалася. Затым паліла самыя звычайныя цыгарэты, якія можна было набыць у крамах, бо не хапала ўжо ні часу, ні цярплівасьці вазіцца з тытунём і папяроснай паперай. Ня будучы Флярэнтына Арысам, любы чалавек запытаў бы сябе, што можа прынесьці будучыня такому, як ён, старому, кульгаваму, з параненай сьпінай, і жанчыне, якая не хацела ўжо іншага шчасьця, акрамя сьмерці. Аднак Флярэнтына Арыса думаў інакш. Ён ратаваў агеньчык надзеі сярод руінаў бедзтва, бо яму здавалася, што няшчасьце ўзвышала Фэрміну Дасу, гнеў упрыгожваў яе, злосьць на ўвесь сьвет вяртала ёй неўтаймаваны характар, якім ён быў у дваццаць гадоў.

Яна мела прычыны дзякаваць Флярэнтына Арысу, бо ў сувязі зь мярзотнымі артыкуламі ён накіраваў у «Справядлівасьць» гнеўны ліст пра этычную адказнасьць прэсы і павагу да гонару і годнасьці ўсялякага чалавека. Ліст ня быў надрукаваны, але аўтар перадаў копію ў «Камэрцыйную газэту», найстарэйшую і найсур'ёзьнейшую на Карыбскім узьбярэжжы, і тая надрукавала ліст на першай паласе. Ён падпісаў ліст псэўданімам «Юпітэр», тэкст быў настолькі зграбным, колкім і поўным здаровага сэнсу, што яго нават прыпісвалі знакамітым пісьменьнікам правінцыі. Гэта быў самотны голас сярод акіяну, але разышоўся ён глыбока і шырока. Фэрміна Даса здагадалася, хто быў

аўтарам ліста, без усялякай падказкі, бо пазнала пэўныя думкі і нават цэлую фразу з разважаньняў Флярэнтына Арысы на маральную тэматыку. Так што яна прыняла яго з адноўленым пачуцьцём прыхільнасьці ў беспарадку яе закінутасьці.

У той самы час аднойчы ў суботу Амэрыка Вікуньня апынулася адна ў спальні на вуліцы Вэнтанас і чыста выпадкова знайшла ў шафцы, якая не зачынялася на ключ, машынапісныя копіі роздуму Флярэнтына Арысы і адказы Фэрміны Дасы, напісаныя ад рукі.

Доктар Урбіна Даса ўзрадаваўся ўзнаўленьню візытаў, якія так натхнялі маці. Насупраць, ягоная сястра Афэлія вярнулася першым гандлёвым караблём зь Нью-Арлеану, які прыбыў з грузам садавіны, як толькі дазналася, што Фэрміна Даса падтрымлівае старое сяброўства з чалавекам, чый маральны воблік быў небездакорнымі. Яе трывога дасягнула крытычнай мяжы зь першых дзён, калі яна шмат пра што здагадалася па ступені фамільярнасьці, па ўпэўненасьці, зь якой трымаўся Флярэнтына Арыса ў доме маці, заўважыла шэпт і спрэчкі па дробязях, нібыта паміж жаніхом і нявестай, на працягу ўсяго візыту, то бок да глыбокае ночы. Тое, што для доктара Ўрбіна Дасы было здаровым сваяцтвам душаў двух самотных людзей на схіле гадоў, для яе выглядала грахоўнай формай патаемнага сужыхарства. Такой была заўсёды Афэлія Ўрбіна, больш, чым да маці, падобная да доньні Блянкі, бабулі па бацькоўскай лініі, нібыта яна была яе дачкой. Зграбная і ганарлівая, як бабуля, яна жыла ва ўладзе прымхаў, была няздольная ўявіць сабе цнатлівага сяброўства між мужчынам і жанчынай ні ў пяць гадоў, ні тым больш у восемдзесят. У ваяўнічай спрэчцы з братам яна сказала, што для поўнага суцяшэньня маці толькі і не хапае, каб Флярэнтына Арыса забраўся ў ложак удавы. Доктару Ўрбіна Дасу не ставала мужнасьці, каб супрацьстаяць сястры, але ягоная жонка ўмяшалася, спакойна заступіўшыся за каханьне, якому пакорныя ўсе ўзросты. Афэлія страціла цярплівасьць.

– Каханьне абсурднае нават у нашым узросьце, – крыкнула яна, – але ў іхным узросьце – гэта сьвінства.

Яна так разьюшана патрабавала выгнаць Флярэнтына Арысу з

дому, што гэта дайшло да вушэй Фэрміны Дасы. Яна паклікала Афэлію ў спальню, дзе звычайна вяла размовы, якіх служанкі ня мусілі чуць, і папрасіла паўтарыць яе абвінавачаньне. Афэлія паўтарыла, не падсалоджваючы, яна была ўпэўненая, што Флярэнтына Арыса, чыя слава дэгенэрата агульнавядомая, перасьледаваў двухсэнсоўныя мэты гэтай сувязьзю, больш шкоднай для добрага імя сям'і, чымся ўсе махлярскія выхадкі Лярэнса Дасы і ўсе наіўныя прыгоды Хувэналя Ўрбіна. Фэрміна Даса выслухала яе моўчкі, нават не міргнуўшы, але калі дачка скончыла гаварыць, яна ўжо была іншай жанчынай, якая вярнулася да жыцьця.

– Адно мне балюча, што няма сілаў адлупцаваць цябе па заслугах за дзёрзкасьць і абразьлівую падазронасьць, – сказала яна. – Але ты зараз пойдзеш з гэтага дому і, клянуся касьцямі сваёй маці, не пераступіш парог пакуль я жывая.

Не было сілы, здольнай пераканаць яе ў іншым. Афэлія перабралася ў дом брата і адтуль пасылала ўсялякія мольбы праз высокапастаўленых эмісараў. Але марна. Нават пасярэдніцтва сына і ўмяшальніцтва сяброваk нічога не далі. Нявестцы, да якой Фэрміна Даса заўсёды ставілася паблажліва, раптам выдала шчырасьць трапнымі словамі лепшых яе часоў: «У мінулым стагодзьдзі мне абасралі жыцьцё з гэтым бедным чалавекам, бо мы былі занадта маладыя, а цяпер вы хочаце ўсё паўтарыць, бо мы занадта старыя». Яна запаліла цыгарэту ад папярэдняй і выліла ўсю атруту, якая разьядала душу.

– Ды пайшлі яны ў сраку, – сказала Фэрміна Даса. – Калі мы, удовы, маем хоць якуюсьці перавагу, яна ў тым, што ўжо няма каму намі камандаваць.

Ніхто нічога ня здолеў зрабіць. Калі ўрэшце Афэлія ўпэўнілася, што нічога ня можа зрабіць, яна вярнулася ў Нью-Арлеан. Толькі таго і дабілася, што маці разьвіталася зь ёю, а Фэрміна Даса пагадзілася на гэта пасьля сьлёзных просьбаў, але не дазволіла ёй прайсьці ў дом: яна паклялася касьцямі маці, а ў тыя змрочныя дні для яе толькі яны заставаліся чыстымі.

Падчас аднаго зь першых візытаў, кажучы пра караблі, Флярэнтына Арыса зрабіў Фэрміне Дасе фармальныя запросіны

на вандроўку па рацэ. Яшчэ адзін дзень цягніком, і яны дабраліся б да сталіцы рэспублікі, якая называлася імі, як і бальшынёй карэнных карыбцаў іхнага пакаленьня, імем, якое горад насіў у мінулым стагодзьдзі: Санта-Фэ* . Але яна яшчэ захоўвала антыпатыі, перанятыя ад мужа, і не хацела бачыць сьцюдзёны і змрочны горад, дзе жанчыны выходзілі на вуліцу хіба што дзеля таго, каб наведаць імшу а пятай. Жанчыны ня мелі права ўваходзіць у кавярні альбо ў дзяржаўныя ўстановы. Таксама, як гаварылі, у горадзе часьцяком узьнікалі жахлівыя заторы на вуліцах ад пахавальных працэсіяў. Там ішоў дробны нудны дождж з тае пары, як гішпанцы падкавалі першага мясцовага мула, і дождж быў пакутлівым, горшым, чым у Парыжы. Зь іншага боку, Фэрміна Даса адчувала моцную цягу да ракі, хацела бачыць, як кайманы грэюцца пад сонцам на вялізных пясчаных адхонах берагу, прачнуцца ўначы ад жаночага плачу лямантынаў. Але сама думка пра такую вандроўку ў яе гады, да таго ж, з улікам яе ўдовінага стану, была нерэальнай.

Флярэнтына Арыса паўтарыў запросіны пазьней, калі Фэрміна Даса ўжо разважыла працягваць жыцьцё бяз мужа, і тая думка падалася ёй усё ж мажлівай. Пасьля разладу з дачкой, засмучаная абразамі ў бок бацькі, двудушнай лісьлівасьцю Люкрэсіі дэль Рэаль, якую столькі гадоў лічыла сваёй найлепшай сяброўкай, яна адчула сябе лішняй ва ўласным доме. Аднойчы ўвечары яна піла свой унівэрсальны настой, глядзела на вялізную лужыну ў двары, дзе ніколі больш ня будзе расьці дрэва яе няшчасьця, і раптоўна сказала яму:

– Я больш за ўсё хацела б пакінуць гэты дом, пайсьці проста наперад і ніколі не вяртацца.

– Чаму б не на караблі? – рызыкнуў Флярэнтына Арыса.

Фэрміна Даса зірнула на яго задумліва.

– Што ж, цалкам мажліва, – адказала яна.

За імгненьне да гэтага яна і ня думала ні пра што падобнае, але варта было ёй усьвядоміць рэальнасьць прапановы, каб вырашыць: сказана – зроблена. Сын і нявестка сустрэлі яе

рашучасьць з захапленьнем. Флярэнтына Арыса пасьпяшаўся патлумачыць, што Фэрміна Даса будзе ганаровай госьцяй на адным зь ягоных караблёў са спэцыяльнай каютай, дзе яна будзе як дома, з выключным сэрвісам, і капітан асабіста зоймецца яе бясьпекай і дабрабытам. Ён прынёс мапы маршрутаў, каб падтрымаць яе энтузіязм, прапанаваў паштоўкі зь неверагоднымі захадамі сонца, паэмы, што апявалі першародны рай на рацэ Магдалене, якія напісалі слынныя вандроўнікі альбо тыя, хто стаўся слынным дзякуючы выдатнай паэзіі. Яна праглядала іх, калі была ў добрым настроі.

– Ня трэба падманваць мяне, як немаўля, – казала яна. – Калі я паеду, гэта таму, што я так вырашыла, а не празь цікавасьць да краявідаў.

Калі сын прапанаваў, каб з маці паехала ягоная жонка, Фэрміна Даса адрэзала, як па-жывому: «Я ўжо не маленькая, і пільнаваць мяне ня трэба». Яна сама рыхтавала для вандроўкі ўсё да драбязы і адчувала вялізную палёгку ад думкі, што пажыве восем дзён на караблі, пакуль ён пойдзе ўверх па рацэ, і яшчэ пяць дзён, якія трэба на адваротны шлях. Узяла з сабою толькі самае неабходнае: паўтузіна строяў з бавоўны, рэчы туалету і гігіены, пару чаравікаў для пасадкі і высадкі, хатнія тапачкі на дарогу і больш нічога: гэта была мара яе жыцьця.

У студзені 1824 году камадор Ёган Бэрнард Эльбэрс, піянэр рачной навігацыі, узьняў сьцяг над першым параходам, які накіраваўся па рацэ Магдалене, – гэта была прымітыўная пасудзінка на сорак конскіх сілаў, якая мела назву «Вернасьць». Больш за стагодзьдзе пазьней, сёмага ліпеня а шостай вечара, доктар Урбіна Даса і ягоная жонка праводзілі Фэрміну Дасу да сходняў карабля, на якім яна ўпершыню ад'яжджала ў вандроўку па рацэ, і гэта быў першы карабель, збудаваны на мясцовай вэрфі, Флярэнтына Арыса назваў яго ў гонар слыннага папярэдніка «Новая Вернасьць». Фэрміна Даса не магла паверыць, што шматзначная для іх назва была насамрэч гістарычнай выпадковасьцю, а ня новай праявай хранічнага рамантызму Флярэнтына Арысы.

У кожным разе, у адрозьненьне ад іншых рачных караблёў, старажытных і сучасных, «Новая Вернасьць» мела дадатковую

каюту, даволі прасторную і камфартабэльную, побач з жытлом капітана. Каюта складалася з гасьцёўні, у якой была бамбукавая мэбля вясёлага колеру, шлюбнай спальні, дэкараванай кітайскімі матывамі, ванны і душу, і вельмі ўтульнай крытай вэранды, аздобленай папарацьцю. З каюты адкрываўся краявід па хадзе і абодвух бартах карабля. Яна мела сыстэму бясшумнага ахалоджваньня паветра, якая аберагала вушы ад вонкавага грукату і стварала ў каюце вечную вясну. Гэтая каюта люкс, вядомая як прэзыдэнцкая, бо ў ёй да таго часу ўжо вандравалі тры прэзыдэнты рэспублікі, не перасьледавала камэрцыйных мэтаў і рэзэрвавалася для прадстаўнікоў найвышэйшай улады і асаблівых гасьцей. Флярэнтына Арыса задумаў гэтую навінку для падняцьця ўласнага іміджу, як толькі быў прызначаны прэзыдэнтам параходнай кампаніі, аднак з патаемнай упэўненасьцю, што рана ці позна каюта станецца шчасьлівым прытулкам для ягонай вясельнае вандроўкі з Фэрмінай Дасай.

Настаў дзень, і Фэрміна Даса насамрэч прыняла прэзыдэнцкую каюту на правах гаспадарыні. Капітан карабля прыняў на борт Урбіна Дасу з жонкай і Флярэнтына Арысу як ганаровых гасьцей – з шампанскім і вэнджаным ласосем. Яго звалі Дыега Самарытана, ён быў у белай форме, бездакорнай фуражцы з эмблемай кампаніі, вышытай золатам, і, як большасьць капітанаў рачнога флёту, ён вылучаўся ўмеранай паўнатой, уладным голасам і манерамі флярэнтыйскага кардынала.

А сёмай вечара далі першы сыгнал да адплыцьця, такі гучны, што ён выклікаў у Фэрміны востры боль левага вуха. Мінулай ноччу яна бачыла сны, поўныя дурных знакаў, якіх яна не адважылася расшыфраваць. Раніцой яна загадала адвезьці яе да пантэону духоўнае сэмінарыі, які знаходзіўся блізка, і які называлі могілкамі Ля-Мангі, і замірылася зь нябожчыкам мужам; стоячы перад крыптай, яна выліла ў маналёгу слушныя папрокі, якія сядзелі ў горле. Затым распавяла яму падрабязнасьці вандроўкі і разьвіталася зь ім ненадоўга. Яна больш нікому не сказала пра вандроўку, бо амаль заўсёды рабіла так, калі накіроўвалася ў Эўропу, каб пазьбегнуць пакутлівых разьвітаньняў. Нягледзячы на тое, што Фэрміна Даса шмат езьдзіла, яна была ўсхваляваная так, нібыта

выпраўлялася ў дарогу ўпершыню, прычым з сыходам дня неспакой павялічваўся. Калі яна паднялася на борт, то адчула такі прыступ самоты і суму, што ёй захацелася пабыць адной і выплакацца.

Прагучаў апошні сыгнал. Доктар Урбіна Даса з жонкай разьвіталіся з Фэрмінай Дасай без драматызму, і Флярэнтына Арыса праводзіў іх да сходняў. Доктар Урбіна Даса хацеў прапусьціць яго сьледам за жонкай і толькі тут здагадаўся, што Флярэнтына Арыса таксама ўдзельнічае ў вандроўцы. Доктар ня здолеў схаваць занепакоенасьці.

– Але ж мы так не дамаўляліся, – сказаў ён зьбянтэжана.

Флярэнтына Арыса шматзначна паказаў яму ключ ад сваёй шараговай каюты, якая месьцілася на палубе агульнай клясы. Але гэта не падалося доктару Ўрбіна Дасу дастатковым доказам цнатлівасьці ягоных намераў. Ён паглядзеў на жонку поглядам чалавека, які перажывае крушэньне карабля ў адкрытым моры, ён шукаў хоць якісьці пункт апоры, але сутыкнуўся зь яе ледзянымі вачыма. Жонка сказала яму ціха-ціха, суворым голасам: «Ты таксама?». Так, ён таксама, як і ягоная сястра Афэлія, думаў, што ў вельмі сталым узросьце каханьне мяжуе зь непрыстойнасьцю. Аднак доктар праявіў своечасовую рэакцыю і на разьвітаньне паціснуў руку Флярэнтына Арысу, хутчэй, з замірэньнем, чым з удзячнасьцю.

Флярэнтына Арыса бачыў, што яны ўжо на беразе, з вэранды салёну. Як ён чакаў і жадаў, доктар Урбіна Даса з жонкай павярнуліся для разьвітальнага пагляду, адчыняючы дзьверцы аўто, і ён махнуў ім рукой на разьвітаньне. Яны адказалі яму тым самым. Ён заставаўся на вэрандзе, пакуль аўто ня зьнікла ў пыле грузавога двара, і затым накіраваўся ў каюту, каб пераапрануцца ў больш адпаведную вопратку для першай вячэры на борце ў прыватнай гасьцёўні капітана.

Капітан Дыега Самарытана прыправіў знамянальную ноч цікавымі аповедамі пра ягоныя сорак гадоў на рацэ, але Фэрміне Дасе давялося прыкласьці немалыя намаганьні, каб выглядаць вясёлай. Нягледзячы на тое, што апошні сыгнал да адплыцьця быў дадзены а восьмай вечара, калі тыя, хто

суправаджаў пасажыраў, сышлі на бераг і трап быў падняты, карабель ня зрушыўся зь месца, пакуль капітан не павячэраў і ня ўзьняўся на мосьцік, адкуль кіраваў манэўрам. Фэрміна Даса і Флярэнтына Арыса засталіся на вэрандзе агульнага салёну сярод шумных пасажыраў, якія спрабавалі пазнаць месцы гораду паводле агнёў, што паступова аддаляліся. Потым карабель пакінуў бухту, увайшоў у нябачнае рэчышча ракі, мінаючы мелі і агні рыбацкіх лодак, што гойдаліся на хвалях, і задыхаў на поўныя грудзі на вольным паветры вялізнай ракі Магдалены. Тады духавы аркестар грымнуў моднай народнай песьняй, і пасьля выбуху радасьці пасажыраў пачаліся скокі.

Фэрміна Даса сказала, што хацела б застацца адна. За вечар яна ня вымавіла ні слова. Флярэнтына Арыса дазволіў ёй заглыбіцца ў роздум і перарваў яго толькі дзеля таго, каб разьвітацца каля ўваходу ў яе каюту. Але яна не жадала спаць, ёй проста было холадна, і яна прапанавала пасядзець крыху на глядзельнай вэрандзе каюты і палюбавацца ракой. Флярэнтына Арыса выкаціў на вэранду два крэслы, плеценыя з лазы, пагасіў сьвятло, накінуў ёй на плечы плед з воўны і прысеў побач. Яна скруціла цыгарку з тытуню, які ён ёй падараваў, прычым зрабіла гэта дужа спрытна, запаліла з расьцяжкай і моўчкі, нібыта дым быў надта гарачы, затым скруціла яшчэ дзьве і паліла іх безь перапынку. Флярэнтына Арыса паступова выпіў два тэрмасы горкае кавы.

Агні гораду зьніклі за гарызонтам. Зь цёмнай вэранды пяшчотная ды ціхая рака, а таксама пашы ўздоўж берагоў пад поўняй ператварыліся ў даліну, якая сьвяцілася сама па сабе. Час ад часу паказваўся саламяны будан каля вогнішча, там прадавалі дровы для параходных катлоў. Флярэнтына Арыса захоўваў цьмяныя ўспаміны пра вандроўку ў маладыя гады, і вобразы ракі ажывалі ў ім асьляпляльнымі парывамі памяці, нібыта гэта было толькі ўчора. Ён сёе-тое прыгадваў услых, спрабуючы ўплываць на настрой Фэрміны Дасы. Яна адстаронена паліла, нібыта жыла ў іншым вымярэньні. Флярэнтына Арыса адмовіўся ад агучваньня ўспамінаў і пакінуў Фэрміну Дасу сам-насам з сабой. Яна запальвала цыгарэты адну ад адной, пакуль такім чынам амаль не спустошыла скрыню. Музыка спынілася апоўначы, шум на

танцавальнай пляцоўцы сьціх, распаўся, перайшоў у паўсонны шэпт, і два сэрцы засталіся сам-насам у цемры вэранды, адлічваючы ўдары ў такт уздыхам карабельнай машыны.

Праз пэўны час Флярэнтына Арыса зірнуў на Фэрміну Дасу і празь зьзяньне ракі ўбачыў яе прывіднай, профілем падобнай да статуі, якая сама выпраменьвала ледзь заўважнае блакітнае сьвятло. Ён здагадаўся, што яна бязгучна плача. Але замест таго, каб вымавіць суцяшальныя словы альбо чакаць, пакуль яна выплача ўсе сьлёзы, паддаўся паніцы.

– Хочаш, каб я пайшоў? – спытаў ён.

– Калі б я гэтага хацела, я б не запрасіла цябе, – ціха адказала Фэрміна Даса.

Тады ён працягнуў у цемры сьцюдзёныя пальцы, пачаў шукаць навобмацак яе руку, знайшоў і зьнерухомеў у чаканьні. Абое былі досыць цьвярозыя і зразумелі імгненна, што рукі, на жаль, ня тыя, якія жылі ў іхным уяўленьні, а рукі старыя і кашчавыя. Аднак тут жа абое абудзіліся. Яна загаманіла пра нябожчыка мужа не ў мінулым, а ў цяперашнім часе, нібыта ён яшчэ жыў, і Флярэнтына Арыса тут жа ўсьвядоміў: для яе таксама настаў час спытаць сябе годна, велічна і зь нястрымнаю прагай жыцьця, што рабіць з каханьнем, якое засталося без гаспадара.

Фэрміна Даса кінула пагаслую самакрутку, каб не адпускаць ягонай рукі. Яна разгубілася, ня ў змозе нічога разумець. Нельга было ўявіць лепшага мужа, чымся нябожчык, але яна знаходзіла больш цяжкога, чым сьветлага ва ўспамінах аб пражытым: занадта было ўзаеманепаразуменьняў, бессэнсоўных сварак, незабытых крыўдаў. Раптам яна ўздыхнула: «Неверагодна, адкуль такое шчасьце цягам столькіх гадоў сярод незьлічоных сварак і калатнечы, чорт пабяры, і я ня ведаю, ці было гэта сапраўдным каханьнем, ці не». Ледзь яна аблегчыла сваю душу, як хтосьці пагасіў поўню. Карабель ішоў, нібыта робячы крок за крокам, ставячы сьпярша адну нагу, і толькі потым другую, як драпежнік, які высочвае ахвяру. Фэрміна Даса нібыта вярнулася з краіны жаданьняў.

– А зараз ідзі, – сказала яна.

Флярэнтына Арыса сьціснуў яе руку, нахіліўся, спрабуючы пацалаваць яе ў шчаку. Аднак яна адвяла яго пяшчотным хрыплаватым голасам:

– Ужо ня трэба – ад мяне патыхае старасьцю.

Яна чула, як ён выйшаў у цемры, як крокі аддаляліся па лесьвіцы – да наступнага дня. Запаліла яшчэ адну самакрутку, і пакуль яе паліла, ёй бачыўся доктар Хувэналь Урбіна ў бездакорным лёгкім строі, прафэсійна суворы, вельмі сымпатычны, афіцыйна закаханы, – ён махнуў ёй на разьвітаньне белым капелюшом зь іншага карабля мінулага. «Мужчыны – гэта вартыя жалю рабы прымхаў, – колісь сказаў ён. – Але калі жанчына вырашыла пераспаць з мужчынам, няма перашкодаў, якія яна ня можа пераадолець. Няма крэпасьці, якую яна ня возьме. Няма маральных установак, якія не зруйнуе дашчэнту. Адным словам, няма для яе Бога». Фэрміна Даса праседзела нерухома да золку, думаючы пра Флярэнтына Арысу не як пра нязьменнага вартаўніка Эвангельскага сквэрыку, бо ў памяці ён не запальваў ужо ні найменшага промня настальгіі, а як пра старога і кульгавага, але рэальнага чалавека, які заўсёды быў побач і якога яна здолела распазнаць. Пакуль карабель вёз яе, задыхаючыся, да ружовага золку, яна маліла Бога толькі пра адно: няхай бы Флярэнтына Арыса здолеў пачаць наступны дзень як трэба.

Ён здолеў. Фэрміна Даса загадала прыслузе не турбаваць яе, пакуль яна ня высьпіцца як сьлед, і калі прачнулася, на начным століку ўгледзела вазу са сьвежай белай ружай, яшчэ з кроплямі расы, а побач – ліст Флярэнтына Арысы, які меў столькі старонак, колькі ён пасьпеў напісаць з моманту іх расстаньня. Гэта быў спакойны ліст – ён толькі спрабаваў выказаць настрой, які ахапіў яго ўначы, – і лірычны, як папярэднія, і рытарычны, як усе ягоныя пасланьні, але ён грунтаваўся на рэчаіснасьці. Фэрміна Даса прачытала тэкст, саромеючыся за неўтаймоўны галёп свайго сэрца. Ліст завяршаўся просьбай перадаць праз слугу, калі яна будзе гатовая, бо капітан чакае іх на мастку, каб паказаць, як функцыянуе карабель.

Фэрміна Даса была гатовая аб адзінаццатай. Выходзячы з

ваннага пакою, яна пахла кветкавым мылам і апранула вельмі просты ўдовін строй з шэрай бавоўны. Адчуваючы, што цалкам узнавілася пасьля начных пакут, яна папрасіла слугу ў бездакорнай белай уніформе, які абслугоўваў асабіста капітана, прынесьці лёгкі сьняданак, і ні слова пра тое, каб па яе прыйшлі. Яна паднялася сама пад асьляпляльна чыстым небам і знайшла Флярэнтына Арысу, які гаманіў з капітанам на мастку. Ён выглядаў інакш, чымся зазвычай, ня толькі таму, што яна пазірала на яго іншымі вачыма, – ён і насамрэч перамяніўся. Замест заўсёднай хаўтурнай вопраткі ён надзеў вельмі зручныя белыя чаравікі, лёгкія штаны і кашулю з чыстай бавоўны з расшпіленым каўняром, кароткімі рукавамі і манаграмай на нагруднай кішэні. Апрача таго, ён насіў барэт белага колеру і мудрагелістую прыладу зь цёмнымі шкельцамі ад сонца паўзьверх спрадвечных акуляраў блізарукага чалавека. Вопратка была новая, напэўна, набытая спэцыяльна для вандроўкі, за выключэньнем старога бурага рэменя: Фэрміна Даса прыкмеціла яго зь першага погляду, нібыта муху ў талерцы поліўкі. Пабачыўшы Флярэнтына Арысу ў такой кідкай вопратцы, прычым, зразумела, апранутай дзеля яе, яна ня здолела стрымаць чырвань. Яна павітала яго сарамліва, і ён засаромеўся яшчэ больш, адчуўшы яе стан. Яны ўсьведамлялі, што паводзяць сябе, як жаніх зь нявестай, і гэта давяло іх да такога стану, што капітан Самарытана глядзеў на іх са шкадобай. Выйсьце са становішча ён знайшоў у тым, што на працягу дзьвюх гадзінаў тлумачыў, як карыстацца органамі кіраваньня і мэханізмамі карабля. Яны марудна плылі па бязьмежнай рацэ, якая залівала пустэльныя долы да гарызонту. Вада каля бухтаў была каламутнай, а на адкрытай рацэ плынь была маруднай і празрыстай, з мэталічным бляскам пад неміласэрным сонцам. У Фэрміны Дасы склалася ўражаньне, што яны праплываюць па дэльце зь пясчанымі астравамі.

– Гэта ўсё, што застаецца ад нашай ракі, – пацьвердзіў капітан.

І Флярэнтына Арыса быў зьдзіўлены пераменамі, і яшчэ больш зьдзівіўся на наступны дзень, калі плыць стала цяжэй. Ён зразумеў: рака Магдалена, адна з самых вялікіх рэк у сьвеце, засталася ўсяго толькі ілюзіяй, часткай ягонай памяці. Як тлумачыў ім капітан Самарытана, гэта барбарскае зьнішчэньне

лясоў пакончыла з ракой за пяцьдзясят гадоў. Карабельныя катлы зжэрлі непралазныя сэльвы і калясальныя дрэвы па берагах, якія прыгняталі Флярэнтына Арысу памерамі падчас першай вандроўкі. Фэрміна Даса не пабачыць жывёлаў, пра якія марыла: паляўнічыя, якія прадавалі шкуры ў Нью-Арлеан, перабілі кайманаў, якія некалі заміралі на доўгія гадзіны з разяўленымі пашчамі ля берагавых адхонаў, каб злавіць якога матыля; шумныя папугаі і шалёна крыклівыя малпы гінулі па меры таго, як высякаліся спрадвечныя гушчары; лямантыны зь вялікімі жаночымі грудзямі, якія кармілі малых і плакалі голасам самотнай жанчыны на водмелях, сталіся ахвярамі аматараў паляваньня.

Капітан Самарытана любіў лямантынаў амаль па-мацярынску, ён лічыў іх жанчынамі, якія пакутуюць празь неразьдзеленае каханьне. І верыў у легенду, паводле якой лямантыны былі адзінымі самкамі без самцоў у жывёльным сьвеце. Ён ніколі не дазваляў страляць з борта карабля, што звычайна рабілі паляўнічыя насуперак заканадаўчай забароне. Аднойчы паляўнічы з Паўночнай Караліны, які меў сапраўдную ліцэнзію, не паслухаўся яго і разьнёс галаву самцы лямантына, што ляжала на беразе зь дзіцем, адным трапным стрэлам з свайго «Спрынгфілда». Малая, ашалелая ад болю, лямантавала каля цела забітай маці. Капітан загадаў падняць сірату на борт, стаўся яе апекуном, а паляўнічага кінуў на пустэльным беразе каля рэшткаў лямантына. Шэсьць месяцаў правёў капітан за кратамі ў выніку дыпляматычнай ноты пратэсту і ледзь не пазбавіўся правоў навігацыі і званьня, але выйшаў з турмы з рашучасьцю рабіць надалей гэтак сама, як толькі гэта спатрэбіцца. Аднак эпізод увайшоў у гісторыю: малеча выросла і жыла шмат гадоў у заапарку для рэдкіх жывёлаў у Сан-Нікаляс-дэ-ляс-Баранкас і сталася апошнім лямантынам, якога бачылі на рацэ.

– Шораз, калі мой карабель праплывае ўздоўж гэтага адхону, – сказаў ён, – я малю Бога, каб той грынга* зноў захацеў павандраваць з намі. Навошта? Каб з задавальненьнем яшчэ раз пакінуць яго на беразе.

Нельга сказаць, каб Фэрміна Даса так ужо сымпатызавала

капітану, але ўсхваляваны волат так узрушыў яе сваім
аповедам, што з тае раніцы заняў прывілеяванае месца ў яе
сэрцы. Вандроўка толькі пачыналася, і было колькі часу
часу, каб сьцьвердзіцца ў думцы: яна не памыліласяў
Фэрміна Даса і Флярэнтына Арыса заставаліся на капітанскім
мастку да абеду, незадоўга да якога яны мінулі сялібу
Калямар, дзе да нядаўняй пары жыцьцё было спрадвечным
сьвятам, а цяпер там засталіся толькі порт у руінах ды
пустэльныя вуліцы. Адзінай жывой істотай, якую яны
заўважылі з карабля, была жанчына ў белым, якая махала
хусткай. Фэрміна Даса не зразумела, чаму яе ня хочуць
падабраць, але капітан патлумачыў, што гэта прывід тапеліцы,
уяўная дзяўчына падавала зманлівыя сыгналы, каб караблі
зьбіваліся з курсу і траплялі ў небясьпечныя віры ля
супрацьлеглага берагу. Карабель праходзіў так блізка, што
Фэрміна Даса добра разгледзела яе пад промнямі сонца, але ні
на хвілю не засумнявалася, што перад ёю сапраўды прывід,
хоць твар здаўся ёй знаёмым.

зьдзекліва
казаў
сэрцаў
ня
важна
амэрыканцаў
ангельцаў,
у Лацінскай
Амэрыцы.

Дзень быў доўгім, сьпякота зьнясільвала. Пасьля абеду Фэрміна
Даса вярнулася ў каюту, каб там правесьці абавязковую сіесту,
але не магла спаць ад болю ў вушах, які ўзмацняўся, калі
«Новая Вернасьць» абменьвалася вітальнымі гудкамі зь іншым
караблём кампаніі, зь якім мінулася за некалькі лігаў вышэй ад
паселішча Баранка-Віеха. Флярэнтына Арыса заснуў імгненна,
седзячы ў галоўным салёне, дзе бальшыня пасажыраў, якія ня
мелі месца ў каютах, спала, нібыта апоўначы. Яму сьнілася
Расальба, а дзея адбывалася якраз непадалёк ад таго месца, дзе
яна колісь узьнялася на борт. У сьне Расальба вандравала адна
ў старамоднай вопратцы мінулага стагодзьдзя, і менавіта яна, а
не немаўля, спала падчас сіесты ў лазовай клетцы, што вісела
пад стольлю. Сон Флярэнтына Арысы, таямнічы і цікавы,
пакінуў у ім асаблівы прысмак на цэлы дзень, пакуль ён гуляў у
даміно з капітанам і двума знаёмымі пасажырамі.

Сьпякота спала з захадам сонца, і карабель ажыў. Пасажыры
зьяўляліся, нібыта пасьля летаргічнага сну, умытыя,
пераапранутыя, і займалі салённыя крэслы, чакаючы на вячэру:
кухар абвесьціў яе а пятай вечара, пад воплескі і жарты ён

абыходзіў палубу з капэлянскім званочкам. Падчас ежы духавы аркестар граў народныя мэлёдыі, і вячэра ператварылася ў прэлюдыю да скокаў, якія завяршаліся апоўначы. Фэрміна Даса не захацела вячэраць праз боль у вушах і прысутнічала пры першай загрузцы дроваў для карабельных катлоў каля голае стромы, дзе не было нічога, акрамя нагрувашчаньня ствалоў ды старога, які кіраваў пагрузкай. Здавалася, нікога няма ў акрузе на адлегласьці безьлічы лігаў. Для Фэрміны Дасы пагрузка зацягнулася і выклікала нуду: на эўрапейскіх трансатлянтычных волатах падобнае немагчыма было б і ўявіць; сьпякота рабілася невыноснай і адчувалася нават на зачыненай вэрандзе з кандыцыянэрам. Але карабель паплыў, зноў падзьмуў сьвежы вецер сэльвы, і музыка ўжо здавалася весялейшай. У сялібе Сытыё-Нуэва гарэла сьвятло толькі ў адным акне, з партовай канторы не падалі ўмоўнага сыгналу пра наяўнасьць грузаў альбо пасажыраў, так што карабель праплыў без гудкоў. Увесь дзень Фэрміна Даса спрабавала здагадацца, да якіх сродкаў зьвернецца Флярэнтына Арыса, каб сустрэцца зь ёю, ня грукаючы ў дзьверы яе каюты, і дзесьці а восьмай вечара ўжо не магла падавіць жаданьня быць зь ім. Яна выйшла ў калідор са спадзевам сустрэць яго быццам бы выпадкова, і яе разьлік тут жа апраўдаўся: Флярэнтына Арыса сядзеў на лаве ў калідоры, маўклівы і сумны, як калісьці ў Эвангельскім сквэрыку, пытаючы сябе другую гадзіну запар, што рабіць, каб яе пабачыць. Яны выказалі зьдзіўленьне аднолькавымі жэстамі, абое разумеючы іх няшчырасьць. Яны прайшліся разам па палубе першае клясы, перапоўненай маладзёнамі, у асноўным студэнтамі, якія балявалі да апошняга, каб як сьлед адзначыць апошнія дні вакацыяў.

У бары Флярэнтына Арыса і Фэрміна Даса выпілі па бутэлечцы прахаладжальнага, седзячы за стойкай, як студэнты, і раптам яна ўбачыла сябе ў страшнай сытуацыі. Яна ўсклікнула: «Які жах!» Флярэнтына Арыса спытаў, чым выклікана падобнае ўзрушэньне.

– Я прыгадала тых бедных старых, – шапнула яна, – забітых ударамі вясла.

Абое пайшлі спаць, ледзь скончылася музыка, пасьля доўгай

гутаркі, якая вялася безь перашкодаў у цемры вэранды. Уначы ня выйшла поўня, неба схавалася за густымі аблокамі, недзе каля гарызонту выбухалі бліскавіцы бяз грому, яны асьвятлялі карабель на кароткія імгненьні. Флярэнтына Арыса скручваў ёй цыгаркі, але яна ня выпаліла і чатырох, пакутуючы ад болю, які часам зьнікаў, каб узмацніцца, калі карабель рыкаў пры сустрэчах зь іншым караблём альбо плыў уздоўж соннай сялібы ці сьцішаў хаду, зандуючы рачное дно. Флярэнтына Арыса распавёў Фэрміне Дасе, зь якою любоўю глядзеў на яе падчас Паэтычных гульняў, перад палётам на паветраным шары, калі яна каталася на ровары для акрабатаў, і як палка чакаў вялікіх сьвятаў, толькі б пабачыць яе. Яна таксама бачыла яго часьцяком, але ні разу ёй і да галавы не прыйшло, што ён зьяўляўся на людзях толькі дзеля яе. Аднак год назад, чытаючы ягоныя лісты, яна раптам спытала сябе, як здарылася, што ён ніколі ня ўдзельнічаў у Паэтычных гульнях: безумоўна, ён бы перамог. Флярэнтына Арыса схітрыў: ён, маўляў, пісаў толькі для яе і ні для каго іншага. Тады яна пашукала ў цемры ягоную руку, якая не чакала сустрэчы, як мінулай ноччу яе, – цяпер яго засталі зьнянацку.

– Якімі дзіўнымі бываюць жанчыны, – ціха сказаў ён.

Яна засьмяялася грудным пяшчотным сьмехам і зноў падумала пра старых у лодцы. Так ёй было наканавана ад нараджэньня: той вобраз будзе перасьледаваць яе заўсёды. Фэрміна Даса, мабыць, пабляднела, але схавала гэта ў цемры вэранды, бо адчувала сябе добра і спакойна, як зрэдчас здаралася ў жыцьці, – яна была чыстая ад усялякай вінаватасьці. Так бы і прасядзела да золку моўчкі, трымаючы ягоную руку, што зьвільгатнела ад сьцюдзёнага поту, калі б ня боль у вушах. Скончылася музыка, і сьціхлі пасажыры агульнае клясы, якія нацягвалі гамакі ў салёне. Фэрміна Даса ўцяміла, што боль мацнейшы за жаданьне быць зь ім. І ведала: варта сказаць яму пра боль, і боль адступіць, але не сказала нічога, каб не трывожыць яго. Яна ўжо ведала яго, нібыта пражыла зь ім усё жыцьцё, і верыла, што ён здольны загадаць вярнуцца ў порт адплыцьця, калі б гэта магло суцішыць боль.

Флярэнтына Арыса прадбачыў, што ўначы ўсё складзецца

менавіта так, як склалася, вырашыў пайсьці да сябе. Ужо каля дзьвярэй каюты ён вырашыў разьвітацца пацалункам, але яна сама падставіла левую шчаку з такой какетлівасьцю, якой ён ня ведаў за ёю, нават калі яна была школьніцай. Тады ён пайшоў далей, і яна, трапечучы да глыбіні душы, прыняла ягоныя вусны, а затым паспрабавала схаваць хваляваньне за сьмехам, забытым ёю з шлюбнае начы.

– Божа мой, – выгукнула яна, – я вар'яцею на караблях!

Флярэнтына Арыса здрыгануўся: насамрэч, як яна папярэдзіла, адчуваўся горкі пах старасьці. Аднак пакуль ён прабіраўся да сваёй каюты па лябірынце сонных гамакоў, ён суцяшаў сябе думкай, што сам, напэўна, мае такі самы пах, ён жа старэйшы за яе на чатыры гады, і яна мусіла адчуць гэты ягоны пах з такім самым уражаньнем. Гэта быў пах чалавечага старэньня, які ён таксама адчуваў у сваіх старых палюбоўніц, і які яны адчувалі ад яго. Назарэцкая ўдава, якая нічога не замоўчвала ў жыцьці, сказала пра гэта даволі жорстка: «Сьмярдзім ужо, як грыфы». Абое цярпелі, бо былі квітымі ў спаборніцтве дурных пахаў. Насупраць, ён засьцерагаўся Амэрыкі Вікуньні, яна пахла пялюшкамі, узбуджала ў ім бацькоўскія пачуцьці, але яго непакоіла думка, што дзяўчыну калісьці адштурхне смурод старога распусьніка. Але ўсё ў мінулым. Галоўнае, што ўпершыню з таго дня, як цётка Эскалястыка пакінула малітоўнік у тэлеграфнай канторы, Флярэнтына Арыса не адчуў такога шчасьця, як гэтай ноччу на караблі, настолькі працінальнае было шчасьце, што яно выклікала страх. Пад раніцу Флярэнтына Арыса ўжо засынаў, калі на рэйдзе каля порту Самбрана карабельны бухгальтар пагрукаў у дзьверы і ўручыў тэрміновую тэлеграму. Яна была падпісаная Леонай Касіяні напярэдадні, і ўвесь яе жах месьціўся ў адным радку: «Амэрыка Вікуньня памерла ўчора. Матывы невядомыя». Аб адзінаццатай ён дазнаўся ад тае ж Леоны Касіяні падрабязнасьці шляхам тэлеграфнага дыялёгу, падчас якога Флярэнтына Арыса асабіста сядзеў за перадатчыкам упершыню за шмат гадоў, якія аддалялі яго ад службы. Амэрыка Вікуньня ўпала ў сьмяротную дэпрэсію з-за правалу на выпускных іспытах і выпіла цэлы флякон опіюму, скрадзены ёю ў школьным мэдпункце. Фляэнтына Арыса ў глыбіні душы адчуў,

што сьведчаньні былі няпоўнымі. Але не, Амэрыка Вікуньня не пакінула нават допісу, які б дазволіў вініць кагосьці ў яе самагубстве. Да гэтага часу, атрымаўшы зьвестку ад Леоны Касіяні, яе блізкія ўжо выехалі з Пуэрта-Падрэ. Пахаваньне адбудзецца сёньня а пятай вечара. Флярэнтына Арыса ўздыхнуў. Адзінае, што ён мог зрабіць, каб не памерці ад пачуцьцяў, што нахлынулі на яго, гэта адрынуць пакуты ўспамінаў. Так ён і зрабіў. Сьцёр яе вобраз назаўсёды, хоць да канца жыцьця яна часам раптам ажывала бяз дай прычыны, нібыта імгненны кінжальны боль ад старой раны.

Потым надышлі бясконцыя сьпякотныя дні. Рака зрабілася вузкай і каламутнай, замест гушчароў і дрэваў-волатаў, якія зьдзівілі Флярэнтына Арысу падчас першай вандроўкі, яны бачылі спаленыя долы, вартыя жалю рэшткі сэльвы, зжэртай катламі караблёў, руіны забытых Богам сялібаў, чые вуліцы заставаліся пад вадой нават у сэзоны самых жорсткіх засух. Уначы людзі прачыналіся не ад русалчыных сьпеваў лямантынаў, якія колісь ляжалі на адхонах, а ад мярзотнага смуроду трупаў, якія праплывалі ў бок мора. Ужо не было войнаў і халеры, але надзьмутыя целы плылі па рацэ, як і раней. Капітан стрымана шапнуў Флярэнтына Арысу: «Нам загадана даводзіць пасажырам, што гэта выпадковыя тапельцы». І ўжо не было нястрымнага базару папугаяў і вісклівай свары нябачных з карабля малпаў, якія ў былыя часы памнажалі паўдзённую сьпякоту сваім балаганам, – толькі злоснае маўчаньне ссохлай зямлі.

Было так мала месцаў, дзе прадавалі дровы, і яны знаходзіліся так далёка адно ад аднаго, што «Новая Вернасьць» засталася бяз паліва на чацьвёрты дзень шляху. Карабель стаяў на якары амаль тыдзень, пакуль матросы паглыбляліся ў спапялелыя багны далей ад берагу ў пошуках апошніх забытых ствалоў. Але іх не было: дрывасекі кінулі дзялянкі і ўцяклі ад драпежных уладальнікаў зямлі, ад нябачнай халеры, ад войнаў, якія ўтойваліся ўладамі за шырмай указаў, што толькі адцягвалі ўвагу. Тым часам пасажыры нудзіліся, ладзілі спаборніцтвы ў плаваньні, арганізоўвалі паляўнічыя экспэдыцыі і вярталіся з жывымі ігуанамі, а потым рэзалі іх, даставалі зь іх гронкі празрыстых і мяккіх яек, і нанава

зашывалі вялізнымі ігламі, а яйкі потым вялілі проста на борце. Вартыя жалю прастытуткі з блізкіх пасёлкаў ішлі за экспэдыцыямі, ставілі імправізаваныя намёты на беразе ракі, прыводзілі музыкаў і гандляроў гарэлкай, ладзілі гулянкі каля карабля, які міжволі спыніў хаду.

Задоўга да таго, як Флярэнтына Арыса стаўся прэзыдэнтам параходнай кампаніі, ён атрымліваў трывожныя паведамленьні пра стан ракі, але амаль не чытаў іх. Кампаньёнаў жа ён супакойваў: «Не хвалюйцеся, пакуль дровы скончацца, у нас будуць караблі на бэнзіне». Ён ніколі не пакутаваў ад гэтага, затуманены жарсным каханьнем да Фэрміны Дасы, і калі ўцяміў усю глыбіню праўды, ужо нічога не заставалася рабіць, хіба што прывезьці сюды новую раку. Уначы нават у лепшыя часы трэба было ставіць карабель на якар. І тады жыцьцё рабілася невыносным. Пасажыры, перадусім эўрапейцы, выходзілі з прапахлых гнільлю каютаў і бавілі ноч на палубе, усімі сродкамі адганяючы машкару ручнікамі, золак жа сустракалі зьнясіленымі, з апухлымі ад пакусаў тварамі. Ангельскі вандроўнік пачатку XIX стагодзьдзя пісаў пра камбінаваны маршрут – на лодцы, а потым на муле, – які доўжыўся пяцьдзясят дзён, што гэта «найгоршая і самая нязручная пілігрымка па пакутах, якую чалавек здольны сабе ўявіць». Гэта перастала быць праўдай за восемдзесят гадоў рачной навігацыі, а потым зноў ёй сталася, і ўжо назаўсёды, калі кайманы зьелі апошняга матылька, былі выбітыя лямантыны, вымерлі альбо ўцяклі кудысьці папугаі, малпы, а сялібы апусьцелі – калі прыйшоў канец усяму.

– Няма праблемаў, – сьмяяўся капітан, – пройдзе некалькі гадоў, і мы паедзем па сухім рэчышчы на шыкоўных аўто.

Фэрміна Даса і Флярэнтына Арыса ратаваліся ў пяшчотнай вясьне зачыненай вэранды, але калі ўзьнікла праблема з дровамі і кандыцыянэр пачаў даваць збоі, прэзыдэнцкая каюта ператварылася ў кавaварку. Фэрміна Даса вытрымлівала начныя стаянкі дзякуючы ветру, які праходзіў праз адчыненыя вокны, і адганяла камароў ручніком, бо помпа для распыленьня інсэктыцыду на нерухомым караблі не працавала. Вушы зноў балелі невыносна, але аднойчы раніцой яна

прачнулася і заўважыла, што боль раптам зьнік, як сьпеў цыкады, якую раструшчылі ботам. Да самае ночы яна не здагадвалася, што левым вухам зусім ня чуе, пакуль Флярэнтына Арыса ня сеў побач і ёй не прыйшлося павярнуць голаў, каб пачуць, што ён кажа. Яна нікому не распавяла пра гэта і ўспрыняла глухату як адзін зь непазьбежных дэфэктаў, выкліканых узростам.

Аднак затрымка карабля сталася для іх ратавальнай. Флярэнтына Арыса аднойчы прачытаў: «Каханьне робіцца больш велічным і высакародным у бядзе». Вільгаць прэзыдэнцкай каюты пагрузіла іх у іррэальную летаргію, у якой лягчэй было кахаць бязь лішніх пытаньняў і словаў. Яны перажылі неверагодна прыгожыя гадзіны ў мяккіх крэслах вэранды, трымаючы адно аднаго за рукі, і цалаваліся яны нясьпешліва, адчувалі асалоду ад пяшчотаў напоўніцу. У трэцюю ноч задушлівай сьпякоты яна чакала яго з бутэлькай анісавай гарэлкі, якую папівала калісьці ўпотайкі зь сяброўкамі стрыечнай сястры Ільдэбранды, а пазьней, пад шлюбам ужо, – з прыяцелькамі, якія незаўважна зьявіліся ў тым новым для яе сьвеце, што нібыта не належаў ёй, а быў проста часова запазычаны. Яна вырашыла крыху выпіць, заглушыць думкі, якія страшылі яе залішняй яснасьцю, але Флярэнтына Арыса падумаў, што яна п'е дзеля храбрасьці, каб наважыцца на апошні крок. Натхнёны ілюзіямі, ён адважыўся, намацаў пальцамі вялую шыю, грудзі ў панцыры з кітовага вуса ад гарсэту, кашчавыя клубы, сьцёгны старой аленіхі. Яна прыняла ягоныя пяшчоты спакойна, без здрыготы, толькі заплюшчыла вочы. Час ад часу яна марудна ўцягвала дым цыгарэты альбо адпівала анісаўку. Калі ўрэшце ягоная рука сьлізганула ніжэй, анісаўка перапоўніла яе сэрца.

– Калі ўжо дурэць, дык давай, – сказала яна, – але ўсё ж як дарослыя людзі.

Яна павяла яго ў спальню без фальшывага сораму, пры сьвятле стала распранацца. Флярэнтына Арыса лёг на ложак, разглядаючы столь, спрабуючы ўзяць сябе ў рукі, зноў ня ведаючы, што рабіць са скурай тыгрыцы, якую ён толькі што дабіў. Яна сказала: «Не падглядай». Ён спытаў: «Чаму?» – не

адрываючы вачэй ад столі.

– Таму што табе не спадабаецца відовішча, – адказала яна.

Потым усё ж павярнуў голаў, убачыў яе, аголеную да таліі, і ўпэўніўся: яна была менавіта такой, якой ён яе ўяўляў. Плечы ў зморшчынках, грудзі – вялыя, бледная скура аддавала жабіным холадам. Яна прыхавала грудзі блюзкай і пагасіла сьвятло. Тады і ён устаў і распрануўся ў цемры, шпурляючы ў яе прадметамі адзеньня, што здымаў зь сябе, і яна ўсё яму вяртала, ціхенька сьмеючыся.

Яны ляжалі доўга: ён адчуваў сябе аглушаным па меры таго, як да яго вярталася цьвярозасьць, яна была спакойна разьняволеная, але малілася Богу, каб не засьмяяцца нават у думках, што здаралася зь ёю часта пад узьдзеяньнем анісаўкі. Яны цягнулі час. Пагаманілі пра сябе, пра тое, наколькі па-рознаму склалася іхнае жыцьцё. Пра неверагодную выпадковасьць таго, што яны ляжалі, у чым маці іх нарадзіла, у цемры каюты карабля, што стаяў на якары, і думалі чорт ведае пра што, калі час быў падумаць пра сьмерць. Раней яна ніколі ня чула, каб у яго была жанчына, хоць адна, і гэта ў горадзе, дзе ўсё было вядома нават раней, чым адбывалася ў сапраўднасьці. Яна сказала пра гэта зьнянацку, і тут жа ён адказаў, не міргнуўшы вокам:

– Я захоўваў цнатлівасьць для цябе.

Яна б яму не паверыла, нават калі б гэта было чыстай праўдай: ягоныя любоўныя лісты цаніліся ёй не за сэнс, не за лоўкасьць спляценьня фразаў, а за моц асьляпляльнай шчырасьці. Аднак ёй падабалася сьмеласьць, зь якой ён гэта сьцьвердзіў. Са свайго боку, Флярэнтына Арыса раптам злавіў сябе на тым, што ніколі б не адважыўся спытаць, ці была ў яе патаемная сувязь па-за шлюбам. Зьдзівіць яго было немажліва, ён ведаў, што жанчыны і мужчыны аднолькавыя ў сваіх патаемных прыгодах: тыя ж хітрыкі, тое ж нечаканае натхненьне, тая ж здрада без згрызотаў сумленьня. Але ён зрабіў слушна, не задаўшы пытаньня. У даўнія часы, калі яе адносіны з касьцёлам былі ўжо даволі сапсаваныя, спаведнік раптоўна спытаў яе, ці здраджвала яна калі-небудзь мужу, і яна ўстала моўчкі,

пайшла, нават не разьвіталася, і больш ніколі не спавядалася перад тым духоўнікам. Стрыманасьць Флярэнтына Арысы нечакана была ўшанаваная: яна працягнула ў цемры руку, ласкава прайшлася па ягоным жываце, боку, амаль безвалосым лабку і шапнула: «У цябе скура, як у немаўляці». Потым яна зрабіла апошні крок: пацягнулася ніжэй, пашаравала там і, разьвітваючыся з ілюзіямі, знайшла тое, што шукала, без прыкметаў жыцьця.

– Ён мёртвы, – ціха сказаў Флярэнтына Арыса.

Гэта здаралася ў яго на самым пачатку з усімі і заўсёды, так што ён навучыўся суіснаваць з гэтай заганай: шораз праходзіў вучобу нанава, нібыта ўпершыню. Ён узяў руку Фэрміны Дасы і паклаў яе сабе на грудзі, яна адчула старое нястомнае сэрца, яго моц, пасьпешлівасьць і хаатычны юнацкі пульс. Ён сказаў: «Зашмат любові таксама шкодна, як і адсутнасьць любові». Але вымавіў гэта ня вельмі ўпэўнена: насамрэч ён перажываў сорам, злосьць на сябе самога і жадаў знайсьці прычыну, каб абвінаваціць яе ва ўласнай паразе. Яна гэта ведала, пачала ўзбуджаць безабароннае цела жартаўлівымі ласкамі – так пяшчотная котка атрымлівае асалоду ад уласнай жорсткасьці. Скончылася тым, што ён ня здолеў вытрываць пакутаў і сышоў у сваю каюту. Яна думала пра яго да золку, упэўненая, нарэшце, у сваім каханьні, па меры таго, як анісаўка вытыхалася лянотнымі хвалямі, яна з усё большай трывогай думала, што ён пакрыўджаны і больш ня вернецца ніколі.

Але ён вярнуўся на наступную раніцу нечакана, аб адзінаццатай, сьвежы і бадзёры, і тут жа распрануўся перад ёю, праявіўшы штосьці накшталт самахвальства. Яна, задаволеная, разглядала яго пры натуральным сьвятле дня і пабачыла менавіта тое, што ўяўляла ў цемры: пасярод пакою стаяў мужчына няпэўнага ўзросту, чыя смуглявая скура гладка пабліскавала, як раскрыты парасон, пазбаўленая валасоў, за выключэньнем рэдкага пушку пад пахамі і на лабку. Ён быў напагатове, і яна здагадалася, што ён агаліў зброю зусім не выпадкова, а насупраць, выставіў яе на паказ, нібыта вайсковы трафэй, дзеля сьмеласьці. Ён нават ня даў ёй часу зьняць начную кашулю, якую яна апранула, калі падзьмуў золкавы

брыз, і ягоная таропкасьць навічка змусіла яе дрыжэць ад шкадобы. Але яна не перашкодзіла яму, у такім становішчы ёй цяжка было адрозьніць шкадобу ад каханьня. Зрэшты, аднак, яна пачувалася пустою.

Упершыню за дваццаць зь лішнім гадоў Фэрміна Даса кахалася, і яна гадала, ахопленая цікаўнасьцю: як гэта будзе пасьля такога доўгага перапынку? Але ён ня даў ёй часу вызначыць, ці сапраўды хацела гэтага яе цела. Ён быў хуткім і сумным, і яна падумала: «Мы ўсё спляжылі». Аднак гэта была памылка: нягледзячы на расчараваньне, на ягонае раскаяньне за тое, што быў такі нялоўкі, і на яе шкадаваньне, выкліканае анісавым шаленствам, яны больш не расставаліся ні на імгненьне. Яны пакідалі каюту, толькі каб схадзіць на абед. Капітан Самарытана, які інстынктыўна пранікаў у любую таямніцу з тых, што завяліся на караблі, штораніцы пасылаў ім белую ружу, ладзіў сэранады з вальсамі іхнай маладосьці, загадаў гатаваць ім жартаўлівыя стравы з прыправамі, якія б падбадзёрвалі. Яны больш не спрабавалі кахацца, да таго моманту, пакуль натхненьне не прыйшло да іх зьнянацку, а ўвогуле ім хапала простага шчасьця быць разам.

І той дзень яны б правялі ў каюце, калі б не капітан, які абвясьціў у дасланым допісе, што яны прыбываюць у Ля-Дараду, то бок у канцавы порт, пасьля адзінаццаці дзён вандроўкі. Фэрміна Даса і Флярэнтына Арыса бачылі з каюты вялізны прыгорак і дамы пад цьмяным сонцам, і ім падалося зразумелым, чаму паселішча назвалі менавіта так, але назва падалася менш трапнай, калі яны адчулі сьпякоту, якая нібыта сапла ў паветры, як пара ў катлах, і ўбачылі расплаўлены асфальт вуліцаў. Апрача таго, карабель кінуў якар не каля схілу прыгорку, а на супрацьлеглым беразе, дзе знаходзілася апошняя чыгуначная станцыя ў кірунку на Санта-Фэ.

Як толькі пасажыры сышлі на бераг, яны пакінулі свой прытулак. Фэрміна Даса падыхала вольным паветрам беспакаранасьці ў пустым салёне, і потым абое назіралі з борту, як шумны натоўп разьбіраў валізкі, пакі і баулы проста каля вагонаў цягніка, які з борта здаваўся лялечным. Здавалася, што пасажыры прыбылі з Эўропы, асабліва

жанчыны, чые цёплыя футры і капелюшы мінулага стагодзьдзя выглядалі бязглузда ў пыле і сьпякоце. У некаторых валасы былі ўпрыгожаны кветкамі батату, якія тут жа вялі ад сьпякоты. Яны толькі што прыехалі з прыандыйскай раўніны пасьля доўгай язды цераз савану, поўную трызьненьняў, і яшчэ не пасьпелі пераапрануцца з улікам клімату Карыбскага басэйну.

Сярод базарнага шуму надта стары чалавек зь несуцешным выглядам даставаў куранятаў з кішэняў жабрацкага паліто. Ён зьявіўся нечакана, прабіўшы сабе шлях у натоўпе, і было відаць, што ягонае паліто колісь належала камусьці іншаму, больш высокаму і мажному. Ён зьняў капялюш, паставіў перад сабой на прычале на выпадак, калі хтосьці пажадае кінуць яму манэту, і працягваў даставаць з кішэняў пяшчотных і яшчэ шэрых куранятаў жменькамі – яны нібыта памнажаліся проста ў яго на руках. Неўзабаве прычал апынуўся пад дыванам зь мітусьлівых куранятаў – яны пішчэлі, бегалі пад нагамі таропкіх пасажыраў, якія трушчылі іх, не заўважаючы. Зачараваная выключным відовішчам, нібыта яго давалі ў яе гонар, бо яна адна глядзела яго, Фэрміна Даса прапусьціла момант, калі пачалася пасадка на карабель для адваротнага рэйсу. Сьвята для яе скончылася: сярод новых пасажыраў яна пазнала ў твар знаёмых і нават сяброў, якія да нядаўняй пары спачувалі ёй і наведвалі яе ў жалобе. Яна пасьпяшалася ў каюту – адзінае ціхае месца на караблі. Флярэнтына Арыса знайшоў яе ў прыгнечаным стане, яна была гатовая памерці, толькі б не трапляць на вочы знаёмым, якія, канечне ж, асудзяць яе за забаўляльныя вандроўкі ўсяго толькі праз год пасьля сьмерці мужа. Флярэнтына Арыса так блізка прыняў да сэрца яе занепакоенасьць, што паабяцаў прыдумаць спосаб укрыцьця ад любых вачэй і ад незаслужанага зьняволеньня ў каюце.

Ідэя ўзьнікла нечакана, калі яны вячэралі ў капітанскай ядальні. Капітана хвалявала праблема, якая здаўна патрабавала абмеркаваньня з Флярэнтына Арысам, але прэзыдэнт кампаніі заўсёды пазьбягаў дыскусіяў, высоўваючы звыклы аргумэнт: «У гэтых дробязях Леона Касіяні разьбіраецца лепш за мяне». Гэтым разам, аднак, Флярэнтына Арыса выслухаў капітана. Размова ішла пра тое, што караблі,

як правіла, везьлі груз да вярхоўяў ракі, але вярталіся безь яго, а пасажырская плынь была адваротнай. «Між тым выгадней мець справу з грузам, які больш плаціць і ня просіць есьці», – сказаў капітан. Фэрміна Даса вячэрала неахвотна, ёй надакучыла нэрвовая спрэчка двух мужчынаў пра мэтазгоднасьць дыфэрэнцыяцыі тарыфаў. Але Флярэнтына Арыса давёў дзелавую размову да канца і толькі потым падкінуў пытаньне, якое здалося капітану вестуном ратавальнай думкі:

– Прыміце гэта як гіпотэзу, – сказаў ён. – Ці мажлівая простая вандроўка бяз грузу і пасажыраў, без прыпынкаў у портах па дарозе?

Капітан адказаў, што гэта сапраўды мажліва толькі як гіпотэза. Параходная кампанія мела абавязкі перад супрацоўнікамі, і Флярэнтына Арыса ведаў пра гэта лепш за ўсіх, былі кантракты па фрахце, пасажырскіх перавозках, паштовых мяхах, і многія зь іх, калі не бальшыня, прадугледжвалі жорсткія санкцыі. Адзіным, што дазволіла б абысьці ўсе абавязкі і законы, было надзвычайнае здарэньне: халера на борце. На караблі абвяшчалі карантын, уздымалі жоўты сьцяг і пераходзілі на рэжым надзвычайнага плаваньня без заходу ў порты. Капітану Самарытана давялося ўчыніць гэтак некалькі разоў у сувязі з сапраўднымі ўспышкамі халеры ў прырэчных сялібах альбо на караблі, хоць у выніку санітарныя ўлады вымушалі дактароў пісаць даведкі пра звычайную дызэнтэрыю. Апрача таго, часта ў гісторыі ракі ўздымалі жоўты сьцяг, каб абысьці падаткі, не прымаць на борт непажаданага пасажыра ці пазьбегнуць непажаданых інспэкцыяў. Флярэнтына Арыса знайшоў пад сталом руку Фэрміны Даса.

– Вось і добра, – сказаў ён. – Так і зробім.

Капітан зьдзівіўся, але дзякуючы праніклівасьці старога ліса, імгненна зразумеў сытуацыю.

– Я камандую караблём, але вы камандуеце намі, – адказаў ён. – Так што, калі вы не жартуеце, дайце мне пісьмовы загад, і мы выходзім зараз жа.

Зразумела, Флярэнтына Арыса гаварыў сур'ёзна, і загад быў падпісаны. Зрэшты, людзі ведалі, што часы халеры не прайшлі, нягледзячы на салодкія казкі санітарных уладаў. Што тычыцца карабля, тут праблемаў не было. Нейкі груз быў перавезены на іншы карабель, пасажырам сказалі, што выяўлены тэхнічныя непаладкі, і на золку накіравалі іх караблём іншай кампаніі. Калі ў іншых выпадках гэта рабілася з амаральных і нягодных прычынаў, Флярэнтына Арыса ня бачыў сур'ёзных падставаў супраць таго, каб спрычыніць гэта ў імя каханьня. Капітан маліў толькі пра адно: пра кароткі прыпынак у Пуэрта-Нарэ, каб прыняць на борт пасажыра, які разьдзеліць цяжкасьці вандроўкі асабіста зь ім: у яго таксама была сардэчная таямніца.

Так што «Новая Вернасьць» узьняла якар на золку наступнага дня бяз грузу і пасажыраў, з жоўтым сьцягам халеры, які радасна разьвяваўся на флягштоку. Увечары падышлі да Пуэрта-Нарэ і падабралі жанчыну, яшчэ больш высокую і мажную, чым сам капітан, вычварна прыгожую, якой не хапала толькі барады, каб атрымаць кантракт у цырку. Яе звалі Зэнайда Ньевэс, але капітан называў яе «мая Волатка», гэта была даўняя сяброўка, якую ён браў на борт у адным порце і вёз да наступнага; калі яна падымалася на борт, то прыцягвала за сабою вецер удачы. Над тым сумным царствам сьмерці, дзе Флярэнтына Арыса настальгічна прыгадваў Расальбу, пабачыўшы цягнік на Энвігада, які цяжка поўз па старым карнізе для мулаў над безданьню, на «Новую Вернасьць» накінулася амазонская навальніца, якая зь невялікімі паўзамі суправаджала іх да канца вандроўкі. Але гэта нікога не турбавала: для плывучага сьвята меўся добры дах. Уначы Фэрміна Даса зрабіла асабісты ўнёсак у агульную гулянку, бо спусьцілася на кухню пад воплескі экіпажу і нагатавала для ўсіх прыдуманую ёю страву, якую Флярэнтына Арыса назваў «Бакляжаны каханьня».

Удзень гулялі ў карты, елі як сьлед, падчас сіесты спалі, нібыта глыбы граніту, да зьнясіленьня, і як толькі сонца схілялася да захаду, аркестар выходзіў на палубу, і яны пілі анісаўку да поўнай спатолі смагі, закусваючы вэнджаным ласосем. Плылі шпарка, карабель бяз грузу быў лёгкім. Узровень вады ўзьняўся

з-за навальніцы ў вярхоўях ракі, дзе за тыдзень выпала больш дажджу, чым калі. На падыходзе да некаторых сялібаў карабель сустракалі гарматным стрэлам міласэрнасьці, каб выгнаць халеру, і яны дзякавалі сумным гудком. Караблі іншых кампаніяў, якія сустракаліся на шляху, пасылалі ім сыгналы спачуваньня. У сялібе Малянгэ, дзе нарадзілася Мэрсэдэс*, пагрузілі дровы на рэшту дарогі.

Фэрміна Даса напачатку чула гудок карабля толькі ўдварам вухам, але на другі дзень з дапамогай анісаўкі яна ўжо чула лепш абодвума вушамі. Яна адчула таксама, што ружы былі больш духмяныя, чым раней, што птушкі сьпявалі на золку званчэй, і што Бог наноў сатварыў лямантына і пасадзіў яго на адхоне Тамалямэкі толькі дзеля таго, каб своечасова яго абудзіць. Капітан спыніў карабель, і яны бачылі вялізную самку, якая карміла малых. Ні Флярэнтына, ні Фэрміна не заўважылі, як зайшлі ў сваёй блізкасьці так далёка. Яна дапамагала яму ставіць клізму, падымалася раней за яго, каб пачысьціць яму зубныя пратэзы, якія ён пакідаў у шклянцы перад сном. Да таго ж, вырашыла праблему з акулярамі, бо ягоныя падыходзілі ёй для чытаньня і цыраваньня. Аднойчы яна прачнулася і, заўважыўшы ў паўцемры, што ён прышывае гузік да кашулі, адразу ўзялася за гэтую справу, апярэдзіўшы рытуальную фразу пра тое, што яму, маўляў, патрэбны дзьве жонкі. У сваю чаргу, Фэрміне спатрэбілася толькі, каб ён паставіў ёй аднаго разу банькі ад болю ў сьпіне.

Са свайго боку, Флярэнтына Арыса натхніўся аркестравай скрыпкай, і праз паўдня ўжо змог сыграць для яе «Вальс Каранаванай багіні», і ён граў гэты вальс некалькі гадзінаў запар, пакуль яго не спынілі сілай. Аднойчы ўначы, упершыню за ўсё жыцьцё, Фэрміна Даса раптам прачнулася, абліваючыся сьлязьмі, і гэта былі сьлёзы ня злосьці, а суму, – яна прыгадала старых, забітых у лодцы ўдарамі вясла. Бясконцая навальніца нікольк не ўзрушала яе, і яна запозьнена падумала, што, напэўна, Парыж ня быў такім змрочным, як ёй здавалася, і ў Санта-Фэ не было столькі пахаваньняў на вуліцах. Мара пра наступныя вандроўкі з Флярэнтына Арысам замаячыла на гарызонце: пра шалёныя вандроўкі бязь лішніх баулаў і грамадзкіх кампрамісаў, пра вандроўкі каханьня.

Напярэдадні прыбыцьця яны ладзілі сьвята з папяровымі гірляндамі і рознакаляровым асьвятленьнем. Неба ачысьцілася ўвечары. Капітан і Зэнайда танчылі, прыціснуўшыся адно да аднаго, першыя балеро, якія ў тыя гады пачалі ўваходзіць у моду. Флярэнтына Арыса адважыўся шапнуць Фэрміне Дасе, што час ужо танчыць вальс для дваіх, але яна адмовілася. Аднак ківала галавой, грукала абцасамі і нават раптам затанчыла, седзячы, пакуль капітан распускаўся ў абдымках сваёй пяшчотнай волаткі ў паўзмроку балеро. Яна выпіла столькі анісаўкі, што без дапамогі ня здолела ўзьняцца па лесьвіцы, і яе ахапіў прыступ сьмеху скрозь сьлёзы, які выклікаў трывогу. Аднак калі яна суняла сьмех у духмянай затоцы каюты, яны заняліся каханьнем з маладой сілай, як старыя ва ўсплёску эмоцыяў, і тая ноч засталася ў яе памяці найлепшым успамінам пра самнамбулічную вандроўку. Яны ўжо не адчувалі сябе жаніхом і нявестай, як меркавалі капітан з Зэнайдай, а тым больш – позьнімі палюбоўнікамі. Абое нібыта мінулі гальготу шлюбнага жыцьця і прасунуліся шмат далей – да самой сутнасьці каханьня. Яны маглі сядзець моўчкі, нібыта даўнія муж з жонкаю, якія прайшлі ўсе жыцьцёвыя выпрабаваньні. Яны былі ўжо па той бок жарсьці, па той бок горычы ад нязбыўных ілюзіяў і расчараваньняў, усё гэта было для іх прымітыўнасьцю, бо яны пражылі разам досыць, каб уцяміць: каханьне было каханьнем ва ўсе часы і паўсюль, але заўсёды яно больш працінальнае з набліжэньнем сьмерці.

Прачнуліся а шостай. Яна з галаўным болем, смакам анісаўкі ў роце і аглушальным пульсам ад уражаньня, што доктар Хувэналь Урбіна вярнуўся, больш мажны і малады, чымся ў той дзень, калі ўпаў з дрэва, і ён сядзеў у крэсьле-гушкалцы, чакаючы жонку каля парогу іхнага дому. Аднак яе думкі былі яснымі, і яна разумела, што гэта не было цяжкім пахмельлем, што рэч у іншым – немінучасьці вяртаньня дадому.

– Вярнуцца дамоў будзе як памерці, – сказала яна.

Флярэнтына Арыса зьдзівіўся: яна нібыта прачытала думку, якая яму не давала спакою з таго моманту, як яны пусьціліся ў адваротны шлях. Ні ён, ні яна не маглі ўявіць, як яны будуць спаць у іншым доме, акрамя каюты, есьці інакш, чымся на

караблі, жыць жыцьцём, якое заўсёды будзе чужым. Гэта і сапраўды было падобна на сьмерць. Ён ужо не заснуў, ляжаў са сплеценымі пад галавой рукамі. Раптам кінжальны ўспамін пра Амэрыку Вікуньню вымусіў яго скурчыцца ад болю, ён ужо ня мог адмахвацца ад праўды, зачыніўшыся ў ваннай, выплакаўся нясьпешліва, да апошняй сьлязінкі. Толькі пасьля гэтага адважыўся прызнацца сабе самому, як яе кахаў.

Яны апрануліся, каб сысьці на бераг. Між тым, карабель пакінуў за сабой апошні адрэзак рэчышча ракі – забалочаны старажытны гішпанскі канал – і плыў сярод карабельных парэшткаў і мёртвых затокаў ужо ў бухце. Пачынаўся сонечны чацьвер над залатымі купаламі гораду віцэ-каралёў, але Фэрміна Даса стаяла на вэрандзе і кляла ў думках смурод старажытнай славы, ганарлівасьць цьвярдыняў, апаганеных ігуанамі, увесь жах рэальнага жыцьця. Яны абое не хацелі і не маглі здацца проста так.

У ядальні сустрэлі капітана. Ён меў жахлівы выгляд, які ніяк не спалучаўся са звыклай акуратнасьцю: няголены, з пачырванелымі ад бессані вачыма, у потнай вопратцы мінулай ночы. Гарэлкавая адрыжка часам перарывала ягоныя словы. Зэнайда спала. Яны моўчкі сьнедалі, калі катэр санітарнай службы порту загадаў іхнаму караблю спыніцца. Капітан узьняўся на масток і сваім грымотным голасам адказаў на пытаньні ўзброенага патруля. Яны захацелі ведаць, якім відам халеры заражаныя пасажыры, колькі іх на караблі, колькі зь іх хворыя, ці ёсьць рызыка далейшага заражэньня. Капітан адказаў, што ён вязе трох пасажыраў і ўсе трое інфікаваныя халерай, але знаходзяцца ў поўнай ізаляцыі. Ні пасажыры, што ўзьняліся на борт у порце Ля-Дарада, ні экіпаж кантактаў зь імі ня мелі. Але камэндант патруля не задаволіўся гэтым і загадаў вывесьці карабель з бухты і чакаць у забалочаным канале Ляс-Мэрсэдэс да другой папаўдні, пакуль будуць уладкаваныя фармальнасьці для дэклярацыі карантыну на борце. Капітан выбухнуў лаянкай рамізьніка, але ўзмахам рукі загадаў лёцману разьвярнуцца і выйсьці зноў да каналу.

Фэрміна Даса і Флярэнтына Арыса ўсё пачулі, седзячы за сталом, але капітан нібыта не надаў гэтаму значэньня. Ён еў

моўчкі, благі настрой праявіўся толькі ў парушэньнях правілаў этыкету, на якіх трымалася легендарная рэпутацыя рачных капітанаў. Ён прабіў кончыкам нажа жаўткі чатырох смажаных яек, макаў у яечню кавалкі банану, браў жаўткі ў рот цалкам і жаваў зь дзікунскай асалодай. Фэрміна Даса і Флярэнтына Арыса глядзелі на яго моўчкі, нібыта вучні за партай, якія чакалі, калі будуць зачытаныя гадавыя адзнакі. Яны не абменьваліся ні словам, нават пакуль ішоў дыялёг з санітарным патрулём, ня мелі ні найменшага панятку пра тое, што ім наканавана, але паводле пульсацыі сасудаў капітанавых скроняў абое ведалі, што ён думае менавіта пра гэта.

Пакуль ён распраўляўся зь яечняй, з цэлым падносам смажаных бананаў і вялізным кубкам кавы з малаком, карабель на малой хадзе выйшаў з бухты, праклаў сабе шлях цераз покрыва гнілой зеляніны і рачнога лётасу зь лілёвага колеру кветкамі і вялізнымі сэрцападобнымі лістамі, вяртаючыся да багнаў. Вада пералівалася мірыядамі рыбінаў, што плылі на баку, забітыя браканьерскім дынамітам, і птушкі, якія ляталі над вадой і над зямлёй, насіліся кругамі над імі з рэзкімі мэталічнымі крыкамі. Карыбскі вецер біў у акно шумам птушынага базару, і Фэрміна Даса адчула ў крыві хаатычны пульс сваёй свабоды. Справа ад іх каламутнае ды маруднае вусьце вялікай ракі Магдалены цягнулася да другога канца сьвету.

Калі талеркі былі спустошаныя, капітан выцер ражком абруса вусны і загаварыў груба, раз і назаўсёды ставячы крыж на ўсіх мітах пра культурную мову рачных капітанаў. Ён гаварыў не для іх, а проста спрабуючы суцішыць гнеў. Нарэшце ён расьсеяна сьцьвердзіў, што ня бачыць спосабу, як выйсьці з дурнога становішча, у якое яны трапілі з гэтым халерным сьцягам.

Флярэнтына Арыса выслухаў яго, не міргнуўшы. Затым агледзеў вокны, прабег вачыма поўны круг квадранта ружы вятроў, выразную лінію гарызонту, бясхмарнае сьнежаньскае неба, воды, якія нібыта абяцалі надзейную навігацыю да сканчэньня вякоў, і сказаў:

– Пойдзем проста наперад, зноў да порту Ля-Дарада.

Фэрміна Даса здрыганулася, бо пазнала даўні голас, адзначаны знакам Сьвятога Духу, і кінула ўчэпісты позірк на капітана. Але капітан ня бачыў яе, ашаломлены моцнай сілай натхненьня Флярэнтына Арысы.

– Вы кажаце гэта сур'ёзна?

– Ад самага свайго нараджэньня, – адказаў Флярэнтына Арыса, – я не прамовіў нічога несур'ёзнага.

Капітан паглядзеў на Фэрміну Дасу і заўважыў першыя водбліскі зімовай шэрані на яе вейках. Потым ён перавёў позірк на Флярэнтына Арысу, адчуў яго непераможную ўладарнасьць, непахіснасьць ягонага каханьня, і быў працяты запозьненай здагадкай, што ня сьмерць бязьмежная, а жыцьцё.

– І да якое пары, вы думаеце, мы будзем матляцца туды і назад? – зноў спытаў капітан.

Адказ Флярэнтына Арысы быў гатовы ўжо пяцьдзясят тры гады, сем месяцаў і адзінаццаць дзён і начэй таму.

– Усё жыцьцё, – адказаў ён.

КАНЕЦ

Пераклаў з гішпанскай ***Карлас Шэрман***

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/13
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 5 (39) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

рэцэнзіі

[image]-[image]2005

"да Зміцера"

паэмыка • аналітыка • крытыка • эсэістыка • літаратура •

рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Андрэй Ягораў
Сакральная гісторыя найноўшага часу

АНДРЭЙ ЯГОРАЎ
асьпірант катэдры паліталёгіі БДУ, сябар рэдакцыі часопісу «Палітычная сфера», спэцыяліст Агенцыі гуманітарных тэхналёгіяў.

Севярынец Павал. *Пакаленьне Маладога Фронту. Гісторыя моладзі, народжанай у 1970–1985 гадах.* – Менск, 2004.

1. У ПОШУКАХ СЭНСУ

У кожнага разумнага чалавека, хто меў дачыненне да беларускай палітычнай апазіцыі, напэўна, паўставала пытанне: «А што робяць палітычныя лідэры, у чым рэальны сэнс іх дзеянняў, якія іх сапраўдныя мэты?» Такія пытанні могуць нараджацца як з недахопу інфармацыі, так і з няздольнасці зразумець сувязь мэтаў і дзейнасці па іх дасягненні. Па-першае, некаторыя мэты палітычных дзеячаў не набываюць публічнасці, застаюцца ў прыватнай клубнай прасторы асабістых знаёмцаў і сапраўды нам не вядомыя. Па-другое, дэкларатыўныя, публічна абвешчаныя мэты не адпавядаюць дзеянням па іх дасягненні. Па-трэцяе, тут можа існаваць камбінацыя першых двух варыянтаў: мэты неабвешчаныя, але па здаровым сэнсе яны падаюцца відавочнымі, між тым як дзеянні палітыкаў кардынальна разыходзяцца з гэтымі «відавочнымі» мэтамі.

З абсалютнай немагчымасці разумна патлумачыць наяўныя

праявы актыўнасці лідэраў беларускай апазіцыі і кіраваных імі арганізацый шарагоўцы, актыўныя ўдзельнікі і вонкавыя даследчыкі палітыкі, што сутыкаюцца з такой дылемай, прыходзяць да высноў альбо пра звычайную некампетэнтнасць сваіх лідэраў, альбо пра іх карумпаванасць і несумленнасць, альбо пра наяўнасць вонкавага (і нябачнага) узроўню кіравання, што выстаўляе сапраўдныя мэты. Які б варыянт ці іх камбінацыя не былі б абраныя, часцей за ўсе яны прыводзяць да высновы аб неабходнасці змены лідэраў – і гэта ў лепшым выпадку. У горшым жа чалавек схіляецца да адыходу ад актыўнай палітычнай дзейнасці ці спробаў штосьці зразумець.

Дапамагчы вырашыць такія пытанні і прыадчыніць «таямніцу» маглі б крытыка і аналіз асабістых учынкаў палітыкамі ў сваіх тэкстах. Але, на жаль, гэтага не адбываецца. Не стала выключэннем і кніга Паўла Севярынца «Пакаленне Маладога Фронту». Кніга не дае нейкай асабліва новай інфармацыі для чытача, што сочыць за палітычным жыццём краіны хаця б па газетах. Няма ў ёй аналізу і рэтраспектыўнай ацэнкі эфектыўнасці ўласных дзеянняў, узлётаў і падзенняў, іх прычын і наступстваў, мала гістарычных дэталяў і фактаў, што натуральна схаваныя ад назіральніка, няма… Ды шмат чаго няма, што хацелася б бачыць у кнізе дасведчанага лідэра, які непасрэдна ўдзельнічаў у прыняцці важных палітычных рашэнняў, прынамсі ў БНФ і «Маладым фронце».

2. ІДЭАЛОГІЯ І ГІСТАРЫЯСОФІЯ

Аўтар заяўляе ў прадмове жаданне «асэнсавання феномену моладзі Беларусі». Але ў кнізе Севярынец выступае не як даследчык ці відавочца, а як ідэолаг. «Пакаленне Маладога Фронту» – не мастацкая літаратура, не хроніка і не публіцыстыка. Гэта гісторыя», – піша ён сам. Так, гэта гісторыя, калі разумець «гісторыю» толькі як наратыў. Кніга Севярынца – гэта расповед аўтара пра сваё жыццё, пра тое, што бачыў ён навокал сябе з часоў дзяцінства па сённяшні дзень. Гэта эмацыйная плынь думак пра тое ці іншае. Аўтар не шукае адказаў, не ставіць пытанняў, ён ужо загадзя ўсё ведае і проста расказвае нам, як яно ёсць, было і нават будзе.

Кніга Севярынца, акрамя ўласна аповеда пра сябе – гэта ідэалагізаваная і спрошчаная версія палітычнай гісторыі Беларусі найноўшага часу. Але гэта не хіба, гэта, хутчэй, натуральная форма палітычнай гісторыі. Галоўная хіба – нерэфлексіўнае стаўленне аўтара да самога сябе. Севярынец становіцца ахвярай сваёй заангажаванасці ў падзеях, «зацікаўленасці» імі. Ідэалагічная зададзенасць пазбаўляе аўтара волі да ісціны і цягне па вузенькай сцежцы апавядання. Выкарыстоўваюцца аднабокія ацэнкі падзей, пад увагу трапляюць толькі тыя факты, што пацвярджаюць думку аўтара, іншыя ігнаруюцца або скажаюцца. Напрыклад, абгрунтоўваючы поспехі «Маладога фронту» ў 2002 г., аўтар піша: «Большасць моладзі падтрымлівае адну з дзвюх самых папулярных арганізацый: «Малады фронт» і БРСМ. «МФ» – 34 %, БРСМ – 27 %, астатнія набралі менш за 5 %». Як кажуць, без каментароў. І гэта далёка не адзінкавы выпадак.

Але ж факты, нягледзячы на іх упартасць, тут не галоўнае. Севярынец піша тую гісторыю, у якую верыць, – сакральную гісторыю. Для яе не патрэбны логіка і факты, яна не зважае на рэальнасць, яна самадастатковая. Крыніца ісціннасці сакральнай гісторыі Севярынца, як і крыніца ісціннасці любой ідэалогіі – у ёй самой. Таму натуральна, што аўтар піша ўзвышана- высакапарным стылем, апелюе, хутчэй, да эмоцыяў, чым да розуму чытача. Свая ўнутраная логіка, вядома, прысутнічае. Як і ў любой версіі гісторыі, у гэтай ёсць:

1) суб’ект, галоўны актор – двухмільённае пакаленне «Маладога фронту», народжанае ў 1970–1985 гг. і агульнабеларускі рух «Малады фронт», авангард гэтага пакалення;

2) аб’ект – Беларусь увогуле і беларуская нацыя ў прыватнасці. Пакаленне «МФ» стварае нацыю і пераўтварае Беларусь;

3) гістарычная місія – Адраджэнне Беларусі ў адпаведнасці з формулай «беларуская форма – хрысціянскі змест»;

4) гістарычны кантэкст – уласна падзеі найноўшай гісторыі Беларусі;

5) апісанне жыцця і дзейнасці пакалення як гістарычнага суб’екта;

6) свая перыядызацыя:

1985–1995 гг. – выспяванне суб’екта;

1996–1997 гг. – першыя спробы палітычнай актыўнасці;

1997–1998 гг. – з’яўленне пакалення ў палітыцы як самастойнага актора, фармаванне руху «Маладога фронту»;

1998–1999 гг. – «субкультурны» заняпад, драбленне пакалення на асобныя субкультурныя групоўкі;

1999–2000 гг. – хрысціянскі пад’ём пакалення, яднанне пакалення;

2000-ны – нашыя дні – заняцце вядучай гістарычнай пазіцыі.

Часавы перыяд з 1970 па 1985 г. абраны досыць выпадкова: можа, лічбы круглыя – 1970, 1985. Перыяд сумнеўны, як і наяўнасць такога цэласнага сацыялагічнага і гістарычнага суб’екта як пакаленне «Маладога фронту». Але аўтар не зважае на гэткія дэталі, бо для яго гістарычная роля пакалення апрыёрна зададзеная, а яе маштабы набываюць трансцэндэнтнае значэнне поля барацьбы «мінулага і будучыні, зла і дабра, д’ябла і Бога».

Аб’ект і гістарычная місія. Тут цяжка што аспрэчыць. Севярынец аб’ектыўна мае рацыю. Але такія мэты не належаць ні асобнай палітычнай арганізацыі, ні асобнаму пакаленню беларусаў, такія мэты належаць самой Беларусі як аб’екту ўладкавання, матэрыялу, які змяняецца высілкамі сапраўдных гістарычных суб’ектаў. Адраджэнне, стварэнне нацыі, уладкаванне Беларусі ў «беларускай» з «хрысціянскім зместам» формах – гэта натуральныя задачы, якія будуць вырашацца незалежна ад дзейных гістарычных асоб. Беларусь не можа не быць «беларускай і хрысціянскай». Зазірніце ў любы падручнік па ідэалогіі беларускай дзяржавы, вы пабачыце там тое самае: дэкларатыўную беларускасць і хрысціянскасць. Адно толькі

ўзаемаадносіны формы і зместу з гуманітарна-тэхналагічнага пункту гледжання куды больш далікатныя. Прымаючы фармальна аднолькавыя мэты, з аднаго і таго ж беларускага матэрыялу, на адной тэрыторыі праектуюцца і будуюцца розныя краіны: «бел-чырвона-белая» і «чырвона-зялёная» Беларусі, поліканфесійная і «праваслаўна-атэістычная». І «пакаленне Маладога фронту», як усё нашае грамадства, падзеленае на будаўнікоў і будоўны матэрыял для розных праектаў (і аўтар гэта таксама разумее). Не зважаючы на такія тонкасці, аднойчы можна прачнуцца ў чужой краіне.

Пакаленне «Маладога фронту», паводле Севярынца, пачынае тварыць гісторыю толькі ў новым тысячагоддзі («стварае нацыю», «робіць палітыку», «абараняе Курапаты»). Да гэтага часу яно – пасіўны назіральнік і актор другога плана ў тэатры падзей сучаснасці: жыве ў жахлівых умовах «імперыі зла», дзе «старшакласнікі трэслі капейкі», потым пускаецца ў авантуры і акунаецца «ў самыя глыбіні зла» на мяжы 1980-х – 1990-х (выпадкова ці наўмысна, але аўтар тут выкарыстоўвае традыцыйны міфалагічны сюжэт, калі герой у сваіх прыгодах сутыкаецца з абсалютным злом, наведвае пекла, але ў выніку перамагае і застаецца жывым), кідаецца ў бізнес і маўкліва пазірае на палітычнае жыццё краіны ў 1992–1995 гг. Пад'ём пачынаецца ў 1996-м –1997-м з «гарачай вясны 1996-га» і вулічных акцый «Маладога фронту». Аўтар старанна пералічвае кожную акцыю, і, здаецца, жыве тым рамантычным часам сваіх першых масавых вулічных дзеяў. Але, акрамя рамантыкі, не дае ні новай інфармацыі пра тое, як гэта адбывалася і арганізоўвалася, ні новых асэнсаванняў, чаму ўсё гэта мела такі вынік, які мела. Напэўна, таму, што той «наступ моладзі» Павал Севярынец лічыць пераможным, удалым. Менавіта з яго паўстае «Малады фронт» – перадавая частка свайго пакалення. Іншыя праекты і моладзевыя арганізацыі, паводле Севярынца, былі ці непаспяховыя (БПСМ, Камітэт па справах моладзі, войска), ці былі часовымі адхіленнямі ад правільнага маладафронтаўскага шляху (радыкалы з «Краю» і «Белага легіёна», «Зубр», субкультуры нефармалаў, крымінальнікаў, папса, тэхнары). Магчыма, з разгулам «пабочных» праектаў пакаленне было б страчанае ў 1998-м –1999-м, але праз асветніцкую працу (курсы «Ды-джэяў Адраджэння», «Шоў

беларушчыны» і г. д.) «Маладога фронту» і агульны хрысціянскі пад'ём здолела ўратавацца.

З 2000 г., паводле ацэнак аўтара, пакаленне «Маладога фронту» дзейнічала беспамылкова. Выхад на палітычнае поле быў уражлівы і досыць паспяховы: хоць 2001 г. прайгралі, але школа была добрая. А далей, калі аўтар апісвае актыўнасць «МФ» у 2002–2003 гг., узнікае адчуванне, што ўся краіна да гэтага на вушах стаіць («моладзь паказвала клас у палітыцы»). Напэўна, пасля такога ўзрушанага расказу ў чытача павінны знікнуць апошнія сумневы наконт вырашальнай ролі пакалення 1970-га –1985-га ў будучыні Беларусі. Але чамусьці не знікаюць. Можа, трэба ў «Малады фронт» запісацца?

3. ДЗІЦЯЧАЯ ХВАРОБА КРУЦІЗНЫ

Вы калі-небудзь бачылі палітыка ў беларускай апазіцыі, які б прызнаў сваю паразу? Гэта вечныя пераможцы. Няма ніводнага палітыка, які б тайна не верыў у тое, што раз за разам прайграючы выбары, губляючы пасады, партыі, грошы, вядомасць, ён застаецца непераможаны. Толькі скажыце каму з іх пра гэта, і вы пачуеце такі экспрэсіўны адказ, такую прамову! Ого! Больш за тое, здаецца, ужо нішто не зможа надаць ім хоць кроплю крытычнасці ў адносінах да ўласных дзеянняў. Чаму так?

Падаецца, яны жывуць у прасторы без часу. Усё адбываецца толькі сёння. Яны дагэтуль сёння, тут і цяпер удзельнічаюць у шэсцях вясны-96, арганізоўваюць байкот-2000, разгортваюць мабілізацыйную кампанію-2001. Калі Павал Севярынец піша пра першую «Акцыю Любові», ён тамака, на гэтай акцыі. Думаючы сёння пра тую акцыю, ён і цяпер ацэньвае яе, як тады. Для яго час спынены. І так для свайго кожнага важнага палітычнага ўчынку. Хто-ніхто яшчэ можа выйсці ў часавую прастору для аналізу дзеянняў іншых людзей і сітуацыі ў цэлым, але амаль няма тых, хто можа рэтраспектыўна і звонку глядзець на сябе самога.

Апазіцыйныя палітыкі – гэта тыя «вечныя дзеці Беларусі», як піша Валянцін Акудовіч. Адных з іх скарыў нацыяльны міф,

іншых – ліберальны, а каго і камуністычны. Большасць з іх жыве не ў рэчаіснасці рэальнай Беларусі, а ў рэчаіснасці свайго міфа. Тут дзеянні рытуалізавана-стандартызаваныя, падпарадкаваныя норме, несамакіраваныя. Актор заўсёды нешта робіць, знаходзіцца ў дзеянні, няма месца развагам, няма месца ацэнкам. Тут ёсць толькі сёння, свет існуе толькі ў гэты момант, мы робім толькі тую канкрэтную справу, якую робім зараз. І немагчыма выйсці і кінуць позірк у мінуўшчыну ці будучыня, паглядзець на ланцуг сваіх дзеянняў, асэнсаваць тое, што робіцца зараз, як частку агульнага працэсу. У гэтай міфічнай прасторы ёсць толькі дрэвы, і лесу за імі не бачна.

У такім падыходзе нельга разважаць пра эфектыўнасць палітычнай дзейнасці. Важны факт наяўнасці справы як такой. Возьмем, напрыклад, апошні дыялог хакераў, што зламалі сайт АГП, з лідэрамі партыі. Сваім учынкам (зломам сайту) «хакеры-патрыёты» нібыта жадалі сказаць: а) тое, што вы рабілі раней, не набліжала вас да мэты (пабудовы дэмакратыі ў Беларусі); б) не рабіце так болей, гэта няправільна; в) рабіце па-іншаму. Што адказваюць партыйцы? Прыкладна гэтае: «мы рабілі тое, што рабілі, і калі мы гэта рабілі, вы гэтага не рабілі», г. зн. проста канстатуюць факт наяўнасці сваёй актыўнасці. Пытанне пра эфектыўнасць ігнаруецца.

Яшчэ адзін цікавы момант. Што б ні здарылася – вінаваты заўсёды іншы: калегі па апазіцыі (у Севярынца звычайна вінавата старэйшая генерацыя палітыкаў), рэжым, толькі не самі палітыкі. Псіхолагі называюць такі стан вонкавым локусам кантролю, калі адказнасць за сваю дзейнасць нясе не сам суб'ект, але нехта іншы. Гэта яшчэ больш абмяжоўвае магчымасці для самакрытыкі. У выніку, мы маем тое, што маем. Дэмакратычная апазіцыя дэманструе, што час не лінейны, а цыклічны, паўтарае інстынктыўна, з дакладнасцю пералётных птушак, адны і тыя ж маршруты, адны і тыя ж памылкі. Таму, калі розум будзе не здольны разарваць гэтае міфічнае кола, Беларусь можа назаўсёды застацца закладнікам сваіх «вечных дзетак».
[image]
[image]
Пачатак Цалкам

№ 5 (39) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/02/13**
[image]

[image]

A R C H E

П а ч а т а к

№ 5 (39) - 2005

[image]

[image]

[image]

рэцэнзіі

[image]-[image]2005

"да Зміласту"

рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Яўген Мірановіч Стварэнне і разбурэнне акупацыйнай рэчаіснасці

ЯЎГЕН МІРАНОВІЧ прафэсар катэдры беларускай культуры Беластоцкага ўнівэрсытэту. Яго апошнія публікацыі – «Zmiany struktury etnicznej na Białorusi w okres okupacji niemieckiej» (Białoruskie Zeszyty Historyczne, t. 21, Białystok, 2004) і падручнік для студэнтаў «Historia Białorusi od połowy XVIII do końca XX

К’яры Бернгард. Штодзённасць за лініяй фронту. Акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941–1944 гг.). – Мінск, 2005. – 390 с.

Кніжка Бернгарда К’яры можа служыць беларускім вучоным прыкладам альтэрнатыўнай – у дачыненні да савецкай – метадалогіі даследавання найноўшай гісторыі. Нямецкі гісторык піша пра нямецкую акупацыйную ўладу ў Беларусі, якая прадстаўляла сабой адзін з найбольш злачынных рэжымаў у гісторыі свету. Пераважная частка працы прысвечана, аднак, грамадству Беларусі, якое на працягу трох гадоў акупацыі перажыло пекла на зямлі. К’яры ўсведамляе маштабы зла, учыненага ягонымі суродзічамі на беларускай зямлі, і не памяншае ані злачынстваў, ані крыўдаў ахвяр нямецкай палітыкі. Адначасова ён пазбягае так характэрнага для польскіх ці беларускіх гісторыкаў імкнення да абароны палітычных, нацыянальных, дзяржаўных інтарэсаў уласнага народу. Пасля ўважлівай лектуры гэтай працы няма ніякіх падстаў рабіць аўтару закід аднабаковасці, хаця вобраз беларусаў, палякаў, украінцаў, літоўцаў, латышоў, расійцаў такі сама малаправабны, як і немцаў.

К’яры даводзіць, што акупацыйны кашмар частковаўжыў выкліканы складанасцю палітычнай сітуацыі, што існавала ў Беларусі яшчэ да вайны. Супярэчнасць беларускіх, савецкіх і польскіх інтарэсаў узмацнялася тут нацыянальнымі, рэлігійнымі і палітычнымі канфліктам яшчэ да 1939 г. Аўтар дае шмат прыкладаў, як усе лагеры імкнуліся выкарыстаць нямецкую акупацыйную ўладу для вырашэння сваіх праблем, а перш за ўсё для ліквідацыі ўсялякай канкурэнцыі. Вельмі часта злачынны рэжым выкарыстоўваўся дзеля знішчэння асабістых ворагаў (с. 159–165). К’яры не піша непасрэдна, але дае выразна зразумець, што вінаватымі ў кашмары на беларускай зямлі былі не толькі немцы, але і бальшавікі, беларусы, палякі, латышы, літоўцы, расійцы, украінцы. Цяжка не прызнаць ягонай рацыі, бо, каб пацвердзіць гэтую тэзу, ён прыводзіць вельмі шмат прыкладаў. Злачынцы мясцовага паходжання часта былі горшымі за тых, каму служылі (с. 203–209). Аўтар, аднак, падкрэслівае, што палітычная і маральная адказнасць за ўсё, што тут адбывалася, ляжыць на немцах.

Пры чытанні кніжкі выразна відаць, што К’яры імкнуўся зразумець людзей, якія стваралі акупацыйную рэчаіснасць. Ён хацеў паказаць з фатаграфічнай дакладнасцю катаў і ахвяры, вярнуць памяць пра сотні тысяч тых, што без віны загінулі, бо апынуліся на дарозе нейкай злачыннай арды, пра наймалодшых, пазбаўленых дзяцінства, пра старэйшых, пазбаўленых маёмасці і чалавечай годнасці. Яму часта цяжка адрозніць злачынцаў ад ахвяр, бо тыя самыя людзі ў час акупацыі маглі выступаць і ў адной, і ў другой ролі.

У шэраг злачынцаў і ахвяр К’яры паставіў і беларускіх паліцыянтаў, у тым ліку тых, што пайшлі служыць з патрыятычных прычын, у надзеі дачакаць беларускай дзяржаўнасці. Яны марылі служыць свайму народу, на практыцы вымушаныя былі з ім змагацца. Савецкае падполле бачыла ў іх здраднікаў і было бязлітасным як да іх саміх, так і да іх сем’яў.

К’яры рашуча адкідае тэзіс Юр’я Туронка пра гаўляйтара Вілгельма Кубэ як прыхільніка беларускай справы (с. 69). Паводле нямецкага гісторыка, Кубэ быў адным з тых, што з

поўнай адданасцю будавалі ў Беларусі апарат тэрору.

Першы раздзел сваёй працы К'яры прысвяціў апісанню метадалогіі даследавання, гістарыяграфіі і крыніц, выкарыстаных для напісання працы. Асновай былі дакументы, якія знаходзяцца ў беларускіх архівах. Увагі заслугоўвае той факт, што яму ўдалося выкарыстаць крыніцы з архіваў КДБ, наогул недаступныя беларускім гісторыкам.

У другім раздзеле аўтар, як мне здаецца, не надта трапна акрэсліў геапалітычную сітуацыю Беларусі як перыферыю Польшчы і Савецкага Саюза. Для абодвух суседзяў Беларусі гэта была, хутчэй, прыфрантавая зона, дзе стала працягвалася змаганне з сапраўднымі і ўяўнымі ворагамі. З абодвух бакоў ад рыжскай мяжы беларуская інтэлектуальная эліта ўспрымалася як нешта падазронае ці нават варожае. Таму амаль усе тыя яе прадстаўнікі, каго не паспелі знішчыць, наіўна чакалі разумення іх нацыянальных праблем з боку немцаў.

Шмат месца прысвяціў аўтар характарыстыцы нямецкай акупацыйнай улады. Ён звяртае ўвагу, што ў Райху было шмат ахвотных служыць у Беларусі. Немцы, якія прыязджалі на ўсход, спадзяваліся тут зрабіць хуткую кар'еру і набыць вялікую маёмасць. Некаторыя ўраднікі імкліва пераўтвараліся ў сярэднявечных феадалаў, ахвярамі якіх рабіліся мясцовыя сяляне (с. 77).

К'яры вельмі добра паказаў, як выглядала акупацыйная рэчаіснасць з пункту гледжання немцаў. Савецкія партызаны на немцаў штодня наводзілі не меншы жах, чым на мясцовае насельніцтва. Партызан мог хавацца ў дзіцяці, у жанчыне, у паліцыянце і нават у нямецкім афіцэры. Ад яго немагчыма было цалкам схавацца.

Вельмі адмоўна ацэньвае нямецкі гісторык усялякіх спецыялістаў, дасыланых з Берліна ў Беларусь. Часта гэта былі вельмі прымітыўныя асобы без ведання месцовых рэалій, якія глядзелі на падпарадкаванае насельніцтва як на горшы гатунак людзей. Яны самі вызначалі сваё права на рабунак усяго, што лічылі для сябе вартым. Спецыялісты ў справах культуры перш за ўсё займаліся нішчэннем помнікаў культуры. Беларусь

страціла мільёны кніжак у выніку запланаванай акцыі аператыўнага штаба, арганізаванага райсхляйтэрам Розэнбэргам (с. 107–110).

К’яры прыйшоў да высновы, што беларускі нацыянальны лагер ніколі не ўспрымаўся немцамі як істотны палітычны фактар, з якім трэба было абмяркоўваць будучыню акупаванага краю. «Нямецкая адміністрацыя, – піша ён, – бачыла ў беларускіх структурах улады не самастойных партнёраў, а дапаможную сілу ў рэалізацыі нямецкіх інтарэсаў. Беларусы былі атрымальнікамі загадаў і мусілі выконваць нямецкія інструкцыі» (с. 144).

Аўтар вельмі добра прыблізіў чытачу акупацыйную сістэму тэрору, важнай часткай якой былі батальёны дапаможнай паліцыі. Немцы ў паліцыйных структурах найчасцей выступалі ў ролі камандзіраў. Пільнаваць нямецкі парадак у Беларусі былі прыцягнуты літоўскія, латышскія, каўказскія, расійскія і ўкраінскія падраздзяленні. У некаторых раёнах, асабліва паўночных і паўднёвых, акупацыйная сістэма трымалася на польскіх ці ўкраінскіх пастарунках. Беларускія паліцыянты – гэта найчасцей сялянскія сыны ва ўзросце 18–22 гадоў, якія з самых розных прычын траплялі на службу да немцаў. Меншасць хацела змагацца за несавецкую Беларусь, большасць – мець матэрыяльны дабрабыт, уладу, адпомсціць за крыўды санацыі, саветызацыі і да т. п. Нягледзячы на матывацыю, К’яры ацэньвае іх адмоўна. «Паліцыянты кампраметавалі сябе, – піша ён, – ужо самым фактам падпісання адпаведнага абавязку. (...) Службовая прысяга, якую яны абавязаны былі прыносіць, фармальна прывязвала іх таксама да нацыянал-сацыялісцкай сістэмы эксплуатацыі» (с. 186).

Адзін з раздзелаў (VIII) К’яры прысвяціў аналізу беларуска-польскіх адносін падчас нямецкай акупацыі. Аўтар не мае сумневу, што гэта была вайна з выкарыстаннем нямецкага апарату тэрору абодвума бакамі. Адзін з падраздзелаў, названы «Палякі як ахвяры і злачынцы» (с. 285–294), вельмі трапна характарызуе складанасць польскага пытання ў акупаванай Беларусі.

Кніжка нямецкага гісторыка, несумненна, – адна з найлепшых

працаў, якія кранаюць праблемы гітлераўскай акупацыі ва Ўсходняй Еўропе. Аўтар паказаў рэчаіснасць з усіх бакоў, а перш за ўсё механізм, які пераўтвараў маладых людзей, часта супраць іх волі, у катаў, незалежна ад таго, дзе яны змагаліся – у шэрагах партызанскіх атрадаў ці паліцыйных батальёнаў. Кніжка дазваляе адчуць той кашмар, які выпаў на долю большасці жыхароў Беларусі, зло, ад якога звычайным людзям немагчыма было ўцячы.

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

№ 5 (39) - 2005

[image]да Зьместу

[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: **2006/02/13**

[image]